ARCHE Зьмест № 10’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Андрэй Дынько. Мова вуліцаў і мова Плошчы
4. Слоўнік, зроблены на энтузіязьме. Гутарка з рэдактарам «Ангельска-беларускага слоўніка» Валентыны Пашкевіч Сяргеем Шупам
5. Аўген Усошын. Зьнішчэньне і ўваскрасеньне беларускага Касьцёлу
6. Алесь Пашкевіч. Галасы забытых людзей
7. Рой Алісан, Стывэн Ўайт, Марго Лайт. Беларусь між Усходам і Захадам
8. Віталь Панамароў. Перакласці – аддзячыць
9. Лісты Антона Луцкевіча з часу Парыжскай мірнай канферэнцыі
10. Анатоль Сідарэвіч. Апошнія дні Антона Луцкевіча
11. Андрэй Вашкевіч. Прадбачанні «Беларускага Фронту»
12. Таццяна Вадалажская. Ці руйнуюцца дыктатуры?
13. Сяргій Жадан. Дэпэш Мод
14. Віталь Скалабан. А знак націску паставіць забыліся...
15. Сяргей Запрудскі. Карскі без рэдактара
16. Павал Абрамовіч. Больш, чым сшытак

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 10 (50) - 2006**
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
[image]
10[image]-[image]**2006**
крытыка • аналітыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура
[image] [image] [image]
[image]

Зьмест

Contents

АНДРЭЙ ДЫНЬКО Мова вуліцаў і мова Плошчы
Слоўнік, зроблены на энтузіязьме. Гутарка зь СЯРГЕЕМ ШУПАМ

КРЫТЫКА

АЎГЕН УСОШЫН Зьнішчэньне і ўваскрасеньне беларускага Касьцёлу
АЛЕСЬ ПАШКЕВІЧ Галасы забытых людзей

АНАЛІТЫКА

РОЙ АЛІСАН, СТЫВЭН ЎАЙТ, МАРГО ЛАЙТ Беларусь між Усходам і Захадам

ЭСЭІСТЫКА

ВІТАЛЬ ПАНАМАРОЎ Перакласьці - аддзячыць

ГІСТОРЫЯ

РЫГОР ЛАЗЬКО Лісты Антона Луцкевіча з часу Парыскай

мірнай канфэрэнцыі
АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ Апошнія дні Антона Луцкевіча
АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ Прадбачаньні «Беларускага Фронту»

ПАЛЕМІКА

ТАЦЯНА ВАДАЛАСКАЯ Ці руйнуюцца дыктатуры?

ЛІТАРАТУРА

СЯРГІЙ ЖАДАН Дэпэш Мод

РЭЦЭНЗІІ

ВІТАЛЬ СКАЛАБАН А знак націску паставіць забыліся...
СЯРГЕЙ ЗАПРУДЗКІ Карскі без рэдактара
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Больш, чым сшытак

[image]
[image]

№ 10 (50) - 2006

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/10/18**
[image]

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 10 (50) - 2006**

[image]

[image]

[image]

10[image]-[image]2006
"ды Зьвесту"

крытыка • аналітыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

Андрэй Дынько Мова вуліцаў і мова Плошчы

АНДРЭЙ ДЫНЬКО
галоўны рэдактар газэты «Наша Ніва». Гэты тэкст ёсьць часткай кнігі, якую рыхтуе Усходнеэўрапейскі дэмакратычны цэнтар і якая мае выйсьці ў студзені 2007-га.

Як толькі міністар статыстыкі абвесьціў аб правядзеньні ў 2009 годзе чарговага перапісу насельніцтва, Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны (ТБМ) запатрабавала, каб у перапісныя лісты ня ўносілася пытаньне пра тое, якой мовай грамадзяне карыстаюцца ўдома, адно пытаньне пра родную мову. Як вядома, пытаньне пра хатнюю мову было новаўвядзеньнем перапісу 1999 году. Палкоўнік Замяталін, тагачасны куратар ідэалёгіі, такім чынам хацеў падвесьці грунт пад узяты Лукашэнкам курс на рэсаветызацыю. Аднак вынікі перапісу расчаравалі замоўцу: ва ўмовах свабоднага запаўненьня перапісных лістоў беларусы масава дэкляравалі вернасьць беларускай мове. Той вынік многія сацыёлягі інтэрпрэтавалі як сублімаваны пратэст. Відавочна, ТБМ баіцца, што лічба, атрыманая ў 2009 годзе, будзе меншаю, чым у 1999-м, і гэта выб’е зь ягоных рук аргумэнты ў змаганьні супраць далейшага ўзмацненьня русіфікацыі. Наколькі гэты непакой мае пад сабою грунт? Увогуле, як разьвіваецца моўная сытуацыя ў Беларусі? Вартых даверу сацыялягічных зьвестак няма, дый ня можа быць ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму, калі больш важыць ня тое, *на якой мове размаўляюць* людзі, а тое, на якой мове яны *хацелі б размаўляць*. Супастаўляючы зьвесткі з розных сфэраў жыцьця, я імкнуўся зьвяртаць увагу на тое, што

зьмянялася ў апошнія гады. Гэтыя перамены часам малазаўважныя, але, забягаючы наперад, адзначу, што даюць надзею камусьці такому беларускамоўнаму і заангажаванаму ў змаганьне за свабоду, як я.

КНІГАВЫДАНЬНЕ: ПРЫВАТНІК ЗАМЯНЯЕ ДЗЯРЖАВУ

За 2005 год у Беларусі выйшла 421 кніга на беларускай мове. Дзяржаўныя фабрыкі зь іх надрукавалі толькі 92 найменьні. Астатнія выйшлі ў прыватных друкарнях. Гэта выяўна кантрастуе з часам СССР, дый першымі гадамі незалежнасьці. У савецкі час выпуск беларускамоўнай прадукцыі цалкам кантраляваўся каляніяльнымі ўладамі. У першыя постсавецкія гады кнігавыданьне забясьпечвалася дзяржаўнай датацыяй. Тым часам як цяпер дзяржаўныя выдавецтвы саступаюць у колькасьці (і якасьці) выдадзеных найменьняў прыватным, сярод якіх вылучаюцца, напрыклад, «Беларускі кнігазбор» на чале з Генадзем Вінярскім, «Тэхналёгія» Зьмітра Санька й выдавецтва Ігара Логвінава. Такую колькасьць прыватных выданьняў можна вытлумачыць перадусім наяўнасьцю незадаволенага попыту.

АДУКАЦЫЯ: НАЗАД У СССР

1 верасьня, Дзень ведаў, дзень пачатку заняткаў актывісты моладзевых арганізацыяў адзначылі дзёрзкім пэрформансам. На плошчы імя Якуба Коласа, клясыка беларускай літаратуры, яны ўстанавілі шыбеніцу. Чалавек, апрануты ў чырвона-зялёную, колераў лукашэнкаўскага сьцяга, вопратку ката, павесіў на ёй падручнік, на адным баку якога было напісана «Беларуская мова», а на другім – «Гісторыя Беларусі, 10 кляса». Патрульныя міліцыянты прыбылі праз пару хвілінаў, якіх юнакам хапіла, каб растварыцца ў тлуме. Загадзя запрошаныя рэпартэры задакумэнтавалі чын і пашырылі інфармацыю пра яго праз СМІ. Такі быў пратэст супраць пераводу выкладаньня гісторыі Беларусі ў школах на расейскую мову.

Калі аналізаваць статыстычна, беларуская мова трымае пазыцыі някепска. На 2006 год 23,3 % школьнікаў хадзілі ў клясы зь беларускаю мовай навучаньня (на 1989 год – 22 %).

Істотна тое, што беларускай мове ўдалося адстаяць пэўныя сымбалічныя пазыцыі ў сталіцы. Калі на 1988 год там не было ніводнае клясы зь беларускай мовай навучаньня, на 2006 год маецца 4 цалкам беларускамоўныя гімназіі і яшчэ ў 43 школах – асобныя беларускамоўныя клясы. Да таго ж, утварылася і ўтрымліваецца невялічкая сетка нефармальных навучальных установаў. Найбольшую вядомасьць набыў Беларускі гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа. Калі ў 2003 годзе ўлады паспрабавалі закрыць яго, настаўнікі, дзеці й іхныя бацькі аддалі перавагу пераходу да падпольнага навучаньня.

Ацэнка стану беларускамоўнай адукацыі залежыць ад оптыкі. У параўнаньні з 1993 годам, калі ў беларускамоўныя першыя клясы ішлі 76 % школьнікаў ад агульнай колькасьці, нават ад 1995 году, калі тая лічба складала 38 %, леташні 21 % не выклікае энтузіязму.

Аднак да 1988 году, стану савецкага часу, лукашэнкаўцам вярнуць сыстэму адукацыі ўсё яшчэ не ўдаецца. Тады ад навучаньня беларускай мове масава вызвалялі – цяпер гэтага няма. Тады ў расейскамоўных школах беларускую мову вывучалі з трэцяе клясы (9 гадоў), цяпер – зь першае (6 гадоў). Тады на ёй вывучалі толькі два прадметы – мову й літаратуру. Цяпер яшчэ й гісторыю й геаграфію, і толькі сёлета беларускамоўнае выкладаньне гісторыі скасоўваюць, што і выклікала студэнцкі пэрформанс з шыбеніцай і бурную крытыку з боку белмоўных СМІ, у тым ліку дзяржаўных: карэспандэнтка «Звязды» зьедліва запыталася ў чыноўніцы Міністэрства адукацыі, ці не зьбіраюцца перавесьці на расейскую мову таксама выкладаньне беларускай мовы й літаратуры. Цяжка ўявіць сабе нейкую іншую сфэру, дзе б дзяржаўная газэта дапусьціла такую адкрытую крытыку «дзяржаўнага курсу».

Калі лічба беларускамоўнага школьніцтва і беларускамоўнага кантэнту падручнікаў суцяшае, якасьць выклікае больш чым пытаньні.

«Большасьць беларускамоўных школаў працуюць у гуманітарным профілі, гэта паглыбленае вывучэньне моваў, гісторыі, грамадазнаўчых дысцыплінаў», – кажа Алесь Лозка,

старшыня Таварыства беларускай школы, іншай моваабарончай структуры. Міністэрства адукацыі працягвае знаходзіцца ў каляніяльных стэрэатыпах, упэўненае, што па-беларуску няможна якасна вывучаць фізыку, матэматыку ці хімію. «Міністэрства адукацыі любіць казыраць тым фактам, што амаль 62 % школаў у краіне – беларускамоўныя, – працягвае А. Лозка. – Але ня трэба забывацца, што ў асноўным гэта малыя школкі ў вёсках, якія паступова закрываюцца».

Пры гэтым у 2006 годзе 43,9 % (75 тысяч) выпускнікоў выбралі на цэнтралізаваным тэставаньні (уступныя іспыты) ва ўнівэрсытэт экзамэн па беларускай мове, а не па расейскай. Экзамэн (цэнтралізаваны тэст) з гісторыі Беларусі, на якім мову выбірае сам выпускнік-абітурыент, 83,3 % здавалі па-беларуску, а не па-расейску (тут і вышэй – зьвесткі Міністэрства адукацыі). Таварыства беларускай мовы настойвае, каб усе тэсты былі даступныя на абедзьвюх мовах.

ТБМ: ГРАМАДЗКІ ЛАБІСТ

ТБМ ператварылася ў найбольшага лабіста беларускае мовы. Арганізацыя, як паведаміў мне ейны старшыня, гісторык Алег Трусаў, мае 15 000 сяброў, зь якіх 5200 рэгулярна сплачваюць ахвяраваньні на дзейнасьць Таварыства, а 2500 дзейнічаюць як актывісты. Улады, спыніўшы дзейнасьць соцень структураў трэцяга сэктару, дагэтуль не рашыліся пазбавіцца ТБМ.

Палітычны ссыльны Павал Севярынец у сваім артыкуле ў «Нашай Ніве» расказаў, як ён лёгка адрадзіў і актывізаваў суполку Таварыства беларускай мовы ў Малым Сітне, куды яго выслалі на прымусовыя работы. На ягоную думку, «адраджэньня нацыянальных каштоўнасьцяў дасягнуць найпрасьцей, дэмакратычных – складаней, а хрысьціянскіх – найцяжэй».

НАВУКА: ПАГРОМ ГУМАНІТАРЫЯЎ

Сытуацыя ў сфэры адукацыі люстэркава адбіваецца ў

гуманітарнай навуцы, якая таксама залежыць ад дзяржаўнага фінансаваньня і зьяўляецца аб'ектам пільнае ўвагі ўладаў. Фактычна разгромлены Скарынаўскі цэнтар, якому заўдзячваюцца многія навацыі ў гуманітарнай сфэры. Новыя кіраўнікі акадэмічных інстытутаў гісторыі, літаратуры і мовазнаўства, адпаведна Аляксандар Каваленя, Валеры Максімовіч і Аляксандар Лукашанец, распачалі хто рашучую чыстку кадраў, хто ператраску тэматыкі дасьледаваньняў, вяртаючы парадкі, уласьцівыя нават ня брэжнеўскім, а дабрэжнеўскім часам.

Асьпірантка Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту А., што вярнулася да навуковае дзейнасьці летась пасьля шасьцігадовага дэкрэтнага адпачынку, расказала мне, што была шакаваная, калі на першай навуковай канфэрэнцыі, дзе ёй давялося выступаць пасьля вяртаньня, у Віцебскім унівэрсытэце, было ўсяго два даклады па-беларуску, абодва менскіх дасьледчыц, прытым што канфэрэнцыя мела філялягічны характар.

Ідэалягічныя і моўныя крытэры ў ацэнцы навуковых працаў ізноў сталі падмяняць навуковыя. Навуковыя кіраўнікі «ня раяць» абараняць дысэртацыю па-беларуску, калі яна не зь беларускай філялёгіі ці, рызыкоўна, гісторыі. Фактычна, у орган ідэалягічнага кантролю ператварылася Вышэйшая атэстацыйная камісія (ВАК). У выніку адбыўся шэраг скандальных завалаў кандыдацкіх і доктарскіх дысэртацыяў зь яўнымі палітычнымі матывацыямі (напрыклад, доктарскай дысэртацыі Алеся Пашкевіча, дацэнта БДУ і старшыні незалежнага Саюзу беларускіх пісьменьнікаў, доктарскай дысэртацыі супрацоўніка Інстытуту гісторыі Яўгена Анішчанкі, прысьвечанай падзелам Рэчы Паспалітай і ролі Расеі ў гэтых падзелах). Зрэшты, найчасьцей навуковыя працы фільтруюцца яшчэ на этапе падрыхтоўкі.

Такая дзейнасьць кіраўніка ВАКу Анатоля Рубінава была высока адзначана найвышэйшым кіраўніцтвам краіны. Нягледзячы на свой пахілы век, ён з ВАКу ўзышоў на пасаду кіраўніка ўсёй ідэалягічнай вэртыкалі краіны, стаўшы намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. Як расказаў

мне акадэмік Аляксандар Вайтовіч, былы кіраўнік Нацыянальнай акадэміі навук і старшыня верхняй палаты парлямэнту, акадэмік Рубінаў – папросту сталініст у сваіх перакананьнях. Тым дзіўней чытаць, што нават гэты «ястраб» не адмаўляе вартасьцяў заходняй сыстэмы: «Западная сыстэма базуецца на прыватнай уласнасьці ў асноўных зьвёнах эканомікі і характарызуецца дэцэнтралізацыяй улады зь перадачай шмат якіх функцыяў і паўнамоцтваў рэгіянальным дзяржаўным і грамадзкім структурам, выбіраным грамадзтвам. У прынцыпе, гэтая сыстэма даказала сваю працаздольнасьць і эфэктыўнасьць... Аднак заходняя сыстэма будавалася стагодзьдзямі, яна патрабуе пэўных традыцыяў, выхаваньня, мэнталітэту, напрацоўкі шматлікіх грамадзкіх структураў і формаў іхнага ўзаемадзеяньня. То бок гэта ня проста ідэя ці ідэалёгія, гэта пэўны цывілізацыйны ўзровень, які не дасягаецца за адзін дзень ці нават два-тры дзесяцігодзьдзі» (Советская Белоруссия. 2006. 28 июля).

Трэба быць цынікам, каб, прызнаючы гэта, адмаўляць свайму народу ў сталасьці, у ягоным праве прымаць паўнамоцтвы, валодаць прыватнай уласнасьцю ў асноўных зьвёнах эканомікі і душыць тыя самыя «традыцыі» – нацыянальную мову ў тым ліку.

Сама маніякальнасьць, зь якой «ідэалягічнае» ведамства выціскае беларускую мову з навуковых дасьледаваньняў, вымушае задумацца пра ейны магутны вызваленчы патэнцыял.

МОВА КАСЬЦЁЛУ Й ДЫПКОРПУСУ

Беларуская мова выкарыстоўваецца ў шэрагу сфэраў, у якіх у савецкі час яна не функцыянавала, скажам, у палітыцы. Найбольш заўважная заваёва мовы – гэта Каталіцкі Касьцёл. Беларусізацыя за пятнаццаць гадоў распаўсюдзілася на амаль усе парафіі краіны, і гэты працэс, відаць, незваротны.

Цікава, што прынцыпова ўжывае беларускую мову шэраг замежных дыпляматычных прадстаўніцтваў у Менску. Да гэтай моды асабліва спрычыніўся пасол ЗША Джордж Крол, які, у

адрозьненьне ад свайго папярэдніка дый нямецкага, расейскага ды польскага калегаў, якія працавалі ў Менску адначасова зь ім, вывучыў беларускую мову і ў публічных выступах выкарыстоўваў толькі яе, выклікаючы захапленьне СМІ і інтэлігенцыі.

СМІ: СЫХОД У ІНТЭРНЭТ

Найбольшы тыраж сярод беларускамоўных газэтаў па стане на 01.09.2006 мае ведамаснае выданьне «Настаўніцкая газета» (46 000 экзэмпляраў) і афіцыёзная, хоць і лібэральна-патрыятычная «Звязда» (38 000). Трэба адзначыць, што тыраж апошняй паволі зьніжаецца, пачынаючы ад апошняга году беларусізацыі, 1995-га, калі ён дасягаў 207 000, і яна мае мала чытачоў у гарадах.

Паколькі незалежная прэса практычна пазбаўленая магчымасьці распаўюджвацца пасьля забароны ўключаць яе ў падпісныя каталёгі і прадаваць праз кіёскі «Белсаюздруку», тыражы беларускамоўных газэтаў рэзка скараціліся («Рэгіянальная газета» – 6500, «Наша Ніва» – 2700, «Вольнае Глыбокае» – 2900 і г. д.) Затое колькасьць наведнікаў беларускамоўных інтэрнэт-сайтаў на працягу 2006 году няспынна ўзрастала. На верасень 2006 году месячная лічба ўнікальных наведнікаў сайту радыё «Свабода» перавышала 40 000, «Нашай Нівы» – 20 000.

Увядзеньне 75-працэнтавай квоты беларускай музыкі (2002–2004 гады) быццам бы ніяк фармальна не ўмацоўвала пазыцый беларускай мовы ў этэры, бо пад маркай беларускай музыкі пройдуць і жук і жаба, абы яны былі скляпаныя ў Беларусі, але на справе, праз агульную рэпэртуарную беднасьць, гэтая норма дала большы шанец беларускамоўнай песьні.

Самымі адчувальнымі абмежаваньнямі прасторы беларускай мовы за апошнія пяць гадоў сталі перавод навінаў БТ на расейскую і перадачы частотаў беларускамоўнага дзяржаўнага ФМ-радыё «Сталіца» расейскамоўнай станцыі.

Беларуская застаецца галоўнай мовай вяшчаньня Першага і Другога каналаў Беларускага радыё, самых слуханых у краіне,

паводле зьвестак сацыялягічнай службы «Новак». Але яна амаль цалкам зьнікла з тэлебачаньня, дзе на ёй робяцца толькі асобныя праграмы і застаўкі. Ці трэба прыводзіць іншыя прыклады, каб канстатаваць, што беларускае грамадзтва застаецца нямым, бязвольным і падатлівым у дачыненьні да моўнай палітыкі ўладаў? Так, як настойлівая беларусізацыя пачатку 1990-х сутыкнулася толькі з асобнымі неарганізаванымі пратэстамі, пераважна, з асяродзьдзя нядаўна аселеных у Беларусі вайскоўцаў, эвакуяваных з Групы савецкіх войскаў у Германіі, так і агрэсіўная русіфікацыя лукашэнкаўскага пэрыяду выклікала не намнога больш значны супраціў у Менску (пераход Беларускага ліцэю ў падпольле, пэрыядычныя студэнцкія хваляваньні, акцыі моладзі «Хачу вучыцца па-беларуску»), Горадні (справа Агаты Мацко, выключэньне студэнта філфаку Гарадзенскага ўнівэрсытэту Яўгена Скрабутана за графіці «Спыніць русіфікацыю»), Горках (сям'я Каральковых шляхам адкрытых пратэстаў дамаглася спачатку хатняга навучаньня на беларускай мове для сваіх дзяцей, а тады й стварэньня белмоўных клясаў), Жодзіне (такі самы чын сям'і Лапіцкіх). Пратэсты найчасьцей набывалі культурны, а не палітычны характар і былі часткаю агульнага супраціву аўтарытарызму.

Большасьць настаўнікаў, бацькоў і актывістаў аддавалі перавагу не публічным пратэстам, а маўкліваму, паддывановаму адстойваньню беларускамоўнага выкладаньня. Яны, магчыма, справядліва меркавалі, што любы розгалас вядзе да падаўленьня іншадумства магутнай адміністрацыйнай машынай.

РОК-МУЗЫКА: БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ ІДАЛЫ

Процілеглую стратэгію дэманструюць культурныя героі нашага часу – рок-музыкі. Як і некаторыя пісьменьнікі й мастакі, яны не хаваюць сваёй пратэставай грамадзкай пазыцыі. Дэкляравана бунтарскія песьні рок-гуртоў «N.R.M.», «Zet», «Neuro Dubel» (панк-банда, якая ў 2003 годзе, ад часу стварэньня гіту «Я памру тут», заявіла, што пераходзіць выключна на беларускую мову, хоць у 1990-х тварыла

пераважна па-расейску), сталі маніфэстамі маладога пакаленьня. Забарона на трансьляцыю песень двух дзясяткаў рок-гуртоў толькі дадала іхнаму вобразу прыцягальнасьці. Іхныя запісы капіююцца пірацкім спосабам дзясяткамі тысячаў асобнікаў, а Лявон Вольскі здольны ва ўмовах інфармацыйнага вакуўму зьбіраць шматтысячныя пляцоўкі.

Рокеры не сумеўшыся выступілі на Плошчы ў сакавіку-2006. І тыя выступы ўспрымаліся цяплей за выступы палітыкаў.

ПАЛІТЫКА: МОВА ССЫЛЬНЫХ

«А. Мілінкевіч без праблемаў пераходзіў з расейскае мовы на беларускую, у залежнасьці ад мовы, на якой было зададзенае пытаньне», – адзначыў апініятворчы тыднёвік дзелавых колаў «Белорусы и рынок» пасьля першага тэлевыступленьня кандыдатаў. Сапраўды, А. Мілінкевіч быў адзіным сярод прэтэндэнтаў, які ўжываў, і ахвотна, беларускую мову.

У астатнім беларуская мова на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 году была непрысутная – і як мова, на якой бы гаварылі, і тым больш як мова, пра якую б гаварылі.

Ніхто з кандыдатаў, і Мілінкевіч не вынятак, не акцэнтаваў моўнае праблематыкі і не прапанаваў шляхоў зьмены статус-кво. Дэмакратычная кааліцыя, што зьяднала разнародныя сілы і адчайна імкнулася стварыць сабе новы імідж, палічыла за лепшае пакінуць гэтую складаную праблему ўбаку, надаючы больш увагі сацыяльна-эканамічным абяцаньням, што, як лічылася, могуць прывабіць выбарцаў з т. зв. балота, непрыхільных ні да Лукашэнкі, ні да апазыцыі. Шкада, што эфэктыўнасьць такой стратэгіі ня стала аб'ектам сацыялягічнага аналізу пасьля выбараў.

Цікава, што А. Лукашэнка таксама не сказаў па-беларуску ніводнае прамовы за час кампаніі, у адрозьненьне ад 2001 году, калі такія прамовы былі. Мусіць, паліттэхнолягі прэзыдэнта ў 2001-м бачылі магчымасьць дэзарыентаваць нацыянальна-дэмакратычны электарат, ня рады выбару ў якасьці адзінага кандыдата прафсаюзнага боса Ганчарыка, які

ня ўмеў па-беларуску, а ў 2006 годзе ня бачылі шанцу пераўзысьці на нацыянальным полі А. Мілінкевіча.

Плошча ж гучала па-беларуску: беларуская мова была мовай трыбуны мітынгаў, моваю песень і вершаў зь мікрафона «Плошчы Каліноўскага», моваю бальшыні транспарантаў. І моваю сэрцаў многіх з тых 1200 чалавек, што прайшлі праз турмы. Доля тых, хто гаварыў па-беларуску на вуліцы Акрэсьціна, дзе месьціцца знакаміты ізалятар, намнога перавышала долю беларускамоўных на любой іншай вуліцы сталіцы.

ДЗЯРЖАЎНЫ ДЫСКУРС: ФІНАНСАВАЦЬ, КАБ КАНТРАЛЯВАЦЬ

Ва ўрадзе А. Лукашэнкі няма ніводнага беларускамоўнага чалавека. Беларускамоўнаму немагчыма трапіць у афіцэрскі корпус арміі й спэцслужбаў. Але ж у грамадзтве сытуацыя іншая, і беларуская мова як вартасьць нават мацнейшая, чым беларуская мова як сродак камунікацыі. Таму лукашэнкаўскі дыскурс мовы амбівалентны. Ён працягвае і кансэрвуе савецкі стэрэатып, які рабіў зь беларускай мовы нешта дадатковае, часовае, пераходнае, другаснае, непаўнавартае, нясамадастатковае, пераважна сымбалічнае, але, зь іншага боку, старажытнае, карэннае, народнае, фальклёрнае. У выніку за ёй прызнаецца права на існаваньне ў пэўнай грамадзкай і культурнай нішы, але адмаўляецца ў праве прэтэндаваць на паноўнае становішча ў дзяржаве, як беларускай культуры адмаўляецца ў статусе, роўным расейскай.

У выніку дзяржаўныя ўстановы дбаюць пра датрыманьне пэўнае долі культурнае прадукцыі на беларускай мове. Так, у 2006 годзе доля спэктакляў на беларускай мове ў рэпэртуары тэатраў склала 38 % (У. Рылатка, намесьнік міністра культуры, паводле «Інтэрфакс»), доля беларускамоўных кніг у агульным тыражы вагаецца ад 12 да 15 %.

Фінансаваць, каб кантраляваць. Гэты прынцып лукашэнкаўскія ўлады запазычылі з савецкага часу. Дзеля таго прызначаюцца

грошы на літаратурныя часопісы на чале з стаўленікамі КДБ, якія мала хто чытае, грошы на акадэмічныя інстытуты на чале з стаўленікамі КДБ, зь якіх масава звальняюць прызнаных навукоўцаў, грошы на тэатры, якія выдаляюць з свайго рэпэртуару купалаўскіх «Тутэйшых». Сымулякры прафануюць культуру. І гіпэрсымулякр – адыёзная кадыфікацыя самой мовы, пачатая Сталіным у 1933 годзе, захаваньне якой так рупіць цяперашнім аўтарытарным уладам.

Яны хочуць, каб той кантроль быў татальны і над мовай. Апошнім памкненьнем А. Лукашэнкі было распрацаваць «новыя» правілы артаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы з адзінай мэтай – забараніць яшчэ жменю незалежных СМІ і культурных праектаў на той падставе, што яны карыстаюцца «іншым» правапісам. Гэты праект быў пацярпеў паразу ў 1998 і 2003 гадах, але на момант напісаньня гэтага эсэ падаецца пэўным, што з 2006 году на беларускай мове, у адрозьненьне ад расейскай, слова «прэзыдэнт» пачне пісацца зь вялікай літары. Лёгіка разьвіцьця падзеяў мае прывесьці да таго, што яшчэ за пару гадоў за напісаньне слова «прэзыдэнт» з малой літары карэктары і рэдактары будуць плаціць высылкай у аддаленыя раёны краіны.

І вось у такой сытуацыі, тым ня менш, моўныя нацыяналісты працягваюць сустракацца як у апазыцыйнай, так і ў лукашэнкаўскай эліце. Гэтак, прынцыпова па-беларуску публічна размаўляюць рэктар Універсытэту культуры Ядвіга Грыгаровіч і дырэктар Дзяржаўнага эстраднага аркестру Міхаіл Фінберг. Паказальна, што Я. Грыгаровіч была прызначаная сэнатарам у верхнюю палату лукашэнкаўскага парлямэнту ў ягоным другім скліканьні, а М. Фінберг – у трэцім, так, нібыта беларускамоўны ў парлямэнце мусіць быць, але ня больш чым у адзіным экзэмпляры.

У моўным пытаньні, як і ў многіх іншых, што зьвязаныя з нацыянальнай ідэнтычнасьцю, лукашэнкаўцы апынаюцца ў двухсэнсоўным становішчы. З аднаго боку, грамадзкія чаканьні вымушаюць іх іграць ролю будаўнікоў дзяржавы, мудрых і прадбачлівых гаспадароў незалежнае краіны. Непамерныя апэтыты расейскага капіталу выклікаюць у іх непакой і

жаданьне ўмацаваць абарончыя бар'еры, што ахоўваюць ад эканамічнай экспансіі Расеі, і адным з такіх бар'ераў ня можа ня быць нацыянальная ідэнтычнасьць і ўсё зь ёю зьвязанае, у тым ліку й мова. З другога боку, нацыянальныя пачуцьці зь іхнай сілай легітымацыі і ляялізацыі, зь іхнай моцнай ірацыянальнай складовай, палохаюць іх яшчэ мацней. Ня вернасьці нацыі хочацца ім ад грамадзянаў, а вернасьці прэзыдэнту, кіраўніку своеасаблівага холдынгу «фінансава-прамысловая група Рэспубліка Беларусь».

У выніку дзяржаўная палітыка аказваецца перапляценьнем супярэчлівых і часам нават узаемавыключальных захадаў і крокаў, нерашучых забаронаў і фіктыўнай падтрымкі, абяцанак-цацанак або, наадварот, пустых пагрозаў. Ад 2002 году з увядзеньнем т. зв. «дзяржаўнай ідэалёгіі» і стварэньнем «ідэалягічнай вэртыкалі», цесна пераплеценай з спэцслужбамі, улады зрабілі настойлівую спробу аднавіць усёахопную сыстэму індактрынацыі грамадзянаў і кантролю над імі, што існавала ў Савецкім Саюзе і пранізвала ўсё грамадзтва зьверху данізу. Аднак гэтыя памкненьні натыкаюцца на даволі глухую рэакцыю грамадзтва. «Ідэалягічныя ўстаноўкі» ўсмоктваюцца і прыжываюцца ў сілавых структурах, дух якіх мала зьмяніўся ад савецкага часу, але не ў прыватным бізнэсе, якому мала залежыць на захаваньні па-лукашэнкаўску зразуметай стабільнасьці. Вытворчыя адносіны і адносіны ўласнасьці такі зьмяніліся за апошнія 15 гадоў, і разам зь імі не магла не зьмяніцца масавая сьвядомасьць.

РЭКЛЯМА: ІДЭАЛ ПРЫГАЖОСЬЦІ

Менавіта стэрэатыпы масавай сьвядомасьці эксплюатуе рэкляма. Вось што мы маем у гэтай сфэры з мовай: беларускай мовай у сваёй рэкляме пасьлядоўна карыстаюцца некаторыя вытворцы, прычым, што адрозьнівае 2000-я ад пачатку 1990-х, яе ўжываюць ня толькі беларускія кампаніі, але і беларускія дылеры шэрагу сусьветных брэндаў: *Samsung* («Уяві ідэал прыгажосьці»), *Renault* («Для тых, хто заўсёды перамагае»), *Gallina Blanca, Pepsi*, польская *Śnieżka* ды іншыя. Паказальная тэндэнцыя: нават расейская кампанія МТС выбрала сабе

беларускамоўны слоган «Прышпільны – мабільны».

Выкарыстаньне беларускай мовы для рэклямы тавараў, прызначаных для спажыўца з даходам, вышэйшым за сярэдні, і для моладзі найлепш ілюструе, як зьмяніўся імідж яе ў грамадзтве.

Ці ня гэтым тлумачыцца, што на 12-м годзе кіраваньня А. Лукашэнкі, які на самым пачатку свайго прэзыдэнцтва даў недвухсэнсоўную дырэктыву апарату сваёй заявай, што «на беларускай мове немагчыма выказаць нічога сапраўды вялікага. Гэта бедная мова. У сьвеце ёсьць толькі дзьве багатыя мовы – гэта ангельская і расейская», у 2006 годзе ў Менску 2,4 % школьнікаў упарта вучацца па-беларуску, тады як у 1988 годзе па-беларуску ў сталіцы намінальна беларускай дзяржавы не навучаўся ні адзін чалавек. І падпольны Беларускі ліцэй, і чыста лукашысцкая 23-я гімназія застаюцца прэстыжнымі сярод сталічнай эліты і налічваюць між сваіх навучэнцаў і выпускнікоў нямала дзяцей высокіх урадоўцаў, буйных бізнэсоўцаў і зь сем'яў артыстычнай эліты.

Беларуская мова – больш не вясковая мова, ня мова калгасу і правадняга радыё. Гэта мова моладзі, багемы, інтэлігенцыі, пратэсту, празаходняй арыентацыі, нонканфармізму, панку, выкліку. Яна застаецца мінарытарнай у жыцьці сярэдняга беларуса, яна працягвае абуджаць моцныя палітычныя пачуцьці.

Любыя параўнаньні кульгаюць, калі гаворка ідзе пра Беларусь, бо гэтая краіна знаходзіцца ў іншым гістарычным часе, у параўнаньні з сваімі блізкімі і далёкімі суседзямі. Беларускі нацыяналізм нарадзіўся позна, у 80–90-я гады XIX стагодзьдзя, пад скіпэтрам адсталае Расейскае імпэрыі. Грамадзянская супольнасьць Беларусі стала аб'ектам увагі і салідарнасьці сьвету толькі ў канцы 1990-х гадоў. Таму якія прагнозы?

КАТАЛЁНСКАЯ, УКРАІНСКАЯ ЦІ ІРЛЯНДЗКАЯ?

На пачатку 1990-х многія расейскамоўныя інтэлектуалы ўрочылі беларускай мове долю гэльскай. Маўляў, як і

ірляндзкі, беларускі нацыяналізм будзе карыстацца мовай калянізатараў, а беларуская зьмярцьвее.

Беларускія нацыяналісты, з свайго боку, спадзяваліся на ажыцьцяўленьне ўкраінскага варыянту. Г. зн. актыўнае вяртаньне мовы ва ўжытак, меры падтрымкі на карысьць яе, пазытыўная дыскрымінацыя расейскае мовы, якія прывялі да таго, што 80 % школьнікаў ва Ўкраіне вучацца па-ўкраінску, украінская сталася мовай уплывовых СМІ й палітыкі. Гэтаму не судзілася збыцца, і сымбалічна роўна за месяц да Аранжавай, нацыянальнай рэвалюцыі над Дняпром А. Лукашэнка ў атмасфэры змрочнай прапаганды заручаецца на рэфэрэндуме правам балятавацца ў прэзыдэнты пажыцьцёва.

Аднак беларускім можа аказацца трэці шлях – каталёнскі. Працэнт жыхароў, якія актыўна карыстаюцца і пасіўна валодаюць каталёнскай, расьце ўвесь час пасьля падзеньня дыктатуры Франка. Дэмакратыя дала каталёнскай культуры магчымасьці свабоднага разьвіцьця, а рост узроўню сярэдняй і вышэйшай адукацыі стварыў інструмэнты для лепшага авалодваньня каталёнскай тымі, *якія б хацелі на ёй размаўляць*.

Пад лёдам плыні не відно. Толькі пасьля падзеньня дыктатуры можна будзе ацаніць, наколькі ўмацавалася ці наадварот аслабела беларуская нацыянальная сьвядомасьць за часоў Лукашэнкі. Толькі наступныя свабодныя выбары пакажуць, які ўплыў у грамадзтве маюць палітычныя сілы, што выступаюць за дзяржаўнасьць адзіна беларускай мовы і ідуць з праграмай ейнага адраджэньня.

Ясна адно: пакуль мова ёсьць моваю сэрца, яна мае шанцы стаць таксама моваю розумаў. Пакуль беларуская мова ёсьць моваю Плошчы, яна ня траціць шанцу аднойчы стаць таксама мовай вуліцаў. Беларускія інтэлектуалы пэрыядычна выказваюць занепакоенасьць палітызацыяй мовы, ператварэньнем яе ў сьцяг пэўнай палітычнай сілы. Тым ня менш, можна канстатаваць, што пакуль беларуская мова ўспрымаецца як мова пратэсту, мова руху за нацыянальнае вызваленьне, яна здольная прыцягваць моладзь, і ў гэтым сэнсе становішча беларускай мовы сёньня нашмат больш выгоднае, чым у позьнесавецкі час. Маніякальныя намаганьні ўлады

блякаваць камунікацыю між беларускамоўнай інтэлігенцыяй і грамадзтвам, выкараненьне асяродкаў беларускамоўнай асьветы і друку даказваюць, што аўтарытарная ўлада бачыць у беларускай мове інструмэнт палітызацыі, ператварэньня людзей у актыўных грамадзянаў. Яна не памыляецца. Сярод рэгіёнаў найменшы працэнт школьнікаў займаецца па-беларуску на Гомельшчыне – толькі 17 % вучняў. І менавіта ў гэтай вобласьці А. Лукашэнка на выбарах стабільна набірае найбольшы працэнт галасоў.

Лёс беларускай мовы й культуры неразрыўна зьвязаны зь лёсам дэмакратыі і грамадзянскай супольнасьці.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/10/08**
[image]

Слоўнік, зроблены на энтузіязьме

Гутарка з рэдактарам «Ангельска-беларускага слоўніка» Валентыны Пашкевіч

Сяргеем Шупам

– Сяргей, нарэшце мы можам узяць у рукі «Ангельска-беларускі слоўнік» Валентыны Пашкевіч пад Вашай рэдакцыяй. Як бы Вы ацанілі значнасьць гэтай падзеі? Што, уласна кажучы, адбылося?

— Па-першае, чаму імя аўтаркі Валентына, а не Валянціна. Можа, на нашае вуха гучыць крыху нязвыкла, але гэта была яе сьвядомая спроба дыстанцыявацца ад расейскага варыянту. Гэтае імя мы мусім успрымаць як любое іншае заходняе ўласнае імя, скажам, Клемэнтына, Рабэртына, Палестына.

А што да значнасьці слоўніка, то, шчыра сказаўшы, мне яшчэ цяжка ацаніць маштаб падзеі. Патрэбная хоць мінімальная дыстанцыя, каб зразумець, што адбылося. Безумоўна, прафэсіяналы, перакладчыкі і студэнты — усе могуць свабодна карыстацца ангельска-расейскімі слоўнікамі. Калі вам трэба было даведацца значэньне ангельскага слова, то вялікай

праблемы не існавала. Але бяда была ў тым, што абміналася, проста выключалася з гэтага ланцугу беларуская мова. Калі нехта перакладаў з ангельскай на беларускую, ён мусіў або рабіць падвойны пераклад праз ангельска-расейскія слоўнікі, або, карыстаючыся ангельскімі тлумачальнымі слоўнікамі, прыдумляць, як перадаць слова па-беларуску. А ў нашым слоўніку гэтая дадатковая задача вырашаная — адразу даюцца беларускія адпаведнікі. Калі параўноўваць з аналягічнымі расейскімі слоўнікамі, розьніца ў тым, што ў нас значна багацейшая сынанімія «правай часткі». Гэта слоўнік не нарматыўны, а хутчэй дэскрыптыўны, то бок ён фіксуе ўсё, што «гуляе» сёньня ў нашых вусных і пісьмовых тэкстах. Там ёсьць словы больш-менш «афіцыйныя», з афіцыйных беларускіх слоўнікаў, і ёсьць словы, якія не фіксуюцца ў афіцыйных словазборах, а ўжываюцца ў нейкіх нефармальных колах. Мы ня ставілі заслоны ніводнаму з гэтых пластоў — усе яны прысутнічаюць. Наш слоўнік — спроба разгарнуць, наколькі магчыма, усё багацьце беларускай лексыкі. Але, на жаль, напоўніцу гэтага не ўдалося.

— Як рабіўся слоўнік? Калі пачалася праца? Як яна арганізоўвалася? Як фармаваўся рэестар? Як разьмяркоўваліся абавязкі ў аўтарскім калектыве?

— Праца пачалася даўно. Яна вялася настолькі доўга, што пра большую частку гэтай гісторыі я ведаю ўжо толькі са словаў тых, хто працаваў на ранейшых стадыях. Недзе ў 1970-я гады Валентына Пашкевіч — беларускі пэдагог, якая атрымала філялягічную адукацыю ў Віленскім унівэрсытэце яшчэ ў канцы трыццатых гадоў, а пазьней выкладала беларускую мову ў беларускіх нядзельных школках у Канадзе, — атрымала грант ад канадыйскага ўраду на падрыхтоўку падручніка *Fundamental Byelorussian*. Ягоныя два тамы выйшлі ў 1974 і 1978 гадах. Гэты падручнік прызначаўся найперш для дзяцей эмігрантаў, якім беларуская мова не была ўжо родная, каб яны маглі яе крыху падвучыць, а таксама для ангельскамоўных пачаткоўцаў. У кожным томе ў канцы быў досыць прыстойны ангельска-беларускі і беларуска-ангельскі слоўнік. Гэта быў пачатак. Да працы вельмі актыўна прычыніўся Антон Адамовіч, і, магчыма, на тым этапе ўзьнікла думка стварыць больш сур’ёзны

ангельска-беларускі слоўнік. Валентына Пашкевіч пачала зьбіраць карткі. Праблема была ў тым, што праца рабілася на энтузіязьме, магчыма, аўтарка ня мела дастатковай лексыкаграфічнай падрыхтоўкі, хоць яна, бясспрэчна, была выдатным філёлягам. Але праца лексыкографа патрабуе пэўных адмысловых навыкаў і ведаў пра тэхналёгію складаньня слоўнікаў. Таму напачатку засталіся нявызначанымі ні крытэры адбору словаў, ні задачы слоўніка — ён ствараўся як мастацкі твор. За аснову сп-ня Пашкевіч узяла нейкі перакладны слоўнік — магчыма, Мюлера — і зьбеларусіла яго правую частку, беручы пад увагу ўсе магчымыя беларуска-расейскія адрозьненьні. Пасьля ёй падалося, што гэтага недастаткова. Тады яна ўзяла ангельскі тлумачальны слоўнік, выдадзены ў Канадзе, і стала трошкі перарабляць свае карткі — да эквівалентаў у правую частку пачалі дадавацца тлумачэньні словаў, фактычна дублюючы іх пераклад. Вельмі часта гэта было залішне. Але сам працэс ёй страшэнна падабаўся, яна працавала як энтузіяст, як мастак, што піша карціну. Пра тэрміны выданьня тады, на пачатку 1980-х, яшчэ ня думалася, і таму не адчувалася такой патрэбы ў лексыкаграфічнай дысцыплінаванасьці. Але паступова рэестар набіраўся, і калі колькасьць картак дайшла да плянаванага памеру, Валентына Пашкевіч зьвярнулася ў Беларускі інстытут навукі й мастацтва, і да працы над слоўнікам далучыліся іншыя супрацоўнікі — гэткія ж энтузіясты, інтэлектуальнае ядро нашай эміграцыі: Вітаўт і Зора Кіпелі, Ян Запруднік, іншыя… Урэшце ў склад рэдакцыйнай камісіі ўвайшло каля дзесяці чалавек. Юрка Станкевіч зрабіў кампутарны набор. І калі сябры камісіі атрымалі тэкст не на картках, а на звычайных старонках, яны пабачылі, што там няма еднасьці ў падыходзе, ніякія крытэры ня вытрыманыя… Карацей кажучы, слоўнік атрымліваўся вельмі прыгожы, вельмі цікавы, але не зусім звыклы. Ім цяжкавата было б карыстацца. І камісія вырашыла, што з гэтым матэрыялам трэба працаваць далей. Усе яны мелі вышэйшую адукацыю, на той час па трыццаць-сорак гадоў пражылі ў Амэрыцы і выдатна ведалі як ангельскую мову, гэтак і беларускую — гэтае пакаленьне яшчэ захавала родную мову. Абапіраючыся на свой досьвед — прыватны, грамадзкі, прафэсійны, — яны пачалі перапрацоўваць слоўнік, разьмеркаваўшы літары — кожнаму па некалькі. Натуральна,

наступны прамежкавы прадукт выйшаў ня менш творчы і фантазійны. Ён таксама зьзяў усімі колерамі вясёлкі, і на кожнай літары адбілася і асоба аўтара, і ягоны погляд на лексыкаграфію. У складзе рэдакцыйнай камісіі былі прафэсійныя філёлягі, фізыкі, хімікі, але не было лексыкографаў. Таму па заканчэньні гэтага этапу стала зразумела, што слоўнік яшчэ далёкі ад ідэалу і выдаваць яго пакуль зарана. Тады нашыя дарогі неяк перакрыжаваліся. Мы даўно супрацоўнічалі зь Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў розных іншых праектах. Яны ведалі, што слоўнікі — гэта маё жыцьцёвае захапленьне, мая справа — больш, чым усе іншыя, якімі я калі займаўся. Калі я быў асьпірантам у Інстытуце мовазнаўства, лексыкаграфія была тэмай маёй дысэртацыі. Праўда, я не абараніўся, але прайшоў увесь курс, здаў усе іспыты і стаў такім хоць і «недапечаным», але ўсё ж лексыкографам. І таму рэдакцыйная рада слоўніка ў 1997 годзе вырашыла, што ёсьць сэнс да мяне зьвярнуцца, тым болей, што я амаль усё сваё прафэсійнае жыцьцё працаваў рэдактарам. Я, вядома, палічыў за вялікі гонар узяцца за рэдагаваньне слоўніка. Але, на жаль, я ніколі ня мог займацца ім як асноўнай працай. Усё даводзілася рабіць у дадатак да асноўнай працы. А зь ёю ўвесь час узьнікалі нейкія пытаньні, даводзілася пераяжджаць у Прагу, з Прагі — у Вільню, зь Вільні — у Прагу, паўсюль вырашаць праблемы, зарабляць на хлеб і гэтак далей… Слоўнік заставаўся прыярытэтам нумар два. Але праца рухалася. Давялося перагледзець кожную літару. Умяшаньні рабіліся ледзь ня ў кожным слоўнікавым артыкуле. Наўздагон мы паспрабавалі вызначыць пэўныя прынцыпы і крытэры, пра якія трэба было дамаўляцца яшчэ да пачатку працы над слоўнікам. Трэба было яе прафэсіяналізаваць і надаць сыстэмнасьці. Адна зь першых прапановаў была перайсьці на міжнародную фанэтычную транскрыпцыю, якую ў нас вучаць у кожнай школе. Патрабавалася вельмі вялікая праца і каб выверыць беларускую частку. У папярэднім варыянце было шмат русізмаў, якія людзі, што жывуць на эміграцыі, не адчуваюць як русізмы: трапляліся словы, не зафіксаваныя ні ў водным савецкім слоўніку. Былі там і занадта радыкальныя «эмігрызмы», якія ня ўсім былі б зразумелыя і ня ўсімі б належным чынам успрымаліся. Але некаторыя з гэтых «экзатызмаў» мы ўсё ж пакінулі, каб перадаць пэўны калярыт, з

увагі на тое, што слоўнік у нечым аўтарскі.

— Што для Вас як для рэдактара было самым складаным у працы над слоўнікам?

— Велізарны аб'ём працы, не заўсёды цікавай, не заўсёды радаснай і захапляльнай, а нуднай і карпатлівай.

— Выдатныя бакі «Ангельска-беларускага слоўніка» Валентыны Пашкевіч відавочныя: гэта і вельмі добрая паліграфія, і значна большы за папярэднія аналягічныя слоўнікі аб'ём, і досыць падрабязна расьпісаная сэмантычная структура кожнай лексычнай адзінкі, багата пададзеная фразэалёгія і разнастайныя прыклады словаўжываньня… Але калі б Вы мелі магчымасьць удасканаліць слоўнік, што б Вы дадалі?

— Дасканаліць яго можна было б бясконца. Кожны раз усплывалі ўсё новыя праблемы, якія я прапаноўваў разьвязаць іначай. І папросту на нейкім этапе мы вырашылі, што да ідэалу мы можам ісьці вечна, але нам трэба ў нейкі момант спыніцца і сказаць сабе: «Мы дайшлі да пэўнай рысы. Цяпер ёсьць сэнс выдаць слоўнік, а дасканаленьне працягваць потым». З чаго б я пачаў? Праблема нумар адзін — пэўная несыстэмнасьць у выбары словаў, бо рэестар фармаваўся выпадкова. Да таго ж гэта было даўно — там ня ўлічаныя вельмі шмат новых словаў. Я б узяў за аснову тлумачальны слоўнік прыкладна такога самага памеру і выверыў бы паводле яго ангельскую частку. Апроч таго, у слоўніку засталіся прыклады, якія часьцяком нічога новага не тлумачаць, ілюструюць, напрыклад, не фразэалёгію, а нейкія абсалютна трывіяльныя рэчы.

— Але для нас прыклады словаўжываньня, узятыя з жывой мовы, — гэта вельмі важна. Мне здаецца, такое багацьце прыкладаў — адзін з найвыдатнейшых бакоў слоўніка.

— Я не падзяляю гэтай думкі, бо ў прыкладах рэалізуюцца тыя самыя значэньні, што падаюцца ў самім слоўнікавым артыкуле, безь ніякіх нюансаў. Дык вось, я б узяў за аснову *Oxford Dictionary of Current English*. Ён мае каля шасьцідзесяці тысячаў словаў, і ён вельмі новы — рэгулярна аднаўляецца і

перавыдаецца. Там вельмі добры рэестар, вельмі прафэсійна расьпісаныя значэньні. (Яшчэ адна праблема ў нашым слоўніку — частая блытаніна паміж аманімічнымі словамі і рознымі значэньнямі таго самага слова: амонімы, якія трэба разьвесьці па розных слоўнікавых артыкулах, трапляюць у адзін, і наадварот.) Напэўна, ня мае сэнсу ў кожным выпадку спрабаваць знайсьці нейкае сваё рашэньне, калі можна абаперціся на добры ангельскі слоўнік — узяць яго за аснову і проста стварыць перакладную частку. Дарэчы, яшчэ адзін слоўнік, які мне вельмі падабаецца — *Cambridge International Dictionary of English*. Там выдатна расьпісаная фразэалёгія, надзвычай падрабязна разгорнутыя трывалыя выразы тыпу *as soon as* і г. д., а кожны прыклад — вельмі дарэчны. Адтуль можна перакладаць усе прыклады. Ён дае адказы на пытаньні, якія іншыя слоўнікі абмінаюць — па спалучальнасьці словаў і г. д. Да таго ж ён падае ўсе варыянты — амэрыканскі, брытанскі, а часам і аўстралійскі. Нам таксама можна было б не абмяжоўвацца толькі амэрыканскім варыянтам, а даваць брытанскі і амэрыканскі паралельна. Я б узяў за аснову гэтыя два слоўнікі і яшчэ раз вельмі ўважліва перагледзеў беларускую частку. Нам ужо рабілі закіды, што ангельскае слова і яго пераклад могуць разыходзіцца ў стылістыцы: *appropriation* перададзенае зусім нефармальным «прысабечваньне».

— Дарэчы, пра «амэрыканскасьць». У прадмове гаворыцца: «У адрозьненьне ад звыклай для беларускага карыстальніка расейскай слоўнікавай традыцыі, у ангельскай частцы слоўніка ўжыты не брытанскі, а амэрыканскі варыянт ангельскай мовы як больш пашыраны ў сьвеце». Даруйце, але акадэмічныя расейскія слоўнікі (Гальперын, Мюлер, Апрэсян, Аракін) падавалі і падаюць як брытанскі, гэтак і амэрыканскі варыянты. Да таго ж мне здаецца, што браць за аснову амэрыканскі варыянт «як больш пашыраны» — тое ж самае, што выдаваць у Беларусі кнігі на расейскай мове, бо яна «больш пашыраная». Грунтоўны слоўнік мусіць адлюстроўваць усе варыянты мовы. Дарэчы, заяўленая «амэрыканскасьць» сыстэмна ня вытрыманая: напрыклад, *color/colour* падаецца і ў амэрыканскім, і ў брытанскім

правапісе, але толькі ў амэрыканскім вымаўленьні; *monolog/monologue* — у двух варыянтах правапісу, а аналягічныя *dialog, analog* — толькі па-амэрыканску. Відавочная «разбэрсанасьць» зь дзеясловамі на *-ize/-ise*: часам даецца і брытанскі, і амэрыканскі варыянт, часам — толькі амэрыканскі (з таго, што кінулася ў вочы: *vocalise* і *vocalize* пададзеныя як дзьве адзінкі з адрознымі значэньнямі). *Pants* прыводзіцца і ў амэрыканскім, і ў брытанскім значэньнях, але не тлумачыцца, дзе — якое.

— Не-не, тут некалькі пытаньняў. Што да сыстэмнасьці, то, па-мойму, амэрыканскасьць, калі не лічыць статыстычнага працэнту хібнасьці, акурат вытрыманая.

— Але часам падаецца і амэрыканскі, і брытанскі правапіс, аднак толькі амэрыканскае вымаўленьне.

— Дык а чым тут парушаецца амэрыканацэнтрызм? Тым, што паралельна часам падаюцца брытанскія формы?

— Часам падаюцца, а часам — не.

— Дык гэта акурат таму, што слоўнік — амэрыканскі. Якраз амэрыканскасьць вытрыманая, калі не лічыць нейкіх відавочных памылак.

— Побач з брытанскім напісаньнем *tyre* падаецца амэрыканская транскрыпцыя — мне гэта неяк дзіўна.

— Гэта ня сьведчыць пра несыстэмнасьць у амэрыканацэнтрызьме. Вымаўленьне ў нашым слоўніку — толькі амэрыканскае. Няма брытанскіх значэньняў, дзе не пазначалася б, што яны — брытанскія.

— Ёсьць! Тыя ж самыя *pants*!

— Ну, гэтыя *pants* у перавыданьні паправім. Але гэта ня самае важнае. Наконт пытаньня, чаму абраны менавіта амэрыканскі варыянт. У беларускай сытуацыі пытаньне выбару паміж расейскай і беларускай мовамі — і палітычнае, і эмацыйнае. Яно вельмі балючае. У выбары амэрыканскага варыянту няма

ніякай палітыкі — у сьвеце на традыцыйнае клясычнае брытанскае вымаўленьне даўно ніхто не зважае. Я думаю, што ў людзей, якія спантанна гавораць па-ангельску, ня будзе ні чыста брытанскага, ні чыста амэрыканскага варыянту, а будзе нейкая «міжнародная ангельская» мова. Таму выбар рабіўся абсалютна адвольна. Мы наўрад ці абразім нечыя пачуцьці, калі спынімся на тым, а ня гэтым варыянце.

— Карыстальніку патрэбныя абодва!

— Гэта іншая справа. Але тут можна спаслацца на тое, што слоўнік рабілі людзі, якія жывуць у Амэрыцы. Для іх брытанскі варыянт — далёкі.

— На старонцы 175 мяне ўразіў прыклад: *They called him George*. а. Яго назвалі Юркам. б. Яго звалі Юркам. А на старонцы 914 — *John is a fine type of schoolboy*. Янка — прыкладны вучань. (Пакінем убаку тое, што ён насамрэч ня «прыкладны», а «ўзорны».) Здаецца, увесь цывілізаваны сьвет даўно адмовіўся ад таго, каб «падганяць» іншаземныя ўласныя імёны (за выключэньнем хіба што імёнаў каранаваных асобаў, сьвятых і папаў рымскіх) пад свае моўныя сыстэмы. Чаму беларусы, якія больш за каго іншага нацярпеліся ад перакручваньня сваіх імёнаў то на польскі, то на расейскі капыл, робяць тое ж самае з ангельскімі імёнамі?

— Я цудоўна разумею ўсе пачуцьці, якія гэта можа выклікаць. Мы пакінулі гэтыя прыклады, з аднаго боку, амаль што жартам. А з другога, гэта рэаліі таго кола, якое прычынілася да ўкладаньня слоўніка. Так сябе называюць іхныя дзеці. Скажам, *George Kipel* па-амэрыканску — Юрка Кіпель па-беларуску. Гэта абсалютна адпавядае таму духу, што сярод іх існуе. Пакаленьне дзяцей эмігрантаў усе свае беларускія імёны перакладае на ангельскую: Алеся — *Alice* і г. д. Вядома, гэта не падстава замацоўваць падобную практыку праз слоўнік, але падобныя прыклады мы пакінулі зь лёгкай усьмешкай.

— Мяркуючы з таго, што не прыводзяцца «інтэрнэтна-кампутарныя» значэньні, прыкладам, словаў *browse, paste, domain, surf*, уласна лексыкаграфічная праца завершылася

досыць даўно. Колькі часу прайшло ад таго, як быў падрыхтаваны тэкст, да выданьня?

— Рэестар быў гатовы да пачатку 1990-х гадоў. На пазьнейшых стадыях сёе-тое дадавалася, але бяз пэўнай сыстэмы. Як я ўжо казаў, абнаўленьне рэестру будзе першым пунктам у працягу працы.

— Слоўнік адрасаваны ў тым ліку і перакладчыкам. Даруйце, але зь яго дапамогай мы не перакладзем ня тое што Чака Палагнюка ці *Brokeback Mountain*, але і моўна зусім цнатлівую «Красуню» ды «Чатыры вясельлі і хаўтуры». У слоўніку ў «найлепшых» савецкіх традыцыях не адлюстраваная табуяваная лексыка, вельмі рэдка прыводзяцца эўфэмістычныя значэньні — у сьпісе скаротаў нават няма тэрміну «эўфэмізм». Чаму Вы пайшлі на гэткія «рэпрэсіі»? Грунтоўны слоўнік мусіць жа падаваць усе пласты лексыкі — для лінгвіста, як для доктара, няма словаў «добрых» і «кепскіх».

— Я цалкам згодны, што бяз гэтага пласту слоўнікі няпоўныя. Я асабіста, калі выбіраю слоўнікі, адразу гляджу табуяваную лексыку, і калі яе няма, я слоўнік адкладаю — значыць, ён недастаткова поўны. У нашым выпадку было сьвядомае рашэньне аўтараў — і аўтаркі, і рэдкалегіі — табуяваную лексыку ня браць. Яны належаць да таго пакаленьня, для якога пабачыць нецэнзурнае слова ў друкаваным тэксьце — штосьці жахлівае. Яны не маглі нічога падобнага і блізка сабе ўявіць. Пэўна, калі б я сам вырашаў, у слоўніку было б усё. Зрэшты, параўнальна невялікі аб'ём таксама накладае свае абмежаваньні, але ў слоўніках, на якія я абапіраўся б, гэты пласт лексыкі прысутнічае. Тым больш тут паўстаюць і вельмі цікавыя задачы для беларускай мовы: як перадаць тую ці іншую адзінку, якія адшукаць эквіваленты?

— На Вашую думку, ці зручны слоўнік для карыстальніка?

— Я ня ведаю, як ацэньваецца зручнасьць. Тым, наколькі лёгка знайсьці слова? У гэтым сэнсе наш слоўнік не адрозьніваецца ад іншых.

— Ну, мне, як мінімум, хацелася б бачыць перакрыжаваныя спасылкі. Да таго ж у адным слоўнікавым артыкуле спачатку падаюцца значэньні слова як, напрыклад, назоўніка, дзеяслова і прыметніка, потым — устойлівыя выразы і ідыёмы да ўсяго адразу. Фразавыя дзеясловы не вылучаюцца з агульнага сьпісу ідыёмаў.

— Гэтыя дэталі таксама хацелася б зьмяніць, але, як я ўжо казаў, мы адчувалі, што трэба падвесьці нейкую рысу і выдаць слоўнік. Калі б за аснову браўся добры ангельскі слоўнік, дзе ўся гэтая праца ўжо зробленая, нам не давялося б вынаходзіць ровар. А ў нас няма сыстэмнасьці ў тым, якая часьціна мовы падаецца першай — назоўнік, дзеяслоў ці што іншае. Можа, мы ставілі на першае месца больш пашыранае паводле частотнасьці. Але тут застаецца вялікая прастора для суб'ектывізму.

— Правяраць частотнасьць трэба паводле вялікіх корпусаў, да якіх мы, на жаль, ня маем доступу.

— І гэта вялікая праца…

— Сяргей, мае былыя каляжанкі па Менскім дзяржаўным лінгвістычным унівэрсытэце сказалі, што гэтая навучальная ўстанова, мабыць, прыдбае некалькі асобнікаў дзеля навуковых мэтаў, але ня будзе замаўляць яго для студэнтаў, бо ў слоўніку выкарыстаны клясычны правапіс.

— Па-першае, клясычны правапіс ужыты з тае самае прычыны, што і амэрыканскі варыянт: слоўнік складалі людзі, якія гэтым правапісам карыстаюцца. А па-другое, я сабе не ўяўляю чалавека, які, валодаючы беларускай мовай, разгарнуў бы гэты слоўнік і не зразумеў, што такое, напрыклад, «парлямэнт», і ня ведаў, як гэта перадаць афіцыйным правапісам. Немагчыма ўявіць, каб мяккі знак перашкодзіў каму-небудзь зразумець, што такое «сьнег» — гэта проста сьмешна.

— Урэшце два варыянты правапісу — гэта нашая рэчаіснасьць, якую не абмінеш, як нельга праігнараваць брытанскі або амэрыканскі варыянт ангельскай мовы.

— Калі нехта прымае рашэньне, што карыстацца слоўнікам нельга, бо ён зроблены «ня тым» правапісам — гэта спроба палітызаваць пытаньне. Клясычны правапіс — гэта тая самая беларуская мова. І трансфармацыя з адной правапіснай сыстэмы ў другую ідзе чыста аўтаматычна. Я сам працаваў з абодвума правапісамі, я быў рэдактарам у дзяржаўным выдавецтве «Мастацкая літаратура» напрыканцы 1980-х, і мы ў рамках афіцыйнага правапісу ўжывалі дакладна тую самую мову, што ўжываецца ў клясычным правапісе — гэта абсалютна не залежыць ад мяккіх знакаў, мяккага *л* і г. д.

— Безумоўна, «Ангельска-беларускі слоўнік» Валентыны Пашкевіч — велізарны крок наперад у беларускай лексыкаграфіі. Але вельмі хацелася б верыць, што на гэтым праца ня спыніцца. Ну мусім жа мы мець вялікі акадэмічны дзьвюхмоўны слоўнік, які паводле ўсіх крытэраў не саступаў бы найлепшым тлумачальным ангельскім! Што дзеля гэтага трэба?

— Мне цяжка адназначна адказаць. Натуральна, патрэбная зацікаўленасьць дзяржавы, патрэбнае фінансаваньне, патрэбная група прафэсіяналаў і адначасна энтузіястаў, якія не фармальна, а з захапленьнем будуць займацца слоўнікам як асноўнай працай і яшчэ атрымліваць за гэта грошы. Зразумела, гэтая каманда мусіць ні на крок не адставаць ад усіх найноўшых дасягненьняў сусьветнае лексыкаграфіі, праца мусіць засноўвацца на корпуснай лінгвістыцы. У нас справа неяк робіцца, аднак зноў жа, больш за кошт энтузіязму. Зрэшты, у нас вельмі шмат праектаў, і часам вельмі добрых, робіцца на энтузіязьме. Таму можна спадзявацца, што і гэтак мы зробім можа й не ідэальны, але вельмі добры і грунтоўны слоўнік. Вядома, гэта зойме больш часу, але галоўнае — імпэт, энтузіязм і жаданьне рабіць справу. Ня варта чакаць ідэальнай сытуацыі, калі будзе і фінансаваньне, і адпаведная структура — можна рабіць тое, што ўдаецца рабіць цяпер.

Гутарыла перакладчыца Вольга Калацкая
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум

№ 10 (50) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/10/08**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 10 (50) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

10[image]-[image]2006

крыныка "Зьместу"

крыныка • аналітыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

Аўген Усошын Зьнішчэньне і ўваскрасеньне беларускага Касьцёлу

АЎГЕН УСОШЫН магістар тэалёгіі. Скончыў гістарычны факультэт БДУ і Івана-Франкоўскую тэалягічную акадэмію. Абараніў магістарскую дысэртацыю, прысьвечаную гісторыі Царквы, на папскім тэалягічным факультэце ў Варшаве.

Ярмусик Э.С. *Католический Костел в Беларуси в 1945–1990 годах*. Гродно: ГрГУ, 2006. – 568 с.

Упершыню за постсавецкі час зьявілася манаграфія, якая прэтэндуе на поўнае дасьледаваньне становішча Каталіцкага Касьцёлу і жыцьця каталікоў *за савецкім часам*. Папярэднія працы тычыліся толькі адзінкавых фактаў або фэномэнаў існаваньня Касьцёлу ў БССР. Трэба падкрэсьліць, што раней аўтар ужо выдаў манаграфію, прысьвечаную лёсу Каталіцкага Касьцёлу падчас Другое сусьветнае вайны, таму разгляданую кнігу выпадае лічыць працягам вывучэньня гісторыі Касьцёлу на тэрыторыі Беларусі.

Манаграфія напісаная на аснове шматлікіх крыніцаў, у пералік якіх, поруч з дакумэнтамі беларускага Камітэту дзяржбясьпекі, Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіву Менскае вобласьці, трапілі дакумэнты дзяржбясьпекі Літоўскае ССР, польскага Міністэрства рэлігійных вызнаньняў і грамадзкай апекі, польскіх вайсковых архіваў і дакумэнты Арміі Краёвай. Шэраг апублікаваных крыніцаў таксама ўражвае: ухвалы Памеснага сабору Расейскай Праваслаўнай Царквы 1988 г. суседнічаюць з дэкрэтамі Другога Ватыканскага

сабору, мэмарандум ксяндза Адама Станкевіча савецкаму ўраду «Каталіцкая праблема ў БССР» з Крымінальным кодэксам БССР 1960 г., энцыкліка папы Пія XI «Пра бязбожны камунізм» з пастановай ЦК КПСС «Аб буйных недахопах у навукова-атэістычнай прапагандзе і захадах у яе паляпшэньні» 1954 г. Крыніцы разнастайнастайныя як храналягічна, так і ідэалягічна. Сярод дасьледаваньняў, якія выкарыстаў аўтар, можна пабачыць і камуністычна-атэістычных аўтараў, і беларускіх нацыянальных, і польска-каталіцкіх, сярод якіх вылучаюцца такія аўтарытэты, як гісторык кс. Раман Дзванкоўскі і філёсаф кс. Ян Бахеньскі.

Манаграфія падзяляецца на пяць разьдзелаў, якія прысьвечаныя асаблівасьцям становішча Каталіцкага Касьцёлу, сьвятароў і вернікаў у БССР, дзяржаўнай палітыцы ў дачыненьні да Касьцёлу. Асобны разьдзел прысьвечаны сувязі Касьцёлу з Ватыканам і іншымі каталіцкімі супольнасьцямі. Маецца на ўвазе Рыма-Каталіцкі Касьцёл у Літве і Польшчы. Кожны разьдзел падзелены на некалькі падразьдзелаў. Спосаб канструяваньня дасьледаваньня належыць выключна аўтару, але варта зрабіць пэўныя заўвагі што да гэтага аспэкту працы.

Возьмем увагу на прынцып падзелу матэрыялу ў манаграфіі. Спэцыфіка існаваньня Касьцёлу пасьлядоўна разглядаецца ў ёй у першым разьдзеле, далей – становішча сьвятароў, потым – становішча вернікаў, палітыка дзяржаўных уладаў у дачыненьні да Каталіцкага Касьцёлу, а напрыканцы – вонкавыя дачыненьні беларускага Касьцёлу з Рымам, польскім і літоўскім Касьцёламі. Падобны падзел пакідае пэўную наратыўную размытасьць і вымагае аўтара паўтарацца, згадваючы адны і тыя факты і тэндэнцыі ў некалькіх месцах. Спрэчным зьяўляецца разьмяшчэньне разьдзелу «Дзяржаўна-канфэсійная палітыка ў Беларусі» пасьля тэкстаў, зьмест якіх, фактычна, прысьвечаны апісаньню гэтае палітыкі. Пагатоў зьдзіўляе месца гэтага разьдзелу паміж разьдзеламі, якія апісваюць касьцельныя праблемы.

Э. Ярмусік пачынае працу з разгляду спэцыфікі дзейнасьці Каталіцкага Касьцёлу на тэрыторыі пасьляваеннай Беларусі ва ўмовах жорсткага процідзеяньня савецкай улады. Аўтар

пачынае апісаньне стану Касьцёлу ў БССР з колькасных паказчыкаў паводле розных азнакаў: адміністрацыйнай – апісвае колькасьць храмаў і дзейных парафіяў на тэрыторыі кожнае вобласьці паасобна, нацыянальнай – працэнтныя суадносіны вернікаў-палякаў і беларусаў і іншых. Аўтар фіксуе рэзкае скарачэньне колькасьці каталіцкіх парафіяў пасьля вайны. Напрыклад, у Менскай вобласьці ў 1950 г. не засталося ніводнага касьцёлу, а ў 1957 г. было ўсяго тры дзейныя. Ува ўсходняй частцы Беларусі канстатуецца татальнае вынішчэньне каталіцтва: па вайне засталіся нешматлікія нядзейныя касьцёлы і незарэгістраваныя ўладаю каталіцкія супольнасьці, якія паступова заняпалі. Параўнальна да ўсходу Беларусі, шмат парафіяў было ў Полацкай, Гарадзенскай, Берасьцейскай абласьцях, то бок на захадзе Беларусі.

Вельмі добра апісвае аўтар мэтоды ў разбурэньні касьцельнае структуры і кожнай магчымасьці кіраваньня каталіцкай актыўнасьцю ў Беларусі. Тагачасная БССР займала частку тэрыторыяў дзьвюх рыма-каталіцкіх адміністрацыйных адзінак: Віленскае архідыяцэзіі і Пінскае дыяцэзіі. На гэтых землях улада ўзяла кірунак на паступовае зьнішчэньне касьцельнае структуры ў Беларусі. У 1945 г. у Польшчу выехаў Казімер Букраба, Пінскі біскуп. Ён працягваў дзейнічаць на тэрыторыі дыяцэзіі, пазасталай у Польшчы, часова разьмесьціўшыся разам з курыяльнымі ўстановамі ў Бельску-Падляскім, а пасьля перанесшыся ў старажытны Драгічын над Бугам. Кіраваць з-за мяжы было амаль немагчыма, таму галавой дыяцэзіі быў прызначаны ксёндз Вацлаў Пянткоўскі. Прынамсі, аўтар сьцьвярджае, што менавіта ён зьвяртаўся ў органы савецкае ўлады з просьбай зарэгістраваць яго кіраўніком Пінскае дыяцэзіі.

Як аказалася, гэтаксама немагчыма было весьці справы і з савецкай Літвы. Віленскаму арцыбіскупу Рамуальду Ялбжыкоўскаму было адмоўлена ў праве кіраваць падначаленымі ягонай дыяцэзіі парафіямі, якія знаходзіліся на тэрыторыі БССР. Хутка і сам біскуп быў змушаны выехаць у Беласток. Палітыка ўладаў была накіраваная ня толькі на пазбаўленьне парафіяў іхных законных зьверхнікаў, але на максымальную атамізацыю рэлігійных супольнасьцяў.

Вышэйзгаданаму кс. В. Пянткоўскаму было забаронена ня толькі ўзначальваць парафіі былой Пінскае дыяцэзіі як часоваму зьверхніку, але і «мяшацца» да іхнае дзейнасьці.

Э. Ярмусік згадвае ў сваёй кнізе адну са спробаў стварэньня на тэрыторыі Беларусі дыяцэзіі на чале зь біскупам-беларусам. Стараньні гэтыя распачаў вядомы дзеяч беларускага каталіцкага руху кс. Адам Станкевіч. Ён зьвярнуўся з двума мэмарандумамі да савецкага ўраду. Але яны засталіся без адказу, а неўзабаве ён быў арыштаваны. Аўтар, аднак, пакідае па-за ўвагаю намер афіцыйных касьцельных уладаў у Рыме і самога папы Паўла VI прызначыць беларускім біскупам кс. Уладзіслава Чарняўскага. Гэтая спроба аказалася безвыніковай з-за пазыцыі савецкіх (беларускіх) уладаў, якія не хацелі ніводнага біскупа ў Беларусі.

Каталіцкія сьвятары, пазбаўленыя лучнасьці са сваімі зьверхнікамі, спрабавалі вырашаць касьцельныя справы калегіяльна. Імкненьне да каардынацыі дзейнасьці паміж сьвятарамі таксама адсочвалася і рознымі спосабамі перасьледавалася. Абапіраючыся на ахіўныя крыніцы, аўтар добра адлюстроўвае, як камуністычныя ўлады зрабілі ўсё, каб пазбавіць касьцельную ўладу магчымасьці ня толькі кіраваць парафіямі, але ўладкоўваць гарызантальныя сувязі духавенства, ягоную самаарганізацыю і міжпарафіяльную каардынацыю дзейнасьці. *Уполномоченные* перанялі на сябе і функцыі ў кіраваньні царквой, фактычна яны рабілі вызначэньні і пераводы духавенства, уплываючы на гэтыя працэсы праз інструмэнт рэгістрацыі парафіяў і сьвятароў. За гэта атрымалі мянушку чырвоных кардыналаў.

З прынцыпам пабудовы касьцельных дачыненьняў у парафіі, паводле якога галавою парафіі ёсьць сьвятар, камуністычныя ўлады пачалі змагацца амаль ад пачатку свайго панаваньня – з 1918 г. Рэалізацыю плянаў савецкіх уладаў у зьнішчэньні гэтага прынцыпу на тэрыторыях, якія не пасьпелі зазнаць да вайны шалёнага і мэтадычнага змаганьня з касьцельнымі структурамі, можна добра прасачыць у разгляданай кнізе. Фактычна, усю ўладу ў парафіі мела так званая *двацатка*. А ксёндз быў наёмным работнікам, які задавальняў рэлігійныя патрэбы

грамады. *Дваццатка* рэпрэзэнтавала каталіцкую грамаду ў органах улады і адказвала за маёмасьць грамады (натуральна, маёмасьць лічылася дзяржаўнай уласнасьцю). Такім парадкам, Касьцёл ператвараўся ў паасобныя грамады, расьцярушаныя на тэрыторыі былых дыяцэзіяў. У парафіях, паводле задумы атэістычных уладаў, рэй павінны былі весьці не адпаведна рэлігійна падрыхтаваныя сьвятары, але група вернікаў, што мела за мэту ўплыў на дзейнасьць грамады і сьвятара і дэканструкцыю ўсялякага структураваньня касьцёлу.

Улада не задавольвалася і гэтым. Кожны выпадак традыцыйнай і больш-менш нефармальнай арганізацыі вернікаў уважаўся за небясьпечны для канфэсійнае палітыкі савецкіх уладаў. Кляштары, якія акрамя непадкантрольнага аб’яднаньня вернікаў сьведчылі (для камуністаў гучала б – прапагандавалі) хрысьціянскае жыцьцё і пераказвалі традыцыю, былі пазачыняныя ўладамі ў сярэдзіне 1950-х гг. Але ня меншай шкодай для камуністычнага рэжыму і атэістычнае ідэалёгіі лічыліся арганізацыі тэрцыярыяў[1] зь іхнай малітоўна-духоўнай дзейнасьцю і арганізацыйнай дысцыплінай. Нават арганізацыі «Жывога ружанца», адзінай мэтай якіх была малітва, часта нават не калектыўная, а індывідуальная, былі непрымальныя для бальшавікоў. Усе іхныя высілкі былі накіраваныя на разьбіцьцё нармальнае дзейнасьці каталіцкай грамадзкасьці, гранічную атамізацыю чалавека і ліквідацыю ўсіх формаў супольнасьцяў.

Камуністы рабілі спробы максымальна зьменшыць магчымасьці для пераказу рэлігіі наступным пакаленьням. Дзеля гэтага забаранялася навучаць дзяцей катэхізму, сьвятары перасьледаваліся нават за само знаходжаньне непаўналетніх на касьцельных адправах. Прыслугоўваньне непаўналетніх падчас набажэнства было парушэньнем закону аб рэлігійных арганізацыях. Сьвятары і вернікі арганізоўвалі падпольнікі навучаньне для пераказваньня асноваў веры. Настаўнікамі ў такіх падпольных групах былі падрыхтаваныя сьвецкія або чальцы патаемных манаскіх супольнасьцяў. Адным з найбольш эфэктыўных мэтадаў супрацьстаяньня татальнай атэізацыі было падтрыманьне практыкі веры ўнутры сям’і, навучаньня асноваў веры бацькамі або бабулямі. Гэта, як слушна заўважалі

[1] Тэрцыярыі (гэтага. *tertio* – трэці) – арганізаваныя ў савецкія прыхільнікі духоўнасьці пэўных манаскіх ордэнаў.

і камуністычныя адмыслоўцы ад атэізацыі, сталася апірышчам Касьцёлу ў гэты час.

Ладная частка зьместу кнігі прысьвечаная рэпрэсіям супраць духавенства. Калі пасьля вайны ксяндзы арыштоўваліся і ссылаліся ў лягеры, то пазьней улады зьмянілі тактыку атэістычнае вайны. Шмат ксяндзоў пад ціскам варункаў і падчас абмену насельніцтвам паміж Беларусьсю і Польшчай у 1940-я гг. выехала ў Польшчу. Некаторыя ксяндзы засталіся, але амаль што ўсе яны адмаўляліся прымаць савецкае грамадзянства. За гэта іх пазбаўлялі права выконваць свае сьвятарскія абавязкі. Увесь час ксяндзы былі абавязаныя плаціць падаткі, пры гэтым сумы падаткаў былі завышаныя і пастаянна расьлі. Апрача фінансавага ціску на ксяндза, практыкавалася і пазбаўленьне яго рэгістрацыі на пэўны тэрмін ці назаўсёды. На ксяндзоў часта накладаліся штрафы, сьвецкія людзі маглі быць пакараныя папраўчымі работамі.

Асаблівыя рэпрэсіі абрынуліся на тых сьвятароў, якія супрацоўнічалі з Арміяй Краёвай. Нават выключна рэлігійнай, капэлянскай місіі ў аддзеле АК было досыць для абвінавачаньня ксяндза і яго зьняволеньня. Мусім зацеміць, што некаторыя ксяндзы, якія былі абвінавачаныя паводле гэтых артыкулаў, дагэтуль не рэабілітаваныя.

Паважнай для беларускага Касьцёлу была праблема новых сьвятароў. Магчымасьці атрымаць падрыхтоўку да сьвятарскіх пасьвячэньняў былі абмежаваныя. Яна праходзіла ў сэмінарыях Коўны і Рыгі. Аўтар падае некаторыя факты падрыхтоўкі да сьвятарскіх пасьвячэньняў, якая адбываліся падпольна. Больш дэталёвая і канцэптуальная распрацоўка гэтай тэмы яшчэ чакаецца.

Высілкі простых вернікаў у захаваньні будынкаў касьцёлаў – важная тэма для дасьледаваньня. Грамады вымушаныя былі плаціць за карыстаньне памяшканьнем, калі-нікалі высокія памеры гэтых выплатаў прычыняліся да адмовы ад касьцёлу. У кнізе апісваюцца выпадкі, калі ўлады вымагалі аплаты ад грамады вернікаў тады, калі будынак фактычна ўжо быў забраны і выкарыстоўваўся ў *народно-хозяйственных целях*. Некаторыя незакрытыя касьцёлы ня мелі ксяндзоў, бо ўлады не

згаджаліся на аднаўленьне ў іх рэлігійнае дзейнасьці. Уся адказнасьць за захаваньне веры і ператрыманьне мясцовае каталіцкае грамады ў такіх выпадках клалася на ейных актыўных чальцоў, якія ўпарта арганізоўвалі супольныя маленьні ў нядзелі і сьвяты. Калі спробы задушыць такія парафіі не ўдаваліся, рэлігійныя ўпаўнаважаныя выкарыстоўвалі больш гнуткую тактыку: касавалі падаткі для грамадаў, якія існавалі безь сьвятара, і такім чынам спадзяваліся зьменшыць актыўнасьць у грамадзе і *фанатызм* вернікаў, накіраваны на захаваньне свае сьвятыні.

Варта згадаць і дачыненьні з Касьцёламі Польшчы і Літвы. Літоўскі Касьцёл праз сваю блізкасьць і захаванасьць структураў быў пастаяннай крыніцай духоўных ласкаў для беларускіх каталікоў. Шмат вернікаў езьдзілі ў Літву хрысьціцца, прымаць тайну бежмаваньня, шматлікія паломнікі наведвалі Літву і падчас каляндарных урачыстасьцяў. Дэлегацыі беларускіх вернікаў наведвалі Літву з мэтай запрашэньня літоўскіх ксяндзоў на пазбаўленыя сьвятарскай апекі беларускія парафіі. У Польшчы працягвалі існаваць цэнтры (Беласток і Драгічын), якія пэўным чынам спрабавалі каардынаваць дзейнасьць структураў рыма-каталікоў у Беларусі. Праз польска-савецкую мяжу ў Беларусь правозіліся дэвацыяналіі[2], каталіцкая літаратура.

Аўтар, добра падаючы багаты архіўны матэрыял, выразна аддае перавагу фіксаваньню фактаў, здабытых у архівах, перад іх[2] Дэвацыяналіі ўбаку агульную гісторыяграфічную клясыфікацыю падзеяў. Прыкладам ёсьць ужыванае аўтарам вызначэньне *усходняй палітыкі Ватыкану*. Падобны тэрмін існуе ўжо велізарную колькасьць гадоў, бадай, зьявіўся адразу ж пасьля ўзьнікненьня гэтай палітыкі. Э. Ярмусік слушна называе *архітэктарам* усходняй ватыканскае палітыкі дзяржаўнага сакратара Ватыкану кардынала Агостына Казаролі. Менавіта падчас яго кадэнцыі расквітнела палітыка, накіраваная на пачатак дыялёгу паміж сьвятым пасадам і сацыялістычнымі краінамі. Напэўна, аўтар дарма прыводзіць у якасьці прыкладу *ўсходняй палітыкі* польскі Касьцёл, які меў пэўны modus vivendi з паноўным рэжымам. Бо Касьцёл і дзяржава ў Польшчы былі заўсёды ў канфрантацыі. Польшча адназначна не была і не

[2] Дэвацыяналіі — набажэнствы, выкананыя на роднай мове: казаньні, малітвы, песьні, урачыстасьці, паломніцтвы, працэсіі і г. д.

магла быць прыкладам і мадэллю для ўсходняе палітыкі Ватыкану.

На жаль, немагчыма пакінуць без увагі некаторыя памылкі і недарэчнасьці, якія ёсьць у дасьледаваньні. На с. 36 аўтар сьцьвярджае, што годнасьць прэлата (якой у разгляданым выпадку быў уганараваны гарадзенскі ксёндз Міхал Арановіч) дае дадатковыя магчымасьці кіраваньня духавенствам, прызначэньня на пасады і г. д. Насамрэч прэлат гэта не пасада, а менавіта адзнака, якая надаецца за пэўныя заслугі перад Касьцёлам.

Імпэт, зь якім аўтар накідваецца на назапашаны ў архівах матэрыял, часам, цераз асаблівасьці аўтарскага стылю, зацямняе сэнс падаванай інфармацыі. Так, напрыклад, на с. 338 пішацца наступнае: «Абвешчаныя ў ёй (энцыкліцы *Pacem in Terris*. – **А. У.**) новыя падыходы да рэжыму тыпу савецкага абазначалі разрыў зь дзейнай дасюль бескампраміснай анатэмай». Пасьля прачытаньня гэтага сказу застаюцца пытаньні: ці была гэтая анатэма *зьнятая*? Ці, можа, гэтыя словы сьведчаць проста пра пераход да палітыкі дыялёгу ў дачыненьні да падобных рэжымаў? Бо анатэма, абвешчаная кампэтэнтнаю ўстановай Касьцёлу, абазначае толькі тое, што чалавек цераз свае *аб'яўленыя* нейкім чынам пераканаьні ня можа быць надалей чальцом Касьцёлу (калі ня зьменіць іх), бо гэтыя пераканаьні супярэчаць дагматычнай або маральнай навуцы Касьцёлу. Адпаведна, *анатэма* тычыцца не рэжыму, але ідэалёгіяў, дакладней, асобаў з шэрагаў каталіцкага Касьцёлу, якія прымаюць пэўныя ідэалёгіі.

Трапляюцца ў кнізе і памылкі іншага характару. Напрыклад, на с. 338 аўтарам згадваецца нейкі кардынал Сыры. Маецца наўвеце, на нашу думку, кардынал Сыры (які пазьней кандыдаваў на папскі пасад пасьля папы Яна Паўла I), бо ўсе кардыналы ёсьць кардыналамі каталіцкага Касьцёлу, а ня нейкай тэрыторыі.

У актыў аўтара трэба залічыць выснову пра адметнасьць беларускага Касьцёлу, якая склалася пад уплывам гістарычных і культурных варункаў ягонага існаваньня. Гэтае сьцьверджаньне ніколі не было аксіёмаю сярод гісторыкаў, а

пагатоў сярод палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў. Сабраныя аўтарам факты, якія сьведчаць пра кшталтаваньне адметнасьцяў беларускага Касьцёлу пад уплывам камуністычнае ўлады і насуперак ёй, добра падмацоўваюць гэтую думку.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/10/08**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 10 (50) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

крытыка [image]-[image]2006

крытыка • аналітыка • эсэістыка • гісторыя • палеміка • літаратура

[image] [image] [image]

АЛЕСЬ ПАШКЕВІЧ

Алесь Пашкевіч Галасы забытых людзей

гісторык, сталы аўтара «ARCHE». Апошняя публікацыя ў часопісе – агляд «Цаглінка ў даволі салідная гістарыяграфіі» (6/2006).

Казлоўскі М. *Галасы разбуджаных птушак: Гістарычна-біяграфічныя нарысы, роздумы над кнігамі, літаратурныя партрэты.* – Менск: Логвінаў, 2006. – 334 с.: іл.

Восеньскім ранкам 1991 г. на адзін з падворкаў у Маладэчне выйшлі два чалавекі: адзін стары і невылечна хворы, а другі яшчэ малады, поўны сілаў і энэргіі. Прадчуваючы, што гэтая сустрэча – апошняя, стары (а гэта быў беларускі літаратар Пятро Бітэль) на разьвітаньне сказаў наступныя словы: «Трымайце Беларусь, усімі рукамі трымайце Беларусь, Міша, ня дайце ёй прапасьці. І хай вам дапамагае ў гэтым Бог!»

Бітэлю тады заставалася жыць усяго каля трох тыдняў. За ягонымі плячыма было вельмі няпростае жыцьцё, падчас якога яму напоўніцу давялося спазнаць усе тыя пакуты, празь якія мусілі прайсьці большасьць беларускіх патрыётаў у XX ст. Ягоны запавет маладэчанскаму краязнаўцу Міхасю Казлоўскаму (а маладым суразмоўцам Бітэля быў менавіта ён) быў вельмі сымбалічны, асабліва калі ўлічваць тагачасную палітычную сытуацыю. Толькі што ў Маскве правалілася спроба дзяржаўнага перавароту, пасьля якой сумны лёс камуністычнае імпэрыі фактычна быў перадвырашаны, і для ўсіх народаў, якія воляй лёсу былі ейнымі насельнікамі, распачынаўся новы, больш сьветлы і аптымістычны этап гісторыі. На долю

беларускіх адраджэнцаў з пакаленьня Пятра Бітэля выпала цяжкая гістарычная місія: ня даць цалкам загаснуць кволаму агеньчыку беларушчыны ў амаль безнадзейных абставінах. І яны яе, нягледзячы на ўсе цяжкасьці і супярэчнасьці, выканалі, ахвярным служэньнем нацыянальнай ідэі забясьпечыўшы саму магчымасьць падобнай сымбалічнай перадачы эстафэты наступнікам.

Гэтую эстафэту Бітэль перадаў у дастойныя рукі. Міхась Казлоўскі, які распачаў актыўную дзейнасьць на нацыянальнай ніве яшчэ ў пачатку 1980-х гг., ня здраджвае ўласным ідэалам і запаветам сваіх духоўных бацькоў і да гэтай пары, хоць жыцьцё краязнаўца, ды і проста сьведамага чалавека, у беларускай правінцыі па-ранейшаму не бесклапотнае. Такія людзі ў нашых умовах мусяць быць перш за ўсё самаахвярнымі энтузіястамі, і яны, дзякуй Богу, пакуль ня зводзяцца.

Міхась Казлоўскі нават сярод гэтай своеасаблівай катэгорыі актыўных і апантаных людзей вылучаецца сваёй актыўнасьцю і апантанасьцю. Дзякуючы менавіта ягоным намаганьням у Маладэчне з 2000 г. больш-менш рэгулярна выходзіць краязнаўчы часопіс «Куфэрак Віленшчыны» – ці не найлепшае выданьне такога кшталту ў Беларусі. У кожным зь ягоных нумароў (а іх выйшла ўжо дзесяць) зьмяшчаюцца ўнікальныя матэрыялы, многія зь якіх цалкам прыдатныя да выкарыстаньня і ў акадэмічнай гістарычнай навуцы. Часьцяком гэтыя матэрыялы належаць пяру самога рэдактара і выдаўца часопісу – Міхася Казлоўскага. Акрамя гэтага, створаная кніжная сэрыя «Куфэрка Віленшчыны». Ды і ў іншых беларускіх выданьнях час ад часу зьяўляюцца матэрыялы аўтарства Казлоўскага.

У выніку такой напружанай працы Міхасём Казлоўскім была створаная даволі значная колькасьць добрых тэкстаў, якія дасьледнік палічыў мэтазгодным нарэшце выдаць пад адной вокладкай і такім чынам падвесьці рысу пад пэўным этапам сваёй творчай дзейнасьці. Практычным увасабленьнем гэтага стала кніга з паэтычнай назвай «Галасы разбуджаных птушак», жанр якой акрэсьлены самім аўтарам як «гістарычна-біяграфічныя нарысы, роздумы над кнігамі, літаратурныя

партрэты».

Кніга структурна падзяляецца на тры часткі, неаднолькавыя паводле аб'ёму. У першую зь іх, пад назвай «Покліч роднай зямлі», уключаныя шэсьць нарысаў, агульнай тэмай якіх зьяўляецца разьвіцьцё адукацыі на тэрыторыі беларускай часткі былой Віленшчыны, у першую чаргу ў Маладэчне. У нарысах пачаргова вядзецца расповед пра Маладэчанскае павятовае шляхецкае вучылішча (дзейнічала ў 1811–1857 гг.), Маладэчанскую настаўніцкую сэмінарыю (1864–1915), Маладэчанскую польскую гімназію імя Тамаша Зана (1922–1939), Маладэчанскую гандлёва-адміністрацыйную сярэднюю школу (1942–1944) і Маладэчанскі настаўніцкі інстытут (1947–1955), Радашкавіцкую беларускую гімназію (1921–1929), Вялейскую беларускую настаўніцкую сэмінарыю (1942–1944). Да нарысаў у гэтай частцы далучаныя два дакумэнтальныя дадаткі. Адзін зь іх уключае матэрыялы, датычныя жыцьця і дзейнасьці заснавальніка Радашкавіцкай гімназіі Аляксандра Ўласава (с. 73–84), а другі – лісты да сям'і з савецкага лягеру былога дырэктара Вялейскай беларускай настаўніцкай сэмінарыі Мікалая Грышкевіча (с. 92–98).

Важным элемэнтам першае часткі выданьня зьяўляюцца кароткія, але інфармацыйна ёмістыя біяграмы на тых людзей, якія ў свой час працавалі і вучыліся ў Маладэчанскай настаўніцкай сэмінарыі, Радашкавіцкай беларускай гімназіі і пасьля гэтага ў той ці іншай ступені бралі ўдзел у беларускім нацыянальным руху. Вядома, падобныя зьвесткі зьмешчаныя далёка не пра ўсіх такіх выпускнікоў і настаўнікаў, а толькі пра тых, пра каго аўтар меў дакладныя зьвесткі. Праўда, мэтазгоднасьць уключэньня ў сьпіс некаторых асобаў (калі браць за асноўны крытэр, як дэкляруе аўтар, іх удзел у беларускім нацыянальным руху) выклікае сумневы. Так, у біяграме на выпускніка Маладэчанскай настаўніцкай сэмінарыі Макара Ігнатоўскага зьвестак пра якую б то ні было беларускую дзейнасьць апошняга няма. Казлоўскі залічыў яго ў беларускія дзеячы на аснове адзінага факту зь ягонай біяграфіі: у 1888 г. у сям'і Макара Ігнатоўскага нарадзіўся сын Усевалад, якому было суджана адыграць немалую ролю ў разьвіцьці беларускага нацыянальнага руху ў першай палове XX ст. Але

тое, што Ігнатоўскі стаў беларускім патрыётам, зусім ня значыць, што такім быў і ягоны бацька. Усё ж і тады, і цяпер сьведамымі беларусамі ў нас звычайна не нараджаюцца, а становяцца, прытым часта насуперак жаданьням уласных бацькоў.

У сьпісе выпускнікоў Радашкавіцкае беларускае гімназіі ў Казлоўскага фігуруе Мікола Абрамчык, вядомы тым, што ўжо пасьля Другой сусьветнай вайны быў прэзыдэнтам Рады БНР. У прынцыпе, гэта правільна, бо Абрамчык сапраўды адзін час значыўся ў сьпісе вучняў гімназіі. Але аўтару варта было адзначыць, што вучнем насамрэч гэты дзеяч ня быў, а толькі лічыўся, бо да гэтага часу ўжо сам некаторы час працаваў, і не бяз посьпеху, настаўнікам на Ашмяншчыне. У Радашкавічы ж ён, як сьведчыў ягоны блізкі сябар Лявон Рыдлеўскі, прыехаў выключна дзеля таго, каб займацца «нацыянальна-рэвалюцыйнай працай». Запіс вучнем 7-й клясы гімназіі быў патрэбен яму толькі дзеля «закансьпіраваньня свайго побыту ў Радашкавічах», да таго ж, маючы вучнёўскі білет, Абрамчык меў магчымасьць «гібка паварачвацца па сваім павеце і нават пабываць некалькі разоў у галоўным беларускім паўстанцкім штабе, які знаходзіўся ў Летуве»[1].

Наагул жа біяграфічныя дадаткі М.Казлоўскага да нарысаў з гісторыі адукацыі ў рэгіёне маюць вялікае навуковае значэньне. Яны ў значнай ступені датычаць тых людзей, пра якіх нямаці М. згадак у наяўных энцыкляпэдыях, даведніках і біяграфічных слоўніках. Дзеля гэтага нават адмыслоўцы-гісторыкі часьцяком ня маюць пра гэтых людзей аніякай інфармацыі, хоць іх прозьвішчы нярэдка фігуруюць у архіўных крыніцах. Думаецца, што пры жаданьні М. Казлоўскі ў будучыні мог бы падрыхтаваць і грунтоўны біяграфічны даведнік дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, якія нарадзіліся ці дзейнічалі ў рэгіёне, тым больш што апісаньне асноўных этапаў жыцьця і дзейнасьці яшчэ шэрагу малавядомых асобаў часта ўводнае практыкуецца аўтарам і непасрэдна ў тэкстах нарысаў. Несумненна, што ў кнізе зьмешчана далёка ня ўся інфармацыя такога кшталту, якой ён валодае.

Другая частка кнігі М. Казлоўскага – «Зь верай і любоўю» –

[1] Рыдлеўскі Л. Зачыныя і дзейнасці Абрамчыка // Зь гісторыяй на «Думаецца, Артыкулы, дакументы, успаміны / Ўкл. і ўводнае слова Я. Запруднікі. Мінск, 1994. С. 122–123.

складаецца зь дзесяці літаратуразнаўчых артыкулаў: водгукаў на кніжкі і асобныя вершы як больш-менш вядомых беларускіх аўтараў, так і літаратараў-пачаткоўцаў. Акрамя таго, тут зьмешчаныя прадмовы, напісаныя ў свой час аўтарам да тых кніжак, якія выходзілі ў бібліятэцы «Куфэрка Віленшчыны».

Урэшце, трэцяя і самая вялікая аб'ёмам (ледзьве ня дзьве траціны ўсяе кнігі) частка «Забытае рэха вяртаю» – гэта дваццаць розных з аб'ёму і структуры жыцьцяпісаў беларускіх нацыянальных дзеячаў розных пакаленьняў, жыцьцё і дзейнасьць якіх трывала зьвязаныя з роднымі для аўтара мясьцінамі – гістарычнай Віленшчынай, частка якой і сёньня ўваходзіць у склад Беларусі. Гэтая зямля па праве лічыцца своеасаблівай кузьняй кадраў для беларускага нацыянальнага адраджэньня. Дастаткова згадаць, што адсюль паходзяць такія знакавыя для беларускага руху дзеячы, як Адам і Янка Станкевічы, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Тамаш Грыб і іншыя. Але асноўным аб'ектам увагі аўтара сталі ў першую чаргу ня гэтыя асобы, пэрыпэтыі жыцьцёвых лёсаў якіх вядомыя хоць бы ў агульных рысах, а тыя дзеячы, якія звычайна знаходзіліся на другасных ролях і пра большасьць якіх у даступнай нам на сёньняшні дзень гістарычнай літаратуры мы можам знайсьці ў лепшым выпадку эпізадычныя згадкі. Такі падыход – невыпадковы. Міхась Казлоўскі лічыць надзвычай важным дасьледаваньне жыцьця і дзейнасьці «тых, на кім, па сутнасьці, трымалася ды і трымаецца руцінная штодзённая шараговая праца, а кажучы глыбей, нацыянальная ідэя ды і лёс роднай Беларусі» (с. 278).

«Нераскручанасьць» большасьці герояў нарысаў вымагала ад аўтара шматгадовай карпатлівай працы ў зборы, як правіла, расьцярушаных і ўрыўкавых зьвестак пра іх. Матэрыялы для сваіх нарысаў Казлоўскі чэрпаў з розных крыніцаў. Перш за ўсё, як вынікае з грунтоўнага сьпісу літаратуры, які падаецца ў канцы кнігі на с. 325–331, аўтар даволі добра знаёмы са старымі беларускімі выданьнямі і ўважліва сочыць за выхадам новых. Акрамя таго, ім выкарыстоўваліся матэрыялы са збораў Менскага абласнога краязнаўчага музэю, Вялейскага краязнаўчага музэю, Віленскага беларускага музэю. Але найбольш арыгінальныя крыніцы, выкарыстаныя Міхасём

Казлоўскім, тыя помнікі жыцьця і дзейнасьці цікавых аўтару асобаў, якія ў свой час ня трапілі ў архіўныя ці музэйныя фонды, а захоўваліся недзе ў сваякоў ці наагул у зусім выпадковым месцы. Акрамя таго, аўтару ўдалося сабраць вусныя сьведчаньні ад некаторых непасрэдных сьведкаў эпохі. Увядзеньне ў навуковы ўжытак такіх матэрыялаў – безумоўная заслуга аўтара, і гэта значна павялічвае агульную каштоўнасьць працы, надаючы ёй непаўторнасьць і арыгінальнасьць. Некаторыя матэрыялы з прыватных архіваў аўтар палічыў патрэбным апублікаваць у разгляданай кнізе цалкам, і трэба прызнаць, што і згаданыя ўжо вышэй лягерныя лісты Мікалая Грышкевіча, і дзёньнікавыя нататкі за 1942 г. былога навучэнца Віленскай беларускай настаўніцкай сэмінарыі Віктара Казлоўскага (с. 148–154) таго вартыя.

Падобныя матэрыялы не заўсёды трапляюць дасьледніку ў рукі без праблемаў. Сам працэс пошуку з усімі ягонымі асаблівасьцямі даволі падрабязна апісваецца аўтарам у нарысе, прысьвечаным жыцьцю і дзейнасьці вядомага калісьці ў Заходняй Беларусі (але, як звычайна вядзецца, дашчэнту забытага ў Беларусі сёньняшняй) дзеяча Тодара Куніцкага. У гэтым выпадку краязнаўцу нібыта і пашанцавала: захавалася старая (яшчэ XIX ст.) хата ў вёсцы Повязынь на Маладэчаншчыне, дзе гэты дзеяч жыў, а ў той хаце (дакладней, у паветцы пры ёй) – тое-сёе з фатакартак і партрэт Куніцкага, выкананы самадзейным мастаком. Удача для дасьледніка – надзвычайная і нават неверагодная, але ва ўмовах Беларусі ўсё набывае сваю «нацыянальную спэцыфіку». На жаль, нярэдка сустракаецца ў нас сытуацыя, калі жывыя сёньня родзічы таго ці іншага дзеяча, апантанага ў свой час беларускай ідэяй, ягоных поглядаў не падзяляюць і нават баяцца, што колішняя «нацыяналістычная» дзейнасьць неасьцярожнага продка можа прынесьці непатрэбныя праблемы ім, зусім «звычайным» людзям. Падобныя меркаваньні робяцца прычынаю таго, што нават і цяпер, у час «міру і стабільнасьці», унікальныя матэрыялы, якія калісьці клапатліва кімсьці зьбіраліся, перажылі войны і стыхійныя катастрофы, могуць стаць ахвярай людзкога бяспамяцтва.

Менавіта бяспамяцтва, абыякавасьць, а часам і звычайны страх

– галоўныя хібы сучаснага беларускага грамадзтва, зь якімі Казлоўскі лічыць патрэбным змагацца. У адным з нарысаў аўтар з сумам канстатуе, што «мы ўнікальная нацыя хоць бы ў тым, што заўсёды і ва ўсім спазьняемся. Спазьняемся выдаваць патрэбныя кнігі, не сьпяшаемся аднаўляць свае помнікі гісторыі і культуры, вяртаць родную мову ў штодзённы ўжытак, шанаваць сваіх герояў, геніяў і прарокаў» (с. 189). Падобнай думкай прасякнутая ўся кніга, і само ейнае выданьне – своеасаблівая спроба гэтым нэгатыўным праявам супрацьстаяць.

Кніга Міхася Казлоўскага – выданьне навукова-папулярнае, разьлічанае на масавага чытача. Чытаецца яна сапраўды цікава і захапляльна, і з гэтага, па вялікім рахунку, няма чаго дзівіцца: аўтар укладае ў свае нарысы душу. Іхных герояў (зь некаторымі аўтар быў блізка знаёмы асабіста) М. Казлоўскі ня толькі паважае, але ўпрост захапляецца імі. І нельга не пагадзіцца, што героі кнігі сапраўды гэтага вартыя. Аднак часам занадта эмацыйнае стаўленьне да той ці іншай асобы замінае аўтару зірнуць на ейнае жыцьцё і дзейнасьць у больш шырокім кантэксьце і даць ім бесстароньнюю і аб'ектыўную ацэнку. У большасьці выпадкаў, праўда, гэта нельга лічыць вялікай хібай – усё ж такі праца не прэтэндуе на статус навуковай манаграфіі. Аднак жа некаторыя гіпотэзы аўтара, выказаныя ў катэгарычнай форме, маюць шанцы замацавацца і ў акадэмічнай навуцы, хоць далёка не заўсёды на гэта ёсьць рэальныя падставы.

У якасьці прыкладу тут можна згадаць спробу ідэнтыфікацыі М. Казлоўскім асобы ўладальніка псэўданіму «А. Незалежнік», які выкарыстоўваўся кімсьці з заходнебеларускіх публіцыстаў у 1920-х гг. У 1997 г. у часопісе «Спадчына» быў перадрукаваны артыкул гэтага аўтара «Тры шляхі» зь віленскага выданьня 1928 г. «З роднае нівы», і публікатары прыпісалі псэўданім ксяндзу Вінцэнту Гадлеўскаму. У сваю чаргу Міхась Казлоўскі пры падрыхтоўцы нарысу «Адам» (с. 171–180), прысьвечанага жыцьцю і дзейнасьці ўплывовага заходнебеларускага дзеяча адзначанага вышэй пэрыяду Адама Більдзюкевіча, паставіў такое вырашэньне пытаньня пад сумнеў і настойвае на тым, што «А. Незалежнік» – гэта більдзюкевіцкі псэўданім. У

падтрымку гэтай вэрсіі прыводзяцца наступныя аргумэнты:

[Більдзюкевіч] пісаў як пад сваім уласным прозьвішчам, так і пад псэўданімамі: А. Саюзьнік, А. Культурнік, А. Незалежнік і крыптанімамі А. Б. і Б. А. Праўда, псэўданім А. Незалежнік чамусьці ў наш час прыпісалі а. Вікенцію Гадлеўскаму (гл. «Спадчына», № 3, 1997, с. 11–15, арт. «Тры шляхі»), хоць ніякай аргумэнтацыі пры гэтым не прыводзіцца. Але чаму так атрымалася – можна здагадвацца. Рэч у тым, што ў кнізе «З роднае нівы» (Вільня, 1928), адкуль той артыкул узяты, якраз на адной са старонак, дзе ён надрукаваны, быў зьмешчаны партрэт а. Вікенція. І гэтага, я думаю, стала дастаткова, каб прыпісаць яго Гадлеўскаму (хоць там амаль на кожнай старонцы чыйсьці здымак). Але, калі разважаць лягічна, то можна заўважыць, што першая загалоўная літара «А» лёгка расчытваецца як «Адам», а сам псэўданім вельмі лёгка характарызуе палітычна-культурны напрамак дзейнасьці аўтара. Па-другое, калі пераглядзець газэту «Сялянская ніва» за 1926–1928 гг. (пік актыўнасьці А. Більдзюкевіча), то кідаецца ў вочы, што ўсе перадавіцы ў гэтым выданьні пісаліся адным чалавекам, які падпісваўся як прозьвішчам А. Більдзюкевіч, так і вядомымі нам псэўданімамі: А. Незалежнік, А. Саюзьнік, А. Культурнік. І тады ўзьнікае заканамернае пытаньне: навошта было Вікенцію Гадлеўскаму, лідэру другой палітычнай сілы (Беларускае хрысьціянскае дэмакратыі. – **А. П.**), *хоць і блізкай ідэалягічна, пісаць пра слушнасьць палітыкі Беларускага сялянскага саюзу і яе кіраўнікоў, усялякім чынам рэклямаваць яго дзейнасьць, паказваць ледзьве не адзінай рэальнай палітычнай сілай беларускага народу? Пры гэтым маючы сваё пэрыядычнае выданьне, якім зьяўлялася газэта «Беларуская крыніца»? Я ўжо не кажу пра саму стылістыку пісьма, яе граматычны лад, напрамак думкі, якая належыць аднаму аўтару. У нашым выпадку, безумоўна, Адаму Більдзюкевічу* (с. 175).

Патрэбна адзначыць, што гэтыя аргумэнты М. Казлоўскага на карысьць сваёй вэрсіі – далёка не бездакорныя. Адзінае, у чым ён тут мае рацыю несумненна, дык гэта ў тым, што нельга схаваных пад псэўданімамі і крыптанімамі аўтараў тэкстаў з

вышэй згаданага выданьня «З роднае нівы» ідэнтыфікаваць толькі паводле зьмешчаных на адных старонках зь імі фатакартак беларускіх дзеячаў. Напрыклад, на старонках з артыкулам пра Беларускі сялянскі саюз (падпісаным псэўданімам «А. Саюзьнік») зьмяшчаюцца фатакарткі двух ягоных лідэраў: Васіля Рагулі і Фабіяна Ярэміча, а матэрыял пра Беларускую хрысьціянскую дэмакратыю аздабляецца адразу шасьцю партрэтамі выбітных беларускіх хадэкаў: Адама Станкевіча, Паўла Карузы, Альбіна Стэповіча, Янкі Шутовіча, Язэпа Жука і Браніслава Грабінскага (аўтарам артыкулу зьяўляецца «Ал. С.» – хутчэй за ўсё, Альбін Стэповіч). Партрэт Гадлеўскага, праўда, у артыкуле «Тры шляхі» адзіны, але таксама адзіны ў артыкуле «Беларускі нацыянальны камітэт» партрэт тагачаснага старшыні гэтае інстытуцыі Вячаслава Багдановіча – а матэрыял падпісаны «П. К-за» (несумненна, Павал Каруза).

Сьцьверджаньне ж М. Казлоўскага пра тое, што першая літара «А» ў шэрагу псэўданімаў адназначна расчытваецца як «Адам», і калі так, то гэта несумненна псэўданімы Адама Більдзюкевіча – непераканаўчае. Калі зыходзіць з гэтае самае лёгікі, то тады мы мусім зь яшчэ большымі падставамі прыпісаць таму ж Більдзюкевічу і псэўданім «Адам Асьветны», пад якім у № 28 газэты «Сялянская ніва» за 9 верасьня 1926 г. была надрукаваная перадавіца пад назвай «Беларуская школа». Між тым, як відаць са стылістыкі і асабліва мовы, гэты артыкул безумоўна належыць пяру вядомага беларускага дзеяча Янкі Станкевіча (у тэксьце сустракаюцца такія актыўна прапагандаваныя гэтым вядомым мовазнаўцам-наватарам у тыя і ў пазьнейшыя часы наватворы, як «на ўвеце» (на ўвазе), «ходацца» (змагацца), «косы» (прамяні) і г. д.).

Далёка не бясспрэчным выглядае таксама іншае сьцьверджаньне М. Казлоўскага: «...навошта было Вікенцію Гадлеўскаму, лідэру другой палітычнай сілы, хоць і менш ідэалягічна, пісаць пра слушнасьць палітыкі Беларускага сялянскага саюзу і яе кіраўнікоў, усялякім чынам рэклямаваць яго дзейнасьць, паказваць ледзьве не адзіную рэальную палітычную сілу беларускага народу? Пры гэтым маючы сваё пэрыядычнае выданьне, якім зьяўлялася газэта «Беларуская

[2] Рагуля В. Успаміны. Менск, 1993. С. 38, 71.

[3] Krušyna M. Šukaúnie nowych darob // Krynica. 1925. № 18. 3 traĭnia. S. 2.

крыніца»?». Калі глядзець на праблему толькі з гледзішча абстрагаванае лёгікі, то рацыя аўтара – несумненная. Але тут нельга забывацца на спэцыфіку беларускага палітычнага жыцьця ў міжваеннай Польшчы, асабліва ў 1920-я гг. Адзін зь лідэраў Беларускага сялянскага саюзу (БСС), Васіль Рагуля, у сваіх пазьнейшых успамінах колькі разоў выказваў слушную думку: «Народ, які ня мае матэрыяльнай базы, ня можа пасьпяхова весьці палітычнае змаганьне»[2]. А ў Польшчы сярэдзіны 1920-х гг. толькі тры беларускія палітычныя арганізацыі мелі сталыя крыніцы фінансаваньня і, значыць, мелі хоць бы патэнцыйныя магчымасьці праводзіць больш-менш сур'ёзную дзейнасьць. Першай з гэтых арганізацыяў была Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ), якая стваралася з удзелам камуністаў і атрымлівала значную фінансавую падтрымку зь Менску (ці нават з Масквы). Другой такой арганізацыяй была Беларуская хрысьціянская дэмакратыя (БХД). Праўда, замежных чыньнікаў, зацікаўленых у функцыянаваньні гэтай партыі, да сярэдзіны 1920-х гг. практычна не засталося, аднак сярод сяброў арганізацыі было даволі шмат каталіцкіх ксяндзоў (якія ўсе былі людзьмі адносна заможнымі), на складкі і ахвяраваньні якіх партыя ў асноўным і жыла. Урэшце, выразна палянафільская Беларуская часовая (пасьля – нацыянальная) рада Арсеня Паўлюкевіча і іншыя падобныя ёй арганізацыі існавалі на субсыдыі цэнтральных і мясцовых польскіх уладаў, а таксама польскіх спэцслужбаў. Беларускаму ж сялянскаму саюзу самастойных крыніцаў фінансаваньня знайсьці ўжо не было як: такіх проста не існавала. Адзіным больш-менш сталым грашовым прыбыткам для партыі маглі быць адлічэньні з пасольскіх пэнсіяў Фабіяна Ярэміча і Васіля Рагулі, але гэтага, нягледзячы на тое, што паслы польскага сойму ў той час атрымлівалі за выкананьне сваіх абавязкаў вельмі вялікія грошы, было відавочна недастаткова для разгортваньня шырокай дзейнасьці.

Такім чынам, адзіны выхад для БСС зь ягонай незалежніцкай ідэалёгіяй быў у заключэньні пагадненьня з БХД, відавочна, у такіх умовах не зусім раўнапраўнага. БХД, такім чынам, аказвала БСС ня толькі маральную, але перш за ўсё матэрыяльную падтрымку, за што, зразумела, магла

разьлічваць на выкарыстаньне структураў гэтай арганізацыі ў сваіх мэтах. Зрэшты, нават ідэя стварэньня падобнай партыі была ўпершыню выказаная на старонках друкаванага органу БХД «Kryniса» яшчэ ў траўні 1925 г.[3]. Пры сёньняшнім стане дасьледаваньня пытаньня, праўда, цяжка сказаць, засноўвалі Ярэміч і Рагуля БСС адразу зь ведама хадэцкіх лідэраў ці проста перахапілі іхную ідэю. Але далейшая прысутнасьць у кіраўніцтве БСС дзеячаў, што перад гэтым былі ў БХД ці выказвалі да яго сымпатыі (у першую чаргу гаворка пра Браніслава Туронка і Янку Станкевіча) сьведчыць пра тое, што Беларускі сялянскі саюз лучылі з хрысьціянскімі дэмакратамі ня толькі чыста саюзьніцкія сувязі. Таму тое, што лідэры БХД маглі друкавацца (вядома, пад псэўданімамі) і ў партыйнай прэсе БСС, ня толькі не выглядае неверагодным, але падаецца зусім рэальным.

Але няўжо каталіцкім ксяндзам з БХД насамрэч не хапала для прапаганды сваіх поглядаў старонак уласнай газэты «Беларуская крыніца», якая выходзіла дастаткова рэгулярна, прытым даволі вялікімі аб'ёмам і накладам? Трэба пагадзіцца, што ў гэтым выданьні яны сапраўды маглі друкавацца неабмежавана, чым, несумненна, і карысталіся. Але М. Казлоўскі не бярэ пад увагу аднаго вельмі важнага фактару. «Беларуская крыніца» (калі быць абсалютна дакладным, то трэба пісаць «Biełaruskaja krynica») выходзіла лацінкай і мела ў заходнебеларускім грамадзтве трывалую рэпутацыю газэты для каталікоў, якую выдаюць ксяндзы. Канфэсійная ж прыналежнасьць у тагачасных умовах мела вялікае значэньне, асабліва для простага люду. А лідэры беларускіх хадэкаў (як, дарэчы, і ўсе іншыя беларускія дзеячы) ніколі ня думалі абмяжоўвацца працай выключна сярод беларусаў-каталікоў, яны заўсёды мысьлілі катэгорыямі ўсяго беларускага народу бяз розьніцы ў веравызнаньні. З імкненьня пашырыць свае ўплывы і на праваслаўную частку насельніцтва (калі не наўпрост, то апасродкавана) і вынікала падтрымка беларускімі каталіцкімі ксяндзамі Беларускага сялянскага саюзу і ягонай кірылічнай газэты «Сялянская ніва».

Акрамя таго, нельга сказаць, каб пры азнаямленьні з падшыўкай «Сялянскай нівы» асабліва кідалася ў вочы, «што

ўсе перадавіцы ў гэтым выданьні пісаліся адным чалавекам, які падпісваўся як прозьвішчам А. Більдзюкевіч, так і вядомымі нам псэўданімамі: А. Незалежнік, А. Саюзьнік, А. Культурнік». Нават калі браць толькі падшыўку за 1927 г. (якая адна толькі ёсьць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, пра што сам аўтар згадвае ў нарысе пра Тодара Куніцкага на с. 294), то і тады відаць, што вялікая колькасьць перадавіцаў – 40 у 96 нумарах (некалькі нумароў, праўда, былі сканфіскаваныя паліцыяй і таму адсутнічаюць у падшыўцы) – наагул друкаваліся бяз подпісу, а многія з астатніх – пад псэўданімамі, але ня толькі пад пералічанымі М. Казлоўскім. Гэтак, былі псэўданімы А. Змагар, Антон Муха, Скарга, Ст. Рубель, Піліп Нікель, Рыгор Булат, А. Дэмакрат, А. Замежны і інш. Усе гэтыя псэўданімы таксама належалі Адаму Більдзюкевічу? Вельмі сумнеўна, хоць бы таму, што М. Казлоўскі, шчыра захапляючыся асобай А. Більдзюкевіча і падымаючы яго ажно да ўзроўню «ідэоляга ня толькі Беларускага сялянскага саюзу, але даволі значнага спэктру беларускага незалежніцкага лягеру» (с. 176), абсалютна выпусьціў з-пад увагі тое, што, акрамя А. Більдзюкевіча, у кіраўніцтва БСС уваходзілі вядомыя беларускія дзеячы, соймавыя паслы Фабіян Ярэміч і Васіль Рагуля. Што яны, нічога не пісалі ў газэту, якую самі ў свой час заснавалі? А калі не пісалі, то чаму? Ня ўмелі ці не хацелі? Але, напрыклад, у той жа «Сялянскай ніве» часам зьяўляліся іхныя артыкулы, падпісаныя ўласнымі прозьвішчамі, якія нічым ня горшыя за ананімныя ці падпісаныя псэўданімамі. Васіль Рагуля пасьля на эміграцыі напісаў успаміны, да зьместу якіх можна і трэба ставіцца крытычна, але тое, што іхны аўтар меў пэўныя літаратурныя здольнасьці – несумненна. Урэшце, абодва паслы дастаткова часта выступалі з зусім ня дрэннымі прамовамі ў сойме і пры гэтым звычайна не маглі карыстацца падрыхтаваным кімсьці тэкстам – гэта забаранялася польскімі законамі. Таму апрыёрнае выключэньне Ф. Ярэміча і В. Рагулі (дарэчы, нават безь ніякага абгрунтаваньня) зь ліку магчымых уладальнікаў псэўданіму «А. Незалежнік» і ўсіх іншых пералічаных М. Казлоўскім падаецца прынамсі дзіўным.

Адносна ж таго, што ўсе артыкулы мелі «адзін напрамак думкі» – гэта зусім ня значыць, што яны належалі аднаму аўтару. Усе беларускія выданьні ў Заходняй Беларусі (і «Сялянская ніва»

тут зусім не выключэньне) арыентаваліся на пэўную аўдыторыю – сялянства. Гэтая катэгорыя насельніцтва не вылучалася высокім узроўнем адукацыі, палітычнай культуры і да т. п. Многія былі наагул абсалютна непісьменныя. Да таго ж характэрнай рысай сялянскай псыхалёгіі, і ня толькі ў той час, заўсёды быў давер да друкаванага слова. Таму, каб заваяваць прыхільнасьць сялянства і паўплываць на ягоны сьветапогляд, сялянская газэта мусіла цьвёрда трымацца вызначанай лініі, і ўсе матэрыялы мусілі калі ўжо не дапаўняць, то прынамсі не супярэчыць адзін аднаму. Плюралізм думак на старонках аднаго і таго ж выданьня ва ўмовах працы сярод грамадзтва зь некрытычным складам мысьленьня быў проста немагчымы. Гэта тычыцца, дарэчы, ня толькі беларускіх, але і польскіх газэтаў, разьлічаных на сялянскую аўдыторыю.

Вернемся, аднак, да псэўданіму «А. Незалежнік» і разгледзім яго больш падрабязна. Карыстаўся ім яго ўладальнік адносна нячаста: за 1926–1927 гг., калі газэта «Сялянская ніва» выходзіла рэгулярна кожныя тры-чатыры дні, усяго ў сямі яе нумарах перадавіца была падпісаная менавіта такім імем (прытым у адным з гэтых выпадкаў – як «А. Незалежны», а ў яшчэ адным – як проста «Незалежнік»). Тэматыка гэтых артыкулаў – выключна палітычная, што відаць і з большасьці іхных назваў: «Спалохаліся народнага руху» (нумар ад 18 красавіка 1926 г.), «Сусьветны мір» (18 сьнежня 1926 г.), «Даўно пара» (8 студзеня 1927 г.), «Польская прэса» (29 студзеня 1927 г.), «Жэнэўская канфэрэнцыя» (3 верасьня 1927 г.), «Нявольніцкая псыхалёгія» (21 верасьня 1927 г.) і «Перамога нацыянальнай ідэалёгіі» (24 верасьня 1927 г.). І менавіта дзеля гэтага цяжка паверыць, што іхным аўтарам зьяўляецца Адам Більдзюкевіч, бо мне аніводнага разу не давялося бачыць тэксту выразна палітычнага характару, які быў бы падпісаны сапраўдным імем гэтага дзеяча. Усе безумоўна ягоныя, г. зн. не схаваныя пад спрэчным псэўданімам тэксты – выключна пра асьвету, каапэрацыю, сельскую гаспадарку або пра чыста арганізацыйныя пытаньні разьвіцьця Беларускага сялянскага саюзу і Беларускага інстытуту гаспадаркі і культуры. Як і Більдзюкевічава кніга «Асновы грамадзкай гаспадаркі» (М. Казлоўскі піша пра яе на с. 178–179) – для свайго часу цалкам неблагая, але абсалютна апалітычная.

Дарэчы, адзін з артыкулаў А. Незалежніка ў «Сялянскай ніве», «Нявольніцкая псыхалёгія», паводле свайго зьместу вельмі падобны да неаднаразова ўжо згаданага артыкулу «Тры шляхі» ў зборніку «З роднае нівы». Аўтар рэзка выступае супраць прадстаўнікоў палянафільскае арыентацыі ў заходнебеларускім руху, а таксама супраць арыентацыі прасавецкай, якую для А. Незалежніка на той момант увасабляў неафіцыйны рэдактар друкаваных выданьняў БСРГ Антон Луцкевіч.

Вось як выказвае сваю думку аўтар артыкулу: «Возьмем цяпер другі кірунак, усходні, ці інакш – саветафільскі. Гэты кірунак падтрымлівае беспрынцыпная газэта «Наша Праўда». «Н. Праўду» беспрынцыпнай называем затым, што яе кіраўнік А. Луцкевіч не прытрымліваецца ніякіх прынцыпаў, ніякай ідэалёгіі, ён ужо быў: **і сацыялістым, і нацыяналістым, і палянафілам, і германафілам, і франкафілам, і літвінафілам, і безвызнанёўцам, і мэтадыстам, і «беспартыйным», і «ідэйным» грамадзістым, і маскаляфілам** (тут і ў наступным абзацы вылучэньне маё. – **А. П.**), і нарэшце «санацыйным спадаровым сельсаюзьнікам».

А цяпер – іншая цытата зь іншага артыкулу, які быў апублікаваны ў «Сялянскай ніве» 12 траўня, меў назву «Раскрытыя карты», займаў добрыя паўстаронкі вялікафарматнай газэты і быў цалкам прысьвечаны крытыцы Антона Луцкевіча. Крытыка была жорсткая, у артыкуле пералічваліся ўсе рэальныя і ўяўныя грахі Луцкевіча, а ў канцы рабілася выснова: «Ён еў з усякага карыта, а цяпер ізноў хацеў вярнуцца да польскага. Ды нічога ў гэтым дзіўнага, бо мой пан «пракурор» патрапіў быць **і сацыялістым, і нацыяналістым, і палянафілам, і германафілам, і франкафілам, і літвінафілам, і безвызнанёўцам, і мэтадыстам, і нарэшце «беспартыйным», «ідэйным» грамадзістым і маскаляфілам**». Ня будзем тут ацэньваць слушнасьць абвінавачаньняў, выстаўленых Луцкевічу (як і маральнае права аўтара на іх), бо для нас цяпер важна ў першую чаргу тое, што артыкул, цытаваная вытрымка зь якога ў пэўных месцах бадай што слова ў слова супадае з прыведзенай яшчэ раней вытрымкай з артыкулу А. Незалежніка, быў падпісаны не псэўданімам, а сапраўдным імем: ***пасол Сойму Васіль Рагуля***.

Гэта, на маю думку, дастаткова важкі аргумэнт на карысьць таго, што ўладальнікам псэўданіму «А. Незалежнік» быў якраз гэты дзеяч, і, значыць, усе апублікаваныя пад гэтым псэўданімам матэрыялы належаць менавіта ягонаму пяру.

Праўда, трэба абавязкова ўлічваць і тое, што вельмі нэгатыўна ў той час ставіўся да Антона Луцкевіча ксёндз Адам Станкевіч, таму ў прынцыпе і ён мог бы напісаць падобныя словы, нават «пазычыўшы» фармулёўку ў Рагулі. Але пасьля ўважлівага азнаямленьня са зьместам усіх артыкулаў «А. Незалежніка» ў «Сялянскай ніве» я схіляюся да таго, што ўсё ж гэты псэўданім належыць самому Рагулю. Акрамя наўпроставага, ёсьць яшчэ і ўскосныя сьведчаньні на ягоную карысьць. Так, артыкул «А. Незалежніка» «Жэнэўская канфэрэнцыя» быў прысьвечаны чарговаму штогадоваму Кангрэсу нацыянальных меншасьцяў Эўропы, што меў неўзабаве адбыцца ў швайцарскай Жэнэве. У якасьці дэлегата ад беларусаў Польшчы ў 1927 г. на Кангрэсе прысутнічаў Васіль Рагуля. Нагодай для напісаньня артыкулу таго ж «А. Незалежніка» «Перамога нацыянальнай ідэалёгіі» стала далучэньне да Беларускага пасольскага клюбу ў польскім сойме былога пасла распушчанай незадоўга да гэтага Беларускай сялянска-работніцкай грамады Юр'я Сабалеўскага, а таксама паслоў беларускага паходжаньня Антона Шапеля і Ўладзімера Шакуна, якія ў 1922 г. прайшлі ў парлямэнт са сьпісу Польскай народнай партыі «Вызваленьне», а з 1924 г. уваходзілі ў фракцыю Незалежнай партыі хлопскай (аналягу беларускай Грамады на этнаграфічна польскіх землях). Стаўленьне аўтара артыкулу ў «Сялянскай ніве» да гэтай падзеі выключна станоўчае, што відаць нават з самой назвы. А вось газэта БХД «Bełaruskaja krynica» (якой, фактычна, кіраваў Адам Станкевіч) да пашырэньня БПК за кошт Шапеля і Шакуна (наконт Сабалеўскага ніякіх пытаньняў не ўзьнікала) паставілася больш стрымана, бо на ейных старонках зьявілася адно толькі кароткае паведамленьне пра падачу гэтымі пасламі адпаведнай заявы ў Клюб. У выніку абодва паслы афіцыйна ў БПК так і не былі прынятыя, падобна на тое, што менавіта з-за супраціву Станкевіча.

Дарэчы тут яшчэ будзе заўважыць, што калі ў ліку прынамсі патэнцыйных уладальнікаў спрэчнага псэўданіму стаў

фігураваць Васіль Рагуля, то падвісае ў паветры таксама і апэляцыя М. Казлоўскага да «стылістыкі пісьма» і «яго граматычнага ладу». Справа ў тым, што шлях Рагулі да беларускасьці быў настолькі пакручасты і складаны, што варты апісаньня ў асобнай працы. Тут жа мы заўважым толькі, што яшчэ ў 1917 г. ён быў адным з найбольш перакананых і актыўных праціўнікаў беларускага нацыянальнага руху, а пасьля, воляй лёсу да яго далучыўшыся, так да канца жыцьця і ня здолеў зжыць даволі паблажлівага стаўленьня да беларускай мовы. Так, вядомы беларускі камуністычны дзеяч, былы лідэр т. зв. «сэцэсіі» ў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў 1924–1926 гг. Міхал Гурын пісаў пра Рагулю ў канцы 1927 г. у сваіх успамінах: «Праўда, беларускі нацыянальны рух захапіў трохі і яго (апісваецца 1924 г. – **А. П.**), бо ён ужо гаварыў па-беларуску, гаварыў слабавата, горай нават чым па-польску, але пісаць па-беларуску ўпарта адмаўляўся і, здаецца, не практыкуе гэтага і сягоньня»[4]. Сьведчаньні Гурына ў гэтай справе, як мне падаецца, дастаткова праўдзівыя, бо ён ні ў якім разе ня быў праціўнікам Рагулі і не жадаў яго здыскрэдытаваць у вачах беларускага грамадзтва. Якраз наадварот, у ягоных успамінах Рагуля ў цэлым ацэньваецца як «чалавек… безумоўна сымпатычны». І калі Рагуля ў арыгінале пісаў свае творы па-расейску, а пасьля нехта іх за ім перакладаў, то можна тады казаць у першую чаргу пра стылістыку і асабліва мову ня аўтара, а перакладчыка. А хто быў перакладчыкам Рагулевых тэкстаў – невядома, зусім ня выключана, што і Адам Більдзюкевіч.

Зрэшты, калі дапусьціць, што спрэчны артыкул «Тры шляхі» М. З нягледзячы на ўсе выкладзеныя вышэй аргумэнты, усё ж сапраўды, як і мяркуе М. Казлоўскі, плён творчасьці Більдзюкевіча, то гэты факт можа сьведчыць пра гэта ня толькі з пазытыўнага боку. Так, у артыкуле ёсьць такія радкі:

[4] Гурын М. З нягледзячы на ўсё жыцьцё // Беларускі звон. 1927. № 29. 7 кастрычніка. С. 3.

Побач з вышэй успомненым кірункам (маецца на ўвазе прасавецкі кірунак у беларускім руху. – **А. П.**), *які ўзьнік сярод сапраўдных беларускіх арганізацыяў, дзякуючы толькі іх памылкам ці палітычнаму непрадбачаньню, быў створаны без удзелу Беларусаў фікцыйны беларускі кірунак з заходніцкай*

арыентацыяй, які меў на мэце толькі інтарэсы чужынцаў і ім выслугоўваўся. Лёзунгі гэтага кірунку асталіся кіненымі зусім на вецер, бо пры існуючых абставінах жыцьця ніхто не паверыў і ня верыць у магчымасьць паправы долі Беларускага народу, дзякуючы дабрадзействам пануючай улады. Не затрымліваемся больш над гэтым кірункам, бо ў ім немагчыма знайсьці і цені беларускае працы: усё, што там робіцца, пранікнута чужацкім духам, чужой апекай, шкоднай для беларускага адраджэнскага руху.

Гэтак «А. Незалежнік» ахарактарызаваў кірунак у заходнебеларускім нацыянальным руху, які называўся палянафільскім. Асноўнымі прадстаўнікамі гэтага кірунку зьяўляліся ў той час Беларуская нацыянальная рада на чале з Арсенем Паўлюкевічам і Беларуская нацыянальна-радыкальная партыя на чале з Францішкам Умястоўскім. Вышэйцытаваныя словы наўрад ці дапускаюць, каб іхны аўтар меў адносна палянафілаў нейкія ілюзіі і гатовы быў зь імі супрацоўнічаць. У той жа самы час, як сьцьвярджаецца ў кнізе М. Казлоўскага, у 1928 г. (акурат у год выданьня кнігі «З роднае нівы») Адам Більдзюкевіч «выйшаў зь Беларускага сялянскага саюзу і па некаторых палітычных пытаньнях салідарызаваўся з так званымі беларускімі палянафіламі, якіх узначальвалі Францішак Умястоўскі і Тодар Вернікоўскі (сябра Беларускай нацыянальнай рады. – **А. П.**)» (с. 179). Калі Більдзюкевіч сапраўды праявіў гэткую дзівосную «гнуткасьць» і, пішучы адно, рабіў зусім іншае, то ці варта дзівіцца, што пасьля яго «дзяўблі з усіх бакоў і ўсе разам… Беларускія левыя і правыя, хадэкі і камуністы, грамадоўцы і нацыяналісты ўбачылі раптам у яго асобе зьлейшага ворага, якога абавязкова трэба зьнішчыць» (с. 180)?

Дарэчы, калі ўжо міжволі закранулася праблема дачыненьняў Більдзюкевіча і іншых беларускіх дзеячаў у канцы 1920-х гг., то трэба адзначыць, што прычына атак на яго была ня толькі ў тым, што «ягоная кандыдатура не набрала патрэбную колькасьць галасоў сярод выбаршчыкаў» на парлямэнцкіх выбарах у сакавіку 1928 г. Польская выбарчая сыстэма была выразна прапарцыйнай: выбаршчыкі галасавалі не за

канкрэтных асобаў, а за партыі і блёкі. Таму на выбарах у Лідзкай выбарчай акрузе, дзе балятаваўся Адам Більдзюкевіч, прайграў не канкрэтна ён, а выбарчае аб'яднаньне, на першым месцы сьпісу якога ягоная кандыдатура была зьмешчаная – Блёк нацыянальных меншасьцяў (БНМ) Польскай Рэспублікі (зь беларускіх партыяў у яго ўваходзілі Беларуская хрысьціянская дэмакратыя, Беларускі сялянскі саюз і Беларускае праваслаўнае дэмакратычнае аб'яднаньне). Праўда, слова «прайграла» тут не зусім падыходзіць: Блёку нацыянальных меншасьцяў нават не далі паўдзельнічаць у барацьбе, бо лідзкая акруговая выбарчая камісія анулявала сьпіс БНМ разам са сьпісам блізкіх да камуністаў радыкальных былых «грамадоўцаў». У выніку больш за семдзесят тысячаў выбарнікаў з гэтай акругі дэманстрацыйна галасавалі за ануляваныя сьпісы, а пераможцу выбараў – праўладнаму Беспартыйнаму блёку супрацоўніцтва з урадам – хапіла для атрыманьня ажно чатырох дэпутацкіх мандатаў усяго 61 856 галасоў.

Наконт самой хады канфлікту М. Казлоўскі цалкам мае рацыю – «пачаліся інтрыгі, зьвягі, якія іншы раз перарасталі ў звычайны брудны палітычны паклёп» (с. 179). Цяжка сказаць, колькі выдумкі, а колькі праўды было, напрыклад, у такіх словах апанэнтаў, што Більдзюкевіч «павадзіўся і навет пабіўся са сваімі ранейшымі прыяцельмі (кс. А. Станкевіч і Ф. Ярэміч – яго пабілі па твару) і адышоў ня толькі ад іх, але адчураўся ўсяго беларускага руху»... «пайшоў у палякі» і залажыў у Вільні польскую школу... нядобра разьлічыўся з даручанымі яму ў 1928 г. выбарнымі грашыма»[5]. Дакладна не адпавядае сапраўднасьці, аднак, тое, што Більдзюкевіч «бязь лішніх спрэчак і звадак… адышоў ад вялікае палітыкі, даючы магчымасьць рэалізавацца іншым» (с. 180). Калі вясной 1930 г. Вярхоўны суд Польшчы прызнаў выбары 1928 г. у шэрагу акруг, у тым ліку і ў Лідзкай, сфальшаванымі і прызначыў новыя выбары, Більдзюкевіч адмовіўся зьняць сваю кандыдатуру са сьпісу Блёку нацыянальных меншасьцяў, разьлічваючы, відаць, прайсьці ў сойм коштам працы былых сваіх палітычных саюзьнікаў, але ў час выбараў – ужо непрымірымых супернікаў. Што зробіш, нашыя нацыянальныя дзеячы – таксама жывыя людзі, а апошнім, як вядома, уласьціва мець як вартасьці, так і

недахопы. Менавіта так мы іх і павінны ўспрымаць. І каб добра спазнаць сваю гісторыю, мы мусім вывучаць яе ня толькі з пазытыўнага боку, але і з нэгатыўнага.

А той казус, які адбыўся з ідэнтыфікацыяй асобы ўладальніка псэўданіму «А. Незалежнік», наглядна дэманструе нам, што праблемай расшыфроўкі псэўданімаў, якімі падпісваліся беларускія публіцысты свае артыкулы ў газэтах і часопісах Заходняй Беларусі, даўно пара заняцца навукова. Праўда, яшчэ ў савецкі час на гэтую тэму была выдадзеная праца Янкі Саламевіча[6], якая і сёньня свайго значэньня ня страціла. Аднак з таго часу кардынальна памяняліся погляды на многія гістарычныя падзеі, былі вернутыя зь нябыту імёны дзясяткаў раней паўмыслова замоўчваных дзеячаў. Аказалася, што і беларускае грамадзка-палітычнае жыцьцё ў той жа Заходняй Беларусі не абмяжоўвалася «барацьбой працоўных пад штандарамі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі супраць польскіх абшарнікаў і буржуазіі ды іх нацыянал-фашысцкіх памагатых». Сёньня не бязь цяжкасьцяў, але вядуцца спробы аднавіць рэальную карціну тагачаснага заходнебеларускага палітычнага жыцьця, а пры нерасшыфраванасьці псэўданімаў бадай што ў кожнага нават сумленнага дасьледніка ўзьнікае неўсьвядомленае жаданьне прыпісаць іх «патрэбнаму» дзеячу. У практыцы аўтара гэтых радкоў калісьці таксама быў выпадак, калі ён у адным з артыкулаў інтуітыўна прыпісаў псэўданім «Davidoviі», якім карыстаўся адзін з публіцыстаў газэты «Bełaruskaja kryniса», Адаму Станкевічу[7] – і памыліўся. Насамрэч гэты псэўданім, як удалося пасьля выявіць, належаў іншаму Станкевічу – Янку. У гэтым выпадку, праўда, прынцыпова памылка ні на што асабліва не паўплывала, але часам бывае і зусім іначай.

Вернемся, аднак, да кнігі М. Казлоўскага. Падрабязна разгледжаная вышэй сытуацыя з псэўданімам – не адзіная, на жаль, недакладнасьць, дапушчаная аўтарам. Напрыклад, на с. 25, у артыкуле пра Маладэчанскую настаўніцкую сэмінарыю, згадваецца Гадыцкі-Цьвірка, які быў дырэктарам гэтай навучальнай установы ў 1900–1907 гг. Казлоўскі адзначае, што «хоць яго і не любілі сэмінарысты, хоць ён пакінуў ня вельмі добрую памяць, але менавіта гэты чалавек уваходзіў у розныя

5 Палітыка. Вільня, 1930. 7 траўня. С. 2.

6 Саламевіч Я. Слоўнік беларускіх псэўданімаў і крыптанімаў (XVI–XX стст.). – Мінск, 1983.

7 Пашкевич А. Взаимоотношения представительств евреев и славянских национальных меньшинств в парламенте межвоенной Польши в 1922–1927 гг. // Материалы Двенадцатой Ежегодной Международной Междисциплинарной конференции по иудаике. Ч. 2. Москва, 2005. С. 145.

беларускія арганізацыі, пачынаючы зь лёсавызначальнага для Беларусі 1918 г.» (с. 25). У гэтым выпадку аўтар, відавочна, стаў ахвярай тае блытаніны, якая зьвязаная з існаваньнем у гісторыі беларускага нацыянальнага руху ажно двух вядомых дзеячаў з прозьвішчам Цьвірка-Гадыцкі. Аднаго зь іх звалі Кастусём, і ён сапраўды быў пэдагогам, перад рэвалюцыяй працаваў у розных навучальных установах, а пасьля рэвалюцыі – у Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце, займаючыся, сярод іншага, распрацоўкай беларускай навуковай тэрміналёгіі. А як сябра мноства беларускіх арганізацыяў пачынаючы нават ня з 1918-га, а з 1917 г. больш адзначыўся іншы Цьвірка-Гадыцкі – Казімер. Але ж ня гэта галоўнае. Абодва гэтыя дзеячы ў акрэсьленыя М. Казлоўскім гады не маглі займаць такую высокую пасаду, як дырэктар настаўніцкай сэмінарыі, з зусім простай прычыны – яны былі тады для гэтага занадта маладыя. Кастусь у 1900 г. меў дваццаць гадоў (і быў толькі студэнтам фізыка-матэматычнага аддзяленьня Маскоўскага ўнівэрсытэту), а Казімер – усяго адзінаццаць. Таму несумненна, што дырэктарам сэмінарыі ў 1900–1907 гг. быў нейкі зусім іншы Цьвірка-Гадыцкі, факт наступнага ўдзелу якога ў беларускім нацыянальным руху прынамсі сумнеўны.

Выказаныя вышэй заўвагі да кнігі нарысаў Міхася Казлоўскага ні ў якім разе ня маюць на мэце прынізіць значэньне ягонай самаахвярнай працы. Так, пэўныя памылкі і недакладнасьці ён дапусьціў, але добра вядома, што ніколі не памыляцца можа толькі той, хто нічога ня робіць. А Міхась Казлоўскі робіць вялікую працу. Скажам шчыра: не было б хай сабе трохі і ідэалізаванага нарысу М. Казлоўскага пра Адама Більдзюкевіча – не было б і выкладзеных у гэтай рэцэнзіі ўдакладненьняў біяграфіі апошняга. І значыць – наагул гэты дзеяч быў бы для нас невядомы, як і дзясяткі ды сотні іншых, што маюць безумоўныя заслугі перад Бацькаўшчынай. Па-ранейшаму «не пісалі б пра яго тоўстыя энцыкляпэдыі і салідныя даведнікі, пра яго маўчалі б беларускія гісторыкі і краязнаўцы, мовазнаўцы і эканамісты» (с. 171). А Казлоўскі напісаў практычна з нуля біяграфію ня толькі Більдзюкевіча, але і іншых малавядомых заходнебеларускіх дзеячаў: аднаго зь лідэраў Беларускага студэнцкага саюзу Тодара Куніцкага, рэдактара сельскагаспадарчага часопісу «Саха» і таленавітага публіцыста-

асьветніка Міколы Ільяшэвіча, дырэктара Вялейскай беларускай настаўніцкай сэмінарыі Мікалая Грышкевіча, загадчыка беларускай друкарні ў Маладэчне Міхася Станкевіча, настаўніка Пятра Зяновіча, слонімскага мастака Антона Карніцкага, цэлай сьвядомай беларускай сям'і Шутовічаў са Смаргоншчыны. Ці шмат пра гэтых людзей, якія ў свой час вялікія намаганьні паклалі на тое, каб ня згас агонь беларушчыны, ведаюць нават прафэсійныя дасьледнікі беларускай гісторыі і культуры? І ці шмат у нас кніжак, у якіх цікава і зьмястоўна апісваецца разьвіцьцё адукацыі ў адным асобна ўзятым невялікім рэгіёне, прытым з асаблівым упорам на тое, якое значэньне гэтая адукацыя мела для разьвіцьця беларускага нацыянальнага руху? А калі яшчэ да ўсяго гэтага дадаць, што кніга мае ўклейку з 76 фатаздымкамі, многія зь якіх – унікальныя, то можна толькі падзякаваць аўтару за ягоную ахвярную працу. І яшчэ пажадаць, каб ягоны творчы куфэрак і надалей не пусьцеў. Тым больш што забытых дзеячаў у Беларусі, на жаль, столькі, што працы ў вяртаньні зь нябыту іхных імёнаў хопіць, відаць, яшчэ не аднаму пакаленьню дасьледнікаў.

[image]

[image]

№ 10 (50) - 2006

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/10/08

[image]

[image] [image] [image]

Рой Алісан, Стывэн Ўайт, Марго Лайт

Беларусь між Усходам і Захадам

(друкуеццца ў скароце)

Пасьля развалу СССР зноў паўстала пытаньне, да якой цывілізацыі аднесьці Беларусь: эўрапейскай ці славянска-бізантыйскай. На фоне «дэмакратызацыі» палітычнага жыцьця ў рэгіёне Беларусь рухаецца ў супрацьлеглым кірунку — да усё больш і больш рэпрэсіўнай формы прэзыдэнцкай улады. Заходнія палітыкі называюць краіну «апошняй дыктатурай у цэнтры Эўропы». Адпаведна зьмяняецца і ейная арыентацыя ў міжнародных стасунках. Калі Захад адмоўна ўспрыняў вынікі лістападаўскага рэфэрэндуму 1996 г., палітычны вэктар схіліўся ў бок значна шчыльнейшага саюзу з Расеяй. Гэта адбывалася ў кантэксьце пашырэньня НАТО і Эўразьвязу, куды ўвайшлі некаторыя суседзі Беларусі. Таму як ніколі раней востра паўстала праблема «эўрапейскага» ці «славянскага» выбару.

ЗАМЕЖНАЯ ПАЛІТЫКА З ГЛЕДЗІШЧА ЎЛАДЫ

МАРГО ЛАЙТ прафэсар у адстаўцы Лёнданскай школы эканомікі. У сфэру яе навуковых інтарэсаў уваходзіць палітыка краінаў СНД. Апошняя публікацыя ў рэцэнзаванай часопісе «Ukraine, Belarus and Moldavia: Europe’s New Neighbourhood» у зборніку «Les Européens face à l’élargissement: Perceptions, acteurs, enjeux»

Афіцыйную пазыцыю Беларусі ў істотных пытаньняў палітыкі вызначае і фармулюе прэзыдэнт Лукашэнка. Схільнасьць да папулісцкіх выказваньняў і напышлівых самаўсхваленьняў часта заводзіць яго вельмі далёка ад дыпляматычнай мовы, неабходнай дзеля вырашэньня практычных пытаньняў у міждзяржаўных дачыненьнях. Словы Лукашэнкі насамрэч часам уводзяць у зман, бо ў шматлікіх галінах Беларусь ажыцьцяўляе больш прагматычную замежную палітыку, чым можна ўявіць з гучнавых прамоваў кіраўніка дзяржавы. Здаецца, ягоная сапраўдная мэта – дамагчыся падтрымкі народу, стварыць вобраз прэзыдэнта – рашучага абаронцы дзяржаўных інтарэсаў.

(Edited by Raupnik, J. Presses de Sciences Po. PO/ALISAN

Беларусь, Эўропа, Эўразьвяз

СТЫВЭН Л. ЎАЙТ

Беларусь мяжуе з краінамі Эўразьвязу, якія ў будучыні могуць стаць вельмі істотнай крыніцай капіталаўкладаньняў і з Расеяй і найбуйнейшым на цяперашні час гандлёвым партнэрам Беларусі. Хаця б з гэтых эканамічных прычынаў беларускае кіраўніцтва, натуральна, спрабуе пазбегнуць неабходнасьці выбіраць паміж Усходам і Захадам і падтрымлівае трывалыя адносіны Беларусі ня толькі да «Эўропы», але і да славянскага ці эўразійскага сьвету. Бясспрэчна, напружаныя, досыць халодныя дачыненьні паміж Беларусьсю і Эўразьвязам абумоўленыя нежаданьнем краіны рабіць адназначна «эўрапейскі выбар». Эўразьвяз прысутнічае ў Беларусі ў выглядзе «парлямэнцкай тройкі», у якую ўваходзяць прадстаўнікі Эўрапарлямэнту, а таксама Парлямэнцкіх Асамблеяў АБСЭ і Рады Эўропы. Аднак ім практычна не ўдаецца дасягнуць сваёй мэты – пераканаць беларускія ўлады прывесьці ўнутранае заканадаўства ў адпаведнасьць з агульнапрынятымі дэмакратычнымі прынцыпамі. Гэта істотна абмяжоўвае супрацоўніцтва Эўразьвязу зь Беларусьсю. Цяперашняе беларускае кіраўніцтва, калі меркаваць паводле афіцыйных заяваў, з асьцярогай ставіцца да пашырэньня Эўразьвязу і, відаць, не чакае, што ў агляднай будучыні краіна далучыцца да гэтага працэсу.

(Edited by Auty, R.; I., de Boer, R., 2006)

СТЫВЭН Л. ЎАЙТ прафэсар міжнароднай палітыкі ўнівэрсытэту Глазга, галоўны рэдактар квартальніка «Journal of Communist Studies and Transition Politics». Выву чае наступствы пашырэньня ЭЎ і НАТО для палітычнага курсу Расеі, Украіны і Беларусі, а таксама мэты, партыі і электаральныя прэфэрэнцыі ў посткамуністычнай Расеі. Аўтар кнігі «Communism and its Collapse» (London and New York: Routledge 2001).

У выніку пашырэньня Эўразьвязу ў 2004 г. Беларусь апынулася, як кажа Лукашэнка, паміж «сусьветным эканамічным гігантам –

Эўразьвязам», з захаду, і «эўразійскім гігантам – Расеяй», з усходу. Беларускі лідэр падкрэсьлівае, што ў гэтай новай канфігурацыі «Беларусь – ня буфэрная дзяржава і не васал ані Эўрапейскага Зьвязу, ані Расеі». Беларусь можа быць мастом між імі, «галоўнай краінай транзыту» для Эўразьвязу. Паколькі краіны Эўропы зацікаўленыя ў пашырэньні партнэрства з Расеяй у энэргетычнай галіне, Лукашэнка сьцьвярджае, што без удзелу Беларусі падобнае супрацоўніцтва ня будзе эфэктыўным і стабільным.

Зазіраючы наперад, Лукашэнка неадназначна выказваецца пра магчымасьць далучэньня Беларусі да Эўразьвязу ў будучыні. З аднаго боку, ён зьвяртае ўвагу, што «…мы ня просімся ў Эўразьвяз. Ні мы, ні яны да гэтага не гатовыя… Мы не спрабуем ім навязвацца». З другога – беларускі прэзыдэнт заяўляе, што «…як толькі мы [Эўразьвяз і Беларусь] дасягнем кампрамісу, як толькі нашыя інтарэсы супадуць, Беларусь, верагодна, увойдзе ў Эўразьвяз». Хоць Лукашэнка цьмяна ўяўляе сабе патрабаваньні да прэтэндэнтаў на далучэньне, але і гэтая ягоная заява сьведчыць, што Беларусь можа ўзяць сабе за мэту ўвайсьці ў эўрапейскую супольнасьць. Праўда, тады гэтую задачу трэба будзе неяк дастасаваць да інтэграцыі ў структуры, якія ўзначальвае Расея.

Лукашэнка даводзіць, што з гледзішча «міграцыі, гандлю наркотыкамі і зброяй і шмат-шмат яшчэ якой незаконнай дзейнасьці… мы служым бар'ерам… для Эўразьвязу». Магчыма, ён спадзяваўся, што на знак «удзячнасьці» за паслугі Эўразьвяз абміне ўвагаю палітычнае становішча ўнутры краіны і схіліцца да практычнага дыялёгу ў пытаньнях аховы межаў.

Беларусь і НАТО

У 1990-я гг., жорстка крытыкуючы НАТО, Лукашэнка выказваў шкадаваньне, што Беларусь адмовілася ад ядравай зброі, і заклікаў стварыць вось Менск–Масква–Пэкін, каб супрацьпаставіць яе пашырэньню НАТО на ўсход. Падобныя заявы стваралі Лукашэнку імідж непахіснага абаронцы славянска-праваслаўнага адзінства, якому нібыта пагражаў Захад у асобе НАТО. У пэўнай ступені гэтымі прамовамі

беларускі лідэр імкнуўся забясьпечыць сабе яшчэ большую падтрымку ўнутры краіны. Але ў пэрыяды напружанасьці ў дачыненьнях Расеі з НАТО рыторыка Лукашэнкі таксама пераконвала Расею, што Беларусь – надзейны шчыт ейнай абароны на заходнім флянгу, і, такім чынам, была дзейсным сродкам, каб дамагчыся ад Расеі эканамічных ільготаў. Аднак на практыцы, калі спала напружанасьць, выкліканая кампаніяй у Косаве, беларускае кіраўніцтва зьмяніла тон сваіх выказваньняў на больш міралюбны.

У сакавіку 2004 г. тры зь пяці суседніх зь Беларусьсю дзяржаваў увайшлі ў склад НАТО. Агульная працягласьць іхнай мяжы зь Беларусьсю – амаль 1500 км. У заявах, разьлічаных на расейскую і беларускую аўдыторыю, Лукашэнка б'е ва ўсе званы з гэтай нагоды. Але ў астатніх выпадках ён выказваецца досыць спакойна. Лукашэнка наракае, што тэрыторыя Беларусі ад краю да краю накрытая сродкамі тэхнічнай выведкі, а самалёты НАТО робяць аблёты беларускай мяжы. Ён папярэдзіў, што нават такія невялікія краіны, як Беларусь, могуць стварыць сыстэмы абароны, здольныя супрацьстаяць патэнцыйнаму агрэсару. Зь іншага боку, беларускае вайсковае кіраўніцтва сьцьвярджае, што ня бачыць прычынаў на цяперашнім этапе называць НАТО ворагам.

Беларусь вымушаная пагадзіцца зь неабходнасьцю ўсталёваць пэўныя двухбаковыя дачыненьні з Паўночнаатлянтычным альянсам. Асабліва складаная для яе праблема – як супрацоўнічаць з НАТО ў галіне практычных пытаньняў бясьпекі на такой аснове, што дазваляла б адхіляць патрабаваньні Захаду да беларускіх уладаў перагледзець іхную ўнутраную палітыку. Тактыка Лукашэнкі – даводзіць, што, адрозна ад некаторых новых дзяржаваў у складзе НАТО, Беларусь ня просіць дапамогі, а прапаноўвае яе. Беларускі прэзыдэнт кажа, што Захад і НАТО ня змогуць паставіць надзейнага заслону ўздоўж сваіх межаў для «тэрарыстаў, нелегальных мігрантаў, наркотыкаў, незаконных паставак зброі, у тым ліку і ядравай» без супрацоўніцтва зь Беларусьсю. Можа, гэта і перабольшваньне, але згаданы чыньнік, верагодна, паўплываў на тое, што цяпер дачыненьні паміж Беларусьсю і НАТО паляпшаюцца. Аднак найбольш аўтарытэтныя заходнія

дзяржавы не прымаюць аўтарытарных мэтадаў кіраваньня Лукашэнкі, і таму малаверагодна, што лёгкае збліжэньне Беларусі з НАТО атрымае далейшы імпульс.

Беларусь і міжнародныя структуры на чале з Расеяй

У сваёй афіцыйнай палітыцы Беларусь надае выразны прыярытэт удзелу ў міжнародных структурах, што ўвасабляюць «інтэграцыю СНД». Тлумачыцца гэткая арыентацыя пачуцьцем «славянскай салідарнасьці» і ўяўленьнем, што Беларусі трэба «прычапіцца» да эканамічна нашмат магутнейшай Расеі. Але ў падобнай палітыцы, апроч таго, адлюстроўваецца выснова, што «эўрапейскі выбар», у канчатковым выніку прывязаны да ўваходжаньня ў Эўразьвяз, для Беларусі, як і для іншых краінаў СНД, – справа нявыгадная.

Падобна, што беларускае кіраўніцтва востра адчувае нестасоўку паміж сваёй традыцыйнай прыхільнасьцю да інтэграцыі на ўсход і адсутнасьцю прагрэсу ў гэтым кірунку. У звароце да нацыі ў красавіку 2004 г. Лукашэнка назваў СНД «кволай і безжыцьцёвай» структурай у параўнаньні з «дынамічным» Эўразьвязам. Ён адзначыў, што за папярэдні год СНД «ня вырашыла ніводнага важнага пытаньня». А празь некалькі месяцаў Лукашэнка выказаў меркаваньне, што калі СНД і надалей будзе працаваць гэтак жа неэфэктыўна, яна «застанецца, але проста як палітычны клюб, дзе сустракаюцца прэзыдэнты, нешта абмяркоўваюць, але ніякіх рашэньняў не прымаюць».

Нашмат больш істотны для беларускага афіцыйнага дыскурсу Саюз Беларусі і Расеі. Але абедзьвюм дзяржавам усё ніяк не ўдаецца ўвесьці ў дзеяньне рашэньні, датычныя ўніфікацыі заканадаўства і эканамічнай інтэграцыі. А значыць, саюз мае досыць віртуальны характар. Да яго дадае і недахоп адміністрацыйных і фінансавых рэсурсаў, і разыходжаньні расейскага і беларускага прэзыдэнтаў у стаўленьні да эканамічнай рэформы. Увогуле Лукашэнку непакоіць, што, з аднаго боку, ідэя саюзу, як яго бачыць Расея, пагражае сувэрэнітэту Беларусі (і асабістай уладзе беларускага лідэра), а з другога – што саюзная дамова страціць усялякае рэальнае

напаўненьне і будзе абсалютна нядзейсная. Лукашэнка вельмі чуйна рэагуе на патэнцыйныя спробы пуцінскай Расеі паглынуць Беларусь. У 2004 г. ён сказаў: «Мы ня можам вяртацца да абразьлівай прапановы інкарпараваць Беларусь у склад Расеі», а таксама: «Аншлюс і саюз – гэта дзьве зусім розныя рэчы». Лукашэнка трымаецца тае думкі, што ўводзіць расейскі рубель у якасьці супольнай грашовай адзінкі трэба толькі на канчатковым этапе інтэграцыі, калі будуць выкананыя ўсе папярэднія пагадненьні з Расеяй, асабліва ў сацыяльна-эканамічнай сфэры. Такім чынам, увядзеньне адзінай валюты – у лепшым выпадку справа аддаленай будучыні.

ЗАМЕЖНАЯ ПАЛІТЫКА З ГЛЕДЗІШЧА ЎЛАДЫ І АПАЗЫЦЫІ

Як ні дзіўна, праведзеныя намі інтэрвію выявілі значнае падабенства меркаваньняў паміж беларускай уладай і рознымі групоўкамі, што складаюць палітычную апазыцыю. І тыя, і другія – пераканаными прыхільнікі сувэрэнітэту і незалежнасьці. І тыя, і другія выступаюць за разьвіцьцё добрых стасункаў з Эўразьвязам. Існуе агульная згода, што як бы ні складваліся абставіны, Беларусь мусіць падтрымліваць добрыя дачыненьні з Расеяй. Улада і апазыцыя разыходзяцца перадусім у разуменьні сродкаў, каб дасягнуць гэтых мэтаў.

Нас асабліва цікавіла, ці можа Беларусь лічыцца за частку Эўропы, якія наступствы мела пашырэньне Эўразьвязу і НАТО, як павінны разьвівацца дачыненьні Беларусі з гэтымі арганізацыямі ў будучыні, наколькі дзейсна працуе СНД і іншыя рэгіянальныя структуры на постсавецкай прасторы. Супастаўленьне інтэрвію, праведзеных у 2000 і ў 2005 гг., выявіла некаторыя яскравыя адрозьненьні. Найперш за гэты час узрасла ступень упэўненасьці, што Беларусь – сапраўды частка Эўропы. Зьменшылася занепакоенасьць магчымымі наступствамі пашырэньня Эўразьвязу і НАТО. Цьвёрда ўсталявалася меркаваньне, што Беларусь мусіць падтрымліваць добрыя стасункі з эўрапейскай супольнасьцю, выказвалася большая, чым раней, гатоўнасьць да супрацоўніцтва з НАТО. Пануе агульны скепсіс што да СНД і іншых структураў, у якія

ўваходзіць Беларусь, у т. л. і датычна саюзу з Расеяй.

І ў 2000 г., і ў 2005 г. апытаныя ўвогуле пагаджаліся, што Беларусь – эўрапейская краіна. Але ў інтэрвію 2005 г. выказвалася менш сумневаў, ці зможа Беларусь застацца сувэрэннай і незалежнай эўрапейскай дзяржавай, менш увагі надавалася былым дачыненьням з СССР і Расеяй. Напрыклад, чыноўнік Міністэрства замежных справаў сьцьвярджае: «Беларусы – эўрапейцы». А ў іншым інтэрвію дзелавая жанчына заявіла: «Беларусь – абсалютна эўрапейская краіна, ня толькі геаграфічна, але і таму, што паводле свайго мэнталітэту мы падзяляем эўрапейскія каштоўнасьці».

У 2000 г. да пашырэньня Эўразьвязу ў Беларусі ставіліся з досыць вялікай доляй насьцярогі. Празь пяць гадоў вельмі мала хто думаў, што яно нанесла шкоду інтарэсам Беларусі. У 2000 г. адзін уплывовы журналіст, зь якім мы размаўлялі, адзначыў, што ўваходжаньне Польшчы ў Эўразьвяз абернецца «суворымі» наступствамі для беларусаў. Празь пяць гадоў ён жа казаў, што сяброўства Польшчы ў Эўразьвязе ніяк не адбілася на Беларусі, а памежны «чаўночны» гандаль працягваецца, як і раней. Відавочна, з апошняе дзесяцігодзьдзе гандлёвае абарачэньне Беларусі з Эўропай павялічылася, і ягонаму росту яшчэ больш паспрыяла пашырэньне Эўразьвязу.

А як палітычная эліта бачыць стасункі Беларусі з Эўразьвязам у будучыні? У 2000 г. існаваў выразны падзел паміж афіцыйнымі асобамі, якія востра крытыкавалі Эўразьвяз, і дзеячамі апазыцыі, якія выступалі за «эўрапейскі выбар» Беларусі. Сёньня ўсе адзінадушна выказваюцца за добрыя дачыненьні з Эўразьвязам. Афіцыйны падыход грунтуецца на тым, што Эўразьвяз цяпер стаў суседам Беларусі, а з суседзямі, як сказаў чыноўнік Міністэрства замежных справаў, спасылаючыся на Лукашэнку, «трэба сябраваць больш, чым са сваякамі».

Сярод апазыцыі мы не знайшлі нікога, хто выступаў бы супраць таго, каб мець добрыя стасункі з Эўразьвязам. Аднак шэраг апанэнтаў беларускай улады выказваліся за ўвядзеньне Эўразьвязам санкцыяў супраць Беларусі. Усе апазыцыянэры віталі прынятую ў сакавіку 2005 г. рэзалюцыю Эўрапейскага Парлямэнту па Беларусі, у якой Беларусь названая

«дыктатурай», а асабіста Лукашэнка – «дыктатарам». Да таго ж усе апазыцыйныя палітыкі выказвалі пажаданьне, каб Эўразьвяз унёс у сваё заканадаўства зьмены, якія дазволілі б дзейнічаць у абыход беларускіх уладаў і фінансаваць ячэйкі грамадзянскае супольнасьці (такія, як апазыцыя).

На стаўленьне да НАТО ў 2000 г. усё яшчэ ўплывалі вынікі кампаніі ў Косаве, якая выклікала ў Беларусі гэткае ж абурэньне, што і ў Расеі. Але да 2005 г. запанавалі больш пазытыўныя настроі, хоць афіцыйная прапаганда па-ранейшаму паказвае НАТО ў тых самых фарбах, што і ў час халоднае вайны. Як заўважыў рэдактар адной зь нешматлікіх ацалелых лібэральных газэтаў, будучыня стасункаў паміж Беларусьсю і НАТО залежыць ад расейскага чыньніка. Калі Расея пачне спакайней ставіцца да НАТО, Паўночнаатлянтычны альянс у Беларусі перастануць успрымаць як праблему, і краіна пачне імкліва рухацца ў бок НАТО. Мы пачулі меркаваньне, што Лукашэнка паказвае гатоўнасьць зблізіцца з НАТО (ці з Эўразьвязам), калі хоча крыху пашантажаваць Расею.

З гледзішча большасьці апазыцыйных дзеячаў і лібэральных палітаглядальнікаў, асноўная пагроза Беларусі зыходзіць ад ейнага палітычнага рэжыму – ад некампэтэнтнасьці ўлады і аўтарытарызму. Для іх галоўная небясьпека – захаваньне цяперашняга рэжыму, які праводзіць палітыку самаізаляцыі. Сюды, казалі апытаныя, дадаецца рост падазронасьці да краінаў-суседзяў і адсутнасьць грамадзянскай супольнасьці. Гэта вядзе да адасабленьня ад дэмакратычных і дабратворных эканамічных працэсаў. Узьнікае заганнае кола: чым бяднейшыя людзі, тым мацнейшая іхная залежнасьць ад палітычнага кіраўніцтва краіны.

Ад 2000 г. да 2005 г. істотна зьмянілася стаўленьне да СНД і іншых міжнародных арганізацыяў, узьніклых на постсавецкай прасторы. У 2000 г. афіцыйныя асобы, што падтрымлівалі Лукашэнку, вельмі станоўча ацэньвалі СНД і Саюз Беларусі і Расеі. Апазыцыйныя палітыкі, у сваю чаргу, давалі рэзка адмоўныя характарыстыкі абедзьвюм структурам. На нашае глыбокае зьдзіўленьне, у інтэрвію 2005 г. усялякія згадкі пра СНД выклікалі абыякавасьць, а часам і кепікі, прычым ня толькі

ў асяродку апазыцыі. СНД называлі «эфэмэрнай арганізацыяй, мяккай формай разводу», «трупам», «бескарыснай і неэфэктыўнай», «клюбам прэзыдэнтаў, які ня мае ніякай палітыкі і не прыносіць ніякай карысьці».

Нас яшчэ больш зьдзівіла, як мала аптымізму выклікае Саюз Беларусі і Расеі, прычым ня толькі з боку апазыцыі. Сам Лукашэнка гаворыць пра «нізкую эфэктыўнасьць асобных элемэнтаў у сыстэме беларуска-расейскага саюзу».

Увогуле ў 2005 г. заўважалася больш моцнае ўсьведамленьне незалежнасьці беларускай саматоеснасьці. Як і Лукашэнка, шмат якія іншыя палітычныя фігуры бачаць Беларусь транзытнай зонай. Пераважае разуменьне, што само геаграфічнае становішча Беларусі – яе стратэгічны запас у дачыненьнях і з Расеяй, і з Эўразьвязам. Палітыкі выказваюць значна больш аптымізму наконт супрацоўніцтва з Эўропай і з Эўразьвязам, чым наконт любой арганізацыі на постсавецкай прасторы. Адпаведна, погляды цяперашняй эліты не ўяўляюць перашкоды на шляху да паляпшэньня дачыненьняў Беларусі з Эўразьвязам. У гэтым аспэкце, як і ў іншых, выяўляецца значна большае адзінства мэтаў паміж Лукашэнкам і ягонымі палітычнымі апанэнтамі, чым можна было б меркаваць, зыходзячы зь іхных унутрыпалітычных супярэчнасьцяў.

ЗАМЕЖНАЯ ПАЛІТЫКА З ГЛЕДЗІШЧА ПРОСТЫХ ГРАМАДЗЯНАЎ

Наколькі гэтыя погляды падзяляюць звычайныя людзі? Каб адказаць на гэтае пытаньне, мы правялі дасьледаваньні ў фокус-групах у 2000 і ў 2005 гг. і агульнанацыянальныя рэпрэзэнтацыйныя апытаньні ў 2000 і ў 2004 гг. Ніжэй прыведзеныя пераважна меркаваньні ўдзельнікаў дзьвюх фокус-групаў, апытаных у Менску ў сакавіку 2005 г. У кожнай было восем асобаў працоўнага ўзросту з роўнай колькасьцю мужчынаў і жанчын.

Шараговыя грамадзяне рэдка вызначаюцца глыбокай дасьведчанасьцю ў пытаньнях замежнай палітыкі. Але нас

найперш цікавіла агульная арыентацыя: куды яны сябе залічваюць культурна і геаграфічна, як уяўляюць Эўропу, Расею і СНД, якія праблемы замежнай палітыкі іх хвалююць, а якія – не?

Удзельнікі нашых фокус-групаў пераважна бачаць сябе часткай славянскага сьвету, а не Эўропы, але тлумачаць гэта па-рознаму. На думку адных, тут вінаватае кіраўніцтва, асабліва адзін пэўны кіраўнік. Аднак большасьць апытаных казала, што прычына – у самім грамадзтве, ягонай мэнтальнасьці. Напрыклад, інжынэр трактарнага заводу Мікалай, які часта сустракаецца з расейцамі, фінамі, швэдамі, немцамі і г. д., сьцьвярджае, што Беларусь – ціхае балота ня столькі празь ейнага лідэра, колькі празь «нязломную інэртнасьць – народ папросту такі». Інспэктар па тэхніцы бясьпекі Белдзяржфілярмоніі Андрэй заўважае, што дасюль дзейнічае стары прынцып: «Я начальнік – дурань ты», як было і за царом-бацюхнам, і за камуністамі, як заўсёды было і будзе. На думку яшчэ аднаго інжынэра, Паўла, гэткія погляды часткова абумоўленыя ўзростам: старэйшае пакаленьне паводле свайго ўзгадаваньня дасюль застаецца «савецкім». Але людзям у значна большай ступені ўласьцівыя агульная абыякавасьць, чаканьне, што за іх усё зробяць, і страх, што калі яны праявяць самастойнасьць, «начальства зь імі разьбярэцца». Гэта перадусім датычыцца праваслаўных і ў меншай меры – пратэстантаў і каталікоў. На думку праваслаўных, галава дзяржавы кіруе ўсім, у т. л. грамадзкімі арганізацыямі і справамі рэлігіяў «у нейкай азіяцкай, ці бізантыйскай, манеры».

Беларусы розьняцца ад эўрапейцаў і тым, як яны працуюць ды бавяць вольны час, і не ў апошнюю чаргу спажываньнем алькаголю. Зваршчык з трактарнага заводу Валер кажа, што «паводле таго, колькі п'юць, гэта славянская краіна, а зусім не эўрапейская». Эўрапейцы па-іншаму праводзяць вольны час, заўважыў загадчык дасьледчай лябараторыі Яраслаў, які шмат пажыў у Нямеччыне: «У Эўропе таксама ёсьць свае п'яніцы і наркаманы, але агульны ўзровень жыцьця, агульная культура вельмі розьняцца ад нашых». Больш за ўсё гэта выяўляецца ў тым, як эўрапейцы працуюць – пераважна дзеля саміх сябе. У Беларусі ў гэтым няма сэнсу. А ў вольны час «людзі прыходзяць

дахаты, уключаюць тэлевізар – і ўсё. А ў Нямеччыне ёсьць кавярні, людзі сядзяць, п'юць каву, гутараць…» Мэліта адзначае, што ў розных частках Беларусі – па-рознаму: брудна на ўсходзе, чысьцей на захадзе, і найчысьцей – каля польскай мяжы: «Ня ведаю, чаму». Але на думку Ніны, прадпрымальніцы, у якой малодшы сын вучыцца ў Маскве, Беларусь увогуле значна далейшая ад Эўропы, чым эўрапейская частка Расеі, а да Эўропы «нам як да Месяца».

Аднак з гэтым меркаваньнем згадзіліся ня ўсе. Некаторыя лічылі Беларусь больш эўрапейскай краінай, чым Расея, ці, прынамсі, «асобнай цывілізацыяй», што злучае Захад і Ўсход і мае ў сабе рысы і аднаго, і другога. Хатняя гаспадыня Натальля зьвярнула ўвагу на большую талерантнасьць беларусаў, на іхную працавітасьць. Яе брат часта езьдзіць у Расею. Там аднойчы на ўзбочыне дарогі ён бачыў маці з дачкой: маці гандлявала гуркамі, дачка – сабою. «У нас вышэйшая, больш эўрапейская культура, – перакананая Натальля. – Думаю, мы цывілізаваная дзяржава, мірная, эўрапейская». Жанчына ўважае Беларусь за асобную цывілізацыю, «штосьці тыпу буфэрнай зоны між Эўропай і Азіяй». «Мы своеасаблівая «прамежкавая» нацыя, – думае Мэліта. – Напэўна, як прыхадцы з космасу».

А што беларусы думаюць пра Эўразьвяз? Выказваліся розныя погляды. Меншасьць схілялася да «савецкага» недаверлівага падыходу. Але большасьць прыхільна паставілася да ідэі больш шчыльнага супрацоўніцтва з Эўразьвязам, які цяпер мяжуе зь Беларусьсю: «Мы будзем сябраваць, дапамагаць адно адному». Трэба браць прыклад з Польшчы: там пэнсіянэры езьдзяць на новых «фіятах», сярэдні заробак – 600 даляраў, а кошты на прадукты ніжэйшыя, чым у Беларусі. У Польшчы старыя прадпрыемствы, якія несьлі страты, закрыліся, але на іхным месцы ўзьніклі «новыя, нармальныя, якія працуюць і разьвіваюцца». Польскія працаўнікі едуць за мяжу ў пошуках вышэйшых заробкаў, а эўрапейцы пачалі ўкладаць грошы ў Польшчу. Тое ж можна сказаць і пра былую ГДР – нямецкі ўрад інвэстуе туды вялізныя сродкі.

З гэтага гледзішча ўваходжаньне Беларусі ў Эўразьвяз прынесла б несумненныя выгады, і ня толькі эканамічныя.

Інжынэр тэлефоннай сувязі Сьвятлана раней заўсёды ездзіла па закупы ў Польшчу, а цяпер гэта задорага. Калі б Беларусь далучылася да Эўразьвязу, Сьвятлана магла б свабодна ўсюды ездзіць. Яраслаў таксама раней ездзіў у Польшчу без аніякіх праблемаў, а цяпер яму трэба віза: «Калі б мы жылі на тэрыторыі Эўразьвязу, я меў бы права свабодна перасякаць межы – ад беларуска-польскай да партугальскай… Адсюль і настальгія па Савецкім Саюзе: раней наша Радзіма была ад Берасьця да Ўладзівастоку, едзь, куды хочаш». Але ўвогуле апытаныя пагаджаліся, што ўваходжаньне ў Эўразьвяз для Беларусі – справа аддаленай будучыні. «Я быў бы рады далучыцца да Эўразьвязу, – кажа Мікалай, вайсковы пэнсіянэр, які цяпер працуе ахоўнікам. – Але нас ніхто туды ня пусьціць». «Нас ня прымуць», – заяўлялі Андрэй, Ніна і іншыя. Да таго ж «Расея будзе катэгарычна супраць».

Уваходжаньне ў Эўразьвяз – сьведчаньне «заходняга выбару», але ёсьць жа і «славянскі выбар» – на карысьць збліжэньня з Расеяй і СНД. Шмат хто лічыць, што «гістарычныя карані Беларусі – на захадзе», а больш шчыльны хаўрус з Расеяй – на цяперашні момант пэрспэктыва ня надта прывабная. «Гэта Бабілён», – заяўляе Натальля. На думку Яраслава, Расея – гэта «чорная дзірка». «Там дасюль няма парадку, – працягвае Натальля, – і ня будзе ў блізкай будучыні». Павал сьцьвярджае, што «калі Беларусі трэба гадоў 60, каб навесьці нейкі парадак, дык Расеі – усе 300». «Мне падабаецца Пуцін, – тлумачыць Натальля, – але гэта не падстава аб'ядноўвацца. Усё роўна нам неабходна ісьці разам з Эўропай». Аднак іншыя не выказвалі ахвоты аддаляцца ад сваёй вялікай суседкі. У Мэліты, напрыклад, бацькі – расейцы са Смаленску, і родная мова ў яе расейская. «Як жа я іх кіну сам-насам зь іхнымі праблемамі?» – кажа яна. Іншыя бачаць у Расеі калясальны рынак, найлепшы варыянт укладаньня грошай.

Усе былі згодныя, што з Расеяй пажадана, нават абавязкова трэба мець добрыя, канструктыўныя дачыненьні. Але апытаныя выказвалі істотныя засьцярогі наконт «саюзнай дзяржавы» і сумневы ў дзеяздольнасьці дый наагул у рэальным існаваньні СНД. Зразумела, беларусы турбуюцца, каб іх не ўцягнулі ў чачэнскую вайну, як было падчас савецкай вайны ў

Аўганістане. Прынамсі, цяпер ніякага сапраўднага саюзу з Расеяй, ваеннага ці якога іншага, «няма». Гэткай жа малаверагоднай уяўляецца і пэрспэктыва адзінай дзяржавы і адзінай валюты, хоць некаторыя з апытаных і віталі б яе ўвядзеньне. Як заўважыў адзін з удзельнікаў фокус-групы, Пуцін трымае Лукашэнку «на адлегласьці», паміж імі няма блізкіх дачыненьняў. Як тлумачылі іншыя, Пуціну «не патрэбная Беларусь», ён «не зацікаўлены ў тым, каб супрацоўнічаць з Лукашэнкам». У самой Беларусі пачынаюць казаць пра саюз з Расеяй, калі ідзе барацьба за ўладу, а потым усё сьціхае. Прынамсі, беларускае чынавенства не захоча страціць сваіх пасадаў і ўплыву ў аб'яднанай дзяржаве.

Што да СНД, агульнае меркаваньне зводзілася да таго, што яна існуе толькі на паперы. СНД была створаная толькі як «мэханізм цывілізаванага разводу рэспублік, якія ўваходзілі ў склад СССР, – заўважыў Ігар, начальнік зьмены заводу «Інтэграл», – і ня мае практычнага сэнсу». Іншым было нават цяжка сказаць, ці існуе СНД.

Фактычна, Беларусі няма патрэбы ні з кім аб'ядноўвацца – ні з Расеяй, ні з Эўразьвязам, сьцьвярджае Мікалай. Варта з усімі падтрымліваць добрыя стасункі. «Так ці іначай, мы застанемся беларусамі, а расейцы – расейцамі. Нас нельга аб'яднаць у адзін народ», – кажа ён. На думку заводзкай працоўнай Галіны, Беларусь застанецца незалежнай дзяржавай. Ёй лепей мець добрыя дачыненьні і з Эўразьвязам, і з СНД, і з Расеяй, але ні да каго не далучацца, і тады Беларусь будзе квітнець. У гэтых выказваньнях, як і ў іншых, найперш гучыць ідэя прыхільнасьці да дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі, якую б унутраную палітыку яна ні праводзіла і з кім бы ні хаўрусавала на міжнароднай арэне.

Наколькі гэтыя погляды падзяляе шырэйшае грамадзтва? Вынікі нашых агульнанацыянальных рэпрэзэнтатыўных апытаньняў сьведчаць, што беларусы практычна ва ўсім выяўляюць большую «эўрапейскасьць», чым расейцы і ўкраінцы (гл. Табліцу 1).

	Беларусь	Расея	Украіна
Адчуваюць сябе ў значнай/ пэўнай ступені эўрапейцамі	34	25	26
Рэдка/зусім не адчуваюць сябе эўрапейцамі	54	68	62
Вызначаюць сябе як эўрапейцаў	16	8	10
Падтрымліваюць уступленьне ў Эўразьвяз	59	56	54
Могуць акрэсьліць Эўразьвяз	48	39	42
Ведаюць, дзе месьціцца штаб-кватэра Эўразьвязу	49	39	36
Думаюць, што краіна павінна далучыцца да НАТО	22	29	22

Табліца 1. Беларусы, расейцы, украінцы і «Эўропа», 2004–2005 гг.

Крыніца: апытаньні, праведзеныя аўтарамі.

Беларусы часьцей уяўляюць сябе «эўрапейцамі», часьцей называюць «эўрапейскасьць» як адзін з варыянтаў свайго самавызначэньня.

Аднак, у параўнаньні з дасьледаваньнямі ў фокус-групах, менш апытаных схільныя аддаваць перавагу Эўропе перад Расеяй (гл. Табліцу 2).

Лепей мець добрыя стасункі з Расеяй 31%

Лепей мець добрыя стасункі з Эўразьвязам і ЗША	6%
Лепей мець добрыя стасункі і з Расеяй, і з Эўразьвязам, і з ЗША	52%
Мы маем дастаткова рэсурсаў, каб разьвівацца самастойна	8%

Табліца 2. Беларусь і ейная вонкавапалітычная арыентацыя, 2005 г.

Крыніца: агульнанацыяльныя рэпрэзэнтатыўныя апытаньні, праведзеныя НІСЭПД (Вільня) і фундацыяй *Pontis* (Браціслава), травень 2005 г., $n = 1.510$.

Прыкладна для траціны стасункі з Расеяй маюць прыярытэт. Яшчэ прыкладна палова лічыць, што аднолькава істотна мець добрыя дачыненьні як з Расеяй, гэтак і з Эўразьвязам і ЗША. Падобныя меркаваньні добра стасуюцца са «шматвэктарнай» замежнай палітыкай, якую пасьлядоўна праводзіць адміністрацыя Лукашэнкі.

НЕКАТОРЫЯ ВЫСНОВЫ

Міжнародная палітыка Беларусі адлюстроўвае прыроду яе аўтарытарнай палітычнай сыстэмы, у рамках якой палітыку правамоцны вызначаць толькі прэзыдэнт. («Навошта праводзіць апытаньні ў Беларусі? – заўважыў нам адзін заходні навукоўца. – Дастаткова ведаць *адно* меркаваньне».) Апроч таго, беларуская палітыка абумоўленая геапалітычным становішчам краіны і моцнай залежнасьцю ад расейскага саюзьніка. Гэтая залежнасьць – ня толькі эканамічная: Расея выступае як гарант улады непрадказальнага беларускага прэзыдэнта.

Афіцыйныя заявы беларускага кіраўніцтва, як ні дзіўна, досыць неадназначныя. У іх гучыць прагматызм, які зыходзіць з канкрэтных варункаў, а не апрыёрная ідэалягічная зададзенасьць. Нельга сказаць, што стасункі Беларусі з «Эўропай» не падлеглыя зьменам – яны вызначаюцца ў залежнасьці ад пазыцыі Эўразьвязу. Таму, магчыма, большы плён дасьць палітыка «канструктыўнага ўзаемадзеяньня», чым упартая варожасьць з абодвух бакоў, якую мы цяпер назіраем. Працяглыя нападкі на беларускія палітычныя інстытуты, выключэньне беларускіх прадстаўнікоў зь міжнародных

структураў, а тым болей фінансаваньне з Захаду СМІ, якія адкрыта ставяць сабе на мэце спрыяць зьмене палітычнага рэжыму, – усё гэта хутчэй штурхне беларускія ўлады ў эўразійскім кірунку.

Пераклаў з ангельскай П. Д. паводле:
Journal of Communist Studies and Transition Politics
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/08
[image]

ВІТАЛЬ ПАНАМАРОЎ

Віталь Панамароў Перакласці – аддзячыць*

Перакладчыкам з беларускай

Чаму мы перакладаем з беларускай? Навошта мы так бестурботна грэбуем мудрай перасцярогай італьянцаў: «Перакласці – здрадзіць»?

Каб растлумачыць гэта, давядзецца парушыць прынятую ў «Гульні ў пацеркі» забарону на выкарыстанне суб'ектыўных асацыяцый: для мяне беларуская мова звязана перш за ўсё з маімі менскімі знаёмымі, якія ўсе, калі ўжываць тэрміналогію Андрэя Дынька, *светлыя людзі*. Беларуская мова нагадвае пра краіну, дзе мне было так добра, як можа быць толькі ва Украіне, таму для мяне пераклад з беларускай – гэта нешта такое цёплае, нібыта бела-чырвона-белыя сцягі над аранжавым Майданам у Кіеве, і «перакласці – аддзячыць».

Пераклад з беларускай – цудоўная нагода пераканацца, наколькі гэтая мова, як і лічыць кожны sacra lingua, па-боскаму суверэнная і неспасціжна сугестыўная. Пошук украінскіх адпаведнікаў беларускіх словаў дазваляе яшчэ раз убачыць «у працы» бязмежныя сэнсавыя магчымасці абедзвюх моваў – ад перадачы ўсёй разнастайнасці пачуццяў аж да ўзнаўлення поўнага абсягу філасофскіх ды багаслоўскіх катэгорый. Таму не дзіва, што для беларуса яго мова, як заўважыў Пётра Рудкоўскі, – гэта не столькі логіка, колькі эротыка. І калі ўкраінец пачуваецца ў сваёй мове нібы ў Хаце Быцця, дык беларус, следам за Вальжынай Морт, цалкам мае анталагічныя падставы

сказаць: мы і ёсць мова. Адсюль вынікае: «перакласці – дамовіцца».

Але пераклад – гэта не толькі вытанчаныя моўныя гульні. Не менш важнае і гэтае дзівоснае пачуцце знаходжання ў сваёй цывілізацыйнай прасторы, якое непазбежна ўзнікае ва ўкраінскага падарожніка на астравах *Архіпелага Беларусь*, так што нават паркавы мост над Сажом у Гомелі падаецца рэплікай моста Мірабо ў Парыжы і адначасова – зменшанай копіяй Пешаходнага моста ў Кіеве. Адны тлумачаць гэтую эмацыянальную і каштоўнасную роднасць супольнай гістарычнай памяццю, другія спасылаюцца на адзіны культурны код, трэція гавораць пра цэнтральнаеўрапейскі падмурак беларускага і ўкраінскага праектаў будучыні, але дакладней за ўсё гэта выказала Ева Вежнавец: «У нас з вамі агульныя сябры і агульныя ворагі».

Перакладаючы з беларускай, у думках здымаеш капялюш перад апантанасцю беларускага *палітычнага народу* (хоць сёння гэта ўжо не шляхта, а інтэлектуалы), які так неталерантна кпіць з усіх гэтых еўразійскіх намаганняў пераканаць Яна-беларуса: «Ты напраўду – проста Ванька». У кожным дасканалым беларускім тэксце свіціцца старажытная традыцыя шанавання годнасці асобы і супольнасці – традыцыя, якую карціць узнавіць ды культываваць і на сваёй глебе, таму «перакласці – запазычыць».

Нарэшце, пераклад з беларускай на ўкраінскую і наадварот – гэта штохвілінны эквівалентны абмен кантэкстам, зместамі, сэнсамі і значэннямі. Гэта нагадвае цягнік «Кіеў–Менск», які з Кіева вязе «Критику», а з Менска – «ARCHE» і «Нашу Ніву»; у Менск едзе ўкраінскамоўная версія кнігі Эрыка Габсбаўма пра пошук і вынаходства традыцый, а ў Кіеў – «Маша і мядзведзі», якіх кіеўскія інтэлектуалы потым вечарамі па чарзе чытаюць уголас у сваіх кватэрах. З Кіева – «Лісты з-пад коўдры» ад Андрэя Хадановіча, а ім насустрач – бутэлька ад Уладзіміра Арлова з аптэкарскім цэтлікам «Лекі для Ірванца». І, значыць, сапраўды: «перакласці – абмяняць».

Таму, калі кіеўскі перакладчык Славаміра Адамовіча і Андрэя Хадановіча Максім Стрыха вітаецца са мною словамі «Жыве Беларусь!», я заўсёды адказваю яму: «Жыве вечна – пакуль мы жывём і перакладаем з беларускай».

З украінскай пераклаў Сяргей Петрыкевіч

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/14
[image]

Лісты Антона Луцкевіча з часу Парыжскай мірнай канферэнцыі

[1] Архив полковника Хауза. Т. IV. Москва, 1944. С. 151.
[2] Ціхаміраў А. В. Беларуская праблематыка на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919–1920 гг. // Весці АН Беларусі. Серыя грамадскіх навук. № 4. 1996. С. 34.

18 студзеня 1919 г. у Парыжы адкрылася міжнародная канферэнцыя, што мела на мэце падвесці вынікі сусветнай вайны – той вайны, якую яшчэ не назвалі Першай сусветнай, але ўжо паспелі назваць Вялікай – настолькі ўражальнымі і непрадбачанымі аказаліся яе наступствы. Сярод гэтых наступстваў быў і ўздым нацыянальных рухаў, а ў іх выніку – развал шматнацыянальных імперый, трываласць якіх перад пачаткам вайны мала ў каго выклікала сумненні: Аўстра-Венгрыі і Расіі. Пры гэтым Аўстра-Венгрыя ў гістарычным маштабе развалілася імгненна, на працягу некалькіх тыдняў, паставіўшы пераможцаў перад здзейсненым фактам; Расійская ж імперыя, у якой палітычны крызіс быў выявай глыбокага сацыяльнага і гуманітарнага крызісу, аганізавала на працягу некалькіх гадоў, выкідваючы прадукты свайго распаду з цэнтру на ўскраіны і за даваенныя межы. Таму на канферэнцыі ў Парыжы дзяржавы-пераможцы мусілі не толькі зводзіць парахункі са сваімі супернікамі, што прайгралі вайну, але і заняцца тэрытарыяльна-палітычным уладкаваннем на развалінах былых імперый.

У аснову праграмы пасляваеннага тэрытарыяльна-палітычнага

ўладкавання былі пакладзены знакамітыя «14 пунктаў» прэзідэнта ЗША Вудра Уілсана, з якімі гэта дзяржава вясной 1917 г. уступіла ў вайну, кінуўшы сваю вырашальную гіру на шалі змагання. Трынаццаты пункт гэтай праграмы прадугледжваў утварэнне незалежнай польскай дзяржавы. Іншыя перамены ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе не планаваліся. Аднак за паўтара года пасля абвяшчэння «14 пунктаў» у гэтым рэгіёне адбыліся настолькі істотныя перамены, што пераможцам давялося грунтоўна скарэктаваць прынятую імі праграму. Змены зноў жа былі пададзеныя ЗША ў выглядзе афіцыйнага амерыканскага каментара да «14 пунктаў», падрыхтаванага пад кіраўніцтвам галоўнага дарадцы прэзідэнта палкоўніка Хаўза і прынятага ўсімі саюзнымі дзяржавамі, а следам за імі і Германіяй. Гэты дакумент прадугледжваў вырашэнне лёсу народаў заходніх ускраін Расіі на ўзор вырашэння польскай праблемы: «Тое, што прызнана правільным для палякаў, несумненна давядзецца прызнаць правільным і для фінаў, літоўцаў, латышоў, а магчыма, і для ўкраінцаў», таму што «адбылося адраджэнне гэтых раней падуладных народаў»[1].

Можна заўважыць, што ў амерыканскім пераліку народаў еўрапейскай Расіі, якія ўжо «адрадзіліся» пасля апублікавання «14 пунктаў», адсутнічаюць беларусы, эстонцы. У гэтым артыкуле нас, натуральна, цікавяць беларусы. Ці азначае іх адсутнасць у дакуменце, пакладзеным у аснову Камп'енскага перамір'я 11 лістапада 1918 г., прысутным потым на сталах Парыжскай мірнай канферэнцыі, што дзяржавы-пераможцы не бачылі Беларусі, не збіраліся займацца і не займаліся ёю? Адзін з беларускіх даследчыкаў у сувязі з гэтым напісаў: «Дзяржавы-пераможцы не толькі не ставілі пытання аб прызнанні незалежнасці Беларусі, але нават не выступалі за аўтаномію для беларусаў»[2]. Фактычна правільна, але па сутнасці няслушна. Заўважым, па-першае, што беларускія гісторыкі пакуль што не вывучалі матэрыялаў Парыжскай мірнай канферэнцыі з-за іх цяжкадаступнасці. Па-другое, пазіцыя дзяржаў у гэтым пытанні, якое з'яўлялася толькі фрагментам шырокай і складанай праблемы пасляваеннага ўладкавання Усходняй Еўропы, ролі Расіі ў ёй, зусім не была маналітнай. Інтарэсы Францыі і Англіі тут разыходзіліся, мела

свае інтарэсы і Польшча, і яны не супадалі ні з першымі, ні з другімі. Была яшчэ і белая Расія, якая мусіла вытрымаць «тэст» на дэмакратычнасць, наладжаны ёй заходнімі дзяржавамі летам 1919 г. Гэтым тэстам якраз было стаўленне цэнтраў палітычнага кіраўніцтва белай Расіі да нацыянальных праблем на яе тэрыторыі, гатоўнасць вырашыць іх на аснове прынцыпу самавызначэння народаў. У кантэксце і пад уплывам гэтых супярэчнасцяў пазіцыі асноўных гульцоў усходнееўрапейскай палітыкі перажывалі эвалюцыю, якая ўплывала і на шанцы беларусаў стаць сучасным дзяржаўным народам. Прама скажам, шанцы нязначныя ў існых канкрэтна-гістарычных акалічнасцях, але здольныя эвалюцыянаваць у тым ці іншым кірунку. Каб павысіць гэтыя шанцы, неабходна было ясна і цвёрда выказаць сваю волю, быць пачутымі і знайсці суб'ектаў міжнароднай палітыкі, гатовых падтрымаць гэтую волю, зыходзячы з уласных інтарэсаў. Неабходна было быць там, дзе вырашалася, – ва ўсялякім разе, на бліжэйшыя гады – тэрытарыяльна-палітычнае аблічча пасляваеннай Еўропы. Неабходна было быць у Парыжы.

Лідэры БНР своечасова зразумелі неабходнасць шукаць падтрымкі з боку пераможцаў у вайне – Антанты і ЗША, каб забяспечыць сваю незалежнасць, перадухіліць паўтарэнне той нацыянальнай трагедыі, якую беларускі народ перажываў з пачатку вайны. Гэтае разуменне вынулецца у зваротах Рады БНР да ЗША і іншых дзяржаў – удзельніц вайны ад 22 кастрычніка 1918 г. У ім Рада прасіла «ў імя прынцыпаў гуманнасці, абвешчаных прэзідэнтам ЗША.. ратаваць беларускі народ ад разгрому і дзеля гэтага яшчэ да адыходу акупацыйных войскаў забяспечыць беларусі знешнюю недатыкальнасць шляхам прызнання яе самастойнасці і незалежнасці і ўнутраную бяспеку перадачай Радзе цывільнага управлення краем». Аднак у канцы 1918 г. нават пры падтрымцы стаўленні да справы незалежнасці Беларусі (якое на самай справе адсутнічала), Антанта не магла задаволіць просьбу Рады БНР, бо не мела дзеля гэтага магчымасцяў. Таму Германія перадавала гэрыторыю Беларусі ў краіны, якую была вымушана эвакуаваць, савецкай Расіі, за выключэннем абшару, прылеглага да Усходняй Прусіі. Гэтую тэрыторыю адлаведна з Камп'енскім перамір'ем яна магла пакінуць толькі пасля

3 Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. Вільня–Нью-Ёрк–Прага, 1998. С. 284. (Далей Архівы БНР. І. 1.)

4 Системная история международных отношений. 1918–2000. В 4 томах. Т. 2: Документы 1910–1940-х годов. Москва, 2000. С. 21; Версальский мирный договор. Москва, 1925. С. VI.

5 Архівы БНР. І. 1. С. 301.

6 Ленин В. И. Полное собрание сочинений. Т. 37. С. 234.

7 Архівы БНР. І. 1. С. 269–270; 272. Мы не ведаем, ці чакаў асабіста Пушкевіч запрашэння на перамовы з Леніным, але з вялікай доляй упэўненасці можам сцвярджаць, што Ленін не збіраўся яго запрашаць, паколькі ўжо ў кастрычніку быў ахоплены шалам сусветнай рэвалюцыі і пад уплывам рэвалюцыйнага крызісу, што пачынаўся ў Германіі. Гл.: Ленин В. И. Полное собрание сочинений. Т. 37. С. 111–113; Т. 50. С. 185–186; 195–196 і г. д. Сітуацыя змянілася толькі ў канцы снежня, калі спадзяванні на хуткую сацыялістычную

Луцкевіча з Леанідам Аляксандравічам Антановічам, дэлегатам ад Магілёўскай губерні, з'язджаў з мэтай ўдасканалення парадку выбараў у Беларускую Народную Рэспубліку, якая ўтварылася ў выніку вываду нямецкіх войскаў з Беларусі.

Дзяржавы-пераможцы хацелі будаваць пасляваенную Еўропу «з чыстага аркуша».

Адпрацаваў на іх у пункце другім праграмнай дэкларацыі Рады міністраў БНР, з якой не кіраўнік Антон Луцкевіч выступіў перад Радай Рэспублікі 22 лістапада 1918 г. У ёй ставілася задача дабівацца «права голасу на мірнай канферэнцыі»[5].

Аднак гэтая канкрэтна сфармуляваная задача аказалася неймаверна цяжкай для вырашэння. Першае, чым давялося займацца ўраду А. Луцкевіча на працягу наступных тыдняў – гэта пошук прытулку для ўладаў БНР, паколькі чырвоныя войскі, што набліжаліся з усходу, мелі загад падтрымліваць у нацыянальных раёнах толькі ўрады, створаныя бальшавікамі[6]. Ясная справа, Антон Луцкевіч не чытаў гэтага загаду, аднак няўдача яго перагавораў з прадстаўніком савецкай Расіі ў Кіеве Х. Ракоўскім[7], вопыт дачыненняў з мясцовымі бальшавікамі перад адыходам немцаў з Менску[8] не давалі яму падстаў для ілюзій. Таму 3 снежня ўрад БНР выехаў з Менска ў Вільню, а 27 снежня адтуль – у Горадню, яшчэ занятую немцамі. Як сведчаць запісы ў дзённіку А. Луцкевіча, яго ўрад і тут не знайшоў неабходных умоваў для працы. Сярод мноства праблем, з якімі яму даводзілася штодня сутыкацца, было рабаўніцтва мясцовага насельніцтва польскімі легіянерамі, якіх падтрымлівалі як нямецкія ўлады, так і Варшава. У польскай сталіцы тады ўжо прымаліся юрыдычныя акты, накіраваныя на анексію паўночна-заходніх тэрыторый Беларусі ў склад адроджанай польскай дзяржавы. «Ясна і бясспорна толькі адно, – запісваў Антон Луцкевіч у сваім дзённіку, – што на Гродзеншчыну ідуць дзве хвалі – з усходу і захаду, што разыграецца яшчэ адзін акт крывавай драмы, пачаўшайся ў 1914 годзе. І абедзве гэтыя хвалі нясуць нам руіну і знішчэнне не толькі матэрыяльнага багацця, але – і гэта найгорш – нашых палітычных ідэалаў, нашага дзяржаўнага будаўніцтва»[9]. Данесці патрабаванне беларускага народу прызнаць яго права

---

8 Из истории гражданской войны в СССР. Т. 1. М.–Л., 1960. С. 238.

9 Антон Луцкевіч. Дзённік / Полымя. 1991. № 4. С. 215–224; № 5. С. 186 і інш. (Далей Дзённік.)

10 Архівы БНР, І, 1. С. 327.

11 Нямецкая акупацыйная адміністрацыя на Усходзе.

12 Дзённік. № 4. С. 221.

13 Дзённік. № 5. С. 173.

14 Тамсама. № 4. С. 222.

15 Тамсама. № 5. С. 181.

16 Архівы БНР, І, 1. С. 336.

на самастойнае існаванне да арэапагу дзяржаў-пераможцаў рабілася ўсё болей пільнай, лёсавызначальнай для Беларусі задачай.

Антон Луцкевіч добра разумеў гэта. 22 студзеня 1919 г. ён падпісаў мемарыял беларускага ўрада старшыні Парыжскай мірнай канферэнцыі, у якім абгрунтаваў права беларускага народу на дзяржаўнае існаванне, падаў этапы фармавання беларускай дзяржаўнасці, выказаў просьбы аб дапамозе Беларусі ў гэтай справе і дапушчэнні прадстаўнікоў БНР на канферэнцыю «дзеля абароны інтарэсаў беларускага народу і дачы патрэбных інфармацый»[10]. Мемарандум меўся завезці ў Парыж генерал Кіпрыян Кандратовіч, «галоўнакамандуючы» так і не створанага беларускага войска. У пачатку студзеня, вярнуўшыся з перагавораў з камандаваннем Обер-Оста[11], генерал прызнаўся Луцкевічу, што немцы выступаюць супраць стварэння літоўска-беларускай арміі[12], а яны пакуль што заставаліся панамі часткі той тэрыторыі, дзе была магчымасць весці набор у гэта войска.

Чаму ж такая адказная місія – уручэння звароту беларускага ўрада да мірнай канферэнцыі – давяралася ваеннаму чалавеку, нядаўна яшчэ генералу расійскай службы, чалавеку, не ўкарэненаму ў беларускі нацыянальны рух? Адказ на гэтае пытанне высвечваюць дзве наступныя вострыя праблемы, з якімі барукаўся ўрад Луцкевіча: грошай і кадраў. І таго, і другога страшэнна не хапала. Пра грошы лепш сказаць так: іх не было зусім. Урад Літоўскай Рэспублікі адмовіўся даць пазыку[13], бо і сам быў небагаты, хаця, здаецца, галоўнай прычынай адмовы было нежаданне падтрымліваць патэнцыйнага суперніка перад арэапагам вялікіх дзяржаў. У гэтай сітуацыі Луцкевіч узрадаваўся, калі даведаўся, што генерал Кандратовіч «маецца ехаць у Парыж сваем коштам. Пры нашых рэсурсах гэта шчасце»[14] . Былы член Чацвёртай Дзяржаўнай думы ад Гродзеншчыны А. Азнабішын сам напрасіўся ў склад дэлегацыі[15], і Луцкевіч не адмовіў яму, вымушаны шукаць людзей больш-менш палітычна дасведчаных і дастаткова культурных, каб не згубіцца ў парыжскіх колах, што фармаваліся вакол канферэнцыі. Можна меркаваць, што гэтак жа выпадкова трапіў у склад дэлегацыі нехта Леанід

Баркоў. Афіцыйна поўны яе склад быў зацверджаны на пасяджэнні Рады народных міністраў БНР толькі 21 сакавіка 1919 г. У яе ўваходзілі, акрамя А. Луцкевіча, міністр юстыцыі А. Цвікевіч; радчыя К. Кандратовіч, А. Азнабішын і Р. Скірмунт; аташэ – Ю. Янкоўскі, А. Галавінскі і Л. Баркоў; кур'ер – Г. Камарынец[16]. У гэтым складзе дэлегацыя была дастаткова кампетэнтная і працаздольная. Аднак на самай справе ў Парыж, і то з вялікім спазненнем – больш чым праз месяц – выехалі трое: Кандратовіч, Азнабішын і Баркоў. Антон Луцкевіч далучыўся да іх у канцы траўня і ўжо на месцы ўключыў у склад дэлегацыі наваспечанага палкоўніка Я. Ладнова, што прыехаў з беларускага асяродка ў Адэсе. Мірная канферэнцыя ў гэты час працавала ўжо пяты месяц і паспела прыняць мемарандумы ўрадаў суседніх Беларусі дзяржаў – Польшчы, Літвы, заслухаць іх дэлегацыі; прыняць рашэнне аб усходняй мяжы Польшчы, у якім яе канчатковае вызначэнне ставілася ў залежнасць ад фармавання ў Расіі дэмакратычнага ўрада, які атрымае прызнанне Захаду; устанавіць сувязь з урадам Калчака і неўзабаве, пасля згаданага вышэй «тэставання», прызнаць яго. Пры гэтым заходнія дзяржавы задаволіліся яго заявай аб прызнанні незалежнасці адной Польшчы і гатоўнасці перадаць пытанне аб нацыянальнай аўтаноміі іншых народаў будучаму Устаноўчаму сходу. Украінскага і беларускага пытання перад урадам Калчака дзяржавы не ставілі.

Такім чынам, дэлегацыя БНР з'явілася на Парыжскай канферэнцыі са спазненнем. Галоўная яго прычына тая ж: адсутнасць грошай, неабходных для фінансавання яе дзейнасці. Ураду БНР даводзілася разлічвацца за гістарычна абумоўленыя дэфармацыі беларускага грамадства, што страціла сваю арыстакратыю з усімі яе магчымасцямі, не здолела ва ўмовах нацыянальнага ўціску сфармаваць моцны прадпрымальніцкі клас з яго міжнароднымі сувязямі, зацікаўлены ў стварэнні сваёй дзяржавы і гатовы падтрымліваць яе нараджэнне ўласным капіталам. Калі ўлічыць яшчэ, што ўрад БНР апынуўся ў становішчы ўрада ў эміграцыі, то можна зразумець, што вонкавая падтрымка яго дзейнасці была ледзь не адзінай крыніцай яго фінансавання.

Яшчэ ў канцы студзеня ў гэтай справе з'явіўся першы пробліск

[17] 1,5 млн карбованцаў (1566 млн нямецкіх марак) Аркадзем Смоліч, міністр Брамінскага ўрада. Архівы БНР, І, 1. С. 334.

[18] Пачаты перагавор Уладзімірам Жылуновічам і Антонам Луцкевічам 29 кастрычніка (10 лістапада) 1918 г. Архівы БНР, І, 1. С. 352.

[19] Там жа. С. 410.

[20] У красавіку 1919 г. дыпламатычны прадстаўнік Польшчы Т. Філіповіч паведамляў, што супрацоўнікамі англійскага Ведамства замежнай палітыкі «Беларусь» («White Russia»). Archiwum polityczne Ignacego Paderewskiego. T. 2. Wrocław, 1994. S. 93.

[21] Архівы БНР, І, 1. С. 767–768.

[22] Адказваючы на гэтае пытанне, неабходна мець на ўвазе шэраг фактараў, што абмяжоўвалі магчымасці дэлегацыі БНР. Сярод іх – неінфармаванасць заходніх палітычных элітаў аб Беларусі[20] і арганічная слабасць самой дэлегацыі. Першы быў аб'ектыўны і, відавочна, прадбачыўся Луцкевічам. Другі ж варта адзначыць асобна. Слабасць дэлегацыі выяўлялася ў адсутнасці ідэйнага адзінства, разыходжаннях у матывацыі асобных яе ўдзельнікаў, што не спрыяла іх згуртаванню вакол кіраўніка і самаадданай калектыўнай працы. Яна выявілася, між іншым, у драматычным і таямнічым казусе, што здарыўся пасля ад'езду Антона Луцкевіча ў канцы жніўня на перамовы ў Варшаву: трое членаў яго дэлегацыі – Кандратовіч, Азнабішын,

[23] Акрамя прыведзеных вышэй прац А. Цікамірава гл.: Лазько Г. Г. Спробы заключэння беларуска-польскага саюза у 1919 г. // Беларускі гістарычны зборнік. Беласток, 2001. С. 109–121. Тут жа прыведзена літаратура.

[24] Архівы БНР. Нью-Ёрк–Мінск–Прага, 1998. Т. 1. Кн. 1. С. 2. Выдзяленне Луцкевіча (А. Цвікевіч)[19]. Аднак ці можна было зрабіць болей?

[25] Архівы БНР, І, 1. С. 363.

[26] Сурмач Г. Беларускі замежны архіў // Беларуская мінуўшчына. 1993. № 1. С. 18–23.

Баркоў – аказаліся затрыманымі французскімі спецслужбамі і абвінавачанымі ў патаемным супрацоўніцтве з германскімі манархічнымі арганізацыямі[21].

Аднак адзначаная слабасць дэлегацыі не стала асноўнай прычынай, якая не дазволіла Антону Луцкевічу дасягнуць лепшых, значнейшых вынікаў на Парыжскай канферэнцыі, першым сярод якіх магло б з'явіцца запрашэнне для выступлення ў адной з яе камісій (яго атрымалі літоўцы, але ўкраінцы таксама не атрымалі). Супраць Антона Луцкевіча дзейнічалі іншыя, больш магутныя фактары, негатыўнае ўздзеянне якіх на справу незалежнасці Беларусі ён здольны быў толькі зменшыць, але не мог нейтралізаваць. Гэта геапалітычныя і эканамічныя інтарэсы дзяржаў ва Усходняй Еўропе, існы тут баланс сілаў, які складваўся на працягу апошняга стагоддзя – а складваўся ён з удзелам Расіі. Расія была часова аслаблена, але яе рэсурсы дазвалялі заходнім дзяржавам спадзявацца на яе хуткае вяртанне на еўрапейскую арэну ў якасці ўсходнееўрапейскай супрацьвагі Германіі, чый патэнцыял як дынамічнай экспансіянісцкай сілы быў не вычарпаны, нягледзячы на яе паражэнне ў вайне. Адкол Беларусі, Украіны ад Расіі ўспрымаўся заходнімі дзяржавамі як шкоднае для іх інтарэсаў аслабленне даваеннага саюзніка, аслабленне менавіта ў тым пункце, дзе яна была небяспечнай для Германіі і таму карыснай для Францыі і Англіі – на еўрапейскай сушы. Адыход ад Расіі прыбалтыйскіх краін не ствараў для заходніх дзяржаў такой сітуацыі. Наадварот, для Англіі незалежныя ад Расіі дзяржавы ў гэтым рэгіёне маглі стаць адным з апорных пунктаў, якія дазвалялі зацiснуць Германію, пазбаўленую пераможцамі ваенна-марскога флота, у яе сухапутных межах, не даючы ёй магчымасці зноў выйсці на марскія прасторы. У гэтай сувязі нават вартасць Польшчы, найбольшай і бліжэйшай суседкі Германіі з усходу, была для заходніх дзяржаў адноснай, абумоўленай грамадскім крызісам у Расіі і часовай слабасцю гэтага традыцыйнага партнёра. Польшча, аднак, у адрозненне ад БНР мела сваё войска і даволі пашыраны ў грамадстве антырасійскі комплекс, які ствараў, праўда, немалыя клопаты для заходніх дзяржаў, але, тым не менш, у канкрэтнай гістарычнай сітуацыі мог быць выкарыстаны і выкарыстоўваўся для барацьбы з бальшавікамі.

Антон Луцкевіч не паддаўся ціску суровых неспрыяльных абставін і шукаў сродкі дзеля іх пераадолення і наступнага прызнання Беларусі старымі дзяржавамі ў якасці адной з незалежных еўрапейскіх дзяржаў. Такімі сродкамі былі заяўленая ім гатоўнасць БНР уключыцца ў адзіны антыбальшавіцкі фронт усходнееўрапейскіх дзяржаў і эканамічныя праекты еўрапейскага маштабу, сярод якіх найбольш цікавым было стварэнне Балтыйска-Чарнаморскага воднага шляху. Апублікаваныя дакументы сведчаць, што супрацоўніцтвам з БНР цікавіліся Латвія, Украіна, некаторыя заходнія эканамічныя колы[22]. Аднак у межах таго часу, што Луцкевіч меў у Парыжы – да канца жніўня – яму не ўдалося дасягнуць падтрымкі праектаў з удзелам БНР з боку вышэйшых сфераў Парыжскай канферэнцыі. Бальшавіцкую праблему на ўсходзе вырашала Польшча, і заходнім палітыкам некаторы час здавалася, што яна дапаможа белым увайсці ў Маскву. А гэта перспектыва пазбаўляла Захад неабходнасці раздражняць белую Расію падтрымкай усходнеславянскіх цэнтрабежных рухаў на былой яе тэрыторыі.

У сваю чаргу тая ж Польшча (дакладней – кіроўны ў ёй лагер Пілсудскага), эфектыўна карысталася спрыяльнай міжнароднапалітычнай сітуацыяй, каб цалкам узяць у свае рукі «расійскае пытанне». Пры пасярэдніцтве Ю. Мархлеўскага Пілсудскі дамовіўся з Леніным, дазволіўшы бальшавікам разбіць Дзянікіна, якога лічыў больш небяспечным для Польшчы праціўнікам, і пачаў падрыхтоўку вырашальнага ўдару па вялікадзяржаўнай Расіі, якая б яна ні была ў будучым – белая ці чырвоная. Такім ударам, на яго думку, стаў бы адрыў ад Расіі Украіны, толькі пасля чаго наступіў бы чарод і беларускага пытання. У гэтую канцэпцыю не ўпісвалася падтрымка Польшчай суверэнізацыі Беларусі, да чаго імкнуўся Антон Луцкевіч, дамагаючыся ў Варшаве аднаўлення дзейнасці Рады БНР і прызнання Рэспублікі Польшчай, – не ўпісвалася якраз таму, што гэтыя крокі аблегчылі б Луцкевічу барацьбу за прызнанне БНР у Парыжы. Таму польскія ўлады спрычыніліся да зрыву парыжскай місіі Антона Луцкевіча, пазбавіўшы яго магчымасці вярнуцца ў Парыж у канцы 1919 г. Фактычна, ён быў інтэрнаваны.

Да гэтага часу аб дзейнасці дэлегацыі БНР на Парыжскай мірнай канферэнцыі было вядома няшмат, на жаль, як і наогул аб дзейнасці ўрада БНР у той перыяд. Ёсць некалькі публікацый аўтарства польскіх і беларускіх гісторыкаў, але толькі ў дзвюх ці трох з іх дзейнасць дэлегацыі на чале з Антонам Луцкевічам з'яўляецца асноўным прадметам даследавання[23]. Адной з прычын, якая стрымлівала вывучэнне гэтай праблемы, з'яўляецца дрэнная забяспечанасць крыніцамі, хаця даводзіцца прызнаць, што капітальная публікацыя дакументаў урада БНР, падрыхтаваная Сяргеем Шупам[24], выкарыстоўваецца гісторыкамі слаба. У названым выданні ёсць некалькі дакументаў Антона Луцкевіча з часу яго знаходжання ў Парыжы, уключаючы адзін яго ліст Дыпламатычнай місіі БНР у Берліне[25], праз якую старшыня Рады народных міністраў стараўся падтрымліваць сувязь са сваім урадам, расцярушаным па розных гарадах Еўропы. Азнаямленне з гэтай публікацыяй толькі ўмацоўвала меркаванне, што прэм'ер-міністр меў перапіску са сваімі калегамі, а калі так, то за тры месяцы мусіў паслаць свайму ўраду болей чым адзін ліст. А гэты быў надрукаваны, відавочна, таму, што быў адзіным лістом, які трапіў у фонд 582 Дзяржаўнага архіва Літвы, матэрыялы якога цалкам апісаны С. Шупам. Пакідаючы ўбаку пытанне аб тым, чаму менавіта гэты ліст трапіў у архіў РНМ БНР, паспяшаемся сцвердзіць, што нам пашчасціла натрапіць на цэлы шэраг раней не апублікаваных лістоў Антона Луцкевіча, звязаных з праблематыкай Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919 г. Яны знаходзяцца ў фондзе 5782, вопіс 1, справы 1, 4 і 6 Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (былы ЦГАОР СССР) сярод іншых дакументаў БНР. Аб наяўнасці ў гэтым архіве дакументаў БНР пісала Ганна Сурмач яшчэ ў 1993 г.[26], аднак значнага рэзанансу яе паведамленне не атрымала.

На жаль, арыгіналы дакументаў нам удалося літаральна толькі патрымаць у руках, працаваць жа давялося з іх мікрафільмовымі копіямі. Нязручнасць карыстання імі і дэфіцыт часу прымусілі засяродзіцца на выяўленні найбольш каштоўных, на нашу думку, дакументаў – якраз луцкевічаўскіх. У дзвюх справах названага фонду іх аказалася 16. «ARCHE» друкуе 15 з іх. Не друкуецца невялікі ліст-паштоўка Антона Луцкевіча ад 31 чэрвеня 1919 г., адрасаваная ў Берлін, на

Кайзер-алею, 209, у якой аўтар паведамляе аб аднаўленні паштовай сувязі паміж Парыжам і Берлінам і цікавіцца справай пераводу грошай для парыжскай дэлегацыі. Прыведзены ім адрас і змест дакументаў дазваляюць меркаваць, што яны з'яўляюцца часткай архіва Дыпламатычнай місіі БНР у Берліне.

Дакументы, што друкуюцца, цікавыя з розных бакоў. Яны дазваляюць «матэрыялізаваць» няпростую дзейнасць урада БНР, з большай дакладнасцю ўключыць яе ў гістарычны кантэкст галоднага і крывавага для Усходняй Еўропы 1919 г. Чаго вартая, напрыклад, такая дэталь, як выказаная Луцкевічам радасць з прычыны выпраўлення яму касцюма, у якім ён зможа прыстойна з'явіцца ў Парыж. Яго лісты дазваляюць удакладніць праблематыку вонкавапалітычнай дзейнасці БНР, метады, якія ўжываў кіраўнік урада для вырашэння галоўнай на той момант задачы – дасягнення міжнароднага прызнання рэспублікі, сутнасць разыходжанняў у асяроддзі кіраўніцтва БНР, што вялі да палітычнага крызісу канца 1919 г., прычыны асабістай драмы Луцкевіча, якая выявілася ў яго адстаўцы ў пачатку 1920 г. і адыходзе ад палітычнай дзейнасці.

З 15 дакументаў, што друкуе «ARCHE», 4 набраныя на друкарскай машынцы (№№ 1, 2, 4, 6), астатнія – аўтографы Антона Луцкевіча. Лісты, пранумараваныя тут №№ 8, 9, 10, напісаны на паперы з вуглавым штампам Дыпламатычнай місіі БНР у Парыжы, тэкст на французскай мове: Delegation de la Republique Democratique de la Russie (Ruthenie) Blanche. 24, Rue Bayard, Paris VIII. Tel. Passy 19-62.

Розніца ў спосабе выканання дакументаў абумовіла розніцу ў спосабе перадачы іх правапісу ў публікацыі. Машынапісныя тэксты перадрукоўваюцца з выстаўленнем «у нескладовага» і «ё» адпаведна з сучаснымі афіцыйнымі нормамі, паколькі, як можна меркаваць, яны адсутнічалі на машынцы. Заўважым, што ў тэкстах Антона Луцкевіча назіраецца пэўная непаслядоўнасць правапісу, якая захоўваецца і ў нашай публікацыі. Аўтографы друкуюцца без змен. Прапушчаныя ў дакументах словы і літары, скарачэнні ўзнаўляюцца ў квадратных дужках.

Выказваем шчырую падзяку Анатолю Сідарэвічу за дапамогу ў

падрыхтоўцы публікацыі.

1

Зусім сэкрэтна!

Берлін, 24 красавіка 1919

№ 55/2015

ІНСТРУКЦЫЯ

ДЛЯ ДЫПЛЁМАТЫЧНАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ

НА МІРНУЮ КОНФЭРЭНЦЫЮ

ў Парыжы

1) Падаць Мэморыял Беларускага Ураду і паддзержываць усе яго дамаганьні перад Конфэрэнцыей /незалежнасьць і непадзельнасьць/.

2) Выясьніць адносіны паміж Беларусьсю і Польшчай.

3) Выясьніць, што пад прыкрыцьцем барацьбы з большэвікамі Польшча вядзе захватнічэскую акцыю.

4) Завязаць перагаворы з дэлегацыямі Украіны, Чэхіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі.

5) Выставіць і развіваць ідэю злучэньня дзеля супольнай самаабароны ўсіх аружных сіл пералічаных у п. 4 дзяржаўных арганізацый і Беларусі, каторым большэвіцкая Расея безпасрэдна грозіць /чэхам грозіць праз Венгрыю/. Выясняць, што такі мілітарны саюз можа быць зачаткам Балтыцка-Чорнаморскай фэдэрацыі /аб Польшчы, якая сама мае імпэрыялістычныя пляны на Беларускія і Украінскія землі, гутаркі быць ня можа!/

6) Прасіць у Антанты помачы для самаабароны Беларусі, эвэнтуальна для вышэй сказанай шырэйшай акцыі, абапертай на абароне кожным народам сваёй тэрыторыі.

7) Асабліва цесны контакт дзяржаць з украінцамі. Паставіць пытаньне аб мілітарным саюзе з Украінай. Залежна ад становішча літвіноў, эвэнтуальна гаварыць з украінцамі і аб магчымасьці выкарыстаньня такога саюза для ідэі Беларуска-Украінскай фэдэрацыі.

8) у справе магчымасьці фэдэрованьня Беларусі з Вялікароссіей выясьняць, што ў прыпадку поўнага аддзяленьня ад Расейскага гаспадарства Балтыкі і Літвы географічнае палажэньне Беларусі і яе эканамічныя інтэрэсы зробяць такое фэдэрованьне зусім немагчымым.

9) Ва ўсіх пытаннях, якія патрабавалі бы аканчацельнай разьвязкі і падпісаньня адпаведных актаў, да прыезду Старшыні дэлегацыі ў Парыж знасіцца з ім, як з Міністрам Загранічных Спраў.

Міністр Загранічных Спраў:

[27] Фрагменты тэксту, выдзеленыя курсівам, унесеныя ў дакумент рукой Антона Луцкевіча.

[28] Генерал Лявон Давыдаў з 1.05.1919 г. – начальнік арганізацыйнага аддзела ваеннага міністэрства ўрада БНР.

[29] Аўтограф А. Луцкевіча.

[30] Гл. «Успаміны аб прэзідэнце Масарыку» Антона Луцкевіча, якія друкаваліся ў «ARCHE» (2003. № 4).

[31] Гл. дакумент № 1.

[32] Прэм'ер-міністр Чэхаславацкай Рэспублікі, кіраўнік яе дэлегацыі на Парыжскай мірнай канферэнцыі.

[33] Знаходзілася ў Варшаве 18–22 красавіка, у час, калі польскія войскі займалі Вільню. У склад дэлегацыі ўваходзіў і палкоўнік Езавітаў. Перагаворы завяршыліся безвынікова.

[34] Старшыня Тарыбы – дзяржаўнай Рады Літоўскай Рэспублікі.

[35] Раман Скірмунт, радца дэлегацыі БНР на Парыжскай мірнай канферэнцыі. У Парыж не выехаў аб чым Антон Луцкевіч у лісце да брата Івана моцна шкадаваў.

[36] Кіпрыян (Цыпрыян) Кандратовіч займаўся арганізацыяй

[27] Арыгінал атрымалі 24.IV.1919.

[Подпісы:] К. Кондратович

А. Ознобишин

[Л.] Барков

Зусім конфідэнцыяльна

Послана цераз Генерала Давыдова у Парыж

4.V.1919

Беларускага войска, меў статус яго галоўнакамандуючага. У складзе дэлегацыі БНР выехаў у Парыж.

37 Язэп Варонка, у гэты час міністр па беларускіх справах ва ўрадзе Літоўскай Рэспублікі.

38 Яўхім Бялевіч, член Рады БНР.

39 Гаворка ішла аб уваходзе прадстаўнікоў Віленскай Беларускай Рады ў склад Тарыбы і ўрада Літоўскай Рэспублікі.

40 Юрка Янкоўскі, аташэ беларускай дэлегацыі. З нявызначанай прычыны ў Парыж не выехаў. Луцкевіч піша аб ім у: Дзённік. 1901 – 1. 6. 1918 / Уклад. Т. Грыгарэвіч. – Мінск: Беларускі Гістарычны Агляд, 1998. – С. 178.

41 У гэты час міністр унутраных спраў ва ўрадзе Антона Луцкевіча.

42 У Беларусь.

Архіў Дукгавінскага ўніверсітэта
Бэрлін. 4 мая [1919]
59/2719 -
МЗС
Копія Беларускай Дэлегацыі
ў Парыжы

З прычыны таго, што мая візыта да Прэзыдэнта Чэха-Славацкай Рэспублікі Масарыка[30] мае вялікую палітычную вагу, пасылаю Вам гэтае пісьмо, як інструкцыю.

Прэзідэнт Масарык зусім стаіць на такім грунце, на якім стануў наш Урад /наша апошняя нарада перад ад'ездам і інструкцыя/[31]. Да нашай концэпцыі фэдэрацыі новаўтвораных дзяржаўных арганізмаў ён – апрача Чэхіі – далучае Югаславію і… Польшчу! Мне прышлося выясьняць яму, што Польшча, як дзяржава імпэрыялістычная з захватнымі апэтытамі, у нашай кампаніі будзе дыссонансам, і з гэтай прычыны да часу аб'еднаньня нас усіх аб ёй ня можа быць гутаркі. На гэтым павінны стаяць вельмі цьвёрда і Вы!

Што датычыцца Вялікарасеі, то становішча Масарыка зусім згодна з нашым. Гэта, наагул, пытаньне будучыны.

Конкрэтныя рэзультаты нашай гадзіннай нарады з прэзыдэнтам Масарыкам такія: ён абяцаўся аказваць нашай Дэлегацыі ў Парыжы ўсялякую дыплёматычную паддзержку і ўраз-жа паслаць адпаведную інструкцыю ў Парыж свайму Міністру Загранічных Спраў, Бэнэшу, да каторага Вы павінны канечне якнайскарэй зьвярнуцца і завязаць самы цесны контакт, ужываючы яго перш за ўсё дзеля выясьненьня праўдзівай ролі Польшчы. Так сама трэба Вам завязаць зносіны з Крамаржам[32] і выясьніць яму наш пагляд на Расею, бо ён страшэнны русафіл у старым значэньні гэтага слова і ў гэтым далёка расходзіцца з

Масарыкам, і з Бэнэшам, і з усім чэскім Урадам.

Хаця аб афіцыяльным прызнаньні нашай незалежнасьці Чэхіей у гэты мамэнт /з прычыны поўнага панаваньня Антанты ў Празе!/ [дамовіцца] не аказалася магчымым, усё-ж мы з Прэзідэнтам умовіліся аб абмене полуафіцыяльнымі дыплёматычнымі прадстаўнікамі: нашым у Празе і чэскім у Горадні. Аднак аб апошнім з прычыны заняцьця Горадні палякамі гаварыць ня прыдзецца – прынамсі, у найбліжэйшым часе.

Аб адносінах з Літвой пакуль-што маю мала навін. Ведаю толькі, што ад літоўскага Ураду езьдзіла дэлегацыя ў Варшаву, але ў склад дэлегацыі літвіны ня згодзіліся дапусьціць ні аднаго беларуса[33], і гэта прымушае думаць, што літвіны вядуць з палякамі торг нашай зямлёй! З гэтай прычыны з імі ў Парыжы трэба быць вельмі асьцярожнымі. Усё-ж на славах Смэтона[34] згадзіўся на формаваньне нашага войска на тэрыторыі Літвы.

Яшчэ раз адзначываю патрэбу самага цеснага збліжэньня з украінцамі. Гэта важна і для нашых адносін з чэхамі, бо для чэшскага транзіта ў Беларусь ёсьць толькі дзьве дарогі: праз Польшчу /гэту нам трэба абмінаць!/ і праз Украіну.

Вось тым часам усё, што лічу патрэбным давясьці як найхутчэй да Вашага ведама.

Ад п[ана] Скірмунта[35] я атрымаў пісьмо з Варшавы. Ён не прыехаў у Берлін, баючыся папсаваць сабе фірму для Парыжа, але гатоў ехаць кожны мамэнт. Яго адрэс: Варшава, Эўропэйская гасьцініца. Прашу рабіць крокі, каб яму далі пропуск!

Аб палажэньні ў Гродне падробнасьцей яшчэ нямашака.

Шлю ўсім прывет!

3

Бэрлін, 6 мая 1919

Копія

Таварышы!

Генэрал Давыдаў, каторы пасьля выезду ген. Кондратовіча[36] заступае яго ў нашай вайсковай рабоце, едзе ў Коўну, каб пазнаёміцца там з ваеннымі справамі як у літвіноў, так і ў беларусаў. Акажыце яму сваё даверые і помач. Папярэджваю толькі: ня лішне гаварыце аб справе нашых чыста-беларускіх (дзяржаўных) формірovак с панам Язэпам[37]. Маю данныя, што яго агенты-афіцэры вядуць між палоннымі такую пропаганду, што ядыную праўдзівую ўласць на Беларусі становіць… партыя соцыялістаў-фэдэралістаў, а ўсё іншае ня мае вагі. Спісак праступленьняў пана Язэпа проці беларускай справы, як бачыце, ўсё болей павялічываецца, і колісь ён дажджэцца расплаты!

Калі Белевіч[38] ужо вярнуўся з Менску, то добра было бы яго прыцягнуць да гэтай работы. Калі тут усё пойдзе гладка, пашлю Вам тэлеграму, а Вы якім колечы спосабам перашліце яе Белевічу, каб сюды ехаў.

Смоліч у пісьме сваім просіць напісаць Вам мой пагляд на адносіны з Літвой. Лічу, як і заўсёды лічыў, што трэба паддзержываць з ёй самыя цесныя зносіны, але вельмі баюся, што факт уваходу прадстаўнікоў Гродзеншчыны[39], хоць і персональна, будзе выкарыстан літвінамі дзеля прадажы нас паляком на законнай аснове: нашы ж людзі прызнаюць права літоўскага ураду на ўладаньне Гродзеншчынай, не дабіўшыся перш забяспечання афіцыяльным актам права аўтаномнасьці «беларускай Літвы». Вось, тут і ёсьць абмылка (калі не сьвядомая здрада!) са стараны п. Язэпа! Калі б акт аўтаномнасьці быў на паперы, а не на славах, то ўсё было-бы іначай: тады дабравольна злучыўшаяся з Літвой частка Беларусі магла бы сама судзіць аб сваёй долі, а не аддавала бы сувэрэннага права панавання над сабой літвінам, якія не задумываючыся прададуць нас паляком за Вільню!

Такія думкі навялі на мяне весткі, прысланыя Смолічам, але мо я і памыляюся: здалёк і на моцы аднаго толькі пісьма судзіць трудна!

Я вельмі здзіўлен Вашым маўчаньнем: Смоліч піша мне аб справах агульна-палітычных, але ад Вас я не маю ні слова аб унутранай рабоце. Не маю нават справаздачы аб падарожы кур'ера Алексючанкі у Варшаву (апрача пісьма Скірмунта з 25.03!) і не ведаю, як стаіць справа з Янкоўскім[40]! Тое, што Тэрэшчэнка[41] сядзіць у Коўне, а не паехаў, як меўся, на Усход[42] дзеля арганізацыйнай работы, можа мець страшэнна сумныя для нас рэзультаты: палякі, занімаючы Беларусь і не знаходзячы ніякіх прадстаўнікоў уласьці беларускага ўраду, будуць мець поўнае апраўданьне завядзеньня польскага цывільнага упраўленьня, проці чаго мы тут пратэстуем. Не ведаю, на што мы прынімалі вядомыя пастановы і ехалі за граніцу: загранічная палітыка бяз унутранай работы – гэта будаваньне дому на пяску! І здаецца, што нашы стараньні тут разаб'юцца аб безнадзейнае палажэньне ў самой Беларусі…

Многа горачы вызываюць у мяне гэтыя думкі, тым болей, што змарнаваных паўтары месяца нічым загладзіць ужо нельга! Не ведаю такжа, ці праз польскі фронт цяпер можна прабрацца: гэта небяспечная справа. Усё гэта – на Вашым сумленьні! Рабіце, што яшчэ можна зрабіць!

У нас жа справа дагэтуль ідзе добра. Кондратовіч, Ознобішын і Барков – у Парыжы. Я жду пазваленьня для сябе і Скірмунта у скорым ужо часе. Тым часам езьдзіў да Прагі да прэзыдэнта Масарыка і заваяваў яго для нашай справы, так што чэскай дэлегацыі ў Парыжы послана ужо інструкцыя паддзержываць нашу акцыю. Апрыч таго, хаця аб афіцыяльным прызнаньні нас чэхамі цяпер гаварыць нельга (з прычыны «апекі» Антанты), мы з Масарыкам умовіліся аб пасылцы нашага пастаяннага прадстаўніка у Прагу на правах (неофіцыяльна) пасла. Такога-ж прадстаўніка меўся Масарык паслаць і нам у Горадню, але з прычыны прыходу туды палякаў і выезду нашага ураду апошняе прыдзецца адлажыць да лепшых часоў. З Масарыкам мы мелі гутарку аб фэдэраваньні новаутвораных дзяржаўных арганізмаў разам з чэхамі, эвэнтуальна Юга-Славіяй.

[43] Прыпіска на левым полі гэтай жа старонкі.

[44] Прыпіска на левым полі гэтай жа старонкі.

[45] Прыпіска на левым полі гэтай жа старонкі.

[46] Рукапіс друкаванага тэксту з праўкамі і дапаўненнямі.

[47] Мяркуецца, што ў Празе ў 1919 г. адбыўся з'езд Інтэрнацыянала, але ў ім удзельнічалі толькі прадстаўнікі Германіі, Аўстрыі, Венгрыі, Чэхіі, Швейцарыі, Галандыі, Швецыі, Нарвегіі, Даніі, Фінляндыі, Балгарыі, Румыніі, Турцыі, Грэцыі, Іспаніі, Партугаліі, Аргенціны, Чылі, Мексікі, Японіі, Кітая, Карэі, Індыі, Егіпта, Персіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Канады, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Паўднёвай Афрыкі, Ірландыі, Англіі, Шатландыі, Уэльса, Расіі, Украіны, Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Туркестана, Татарстана, Башкірыі, Сібіры, Далёкага Усходу, Кубані, Дона, Урала, Крыма, Кавказа, Сярэдняй Азіі, Закаўказзя, Поўначы, Поўдня, Захаду, Усходу, Цэнтра, Поўначы, Поўдня, Захаду, Усходу, Цэнтра, Поўначы, Поўдня, Захаду, Усходу, Цэнтра

4

КОПІЯ

Зусім сэкрэтна!

Членам Беларускай Дэлегацыі

ў Парыжу

Бэрлін, 14 мая [1919]

69/2029.-

Вашу першую почту я атрымаў і вельмі за яе дзякую. Са сваей стараны сьпяшу Вас паведаміць, што 12 мая генэрал Дюпон[50] прыслаў мне пропуск у Парыж, выстаўлены на моцы паведамленьня з Парыжу з 11.V., – значыць, як рэзультат Вашых стараньняў. Аднак выехаць здалею не раней, як у аўторак, 20 мая, з тэй прычыны, што да гэтага часу атрымаю ўжо грошы з венскага банку, якія былі там арыштованы. Апрач таго, толькі ў панядзелак будзе гатова мая адзежа.

Тым часам тут робіцца, што можна, у справе вайсковай. Працуем з генэралам Давыдавым, каторы ўзяўся за работу вельмі энэргічна. Ёсьць вялікая надзея на ўдачную форміроўку войска! Гутарка йдзе толькі аб грошы, і дзеля гэтай справы павінны Вы рабіць, што можна, у Парыжу, каб нам ня ўлезьці ў залежнась ад другіх. Можаце сурьёзна гаварыць аб пазычцы 200–300 мільёнаў, якія могуць быць забяспечаны канцэсіямі ў мысьль пасланай Вам заметкі.

Чакаю прыезда ген. Давыдава з Коўны і тады дам Вам больш падробныя данныя аб вайсковай справе. Тым часам сьпяшу падзяліцца з Вамі тэй ідэяй, якая прышла мне ў галаву, чытаючы Вашэ пісьмо аб беларусах у амэрыканскай арміі. Вось

жа ўчыніце, гдзе належыць, крокі дзеля выясьненьня пытаньня, чы ня можна было-бы з амэрыканскай арміі павыцягваць салдатаў-беларусаў? Гэта была бы вялізарная сіла і тым больш сурьёзная, што вольная ад тых настраеньняў, якімі хварэюць нашы салдаты-палонныя. Ідэю гэту я лічу настолькі важнай, што шлю Вам гэтае пісьмо экстра, не чакаючы на выясьненьне спраў вайсковых і фінансовых.

У канцы зьвярну ўвагу яшчэ вось на што. Цяпер літвіны знаходзяцца ў самым паскудным палажэньні з прычыны праектаванага вываду з Літвы нямецкіх войск. Вось гэты мамэнт Вы павінны выкарыстаць! Завядзіце перагаворы з Розэнбаумам[51]: ён чалавек дужа разумны і можа выясьніць літвіном, што толькі на моцы аб'еднаньня з беларусамі можна будзе стварыць такую сільную армію, каторая магла бы проціпаставіца польскай арміі: з сваіх двух губэрній літвіны не здалеюць набраць столькі народу, каб бароцца з палякамі. Калі ж літвіны і цяпер ня пойдуць з намі, то гэта будзе знак, што яны знюхаліся з палякамі і нас прадаюць, карыстаючы фармальна з тых дакумэнтаў, якія ім дала Гродзенская Беларуская Управа[52], прызнаўшая сябе за сувэрэнную ўласьць «Гродзенскага краю» і, як такая, аддаўшая на паперы Гродзеншчыну ў поўнае распараджэньне літоўскага правіцельства! У такім прыпадку Вам прыдзецца самым вострым спосабам выступіць проці літвіноў і іх палітыкі!

Да гэтага далучаю пісьмо на імя Розэнбаума, каторае прашу яму аддаць пры перагаворах з ім.

Прыеду пэўне з ад'ютантам і з гэтай прычыны прашу парупіцца аб памяшчэньне для двух. З дарогі пашлю Вам тэлеграму.

Прывет усім – да скорага пабачаньня!

Міністр Загранічных Спраў

5 чэрвеня [19]19[53].

Paris, 29.V.[19]19.

Hotel Metropole, Rue Francais I

Дарагія Таварышы!

Даехаў я шчасьліва. Работа наша йдзе поўным ходам. З Ладновым у гэты мамэнт маю абшырную гутарку: ён нам будзе вельмі карысны!

Справа Беларусі і другіх стане на парадак дня ў самым хуткім часе.

Прашу Вас праз гэтага-ж кур'ера прыслаць мне клішэ, якія памешчэны ў брашуры Д[оўнар]-Запольскага. Яны ўсе ў друкарні Гартмана.

Грошы ў банку ня надта беспечна дзяржаць. Мо' іх выбраць з бягучага рахунку і палажыць у сэйф, не закрываць тым часам рахунку, а пасьля ізноў іх туды аддаць?

Работу трэба вясьці цяпер пераважна ў Парыжы, і я тут пэўне даўжэй пасяджу. Вы сваё рабіце. Справа грошы пакуль-што нявыясьнена. Кадры нашых ваякоў падгатаўляйце пакуль-што на тыя грошы, якія ёсьць у нашай кассе.

Прывет усім.

Ваш Ант [подпіс]

6

Парыж, 19 чэрвеня 1919 г.

Зусім сэкрэтна.

Радзе Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі.

Прыезд мой у Парыж выпаў у той мамэнт, калі справа Расеі і новаўтвораных дзяржаў прыйшла на парадак дня. Але перш чым падыйсьці да самае справы, лічу патрэбным даць кароткі нарыс агульнага палажэньня, якое тут панавала ў мамэнт майго прыезду.

Дзяржавы Антанты дайшлі ўгоды ў справе міра толькі пасьля страшэннай калатні. З аднаго боку ў кожнай з іх ішла ўнутраная калатня партый: вядома, соцыялісты былі проці пагнібеньня Нямеччыны на карысьць антанцкага капіталу. З другога-ж боку кожная з гэных дзяржаў старалася выкарыстаць палажэньне для сябе. Найбольш зацікаўлены ў пагнібеньні немцаў французы: іх эканаміцкае палажэньне дужа цяжкое, што адбіваецца перш за ўсё на стане іх фінансаў і ўсё паніжаючымся курсе франка. Вось, французы і хочуць адыгрывацца на Нямеччыне: і з Заходу, і з Усходу – праз Польшчу, каторая знаходзіцца цэлком у сфэры французкіх уплываў і каторую так энэргічна паддзержываюць французы – і толькі французы… Вось скуль ідзе жаданьне зрабіць Польшчу вялікай і сільнай дзяржавай: без пагрозы немцам з Усходу французы ня могуць чуць сябе даволі забяспечанымі на Заходзі. Ізноў-жа Англія зацікаўлена ў стварэньні новых рынкаў на быўшых Расейскіх землях і ўжо ўстанавіла сваю сфэру ўплываў у прыбалтыцкім краю: перш за усё ў Латвіі і Эстоніі. У тым жа зацікаўлена і Амэрыка: гэта выявілася вельмі ярка ў справе ліквідацыі амэрыканскага меньня, астаўшагася пасьля вайны на французкай тэрыторыі. Так, ня гледзячы на жаданьне закупіць усё гэта гуртам Францыяй і Англіяй, амэрыканская ліквідацыйная камісія пачала сьпешна распрадаваць усё новым дзяржавам, каб гэтак зразу завязаць у іх тарговыя зносіны на будучыну.

Ва усім гэтым мне скора ўдалося разабрацца пры помачы Ладнова і тых французскіх сфэр, якія ўмеюць глядзець далей, чым глядзіць французская ўрадовая палітыка. Гэта-ж пацьвярдзілі і мае асабістыя гутаркі з прадстаўнікамі англіцкай і амэрыканскай міссій /Бурдільен, Лорд, проф. Сімпсон і інш./ і французскімі дзеячамі /палк. Фрэйдэнбэр, де-Вуліч, член

Палаты[54] Жак Стэрн, праф. Сэньёбос і т. д./.

Усё гэта паказала ясна, што прызнаньне нашай незалежнасці будзе залежаць цэлком ад таго, чы адна з антанцкіх дзяржаў зацікавіцца намі з пагляду спадзяваных барышоў. І вось, пасьля падачы ўсіх афіцыяльных заяў і пасьведу урадавых асоб, мы і пачалі работу ў кірунку запачаткаваньня нашай справы антанцкіх капіталаў.

Мы разумелі, што, дзякуючы [illegible] матэрыяламаў [illegible], бялізны, абутку, спажыўных прадуктаў, тытуню, мэдыкаментаў і інш. /ужо цяпер маюцца на мэце/, якія ў гэтых краінах [illegible] – на якіх 200 мільенаў, ці болей, то зробіць нам [illegible] Інтарэсы Амэрыкі [illegible] канферэнцыі. Ня буду пісаць аб тым, якімі дарогамі [illegible] дзеля работы мы ў справе прадажы нам у крэдыт дагналі англічанаў [illegible] Англіі і Амэрыкі [illegible] Міністэрства замежных спраў БНР.

Для правядзеньня гэтай справы вялікую вагу іграла пытаньне аб тым, ці кожная з новых дзяржаў [illegible] большым і забясьпечыць ад іх. Гэта ж іграе ролю і ў справе [illegible] праш дзеля аб'яднаньня новых дзяржаў з Польшчы да Чорнага мора на грунці ваеннага саюзу. Апрацаваную ген. Кондратовічам дакладную запіску на гэту тэму з ваеннага пагляду мы разаслалі ўсім, каму тое ведаць належала і ўсім дэлегатам новых дзяржаў. З боку апошніх мы сустрэлі вялькае спачуваньне ідэі саюзу і вымушаны прызнаньне патрэбнасьці яго для ўсіх. Намякае на іх далей у лісце.

Беларускі з'езд Віленшчыны і Гарадзеншчыны, які праходзіў 9–10 чэрвеня 1919 г., заняў цвёрдую пазіцыю на карысць незалежнасці і непадзельнасці беларускай дзяржавы, падтрымаў урад БНР.

Пэўне з газэт Вам ужо вядома, што Пішон[55] у Палаце чытаў праграму Антанты аб адбудове Расеі. Праграма гэта – фэдэрацыя з забясьпечаньнем «нацыянальнай суверэннасьці». Вось, яшчэ задоўга да гэтага ў Міністэрстве загранічных спраў [Францыі] Ігнасу і Вальдэмарасу[56] было сказана, каб яны

[54] Прыпіска над тэкстам.

[55] Міністр замежных спраў Францыі.

[56] Кіраўнікі літоўскай дэлегацыі на мірнай канферэнцыі.

[57] Вядомы расійскі дыпламат, міністр замежных спраў урада Калчака і яго прадстаўнік на мірнай канферэнцыі.

[58] Гл.: Архівы БНР, 1, Т. С. 359–360.

[59] Там самае. С. 360–361.

[60] Шэсць машынак Балтайпс і інш. Чорным шрыфтам выдзелены словы, якія ў арыгінале напісаны лацінкай.

[61] Трэнд на ЗША [illegible] Інтарэсы Амэрыкі [illegible] канферэнцыі. Ня буду пісаць аб

[62] Аднак у Палаце [illegible] англічанаў [illegible] Міністэрства

[63] Гл.: Архівы БНР, 1, Т. С. 403.

[64] Кур'ер урада БНР. Гл.: Архівы БНР, 1, Т. С. 403.

[65] У 1918 г. падпалкоўнік Енакіеў займаў пасаду загадчыка інфармацыйна-архіўнага бюро Народнага сакратарыята БНР. Выдаць, заставаўся на гэтай пасадзе і у 1919 г. Гл.: Архівы БНР, 1, Т. С. 203.

[66] Пілацы Падэрэўскі – прэм'ер-міністр і міністр замежных спраў Польшчы, кіраўнік яе дэлегацыі на мірнай канферэнцыі. З ім у Парыжы Антон Луцкевіч вёў перамовы аб ваенным антыбальшавіцкім саюзе ў аднак не прызнанне падтрымку беларускай дзяржавы. Намякае на іх далей у лісце.

[67] Беларускі з'езд Віленшчыны і Гарадзеншчыны, які праходзіў 9–10 чэрвеня 1919 г., заняў цвёрдую пазіцыю на карысць незалежнасці і непадзельнасці беларускай дзяржавы, падтрымаў урад БНР.

[68] Гл.: Архівы БНР, 1, Т. С. 376–378. Перагаворы вынікалі анэксіянісцкую пазіцыю Літвы адносна беларускай тэрыторыі.

[69] Прыпіска.

[70] На першым лісце дакумента справаводныя паметкі: 1)

[illegible] 31/VII [1919 г.]; 2) «Дамі нашы Кошчы». 3) «Самое [illegible] [1919 г.] Крэчэўскі [подпіс]».

[illegible] ўсялякія незалежніцкія выступленьні ў 58.

[illegible] да спадобы: псуюць, бач, даверыя [illegible] 57 [illegible] Сапоцкі [illegible] Беларусі [illegible] ў склад Літоўскай Рэспублікі.

[illegible] Фошоса з [illegible] паразуменьня ў нашых спорных справах [illegible] даждаліся… Толькі пару дзён таму да мяне «зусім [illegible] 9 [illegible] 1919 г. Гл.: Архівы БНР, I, 1. С. 400.

[illegible] Ці [illegible] мянушка. [illegible] літвіны зрабілі [illegible] 1919 г. [illegible] новымі [illegible] 58 [illegible] Гл.: Архівы БНР, I, 1. С. 380.

[illegible] 1919 г. Гл.: Архівы БНР, I, 1. С. 380.

[illegible] У сувязі з няўзгодненым з беларускім прадстаўніцтвам у «Тарыбе» і антыбеларускім паводле зместу мемарыялам Д. Сямашкі, пададзеным Парыжскай мірнай канферэнцыі, беларусы «тарыбаўцы» звярнуліся з афіцыйнай заявай да ўрада Літоўскай Рэспублікі аб тым, што не могуць лічыць яго сваім прадстаўніком на канферэнцыі. Гл.: Архівы БНР, I, 1. С. 373–374.

[illegible] Пасля ўступлення немцаў у Менск у лютым 1918 г. [illegible] 60. Але мы на першым пляне стаўляем фэдэрацыю балтыцкіх зямель і Беларусі. З латышамі вядзем вельмі сур'ёзныя перагаворы.

[illegible] Луцкевіч адносіў да іх і члена дэлегацыі Азнабішына.

[illegible] Дзеля працягу перагавораў аб антыбальшавіцкім саюзе, [illegible] 1919 г. [illegible] Таганрогу. [illegible] Ічасоўска-Вальдэмараўскую [illegible] бандуі завясьці іншы лад у літоўскай дэлегацыі. Там ужо цяпер бакоў.

[90] У ўсе разы было прычына за тое, каб ўкраінскае ямі і адносіна да нас; за нас стаяць клерыкалы, бо яны больш разумныя і больш адданыя.

[91] Кандыдатаў у справе незалежнасьці, чым гэная банда палітычных спэкулянтаў.

Пакуль што канчаю на гэтым мой першы даклад і спадзяюся, што да выезду курьера дапоўню яго весткамі аб позытыўных рэзультатах нашае працы.

Ант. Луцкевіч [подпіс]

7

Парыж, 8.VII.1919.

Дарагія Таварышы!

Перашліце хутчэй да Вільні пісьмы і чэмодан з рэчамі для Івана. Напішыце, ці яму выплацілі мае 6000 марак і ці купілі пальто? Таксама адашліце пісьмо Тэрэшчэнцэ.

Там з мяне нешта выпадала заплаціць Frln Tiel. Будзьце ласкавы выплаціць з казённых грошы і, пасылаючы мне грошы, адлічыць гэту суму.

Сягоньня з расейскіх колчакоўскіх кругоў зроблены крокі дзеля завязаньня з намі перагавораў. Паўтараю: мы гаварылі і будзем гаварыць з усімі, будзем таргавацца на ўсе бакі, каб вытаргаваць для нашага краю калі не незалежнасьць, дык прынамсі фэдэрацыю з тым ці іншым сільнейшым суседам.

Пры гэтым пасылаю Вам копіі трох прыказаў, каторыя прашу прыняць да ведама. Прыказ № I – 160 адмяняе той пункт, дзе гаворыцца аб скасаваньні чыноў: гэтага вымагае ўся сучасная коньюнктура.

Толькі што дастаў вестку, што ў Радзе Чатырох[61] [абмяркоўваецца] пытанне аб тым, з кім нас зьвяжуць: з

Масквой, ці з Варшавай. Гэта будзе паваротны пункт ва ўсёй палітыцэ Антанты ў адносінах да нас. А пакуль што «страхуемся» і ад пажару, і ад патопу.

Ваш Ант [подпіс][62]

Пасылаю квіт Галавінскага[63] на залог у публічнай бібліятэцэ. Вазьміце грошы назад[64].

8

Парыж, 24.VII.[19]19.

Таварышы,

вельмі прашу Вас зрабіць вось што: атрымаць афіцыяльную спраўку з Reichsbank'у ў Бэрліне, які быў тамака цьвёрды курс французскіх франкаў. Гэту спраўку прасіце гэнэрала Давыдова пераслаць адміралу Погуляеву ў Парыжу, адзначыўшы, што гэта пасылаецца па маей просьбе.

Грошы, пасланыя цераз Швэйцарыю, я дагэтуль не атрымаў. Найгорш тое, што Стош[65] не напісаў, на які банк яны высланы, – бо з Швэйцарыей зносіны тут даволі частыя, і я бы сам мог прысьпешыць іх атрыманьне. Жду Вашага кур'ера чым хутчэй. Калі б гэтае пісьмо прыйшло да яго выезду і калі-б Вы пасьпелі атрымаць спраўку з Reichsbank'у, дык прышліце яе проста мне. Разам з тым шліце ўсе асыгнаваныя мне грошы ўсё роўна ў якой валюце, бо пэўне прыдзецца хутка зрабіць падарожу да Вільні – але праз Польшчу, дзе маркі ходзяць. Аддавец гэтага, кс[ёндз] Віскont, адзін з нячысленых прыяцеляў беларусаў між літвінамі. Ён Вас пазнаёміць з тутэйшымі справамі наагул. Тутэйшая літоўская дэлегацыя, на жаль, увесь час вядзе самую вострую барацьбу проці нас. Гэтак, сягоньня ў амэрыканскай дэлегацыі я даведаўся, што гэтыя паны ў афіцыяльнай гутарцы заяўлялі амэрыканцам, быццам ніякага беларускага ураду німа, а дэлегацыя наша – самазванная. Гэта было сказана затым, каб амэрыканцы не прадалі нам запасаў сваіх у Францыі, аб чым у

нас ішлі перагаворы.

Пакуль-што бывайце здаровы. Калі што будзе добрага, то да выезду кс[яндза] Віскonта йшчэ прыпішу.

Прывет усім. Ант [подпіс].

9

Парыж, 29.VII.[19]19.

Таварышы!

На гэтым тыдні, здаецца, закончым умову аб прадажы нам розных тавараў з пяцілетнім крэдытам на 100.000.000 франкаў (14 мільёнаў доляраў). Трэба будзе пры гэтым выплаціць 200.000 франкаў. У сьлед за гэтым пад залог часьці тавару атрымаем вялікшую пазыку (некалькі мільёнаў франкаў), дык тыя 200.000 фр[анкаў] зразу будуць вернены. З гэтай прычыны прашу ўраз-жа прыслаць мне ня меньш як паўмільёна марак, спісаўшы іх на міністэрства загранічных спраў. Калі гэта ня будзе зроблена зараз-жа, дык німа што далей гуляць у палітыку: я адмаўляюся ад далейшай работы і ад свайго становішча.

Дзякуючы таму, што Вы нам дагэтуль нічога не прыслалі, мы аказаліся за бортам новага журналу, пасьвячонага справам новых рэспублік, бо не маглі заплаціць зразу 10.000 франкаў на выдавецтва.

Дзіўлюся, што Вы ня выкарысталі генэрала Потоцкага, каторы прыехаў у Парыж і ахвотна ўсё перавёў-бы. Прасіце яго памагчы Вам, калі самі нічога ня можэце наладзіць. Чаму не прыехаў Енакіев[66], калі меў пазваленьне?

Я нічога гэтага не магу зразумець. Бачу толькі адно, што праз гэтыя няшчасныя грошы ўся наладжаная намі работа разваліцца. На жыцьцё дэлегацыі асталося ўсяго на два тыдні, а далей выйдзе востры скандал. Завязалі мы добрыя зьвязі з

амерыканцамі. Здаецца, аднаму нашаму земляку-амерыканцу дамо мандат на прадстаўніцтва нашых інтарэсаў.

З усяго відаць, што справы Расеі і новых рэспублік, бадай, цяпер не разьвяжуцца ў Парыжы, а пяройдуць у Лігу Нацый. З гэтай прычыны патрэбна добрая падгатоўка нашай справы ў Амэрыцы.

Маскалі ўжо йдуць на уступкі нам: у № англіцкай газэты «Times» з ліпня надрукавана гутарка з міністрам загранічных спраў, Сазонавым, дзе гаворыцца ўрэшце аб аўтаноміі і Беларусі (пасьля маіх з ім гутарак). Але ўсё адносіцца да «ўсерасейскага» устаноўчага сходу, і ніхто ніякіх абязацельств даваць цяпер ня можа і ня хоча. Трэба мець міжнародныя гарантыі.

Мы паслалі Падэрэўскаму[67] афіцыяльную паперу, каб вызначыць месца на окупаванай Беларусі для беларускіх вайсковых фарміровак. Са свайго боку намечаем Ваўкавыск, Горадню, Ліду. Дагэтуль афіцыяльнага адказу ня маем. Аб гэтым прашу захаваць сэкрэт.

З латышамі нашы адносіны вельмі добрыя. Наадварот, з літвінамі йдзе барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць. Яны сваімі падкопамі пад беларусаў вызвалі [непрыязнасьць] у ўсіх адразу. Яны афіцыяльна заяўлялі ў амэрыканскай камісіі, што нам нельга прадаваць тавараў, бо наша дэлегацыя нікога не прадстаўляе, ніякага ўраду німа і т. д. З гэтай прычыны прысланыя матэрыялы аб з'езьдзі ў Вільні[68] страшэнна нам памаглі і ўмацавалі нашу пазіцыю. Мы іх пусьцім у прэсу – французскую і амэрыканскую, а такжа падамо ў Мірную Канфэрэнцыю. Добра памагае і справаздача Крэчэўскага аб перагаворах з літвінамі[69]. Яе мы добра выкарыстаем.

З літвінамі, як відаць, усё трэба ліквідаваць. Я мо' ў хуткім часе даб'юся перамены нашае пазыцыі ў краю – пад польскай окупацыяй, але гэта йшчэ толькі добрыя праекты…

Наагул-жа, на ўсё патрэбны грошы, грошы і грошы. Калі б я сюды прыехаў 6 месяцаў таму назад і каб меў да дыспазыцыі 10 мільёнаў, дык Беларусь даўно ўжо была бы прызнана і мелі-бы

сваё войска!

Яшчэ раз кажу: калі Вы не прышлеце жаданыя грошы, дык усё пойдзе к чорту. Я пішу аб грашах апошні раз, бо, калі іх ураз не дастану, дык ня будзе ніякае карысьці далей біць лбом у сьцяну.

Ант [подпіс].

Прашу паведаміць мяне, на які банк у Швейцарыі пасланы грошы? Калі б гэта Вы нам зразу напісалі, дык праз нашы зьвязі у Швэйцарыі ўжо выдабылі-бы гэтыя грошы!..[70]

10

Сэкрэтна

Паўнамочніку Беларускага Ураду для

перагавораў з Літоўскім Урадам,

Сэкрэтару Рады Рэспублікі, П. Крэчэўскаму

у Коўні[71]

Таварышу!

За Вашу справаздачу шчыра дзякую: яна вельмі нам тут памагла дзеля абароны ад літвіноў, якія не кідаюць барацьбы з беларусамі. Гэтак праз амэрыканцаў устаноўлена, што літоўскія дэлегаты офіцыяльна заяўлялі ў амэрыканскай камісіі дзеля прадажы запасаў, што наша дэлегацыя нікога не прадстаўляе, бо наш урад – гэта міф. Для узмацаваньня нашай пазыцыі вялікую услугу аказаў віленскі зьезд[72], тэлеграму каторага і тэкст рэзалюцыі мы атрымалі толькі цяпер. Усё гэта выкарыстаем у прэссе (франц[ускай] і амерык[анскай]) і

падамо Мірнай Конфэрэнцыі.

З літвінамі німа што далей гутарыць: раз яны стаяць на грунці берасьцейскага міра[73], то нам з імі німа аб чым гаварыць. Можна было-бы хіба дзеля ачысткі сумленьня паставіць афіцыяльна пытаньне аб фэдэрацыі і прасіць адказ на паперы.

З латышамі ў нас адносіны добрыя. Яны згаджаюцца на транзіт цераз іх тэрыторыю і порты нашых грузаў і войск.

У справе помачы нашай вайсковай работы йдуць перагаворы з французскімі ваеннымі кругамі (штаб Фоша[74] і глаўная саюзьніцкая ваенная рада), але ўсё залежыць ад Мірнай Конфэрэнцыі, якая павінна даць сваю прынцыпіальную згоду. Жджэм хутка яе адказу.

Аб Вашым прыезьдзі будзем старацца, але і Вы з свайго боку падайце ад сябе просьбу, каб пусьцілі Вас у Парыж дзеля справаздачы нашай дэлегацыі аб жаданьнях і патрэбах народу.

Шчырае дзякуй за Вашу працу і весткі.

Ант. Луцкевіч [подпіс]

Справы нашы йдуць усё лепей. Здаецца, аднак, што аканчацельная разьвязка пытаньня аб Расеі і новых рэспубліках пяройдзе ў Лігу Нацый. Здаецца, закупім на крэдыт на 100 мільёнаў франкаў тавараў![75]

11

Paris VIII-e, 24 rue Bayard

Дарагія Таварышы!

Я страшэнна рады, што Вы прыслалі Белевіча[76] – ну, і грошы! Справа наша пасоўваецца ўпярод, і 99 % ёсьць за тое, што і

Францыя пацвердзіць нашу куплю ад амэрыканцаў. А тады – апрыч таго тавару, які намі тут затаргаваны на 100 мільёнаў франкаў – нам суляць тавары з Амерыкі, адкрываючы крэдыт на 300 мільёнаў.

Стош таксама грошы прывёз. Гэтак мы ўрэшці абяспечаны на правядзеньне гэтай справы, рэзультаты якой відочны самі па сабе.

Праз Стоша пашлю абшырнейшы даклад. Ён пэўне паедзе праз пару дзён.

З Белевічам я і Л[адноў] мелі ў першы-ж дзень сур'ёзную нараду і выясьнілі пэўную згодлівасьць нашай работы і работы на мясцох. Гэта нам паддало духу і энэргіі, каб давясьці дзела да канца. Белевіча мо' задзержым тут даўжэй, бо людзі на гвалт патрэбны.

Калі Цьвік[77] што Вам пісаў, то паведаміце хоць адкрыткай, гдзе ён.

Шчыры прывет усім.

Ваш Ант [подпіс]

12. VIII.[19]19.

12

Paris, le 14.VIII.[19]19.

Дарагія Таварышы!

Я паслаў Вам заказное пісьмо, але ня ведаю, чы яно да Вас дойдзе. Калі атрымаеце, карыстайце так сама з почты, каб увесь час дзяржаць зьвязь.

Надыходзяць станоўчыя дні. Окупацыя нашага краю палякамі [сталася фактам][78], і трэба з гэтым лічыцца. Трэба лічыць, што гэта окупацыя пратрывае ня меньш 2–3 гадоў, калі большэвікам

ня ўдасца раней выперці палякоў. Трэба разумець, што без сільнай арміі, ў якую пайшлі-бы нашы народныя массы: арміі нацыянальнай беларускай, паварот большэвікоў будзе заўсёды магчымы. І дзеля ўсяго гэтага, дзеля карысьці нашае справы і спасеньня тых-жа палякоў, трэба за ўсялякую цану знайсьці супольны язык з палякамі і згаварыцца з імі аб арміі.

Са стараны расейскіх зусім урадавых кругоў (Сазонов, Маклаков[79]) заяўлена, што яны нічым нам у вайсковай справе памагчы ня могуць, бо ня маюць даволі грошы. Аўтономію суляць ужо і нам (гл. інтэрвью Сазонова ў 'Times', надрукованае пасьля маіх з ім гутарак), але праз усерасейскую констытуанту[80], а якая яна будзе – хто можа цяпер сказаць?!

Я, Ладнов і Белевіч сур'ёзна абсудзілі палажэньне і зусім згодзіліся ў ацэнцы яго. Далейшыя крокі будуць зроблены з супольнай пастановы. З Вашых пісем і са слоў Б[елевіча] з радасьцю бачу, што ўсе нашы стаяць на тым самым грунці.

Дзеля вайсковай справы вядзем работу і перад мірнай канфэрэнцыяй. Справа амэрыканскіх запасаў таксама пасоўваецца ўпярод. Гэтымі днямі будзем мець вельмі важную нараду з міністрам фінансаў.

Калі мне ўдасца праехаць на ўсход, дык мо забяру з сабой Б[елевіча], бо Л[аднову] трэба будзе тут давясьці справу да канца. Грошы прыйшлі якраз у пару: і праз Стоша, і праз Б[елевіча]. У момэнт, калі ў касе асталося толькі 2000 франкаў, Ознобішын хацеў «узарваць» Дэлегацыю, але дзякуючы маей і Л[аднова] выдзержцы (далібог, не хвалюся!) мы не далі яму магчымасьці гэта зрабіць. Калі-ж з'явіліся грошы ад Вас, усё зьмянілася, і гэты гад «ниже воды, тише травы». Аднак, мы яму не даверaем і баімося закуліснай работы. З гэтай прычыны пастараемся яго сплавіць да Вас, а Вы яго задзяржыце ў Бэрліне: ён Вам паможа наладзіць папсаваныя адносіны з маскалямі і сплавіць, як належыць: без скандалаў – Давыдава. З Вашымі поглядамі на апошняга мы зусім згаджаемся. Калі Ознобішын прыедзе ў Бэрлін, то ўжо яго не выпускайце, бо ў прыпадку нашага разьезду ў розныя канцы ён у Парыжу можа быць небяспечны.

Калі-б удалося перанесьці наш урад у Прагу[81], то гэта было-бы вельмі добра. Я лічу гэту думку зусім правільнай. Тым болей, што ў прыпадку шчасьлівай разьвязкі пытаньня аб нашых оккупантах, мо' скора прыдзецца ўсім вярнуцца ў Менск або Вільню, а хіба з Прагі гэта будзе лягчэй. Выступленьне проці літвіноў перад Конфэрэнцыяй ужо зроблена. Да мэморыялу, чарнавік каторага я Вам ужо паслаў праз ген. Патоцкага (у ім выкінуты толькі словы, што Украіна – саюзьніца Нямеччыны), далучаны дакумэнты: рэзалюцыя Віленскага зьезду, тэлеграма зьезду да нашага ураду, адазваньне Семашкі[82], пратэст беларусаў-тарыбнікаў проці літоўскага аннэксыонізму і заява Крэчэўскага аб тым, што яму заявілі літвіны ў часі перагавораў. Гэтае «досье» вельмі сурьёзнае. Яно, здаецца цэлком будзе надрукована ў «Revue Parlamentaire». Апрыч таго пусьцім стацьцю аб тым, што берасцейскі мір дагэтуль на практыцы не ануліраван толькі ў адносінах да беларускага народу, зямлю каторага немцы раздалі літвінам, украінцам і маскалём.

Як відаць з прыраўнаваньня нашых і Вашых данных, немцы вядуць зусім выразную лінію на «единую неделимую Россію». Гэта відаць з іх адносін да нас: нашых грошы, загрэбленых у Менску[83], яны не вярнулі, пярэсланыя праз украінскую крэдытную канцэлярыю паўтара мільёна з хвастом зрабавалі і робяць усё, каб мы сваё войска арганізовывалі пад скрыдлам Лівэноў, Бэрмонтаў[84] і т. п. – з тым, каб гэткае войска пасьля нас-жа павесіла ў першы чарод! З гэтым трэба быць вельмі асьцярожнымі!

Пакуль-што бывайце здаровы. Калі ўдасца зрабіць падарожу на ўсход, дык пастараюся затрымацца ў Празе і Вас туды вызваць.

Шчыры прывет усім.

Ваш Ант [подпіс].

Прыкладаю запіску[85], якія матэрыялы патрэбны для нашага сэкрэтарыяту. Польскія выданьні нам вельмі прыгодзяцца. Пасылаю колькі экзэмпляраў французскай кніжкі, дзе ёсьць і аб нашай справе, а такжа нумары газэт з заметкамі аб нас[86].

13

Paris, le 24.VIII.[19]19.

Дарагія Таварышы!

Бачыце, якога спосабу ужываю, каб пераслаць Вам гэтае пісьмо: гэта затым, каб забяспечыцца ад магчымай «цэнзуры», бо ведамасьці, якія Вам пасылаю, становяць у вялікай часьці сэкрэт перад нашымі чарнасоценцамі[87].

Справа вось у чым: заўтра я і палкоўнік Ладноў (апошні не напэўна!) едзем у Варшаву на просьбу Падэрэвскага[88]. Аб нашай падарожы аддавец пісьма ведае, але аб запросінах ня ведае, аб чым яму і не кажыце, здаволіўшыся офіцыяльным выясьненьнем падарожы, якое ён сам Вам дасьць. Мая мэта – дабіцца за ўсялякую цану магчымасьці арганізацыйнай работы для нашага ўраду ў нашым краю, ў тым ліку і арганізацыі аружных сіл – хаця-бы ў форме міліцыі. Ясна, што польская акупацыя можа патрываць гады два – найменш! – а за гэты час палякі сваю работу лёгка зробяць, калі мы ня будзем мець магчымасьці шырока працаваць і нешта даць нашаму народу. Тады разьдзел Беларусі – немінучы. На гэту тэму ўжо йдуць у Варшаве перагаворы між палякамі і Денікінцамі[89], – іх трэба за усялякую цану разстроіць.

Маскалі ахвотна пайшлі-бы на кампэнсацыю палякоў нашай зямлёй: ім важна супрацоўніцтва палякоў з Денікіным – тым больш, што Пятлюру паддзержываюць румыны. Дый з палякамі, як кажуць, украінцы здолелі замірыцца[90] – хоць мо’ толькі часова. Палякі-ж стаўляюць справу Беларусі і Літвы на такі грунт, што яны павінны быць разьвязаны мірнай конфэрэнцыяй. Ведама, палякі спадзяюцца дайсьці угоды з намі, і мы паддзержываем іх пэўнасьць у гэтым. Гэтымі днямі адзін палкоўнік з сьвіты генарала Драгоміра сказаў нашаму генаралу[91], што «Вы, беларусы, ў скорым часе адыграеце важную ролю». Відаць, маскалі таксама пераконаны, што мы пойдзем з імі. І іх мы расчаровываць ня хочам, а угледаемся, дзе будзе найвялікшая карысць для нашай Бацькаўшчыны, і пойдзем з тымі, хто дасць максімум пэўнасьці, што мы захавалі

незалежнасьць у самых шырокіх межах.

Вось, наша палітыка. Ведама, нашы чорнасоценцы ня ў курсе ўсяго гэтага – апрыч таго, што прыходзіцца ім канечне гаварыць. І з гэтай прычыны бытнасьць у Парыжу О[знобішына] пасьля майго выезду небяспечна. Трэба, каб Вы яго выдзяржалі як найдаўжэй, карыстаючыся ім для ліквідацыі Давыдава і іншых спраў. Мо' пры павароці «на Маскву» ён будзе карысны. Але, калі выпадкі прымусяць нас да камбінацыі з палякамі, дык ён можа нам шмат папсаваць.

У справах адносін да немцаў і іх адбудовыванья Расіі трэба Вам быць вельмі асьцярожнымі. Тут О[знобішын] можа быць Вам вельмі карысным дзеля разьведкі. Калі яму трэба будзе грошы на прадстаўніцтва – давайце! Сутачныя-ж яму заплочаны да 1.IX.[19]19.

О[знобішыну] я сказаў, што калі прыйдзецца сплаўляць Давыдава, дык можа будзе выкарыстаць канец крэдытаў. Вы-ж адмалюйце яму Д[авыдава], як мае быць, каб О[знобішын] шчыра ўзяўся за рэвізію.

З прычыны таго, што міністэр абароны ў нас ужо ёсць, я касую становішча экспэрта па ваенным справам, якое дадзена Д[авыдаву], і пішу яму, каб вярнуў мандат і паўнамочча дзеля вядзеньня перагавораў з вядомымі кругамі. Вырвіце ад яго канечна гэтыя дзьве паперкі. Прыказу яму на рукі не давайце, а дайце прачытаць і распісацца на прыказе, што чытаў.

Ліквідацыю В[аенна]-Арган[ізацыйнага] аддзелу ў патрэбе зрабіце самі – пастановай Рады Міністраў, закрыўшы крэдыты. Добра было-бы, каб хто з Вас прыехаў таксама ў Варшаву. Найлепей бы зрабіў гэта Смоліч і Цьвік. Калі яны там, або ў Празе, тэлеграфуйце, каб мяне там спаткалі (ў Варшаве), бо могуць вынікнуць вельмі сур'ёзныя пытаньні, адказ за якія прыдзецца браць мне аднаму.

З Варшавы буду прабівацца на Вільню–Менск і заеду да Івана ў Закопанэ. Да Вільні тэлеграфую, каб хто таксама пад'ехаў у Варшаву.

Я з Ладновым прыцягнулі да работы ў нас де-Вуліча[92], як райчага пры Радзе Міністраў па справам фінансовым і прамышленым, на правах упраўляючага міністэрствам. Гэта для нас незвычайна цэнны прыбытак: ён нас можа выратаваць у фінансовых справах. Ён жа вядзе справу куплі амэрыканскіх стокаў[93], якія можна лічыць нашымі, толькі атрымаем мы іх праз французаў, што менш прыемна. О[знобішын] ня ў курсе гэтых спраў. Назначэньне де-Вуліча правядзіце праз Раду Міністраў: копіі назначэньня пасылаю.

З сабой бяру 100 з лішкам тысяч марак, каб ня быць з пустымі рукамі ў Вільні і Менску.

Шчыры прывет усім.

Ант [подпіс]

Прашу выслаць прыложанае пісьмо ў Ковеншчыну, а таксама другое Егеру[94] Вайсковых запасаў[95].

14

Варшава, Hotel Saski

18. IX. [19]19.

Дарагі Таварышу![96]

Сяджу ў Варшаве і вызываю сюды Захарку, бо ён тут нарабіў паскудных абмылак[97] . Пілсудскі настойвае, каб як найбольш людзей нашых ехала ў Менск. Пакідаю Вас у Бэрліне аднаго, але думаю, што хутка некага надышлю Вам на падмогу. Мо’ разам і добрыя весткі пашлю, калі тут удасцца нечага дабіцца. Тым часам шлю адну: віншую Вас з насьледнікам – сынам, бо д-р Об’езерскі[98] прывёз сюды вестку, што «у Зайчыхі сын». Гэтак род Зайцоў ужо не абарвецца!

Аб Вашай рабоце ў Бэрліне скажу вось што. Калі толькі ўдасцца дабіцца ад Пілсудскага згоды на нашы вайсковыя фарміраванні, дык можна будзе выкарыстаць нашы лепшыя элементы. Вось, і дзяржыце ў руках гэткіх людзей, пакуль будзе магчыма. Калі-б жа немцы згодзіліся ўрэшці выдзяліць нашых беларусаў[99] у асобны табор, дык гэта было бы найвялікшым нашым заваеваньнем. У гэтым кірунку і вядзіце далей работу. Аб тым, якую лінію маеце вясьці наагул, мяркуйце паводлуг маіх справаздач з Парыжу. Тут жа, ў Варшаве, мая работа вядзецца ў такім духу: дабіцца прызнаньня нашай дзяржаўнасьці і урадовых устаноў цаной некаторых компромісаў, як дапушчэньне польскіх прадстаўнікоў у раду і ўрад і назначэньне польскіх ваенных прадстаўнікоў пры нашых павятовых камісарах. Гэтак часова ад лішне вострых выступленьняў проці Польшчы наагул трэба Вам часова устрымліваецца, бо да сазыву устаноўчага Сэйму Беларусі і разьвязкі пытаньня аб прызнаньні нас палякамі трэба ім рабіць «przyjemną twarz»[100]. Іншая рэч крытыка паадзінокіх учынкаў польскай адміністрацыі і эндэцкай палітыкі: проці эндэкаў можна пісаць усё!

Вось, пакуль што ўсё, што я Вам магу сказаць, даверыўшы паперы.

Шчыры прывет усім.

Ваш Ант [подпіс].

15

Варшава, 23.X.[19]19[101] .

Дарагі Таварышу![102]

Толькі сягоньня, 23.X., прыслаў мне Вершынін[103] праз чэскага кур'ера Ваш пакет. Сьпяшу Вас паведаміць, што справа арганізацыі беларускага войска на Беларусі ўжо пастаноўлена: апрацован ужо прыказ Пілсудскага аб гэтым і заўтра мае быць

падпісан на аўдыенцыі членаў вайсковай камісіі[104]. Войска нашае будзе зусім незалежнае – з сваім глаўнакамандуючым (палк. Конопацкі), толькі паступаючы на антыбальшавіцкі (ня іншы!) фронт падлягае вышэйшай польскай камандзе опэрацыйна і тактычна. Гэтак сама ўдачна разьвязываецца і справа арганізацыі беларускіх часьцей у Латвіі. Толькі-што я закончыў двохгадзінную нараду з латышскім міністрам загранічных спраў Мэеровіцам, які прыехаў у [складзе] дэлегацыі ў Варшаву і быў у мяне.

Нарада з М[эеровіцам] паказала, што трывога Крэчэўскага і гвалт, каб я 25.X. быў у Рызе[105] (гэта ўжо фізычна немагчыма!), зусім дарэмны. Латышы добра разьбіраюцца у справе Вільні і паддзержываюць ідэю беларуска-літоўскай фэдэрацыі. Апрыч таго я абгаварыў цэлы рад іншых нашых спраў, у тым ліку назначэнне прадстаўніка Латвіі пры нашым урадзе ў Менску.

Ужо тое, што войска нашае арганізуецца ў зьвязку з Польшчай і Латвіей – ворагамі Немцаў, ясна паказвае абсурднасьць заявы Крэчэўскага аб патрэбе пераносу ураду ў Бэрлін! Sapienti sat![106] І я больш нічога яму не адказваю.

Наадварот: усе сілы трэба концэнтраваць у Менску, дзе Рада Рэспублікі хутка адкрые сэссію, на якую павінен прыехаць Кр[эчэўскі]. Даволі ўжо мелі Варонкаўскай палітыкі «пуффоў»[107] пад той час, як на мясцох нічога не рабілася. За ўвесь час маёй працы ў Парыжу я неустанна сустрэкаўся з пытаньнямі: а гдзе Ваш урад? І калі мне маюць даць на сотні мільёнаў марак тавараў у крэдыт, літвіны заяўлялі, што «б[еларускі] урад памяшчаецца ў вагонах скорых паяздоў Эўропы». Яшчэ добра, што не казалі таго, чаго дабіваецца Пётра: што ў Б[эрліне]!

Я наагул не разумею, на што Вы спадзяецеся ў Бэрліне. Хіба-ж выпадкі ў Латвіі і Літве Вас нічога не наўчылі?[108] Ці мо с[ацыялісты]-ф[эдэралісты] хочуць ісьці на «фэдэрацыю» з Денікіным? Няўжо-ж гэткая наіўнасць?..

Разумею адно і ў Б[эрліне] робіцца ваенная работа, а такжа шырокая асьведамленьне. Лічу гэта вельмі цэнным і, каб яе не прыпыняць, пастараюся чым хутчэй паслаць некага на Вашае

месца.

Што датычыцца дэлегацый у Лондан і др., то ўсё гэта наладзіцца, але не раней, як умацаваўшы наш урад на месцы. P.P.S.[109] падніме ў Сэйме справу нашага прызнаньня, і для яе ўжо тут многа зроблена, – а без Польшчы, якая – як Вам вядома – акупавала Беларусь, мы астанемся назаўсёды ў паветры і будзем занімацца Варонкаўскай работай: пусканьнем пузыроў з мыла.

Падчырківаю Вам, што наша работа робіцца ў Варшаве ў поўным контакце з украінцамі. Цьвік – у Пятлюры, а тут сядзіць укр[аінская] дэлегацыя з міністрам закор[донных] спраў Андрэем Левіцкім.

Наагул-жа Варшава, а не Ваш Бэрлін, становіцца цэнтрам разьвязкі усходняга пытаньня. У гэтым зусім солідарны з намі і латышы і украінцы. Ідзе аб рэальныя сілы, а не аб пустыя фразы, на якія так шчодры палітыкі Варонкаўскага тыпу. Намячаецца комплекс дзяржаў між Балтыкай і Чорным морам разам з Польшчай, – але так, каб не было польскай супрэмацыі[110].

Гэта можа вельмі непадабацца Вашым бэрлінскім прыяцелям, і я думаю, што добра было-б мо' перавезьці наш скарб у Прагу, дзе мог бы часова пасядзець Базыль[111] . Пішу Табе шчыра (і толькі Табе): уважаю, што гэтая камбінацыя з Варонкай[112] – гэта рэзультат уплыву гэтага пана на Базыля. А што варты тлумачэньня Вар[онкі], чаму ён не выходзіў у адстаўку, калі таго вымагала наша палітыка, – відаць вось з чаго: ён і «без дастатачных прычын» гатоў быў кінуць літвіноў (ведама, цаной пасольства ў Лондоне!), калі стала вядома, што габінэт у Коўні рэорганізуецца і бел[арускага] мін[істэр]ства зусім ня будзе! Адчыніце, людзі, вочы! Ведайце, што не магу я наразіць нашу справу на блутаніну ў Лондоне, дзе Варонку знаюць, як літоўскага міністра! Гэта-ж такая думка – адзін сьмех.

Я прасіў Базыля зусім афіцыяльна прыехаць сюды. Ад яго адказу ня маю. Тымчасам грошы тут на гвалт патрэбны. Расейскія (думскія) маюць добры курс (60 м[арак]). А ў Менску голад і гвалт. А ўрад трэба неяк абставіць, каб меў нейкі від і

каб можна было людзям паказаць!

Шчыры прывет.

Ваш Ант [подпіс].

*Прадмова, каментары і публікацыя Рыгора Лазько**

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 10 (50) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/14
[image]

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ
гісторык, даўні аўтар «ARCHE».
Укладальнік кнігі «Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху» (Менск, 2003).
Падрыхтаваў да друку чарговыя два тамы твораў Антона Луцкевіча.

Апошнія дні Антона Луцкевіча

Калі Маргарыта Пярова, унучатая пляменьніца Антона Луцкевіча, апублікавала ў «Літаратуры і мастацтве» артыкул «Ці будзе Аткарск яшчэ адным сьвятым месцам для беларусаў?», некаторыя гісторыкі выказалі сумненьне адносна абнародаваных ёю зьвестак.

Нагадаю, што ў артыкуле ўдакладняліся дата і месца сьмерці А. Луцкевіча. Раней савецкія «органы» хацелі пераканаць нас, што бацька беларускае дзяржаўнасьці памёр у 1946 г. у Сяміпалацінскай вобласьці Казахстану. Сутыкнуўшыся зь яўнаю хлусьнёю наконт датаў і месца сьмерці іншых выдатных дзеячаў беларускага руху і беларускае культуры, я палічыў патрэбным паставіць пад сумненьне гэбісцкія зьвесткі і наконт Луцкевіча. Так, у 1994 г. у 4-м томе біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменьнікі» ў артыкуле «Антон Луцкевіч» стаяць пытальнікі і пасьля лічбы «1946», і пасьля словаў «Сяміпалацінская вобласьць, Казахстан», а ў аднайменным артыкуле, зьмешчаным у 4-м томе Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі, лічбы «1946» наагул няма: замест яе стаіць пытальнік (прауда, у тэксьце зроблена зацемка, што А. Луцкевіч, паводле афіцыйнай вэрсіі, памёр у Сяміпалацінскай вобласьці (Казахстан) у 1946-м). І вось 8 лютага 2002 г.

1 Кніга выйшла накладам усяго 20 асобнікаў. У Нацыянальнай бібліятэцы яна есьць.
2 Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова пачытаць артыкулы А. Луцкевіча «Прычыны крызісу» і «Ня можна маўчаць...» у «Беларускім Звоне» за 6 студзеня і 10 сакавіка 1931 г.
3 Што такое нацфашызм і чым ен адрозьніваецца ад нацдэмакратызму, я пісаў у артыкуле «Хроніка пераломнага часу. Антон Луцкевіч як ідэоляг і правадыр нацыянал-фашызму і нацыянал-дэмакраты» (Дзеяслоў. 2004. № 8).

Мікалай Іванавіч Пяровіч, дзед Асобая нарада пры НКВД СССР, 1941 г.

О СУДИМОСТИ И СМЕРТИ

09.08.2001 № 4962-Р

В следственном деле № П-11794 архивного фонда КГБ Литовской ССР Особого архива Литвы есть сведения, что Луцкевич Антон Иванович 1884 г. р., уроженец гор. Шяуляй, житель гор. Вильнюс 30.09.1939 г. был арестован Вильнюсской опергруппой.

Постановлением 3 отд. УГБ НКВД БССР от 17.11.1939 г. дело на Луцкевича принято к своему производству, избрана мера пресечения содержание под стражей в Минской тюрьме.

Обвинительным заключением 3 отд. УГБ НКВД БССР от 08.08.1940 г. обвинялся в том, что в период Октябрьской революции и гражданской войны организовывал контрреволюционные (дальше – к. р.) силы из белорусской националистической среды, находясь на территории Западной Белоруссии, являлся агентом 2-го отдела Польглавштаба, организовывал белорусский к. р. элемент (так в документе) для активной борьбы с коммунистическим революционным движением в Западной Белоруссии и СССР, при активном участии Луцкевича был организован «политический центр» в Вильнюсе, который перебрасывал к. р. шпионско-диверсионные и повстанческие кадры на территорию БССР, где последними был организован «Белорусский национальный центр», ставивший своей целью свержение Советской власти и образование «правительства» (так в документе) буржуазной Белоруссии во главе с нацфашистом Луцкевичем[3], т. е. в преступлениях, предусмотренных ст. 64, 68, 74 и 76 УК БССР.

Постановлением Особого Совещания при НКВД СССР[4] от 14.06.1941 г. за антисоветскую деятельность осужден на 8 лет исправительно-трудовых лагерей.

04.02.1942 г. из Балашевской тюрьмы[5] № 3 прибыл в пересыльный пункт гор. Аткарска Свердловской области[6].

23.03.1942 г. умер в перпункте гор. Аткарска.

ОСНОВАНИЕ. Ф<онд> К-1. Оп< ись> 58. Сл<едственное> д<ело> № П-11794. Том 1. Л<исты> 1, 2, 4.

Сл. д. № П-11794. Том 2. Л. 320, 334, 335, 338.

Н<адзорное> д<ело> П-11794. Л. 27.

В анкете арестованного Луцкевича Антона Ивановича от 14.01.1941 г. указано: 1) сын Луцкевич Юрий Антонович 20 лет (так в документе, год и место рождения не указаны), проживающий [в] гор. Вильнюс, Пивная ул. 2, кв. 8, электромонтер; 2) сын Луцкевич Лев (так в документе) Антонович 18 лет (так в документе, год и место рождения не указаны), проживающий [в] гор. Вильнюс, Пивная ул. 2, кв. 8, электромонтер.

ОСНОВАНИЕ. Ф. К-1. Оп. 58. Н. д. № 11794. Л. 4.

ЗАМЕЧАНИЕ: В архивном фонде КГБ Литовской ССР Особого архива Литвы более точных данных о смерти Луцкевича Антона Ивановича и более точных данных о Луцкевич Юрий Антоновиче и Луцкевич Леонид Антоновиче не имеется.

Директор Овидиюс Леверис

Заведующая отделом Вильма Эктите

Мера пакараньня, выбраная для А. Луцкевіча, выглядае мяккаю: «усяго» восем гадоў. Але возьмем пад увагу два моманты.

Першы: ніхто не гарантаваў, што ў дзень сканчэньня тэрміну пакараньня – 30 верасьня 1947 г. – супраць Луцкевіча не распачалі б новай справы. А магло быць і так, што яго адправілі б у ссылку або вызвалілі б зь «мінусамі»: грамадзянін Луцкевіч мае права жыць ва ўсіх населеных пунктах СССР мінус Масква і Ленінград, мінус сталіцы саюзных рэспублік і г. д. А са ссылкі – зноў у турму ці ў лягер: вёў антысавецкія размовы, крытыкаваў калгасны лад... Вядомая нам практыка.

Другі момант: у А. Луцкевіча было слабое здароўе. У няволі яно не паправілася. Ва ўжо названай кнізе У. Міхнюка, А. Гесь ды М. Клімовіча маецца лекарская даведка. Доктар Голікава, агледзеўшы 57-гадовага вязьня Луцкевіча, выявіла наступнае: «Рэзкая бледнасьць скураных покрываў. Падскурна-тлушчавы слой разьвіты слаба». Яна канстатавала таксама, што ў 1937 г. Луцкевіч быў хворы на тубэркулёз і што ў яго парок сэрца. У турэмна-лягерных умовах чалавеку пагражалі або рэцыдыў сухотаў і дыстрафія, або праблемы з сэрцам. Дарэчы, зь ліста Ўладзімера Жылкі мы ведаем, што праблемы з сэрцам пачаліся ў Луцкевіча яшчэ ў 1923 г.[7], аднак на волі іх удавалася вырашаць. Іншая справа – няволя. І старэньне арганізму.

Даведка доктара Голікавай складзеная 22 красавіка 1941 г. А ўжо 15 траўня начальнік санітарнай часткі ўнутранай турмы паведамляў начальніку гэтае ўстановы капітану дзяржбясьпекі Міронаву, што вязьню камэры № 7 Луцкевічу ў сувязі з захворваньнем сэрца неабходна замест чорнага хлеба даваць белы. 450 г штодня на працягу 15 дзён.

Амаль роўна празь месяц пасьля гэтага – 14 чэрвеня – Луцкевічу была вызначана мера пакараньня. З рашэньнем Асобае нарады яго пазнаёмілі 7 ліпеня.

Вось тут мы стаім перад пытаньнем: чаму А. Луцкевіча адразу пасьля прысуду не адправілі на Поўнач?

У кнізе У. Міхнюка, А. Гесь і М. Клімовіча рэпрадукуецца выпіска з пратаколу № 61 Асобае нарады пры наркаме дзяржбясьпекі СССР. На ёй рукою напісана: «Воркутпечлаг». Якую працу за Палярным кругам у Пячорскім вугальным басэйне прадбачылі для сухотніка і сардэчніка Луцкевіча гэбісты, цяжка сказаць. Як цяжка сказаць, чаму яго павезьлі не на паўночны ўсход ад Масквы, а на паўднёвы – у горад

[7] Гл. Жылка У. Выбраныя турмы. Мінск: ТБ НКВД Беларусі кнігазбор, 1998. С. 254.

Балашоў.

Для нас цікавая даведка бяз нумару, якая захоўваецца ў архіве пры Галоўным упраўленьні ўнутраных справаў Саратаўскай вобласьці (Ф. 37. Воп. 14. Арх. № 65. Арк. 64) і выдадзеная 10 студзеня 1941 г. начальнікам турмы № 3 Упраўленьня НКВД па Саратаўскай вобласьці, што знаходзілася ў Балашове. Даведка цікавая выпраўленьнямі, якія сьведчаць, што гэбісты не адмовіліся ад намеру паказаць А. Луцкевічу савецкую Поўнач. У даведцы выкасаваны запіс у абзацы «В какой лагерь следует», а ў абзацы «Пункт назначения» выкасаванае слова «Аткарск» і ўпісана «ст. Сосьва ж. д. им. Кагановича Севураллаг». Гэтым давалася зразумець: Аткарск – не канчатковы пункт, а «перасылка»; вось прывязуць зэка Луцкевіча ў Аткарск, а адтуль – ужо з этапам – адправяць у Сосьву. Ведама, так вырашылі не ў Балашове.

З Балашова ў Аткарск Луцкевіча прывезьлі 4 лютага 1942 г., а праз два тыдні (18 лютага) начальнік санчасьці Аткарскага перасыльнага пункту А. С. Куркоў дакладваў начальніку «перасылкі» Кудасаву, што вязень Луцкевіч падлягае шпіталізацыі з дыягназам «міякардыт, зьнясіленьне».

Так пачаліся апошнія 34 дні ў жыцьці Антона Луцкевіча. Мы ня ведаем, хто і як яго лячыў, затое маем дакумэнт, складзены 23 сакавіка 1942 г.:

Начальнику Аткарского п/пункта

Рапорт

Доношу, что з/к Аткарского п/пункта Луцкевич Антон Иванович 1884 года рождения 23/III-42 в 12 часов дня умер.

Нач. санчасти Курков.

У тым самым архіве захоўваецца і такі дакумэнт:

Акт

23 марта 1942 года мы, нижеподписавшиеся начальник санчасти Аткарского п/пункта УНКВД Курков А. С., ответ. дежурный комендант Лапкин К. А., медсестра Воскресенская В. В., составили настоящий акт в том, что 23/III-42 в 12 часов умер больной з/к Луцкевич Антон Иванович 1884 года рождения с диагнозом «миокардит, отек лица и конечностей».

Смерть наступила от парализации сердечной деятельности.

Пад актам маюцца подпісы і трохкутная пячатка.

Пахавалі А. Луцкевіча ў дзень сьмерці, пра што таксама ёсьць дакумэнт:

АКТ О ПОГРЕБЕНИИ

1942 года, марта 23 дня мы, нижеподписавшиеся комендант кладбища коммунально-бытовой части г. Аткарска тов. Хмельницкий, стрелок ВОХР пересыльного пункта г. Аткарска тов. Демченко И. и рабочие, присутствовавшие на погребении, Червяков Иван Васильевич и Баркалов А. В., сего числа произвели погребение умершего заключенного 23/III-42 года, прибывшего 4/II-42 г. из Балашовской тюрьмы ЛУЦКЕВИЧ Антона Ивановича 1884 года рождения, уроженец г. Шавли (Литва), последнее время проживал в Западной Белоруссии[8] (бывш. Польша), осужден Особым Совещанием 14/6-41 г. за а/сов. агит. на 8 лет, личное дело № 1100.

В гроб с умершим положена дощечка с надписью фамилии, инициала заключенного с указанием № личного дела и на могиле погребенного установлена дощечка с порядковым номером лит. «В», о чем и составлен настоящий акт.

Акт надрукаваны ў двух асобніках, падпісаны камэндантам могілак, стралком і рабочымі ды змацаваны трохкутнаю

[8] Вільні, да ёсьць крыштаваны А. Луцкевіч, Сталін ужо падарыў Літве, але

пячаткаю.

28 сакавіка 1942 г. начальнік перасыльнага пункту Кулдасаў і начальнік санчасьці Куркоў накіравалі паведамленьне (*извещение*) начальніку аддзелу актаў грамадзянскага стану УНКВД па Саратаўскай вобласьці, у якім пісалі:

Гр-н Луцкевич Антон Иванович 1884 рождения, уроженец г. Шавли (Литва), осужденный Особ. совещ. при НКВД СССР от 14-6-41 по ст. АСАгит. к 8 годам л/св., в пересыльном пункте г. Аткарска 23-III-1942 г. умер.

Последнее местожительство его в Западной Белоруссии.

месцам яго апошняга жыхарства на ранейшаму лічыцца Заходняя Беларусь.

Я тут вельмі падрабязна цытаваў атрыманыя М. Пяровай дакумэнты дзеля таго, каб паказаць, што яны супярэчаць ранейшым афіцыйным зьвесткам аб даце і месцы сьмерці А. Луцкевіча. І дзеля таго, каб паказаць, што яны – і архіўная даведка зь Вільні, і архіўныя дакумэнты з Саратава – паказваюць нам сапраўдныя дату і месца сьмерці бацькі беларускае дзяржаўнасьці. Ня думаю, што цяпер, калі названыя нават імёны ўдзельнікаў пахаваньня А. Луцкевіча, могуць узьнікнуць нейкія новыя сумневы.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/15

[image]

АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ
гісторык. Адна з апошніх публікацыяў – «Беларускае насельніцтва Аўгустоўскага павету Сувальскай губэрні (2-я пал. XIX – пач. XX стст.) (Białoruskie Zeszyty Historyczne, 21, 2004).

Андрэй Вашкевіч
Прадбачанні «Беларускага Фронту»

УСТУП

У другую палову 1930-х гадоў Еўропа ўвайшла, усё больш усведамляючы, што хутка пачнецца новая вайна. Вядучыя дзяржаўныя нацыі актыўна рыхтаваліся да яе, аддаючы на ўзбраенне большую частку сваіх бюджэтаў і сплятаючы дыпламатычныя інтрыгі з мэтай стварыць выгадную для сябе сістэму ваенна-палітычных дамоў. Малыя недзяржаўныя нацыі, разумеючы, што ў будучай вайне ім адводзіцца роль пешак, спрабавалі падрыхтавацца да яе прынамсі ідэалагічна, бо, ведалі – бойня, віноўнікамі якой яны не будуць, нясе ў сабе адначасова і пагрозу новага паняволення, і надзею на змену да лепшага. Да ліку апошніх належалі і беларусы, якія вось ужо паўтара дзесяцігоддзя жылі ў розных дзяржавах і ні ў воднай з іх не мелі правоў, належных свабоднай еўрапейскай нацыі.

У 1914 годзе Першая сусветная вайна захапіла беларусаў на культурна-асветніцкай стадыі «нашаніўства», калі нават сама ідэя незалежнасці краіны здавалася фантастычнай. Цяпер, праз дваццаць гадоў, беларусы ўжо мелі за спінаю досвед палітычнага, грамадскага і нават узброенага змагання, мелі

дэкларацыю незалежнасць у выглядзе БНР і фантомную савецкую дзяржаўнасць, мелі стотысячную Грамаду ў Заходняй Беларусі і колькі гадоў «беларусізацыі» ў Беларусі Ўсходняй. Тым не менш, у пачатку 1930-х беларускі нацыянальна-вызвольны рух быў разгромлены па абодва бакі рыжскай мяжы. Беларускія дзеячы, што жылі або пераехалі ў БССР, былі расстраляныя, а заходнебеларускія вёскі пасля бурлівых 1920-х гадоў вярнуліся да стану «спаконвечнага сну».

Газета «Беларускі Фронт», выданне якой было арганізавана ксяндзом Вінцэнтам Гадлеўскім летам 1936 года, стала своеасаблівым індыкатарам грамадскай актыўнасці беларускіх эліт. Ніводная заходнебеларуская газета ў тое дзесяцігоддзе не прысвячала так шмат увагі міжнароднаму становішчу, не мела такога шырокага палітычнага кругагляду, не друкавала такіх добрых і актуальных публіцыстычных цыклаў, не прадбачыла так дэталі трагедыі, што пачалася ў Еўропе праз некалькі гадоў.

[image]

НАРАДЖЭННЕ ІДЭІ

Гісторыя «Беларускага Фронту» пачалася ў канцы лета 1935 года, амаль за дзесяць месяцаў да выдання яго першага нумара. Менавіта тады функцыянеры Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ўпершыню звярнуліся да кіраўніцтва Беларускай хрысціянскай дэмакратыі з прапановай супрацоўніцтва на аснове праграмы Народнага Фронту. Рабілася яна ў адпаведнасці з пастановамі сёмага кангрэса Камінтэрна, які акурат тады скончыў сваю працу ў Маскве. Кіраўніцтва КПЗБ, якое ў 1928–1935 гг. падтрымлівала тэорыю «нацыянал-фашызму» (паводле яе ўсе нацыянальныя дэмакратычныя партыі разглядаліся як ворагі КПЗБ і памагатыя фашыстаў), цяпер павінна была заклікаць усе прагрэсіўныя заходнебеларускія сілы да сумеснай барацьбы з фашызмам. Такі саюз усіх дэмакратычных арганізацый (ад цэнтрыстаў да камуністаў) павінен быў атрымаць назву Народнага Фронту. Сярод усіх заходнебеларускіх партый прапанову ўступіць у Народны Фронт атрымала толькі БХД.

[image]
Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі,
пачатак 1930-х гг.

Беларуская хадэцыя, хоць і значна аслабленая польскімі рэпрэсіямі, працягвала заставацца ўплывовай беларускай нацыянальнай арганізацыяй, якая стаяла на пазіцыях Акта 25 сакавіка 1918 г. Фармальна яе ўзначальвалі Янка Шутовіч, Адольф Клімовіч і Янка Пазняк, аднак рэальнае кіраўніцтва партыяй па-ранейшаму заставалася ў Вінцэнта Гадлеўскага і Адама Станкевіча. Пасля біскупскай забароны 1928 г. удзельнічаць ксяндзам у дзейнасці БХД, яны выйшлі з партыі, аднак першы займаў пасаду старшыні Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, другі – спачатку скарбніка, а пасля старшыні рэвізійнай камісіі інстытута. Менавіта ім трэба было вырашыць, ці пойдзе хадэцыя на супрацоўніцтва з камуністамі.

Хадэкі мелі масу рэальных падстаў баяцца правакацыі з боку заходнебеларускіх камуністаў, бо цягам апошніх некалькіх гадоў менавіта яны кляймілі БХД як згодніцкую, варожую беларусам і нават фашысцкую арганізацыю. Варта толькі згадаць выдадзеную КПЗБ у 1934 г. прапагандысцкую брашуру пад назвай «Як Беларуская хадэцыя гандлюе крывёю рабочых і сялян», у якой былі надрукаваныя ілжывыя звесткі пра супрацоўніцтва лідэраў хадэцыі з польскай дэфензівай[1].

Менавіта ў прынцыповым пытанні аб справе супрацоўніцтва з КПЗБ і выявіліся супярэчнасці паміж Адамам Станкевічам і Вінцэнтам Гадлеўскім. Першы прызнаў неабходнасць тактычнага супрацоўніцтва найперш у галіне барацьбы за беларускую школу і нават даў у лютым 1936 г. інтэрв'ю ў падтрымаў Народны Фронт. Другі схіляўся да думкі, што з камуністы ставяць сваёй мэтай справакаваць палякаў на ліквідацыі БХД праз уцягванне яе ў нелегальную антыурадавую працу. Больш за тое, кс. Гадлеўскі лічыў саму ідэю Народнага Фронту небяспечнай для беларусаў, паколькі за рэдкім выключэннем (Г. Дэмбінскі, Е. Ендрыхоўскі) лідэры народнафронтаўцаў нават не цікавіліся беларускім

У лютым 1936 г. адбылася таксама партыйная рэформа БХД.

[1] Уверсіі
[illegible]
[illegible]
[illegible]

Арганізацыя змяніла сваю палітычную праграму ў бок больш радыкальных палажэнняў і атрымала новую назву – Беларускае народнае Аб'яднанне (БНА). Рэформа партыі была арганізавана людзьмі больш блізкімі да кс. А. Станкевіча і, нельга сумнявацца, праходзіла пад яго кіраўніцтвам. У рэформе Гадлеўскі ўбачыў няўдалую спробу эклектычна аб'яднаць ідэі «папскіх энцыклікаў, саветызму і буржуазнай дэмакратыі». У канчатковага рашэння аб разрыве з групай кс. Станкевіча, мабыць, спрычыніліся таксама канфлікты ў Беларускім інстытуце гаспадаркі і культуры, за кіраўніцтва якім разгарнулася зацятая барацьба.

12 чэрвеня 1936 года кс. В. Гадлеўскі выдаў першы нумар газеты, якая атрымала назву «Беларускі Фронт» і мела падзагаловак «Незалежны народна-радыкальны часапіс». У рэдакцыйным артыкуле газета абвяшчала, што будзе стаяць на грунце незалежнасці Беларусі і таму адкідае ідэю стварэння Народнага Фронту. Былі таксама надрукаваны адкрытыя лісты кс. Гадлеўскага і В. Папуцэвіча (пасля 1945 года – Панкуцэвіч) аб тым, што апошнія парываюць з ідэалагічнай лініяй БНА.

Хутка пасля выхаду газеты сябра і паплечнік абодвух беларускіх ксяндзоў кс. Язэп Рэшаць даслаў Адаму Станкевічу паштоўку, дзе дзяліўся думкамі наконт новага выдання. Гэта бадай што адзіны знойдзены пакуль дакумент, з якога можна даведацца аб прычынах выдання газеты і ідэалагічных разыходжаннях лідэраў былой БХД. Прапануем яго чытачу цалкам:

Дарагі,

прыслаў мне Вінцук [Гадлеўскі] 1 нумар «Бел. Фронту».

Газэта як газэта, магла б быць горшай, магла б быць лепшай.

Але ня ў тым справа. Аказваецца, што «Б[еларуская] К[рыніца]» так ужо моцна захісталася ў сваей незалежніцкай ідэалёгіі, што трэба ад яе ўцякаць, каб у катастрафальных развалінах не пахаваць сябе і ўсё, што жывое-беларускае… Хм…

Беларускага Аб'яднання (БНА) – Беларускае народнае аб'яднанне (БНА) – арганізавана прыватнасці, фэст А. Станкевіча і Ф. Яго Да) кс. Вінцэнта навучаліся ў сувязях з кіраўніком віленскай дэфензівы кіртыклісам, напрыклад, што атрымалі ад яго 74 тыс. злотых на правядзенне выбарчай кампаніі 1928 г. Праз многа гадоў П. Каруза прызнаваў, што, даведзены да знямогі бяссоннем (яму не давалі спаць), напісаў пад «паказанні» дыктоўку менскага следчага Оберфельда.

«Рэзалюцыя Пазьняка…»

«процiў дыктатуры якой бы…»

Чытаючы гэныя матывы, думаецца, як сходна падзел ваш прыпамінае сярэднявечныя кірункі схалястычныя, дзе розныя spitzfindlichkeiten выклікалі ў вучоных глыбокія непаразуменьні.

Гэтак моцна падчоркнутая незалежнасьць «Б[еларускага] Ф[ронту]» кампрамэтуе між іншым выразна і пазыцыю «Б[еларускай] К[рыніцы]», мала таго, бо выглядае тут нават як бы трохі і правакацыйна…

Пішу, як мне здаецца, бо закулісовых вашых пэпарапэтыцыяў ня знаю добра.

Не разьбіраючыся ў ідэалёгічных падставах падзелу, прыкмячаю адную і другую старану зусім індывідуальна.

Залежнасьць у палітыцы… аб тым можна пісаць вялікую кнігу.

Незалежнасьць у палітыцы – таксама рэч рэлятыўная, знаючы, што такое палітыка.

А цяпер пачнецца стралянiна між «Б[еларускім] Ф[ронтам]» і «Б[еларускай] К[рыніцай]», востры і горкі крытыцызм уключна аж да асабістых разрахункаў… А што [нечытэльна] на тым скарыстаюць? Каб «Б[еларускі] Ф[ронт]» быў толькі скрыдлам адным вялікага супольнага фронту, тады што іншае, але калі сэнс яго будзе ў падзеле ідэалягічным і таварыскім зь «Б[еларускай] К[рыніцай], чаго тады спадзявацца? Магчыма, што і добра будзе, але пакуль што ў гэтым я асабіста не арыентуюся.

Просіць В[інцук Гадлеўскі] якую капейку паслаць яму на падмогу – чаму ж не, пашлю. Не спэцыяльна дзеля падтрыманьня ідэалёгіі «Б[еларускага] Ф[ронту]» як апазыцыйнай газэты да даселяшняй «Б[еларускай] К[рыніцы]», а проста пакуль што дзеля таварыскіх узглядаў.

Язэп Рэшаць

Больш падрабязна пра ўзаемаадносіны камуністаў і хадэкаў гл.: Вашкевіч А. БХД і КПЗБ: ад супрацьстаяння да супрацоўніцтва. 1935–1938 // Берасцейскі Хронограф. Брэст, 2004. С. 110–118.

2.

Язэп Рэшаць у канцы чэрвеня пісаў Станкевічу аб пазіцыі Гадлеўскага: «Ён цвердзіць, што ўсё здаровае за ім, дзе ўжо ўсе адны да вас горнуцца. Ён уважае, што катастрофа чакаецца поўная… Згаджаецца, што «Б[еларускі] Ф[ронт]» і «Б[еларуская] К[рыніца]» між сабой супярэчнасцяў мець не маюць». Гадлеўскі падкрэсліў, што не будзе канфлікту з Станкевічам, і вельмі абураўся наконт таго, як мог дазволіць пайсці «на такое» (саюз з камуністамі), маючы такі досвед палітычны нюх[3]. На жаль, Рэшаць меў рацыю, канфлікт паміж рэдакцыяй «Беларускага Фронту» і выданнямі, што друкаваліся Беларускім народным аб'яднаннем («Беларускай Крыніцай», «Хрысціянскай Думкай» і «Шляхам Моладзі») то затухаючы, то зноў распальваючыся, цягнуўся наступныя тры гады.

Гісторыкам пакінуць па-за ўвагай пытанне аб узаемаадносінах «Беларускага Фронту» і заходнебеларускіх камуністаў. Адзінае, што можна сказаць, – гэта тое, што Назустрач Сцягу Вераснь 1937 адназначна негатыўнай. У ліпеньскім нумары легальнага «Чырвонага Сцяга» «Беларускі Фронт супраць фронту», дзе для выдаўцоў «нечыстая Віленшчына» называлася прыстанішчам найбольш «ворагаў народу»[4]. Вынікам стала [illegible] адносін [illegible] Гадлеўскага ад фашызму», – пісаў «Чырвоны Сцяг», яўна намякаючы на магчымасць супрацоўніцтва[5].

[2] Цыт. Гадлеўскага: «Ён цвердзіць, што ўсё здаровае за ім, дзе ўжо ўсе адны да вас горнуцца. Ён уважае, што катастрофа чакаецца поўная… Згаджаецца, што «Б[еларускі] Ф[ронт]» і «Б[еларуская] К[рыніца]» між сабой супярэчнасцяў мець не маюць». Гадлеўскі падкрэсліў, што не будзе канфлікту з Станкевічам, і вельмі абураўся наконт таго, як мог дазволіць пайсці «на такое» (саюз з камуністамі), маючы такі досвед палітычны нюх. На жаль, Рэшаць меў рацыю, канфлікт паміж рэдакцыяй «Беларускага Фронту» і выданнямі, што друкаваліся Беларускім народным аб'яднаннем («Беларускай Крыніцай», «Хрысціянскай Думкай» і «Шляхам Моладзі») то затухаючы, то зноў распальваючыся, цягнуўся наступныя тры гады.

[3] ЦДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 279. Арк. 24–24 зв.

[4] «Białoruski Front» w ślepym zaułku // Czerwony sztandar. 1937. № 13 (22). S. 10.

[5] Мучнік Адзін з лепшых дасягненняў // Назустрач Сцягу. Вераснь 1937. № 10. С. 2.

[6] Гапуноў М. Ліст выдаўца // Мінск. Беларусь, 1970. С. 259–260.

[7] Кенарская Вітаўтаўская // Сцяг адзінства. 1998. № 1. С. 235.

[8] Мацюшонак Ідэалогія ВНА // Дзеячы адраджэння і грамадска-палітычнай думкі. Вып. 6. С. 269.

[9] Пазняк З. Вінцэсь Гадлеўскі // Наша слова. 1998. № 31. С. 11.

[10] Варкоўнік Характар Камуністычнай партыі // Бацькаўшчына. 2004. № 1 (9). С. 99–100.

[11] На нашым фронце // Наша ніва. 1938. № 7 (23).

[12] А. Ш. Што чытаюць // Наша ніва. 1938. № 7 (23).

[13] ЦДАМЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 279. Арк. 56–56 адв.

Супярэчлівымі былі адносіны да выдаўцоў газеты і ў заходнебеларускага паэта-камуніста Максіма Танка. У сваім дзённіку Танк некалькі разоў называе «Беларускі Фронт» фашысцкім і тым не менш згадвае выдаўца газеты В. Папуцэвіча як свайго знаёмага, які ў маі 1939 г. дапамог яму ўладкавацца на працу[6]. Магчыма, слова «фашысцкі» ў дачыненні да газеты аўтар дзённіка ўставіў ужо пасля вайны, рыхтуючы свае нататкі да выдання. Дарэчы сказаць, «БФ» нярэдка пісаў пра творчасць гэтага паэта, тады яшчэ пачаткоўца.

Хутка, аднак, палеміка «Чырвонага Сцяга» і «Беларускага Фронту» спынілася, КПЗБ летам 1938 г. была распушчаная на загад Камінтэрна.

Ад першага нумара і да канца 1938 г. газету рэдагавалі чатыры чалавекі. Рэдкалегія складалася з інжынера Л. Дубейкаўскага, студэнта В. Папуцэвіча і магістраў М. Шкялёнка і В. Гадлеўскага. Варта адзначыць, што ксёндз Гадлеўскі падпісваўся менавіта як магістр (г. зн. чалавек, які мае закончаную вышэйшую адукацыю) і свядома не акцэнтаваў увагі на сваім духоўным званні. Гэтым ён стараўся, па-першае, падкрэсліць, што газета не мае сувязі з каталіцкай ідэалогіяй, а па-другое, даць сабе большую свабоду выказванняў на старонках свайго выдання. Рэдактарам-выдаўцом першых чатырнаццаці нумароў быў В. Папуцэвіч. Далей В. Папуцэвіч фігуруе толькі як выдавец, кс. В. Гадлеўскі робіцца адказным рэдактарам (да таго часу В. Папуцэвіч ужо ледзь не трапіў у турму як рэдактар газеты, і ксёндз, напэўна, не хацеў яго больш падстаўляць). Пачынаючы з 34-га нумара (снежань 1938 г.), рэдкалегія прынамсі афіцыйна спыніла сваё існаванне, нумар падпісалі Гадлеўскі і Папуцэвіч, а пад астатнімі сямнаццаццю нумарамі фігуруе толькі прозвішча рэдактара-выдаўца Вінцэнта Гадлеўскага.

Гэтыя чатыры чалавекі пры бясспрэчным лідэрстве кс. Гадлеўскага і складалі ідэалагічную аснову групы «Беларускага Фронту». Менавіта крыптонімамі В. Г. (В. Гадлеўскі), В. П. (В. Папуцэвіч) і М. Ш. (М. Шкялёнак) падпісана большасць артыкулаў (сустракаюцца таксама нерасшыфраваныя

крыптанімы А.В., Р.С. і інш.). Рэдкалегія збіралася ў доме Л. Дубейкаўскага на Падгорнай вуліцы ў Вільні, дзе абмяркоўвала свае справы[7]. Фінансаванне газеты адбывалася з складак яе выдаўцоў, а паколькі друкаваўся толькі адзін нумар на месяц накладам 1000 асобнікаў[8] (толькі з 1939 г. газета пачала выдавацца раз на два тыдні), то месячная агульная сума выдаткаў 150–200 злотых для заможнага інжынера, адваката і ксяндза не павінна была быць вельмі вялікая, тым больш што частку расходаў з часам пачаў пакрываць продаж.

Паводле В. Пануцэвіча, былі канфіскаваныя восем з пяцідзесяці аднаго нумара газеты (фактычна кожны шосты)[9]. Тры разы газету канфіскоўвалі яшчэ ў друкарні. У такім разе наступны нумар газеты друкаваўся са зместам папярэдняга, выкідаўся толькі канфіскаваны артыкул. Яшчэ некалькі разоў канфіскаты адбываліся ўжо на пошце, калі наклад рассылаўся чытачам. Быў канфіскаваны ўжо трэці нумар газеты, артыкул «Залежнасць ці незалежнасць» цэнзары выкраслілі праз выказванне «сапраўдную незалежнасць нельга атрымаць, яе можна толькі ўзяць». Праз сем месяцаў, у сакавіку 1937 г., адбыўся суд над рэдактарам В. Папуцэвічам; апошні атрымаў год турмы ўмоўна[10]. У пачатку 1939 г. як рэдактара газеты судзілі і кс. Гадлеўскага.

Афіцыйна ў перадваенны час групоўка кс. В. Гадлеўскага так і не была аформлена ў партыю або грамадскую арганізацыю, гэта быў зародак будучай партыі ці руху, арганізацыйнае ядро, здольнае выпрацаваць ідэалогію і асноўныя кірункі дзейнасці, таму мы і будзем называць яе групай «Беларускага Фронту». Праўда, у самым пачатку 1937 г. газета паведаміла, што неўзабаве будзе праведзена арганізацыйная канферэнцыя Беларускай народна-радыкальнай партыі, але, мабыць, ад гэтай ідэі адмовіліся. Ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму ў Польшчы спробы стварыць легальную беларускую незалежніцкую партыю былі бессэнсоўныя.

Асноўнымі прынцыпамі газеты былі выключны палітычны прагматызм, асабліва ў міжнародных пытаннях. Група Гадлеўскага шукала палітычнага саюзніка і мела амбіцыю рыхтаваць нацыю да дзейснага змагання за незалежнасць.

АНАЛІЗ МІЖНАРОДНАГА СТАНОВІШЧА

Напярэдадні новай сусветнай вайны ўвесь свет раздзяліўся на тры вялікія блокі: дэмакратычныя дзяржавы (іх «Беларускі Фронт» называў яшчэ «сытым» блокам, бо яны гаспадарылі ў свеце пасля перамогі ў вайне 1914–1918 гг.); «галодны» або «дынамічны» блок, які складаецца з краін, пакрыўджаных пры раздзеле сусветнай здабычы ў 1919 г. (Германія, Італія і Японія), і Савецкі Саюз. І «дынамічны» блок, і СССР мараць пра перадзел свету і паслядоўна ідуць да гэтага:

Пасля вайны і Версальскага трактата (1919 г.) праз нейкі час існавала нейкая стабілізацыя, але чым далей ад Версаля і вайны, тым болей спасцерагаецца бурленне, якое прадказвае новыя змены і новую, яшчэ большую вайну. Значыць прыбліжаемся да апошняга этапу ніштажэння Версальскага трактата, а разам з ім і ўсіх іншых трактатаў...[11]

Насамрэч «Саветы вайны хочуць і да яе імкнуцца, нават хацелі б яе выклікаць, толькі не паміж сабою і некім, але паміж двума блокамі. Тактыка Саветаў, здаецца, такая: выклікаць сусветную вайну і ўмяшацца ў яе тады, калі надыдзе дагодная часіна»[12]. Італія імкнецца «заснаваць навокал Міжземнага мора вялікую Рымскую імперыю, як было на пачатку нашай эры», Германія – разбурыць Версальскі трактат, здабыць калоніі і рушыць на ўсход, Японія – завалодаць Кітаем і басейнам Ціхага акіяну, стварыўшы імперыю жоўтай расы з насельніцтвам больш як 600 млн чалавек.

Гэтая ацэнка Гадлеўскага была дадзеная за год да ўкладання афіцыйнага саюзу Італіі і Германіі. Пасля таго, як летам 1936 г. Італія прызнала прыярытэт Германіі ў Аўстрыі, «Беларускі Фронт» недвузначна сцвердзіў:

Угода гэтая мае велізарнае значэнне для эўрапейскай, а нават сусветнай палітыкі, бо ідзе не толькі аб згодзе Нямеччыны з Аўстрыяй, але сягае глыбей і далей: яна сцвярджае, наступіла згода паміж Нямеччынай і Італіяй, паміж гітлерызмам і фашызмам. Гітлер і Мусаліні праз Аўстрыю падалі сабе рукі[13].

У пачатку кожнага каляндарнага года газета спрабавала вызначыць найважнейшыя падзеі папярэдніх месяцаў і даць прагноз на наступны год. Так, галоўнымі палітычнымі вынікамі 1937 г. газета называла стварэнне Антыкамінтэрнаўскага пакта, пачатак Японіяй вайны ў Кітаі і выхад Італіі з Лігі Нацый. Усё гэта былі першыя крокі да вялікай вайны.

Яшчэ адной міжнароднай падзеяй, пра якую «Беларускі Фронт» пісаў літаральна ў кожным нумары, была вайна ў Іспаніі. Газета нарадзілася фактычна адначасова з пачаткам грамадзянскай вайны і падрабязна асвятляла яе ход і ўплыў на сітуацыю ў свеце. Кс. В. Гадлеўскі глядзеў на палаючую Іспанію як на грандыёзны палігон, дзе будучыя ўдзельнікі сусветнай вайны вырашылі праверыць найноўшыя ваенныя тэхналогіі і трываласць створаных ваенна-палітычных блокаў. Ніякай сімпатыі да ваюючых бакоў ён не праяўляў (у адрозненне ад кс. А. Станкевіча і прэсы, звязанай з БНА, якая спагадала рэспубліканцам), прызнаючы, аднак, што віна за развязванне вайны ляжыць на Франка і германска-італьянскім імперыялізме. Ксяндза найбольш цікавілі два пытанні: ці стане вайна ў Іспаніі непасрэдным штуршком да сусветнай вайны і як паставяцца франкісты да баскаў і каталонцаў, што атрымалі аўтаномію з рук рэспуб-ліканскага Народнага Фронту. Аўтаномія баскаў і каталонцаў (з становішчам якіх заходнебеларускія інтэлектуалы пастаянна параўноўвалі свой народ) была для кс. Гадлеўскага бадай што галоўным аргументам за мадрыдскі ўрад.

«Беларускі Фронт» выступаў супраць крыжовага паходу заходніх краін (у тым ліку і фашысцкай Германіі) на СССР. У такім разе край быў бы разбураны, заходнія краіны бязлітасна эксплуатавалі б яго багацце, а пытанне пра незалежнасць паранейшаму засталося б адкрытым. Найлепшым варыянтам разгортвання падзеяў кс. Гадлеўскі ўважаў вайну Японіі супраць СССР, у такім разе беларусы маглі б дамагчыся незалежнасці, пазбегнуўшы разбуральнай вайны.

Падсумоўваючы, пазіцыю «Беларускага Фронту» можна выразіць так: у хуткай вайне беларусы бадай што не будуць мець ніводнага шчырага саюзніка.

ПРАБЛЕМА ПАЛІТЫЧНАГА ВЫБАРУ

Нацыю В. Гадлеўскі разумеў як своеасаблівы «палітычна-біялагічны арганізм», у якім арганічна спалучаюцца інтарэсы кожнай канкрэтнай асобы і ўсяго грамадства:

Нацыянальная ідэя лучыць усіх сяброў нацыі: і тых, што жывуць за граніцамі, і тых, што раздзелены часам. Нацыянальная ідэя лучыць паміж сабою тыя пакаленні, што адышлі, з тымі, якія маюць прыйсці, а злучвом ёсць жывучае пакаленне... Чалавечая адзінка толькі праз цесную сувязь з жыццём свайго народу, з ягонай мовай, з яго культурай і традыцыяй можа развіваць свае творчыя магчымасці. Жывучы й працуючы ў сваіх собскіх варунках, чалавечая адзінка найлепш і найкарысней спаўняе свае заданні. У іншых, чужых варунках чалавек не можа гэтак выявіць сваіх здольнасцяў.

[image]
Вацлаў Папуцэвіч
на ганку свайго дому
ў Чыкага,
сярэдзіна 1960-х гг.
(друкуецца ўпершыню).
Характарызуючы беларускае грамадства паводле палітычных арыентацыяў, «Беларускі Фронт» дзяліў яго на чатыры групы. 1-я група – русафілы, якіх называюць яшчэ камуністамі, аднак ідэйных камуністаў сярод іх вельмі няшмат. Яны гатовыя былі б падтрымаць і фашызм, і цара, калі б тыя раптам перамаглі ў Расіі. 2-я група – кар'ерысты, якія актыўна прыстасоўваюцца да польскай дзяржаўнай палітыкі з мэтай заняць лепшыя пасады. 3-я група – нешматлікія, ідэйна раздробленыя і расцярушаныя ў краі свядомыя беларусы. Апошняя, 4-я група – уся астатняя маса беларусаў, якая жыве паводле прынцыпу «мая хата з краю» і на працягу апошняга дзесяцігоддзя (пасля Грамады) зусім не цікавіцца палітычным жыццём.

Кс. В. Гадлеўскі бачыў у адзінстве інтэлігенцыі і сялянства для беларусаў шанец выжыць у вялікай вайне. У імя гэтага трэба

было развіваць гэтак званы «творчы» (у супрацьлегласць імперыялістычнаму, захопніцкаму) нацыяналізм беларусаў.

Час-почас у «Беларускім Фронце» з'яўляліся і цэлыя публіцыстычныя цыклы. Да ліку найбольш цікавых можна аднесці серыю артыкулаў, аб'яднаных агульнай назвай «Чаму бунтуюцца «Ройсты»?». Нагодай да яго стварэння стала з'яўленне кнігі Язэпа Мацкевіча пад назвай «Бунт Ройстаў». Пад словам «ройсты» (у беларускай мове – «забалочаныя, зарослыя чаротам мясціны») аўтар разумеў усю Заходнюю Беларусь і паспрабаваў у кнізе выявіць супярэчнасці грамадскага і гаспадарчага жыцця ў краі. У кнізе крытыкавалася палітыка польскага ўраду: амаль за дваццаць гадоў ён не дасягнуў амаль ніякіх поспехаў у паланізацыі беларусаў: «Цэлая ваша работа, паны, гэта адна вялікая фікцыя, гэта той павярхоўны пакост з вапны, якім вы загадалі маляваць сцены хатаў, зверненыя да шляху або дарогі, кудою можа праехаць пан прэм'ер Складкоўскі. Фікцыя, адна вялікая фікцыя!»[14]. Публіцысты «Беларускага Фронту» развілі тэму, і так з'явіліся артыкулы «Як выглядаюць «Ройсты», «Славянская ідэя на «Ройстах», «Матар'яльная галіта «Ройстаў», «Як памагчы беларускім «Ройстам».

Першым, што падкрэслівалі публіцысты з «Беларускага Фронту», была *фікцыя польскага нацыяналізму* на заходнебеларускіх землях. Паводле польскай статыстыкі, беларусаў станавілася ўсё менш і менш, між тым навят прысланыя асаднікі і цэлыя воласці, населеныя літоўцамі, пераходзілі на беларускую мову. «Ройсты», як і дваццаць вякоў таму, засталіся агромністым кансерватыўным беларускім балотам, якое засмоктвае чужынцаў і вельмі слаба рэагуе на вонкавыя раздражняльнікі:

Глядзіш на зямлю, зможаш сказаць, што ўсё спакойна. Наш народ на выгляд аспадарны, ціхмяны, дысцыплінаваны, ён выконваюць закон... Хто не ўмее глядзець у нутро беларускага народу, той скажа: «усё спакойна» – і пойдзе да сваёй хаты, не чуючы, як у сэрцы і ў душы гэтага народу кіпіць шмат нездаволенасці[15].

[14] В. П. У шаснаццатыя ўгодкі Слуцкага паўстаньня // БФ. 1936. № 8, 5 жніўня, с. 1.

[15] Тамсама. С. 3.

[16] Парадокс сытуацыі, дасягнуты ў Заходняй Беларусі, палягаў у тым, што ўлады, не маючы ніякіх рэальных поспехаў у паланізацыі беларусаў, імкнуліся ўсяляк перашкодзіць развіццю беларускага нацыянальнага руху, які, аднак, быў ужо ў стане самастойна існаваць і развівацца. Гл. Цітоў І. Беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Мінск, 1994. С. 3–4.

[17] Парадокс сытуацыі, дасягнуты ў Заходняй Беларусі, палягаў у тым, што ўлады, не маючы ніякіх рэальных поспехаў у паланізацыі беларусаў, імкнуліся ўсяляк перашкодзіць развіццю беларускага нацыянальнага руху, які, аднак, быў ужо ў стане самастойна існаваць і развівацца. Гл. Цітоў І. Беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Мінск, 1994. С. 3–4.

[18] В. П. У шаснаццатыя ўгодкі Слуцкага паўстаньня // БФ. 1936. № 8, 5 жніўня, с. 1.

[14] В. П. «Бунт Ройстаў» // БФ. 1938. № 8 (25), 1 красавіка.

Апрача перадвыбарчых, «Беларускі Фронт» друкаваў таксама і працы гістарычнага (навуковыя артыкулы) з нацыянальнай тэматыкі, якія дасюль могуць уяўляць цікавасць для яе даследчыкаў. Гэта артыкулы М. Шкялёнка, прысвечаныя розным этапам гісторыі Беларусі (напрыклад, пра раскопкі ў Городні і Вільні), праца В. Папуцэвіча пра Слуцкае паўстанне[16], аповед кс. Гадлеўскага пра 1-шы Усебеларускі кангрэс.

Кс. В. Гадлеўскі прызнаваў дэмакратыю як найбольш адпаведную форму рэалізацыі прынцыпу свабоды асобы: «Гэтай свабоды не можа даць ніякая дыктатура, а дае толькі сапраўдная дэмакратыя. Яна дае тыя свабоды, якіх заўсёды жадае чалавек: свабоду сумлення, думак, слова і асабістага дзеяння ў межах права»[17]. Выхад з крызісу класічнай парламенцкай дэмакратыі, выкліканага галечай масаў і бюракратызацыяй улады (што і прывяло да ўзнікнення і развіцця фашызму), кс. Гадлеўскі бачыў у замене капіталістычнай сістэмы, заснаванай на эксплуатацыі чалавека чалавекам, г. зв. «кааператыўным дэмакратызмам». Кааператывізм тут разумеўся як грамадскі лад, заснаваны на супольнай добраахвотнай працы, прыватнай уласнасці, бяскласавасці грамадства і кааператыўна-дэмакратычнай культуры. Прызнавалася неабходнасць перадзелу прыватнай уласнасці і надзялення ёю «кожнага ў такім ліку, каб ён мог злучыць яе ў супольным супрацоўніцтве». У зямельным пытанні гэта выглядала як канфіскацыя зямлі ў буйных уласнікаў і перадача яе сялянам па працоўнай норме. Адначасова сялянаў трэба было схіляць да развіцця спажывецкай, вытворчай і крэдытнай кааперацыі.

Ідэі каператывізму мелі значны адбітак і ў далейшай ідэалагічнай дзейнасці кс. Гадлеўскага. Так, у напісаным ім у пачатку 1941 г. «Ідэалагічным Статуце Беларускага Нацыянальнага Фронту» ксёндз прапанаваў скласці заканадаўчую ўладу (Гаспадарскую Раду) з прадстаўнікоў асноўных прафесій прапарцыйна іх колькасці і грамадскаму значэнню.

Час Х набліжаўся надзвычай імкліва. Недзе напрыканцы 1938-га ці ў пачатку 1939 г. кс. В. Гадлеўскі быў уражаны той

19 А. В. Надсан, Беларускі нацыянальны фронт // Працы БГУ. Т. III (1939). С. 2.
20 Пецушкевіч Я. Кс. Вінцэнт Гадлеўскі. С. 71.

лёгкасцю, з якой сусветная супольнасць дазволіла Гітлеру далучыць Аўстрыю і ліквідаваць незалежнасць Чэхаславакіі. Цытуючы польскую перыёдыку, «Беларускі Фронт» пісаў: «Істотная вартасць... Гітлера ляжыць у тым, што ён разумее… псіхіку Захаду і выкарыстоўвае яе. Ён умее расшыфраваць пад азнакамі магутнасці істотную маласць духу»[18].

Акурат з канца 1938 г. «Беларускі Фронт» перастае крытыкаваць фашысцкую Германію, а яго публіцысты спрабуюць патрактаваць Гітлера як асобу, што працягвае справу амерыканскага прэзідэнта Уілсана ў барацьбе за самавызначэнне нацый.

Можна сказаць, што пранямецкая стаўка кс. Гадлеўскага стала вынікам зробленага ім аналізу палітычнага становішча ў свеце. Савецкі Саюз і Польшча як саюзнікі адпадалі катэгарычна, паколькі былі дасюлешнімі гаспадарамі становішча і прыгняталі беларусаў. Заходнія дэмакратыі мала цікавіліся беларускім пытаннем і разлічваць на іх было нельга, заставалася толькі фашысцкая Германія, якая пакуль ніяк не зарэкамендавала сябе. Пры тым кс. Гадлеўскі здагадваўся, што заходнія дэмакратыі і СССР прынцыпова не хочуць мяняць сітуацыі ў свеце (тады бадай што ніхто не мог падумаць, што пасля вайны СССР будзе такім моцным, каб падпарадкаваць палову Еўропы):

Пры перамозе кааліцыі астаецца ў нас status quo, гэта значыць той парадак, які цяпер існуе. Паводле дагавораў, граніцы на ўсходзе Еўропы не зменяцца. Могуць змяніцца толькі ў цэнтральнай Еўропе, магчыма, паўстала б ізноў незалежная Чэхія, ці нават Чэхаславаччына, знікла б з палітычнай карты Усх. Прусія, падзеленая паміж Польшчай і Літвою, магчыма, што і Саветы атрымалі б нейкую нагароду на ўсходзе ці ў іншым месцы – але наагул беручы, вялікіх змен не было б.

Калі б перамог «дынамічны» блок, зьмены былі б велізарныя, не толькі ў Еўропе, але і на ўсім свеце. Найболей зменаў было б у раёне Міжземнага мора, у ўсходняй Еўропе і на Далёкім Усходзе. Італія, Нямеччына і Японія падзялілі б свет паводле сваіх планаў

Адкрытую стаўку на Германію кс. Гадлеўскі фактычна зрабіў толькі ў апошнім нумары газеты, які выйшаў 1 верасня 1939 г., калі вермахт ужо перайшоў межы Польшчы. Гадлеўскі сцвердзіў: «Беларусь можа паўстаць толькі пры варожых адносінах Нямеччыны й Расіі. Беларускую справу можа паставіць на парадак дня толькі той блок, які выступае проціў Расіі й для якога падзел Расеі быў бы карысны...»

У самым пачатку верасня 1939 г. кс. Гадлеўскага наведаў В. Папуцэвіч, які, будучы мабілізаваным у польскае войска, ехаў на фронт. Ужо ў сярэдзіне 1960-х гг. ён успамінаў іхнюю размову:

Кс. Гадлеўскі мне дэтальна прадставіў магутнасць нямецкага ўдару на Польшчу і казаў, што за тыдзень не астанецца і следу з польскай дзяржавы. Што да будучыні, то радзіў мне пры першай нагодзе перайсці на нямецкі бок, куды і ён думае перайсці, і там «будзем бачыць, што рабіць». Гаворачы аб паляках, ён паказваў на поўную недалужнасць польскай палітыкі, на нечуванае засьляпленне нацыяналістычнае, што вядзе няўхільна да гібелі гэтую дзяржаву, што, магчыма, дасць новыя магчымасці для беларускага народу[20].

Наступная сустрэча выдаўцоў газеты адбылася толькі праз два гады.

ПАСЛЯ «БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ»

«Будзем бачыць, што рабіць», «час пакажа, што трэба рабіць», «трэба дзейнічаць па сітуацыі» – выказванні падобнага кшталту часта сустракаліся на старонках «Беларускага Фронту». Яны выдатна адлюстроўваюць стан няпэўнасці, у якім апынуліся беларусы напярэдадні вялікай вайны. Ніводная з тых вонкавых сілаў, што маглі спрычыніцца да нацыянальнага самавызначэння беларусаў, так і не прапанавала ніякай

канкрэтнай праграмы, а беларускі нацыянальна-вызваленчы рух быў занадта слабы, каб дамагчыся незалежнасці сам.

Як паказаў у сваёй кнізе нямецкі гісторык Б. К'яры, нямецкія ўлады ўсе тры гады акупацыі Беларусі кіраваліся ў сваёй дзейнасці не нейкімі прадуманымі планамі, а хутчэй канцэпцыяй «кантраляванага хаосу», падштурхоўваючы мясцовае насельніцтва да ўзаемнага знішчэння і зусім не думаючы пра вырашэнне актуальных праблем краю. Справа незалежнасці Беларусі цікавіла немцаў яшчэ менш, чым у гады Першай сусветнай вайны. Закладнікамі гэтай знішчальнай і, не ў меншай ступені, самазнішчальнай палітыкі акупантаў сталі і выдаўцы «Беларускага Фронту».

Далейшы лёс заснавальніка і галоўнага ідэолага «Беларускага Фронту» вядомы. Кс. Гадлеўскі, вырашыўшы стаць на бок немцаў, уцёк летам 1940 г. у акупаваную імі Варшаву, паспрабаваў арганізаваць беларускія вайсковыя адзінкі ў нямецкім войску, працаваў у школьным камісарыяце ў Менску і быў расстраляны гестапа ў снежні 1942 г.

Існуе мноства версій прычыны расстрэлу ксяндза. Хутчэй за ўсё, ён стаў ахвярай узаемнай барацьбы ў нямецкім кіраўнічым апараце (паводле Ю. Туронка).

Стаўка на Нямеччыну аказалася пройгрышная.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/18
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 10 (50) - 2006**

[image]

[image]

[image]

[image]-[image]2006

крытыка • аналітыка • эсэістыка • гісторыя • **палеміка** • літаратура

[image] [image] [image]

ТАЦЦЯНА ВАДАЛАЖСКАЯ

Таццяна Вадалажская сацыёляг, супрацоўніца Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі.

Ці руйнуюцца дыктатуры?

Сакавіцкія падзеі для Беларусі былі, ёсць і, мабыць, яшчэ некаторы час будуць асноўнай крыніцай і нагодай з'яўлення асобных вывадаў і палажэнняў. Падрабязней яна будзе разгледжана ніжэй.

[1] Гаворка ідзе аб процілегласці менавіта падыходаў, а не рознага роду тэкстаў сацыяльна-палітычнай тэматыкі. Мы не ставім сабе тут задачы аналізу ўсяго масіву інтэлектуальнай і псеўдаінтэлектуальнай прадукцыі, вырабленай за гэты час, хоць такая задача, бадай што, з'яўляецца адной з самых актуальных як для палітычнай, так і для інтэлектуальнай сферы Беларусі. Артыкул В. Сіліцкага «Памятаць, што дыктатуры руйнуюцца» ўяўляецца шмат у чым сімптаматычным і ў асноўным характэрным для сучаснай беларускай аналітыкі, таму разгледзім яго як прыклад, ці case-study.

[2] Гл. сайт worvik.com.

Перш чым звярнуцца да артыкула, варта абазначыць яшчэ адну ўмову, ці рамку, нашага стаўлення да яго – гэта ўласная аналітычная практыка, што грунтуецца на сістэмна-разумовадзейнаснай метадалогіі, якая з'яўляецца як мінімум альтэрнатыўнай, калі не процілеглай тым падыходам, на якіх будуецца аналіз і развагі Сіліцкага[1]. У ходзе гэтай практыкі таксама з'яўляліся тэксты[2], напісаныя па гарачых слядах сакавіцкіх падзей (што як прагназавалі, так і аналізавалі іх разгортванне), якія пераважна «негатыўна» ўспрымаліся

«інтэлектуальнай і палітычнай грамадскасцю».

Улічваючы гэтыя дзве акалічнасці, звернемся да артыкула В. Сіліцкага. Што адразу ж кідаецца ў вочы чалавеку, які ставіцца да сакавіцкіх падзей не проста з даследчым інтарэсам, а з глыбокай зацікаўленасцю ўдзельніка, гэта тое, што пазіцыі ў ацэнцы тых ці іншых прынцыповых аспектаў супадаюць.

Па-першае, у ацэнцы характару сакавіцкіх падзей і ролі афіцыйнай апазіцыі ў іх развіцці.

Сіліцкі: *Сакавіцкі чын на плошчы Каліноўскага, нягледзячы на тое, што ён быў спрычынены перадвыбарнымі падзеямі і ўдзелам апазіцыі ў выбарах, быў не палітычным, а хутчэй дысідэнцкім пратэстам. Ён не дамагаўся канкрэтных мэтаў (якіх ніхто канкрэтна і паслядоўна не пазначыў), а хутчэй быў сродкам захавання пачуцця ўласнай годнасці прадстаўнікамі дэмакратычнай субкультуры.*

[...] *Стратэгічныя мэты дэмакратычных сілаў так і не былі вызначаныя, а спробы іх дэкларацыі гучалі даволі агульна (узгадаем тэзу пра «аблогу аўтарытарнай фартэцыі»), з розных бакоў і часцяком уступалі ў супярэчнасць адна з адной. Калі не вызначаныя мэты, няма і больш-менш рэальнага плана дзеянняў у іх дасягненні.*

Сайт «Рушэньня»: *Кожны на плошчы адстойваў нешта сваё, а значыць, і дзейнічаў аўтаномна. Узніклая салідарнасць тычылася не столькі агульных задач, колькі агульных пачуццяў, настрояў. Многія ішлі, не спадзеючыся на рэальныя змены, але адчуваючы, што па-іншаму не могуць. А ці было нешта, што сапраўды можна было адстаяць? Каб нешта адстойваць, яно павінна быць бачным, рэальным, гатовым да праяўлення. Што ж абаранялі людзі на плошчы? Пачуцце ўласнай годнасці і магчымасць свабодна выказваць свае погляды.*

[...] *У цэлым усе прэтэнзіі, выказаныя да АДС яшчэ ў лістападзе і снежні 2005 г., засталіся без адказу, а ў ходзе выбараў пацвердзіўся і шэраг нашых найгоршых асцярог: 1) адсутнасць*

стратэгіі (можна ўжываць іншыя тэрміны: канцэпцыі кампаніі, плана дзейнасці, праграмы работ і да т. п. Нічога, словам, няма); 2) памылкі ў кадравай палітыцы (можна гаварыць пра памылкі ў персанал-тэхналогіях, у кадравым менеджменце, ужываць іншыя модныя словы – сутнасць справы ад гэтага не мяняецца: Мілінкевіч зрабіў дрэнныя назначэнні); 3) замест кансалідацыі і прыцягнення людзей да кампаніі адзінага кандыдата – адштурхоўванне, адкрытая дэманстрацыя незацікаўленасці ў прыхільніках і партнёрах.

Па-другое, у ацэнцы стану рэжыму як усталяванага ўсур'ёз і надоўга, угрунтаванага на адпаведным стане грамадства. Сіліцкі кваліфікуе яго як развіццё карпаратыўнай дзяржавы і тэндэнцыі віртуалізацыі светапогляду і светаадчування, АГТ – як медыя-фашызм, што абапіраецца на кубінізацыю беларускага грамадства. І ў адным, і ў другім выпадку відавочна, што ўзніклі і замацаваліся новыя ўмовы, якія неабходна ўлічваць і ў аналізе, і тым больш у дзейнасці дэмакратычна настроеных сілаў. Гэтыя абставіны патрабуюць пераасэнсавання і рэфармавання дейнасці апазіцыі.

Сіліцкі: *Аднак палітычная апазіцыя пакуль што існуе, а магчымасцяў займацца палітычнай дзейнасцю амаль не засталося. Інстытуцыянальны стан беларускай апазіцыі фактычна не змяніўся з таго часу, калі паўсталі палітычныя суб'екты, – з больш лагодных, плюралістычных часоў. Атрымалася, што форма цалкам не адпавядае жыццю.* […] *У новых умовах патрэбна было б нейкае пераасэнсаванне сваіх мэтаў і задачаў, а таксама і змены інстытуцыянальных рамак сваёй дзейнасці, рэканструкцыя іх пад новыя рэаліі, якія не зводзяцца да барацьбы за ўплыў той ці іншай партыі ці партыйнай ідэалогіі.*

Сайт «Рушэньня»: *На сённяшні дзень апазіцыя мае цэнтралізаваную лідэрскую структуру, пабудаваную на прызнанні асобы лідэра (аб'яднання лідэраў).* […] *Такая структура паводле азначэння не можа процістаяць таталітарнай машыне праз неадпаведнасць тыпаў*

арганізаванасці («Аналітыка – красавік»).

Патрабуецца кардынальнае абнаўленне ўсёй апазіцыі Лукашэнкаваму рэжыму ў краіне, абнаўленне ідэй, кадраў, электаральнай базы. Адначасова з гэтым патрабуецца абнаўленне і вонкавага контуру сувязяў апазіцыі з міжнароднай супольнасцю («Некалькі тэзісаў па гарачых слядах беларускіх выбараў 2006 года»

).

Па-трэцяе, ва ўяўленнях пра перспектыўнасць новых дэцэнтралізаваных формаў арганізацыі дэмакратычных сілаў, заснаваных не на структурных арганізацыях, а на агульнасці ідэй і каштоўнасцей. Для Сіліцкага гэта разгортванне грамадзянскай дысідэнцкай актыўнасці, для «Рушэньня» – уласна рух як працэс.

Аднак, як можна заўважыць па датах публікацыі, дасягнутая згода мае істотны лаг у часе. Асабліва калі прыгадаць, што задача кардынальнага рэфармавання апазіцыі, вырашэнне кадравага пытання ў адпаведнасці з патрабаваннямі сітуацыі і арганізацыя «Рушэньня» з'яўляліся цэнтральнай задачай для «Стратэгіі-2006», апублікаванай без малога за год да выбараў. Але тады беларускія аналітыкі былі заняты зусім іншымі праблемамі. Той жа Сіліцкі ў пачатку 2006 г. падрабязна разбіраў, чаго менавіта спалохаўся рэжым, прызначыўшы датэрміновыя выбары («Выбары навыварат»), і таксама заклікаў спадзявацца на лепшае: «Жыццё пасля Лукашэнкі калі-небудзь і надыдзе. Вядома, не сёння і не заўтра. Але ж кожны год, кожныя выбары, нават сакавіцкія, няўхільна набліжаюць гэты дзень».

Сёння ўсе асноўныя праблемы і задачы, якія ў «Стратэгіі-2006» прапаноўвалася рашыць апазіцыі, лёгка прызнаюцца і ўзнаўляюцца практычна ўсімі, хто піша ці гаворыць аб мінулых выбарах. Але праблема ў тым, што ў якасці тлумачэння гэтыя вывады ўжо практычна нічога не вартыя, яны трацяць свой сэнс і каштоўнасць. І тут выяўляецца асноўная супярэчнасць паміж рознымі падыходамі да аналітыкі.

Гэтае адрозненне заключаецца ў адказе на пытанне «Якая пазіцыя аналітыка ў сістэме сацыяльна-палітычнай дзейнасці?». Прынцыповыя адрозненні аналітычных прадуктаў звязаны менавіта з несупадзеннем у гэтых пазіцыях, адносна якога прыватныя супадзенні ці несупадзенні ацэнак і прагнозаў неістотныя.

Пазіцыя В. Сіліцкага – гэта пазіцыя пабочнага, «аб'ектыўнага» наглядальніка, вынесеная за рамкі непасрэднай сацыяльна-палітычнай дзейнасці. Пры гэтым няўключанасць не азначае адсутнасці ўплыву на гэтую самую дзейнасць і разгортванне тых ці іншых працэсаў на палітычным полі. Тут важна, што сам аналітык выносіць сябе і тое, што ён робіць, так сказаць, за дужкі, фіксуючы «аб'ектыўныя» тэндэнцыі і даючы тлумачэнне падзеям, якія адбываюцца, зыходзячы з тых ці іншых тэарэтычных палажэнняў і на тых жа падставах даючы прагнозы далейшага развіцця. Такім чынам, гранічнай рамкай аналізу з'яўляецца данасць сітуацыі, тое, што ёсць тут і цяпер. Змяненне гэтага самага «тут і цяпер», якое падпарадкоўваецца ўласным законам, робіць «рухомай» і пазіцыю аналітыка, што адсочвае і тлумачыць тэндэнцыі кожны раз у новай сітуацыі. Рэальнасць тых ці іншых тэндэнцый, значнасць падзей ці суб'ектаў вызначаецца на падставе мінуўшчыны ці зыходзячы з адпаведнасці тэарэтычным пабудовам.

Іншая пазіцыя – дзейнасная, якая грунтуецца не на аб'ектывісцкім, а на сістэмна-разумовадзейнасным падыходзе (СРД-падыходзе), – ацэньвае і разглядае тое, што адбываецца, зыходзячы з яго адпаведнасці таму, што павінна быць. Менавіта гэтыя адносіны вызначаюць ступень «рэальнасці» тых ці іншых падзей і дзеянняў. Гэта кардынальным чынам мяняе пазіцыю аналітыкі ў сістэме сацыяльна-палітычнай дзейнасці, па сутнасці ўключаючы яе ў гэтую сістэму. Аналітыка не апісвае і тлумачыць існую сітуацыю, а інтэлектуальна і рэфлексійна забяспечвае дзейнасць у дасягненні пастаўленых мэтаў. І гэтыя мэты, сфармуляваныя як тое, што павінна быць, з'яўляюцца асновай і рамкай для аналізу таго, што ёсць. Тут нязменнасць і ўнутраная цэласнасць пазіцыі забяспечваецца за кошт захавання мэтаў дзейнасці, а не за кошт статычнасці самой пазіцыі, якая знаходзіцца «над» бягучымі падзеямі. Падставы

для таго, каб тыя ці іншыя падзеі, факты і суб'екты лічыць рэальнымі і значнымі, ляжаць не ў мінуўшчыне, а ў будучыні.

Апазіцыя *тэндэнцый* і *інтэнцый* як стрыжня аналітычнай дзейнасці прасочваецца, у першую чаргу, у тых прагнозах і вызначэнні задач, якія даюцца ў выніку аналізу. Пры гэтым кваліфікацыя сучаснай сітуацыі можа быць падобная. Гэтае адрозненне можна прасачыць на прыкладзе аналізу апазіцыйнай партыйнай структуры.

Прызнаючы факт неадпаведнасці паміж наяўным у Беларусі палітычным рэжымам і існаваннем сістэмнай апазіцыі ў яе класічных партыйных формах, два аналітычныя падыходы прапануюць кардынальна розныя схемы разумення і вырашэння гэтай супярэчнасці.

В. Сіліцкі піша:

Ва ўмовах немагчымасці кантралявання базавых працэсаў, што адбываюцца ў дзяржаве і грамадстве, палітычная апазіцыя робіцца закладніцай абставін, мусіць, пры самых сваіх актыўных дзеяннях, спадзявацца на цуд, на форс-мажор ці на натуральны ход падзей, які можа заняць балюча шмат часу. Яна не можа даць аніякіх гарантый, што самыя эфектыўныя індывідуальныя і калектыўныя дзеянні прынясуць плён, што яны не будуць ануляваныя прэвентыўнымі дзеяннямі ўлады.

У выніку такога аналізу наяўная сітуацыя прызнаецца фатальнай і прапануецца чакаць, калі ўзнікнуць больш спрыяльныя ўмовы – унутраная дэзарганізацыя сістэмы. А тады ўжо «інтэрпрэтаваць яго (крызісу) прычыны і навязаць гэтую інтэрпрэтацыю грамадству». Пры гэтым сцвярджаецца, што «неабходныя памеры дэзарганізацыі ўсёй лукашэнкаўскай сістэмы такія, што яны наўрад ці могуць быць спрычыненыя дзеяннямі апанентаў». Гэта значыць, застаецца чакаць, калі ў ходзе натуральнага развіцця сістэма сама сябе зжыве. Такім чынам, для палітычнай апазіцыі ў сучасных умовах даецца дыягназ, які сведчыць пра скон яе як рэальнага гульца на палітычным полі. Даючы крытычную ацэнку дзеянням апазіцыі

падчас сакавіцкіх падзей, аўтар сцвярджае, што памылкі не з'яўляліся фактарам, які істотна паўплываў на сітуацыю. Сама сітуацыя такая, што ЛЮБЫЯ дзеянні былі б безвыніковыя.

На фоне такіх разваг фраза: «У новых умовах патрэбна было б нейкае пераасэнсаванне сваіх мэтаў і задач, а таксама і змены інстытуцыянальных рамак сваёй дзейнасці, рэканструкцыя іх пад новыя рэаліі, якія не зводзяцца да барацьбы за ўплыў той ці іншай партыі ці партыйнай ідэалогіі» – выглядае як даніна модзе ці традыцыйныя паліталагічныя заклінанні. Што, зрэшты, сам аўтар і пацвярджае: «Праблема ў тым, што зрабіць гэта амаль немагчыма».

На пытанне пра тое, ці магчыма ў сучаснай Беларусі асэнсаваная палітычная дзейнасць, аўтар сваім тэкстам адказвае: «не». Для такой дзейнасці патрэбныя ўмовы, з'яўлення якіх неабходна дачакацца і быць гатовымі да іх надыходу. У гэтым кантэксце робіцца зразумелай назва артыкула, якая нагадвае словы падбадзёрвання і падтрымкі ў тых сітуацыях, калі зрабіць нічога нельга і застаецца толькі спадзявацца на натуральнае вырашэнне неспрыяльнай сітуацыі, з шэрагу «пасля чорнай паласы абавязкова надыдзе белая», «што ні робіцца, усё да лепшага» і да таго падобнае.

Зыходзячы з аналізу сітуацыі, аўтар робіць вывады пра тое, што адзіна магчымай прасторай супраціўлення, закліканай, зрэшты, не даць знішчыць канчаткова ўжо загнаныя ў рэзервацыю дэмакратычныя сілы, з'яўляецца грамадзянская дысідэнцкая актыўнасць. Палітычная ж дзейнасць мае сэнс толькі для таго, каб дапамагаць разрозненым дысідэнтам «захоўваць надзею ў тым, што палітычны прарыў магчымы». У адпаведнасці з гэтай муляжнай функцыяй прапануюцца і асноўныя кірункі работы, а таксама стратэгіі паводзін.

Галоўным і адзіным спосабам дзеяння палітычных структур прызнаецца арганізацыя масіўнага інфармацыйнага прарыву звонку. А для захавання «светлага вобразу» прапануецца памятаць, што «любыя дзеянні па высвятленні адносін, любыя адкрытыя канфлікты, звязаныя з барацьбой за лідэрства, сёння дыскрэдытуюць увесь дэмакратычны Рух». Гэтыя вывады яшчэ раз пацвярджаюць, што «пераасэнсаванне інстытуцыянальнага

застою і крызісу ідэй палітычнай апазіцыі» не разглядаецца аўтарам як сапраўдная задача ў сённяшняй сітуацыі.

Пры гэтым Сіліцкі агаворваецца, што ва ўладкаванні і функцыянаванні беларускай апазіцыі шмат праблем. Застаецца незразумелым, якім чынам яна пераадолее гэтыя праблемы да моманту распаду рэжыму, не робячы «рэзкіх рухаў» і захоўваючы твар. Відаць, гэтыя змены таксама з'яўляюцца вынікам натуральнага працякання працэсаў дэмакратызацыі пры «правільных» умовах.

У процілегласць погляду Сіліцкага, у рамках дзейнаснага падыходу змяненне ў задачах і спосабах палітычнай дзейнасці, пераструктураванне яе ў адпаведнасці з характарыстыкамі супрацьстаўленай сістэмы разглядаецца як асноўная задача. Менавіта ў гэтым заключаецца радыкальнасць «Стратэгіі-2006», адзначаная ў артыкуле Сіліцкага, а не ў самім дапушчэнні магчымасці рэвалюцыі. Рэвалюцыйны сцэнарый разглядаецца там не як рэалізацыя ўжо наяўных у грамадстве тэндэнцый, а як задача, што патрабуе кардынальных крокаў у яе ажыццяўленні. І гэтая задача мае на ўвазе кардынальныя змены ў апазіцыйным лагеры. Тут прыярытэт не ў захаванні іміджу, а ў выкананні патрэбных функцый, паколькі на натуральнае вырашэнне сітуацыі спадзявацца не варта.

Пры такім падыходзе захаванне тых ці іншых палітычных структур не з'яўляецца каштоўнасцю само па сабе, як, дапусцім, існаванне апазіцыйных партый з'яўляецца неабходнай нормай для дэмакратычных сістэм. Адзінай падставай існавання чаго б там ні было ў палітычным полі з'яўляецца яго мэтазгоднасць. Зыходзячы з гэтага, і ў «Стратэгіі», і ў постсакавіцкай аналітыцы прапаноўвалася правядзенне жорсткай кадравай работы і ігнараванне нефункцыяноўных партыйных структур, а таксама стварэнне шырокага Руху над існымі палітычнымі і грамадскімі арганізацыямі.

Ён павінен быць пабудаваны на прынцыпе калектыўна размеркаванага суб'екта, у якім кожная з часцінак (асобныя людзі ці арганізацыі) рухаюцца да агульнай мэты, выконваючы тыя ці іншыя функцыі, адпаведныя іх здольнасцям і

кампетэнцыі. Размеркаванне функцый адбываецца не паводле рашэння кіраўніка (лідэра), а праз прызнанне часткамі калектыўна размеркаванага суб'екта адна ў адной аўтарытэтаў у выкананні прынятай функцыі ці задачы.

Для рэалізацыі такой схемы патрабуецца адмова ад стратэгіі выжывання, якая прыводзіць да таго, што поле апазіцыйнай палітыкі канстытуюецца камерцыйнай логікай. Чаканне неабходных умоваў для палітычнай дзейнасці прыводзіць да «пераўтварэння палітычнай барацьбы ў сродак выжывання і самаўзнаўлення. Яно патрабуе такіх формаў арганізацыі, пры якіх перамога немагчымая. У сваю чаргу, рэфармаванне апазіцыі, абнаўленне ідэй, стратэгій і ратацыя кадраў непрымальныя».

Такім чынам, патрабаванні, якія задаюць кірункі дзейнасці, ляжаць у будучыні. Змяненне сітуацыі не мяняе мэты, а мяняе спосабы і шлях яе дасягнення. Напрыклад, для тых жа беларускіх палітычных партый у 1994 г. стаялі зусім іншыя задачы: «будаўніцтва анталагічнага падмурку» і «праграмаванне дзейнасці» (У. Мацкевіч), якія б замацавалі іх як структуры і стварылі падставы для канкурэнцыі адна з адной. Цяпер канкурэнцыя ляжыць не ў сферы падыходаў да грамадскага ўладкавання, а ў функцыянальнай кампетэнтнасці. І калі з нагоды першага недарэчна і нават злачынна жорстка разгортваць канкурэнтную барацьбу (і тут нельга не пагадзіцца з Сіліцкім), дык з нагоды другога – толькі жорсткая канкурэнцыя з'яўляецца ўмовай перамогі над рэжымам.

Такім чынам, калі ўжо мы прызнаём, што сённяшні час – гэта час рэфлексіі і пераасэнсавання падстаў і стратэгій дзейнасці, то гэта датычыць і аналітычнай дзейнасці ў тым ліку. Таму, разгортваючы параўнанне альтэрнатыўных падыходаў, мы абазначаем і прапануем для «засялення» прастору для такой рэфлексіі і дыскусіі. Прастору, якая канстытуюецца пытаннем пра мэты і нормы аналітычнай дзейнасці.
[image]
[image]

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/10/15**
[image]

СЯРГІЙ ЖАДАН
(нар. 23 жніўня 1974) – паэт, празаік, эсэіст, перакладчык. Скончыў Харкаўскі пэдагагічны ўнівэрсытэт. Вялікі сябар Беларусі.

Судзьдзя – западліст:
ён ня любіць «Мэталіст».

15.02.04 (нядзеля)

Калі мне было чатырнаццаць, і ў мяне былі свае віды на жыцьцё, я ўпершыню накачаўся алькаголем. Пад самую завязку. Было вельмі цёпла, і нада мной плылі сінія нябёсы, а я ляжаў і паміраў на паласатым матрацы і нават пахмяліцца ня мог, бо мне было толькі чатырнаццаць, і пахмяляцца я яшчэ проста не навучыўся. За апошнія пятнаццаць гадоў у мяне было больш чым дастаткова падставаў, каб зьнелюбіць гэтае жыцьцё. Жыцьцё ад пачатку, як толькі я пачаў яго ўспрымаць, выявілася штукай подлай і няўдзячнай, яно адразу ж узяло за звычай абарочвацца такімі лажовымі сытуацыямі, згадваць пра якія ня хочацца, але якія запамінаюцца надоўга. Хоць са свайго боку я асаблівых прэтэнзіяў ніколі не выказваў. Відавочна, у мяне ўсё добра ў маіх стасунках з жыцьцём, нават насуперак ягонай клінічнай мудакаватасьці. Мяне, па вялікім рахунку, калі не траплялася чарговых дэмаршаў звонку, усё задавальняла – мяне задавальнялі абставіны, у якіх я жыў, задавальнялі людзі, зь якімі я меў зносіны, зь якімі я час ад часу бачыўся і зь якімі мне даводзілася мець справу. Яны мне, па вялікім рахунку, не

перашкаджалі, спадзяюся – я ім таксама. Што яшчэ? Мяне задавальняла тая колькасьць бабак, якая ў мяне была, то бок задавальняла ня колькасьць як такая, бабак у мяне, насамрэч, амаль ніколі не было, задавальняў сам прынцып абарочваньня іх навокал мяне – я зь дзяцінства заўважыў, што банкноты зьяўляюцца акурат тады, калі табе трэба, і прыблізна ў той колькасьці, безь якой ты не абыдзесься, звычайна гэта спрацоўвала, дакладна спрацоўвала. Вядома, калі ты не да канца страціў сумленьне і зьберагаеш хаця б рэшткі нейкай прыстойнасьці, у сэнсе там чысьціш зубы, або не ясі сьвініну (калі ты мусульманін), то да цябе зь нявысьветленай табой рэгулярнасьцю прыходзіць анёл з чорнымі бухгальтарскімі нарукаўнікамі і перхацьцю на крылах і абнаўляе твой бягучы рахунак пэўнай сумай у грашовым эквіваленце, так, каб ты, з аднаго боку, зусім ногі не працягнуў, а зь іншага – ня надта выёбваўся і не перапаскудзіў сваёй рэінкарнацыі купляй танкераў з нафтай і цыстэрнаў са сьпіртам. Мяне гэта задавальняла, у гэтым я анёлаў разумеў і падтрымліваў. Мяне задавальняла краіна, у якой я жыў, задавальняла тая колькасьць гаўна, якім яна была запоўнена і якое ў найбольш крытычныя моманты майго ў гэтай краіне пражываньня сягала каленяў і вышэй. Я разумеў, што *цалкам* рэальна мог нарадзіцца ў іншай краіне, куды горшай, напрыклад, з больш суворым кліматам ці аўтарытарнай формай кіраваньня, дзе ля ўлады стаялі б ня проста ўблюдкі, як у маёй краіне, а якія-небудзь замарочаныя ўблюдкі, якія перадавалі б уладу ў спадчыну сваім дзецям, разам з вонкавымі пазыкамі і ўнутраным цемрашальствам. Так што я лічыў, што даволі добра трапіў, таму ня трэба пераймацца гэтымі рэчамі. Па вялікім рахунку, мяне задавальняла ўсё, мяне задавальняла тэлевізійная карцінка, якую я бачыў за вокнамі памяшканьняў, дзе жыў, таму я намагаўся проста ня надта хутка пераключаць каналы, бо пасьпеў заўважыць, што любыя праявы ўвагі з боку змантаванай наўкола мяне рэальнасьці абавязкова сканчаюцца наперад прагназаваным паскудзтвам ці проста дробным жыцьцёвым западлізмам. Рэальнасьць прыкольная сама сабой, але цалкам лажовая пры падліку пасьляматчавай статыстыкі, калі ты аналізуеш свае і яе паказальнікі і бачыш, што парушэньняў зь яе боку было ў некалькі разоў болей, а выдаленьні трапляліся толькі ў тваёй камандзе. Калі нешта

мяне і прыгнятала па-сапраўднаму, то менавіта пастаянныя і настойлівыя намаганьні гэтай тэлекарцінкі ўступіць са мной у ненатуральныя палавыя дачыненьні, то бок, папросту кажучы, адтрахаць мяне, скарыстаўшыся маімі ж грамадзянскімі правамі і хрысьціянскімі абавязкамі. Я весела пражыў гэтыя свае пятнаццаць гадоў дарослага жыцьця, не беручы ўдзелу ў пабудове грамадзянскай супольнасьці, не прыходзячы на выбарчыя ўчасткі і пасьпяхова пазьбягаючы кантактаў з антынародным рэжымам, калі вы разумееце, што менавіта я маю на ўвазе; мяне не цікавіла палітыка, не цікавіла эканоміка, не цікавіла культура, нават прагноз надвор'я мяне не цікавіў, хоць гэта была ці не адзіная ў гэтай краіне рэч, што выклікала давер, але мяне яна ўсё адно не цікавіла.

Цяпер мне трыццаць. Што зьмянілася за апошнія пятнаццаць гадоў? Амаль нічога. Нават выгляд гэтага ёбанага прэзыдэнта ня надта зьмяніўся, ува ўсякім разе яго партрэты як рэтушаваліся тады, так і цяпер рэтушуюцца, нават я гэта заўважыў. Зьмянілася музыка на радыё, але я яго, па вялікім рахунку, і ня слухаю. Зьмянілася адзеньне, але 80-я, наколькі я разумею, і надалей у модзе. Не зьмянілася тэлекарцінка, яна такая ж ліпкая й едкая, як разьліты на паркеце ліманад. Не зьмяніўся клімат, зімы ўсё такія ж доўгія, а вёсны – доўгачаканыя. Зьмяніліся сябры, то бок адны назаўсёды зьніклі, а іншыя зьявіліся замест іх. Зьмянілася памяць – яна зрабілася даўжэйшай, але не зрабілася лепшай. Спадзяюся, яе хопіць яшчэ гадоў так на шэсьцьдзесят трывалага пабытовага пахуізму і нязломнай душэўнай раўнавагі. Чаго я сабе і жадаю. Амін.

17.06.93 (чацьвер)

УСТУП №1

16.50

17 чэрвеня каля пятай гадзіны дня Сабака Паўлаў намагаецца спусьціцца ў падземку. Ён падыходзіць да турнікета, ідзе

проста на жанчыну ва ўніформе і дастае з кішэні вэтэранскае пасьведчаньне. Жанчына ва ўніформе глядзіць у пасьведчаньне і чытае: «Паўлава Вера Навумаўна».
— Ну? – пытаецца.
— Бабуля, – кажа Сабака Паўлаў.
— Дзе бабуля?
— Гэта, – паказвае Сабака пасьведчаньне. – Мая бабуля.
— Ну і што?
— Яна – вэтэран.
— Ну, а ты чаго хочаш?
— Яна ў танку гарэла.

Жанчына яшчэ раз глядзіць у пасьведчаньне. Хто яе ведае, думае яна, можа і гарэла, па фота ня скажаш.
— Ну, добра, – кажа яна. – А ад мяне чаго трэба?
— Прапусьціце, – гаворыць Сабака.
— А ты што – таксама ў танку гарэў?
— Ну, пачакайце, – пачынае таргавацца Сабака, – можа, я ёй паесьці нясу.
— Што паесьці?
— Ну, паесьці, – Сабака прыгадвае, што насамрэч есьць ягоная бабуля, калі ёй даюць. – Малочныя прадукты, разумееце? Сыр.
— Сам ты сыр, – бяз злосьці кажа цётка ва ўніформе.

Сабака разумее, як усё гэта выглядае збоку. Што вось ён б'ецца галавой аб велічэзны бясконцы мур, якім ад яго адгарадзілася жыцьцё, б'ецца безь ніякай надзеі на посьпех, і ўсе жыцьцёвыя спакусы, у тым ліку і праезд у мэтрапалітэне, яму цяпер проста ня сьвецяць, вось як гэта выглядае. Ён зьбірае ўсю сваю волю ў кулак і гаворыць нешта кшталту таго, што, маўляў, паслухайце, жанчына, ён, вядома, гаворыць ня так, але зьмест прыблізна такі. Дык вось, паслухайце мяне ўважліва, кажа ён, добра? Толькі не нэрвуйцеся. Вось што я вам скажу, жанчына. Вы, канечне, можаце зьневажаць мяне, я бачу, што вы зьневажаеце мяне, вы ж зьневажаеце, так? Паслухайце, паслухайце, я хачу яшчэ сказаць, паслухайце. Але пры ўсім пры гэтым, разумееце, як бы гэта сказаць – ну, вы там, я ня ведаю што, вы па-рознаму можаце да гэтага ставіцца, згодны, для вас гэта можа нічога ня значыць, але пагадзіцеся – мая бабуля можа здохнуць з голаду

толькі праз тое, што мяне – яе законнага ўнука, перапрашаю, вось так проста не прапусьціла ў мэтро нейкая падла тылавая. Пагадзіцеся? (ну, у гэтым месцы яны проста паабкладалі адно аднаго, але хай будзе так) – ён канцэнтруецца і раптам прашмыгвае ў жанчыны пад рукамі, узмахваючы ў паветры вэтэранскім пасьведчаньнем, і зьнікае ў халодных кішках падземкі.

«Якая падла тылавая? – думае жанчына. – Я ўвогуле – 49-га году нараджэньня».

17.10

Сабака выходзіць пад стадыёнам, на пустую плятформу, недзе праз гадзіну «Мэталіст» гуляе апошні хатні матч, сёньня ўсе павінныя зьехацца, ведаеце, як бывае, закрыцьцё сэзону і ўсё такое, наверсе дажджлівае лета, неба з хмарамі, і недзе акурат над Сабакам стаіць напаўразвалены стадыён, у апошнія гады ён зусім размок і асунуўся, скрозь бэтонныя пліты пачынае прабівацца трава, асабліва пасьля дажджоў, трыбуны засраныя галубамі, на полі таксама гаўно, асабліва калі там гуляюць нашыя, разваленая краіна, развалены фізкультурны рух, вялікія стырнавыя праябалі найгалоўнейшае, як на мяне, вось жа, як ні круці, а ў Саюзе былі дзьве рэчы, якімі можна было ганарыцца – футбольны чэмпіянат і ядзерная зброя; тых, хто пазбавіў народ такіх атракцыёнаў, наўрад ці чакае спакойная бестурботная старасьць, нішто так не падрывае карму, як хуёвая нацыянальная палітыка, гэта ўжо дакладна. Сабака яшчэ нейкі час стаіць на плятформе, зь іншага боку маюць пад'ехаць знаёмыя, так што трэба іх дачакацца. Сабака стомлены і змучаны – ён п'е ўжо трэці дзень, яшчэ і надвор'е паганае, напэўна, гэта ад надвор'я, ціск ці як гэта называецца, як называецца стан, калі ты п'еш трэці дзень і раптам перастаеш пазнаваць родных і блізкіх? Вядома, ціск.

Ён нават ня можа згадаць, што адбылося – лета пачыналася так добра, ішлі дажджы, Сабака пасьпяхова і бестурботна прасяраў свае маладыя гады, але раптам сябры-рэклямнікі зацягнулі вечна беспрацоўнага Сабаку ў нетры рэклямнае індустрыі,

кажучы прасьцей, узялі кур'ерам у аддзел рэклямы сваёй газэты, Сабаку ламала, але ён трымаўся і хадзіў на працу. Карысьці ён прыносіў няшмат, але добра было ўжо тое, што недзе лічыўся чалавекам, сам ён гэтым асабліва ніколі не пераймаўся, ну, а сябры, на тое яны і сябры, каб грубым кантактавым спосабам выпраўляць твой сацыяльны статус, я ад самага пачатку казаў, што надоўга яго ня хопіць, але мяне ня слухалі, казалі: нічога, ён нармальны ўвогуле хлопец, ёбнуты трошкі, але нічога, нічога, пагаджаўся я, нічога.

Сабакі хапае дзён на дзесяць, пасьля ён запівае і на працу больш ня ходзіць, а каб яго не знайшлі, п'е па знаёмых, у Сабакі ў ягоныя дзевятнаццаць паўгораду знаёмых, адну ноч ён нават начуе на вакзале – сустракае там знаёмых грыбнікоў, што едуць ранішняй электрычкай кудысьці на Данбас па сыравіну, і начуе зь імі пад калёнамі на вуліцы, тройчы шманаецца патрулямі, сумленна адседжвае да ранку, слухаючы байкі пра грыбы ды іншыя тэрмаядзерныя рэчы, потым не вытрымлівае і звальвае дахаты. Тут яго і засьпявае тэлефонны званок. У іншым стане Сабака ні за што слухаўку ня зьняў бы, але ўсярэдзіне ў яго ўжо плаваюць срэбныя халодныя стронгі трохдзённага алькагольнага запою і балюча б'юць зь сярэдзіны хвастамі па нырках і печанях, так што сьвет у Сабачых вачах цямнее, і слухаўку ён бярэ аўтаматычна. «Сабака? – крычаць у тэлефон. – Ня сьмей кідаць слухаўку!»: сябры-рэклямнікі Вова і Валодзя, якія ўладкавалі яго на сваю галаву ў рэклямны бізнэс, сядзяць недзе ў сваім камсамольскім офісе, і, вырываючы адзін у аднаго слухаўку, імкнуцца пераканаць Сабаку пагаварыць зь імі, зьбіваючыся час ад часу на мат. «Сабака! – гавораць яны. – Галоўнае, ня сьмей кідаць слухаўку. Підар! – гавораць яны, пераканаўшыся, што Сабака іх слухае, – калі ты зараз кінеш слухаўку, табе хана. Мы цябе ўрыем, чуеш?» «Алё», – кажа на гэта Сабака. «Што алё? – нэрвуюцца Вова і Валодзя – Што алё? Ты нас чуеш?» «Так», – кажа Сабака напалохана. «Добра, – жвавеюць Вова і Валодзя. – Значыцца, так, цяпер – дзесяць раніцы». «Што?» – Сабака канчаткова пужаецца і слухаўку кідае. Тэлефон адразу трашчыць зноў. Сабака нерашуча падымае слухаўку. «Ты!!! – раве ў слухаўцы. – Підар!!! Ня сьмей кідаць слухаўку!!! Ты нас чуеш??? Ня сьмей кідаць слухаўку!!!» Сабака цяжка зглытвае сьліну. «Ты нас чуеш?» «Ну», –

няўпэўнена кажа Сабака. «Значыцца так, – разрываюцца рэклямнікі. – Цяпер – дзесяць раніцы. Ня сьмей кідаць слухаўку!!! Ты чуеш??? Ня сьмей кідаць слухаўку!!! Цяпер дзесяць. А палове на шостую мы чакаем цябе каля стадыёну. Калі ня прыйдзеш – мы табе адарвем яйцы. Калі прыйдзеш – мы табе таксама адарвем яйцы. Але табе лепш прыйсьці. Ты зразумеў???» «Так», – кажа Сабака. «Ты нас зразумеў?!!» – ня могуць супакоіцца рэклямнікі. «Зразумеў», – кажа Сабака Паўлаў, адчуваючы, як стронгі весела ганяюць недзе ў яго пад горлам. «Што з табой? – нарэшце пытаюцца рэклямнікі. – Табе дрэнна?» «Так» – «Табе чаго-небудзь прынесьці?» – «Вадзяры прынясіце». «Підар», – гавораць Вова і Валодзя і кладуць слухаўку.

Сабака пераводзіць дых. Дзесяць гадзінаў. Трэба пераапрануцца або пахмяліцца, лепш, вядома, пахмяліцца. З суседняга пакою выходзіць ягоная бабуля. Гэта ягоная бабуля, ён яе любіць, ну і ўсякае такое, нават ходзіць зь яе вэтэранскім пасьведчаньнем, можна нават сказаць, што ён ганарыцца ёю, не зусім, канечне, але да пэўнай ступені, гаворыць, што яна ў танку гарэла, я сабе слаба ўяўляю старэнькую ў танкавым шлеме, але ўсё можа быць. «Што, Віталік?» – гаворыць яна. «Праца, бабуля, – кажа Сабака. – Праца». «Што гэта за праца такая, – бядуе старэнькая. – Учора цэлы дзень тэлефанавалі, дзе, кажуць, гэты підар. А я адкуль ведаю?»

17.22

Вова і Валодзя выскокваюць з вагона, падбіраюць Сабаку і выходзяць на вуліцу. «Жывы?» – пытаюцца. Сабака зусім бледны, ніяк не паправіцца, яны цягнуць яго ў гастраном на Пляханаўскай і бяруць там дзьве пляшкі вадзяры, ня бойся, гавораць яны Сабаку, мы цябе спачатку адкачаем, а ўжо потым яйцы рваць будзем, які нам інтарэс рваць нешта ў цябе такога, ты на сябе паглядзі, яны падводзяць яго да вітрыны гастраному, гастраном цёмны і пусты, як і большасьць гастраномаў у краіне ў гэты трывожны час, развалілі краіну, сукі, глядзі, гавораць яны Сабаку, глядзі, на каго ты падобны, Сабака зусім расслаблены, ён глядзіць у вітрыну, за якой стаіць прадавачка ў белым халаце і таксама глядзіць, як за акном на

вуліцы, якраз насупраць яе, стаяць двое навалачнага выгляду ўблюдкаў, трымаюць пад рукі трэцяга такога ж і паказваюць на яе пальцамі. Яна глядзіць на іх зь нянавісьцю, Сабака неяк факусуе позірк, пазнае сваё адлюстраваньне і раптам заўважае, што ў гэтым адбітку ёсьць яшчэ нехта, нейкая дзіўная істота ў белым адзеньні зь вялікай колькасьцю касмэтыкі на твары цяжка паварочваецца ў яго абалонцы, у межах ягонага цела, нібы намагаецца прарвацца скрозь яго, так што яму робіцца блага, напэўна, думае Сабака, гэта мая душа, толькі чаму ў яе залатыя зубы?

17.35 – 18.15

Цягам сарака пяці хвілінаў Сабаку прыводзяць у прытомнасьць. У яго ўліваюць вадзяру, і, па нейкіх законах фізыкі, Сабака, напаўняючыся ёю, выплывае на паверхню, гаворыць усім прывітаньне, яго таксама вітаюць усе прысутныя, зь вяртаньнем цябе, піянэр-герой Сабака Паўлаў, клёва, што ты вярнуўся да нас, нам тут цябе таксама не хапала, ага, гавораць прысутныя, то бок Вова і Валодзя, мы проста мусілі цябе адкачаць, каб яшчэ раз паглядзець у твае, хоць і п'яныя, але ўсё адно сумленныя вочы, каб ты нам сказаў, за што ты так ненавідзіш рэклямны бізнэс цалкам і нас з Валодзем, кажа Вова, у прыватнасьці, што мы табе зрабілі, што ты нас так беспантова кінуў, зьнік зь вельмі важнай, дарэчы, карэспандэнцыяй, за якую, калі б маглі, мы б табе двойчы яйцы адарвалі. І так паміж імі вядзецца нейкая такая сяброўская размова, ведаеце, як яно бывае, і Сабака цалкам вяртаецца на сьвет, зь якога яго лездь ня выштурхнула ягоная ж уласная душа, ён азіраецца навокал і прыслухоўваецца: стронгі ляжаць недзе на глыбіні, злы залатазубы анёл у белым халаце і капронавых панчохах таксама адляцеў, рэклямнікі Вова і Валодзя зацягнулі яго кудысьці ў зарасьці за мэталёвыя, пафарбаваныя ў белае, кіёскі і шчодра пояць вадзярай. Соцыюм патрабуе кампрамісаў.

18.15

Чаму яны ніколі не прыходзяць на стадыён своечасова, калі там гучаць маршы і прывітальныя прамовы клеркаў ад

муніцыпалітэту? Па-першае, яны звычайна прыходзяць не зусім цьвярозыя і ўжо дрэнна арыентуюцца ў часе, іншым разам яны наагул дрэнна арыентуюцца, што ўжо там час, яны поры году не адрозніваюць, заўжды то ў цёплых швэдрах пад пякучым сонцам, то ў мокрых футболках пад першым сьнегам. Па-другое, перад матчамі адбываецца якая-небудзь лятарэя, а ў лятарэю яны ня вераць, тут і гаварыць няма пра што. Па-трэцяе, іх таксама можна зразумець – калі табе дзевятнаццаць і ты запаўзаеш у свой сэктар, і ўсе – уключна зь міліцыяй – бачаць, у якім ты цудоўным прыўзьнятым стане, што можа быць больш узбуджальным для цябе? Потым, калі ты вырасьцеш і пачнеш працаваць у банку ці газавай канторы, калі з рэальнасьцю будзеш вымушаны мець зносіны толькі па тэлевізары, а зь сябрамі – па факсе, калі ў цябе будуць сябры, а ў іх – факс, тады, канечне, табе похуй будзе такая штука, як п'яны тынэйджарскі драйв, што зносіць башку і кідае цябе на ўсе амбразуры сьвету, калі вочы вільгатнеюць ад узбуджэньня, кроў пад пазногцямі спыняецца ад таго, што вось некалькі соцень чалавек сочаць, як яны заходзяць у сэктар і шукаюць свае месцы, і нават кагосьці нясуць на плячах, называючы яго чамусьці сабакам, час ад часу губляюць яго паміж лавамі, але ўпарта і настойліва падбіраюць і цягнуць на запаветныя месцы, далей ад вартавых, далей ад прадавачак марозіва, увогуле – далей ад футболу, як яны яго разумеюць.

18.25

Наступны раз у прытомнасьць Сабака Паўлаў прыходзіць ужо на стадыёне, добра вось так сядзець зь сябрамі, думае ён, на лаве, недзе пад нейкімі дрэвамі, што шумяць і хістаюцца ва ўсе бакі, не, раптам думае ён, гэта ня дрэвы, тады што гэта?

Празь некалькі сэктараў, зьлева ад іх, пад цяжкім чэрвеньскім дажджом, стаяць фанаты суперніка. Іх некалькі дзясяткаў, яны прыехалі зранку на вакзал, і за імі цэлы дзень цягаецца некалькі патрулёў, на стадыёне ім адвялі асобны сэктар, у якім яны сумна махаюць размоклымі і разбухлымі сьцягамі. Яшчэ да перапынку нашыя, незадаволеныя вынікам і надвор'ем, прарываюць кардон і пачынаюць іх біць. Зьнізу, ад поля,

падцягваецца рота курсантаў-пажарнікаў, міліцыя, зрэшты, не прыдумвае нічога лепшага, як выпхаць усіх з стадыёну, і пачынае адцясьняць народ да выхаду, пакуль яшчэ ідзе першы тайм; усе, ясная рэч, забываюцца на футбол і пачынаюць заўзець за нашых на трыбунах, каманды таксама больш пераймаюцца бойкай, чым вынікам, цікава ўсё ж такі, нечакана, тут, на полі, і так усё было зразумела – хтосьці пад канец абавязкова гульню зьліе, а там – бач ты, нейкая барацьба, зусім табе рэгбі, вунь і пажарныя па галаве ўжо атрымалі, а тут і тайм заканчваецца, і каманды неахвотна цягнуцца ў тунэль, міліцыя выносіць апошніх гастралёраў, таму, калі гульня аднаўляецца, сэктар ужо апусьцелы. Толькі растаптаныя і разарваныя сьцягі, нібы фашысцкія штандары на Чырвонай плошчы, сьцяжэла ляжаць у лужынах, нашыя, хто ацалеў, задаволена вяртаюцца ў свае сэктары, найбольш зацятыя і прынцыповыя заўзятары едуць на вакзал – адлоўліваць тых, хто будзе вяртацца дадому; і тут, недзе на пятнаццатай хвіліне другога тайму, на трыбуны забягае яшчэ адзін гастралёр – зусім юны чувак, раскудлачаны і намоклы, дзе ён быў дагэтуль – невядома, але вось ён ужо дакладна ўсё найцікавейшае прапусьціў, ён убягае і бачыць сьляды пабоішча і рваныя сьцягі сваёй каманды і нікога зь сяброў; дзе нашыя? – крычыць ён, азірнуўшыся на прыціхлыя трыбуны, гэй, дзе ўсе нашыя?! – і ніхто яму нічога ня можа адказаць, шкада чувака, нават ультрасы замоўклі, абарвалі сваё працяглае «судзьдзя – підарас», глядзяць сарамліва на гастралёра, няёмка перад чуваком, сапраўды – неяк непрыгожа выйшла, і чувак глядзіць зьнізу на заціхлыя сэктары і глядзіць на мокрае поле, на якім месяць гаць каманды, і глядзіць у халоднае і маларухомае неба і ня можа зразумець: што адбылося, дзе пацаны, што гэтыя клоўны зь імі зрабілі, і падбірае пагнутую піянэрскую трубу, у якую да гэтага дзьмуў нехта зь яго палеглых сяброў, і раптам пачынае пранізьліва сьвісьцець у яе, плаксіва і роспачна, так што ўсе аж ахранелі – трэба ж так, сьвісьціць, адвярнуўшыся і ад поля, і ад ультрасаў, і ад прыціхлых і прысаромленых пажарных, сьвісьціць нейкую сваю, толькі яму аднаму вядомую, гучную і фальшывую ноту, укладаючы ў яе ўсю сваю адвагу, усю сваю безнадзейнасьць, усю сваю чыста пацанскую любоў да жыцьця…

19.30

Пад самым дахам, над апошнімі радамі, сядзяць сонныя галубы, якія ўжо звыклі да паразаў нашай каманды, і сонна буркочуць, жывуць сабе, нікому не перашкаджаюць, прыкольныя мокрыя зграі, але вось Сабака слухае іх скрозь сон, яны яму зьяўляюцца ў ягонай алькагольнай прастрацыі і выцягваюць яго адтуль, ведаеце, такі дзіўны стан, калі ты адным вокам бачыш сьвятло сьпераду, а другім, як бы гэта патлумачыць – другім ты бачыш тое, што можна, напэўна, назваць іншым бокам сьвятла, ну, вы разумееце, адным словам, калі табе адначасова паказваюць вельмі многа, але ты ў такім стане, што ўбачыць ужо нічога ня можаш. Дый ня хочаш. Таму Сабака спаўзае на цэмэнтную падлогу і пачынае адпаўзаць у бок праходу, трушчачы сваімі змучанымі грудзямі сланечнікавае шалупіньне, недапалкі і лятарэйныя білеты. Адпаўзае да праходу, устае на ногі і нерашуча рушыць наверх, да апошняга раду, чапляецца там за мэталёвае мацаваньне і павісае на ім зусім бязь сілаў – ня ўпасьці на трыбуну і не прыціснуць заўзятараў якіх-небудзь калі ўпадзеш трэба будзе выбачацца з кімсьці сутыкацца штосьці гаварыць і тады ўсе адразу адчуюць як дрэнна пахне ў цябе з рота і адразу здагадаюцца што ты піў так што галоўнае ні з кім не гаварыць і ні да каго не зьвяртацца а калі ўпадзеш абавязкова з табой хто-небудзь загаворыць і не адкруціься потым скажуць што ў цябе так з рота дрэнна пахне дакладна ўнюхаюць толькі пачнуць гаварыць нават калі адвярнуцца і гаварыць убок усё адно ўнюхаюць хіба што добра адвярнуцца і так гаварыць што гаварыць? што трэба гаварыць каб яны не даведаліся? што я павінен сказаць? хутчэй а то заўважаць скажуць што-небудзь што скажуць? скажуць чаму маўчыш? не крычыш? чаму я не крычу? трэба крычаць інакш яны заўважаць што ў мяне дрэнна пахне з рота скажуць што ў мяне дрэнна пахне з рота бо я не крычу або падумаюць што я п’яны бо я не крычу што я павінен крычаць? што я павінен крычаць? ну што я павінен крычаць? трэба запытаць у каго-небудзь трэба адвярнуцца і запытацца або адвярнуцца і закрычаць тады ніхто нічога не заўважыць усё адно не заўважаць такі шум стаіць добра я крыкну штосьці ўбок ніхто не пачуе як у мяне дрэнна пахне з рота але ўсе заўважаць што я крычу значыць я ня п’яны нармальна гэта я нармальна

прыдумаў толькі што крыкнуць ну што ж мне крыкнуць што яны ўсе крычаць? пра судзьдзю пра судзьдзю толькі крыкнуць убок каб не пачулі і каб не заўважылі неяк так трэба крыкнуць і абавязкова пра судзьдзю тады будзе нармальна – і тут наш форвард вывальваецца сам-насам з брамнікам і б'е, проста хуячыць з усяе моцы, некалькі тысяч мокрых заўзятараў замірaюць, затрымліваюць, можна сказаць, дых, і тут за іхнымі сьпінамі ў вільготнай цішыні роспачна лунае:
— Гэээээээээээээээй!!! Тыыыыыыыыыыыыыыыыы!!!!!!!!!!!!!!!

І мокрыя заўзятары ў блізкіх сэктарах зачаравана паварочваюць галовы і бачаць там Сабаку Паўлава, старога добрага Сабаку Паўлава, якога тут ведае кожны сабака, то бок кожны сяржант з рацыяй, ён зусім зьняможана павісае на жалезным мацаваньні, павярнуўшыся да трыбунаў, назавём гэта сьпінай, і працяжна вые кудысьці ў нікуды, ці як гэта назваць.

19.45

Чаму? Таму што ты ня проста нейкі мудак, які зьмірыўся зь існым несправядлівым станам рэчаў і са штодзённымі наёбкамі зь яго боку, таму што ты не зьбіраесься да канца сваіх дзён угрызацца ў чыёсьці горла за расфасаваную імі хаўку. Таму што ты, урэшце, маеш што сказаць, калі б нехта запытаў у цябе пра найгалоўнейшае, так што гэтага ўжо хопіць, думае Сабака, дакладней, ён, вядома, у такім стане нічога падобнага ня думае, але калі б ён мог цяпер думаць, ён, мне здаецца, думаў бы менавіта так, таму ён пачынае лезьці ўгору па бэльцы, што падпірае дах, зьдзіраючы пальцамі старую зелёную фарбу і засохлае птушынае лайно, прыціскаючыся да халоднай трубы, асьцярожна цягнецца ўгору, перастаўляючы ногі па жалезнай канструкцыі, апынаецца акурат над галовамі сяржантаў, што на нейкі час забыліся на яго, над галовамі ўсіх сваіх мокрых і п'яных знаёмых, колькі іх тут ёсьць, над шчасьлівымі галовамі Вовы і Валодзі. Іх ён і пазнае і спыняецца акурат над імі, разглядае іх зьверху, думае: о, як клёва, калі працягнуць руку ўніз, можна абодвух падняць сюды, і ён цягне да іх руку і нешта ім кажа, нават не заўважаючы, як дрэнна ў яго пахне з рота.

І тут нашы закалочваюць мяч, і мокрыя горлы равуць – ваў-ў-ў-ў-ў!!! – ваў-ў-ў-ў-ў!!! – равуць яны, і ад гэтага рову сотні і тысячы сонных галубоў выпырхваюць са сну і вылятаюць, як снарады, са сваіх сядалаў, усланых пер'ем, зямлёй і лятарэйнымі білетамі, вылятаюць хваляй пад мокрае неба, і гэтая хваля б'ецца аб Сабаку, і той ня ўтрымліваецца і ляціць уніз, пралятае свае некалькі мэтраў і смачна плюхаецца на лаву, поруч з Вовам і Валодзем, тыя нарэшце згадваюць пра свайго таварыша, паварочваюцца да яго і бачаць яго побач з сабою, як і мае быць.

— О, Сабака, – крычыць Вова.
— Сабака, мы забілі, – крычыць Валодзя.
— Здорава, – гаворыць Сабака і ўсьміхаецца. Упершыню за апошнія тры дні, дарэчы.

19.50 – 8.00

Вова і Валодзя не наважваюцца паказаць свае дакумэнты, таму да шпіталізаванага Сабакі іх не пускаюць, яны тлумачаць, што яны сябры, нават родныя, далёкія, але ўсё ж такі родныя, але ім кажуць, што такіх родных, як Сабака, саромецца трэба, і ўкладаюць яго – п'янага і соннага – на насілкі, а потым запіхваюць у хуткую, чамусьці яны ўсе думаюць, што Сабака менавіта траўмаваны, а ня п'яны, гэта яго і ратуе, яго не забіваюць на месцы, як гэтага вымагаюць інструкцыі паводзінаў для сяржантаў, старшынаў і мічманаў пры гераічнай абароне спартыўных комплексаў і месцаў масавага адпачынку працоўных падчас правядзеньня там футбольных матчаў, палітычных мітынгаў ды іншых фізкультурна-асьветніцкіх шабашаў. Нейкі мілажальны сяржант нават падыходзіць да кіроўцы хуткай, запісвае яго каардынаты, пакідае яму свой рабочы тэлефон і загадвае неадкладна імчаць цяжкапараненага Сабаку, а заўтра, калі нічога сур'ёзнага ня здарыцца, прывезьці яго залатанае цела да іх у раус для далейшых лябараторных дасьледаваньняў, там яны і высьветляць, што гэта за Гагарын наябнуўся ім на галовы. Кіроўца бярэ пад казырок, ну вы разумееце, пра што я, і хуткая зьнікае за зялёнай брамай стадыёну, разганяючы сваімі сырэнамі мокрых заўзятараў, у

вясёлым віры якіх губляюцца і Вова з Валодзем – бо перамога прадугледжвае зьбіраньне да купы і радасную калектыўную масу, салюты і зладжаны харавы сьпеў, і толькі параза, горкая асабістая параза, не прадугледжвае нічога, акрамя п'яных санітараў і апарату штучнага дыханьня, які да таго ж і не працуе, дакладней не – ён працуе, але ніхто ня ведае як.

Да раніцы Сабака абрыгвае ўсе прасьціны, у якія ён быў загорнуты, і выклікае рэзкую агіду з боку мэдычнага пэрсаналу. Дзяжурныя мэдсёстры намагаюцца кудысьці дазваніцца, знайсьці тых далёкіх родзічаў, якія хацелі гэтую навалач забраць яшчэ там – на стадыёне, але тэлефону ніхто ня ведае, у Сабакі з усіх дакумэнтаў знаходзяць толькі вэтэранскае пасьведчаньне, выданае на імя Паўлавай Веры Навумаўны, усе разглядаюць гэтае пасьведчаньне – пашарпанае й абгарэлае па краях – але Сабака, хоць ты забі, на Паўлаву Веру Навумаўну ня цягне, яны на ўсялякі выпадак яшчэ глядзяць па картатэцы і са зьдіўленьнем высьвятляюць, што, згодна зь іхнымі запісамі, гэтая самая Вера Навумаўна яшчэ тры з паловай гады таму богу душу аддала, але ў гэтых картатэках такое трапляецца, гаворыць старэйшая дзяжурная мэдсястра, цалкам прызнаць, што перад ёю ўсё ж такі ня Паўлава Вера Навумаўна, а нейкі неідэнтыфікаваны ўёбак, яна адмаўляецца, таму зранку яны вызвоньваюць кіроўцу з хуткай, той толькі што адпрацаваў зьмену і з гэтай нагоды піў усю ноч, таму пра Сабаку зразумеў не адразу, сказаў, што ніякай Веры Навумаўны ён учора са стадыёну не прывозіў, бажыўся, што жанаты і што з жонкай у іх усё добра, нават сэкс зрэдзьчасу бывае, калі ён не на зьмене, ну, але ўрэшце зразумеў, пра што вядзецца і выдаў мэдсёстрам тэлефон сяржанта, што цікавіўся ўчора далейшым лёсам падабранага Сабакі. Мэдсёстры кідаюцца тэлефанаваць сяржанту, гавораць, што, маўляў, бяда, таварыш сяржант, у нас тут ляжыць абрыганы неданосак, які-які? з ранішняй бадзёрынкай у голасе перапытвае сяржант і тут-такі пачынае запісваць, запісваю, кажа ён, аб-ры-га-ны, ну-ну? вось, кажуць мэдсёстры, мала, што абрыганы, дык ён яшчэ і бяз пашпарта, так-так-так, адказвае на гэта сяржант, ня так хутка, ма-ла-што-аб-ры-г, слухайце, раптам пытаецца ён, ну, а мне-то што, можа, у яго страсеньне мазгоў? Няма ў яго, кажуць сёстры, ні

страсеньня, ні мазгоў, ён наагул нейкі дэзэртэр, ходзіць з чужымі дакумэнтамі, ага, ажыўляецца сяржант, з чужымі, яшчэ і абрыгаў нам тут усё, ня могуць супакоіцца сёстры, ну, гэта вы добра, сувора гаворыць сяржант, давайце, цягніце яго да нас, але хутчэй, у мяне а дзявятай зьмена сканчаецца, а напарнік мой зь ім цягацца наўрад ці захоча – у яго ціск. Зразумела, кажуць сёстры, ціск.

Яны тут жа выклікаюць дзяжурнага кіроўцу, забірай, кажуць яму, гэтую навалач, якая нам тут усё абрыгала, і вязі яе ў Кіеўскі раус, у яе там нейкі непарадак з дакумэнтамі, ага, кажа кіроўца, вось зараз усё кіну і павязу вашую навалач выпраўляць дакумэнты, можа, яго яшчэ ў ЗАГС адвезьці? рабіць мне няма чаго. У прынцыпе, ён нядаўна заступіў на зьмену і рабіць яму сапраўды няма чаго, ты давай не выёбвайся, гаворыць яму старэйшая дзяжурная мэдсястра, чыя зьмена заканчваецца, адвязеш яго – і адразу назад, у нас тут яшчэ працы мора, ага, кажа кіроўца, чорнае мора, і грэбліва ўзяўшы пад руку аслабелага і дэмаралізаванага Сабаку, вядзе яго ўніз, адчыняе заднія дзьверы хуткай, давай, кажа Сабаку, залязай, сядай вунь на насілкі, а лепш кладзіся, а то ўпадзеш на павароце, разаб'еш якое-небудзь шкло, або парэжасься, або фарбу перавернеш, якую фарбу? пытаецца Сабака, якую-небудзь, гаворыць кіроўца, кладзіся давай, можа, я пасяджу? баязьліва пытаецца Сабака, ты давай не выёбвайся, кажа яму кіроўца і сядае за штурвал. Сабака спрабуе легчы, але яму адразу ж робіцца блага, і ён пачынае рыгаць – на насілкі, на сьцены, на нейкую фарбу, ну вы разумееце. Кіроўца ў адчаі тармазіць, бяжыць да задніх дзьвярэй, адчыняе іх, атрымлівае сваю порцыю Сабачых ванітаў і выкідае напаўахаладзелага Сабаку на ранішні харкаўскі асфальт, і ўжо лаючыся на чым сьвет стаіць, вяртаецца назад у шпіталь, дзе яго, калі сказаць папраўдзе, ніхто асабліва не чакае.

УСТУП № 2

9.00

— Ведаеце, што найгоршае – я ня ведаў, што там іх дзьве. Адна на гаўбцы была.

— Ну.
— Ну, я зайшоў, а яна там адна. Я ж ня ведаў, разумееце? І яна ляжыць амаль цалкам разьдзетая, там нейкія майткі, бюстгальтары.
— Што, некалькі бюстгальтараў?
— Не, ну, проста розная бялізна.
— Як гэта?
— Ну, рознага колеру, разумееш?
— Нават гаварыць пра гэта не хачу.
— Я ж кажу. Я ўвогуле не люблю бялізны. Жаночай, маю на ўвазе.
— Ну, зразумела.
— Карацей, я бачу, яна ўгашаная, ну, таксама пачынаю распранацца. А я ж ня ведаў, што яны ўжо зранку. Яны там, значыцца, спачатку наглыталіся нейкай брыдоты, а потым вадзярай залілі, уяўляеце? Сукі п'яныя. А я стаю, і ў мяне эрэкцыя.
— Нішто сабе.
— А тут гэтая сука з гаўбца выходзіць, ну, другая. Пужаецца, канечне.
— Зразумела...
— Тая, што ў пакоі, нічога, мабыць, прывыкла ўжо.
— Да чаго?
— Да мяне. Яна мяне такога ўжо бачыла, ну, з эрэкцыяй.
— Завал.
— Я ж кажу. А тая, што на гаўбцы, ужо ўгашаная, вы разумееце, яны зранку пілі, сукі. Я жанчынам увогуле піць бы забараніў. Вы разумееце, пра што я?
— Так, бабы. У мяне сусед ёсьць, дык ён зранку выходзіць і бярэ літры два вадзяры.
— Два літры?
— Сур'ёзна.
— Пра гэта нават думаць непрыемна.
— Я пытаюся ў яго – на хуя табе, мужык, два літры? Ты ж ня вып'еш. А ён ведаеце, што кажа?
— Што?
— Я, кажа, калі вып'ю, ну там першы пузыр, ужо баюся кудысьці выходзіць. А выпіць хачу, не магу спыніцца.
— Сур'ёзна?
— А хулі ён баіцца?

— Ну, ня ведаю, страшна яму. Стром пачынаецца ад вадзяры. А выпіць хочацца. Ну, ён і бярэ адразу два літры. Сядзіць і квасіць.
— Ну, пачакай, раздушыць ён пузыр, раздушыць другі, ды хрэн зь ім – вып'е ўсё. А далей?
— Што – далей?
— Ну, выпіць жа ізноў хочацца?
— Хочацца.
— Але ж выходзіць страшна.
— Не, ні фіга, там, разумееце, такая сыстэма – ён калі выпівае свае два літры...
— Два літры!
— ...ну, два літры, яго перамыкае, і яму ўжо ня страшна.
— Сур'ёзна?
— Я сам бачыў.
— Ну, а як яму?
— Што значыць – як?
— Ну, як яму, калі ня страшна?
— Яму похуй.
— І што?
— Ну, і ён далей валіць па вадзяру. Падае, а ідзе.
— Во бля...
— Яшчэ б. А ты кажаш – эрэкцыя.
— Што эрэкцыя?
— Ты кажаш – эрэкцыя.
— Ну, эрэкцыя.
— І што?
— Нічога. Ну, стаю я са сваёй эрэкцыяй.
— Завал...
— Ну.
— І тут выходзіць гэтая п'яная сука з гаўбца, уяўляеце?
— Я гэтага не ўяўляю.
— Ну, і бачыць мяне. І, значыцца, думае – што гэта за мудак сюды прыпхаўся і стаіць тут?
— Што стаіць?
— Стаіць, кажа.
— Мабыць, думае яна, сусед, прыйшоў патрахацца. І, значыцца, хапае пусты фугас з-пад шампанскага і запускае мне проста ў чэрап.
— А ты?

— Ну, я прытомнасьць страціў. Упаў, значыцца, увесь у крыві. А гэтая сука п'яная, уяві, падбягае да іншай і давай яе будзіць, уставай, кажа, трэба яго, ну, то бок мяне, вязаць. І яна ўстае, прыкінь, і яны мяне вяжуць прасьцінамі па руках і нагах.
— Дык яна ж цябе ведала, ну, тая другая.
— Ды яны ж угашаныя абедзьве зранку, сукі, я ж кажу! Яны нейкай фігні нажэрліся, а потым яшчэ вадзяра. Як тая сука з гаўбца назад трапіла – не ўяўляю. Яны адна адну ўжо не пазнавалі.
— Ну?
— І, значыць, вяжуць мяне і зацягваюць у ванну, кінулі і пайшлі спаць.
— Ага...
— А зранку, значыць, адна зь іх, тая, што з гаўбца выйшла, вядомая рэч, ужо нічога ня памятае і папёрлася ў ванну мыцца. Прычым, карова, сьвятла не ўключае, навобмацак лезе. Залазіць, значыць, у ванну, а там я...
— Гарэлка, ты разумееш, яна жанчын глушыць, яны як рыбы робяцца.
— Я калісьці кантралёрку ў трамваі сустрэў, дык яна са сваім кампостэрам хадзіла.
— Не пізьдзі.
— Што – не пізьдзі? Сур'ёзна – ідзе баба, п'яная, сто пудоў, я ёй свой талёнчык даю, а яна аднекуль з кішэні дастае кампостэр, уяўляеце?
— Свой кампостэр, мабыць, прыкольна мець.
— Твая праўда.
— Во бля...
— Я спрабаваў калісьці зьняць у трамваі. Уначы акурат ехаў, нікога не было, ну, я давай яго выломваць, распароў руку, уяўляеце, кроў цячэ ва ўсе бакі, а тут кантралёры заходзяць.
— Сукі.
— Ну, і адразу да мяне, у прынцыпе, я адзін там ехаў, больш нікога. На хуя, кажуць, кампостэр ламаеш.
— А ты?
— Што я? Кажу, не ламаю я нічога, хацеў, кажу, талёнчык пракампаставаць, а ваш траханы кампостэр мне руку зажаваў. Во, кажу – глядзіце.
— Крута.
— Во бля...

Какава, непаваротлівы і спацелы, у гэтай кампаніі добра, наагул, пачуваецца. Маленькі пакойчык, у якім яны сядзяць, наскрозь прапах цыгарэтным дымам і кавай, кубкаў на ўсіх не хапае, яны пускаюць па кругу першую каву, потым другую, перадаюць кубкі з рук у рукі, потым перадаюць кавалкі белага хлеба, пасьля гадзіны сядзеньня ў гэтым пакоі іхнае адзеньне, іхныя валасы і яны самі пахнуць тытунём і хлебам, хлебам нават больш. Какава выцірае рукавом спацелы лоб, ты што, сьмяюцца ўсе, Какава, гэта ж твой выхадны касьцюм, нічога – Какава чырванее – нястрашна, вымыю, ну-ну, сьмяюцца ўсе далей, ты ўжо другі год абяцаеш, бяры хлеб, Какава бярэ з рук сяброў сьвежы белы хлеб і далей слухае байкі, ён гатовы быць зь імі хоць увесь час, яму зь імі добра, дзеляць разам зь ім хлеб і цыгарэты, і галоўнае – яго ніхто не праганяе. А ў наш час ты яшчэ пашукай кампанію, якая будзе трываць цябе некалькі дзён у тваім пясочным касьцюме, які ты ня мыеш ужо другі год, калі ня трэці.

Какава да таго ж затоўсты для гэтай кампаніі, і ў касьцюме сваім ён выглядае жахліва, але гэты касьцюм яму падабаецца, ня ведаю, дзе такія касьцюмы прадаюцца, Какава ж яго недзе знайшоў, лічыць, што касьцюм стылёвы, ён памяшаны на такіх штуках, Какава ці не адзіны з маіх знаёмых ходзіць у цырульню, карыстаецца нейкім підарскім гелем, нават голіцца час ад часу, хоць на карысьць яму гэта не ідзе. Іх набілася ў пакой чалавек шэсьць, сядзяць і слухаюць Малога Чака Бэры, той апавядае, як ён сьвяткаваў свае народзіны, гісторыя ўсім падабаецца, Какава слухае з адкрытым ротам, яму асабліва спадабалася пра бялізну розных колераў, ён спрабуе сабе гэта ўявіць, але ня можа. Пасьля Малы Чак Бэры пушчае па кругу яшчэ адну цыгарэту і раптам гаворыць: Какава, раскажы ты што-небудзь, усе пагаджаюцца: так, Какава, давай, раскажы нам што-небудзь, што ты сядзіш маўчыш, нам жа таксама цікава, давай, раскажы нам што-небудзь, о, раскажы нам пра сваіх баб, усе сьмяюцца, так, крычаць, Какава, давай, раскажы нам пра сваіх баб. Какава саромеецца, ён усё-ткі адчувае сябе не зусім упэўнена, яны каманда, а ён так – проста зайшоў да іх у госьці, але ісьці прэч яму ня хочацца, таму ён думае, што расказаць, так, каб гэта было пра баб. Пра баб. Баб ён бачыць пераважна па тэлевізары. Можа, ім пра тэлевізар расказаць?

У пакой забягае нехта з адміністрацыі, усё – крычыць, пайшлі, пайшлі, хутчэй, час пачынаць, і яны пачынаюць падымацца і выпаўзаюць у калідор, ідуць гуськом, адзін за адным, дажоўваючы хлеб, дабіваючы цыгарэты, Какава цягнецца за імі, яны праходзяць нейкімі закавулкамі, паўсюль стаяць шчыты з агітацыяй, на сьценах вісяць вогнегасіцелі, нарэшце яны выходзяць на сьвятло, нехта паварочваецца да Какавы і кажа: давай, сябра, пачакай нас тут, добра? мы нядоўга. А колькі гэта будзе? пытаецца Какава, ды пару гадзінаў, можа, трошкі даўжэй, давай, сядай вунь пад сьценкай і пачакай. А можна, я паслухаю? пытаецца Какава, паслухай, кажа нехта, паслухай, але ў прынцыпе тут ня вельмі цікава – так, хуйня поўная. Какаву застаецца толькі паверыць ім на слова.

Заля забітая, сабралася больш як дзьве тысячы чалавек, хто прыйшоў пазьней – стаяць у праходах, таўкуцца пад сцэнай, публіка стромная – студэнты, пэнсіянэры, вайскоўцы, інваліды, інвалідаў асабліва шмат, ну, гэта зразумела, ёсьць нават бізнэсмэны, у касьцюмах едкіх колераў, ну і так далей. Калі яны выходзяць, заля радасна выбухае, інваліды пачынаюць крычаць нейкія свае мантры, ім махаюць рукамі, усьміхаюцца, нават пару букетаў паляцела на сцэну, яны выходзяць і нясьпешна бяруць у рукі інструмэнты, падключаюцца, хтосьці нешта паказвае гукавікам, маўляў, дайце мне больш, хтосьці адкаркоўвае пляшку зь мінэралкай, народ працягвае скандаваць, ладзячы сабе невялічкае сьвята, але яны ня надта на гэта вядуцца, усе разумеюць, у чым тут рэч, хто тут насамрэч галоўны і чым усё гэта скончыцца, і калі разагрэтыя інваліды пачынаюць сьпяваць хорам, і на іх ужо амаль ніхто не зьвяртае ўвагі, зьяўляецца ён –

10.00

Вялебны Джонсан-і-Джонсан, сонца на затуманеным небасхіле новага амэрыканскага пастарства, зорка самых масавых прыходаў на ўсім Заходнім узьбярэжжы, лідэр Царквы Ісуса (аб'яднанай), поп-стар, які ўпраўляе мазгі ўсім, хто гэтага прагне і хто прыйшоў да яго гэтым летнім дажджлівым ранкам, проста пасярод тыдня, вялебны Джонсан-і-Джонсан пляваць

хацеў на ўсе гэтыя ўмоўнасьці, ён не старавер які-небудзь, каб адпраўляць свае службы толькі ў выходныя, што за гаўно, кажа ён, што за стараабраднае гаўно, і ўсе зь ім пагаджаюцца. Ён прыехаў у горад пару тыдняў таму, зьняў канцэртную залю на месяц наперад, набраў музыкантаў і вось ужо чацьверты дзень ябошыцца тут, вяшчаючы абарыгенам слова божае, абарыгенаў набіваецца з кожным разам усё больш, вялебны мае фантастычных агентаў, усе гарадзкія газэты яшчэ за месяц да яго прыезду пачалі пра гэты прыезд пісаць, улёткі зь яго ўсьмехнутым амэрыканскім яблом раздаваліся на заводах, базарах і ў банках, у першы ж дзень па прыезьдзе ён даў інтэрвію найпапулярнейшаму гарадзкому ты-ві, і да найвялікшага зьдзіўленьня глядацкай аўдыторыі нават гаварыў на больш-менш прыстойнай дзяржаўнай мове, набіраючы трохачковыя проста на пустым месцы, гаварыў, што мае мясцовыя карані, але наагул ёсьць васпам, то бок стопрацэнтным белым з Тэхасу, ня дзіўна, што пра яго гаварыў цэлы горад, падчас перашага казаньня ў залі было некалькі тэлекамэраў, усе больш-менш апэратыўныя каналы лічылі мэтазгодным сказаць, што першае казаньне вялебнага Джонсана-і-Джонсана, пра якое так доўга гаварылі бальшавікі, адбылося, усё клёва, дарагія хакавяне, вы проста мусіце гэта ўбачыць, тым больш – уваход халяўны, плюс усім раздаюць бясплатныя каляндарыкі зь фізіяй вялебнага, службы будуць праходзіць кожны дзень да канца чэрвеня, пачатак а дзясятай, трынаццатай і сямнаццатай нуль-нуль, без выходных.

І вось ужо чацьверты дзень запар ён стрыжэ купоны, агалошваючы па тры казаньні ў дзень, у яго тут ужо свае фанаты, яны аддана рэагуюць на кожнае саплівае ўсхліпваньне вялебнага, перакладзенае для іх нейкай цёткай у шэрым афіцыйным касьцюме, якая працуе ў вялебнага перекладчыцай, і якая яго, здаецца, не разумее, ва ўсялякім разе перакладае яна абы-што, а самому вялебнаму, здаецца, проста западло яе карэктаваць, мабыць, адкрыцьцё божае накрывае яго з галавой, яго проста прэ падчас казаньня, на яго нават пачалі хадзіць плянавыя, яны па-свойму разумеюць старога, гэта нібы такая сусьветная салідарнасьць усіх абкілбашаных прыдуркаў, якім тым ці іншым спосабам, кожнаму па-свойму, канечне, адкрываюцца божыя таямніцы, вось іх разам і прэ, а тут яшчэ і

музыка гучыць.

Музыку граюць менавіта яны, вялебны правёў сярод іх дасканалы кастынг, выбраў у асноўным студэнтаў кансэрваторыі, толькі Малы Чак Бэры паходзіў з панкаў, яго вялебны ўзяў за пачуцьцё рытму, наагул для яго асьвета не была вызначальнаю, галоўнае, каб яны добра выглядалі на сцэне, ну, там, ніякіх габрэяў, ніякіх манголаў, ні ў якім разе каб ня чорныя, карацей, сапраўдны фашысцкі ўблюдак, але народу падабаецца.

Вялебны накручвае сябе ў грымёрцы, глытае нейкія пігулкі, п'е шмат кавы без кафэіну і ўголас рэцытуе нешта з голі бібла, прымушаючы перакладчыцу паўтараць, перакладчыца панура маўчыць, вялебнага гэта заводзіць яшчэ больш, у яго ўжо першыя прыступы божага адкрыцьця, у яго гэта як срачка, яго проста разрывае і ўсё тут. Заходзіць нехта з адміністрацыі, час, кажа, ісьці, народ ужо чакае, вялебны сёрбае зь вялікага пластыкавага кубка сваю беспантовую каву, аблівае ёю сваю беласьнежную кашулю, шыт, кажа, факін шыт, перакладчыца спрабуе перакласьці гэта чуваку з адміністрацыі, але той толькі адмахваецца. Добра, гаворыць вялебны, давядзецца зашпіліцца на ўсе гузікі, будзем, як вустрыцы, або як малюскі, як васьміногі, адным словам, усе мы пад Богам ходзім, дадае ён і выходзіць у калідор. За кулісамі, пад самаю сцэнай, вялебны на імгненьне спыняецца, яго ўвагу прыцягвае паўнаваты юнак у пясочным касьцюме, нішто сабе юнак, думае вялебны і на хвілінку прытарможвае. «Ты хто?» – пытаецца ён, і ў закулісным сутоньні на імгненьне бліскае корпус яго наручнага гадзіньніка, Какава замірае і на нейкі момант губляе мову, што ты маўчыш? нецярплівіцца вялебны, у цябе ёсьць сям'я? Какава ківае сваёй вялікай галавой, але імя не называе. Ну, добра, вялебны губляе рэшткі цярплівасьці, вялікая ласка госпада, хай яна ляжа і на такіх ебанатаў, як ты, перакладчыца хоча гэта перакласьці, але вялебны перапыняе яе – потым-потым, кажа ён і ідзе на сцэну, цяжка цягнучы над сабой жоўты непагасны німб.

Какава вырачана глядзіць на тое месца, дзе стаяў вялебны, доўга прыходзіць у прытомнасьць і на ватных нагах ідзе шукаць

прыбіральню, нарэшце знаходзіць, з апошніх сіл адчыняе дзьверы, запаўзае ўсярэдзіну і пачынае бляваць. Я даўно заўважыў – калі ён нэрвуецца, калі ў яго стрэсы ці што, ён абавязкова блюе, проста бяда нейкая, калі пачынаецца сэсія, да яго лепш увогуле не падыходзіць, такі чалавек. «Госпадзе, – думае Какава, – о, госпадзе. Няўжо гэта сапраўды я, няўжо гэта сапраўды да мяне толькі што падыходзіў гэты чалавек? Ня можа быць, я, натуральна, ведаю сабе цану, у мяне добрыя сябры, у мяне мама ў бібліятэцы працуе, мяне ў Макееўцы няблага ведаюць і ў Мелавым таксама, але каб так! Ня ведаю нават, што і падумаць», – думае ён і зноў пачынае бляваць. «Як жа гэта, – думае ён адпляваўшыся, – гэта ж каму апавяду – не павераць. Скажуць, што ты вярзеш. Блін, сам сабе ня веру – жыў як жыў, сумленна рабіў сваю справу, нікому не перашкаджаў, нікога не падстаўляў, магчыма, гэта і ёсьць падзяка госпада. Інакш як, як – проста не разумею, як так сталася, што да мяне, проста да мяне, беспасярэдне, вось так узяў і падышоў чалавек, У ЯКОГА НА РУЦЭ ЗАЛАЧОНЫ РОЛЕКС!!!»

Какава яшчэ раз нахіляецца і бачыць на падлозе, побач з ракавінай, стосік брашурак з казаньнямі прападобнага, ён пабожна бярэ адну, разглядае трошкі пажмяканы твар Джонсана-і-Джонсана, разглядае ролекс у яго на руцэ, і, усьміхнуўшыся, хавае брашуру ў кішэню свайго пясочнага пінжака.

Дарагія браты і сёстры! (Дарагія браты і сёстры! перакладае цётка ў касьцюме.) Госпад маніпуляцыямі сваіх боскіх рук сабраў тут нас з вамі! (Госпад прарабіў пэўныя маніпуляцыі – перакладае яна – з вамі.) Так падзякуем яму за тое, што мы тут сабраліся – і вы, і я! (Таму дзякуй вам, што вы тут сабраліся, і я.) Я кажу вам, браты і сёстры, устанем, устанем і прачытаем малітвы, у імя госпада, алілюя! (Алілюя, – не зусім разумее яго цётка.) Госпадзе, кажу я! (Ён кажа – «Госпадзе».) Паглядзі на гэтых людзей, якія тут сабраліся гэтым ранкам! (Зранку ўжо сабраліся.) Іх прывяла сюды твая боская любоў, ці ня так? (Іх прывяла сюды ня так любоў.) Так, Госпадзе! (Так.) Так, алілюя! (Цётка маўчыць.) Але вы можаце запытацца, чаму ты, вялебны Джонсан-і-Джонсан, гаворыш нам пра гэта, мы ведаем, усё гэта

пра нас, таму лепш пакажы цуд! (Мы ведаем пра вас усё! пагрозьліва гаворыць цётка, можаце запытацца.)

Я хачу апавесьці вам адну гісторыю, я хачу вам паказаць на канкрэтным прыкладзе, каб вы зразумелі, што я маю на ўвазе. (Я хачу вам, напрыклад, паказаць, вы разумееце, што я маю на ўвазе.) Адна дзяўчына з паўднёвага Канэктыкуту (Адна дзяўчына з поўдня) жыла ў вялікай скрусе (жыла сабе на поўдні), яна ня мела бацькоў, ня мела сяброў, ня мела ўласнага псыхоляга (яна займалася псыхалёгіяй, была псыхолягам, уласным), яна зусім страціла надзею на божае адкрыцьцё, і яе дні цягнуліся бясконцай плыняй (яна ўсё страціла і цягалася без канца). Алілюя! (Цётка маўчыць.) Аднаго разу на яе шляху трапіўся божы чалавек, пастар (у ейным жыцьці зьявіўся чалавек, мужчына) і ён сказаў ёй: сястра! (Гэта была яго сястра.) Сястра! (Яшчэ адна.) Спыніся, гэта кашмарна – ты сама зачыняеш дзьверы, празь якія мог бы ўвайсьці да цябе Ісус! (Зачыняй дзьверы, сказаў ён, да цябе можа прыйсьці кашмарны джызус.) Навошта ты гэта робіш? (Што ты для гэтага робіш?) І ён пайшоў ад яе, ён меў ужо досыць яе зьняверы. (Стары, выяўляецца, меў яе, і ён сказаў досыць. І пайшоў.) І яна засталася адна, і дні яе далей цягнуліся бясконцай плыняй. (І так яна далей цягалася, адна.) І вось аднаго разу, калі яна вярталася з пакупкамі (аднаго разу яна-такі патрапіла на шопінг) і пераходзіла вуліцу, нейкі п'яны аўтааматар ня змог як сьлед прытармазіць і зьбіў яе з ног (яна была ўжо такая п'яная, але не магла спыніцца і падала з ног, як аўтааматар), і калі яна апрытомнела ў рэанімацыі, на апэрацыйным стале (яна прачнулася на стале, ну там п'яная, брудная, у разарваным адзеньні, шалава), пад скальпэлем хірурга (на ёй ужо быў хірург), яна не змагла згадаць свайго імені (яна не магла яго нават згадаць. Ды яна ўсё забыла, яна п'яная была, алькагалічка скончаная), яна страціла памяць! Яна зусім нічога ня памятала (прапіла ўсё – і хату, і шмоткі, грошы зьняла з кніжкі – таксама прапіла, знайшла хахаля, пачалі самагон гнаць), ня памятала сваіх бацькоў, свайго тату, сваю маму (тваю маму, казалі яны, што за курва падсялілася да нас у пад'езд, нам хутка электрычнасьць адключаць празь яе апарат), яна забылася на ўсё сваё жыцьцё (усё сваё жыцьцё мы тут не разгінаемся, а гэтая прашмандоўка прыйшла на ўсё гатовае,

яшчэ і хахаля з сабой прывяла), і калі ўжо ўсе, нават дактары, страцілі надзею (мы табе, сука, пакажам будынак узорнага побыту і маральны кодэкс будаўніка камунізму. Мы табе, падла, ногі паадрываем. А хахаля твайго ў дыспансэр здамо, хай лечыцца), ёй раптам зьявілася божае адкрыцьцё (а то зусім абарзела сучка прывакзальная, з хахалем сваім, прашмандоўка, думае, што мы замест яе за электрычнасьць плаціць будзем, думае, яна тут самая разумная, дрэнь марская, і яшчэ гэты, хахаль ейны, ёбаны-сьмешны: здамо ў дыспансэр і кранты, да хулі мы тут зь імі ручкаемся – зараз паклічам участковага, абрэжам драты, і хахаля ейнага таксама абрэжам, знайшоўся тут – марак гандлёвага флёту, ёбаны-сьмешны, прыйшлі на ўсё гатовае, прашмандоўкі, блядзь), і Бог сказаў ёй (на хуй, на хуй з пляжу, дзевачка, мы ўсё сваё жыцьцё тут гарбацімся, а ты думаеш што – самая галоўная, за хахаля за свайго думаеш схавацца, за марачка? Дыспансэр па тваім марачку плача, вось што мы табе скажам, так-так – дыспансэр)... Які дыспансэр? раптам думае Джонсан-і-Джонсан, што гэтая факін-сучка перакладае? Ён робіць паўзу, падчас якой чутны плач інвалідаў, і працягвае.

Дарагія браты і сёстры! (Дарагія браты і сёстры! вяртаецца бліжэй да тэмы перакладчыца.) І вось Госпад кажа ёй: згадай усё (госпад кажа вам – згадайце і ўсё!), устань і ідзі! (і ідзіце сабе!), і яна пайшла (і пайшла яна), і яна спыталася дактароў (запытайце дактароў): хто плаціў за маё лячэньне (хто за ўсё плаціць будзе)? І яны сказалі ёй – гэта цуд, божы цуд, але нехта аплаціў тваю страхоўку (страхуйце свой цуд), і нехта перадаў табе адзеньне, рэчы, і гэта другі цуд (іншая рэч, што нехта перадаў табе цуд), і нехта зьняў для цябе жытло, ты маеш цяпер дах над галавой, і гэта трэці цуд (і гэта цуд, які ўжо трэці раз у цябе над галавой). І тады яна зразумела – вось яно, адкрыцьцё госпада, адкрыцьцё, што адкрылася ёй (і тады ў ёй адкрылася), і што гэта сам Ісус дорыць ёй прасьвятленьне, зусім невялічкае, невялічкую такую палоску сьвятла, як уначы, калі вы адкрываеце лядоўню (кашмарны джызус уночы хоча падарыць ёй лядоўню, зусім такую невялічкую). Дзеля чаго я апавядаў вам гэта, браты і сёстры? (Для чаго вам браты, сёстры?) Дзеля таго, каб вы зразумелі, што божае адкрыцьцё – гэта як марскія прадукты (цётка замучана змаўкае і пра нешта

задумваецца): галоўнае ня проста злавіць яго, галоўнае – умець яго прыгатаваць. Божае адкрыцьцё – гэта як мазгі васьміногa: ты ня ведаеш, дзе яны ў яго знаходзяцца. Таму што ты падыходзіш да васьміногa, глядзіш на яго, і ты думаеш – алілюя! – дзе ў гэтага факін васьміногa мазгі? Вось жа, калі ёсьць васьміног, то павінны быць і мазгі? Але ты ня можаш дайсьці да гэтага сваім розумам, твой розум лянівы і зьняверaны, ты ня можаш вось так проста ўзяць васьміногa і зрабіць сваю справу, ты маеш усё зьвяраць з унутраным голасам, які гаворыць табе – кінь яго, кінь, ты ня знойдзеш тут нічога, гэтая задача не для цябе. І тады ты пачынаеш сумнявацца ў сабе. Алілюя! Ты думаеш – так, я ня варты гэтага, я надта слабы і немачны, каб прайсьці гэты шлях да канца і ўва ўсім разабрацца, гэтая праца не для мяне. Я лепш адыду ўбок. Бо ты бачыш ягонае цела, яно такое самае, як тваё цела. І ты бачыш ягоныя вочы – яны такія самыя, як твае вочы, і ты слухаеш, як б'ецца яго сэрца, – хай будзе слаўны госпад – яно б'ецца так сама, як тваё! Так хто ты такі?
— Васьміног! – крычыць нехта з залі.

Які васьміног? не разумее Джонсан-і-Джонсан, чаму васьміног? ён на імгненьне разгублена замаўкае, але не губляе хвалі і зноў дае нырца ў квяцістае пурпуровае казаньніцкае гаўно: правільна, ты – дзіцё божае! Усе мы дзеці божыя! Адкрыцьцё госпада ў кожным з нас (кожнаму з вас – уключаецца цётка – на выхадзе дадуць брашурку і каляндарык з фота вялебнага), памятайма пра ўвагу ўсявышняга (дзякуй вам за ўвагу, усяго добрага, да наступных сустрэчаў на казаньнях Царквы Ісуса (аб'яднанай), сустрэча зь якім нас чакае наперадзе! (Да наступных сустрэчаў, паўтараецца цётка, не забывайце свае рэчы, дадае яна, і забярыце адсюль гэтых траханых інвалідаў.)

Ах, як я іх зрабіў, гаворыць вялебны Джонсан-і-Джонсан чуваку з адміністрацыі. Чувак глядзіць на яго закаханымі вачыма. Так, паўтарае вялебны, як я іх зрабіў. Толькі навошта я зноў пра васьміногаў вёрз, што са мной апошнім часам адбываецца? пытаецца ён у чувака, толькі прыму вітаміны, як адразу пачынаю гаварыць пра васьміногаў. Нічога не магу з сабой зрабіць, апраўдваецца ён, мяне проста прэ ад гэтых чароўных

істотаў. Ох, як мяне прэ, радасна гаворыць ён і зьнікае ў грымёрцы.

11.00

Пакуль усе гэтыя артадоксы сёмага дня яшчэ не разышліся і вялебны, размахваючы рукамі, пакідае сцэну, Какава сядзіць на лаве і намагаецца зразумець, пра што яны там гаварылі, але да яго ня надта даходзіць зьмест прамовы вялебнага, штосьці там пра электрычнасьць і пра дыспансэр, пра васьмінога, Какава нудзіцца, лепш бы дома тэлевізар паглядзеў, думае ён, але тут, у дадатак да адкрыцьцяў вялебнага, вытрымліваючы драматургію агітацыйнай работы сярод абарыгенаў, у гульню ўступае «Боскі аркестар вялебнага Джонсана-і-Джонсана», сябры Какавы, на вырашальным этапе няроўнай барацьбы дабра са злом і вялебнага Джонсана-і-Джонсана з уласным маразмам. Яны граюць блюзы, клясычныя рэчы, якія патрон выбіраў для іх асабіста, інваліды ў залі пачынаюць падтанцоўваць, бізнэсмэны расшпільваюць гузікі на сваіх салатавых пінжаках, публіка ажыўляецца, вялебны ў грымёрцы радасна выцірае пот на твары, паблісквающы ролексам, аркестар заводзіцца, яны граюць старую тэму, паступова адыходзячы ад яе, канчаткова распальваюцца і заводзяць нешта такое, чаму іх у кансэрваторыі дакладна не вучылі – «Atomic Bomb Blues», напісаны ў далёкія пасьляваенныя гады Гомэрам Гарысам, нікому тут не вядомым, нават вялебнаму Джонсану-і-Джонсану не вядомым, яго божае адкрыцьцё не залазіць на такія паўзьмежныя тэрыторыі, адкуль яму ведаць пра Гомэра Гарыса, васьміногу ёбанаму. Вось гэта Какаву падабаецца значна больш, чым казаньне вялебнага, яму тут усё зразумела, ён таксама пачынае падтанцоўваць за сцэнай і раптам чуе, як нехта проста выграбае з аркестру, валіць упоперак партытуры, Какава адразу ж пазнае гітару Малога Чака Бэры, які, відавочна, таксама злавіў сваё адкрыцьцё, і нібы гаварыў, зьвяртаючыся да натоўпу інвалідаў –

божа, калі ты мяне чуеш за крыкамі гэтай скаціны Джонсана-і-Джонсана, калі ты наагул яшчэ не абламаўся браць ва ўсім гэтым удзел, дай мне хоць бы шанец, усяго некалькі фразаў, і

ўсё, я хутка ўсё табе патлумачу, галоўнае, зьвярні на мяне ўвагу, я ўсё ж такі ў боскім аркестры граю, хай я нават суцэльнае гаўно ў тваіх вачах і табе сорамна за мяне, за ўсё, што я, так бы мовіць, раблю, але не адварочвайся яшчэ хаця б некалькі сэкундаў, мне херова, божа, як мне херова, хто б ведаў, і граю я херова, але ўсё адно – пашлі мне хоць які пробліск, калі я зразумела тлумачу, разбаўтай гэты смутак у маіх лёгкіх, у маім сэрцы і страўніку, усё гаўно, умоўна кажучы, чуеш, я прашу ўсяго толькі прасьвятленьня, мне толькі дзевятнаццаць, магчыма, я мала чакаў, але ж я гавару толькі пра палоску сьвятла, невялічкую такую, як уночы, калі адчыняеш лядоўню, ну, ты ведаеш, пра што я, каб можна было выдыхнуць усё тое, што ўдыхнуў у сябе за ўсе гэтыя дзевятнаццаць гадоў, хоць бы якую радасьць, божа, якуюсьці мінімальную, так, каб спэцыяльна не замарочвацца, проста як-небудзь, пры нагодзе, паслухай мяне, хоць нешта, хоць трошкі, ну хоць нешта, хоць якогасьці прасьвятленьня, чуеш, божа, добра? добра? ну і красоўкі, божа, красоўкі, пару красовак, ты чуеш?! ты чуеш мяне?!! ты, чуеш ты, чуеш наагул, пра што я тут гавару?!!! а??!!!!! а?!! ааааааа!!!!!!!!!!!!!!!!!!! ааааааааааааааааааааааааааааааааа!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!!

Аркестар падхоплівае гэтую хімэрную тэму, усе раптам прахбвалі, які клёвы чувак, гэты Малы Чак Бэры, як ён усё зьвязаў прыкольна, таму кожны намагаецца нічога не сапсаваць, Какаву даўно так не ўстаўляла, ён проста ўпаў на лаву, сядзеў забіты і слухаў, слухаў, а яны ўсё валілі і валілі, і нават калі інваліды пачалі распаўзацца, і бізнэсмэны разбраліся па тачках, і прыбіральніцы рушылі зьбіраць паміж радамі пустыя пляшкі з-пад вадзяры і пакамечаныя каляндарыкі з амэрыканскім яблом вялебнага – яны і далей ніяк не маглі спыніцца. І як яны гралі! Як багі! То бок амаль не лажалі.

УСТУП № 3

00.00

Мае сябры хочуць, каб зь імі лічыліся. Яны раўніва ставяцца да таго, як зь імі размаўляюць і пра што, як на іх пры гэтым глядзяць, намагаюцца зразумець, што пра іх думаюць калі гавораць, увесь час скандаляць, зь імі цяжка мець зносіны, яны нэрвуюцца ў кампаніях, калі гэта ня іхная кампанія, іх час ад часу аднекуль выкідаюць, калі б нехта зь іх ляцеў на самалёце, яго б і з самалёта выкінулі, гэта ўжо дакладна. Я сам да такіх рэчаў раней нармальна ставіўся, але апошнім часам таксама пачынаю замарочвацца: не люблю, скажам, калі нехта забывае маё імя, вось, скажам, мы гаворым-гаворым, і раптам выяўляецца, што ніхто ня ведае, як мяне завуць, навокал столькі прыдуркаў круціцца; або не трываю, калі ў кагосьці на твары розная хуйня, ну, я маю на ўвазе не якіхсьці там цыклёпаў аднавокіх, вядома, проста калі ў некага твар парэзаны пасьля галеньня, або кроў на губах, або іншыя рэчы – не люблю, па-мойму, гэта непавага – хадзіць з такой брыдотай на твары, ня ўмееш галіцца – сядзі дома, лупіся ў тэлевізар або займіся чым-небудзь карысным, не – абавязкова расхуячыць сабе пысу якім-небудзь станком, перастрэне цябе на вуліцы і давай грузіць нікому не патрэбнымі рэчамі, ня памятаючы да таго ж, як цябе завуць. Або не люблю касмэтыкі, жахлівая рэч – касмэтыка, агрэсіўная і дрэнна пахне, парфуму цярпець не магу, піць яшчэ хай сабе, але так – не разумею, розныя бранзалеткі, завушніцы, значкі – ва ўсім гэтым ёсьць непавага, ва ўсялякім разе мне так здаецца. Раней я спакойна ставіўся да такіх рэчаў, наагул – раней я шмат рэчаў проста не заўважаў, жыцьцё – такая прыкольная штука: чым далей заплываеш у яе акваторыю, тым больш гаўна плавае наўкола цябе, плавае і ня тоне, але зь іншага боку – так і цікавей.

Сяброў у мяне досыць шмат, гэта нават не кампанія, хутчэй такі дружны калектыў сымулянтаў, што кідаюць усіх вэрбавальнікаў і працадаўцаў, мы жывём у некалькіх суседніх пакоях на адным паверсе, сьпім упокат, я нават ня ўсіх ведаю, сапраўдны сябар тут адзін – Вася Камуніст, іншыя – публіка больш-менш выпадковая, хоць яны таксама нашыя сябры, яны то зьяўляюцца, то зьнікаюць, час ад часу іх набіваецца на нашым паверсе больш за дзесяць, іншым разам я сам па некалькі дзён блукаю па калідорах, вылязаю на дах і гляджу навокал. Нам усім па васямнаццаць-дзевятнаццаць,

пераважную большасьць маіх сяброў павыганялі ўжо з навучаньня, яны цяпер або беспрацоўныя, або займаюцца нікому не патрэбнымі рэчамі, напрыклад Сабака Паўлаў – я ніколі ня мог зразумець, чым ён напраўду займаецца. Бацькі ў Сабакі Паўлава – габрэі, але на сябе ён гэта не пераносіць, гаворыць, што бацькі – гэта бацькі, а ён – гэта ён, і больш за тое, Сабака Паўлаў гаворыць, што ён прбвы. Адпаведна, з бацькамі ён не жыве, гаворыць, што ня можа жыць з жыдамі, тусуецца па знаёмых, часам завісае ў нас на тыдзень-другі, яшчэ ў яго ёсьць бабуля, відаць, не габрэйка, бо ў яе ён таксама іншым разам спыняецца. Час ад часу ён цягае ў бабулі з сэрвантаў розную антыкварную парцаляну і прадае яе на барахолцы, на атрыманыя грошы накупляе ў аптэчных кіёсках каля рынку розных пігулак і ідзе да нас. Тады мы наагул не выходзім з пакою некалькі дзён, хіба што адліць ці парыгаць, але парыгаць можна і ў пакоі. Адліць, у прынцыпе, таксама. Я люблю Сабаку Паўлава, нават нягледзячы на ягоны антысэмітызм, мне-то што.

Сабака ідэйна не працуе, лічыць западло, гаворыць: «Мне западло працаваць на іх», ён наагул лічыць, што ў нашай рэспубліцы адбыўся пераварот і да ўлады прыйшлі габрэі, жыды, кажа ён, паўсюль жыды; я, у прынцыпе, лічу, што ён дарэмна так гаворыць, але працаваць таксама не хачу. Ня так даўно, праўда, нашы сябры – рэклямнікі Вова і Валодзя – уладкавалі Сабаку да сябе ў газэту, у аддзел рэклямы, кур'ерам, Сабака доўга вагаўся, прыходзіў да нас на паверх, блукаў па кухні, называў Вову і Валодзю жыдамі і вагаўся. Нарэшце адважыўся і пайшоў працаваць. Прапрацаваў дзён дзесяць. Некалькі дзён таму зьнік разам зь нейкай карэспандэнцыяй, Вова і Валодзя прыяжджалі да нас, але мы нічога ня ведалі, тэлефанавалі бацькам, тыя таксама ня чулі пра свайго сына-Сабаку паўтара году, здаецца, гэта іх задавальняла, нават да бабулі паехалі, бабуля іх не пусьціла, глядзела праз напаўадчыненыя дзьверы і не разумела, што ад яе хочуць, здаецца, Сабака да рэшты замардаваў старую, паспрабуйце, пажывіце з унукам, які на сьняданак спажывае спачатку вадзяру, а потым ужо ўсё іншае. Адным словам, Сабака зьнік і нашы сябры-рэклямнікі пагражалі зрабіць зь ім штосьці страшнае ў тым разе, калі ён знойдзецца: «Так і

перадайце Сабаку, – казалі яны нам, – яйцы адарвём». Я сумняваўся, што такім спосабам можна было заманіць Сабаку назад у рэдакцыю, але абяцаў перадаць. Мне ня цяжка. Вову і Валодзю мы недалюблівалі, але трывалі, яны вучыліся на гістарычным і, як большасьць выдатнікаў з гістарычнага, супрацоўнічалі з кгб; кгб, я думаю, моцна пацярпела ад прысутнасьці ў сваіх шэрагах двух даўнаў – Вовы і Валодзі, але парадак ёсьць парадак, я так думаю, інакш для чаго б іх трымалі ў штаце. Вова і Валодзя, вядома, па пратэкцыі кгб, ужо на першым курсе ўладкаваліся ў рэклямны аддзел адной зь першых харкаўскіх незалежных газэтаў, газэта іхная працавала ад нейкага фонду дэмакратычнага разьвіцьця, рэдактар – підар-праныра – выбіў з амэрыкосаў салідны грант, і яны запусьцілі ў сьвет сваю незалежную газэту, аднымі зь першых пачалі друкаваць на вокладцы голых цётак, а ўсярэдзіне – шырокія праграмы тэлеперадачаў. Акрамя гэтага, пастаянна гналі на савок, можна сказаць, што за грошы амэрыкосаў палівалі гаўном нашу савецкую бацькаўшчыну, нашу маладосьць, можна сказаць, я не любіў гэтую газэту, хаця цёткі на вокладцы мне падабаліся. Вова і Валодзя працавалі, як я ўжо сказаў, у рэклямным аддзеле, ня ведаю, як яны там працавалі, напэўна, дрэнна, бо традыцыйна раз ці двойчы на тыдзень яны заяжджалі да нас, напіваліся вадзяры і біліся між сабой. Наагул яны сябравалі, а як напіваліся, выходзілі незаўважна ў калідор і пачыналі мачыць адно аднаго, прычым па-сапраўднаму, бяз дурняў, з выбітымі зубамі, з саплямі і сьлязамі на фэйсах. Так што якія зь іх маглі быць кадэбісты – ня ведаю. Мы іх спачатку разводзілі, а потым глядзім – ну, хулі, б'юцца пацаны і няхай сабе. Можа, у іх, у гісторыкаў, так прынята, можа, ім кгб за гэта даплачвае, чаго лезьці.

Яшчэ з намі на паверсе жыве Ваха. Ваха – грузін, хоць Сабака яго таксама называе жыдом. У Вахі свой бізнэс: каля кальцавой, на самым выезьдзе з гораду, зусім блізка ад нас, у яго стаіць некалькі кіёскаў, у якіх працуе некалькі наложнікаў. Наложнікі жывуць у адным з кіёскаў, зьбіраюцца там на ноч, узімку распальваюць вогнішча, аднаго разу ледзь не спалілі кіёск, добра, што ён быў жалезны, проста паапякаліся, але выжылі. Ваха мае цэлыя два пакоі – у адным ён жыве, а ў другім трымае кантрабанду, розныя там чакалядкі, колу, гераін

і чупа-чупсы. Мянтуры ён плаціць, вахтарам таксама, нас не чапае, так што Ваха – пазытыўны герой, дакладна пазытыўны, інакш ня скажаш. Нам ён прадае непалёную вадзяру, хоць і ня робіць зьніжак. Сабакі Ваха баіцца, і калі той прыходзіць да нас, зачыняецца ў адным са сваіх пакояў, я сабе ўяўляю, як ён у гэты час пералічвае пацёртыя банкноты і заглытвае залатыя манэты, каб габрэй-антысэміт Сабака Паўлаў не адабраў у яго чаго-небудзь.

Далей па калідоры, недзе ў ягоных нетрах, жыве Какава – данбаскі інтэлігент. То бок яго мама працуе ў бібліятэцы на нейкай шахце. Какава тоўсты, і мы яго ня любім, ён, наадварот, цягнецца да нас, ну, у яго і выйсьця, па вялікім рахунку, іншага няма, хто стане вадзіцца з данбаскім інтэлігентам. Хаця ў яго ёсьць яшчэ нейкія знаёмыя ў горадзе, акрамя нас, нейкія музыканты, вядома ж, такія самыя піжоны, як і Какава, калі ён зь імі сустракаецца, то прыпаўзае дадому на рагах, накачаны партвэйнамі, і завальваецца спаць. У Какавы ёсьць пясочны касьцюм, у якім ён падобны да сапраўднага мудака, ён яго амаль ніколі не здымае, ледзь ня ў душ у ім ходзіць, калі накачваецца партвэйнамі і прыпаўзае дадому, завальваецца ў ложак проста ў гэтым касьцюме, шматфункцыянальная штука выходзіць – касьцюм данбаскага інтэлігента. Прачнуўшыся, Какава выходзіць на кухню і назірае, хто там што сабе гатуе, нюхае паўфабрыкаты і размаўляе на ўсялякія адцягненыя тэмы – неапахмелены, тоўсты, у камечаным піжонскім касьцюме.

Яшчэ ўвесь час недзе побач жыве Марак – адбіты чувак з парваным правым вухам, кажа, што вуха яму пракусіў сабака, Паўлаў? – перапытвае абавязкова хто-небудзь, такі нібы жарт, Марак нейкі богабаязны ці проста тармазнуты, нават ня ведаю, як патлумачыць, ён, скажам, мыецца толькі ўночы, гаворыць, што ня хоча, каб яму перашкаджалі, перашкаджалі што? пытаюся я ўвесь час, Марак чырванее, але працягвае мыцца толькі ўночы, такі вось чувак.

Зь іншых сяброў можна згадаць хіба што Карбюратара, так, Сашу Карбюратара, таксама майго добрага прыяцеля, Саша прыехаў аднекуль з памежжа, хоць яно тут паўсюль, гэтае памежжа, Саша, уласна, прыехаў насуперак бацькоўскай волі,

выяўляецца, і такое бывае, у яго дома засталіся мама і айчым, Саша скончыў курсы кіроўцаў, мае сапраўднае пасьведчаньне кіроўцы і хоча з часам адкрыць якую-небудзь кантору па перавозцы грузаў, ну, там купіць сабе катафалк і вазіць, скажам, мэблю, ён наагул з жарсьцю ставіцца да тэхнікі, калі вы разумееце, пра што я. Аднаго разу ён нават купіў сабе падручнікі са схемамі й апісаньнямі аўтамабіляў і спрабаваў ва ўсім гэтым разабрацца. Пачаў ён, як ня цяжка здагацца, з карбюратараў. Пасьля гэтага падручнікі зьніклі, я сабе так разумею, што іх проста нехта прапіў, чаго дабру прападаць. Наагул, Карбюратар мае такую здольнасьць – трапляць у гаўно, не для яго падрыхтаванае.

Ну, усіх астатніх я і сам ужо ня надта добра ведаю, зьяўляюцца розныя героі коміксаў час ад часу, але прасачыць, хто яны і для чаго зьяўляюцца ў нашым жыцьці, вельмі цяжка, так – прыходзіць які-небудзь, умоўна кажучы, Іваноўскі – хімэрны тып, калі не сказаць ёбнуты, і, уласна, гэта ўсё, што пра яго можна сказаць. Фактычна ўсё.

Добрая, ад веку галодная, кампанія, якую незразумела што трымае разам, бо ў прынцыпе, усе адно аднаго недалюбліваюць, ну, але гэта яшчэ не прычына, каб ігнараваць здаровыя стасункі. Рабіць нам, па вялікім рахунку, няма чаго, хоць у кожнага сваё стаўленьне да рэчаіснасьці, у нашым веку яно зводзіцца да нейкіх простых прымхаў і жаданьняў – там, патрахацца, я нават ня ведаю што яшчэ. Жанчыны нас ігнаруюць, нават прасталыткі з кальцавой, мы час ад часу ходзім паглядзець на прасталытак, так, нібыта экскурсіі, бясплатныя атракцыёны, грошай у нас, вядома, няма, таму мы проста зь імі тусуемся, клянчым цыгарэты, апавядаем розныя гісторыі з жыцьця, перашкаджаючы ім, адным словам, зарабляць цяжкі хлеб прасталыткі. Але яны да нас ставяцца няблага, там, на кальцавой, яны не асабліва каму і патрэбныя, таксама, як мы, і ім, і нам не хапае бабак і любові грамадзтва, і яны, і мы перажываем гэтае мокрае дажджлівае лета ў пустым харкаўскім прыгарадзе, зарослым травой і залепленым рэклямай, фантастычнае месца, фантастычныя прасталыткі, фантастычнае жыцьцё. Гомасэксуалізмам мы не займаемся, але ўсё да гэтага ідзе.

7.00

Галоўнае, што яны ўсё правільна падлічылі, у такіх выпадках нешта недзе не дадумаеш – абавязкова пападзеш, тут усё ня так проста, калі пачынаеш рабіць свой бізнэс, нешта там прадаваць, найперш падумай, няхай ты нават бяспройгрышнымі, на першы погляд, фішкамі займаесься, усё адно лепш перастрахуйся. Адна рэч, калі маеш справу, скажам, з акцыямі або зь пераразьлікамі, ну, карацей, калі бабкі табе ў рукі не трапляюць, тут яшчэ за цябе нехта можа ўсё падлічыць, ты толькі і маеш выконваць, што там ад цябе патрабуецца, і не займацца расьпізьдзяйствам на рабочым месцы. Іншая рэч, калі ты працуеш з жывымі бабкамі, з чорным, бля, налам, і за табой не стаіць кантора, калі апынаесься сам-насам, безь ніводнага пасярэдніка, з жывой грашовай масай, вось тады лепш падумаць, інакш дзе-небудзь абавязкова ўляціш, гэта ўжо без варыянтаў. Колькі разоў даводзілася бачыць, як цалкам нармальныя людзі хапаліся за адпачатку лажовыя рэчы, адпаведна – гарэлі разам з рэшткамі фінансавага дабрабыту і павагі супольнасьці, бізнэс сярэдняй рукі – жахлівая штука, адзін толькі няправільны крок, і ўжо маеш паяльнік у дупе, такое вось першаснае нарошчваньне капіталу ва ўмовах посттаталітарнага грамадзтва.

Яны і мне спачатку прапаноўвалі ўвайсьці ў долю, але я чамусьці адмовіўся, ня ведаю, нешта мяне насьцярожыла, нават ня ведаю, што – зьнешне ўсё выглядала сур'ёзна, мой сябра Вася Камуніст, добры хлопец, рэдкай душы пахуіст, у нейкі момант заламаўся жыць на гарэлцы з гарбатай з пастаяннымі перабоямі і ўсё падлічыў, выходзіла нібы зграбна: яны скідваюцца на чацьвярох, едуць у Расею, купляюць там на ўсе бабкі дзьве скрыні вадзяры, калі купіць у нас даляры і памяняць іх у Расеі, яны акурат выйгравалі на курсе, тым больш, калі бярэш оптам, ну, дзьве скрыні – гэта ня опт, але каго гэта хвалюе. У Расею і назад яны дабіраюцца электрычкамі, на квітках эканомяць, у дарозе харчуюцца ўсё той жа вадзярай, прывозяць яе назад і сплаўляюць на вакзале за падвойны кошт, потым зноў едуць у Расею і купляюць чатыры скрыні вадзяры, такім жа чынам прывозяць яе назад і

так сама сплаўляюць, гэта возьме трохі часу, але за пару начэй на Паўднёвым вакзале гораду Харкава можна прадаць што заўгодна, нават душу, калі яна ў цябе ёсьць, пасьля гэтага пачыналася найцікавейшае: яны едуць яшчэ раз, апошні, і на ўсе бабкі купляюць восем скрыняў вадзяры, перавозіць яе трохі рызыкоўна, але паспрабаваць можна, у выпадку чаго адкупіцца ад мытнікаў можна будзе той жа вадзярай, хоць і шкада.

І вось, – казалі яны мне, – у нас выходзіць па дзьве скрыні вадзяры на рыла, уяўляеш? Ну, – кажу, – і што? І мы, – гаварылі яны з прыдыхам, – іх прабухваем!!! Што, усе восем скрыняў? Так! Не агораем, – кажу. Хуй, – кажа Вася Камуніст, – дні за тры агораем, дакладна агораем. Я ўявіў сабе гэтыя тры дні і адмовіўся.

Вася сапраўды ўмее такія рэчы сур'ёзна правярнуць, я яго разумею, у прынцыпе, што яму губляць? – гэта ягоны шанец хаця б некалькі дзён ня мець перабояў з харчовым кошыкам, які, у ягоным выпадку, складаецца амаль выключна зь лікёра-гарэлкавай прадукцыі, уласна, гарэлкавай, прычым тут лікёры. Ён набірае скаўтаў, падгаворвае Марака, Марак пагаджаецца досыць хутка – чаго б і не паехаць, кажа, у горадзе яму рабіць няма чаго, ім нават міліцыя не цікавіцца, таму што жыве Марак без прапіскі, як і належыць сапраўднаму марскому воўку, уночы хаваецца ў дэшы, удзень адсыпаецца, пра яго існаваньне наагул мала хто ведае, майскі дэмбель, адным словам, яшчэ да іх прыстаюць два нейкія чувакі невядомага сацыяльнага паходжаньня й адміністратыўнага падпарадкаваньня, Вася ўсю ноч зь серады на чацьвер праводзіць сярод іх агітацыйную работу, кажа, што ў Расеі цяпер можна амаль за нішто скупіць ледзь ня ўсё, хоць танкі церазь мяжу пераганяй, але танкаў яны ня хочуць, яны хочуць вадзяры, таму плян усім падабаецца, я б таксама пагадзіўся, я ўжо казаў, ды ня склалася. І вось на раніцу яны-такі зрываюцца ехаць за сваімі прымроенымі сінімі птушкамі дэмпінгавага алькаголю, скідваюцца, у каго колькі ёсьць, але ў іх не хапае нават на марозіва.

Трэба нешта прадаваць. Нехта з кампаніі прыцягвае фотаапарат, вось, кажа, фотаапарат, а не шкада? пытаюць яго, не, усё нармальна, кажа ён, усё адно фатаграфаваць няма каго,

сапраўды, пагаджаюцца ўсе, што тут фатаграфаваць, сам Вася дастае аднекуль заныканы бінокль, я, напрыклад, ня ведаў, што ў яго ёсьць бінокль, хоць мы і сябры, такая вось штука. Ну, і застаецца цяпер камусьці ўсё гэтае непатрэбства прадаць. У прынцыпе, – думае Вася, – прадаць можна было б Мараку, ён лох, ён бы купіў. Але Марак у долі. Можна прадаць Какаву, Какава таксама лох, і ён ня ў долі. Але Какава ня толькі ня ў долі – ён наагул зьнік, яго ўжо некалькі дзён ніхто ня бачыў. І тут нехта згадвае пра Ваху, правільна, – кажа Вася, – Ваха – грузін, грузіны любяць оптыку, праўда? – недаверліва перапытвае нехта з кампаніі, ну, канечне, – кажа Вася, – канечне: усе грузіны любяць оптыку, і яны ідуць да Вахі і знаходзяць яго ў адным зь ягоных кіёскаў, кажуць, тыпу, Ваха, оптыку возьмеш?

Але Ваха гэтым прахалодным чэрвеньскім ранкам не зусім сябруе з галавой, ён па вушы завяз ва ўласным канабісе, які ён зь вечара паліць ва ўласным, зноў жа, кіёску разам з наложнікамі, таму ў Вахі пачынаюцца жахі, якую оптыку, камандзір? – пытаецца ён. – Чаму оптыку? Вася дастае з пакета стары бінокль без матузкоў і амаль не ўжываны апарат «ФЕД 5» у рыпучым скураным футляры, вось, кажа Ваху, бяры, не пашкадуеш, тавар харошы. Але Ваха перапужаны і з кіёску не выходзіць, сядзіць там разам з наложнікамі і глядзіць на Васю скрозь цесную амбразуру, але Вася яму ўсьміхаецца па-сяброўску і астатнія скаўты таксама ўсьміхаюцца, хоць і трохі напружана, і Ваха раптам думае – бля, думае ён, бля, што я раблю, чаму я тут сяджу, якая цяпер гадзіна, што гэта за мудакі стаяць перада мной, і галоўнае – чаму яны зь біноклем?!! Але нейкія галасы яму нешта нашэптваюць, і ён-такі выпаўзае вонкі і бярэ ў свае неслухмяныя рукі аптычную прыладу, яго адводзяць трошкі ўбок, каб ён меў на што паглядзець, на дварэ пуста, паветра наўкола кіёскаў пахне канабісам і дажджом, Ваха глядзіць у бінокль і са сьвятым трапятаньнем разглядае запоўненыя ціхія аўтастаянкі, канцавую трыццаць восьмага, некалькіх прасталытак на перакрыжаваньні, і далей па коле – недароблены дзевяціпавярховік, што выпаўзае аднекуль з балота, і так павярнуўшыся вакол уласнае восі, ён раптам натыкаецца ўзброеным вокам на ўласны, зноў жа, кіёск, і перад яго затуманенымі вачыма раптам выразна паўстае надпіс «ЧП

ВАХА», ні хуя сабе, думае ён, гэта ж я, і тут яго прэ канчаткова...

Прадаўшы оптыку й атрымаўшы на рукі неблагую, як на іхныя сьціплыя скаўцкія патрэбы, суму, сябры тут жа, над целам напаўпрытомнага Вахі, купляюць у ягоных наложнікаў два літровыя «Кайзэры» і проста так ідуць на вакзал, каб сесьці на першую ранішнюю электрычку да гораду Белгараду, яны трохі ўзбуджаныя і шумныя, сярод пахучага летняга ранку, пад сьвежымі нябёсамі, адчайдушныя шукальнікі радасьці і прыгодаў, збоку яны сапраўды падобныя да турыстаў, ці лепш нават да багамольцаў, што едуць сабе на багамольле ў горад рускай славы Белгарад і не бяруць з сабой нічога лішняга, акрамя двух «Кайзэраў» і студэнцкіх квіткоў, а з улікам таго, што да Белгарада «Кайзэраў» яны вып'юць, то і наагул нічога лішняга, сапраўдныя табе багамольцы.

11.00

У Белгарадзе яны вырашаюць спачатку паглядзець горад, усё-ткі цікава, як тут людзі жывуць, потым узяць тое, што ім належыць, і вячэрняй электрычкай вярнуцца назад, часу ў іх дастаткова, сьпяшацца няма куды, таму яны выходзяць праз зарыганы вакзал гораду рускай славы, і ім адразу трапляецца крама зь вялікай колькасьцю алькаголю ўсярэдзіне. Нехуй у гэтым Белгарадзе глядзець, – кажа Вася і заходзіць усярэдзіну. Яму ніхто не пярэчыць.

«Што вам, сыночкі?» – пытаецца прадавачка. «Мамаша, мамаша, – гаворыць Вася Камуніст, – нам водачкі». «Колькі?» – пытаецца прадаўніца. «Дзьве», – гаворыць Вася. «Пляшкі?» – дзелавіта пытаецца яна. «Скрыні», – кажа Вася. «А вам, сыночкі, па шаснаццаць гадкоў ужо ёсьць?» – кампанія дружна дастае студэнцкія пасьведчаньні зь дзяржаўнай сымболікай сваёй рэспублікі. Пасьля чаго крэпасьць здаецца, і вадзяру ім прадаюць.

«Добра было б яе трахнуць», – кажа Марак ужо на вакзале. «Чувак, – нэрвова адказвае Вася, – ты тут бізнэсам займаесься ці блядзтвам?» Рытарычнае пытаньне ў правінцыі.

14.00

На зваротным шляху іх пабіў патруль. Увогуле, яны самі вінаватыя, разьняволіліся, маючы ў руках такое дабро, расслабіліся і закурылі проста ў вагоне, а паколькі вагон быў амаль пусты, то патруль нават ня меў выбару, моўчкі падышоў і надаваў дручкамі па сьпінах. Скаўты маўчалі і, каб ня выказаць болю і роспачы, думалі пра нешта добрае, а паколькі яно – гэтае добрае – знаходзілася зусім побач, пад лавай, то і думалася ім лёгка, і экзэкуцыю яны перанесьлі годна. Хоць патруль, вядома, разьлічваў на нейкае ўзброенае супраціўленьне, яны ўжо некалькі гадзінаў тут катаюцца туды-сюды, іх па-свойму можна зразумець, катаесься тут у занюханай электрычцы ўздоўж дзяржаўнай мяжы і нават пабіцца няма з кім – навокал адны спэкулянткі, з кім тут біцца, яны і скаўтаў білі хутчэй па інэрцыі, так – каб форму ня страціць, хоць лягчэй ад гэтага нікому не было.

«Підарасы, – кажа Вася, калі патруль зьнікае, – лепш ішлі б на завод, у цэх». «Правільна, – кажа Марак, – у ліцейны цэх». Усе пагаджаюцца – правільна, у ліцейны цэх, у ліцейны цэх, ліцейны цэх – гэта крута.

18.00

На вакзале, ужо ў Харкаве, яны знаходзяць гуцулаў, што другі месяц прабіваюцца аднекуль з-пад Кастрамы, з заробкаў, і сядзяць некалькі дзён на харкаўскім вакзале, бабкі прасадзілі, так што цяпер ня ведаюць, куды ім лепш паехаць – назад пад Кастраму, яшчэ бабак зарабіць, ці ўсё-ткі дадому, паколькі не сэзон, яны вырашаюць ехаць дадому, дастаюць з абшчаку рэшткі бабак і купляюць у скаўтаў адну са скрыняў вадзяры, вадзяра ў скаўтаў таньнейшая, чым паўсюль на вакзале, таму гуцулы бяруць адразу скрыню, хто яго ведае, як яно далей складзецца, лепш гэтым не рызыкаваць.

У Васі з кампаніяй раптам зьяўляецца плойма грошай. Двое безыменных чувакоў адразу намагаюцца ўсё падзяліць, але Вася кажа ім – хуй, робім як дамовіліся, чувакі настойваюць,

Марак у гэтай сытуацыі шчыра ня ведае, як паводзіцца, у ягоным жыцьці пры ім яшчэ ніхто бабак не дзяліў, таму чувакі вырашаюць, што ён таксама за Васю і проста набіць ім рыла не адважваюцца, добра, кажуць яны, тады ганіце нам вадзяру, – хуй вам, – Вася прытрымліваецца нейкіх сваіх камуністычных прынцыпаў і дзяліцца ня хоча, тады чувакі нахабам лезуць у торбу, адкуль бяруць па фляконе ў руку, то бок, колькі гэта выходзіць, – чатыры фляконы, і валяць адтуль, фотаапарат вернеце, – кажуць яны на разьвітаньне і зьнікаюць у падземным пераходзе. «Чаго гэта яны?» – пытаецца Марак, яму сытуацыя не падабаецца, такая прыкольная кампанія была, вадзяру пілі, пра жыцьцё гаварылі, ніхто яго – Марака – не абражаў, і раптам на табе. «Бачыш, – кажа Вася Камуніст, – як грошы людзей псуюць». «Мяне не псуюць», – гаворыць Марак. «У цябе іх няма», – адказвае Вася Камуніст і ідзе далей прадаваць вадзяру.

Але гандаль неяк затарможваецца, плятформы пустыя, усе, хто хацеў паехаць, напэўна, паехалі ўжо, Вася не прыдумвае нічога лепшага, як зноў пайсьці да гуцулаў, а гуцулы ўжо п'яныя настолькі, што згаджаюцца зноў узяць вадзяру, добра, кажуць яны, і бяруць у Васі яшчэ некалькі фляконаў, пасьля гэтага Вася спрытна ўцюхвае пляшку нейкай бабулі, якая безнадзейна чакае чагосьці, каля яе таўчэцца ўнук гадоў сямі, уласна, унук і радзіць бабулі ўзяць флякон, бяры, кажа, у дарозе прыдасца, бабуля сварыцца на яго, але да парады прыслухоўваецца і флякон бярэ, таму ў Васі застаеца зусім няшмат.

З суседняй плятформы за імі ўжо пэўны час сочаць трое сур'ёзных чувакоў у адыдасаўскіх касьцюмах, яны падыходзяць да Васі з Мараком, заціскаюць іх у коле, і кажуць: «Хто вы такія?»

Вася пачынае тлумачыць. Чувакі слухаюць, потым ім гэта, здаецца, надакучвае, і яны гавораць, ведаеце, гэта мы спыталіся, як кажуць, зь ветлівасьці, насамрэч нам усё адно, хто вы і адкуль, і колькі вас тут, мы вам вось што хацелі сказаць: калі мы вас тут яшчэ раз убачым – мы вас закапаем недзе між першай і другой плятформамі, так, каб штовечар над вашымі магіламі трывожна гудзеў кіеўскі фірмовы, але пакуль

што мы гэтага рабіць ня будзем (пасьля гэтага перапужаны Вася трошкі супакойваецца, перапужаны Марак – не), тут наагул мы гандлюем усім алькаголем, гэта, калі можна так сказаць, наша зямля, і вы нам тут не патрэбныя (і Вася, і Марак раптам востра гэта адчуваюць), і мы вось тут з вамі пагаварылі, бачым, што вы напраўду не канкурэнты, здаецца, вы проста дэбілы (абодва ў думках з гэтым пагаджаюцца), таму на першы раз мы вас чапаць ня будзем, але ў якасьці кампэнсацыі («Вой», – думае Марак. Вася напалохана маўчыць) мы возьмем у вас вадзяру. Але ня ўсю, вось такія мы высакародныя разбойнікі, каб вы ведалі. Яны залязаюць у торбу і бяруць адтуль па фляконе, і, кажуць, яшчэ адно – мы б вас увогуле не чапалі, але вы вадзяру вельмі танна прадаяце, зьбіваеце цану, ясна, дэбілы?

Вася і Марак забягаюць у падземны пераход і там пераводзяць дых. «Підарасы, – Вася бярэцца за старое, – іх бы ў цэх». Але Марака ідэя ўжо не прыколвае, пайшлі дадому, пачынае ён, хуй, кажа Вася, яшчэ пяць фляконаў засталося, прадамо і паедзем, заб'юць, кажа Марак, ай, перастань, кажа Вася, чаго ты баісься, зараз хутка ўсё сплавім, купім хаўкі і дадому, давай, ня бойся, не, гаворыць Марак, не хачу, баюся. Добра, не вытрымлівае Вася Камуніст, хрэн з табой. Вось табе за работу, давай, валі: ён дастае дзьве пляшкі і дае іх Мараку. Марак вагаецца толькі нейкае імгненьне, значыць так, думае ён, зранку ў мяне не было нічога. Цяпер у мяне дзьве пляшкі. Відавочна, што я ў плюсах, вырашае ён і забірае сумленна зароблену вадзяру. Усё, давай, кажа Вася, дома ўбачымся. «Та-ак, сапраўды дэбіл», – думае ён, гледзячы ў сьпіну кампаньёну, чыя стомленая ваенна-марская туша зьнікае ў цемры пераходу. На вуліцы таксама цямнее, зьяўляюцца зоры, і птушкі хаваюцца ад дажджу ў памяшканьні вакзалу. «Калі зараз паехаць дахаты, – думае Марак, – можна зачыніцца ў дэшы і да ранку ўсё выпіць». Так ён і робіць.

21.00

Ён бярэ ўсё, што ў яго засталося, і ідзе па вячэрнім пэроне, хочаш ня хочаш, мусіш рызыкаваць, калі табе дзевятнаццаць і галава забітая голымі цёткамі з газэтных вокладак, рэклямай і

прапагандай – чаго табе баяцца на трэцяй плятформе Паўднёвага вакзалу гораду Харкава. У 21.00 падыходзіць транзытны на Баку, праваднікі-бакінцы – людзі салідныя, з бабкамі, можна рызыкнуць. Вася падыходзіць да першага вагона, яго пасылаюць, потым да наступнага, на трэці раз тоўсты бакінскі камісар спыняе яго: «Водка нэ травлэна?» – пытае. «Нармальна водка, нармальна», – кажа Вася. «Добра, давай, пашлі ў вагон». «Навошта ў вагон?» – Вася насьцярожваецца. «Нэ бойся, нэ бойся, – кажа камісар, – я проста праверу – палёная ў цябе водка ці не, калі ўсё нармальна – вазьму ўсю адразу». Яны заходзяць у купэ правадніка, там пахне анашою і проста дарагім тытунём, у вагоне цёпла і напаўпуста, у Баку амаль ніхто ня едзе, тыя, хто едзе – сьпяць, дзявятая вечара, што ім яшчэ рабіць, на пэрон не выходзяць, каб лішні раз не нарвацца на шмон, гарэлку потым у правадніка купяць, лепш не савацца на вакзал, ад іх усіх за некалькі мэтраў нясе спэрмаю і плянам, так, нібы ўсю дарогу, некалькі дзён і начэй, яны дрочаць па абкурцы, грамадзяне ёбанага Азэрбайджану. «Захадзі», – кажа Васю праваднік, Вася заходзіць у паўзмрок купэ, і праваднік рэзка зачыняе за ім дзьверы. «Пасядзі тут», – кажа, зачыняе дзьверы на ключ і кудысьці ідзе, Вася пачынае панікаваць, б'е з нагі ў сьценку, стукае ў зачыненае акно, круціцца як шчур у цесным, прапахлым азіяцкімі травамі пакоі, нарэшце сядае на пранумараваную коўдру, якой засьцеленая паліца, і пачынае плакаць, сьціскаючы пад пахай пакет з вадзярай. Ну, добра, гаворыць ён сам сабе, добра, ня ный, што яны табе зробяць, ну, забяруць вадзяру, на хера мне гэтая вадзяра, падумаеш – вадзяра. Трахнуць. Так, трахнуць могуць, асабліва гэты кабан у чыгуначным картузе, які зачыніў мяне тут. Не, ня трахнуць, як мяне можна трахаць, але Вася глядзіць на столік, засыпаны цыгарэтамі і прэзэрватывамі, і думае, што ў прынцыпе могуць і трахнуць. Могуць прадаць чачэнам на камплектуючыя запчасткі. Патрэбны я чачэнам? Канечне, патрэбны. На органы, там, ныркі адрэжуць, лёгкія, яйцы, прывяжуць дзе-небудзь у сябе ў ауле за ногі і пачнуць дзяўбці пячонку, як Прамэтэю, або прэпаруюць, як кроліка, і зробяць са скуры баявы чачэнскі барабан, мама з Чаркасаў нават на магілу ня прыйдзе, трэба валіць, валіць, пакуль бакінец не прыйшоў: Вася здымае пас і перавязвае клямку дзьвярэй, цяпер захочуць – ня ўвойдуць,

спрабуе адчыніць акно, яно трошкі паддаецца, Вася высоўвае галаву вонкі, у пахучае вакзальнае сутоньне, націскае яшчэ, адтуліна павялічваецца, Вася пераводзіць дых, бачыць на паліцы некалькі порначасопісаў і рашуча сігае ў акно. Тут цягнік рэзка кранаецца, рыпіць сваімі рэўматычнымі суставамі і рушыць у бок Баку, цягнучы з сабой, акрамя ўсяго, і ні ў чым не вінаватага Васю Камуніста, майго сябра, між іншым.

Заўжды так: хочаш ня хочаш – мусіш змагацца, інакш з гэтага нічога ня выйдзе, або сядзі дома і ня рыпайся, або ўжо давай – спрабуй узяць за яйцы прыкрыя абставіны, а там, калі ўсё атрымаецца, цябе абавязкова чакае джэк-пот, ну, там, ня ведаю, што ў такіх выпадках даюць пераможцам – дысконтная картка, сталыя зьніжкі, бясплатны сэкс, карацей – дрыгайся, інакш табе з гэтага гаўна ўсё адно ня выбрацца; Вася з адчаем глядзіць, як паўзь яго праплываюць апошнія вакзальныя прыбудовы, зьнікаюць спэкулянткі і кантрабандысты, нават ментаўні нідзе не відаць, у такой сытуацыі ён бы і ёй быў рады, увесь гэты набор знаёмых і родных рэаліяў зьнікае недзе ў блакітнай далечыні, і ў гэты час бакінскі камісар разьбіраецца са сваімі няхітрымі справамі, згадвае пра закладніка і спрабуе зайсьці ва ўласнае купэ. Але дзьверы не паддаюцца. Гэй, няверны, давай адчыняй, крычыць ён нешта кшталту гэтага. Вагон трывожна чакае. Вася гарачкава соўваецца ў акне і раптам разумее, што захрас. Праваднік наагул нічога не разумее. Ён па звычцы гаворыць па-азэрбайджанску са шчодрымі дадаткамі з братніх славянскіх моваў, спачатку проста лаецца, потым пужаецца – раптам скаўта хапіў кандрацій, потым нэрвова пачынае заклікаць Васю да парадку і сумленьня, пасажыраў заклікае быць сьведкамі, цягнік ужо недзе ў прыгарадзе, і тут аконная рама, у якой захрас Вася Камуніст, не вытрымлівае і трашчыць, Вася пасьпявае згрупавацца, выварочваецца ў акне і цалкам прыцэльна, як пацяганы дваровы кацяра, спляноўвае з акна, вецер урываецца ў пустое купэ для адпачынку праваднікоў і весела шпурляе пад столь ігральныя карты, упакоўкі з-пад прэзэрватываў і парнаграфічныя ўлёткі, руйнуючы, адным словам, усталяваны побыт працаўніка азэрбайджанскага міністэрства шляхоў зносінаў. І бясконцы цягнік, напоўнены мяшкамі з вугалем і валізамі з гераінам, весела памахвае хвастом і ўжо пярэднімі вагонамі ўяжджае на тэрыторыю Расеі,

адным словам, чувакам не пазайздросьціш.

23.00 – 08.00

Вася нават нічога не ламае, у сэнсе, не ў вагоне нешта, а сабе – нічога не ламае. Проста скочваецца з насыпу, рве правую штаніну, але нават вадзяру – якую ён увесь гэты час сутаргава прыціскае да сэрца – не выпускае і не разьбівае. Ужо не гаворачы пра розныя там рэбры, галенастопы і ўсякую такую анатамічную паябень. Устае так, нібы нічога не адбылося, абтрушвае штаніну, выцірае ўспацелыя далоні аб швэдар, каб гарэлка, глядзі, ня высьлізнула, і ідзе шукаць цывілізацыю, ну, але якая там цывілізацыя, калі ты з вагона выпаў, так – ідзеш, куды можаш, уздоўж заводзкіх парканаў, мінаючы колішнюю гордасьць абароннай прамысловасьці, і толькі зямля пад падэшвамі чвакае – вязкая і прыставучая, як пажаваны стымарал. Але раптам Вася выходзіць на трамвайныя рэйкі, ну, гэта ўжо добра, думае ён, яшчэ б ведаць, у які мне бок, ён сядае на рэйкі і дастае пляшку. Надпівае і думае пляшку схаваць, але вырашае не сьпяшацца, куды сьпяшацца, думае ён, да раніцы пратрымаюся, а там пабачым, і ён п'е далей і не пераймаецца надта ні гэтай ноччу, ні ўсім сваім няўдалым бізнэсам. Усё нармальна, у прынцыпе, усё нармальна, магло быць нашмат горш, маглі наагул забіць або падвесіць дзе-небудзь у тамбуры, або ў топцы засмажыць, тунгусы сраныя, Вася смачна прыкладаецца да пляшкі, так, думае ён, добра, што вадзяры шмат, усю нават ня вып'ю. Добра, дарэчы, што ня вып'ю, а то дзе яе цяпер купіш, думае ён і так і сядзіць – у драных джынсах, што спадаюць бяз паса, у цёмным швэдры і бітых красоўках, на мокрых рэйках, на якіх час ад часу пабліскваюць пранізьлівыя месяцовыя промні.

А першай ночы Васю ледзь не пераехаў дзяжурны трамвай. Кіроўца толькі ў апошні момант бачыць, што на рэйках нешта ёсьць, сабака, думае кіроўца, і вырашае расьціснуць, але ўсё ж пасьпявае заўважыць, што не – не сабака, які сабака, сабакі вадзяру з горла ня глушаць, пасьпявае прытармазіць, выбягае з трамвая і знаходзіць на рэйках п'янага Васю. Ты што – дэбіл? крычыць ён, я ж цябе, бля, ледзь напалам не разьдзяліў.

Прабач, кажа Вася, я ад цягніка адстаў, на, вось, вадзяры, кіроўца бярэ, добра, кажа ён сам сабе, ад стрэсу трошкі можна, і сядае каля Васі. Так яны і сядзяць сабе на рэйках, нават не размаўляючы, сядзяць, маўчаць, не перашкаджаюць адзін аднаму – рэйкі шырокія, месца ўсім хопіць, пачынае накропваць дробны дожджык, добра, кажа нарэшце кіроўца, паехалі, я цябе магу да парку падкінуць, там неяк дабярэсься, дзякуй, кажа Вася, але квіток купіш, у нас тут кантралёры на лініі, якія кантралёры? дзівіцца Вася – ноч на дварэ, ага, абражаецца кіроўца, прызвычаіліся без квіткоў езьдзіць, чорт з табой, мне час ехаць, і яны залязаюць у халодны трамвай і едуць у парк, па дарозе сапраўды падсаджваецца кантралёрка, падыходзіць да Васі, той хоча заплаціць ёй, лезе ў кішэню, але знаходзіць там толькі тоўсты пачак расейскіх рублёў, вытаргаваных у гуцулаў, і ўсё, і больш нічога, вось, кажа ён кантралёрцы, вазьміце. Што гэта? пытаецца тая, грошы, гаворыць Вася, якія гэта грошы? гэта брудныя грошы, гаворыць Вася, брудныя. Вазьміце іх, калі ласка. Але кантралёрка раптам кажа: ні фіга – мне гэтыя грошы не патрэбныя, давай нашыя. Ды дзе я іх вазьму? стомлена адбіваецца Вася. Бяры дзе хочаш, жорстка гаворыць кантралёрка. Я ад цягніка адстаў, кажа Вася, але кантралёрка не рэагуе. Ну, хочаце, я вам вадзяры дам? Не, адмаўляецца кантралёрка, не хачу. Як гэта? зьдзіўляецца Вася.

«Што тут скажаш, – думае ён. – Ні квітка ўзяць, ні штраф заплаціць, няпруха, адным словам». Ён выходзіць з трамвая, сядае на рэйкі і дастае другую пляшку. Мокрыя бліскучыя рэйкі раўнамерна цягнуцца ад яго ў абодва бакі бясконцасьці, менавіта гэта, па вялікім рахунку, і мірыць яго з рэчаіснасьцю.

УСТУП № 4

22.00

Калі я стану дарослым і мне будзе шэсьцьдзесят чатыры, я абавязкова згадаю ўсё гэтае марнатраўства, хоць бы дзеля таго, каб спраўдзіць, ці ператварыўся і я ў такую маларухомую худобу, якая толькі і можа, што пражоўваць нікелевымі сківіцамі запасы хаўкі, нарыхтаваныя для доўгай палярнай

зімы. Як я буду пачувацца ў шэсьцьдзесят чатыры? Ці будуць мяне таксама ненавідзець усе гэтыя дзеці вуліцаў і супэрмаркетаў, як сёньня я ненавіджу ўсіх, каму за сорак і хто пасьпеў ужо акапацца на зялёных пагорках гэтага жыцьця, акурат зь яго сонечнага боку? І як я сам буду ставіцца да іх? Што трэба рабіць цягам жыцьця са сваімі мазгамі, каб яны наскрозь не пратухлі і не ператварыліся ў сьлізкую масу водарасьцяў, непрыдатных нават для ўжываньня ў харч? Падазраю, калі я нешта пра гэта і даведаюся, дык менавіта ў свае шэсьцьдзесят чатыры, і тады штосьці мяняць мне ўжо не захочацца. Што зь імі з усімі робіцца, яны, вядома ж, таксама пачыналі як нармальныя вясёлыя жыхары нашых гарадоў і вёсак, ім, натуральна, падабалася гэтае жыцьцё, не маглі ж яны адпачатку быць такімі дэпрэсіўнымі ўёбкамі, якімі яны зрабіліся цяпер, у свае пяцьдзясят-шэсьцьдзесят. Тады з чаго пачыналася іхная пэрсанальная вялікая дэпрэсія, дзе яе карані? Пэўна, гэта ад сэксу ці ад савецкай улады, іншага тлумачэньня асабіста я не знаходжу. Я люблю разглядаць старыя фотаальбомы з карткамі саракавых-пяцідзясятых гадоў, дзе гэтыя чувакі, вясёлыя і коратка стрыжаныя, абавязкова ўсьміхаюцца ў камэру, у вайсковых або пэтэвэшных формах, з простымі і патрэбнымі ўсім рэчамі ў руках – развраднымі ключамі, фугаснымі гранатамі ці, на крайняк, макетамі самалётаў, дзеці вялікага народу, сьцяганосцы, бляха-муха, куды гэта ўсё падзелася, савок выціснуў зь іх усё людзкае і ператварыў у паўфабрыкаты для дзядзькі сэма, вось што я думаю. Ва ўсялякім разе я ўвесь час заўважаю, зь якой нянавісьцю і агідай яны глядзяць на ўласных дзяцей, яны плююць на іх, адлоўліваюць у глухіх калідорах нашай бязьмежнай краіны і хуячаць па нырках цяжкім кірзавым ботам сацыяльнае адаптацыі. Вось такая вось штука.

19.00

Калі перад табой столькі дзьвярэй, ты ніколі ня ведаеш, у якія менавіта табе трэба зайсьці, думаю я, стоячы перад тралейбусам. Гэта ўжо трэці ці чацьвёрты, які я прапускаю, я ніяк не магу сканцэнтравацца і вырашыць, што канкрэтна мне трэба і для чаго. То бок куды я маю паехаць і хто мяне там

чакае. Неяк неспадзявана я застаўся адзін, безь сяброў і знаёмых, без настаўнікаў і гуру, і толькі пасажыры, што стаяць тут поруч са мной, на канцавой, пад дажджом, запіхваюцца ў тралейбусы, і я ім, здаецца, перашкаджаю. Ва ўсялякім разе глядзяць яны на мяне непрыветна, гэта ўжо дакладна. І вось, калі я ўжо больш-менш вырашаю, чаго хачу, за маёй сьпінай узьнікаюць дзьве постаці ў плашч-палатках і пагонах і забіраюць мяне з сабой, я спачатку вырашаю ўскочыць у пусты тралейбус, ну, але гэта дакладна быў ня мой маршрут і ня мой дзень – мяне схапілі за рукі і пацягнулі праз плошчу.

19.30

Выглядае, як казарма. І пахне, як у казарме, дарэчы, чым тут напраўду пахне? Тушонкай, ва ўсіх казармах пахне тушонкай і дэзэртэрамі, доўбанае гарматнае мяса, вось чым тут пахне. У шкляной будцы сядзіць вартавы з абрэзаным калашом, чытае парнуху і жарэ кансэрвы, выцягваючы іх са слоіка раскладной лыжкай. Калі мы зайшлі, ён нават не варухнуўся, вось што значыць баявая выпраўка і жалезныя нэрвы. У калідоры вісіць некалькі вялікіх лямпаў, праўда, сьвятло ня надта яркае, але ў мяне паўгадзіны ўжо цякуць сьлёзы, я амаль нічога ня бачу, так што лямпы мяне сьлепяць, я нават не магу разглядзець, што там за кансэрвы жарэ вартавы. Ён нас моўчкі прапускае, і яны нават не вітаюцца адзін з адным, чмошны народ – сяржанты, чмошны і суворы, як фіны альбо ляпляндцы. Яны мяне проста ненавідзяць, ублюдкі фашысцкія, сядзяць тут, жаруць сваю тушонку, я б цяпер ужо дома быў, калі б ня гэтыя ляпляндцы. З выгляду нармальныя чувакі, магчыма, на некалькі гадоў старэйшыя за мяне, у іншых абставінах мы маглі б пасябраваць, хадзілі б на футбол, у кіно, я ня ведаю, што там яшчэ робяць сябры, ну, але людзі вельмі псуюцца, варта ім толькі абматацца службовымі анучамі, магу толькі ўявіць, што зь імі далей будзе, гэта ж так проста ня скончыцца, яны ж самі павінныя разумець такія рэчы, ляпляндцы гэтыя.

19.15

Так, пацан, – кажа адзін зь іх, відавочна, старэйшы або

нахабнейшы. – Альбо ты ідзеш далей, альбо мы зараз цябе заб'ём. Пачакайце-пачакайце, – кажу я, – вы не разумееце – у мяне ўсё нармальна, давайце я сапраўды пайду, але ў іншы бок, туды, куды я ўжо ішоў. Куды ты ішоў? – крычыць старэйшы, ты захрас у дзьвярах, людзі зайсьці не маглі. Сур'ёзна? – пытаюся. – Ну, мяне, вядома ж, падштурхнулі. Хто цябе штурхаў? – крычыць той самы. – Ты проста пад колы кінуўся, а потым у дзьвярах захрас. Добра-добра, – кажу я, – давайце я пайду туды і яшчэ раз паспрабую, добра? І я напраўду спрабую вызваліцца зь іхных абдоймаў, і ўжо тады яны пачынаюць мяне біць. А калі і гэта не дапамагае, то проста дастаюць балёнчыкі і шчодра паліваюць мяне чаромхаю, адварочваючыся пры гэтым. Пэўна, гэты пах ім не падабаецца.

22.30

І ты, блядзь, ты – які ад прыроджанага алькагалізму і вясёлай натуры яшчэ ўчора рабіў зусім вар'яцкія рэчы – ты раптам згодны падтрымаць якія заўгодна рэпрэсіі і карныя апэрацыі, ты валяесься дома, чытаеш крымінальную хроніку і балееш не за сумленных у сваім вар'яцтве маньякаў, а за генэралаў стаўкі і касталомаў з надзвычайных аддзелаў, стары рэакцыйны ўблюдак, што забыўся на церпкі пах раус. Менавіта так і пачынаецца фашызм – учорашнія байцы нябачнага фронту раптам ператвараюцца ў тлустае апірышча для антыгуманных экспэрымэнтаў з рэчаіснасьцю і сьвядомасьцю, тыя, хто толькі ўчора вярнуліся з франтоў і акопаў пераможцамі, ужо празь нейкія дзесяць-пятнаццаць гадоў раптам пераўтвараюцца ў фашысцкіх сьвіней, вось у чым найвялікшая таямніца цывілізацыі, грамадзтва пажырае само сябе, яно цяжэе й асядае пад цяжарам сылікону, якім само сябе і накачвае.

19.45

— Так, – кажа адзін з фашыстаў, – даставай, што там у цябе ў кішэнях.

— Не магу, – адказваю. – Спачатку наручнікі здыміце.

— Не выёбвайся.

— Ну, хаця б часова здыміце, я дастану, а потым вы зноў іх надзенеце.

— Ну-ну, мы іх здымем – а ты зноў уцякаць. Давай выцягвай, а то па галаве дамо.
— Вы ня маеце права мяне біць, – кажу я фашыстам. – Я дэкану патэлефаную.
— Гэта мы зараз дэкану патэлефануем, – кажуць фашысты.
— Не, гэта мой дэкан, так што тэлефанаваць яму буду я.
— Менш пізьдзі, – гавораць яны.

Так, размова нешта ня клеіцца. Цікава, дзе ў іх тут газавая камэра, я ўсё яшчэ дрэнна бачу. Да таго ж газ, накладзены на выпітае мной, складае нейкія вясёлкавыя камбінацыі ў галаве.
— Зараз мы цябе сфатаграфуем.
— Гэта яшчэ навошта? – пытаюся я.
— На памяць, – сьмяюцца фашысты.
— А дзе тут у вас газавая камэра? – пытаюся я.
— Што? – не разумеюць яны.
— Ну, камэра, – кажу я. – З газам.
— Ага, – кажуць яны. – І з душам. Зараз будзе.

Зараз яны мяне расстраляюць, думаю я. Ублюдкі фашысцкія. І тут у пакой заходзіць тоўсты капітан, у сэнсе, не капітан карабля, гадоў пяцідзесяці, з рэшткамі сумленьня ў вачах і рэшткамі бутэрбродаў на кіцелі. Я зразумеў, што гэта мой шанец, і вырашыў за яго трымацца, ну, не за кіцель, канечне.

23.00

Потым пачынаецца старасьць, ты проста пусты зь сярэдзіны, у табе проста нічога не застаецца, цябе выціснулі, выдушылі і ўсё тут, і выкінулі, так што можаш цяпер ганарыцца сваімі пратэзамі і мэдалямі. Каму ты патрэбны, па вялікім рахунку, што ты рабіў увесь гэты час, чаму цябе ўсе ненавідзяць і чаму ты ім ня можаш адказаць нават гэтым? Дзе твая нянавісьць? Дзе твая злосьць? Што з табой здарылася? Ува што цябе пераўтварыла сыстэма? Як жа так – ты ж нядрэнна пачынаў, яшчэ тады, у свае шаснаццаць-сямнаццаць, ты ж быў нармальным чалавекам, не зусім скончаным і ня цалкам прадказальным, што ж ты так аблажаўся, як ты паглядзіш у вочы анёлам на кпп пасьля таго, як памрэш ва ўласным гаўне, як ты ім у вочы паглядзіш, што ты ім скажаш, яны ж цябе не

зразумеюць, яны ўвогуле нікога не разумеюць, нікога-нікога.

20.00
— Кім жа ты будзеш?
— Настаўнікам.
— Які зь цябе настаўнік? Ты ж п’яны ўвесь.

Так, трэба неяк адсюль выбірацца, бо гэты ўблюдак мяне дакладна расстраляе. Здаецца, я памыліўся. На гэтых фашыстаў ніколі нельга спадзявацца, абавязкова здадуць.
— Скажыце, як вас завуць?
— Мяне? Хм. Мікалай Іванавіч. Мікалай Іванавіч Плоскіх.
— Як?
— Плоскіх.
— Можна я вас буду проста Мікалаем Іванавічам называць?
— Валяй.
— Мікалаю Іванавічу…
— Ну?
— Вы разумееце, я ўвогуле ня п’ю.
— Я бачу.
— Сур’ёзна. Ня п’ю. Наагул.
— А што ж ты так нахуячыўся?
— Мікалаю Іванавічу, вы разумееце… Гэта мой дэкан.
— Што дэкан?
— Ну, у яго народзіны сёньня, разумееце?
— Ага, і ўвесь факультэт бухаў, так?
— Ну, не, канечне. Ён проста папрасіў дапамагчы яму пераехаць. У новую лябараторыю.
— Якую лябараторыю?
— Новую. Пераехаць. Там, рэчы перавезьці, апаратуру.
— Апаратуру?
— Ну, так. Колбы.
— Якія колбы?
— Ну, колбы такія, ведаеце, – я спрабую патлумачыць яму як выглядае колба, але сам не магу гэтага згадаць.
— Ну і што?
— Мы хімікі.
— Я бачу.
— Сур’ёзна. Ведаеце, колбы там розныя – (чаго я да гэтых

колбаў прычапіўся?) – Мікалаю Іванавічу...
— Ну?
— У вас жа дзеці ёсьць?
— Ёсьць, – кажа Мікалай Іванавіч, папраўляючы свой фашысцкі кіцель. – Сын. Такі самы разьябай, як ты, – Мікалай Іванавіч, здаецца, супакойваецца. – Клей вось пачаў нюхаць, зараза такая. Я нядаўна палез у тумбачку.
— Палезьлі ў тумбачку? – не разумею я.
— Ну, у мяне там МАЕ рэчы, разумееш? Палез, значыць, гляджу – клею няма, я да яго – ты што, кажу, ахуёк – раней цыгарэты МАЕ паліў, цяпер МОЙ клей нюхаеш?
— Ваш клей? – я яго ніяк не магу зразумець. Што ён кажа?
— Я для рамонту купіў, – абражаецца Мікалай Іванавіч. – Для рамонту, ясна? А цяпер які рамонт, бяз клею?
— Ну, – кажу я.
— А абрыгаўся чаго?
— Ня ведаю, Мікалаю Іванавічу, у мяне нешта апошні час з носам. Сплю дрэнна, ува сьне задыхаюся. Рыгаю вось.
— Гэта ў цябе глянды.
— Думаеце?
— Дакладна, глянды. Табе іх трэба выразаць.
— Выразаць?
— Ага.
— Ну, так, – кажу я. – Як жа я іх выражу? Што тады застанецца? Магчыма, глянды, гэта наагул лепшае, што ў мяне ёсьць.
— Эх, сынок-сынок. Што ж мне з табой рабіць?
— Мікалаю Іванавічу...
— Ну?
— Адпусьціце мяне. Я больш ня буду.
— Ды куды ж я цябе адпушчу? Цябе ж такога празь пяць хвілінаў зноў падбяруць. Гэтыя ж вось два підарасы, што цябе прыцягнулі, і падбяруць. Яны маладыя, для іх гэта, як варожы самалёт зьбіць – можна новую зорачку на борце маляваць. Так што сядзі тут. Тут ты цяпер у найбольшай бясьпецы. Так, зараз, дзе МАЕ ключы, пайшлі – я пакіну цябе да ранку ў камэры.
— У газавай?

20.30

У камэры цёмна, уздоўж сьцен стаяць дзьве лавы, на адной валяецца чувак у скуранцы, паміж лавамі наглуха закратаванае акно, Мікалай Іванавіч забірае мой пас і шнуркі і пакідае мяне ў цемры. Я адразу кідаюся да акна, ня можа быць, думаю, каб адсюль нельга было ўцячы, зь любой газавай камэры можна ўцячы, натуральна, што і з гэтай таксама. Што ты робіш? пытаецца чувак, парыпваючы ў цемры скуранкай, ды вось, хачу неяк вылезьці адсюль, ага, кажа чувак, а ты падкоп зрабі. А што, кажу, адсюль ніяк ня вылезьці? Не, кажа ён, ніяк. Толькі падкоп. А ты адкуль ведаеш? пытаюся. Я, кажа ён, вось у гэтай самай камэры сядзеў яшчэ тры з паловай гады таму, калі мяне ўзялі першы раз. Ух ты, кажу, дык ты тут свой? Ты фільтруй базар, кажа чувак, які я ментаўні свой? Ну, прабач, кажу, не хацеў цябе абразіць. А за што цябе ўзялі? На кічы, павучальна кажа чувак, і яго скуранка пакрыўджана рыпіць, не пытаюцца, за што, на кічы пытаюцца – па якім артыкуле, зразумеў? Зразумеў, кажу.

Так мы зь ім да раніцы і прасядзелі. Ён апавядаў пра кічу, а я думаў пра сваё. Лавы пахлі клапамі.

18.06.93 (пятніца)

7.00
— Мікалай Іванавіч?
— Давай, сынок – падымайся. Хадзем на папраўчыя работы.
— Бывай, – кажу я чуваку, але той у адказ толькі сонна пацмоквае.

Значыць так, – Мікалай Іванавіч вядзе мяне абадранымі калідорамі, выводзіць праз бакавыя дзьверы, я бачу, што мы трапілі ў калідоры пашпартнага стала, ён таксама знаходзіцца ў адным памяшканьні з раус, тут яшчэ зусім нікога няма, ніякіх наведнікаў, толькі дзьве прыбіральніцы мыюць калідор з двух бакоў і глядзяць на мяне асуджальна, кожная па-свойму, канечне, але асуджальна, Мікалай Іванавіч адчыняе яшчэ нейкія дзьверы і заводзіць мяне ў вялікі пакой, дзе стаіць вялікая лядоўня і газавая пліта, падлога залітая вапнай, відаць, тут робяць рамонт, можа, менавіта гэта і ёсьць газавая камэра,

думаю я, а народ яны труцяць, пэўна, з дапамогай газавай пліты.
— Значыць так, сынок, – дзелавіта кажа мне Мікалай Іванавіч, – значыць так.

Зараз, думаю, ён прапануе мне засунуць галаву ў духоўку і адкруціць краны.
— Я вырашыў не тэлефанаваць твайму дэкану. Навошта табе гэтыя непрыемнасьці, правільна?
— Правільна.
— Але каб больш такога не было, ясна?
— Ясна.
— Значыць так, – кажа Мікалай Іванавіч, – вось твой пашпарт, вось твой пас.
— А шнуркі?
— Во, бля, забыўся. Ну, усё адно – вяртацца. Значыць так, – ён, здаецца, сам ня ведае, што яму трэба. – Бачыш лямпачку?
— Бачу.
— Яна разьбітая – бачыш?

Я гляджу наверх. Сапраўды – разьбітая.
— Бачу, – кажу.
— Во, давай – выкруці яе. А то я туды не залезу. Гады МАЕ ўжо ня тыя.
— Выкруціць? – перапытваю.
— Выкруці.
— І ўсё?
— І ўсё.
— І можна ісьці дахаты?
— Ну, не, – кажа Мікалай Іванавіч. – Да вечара перасядзіш, каб ніхто нічога, а там – піздуй, куды хочаш.
— Да вечара?
— Да вечара, – кажа Мікалай Іванавіч. – Давай, лезь.

Ён падстаўляе мне разьдзёўбаную раскладную драбіну, залітую вапнай і фарбай, і адступае ўбок. Здаецца, баіцца, каб я на яго не зваліўся. Я нерашуча тапчуся, але вырашаю лезьці, усё-ткі гэты Мікалай Іванавіч не такі ўжо і гаўнюк, гаўнюк, канечне, але не такі ўжо, пашпарт мне, прынамсі, аддаў, хоць шнуркі і заныкаў. Я лезу наверх і разглядаю зблізку лямпачку, яна ня

проста разьбітая, гэта нейкая апушчаная лямпачка, таксама ўся ў вапне і фарбе, ня ведаю ўжо, хто ў іх тут рамонтам займаецца, але да электрычнасьці ён, пэўна, ставіцца зь нянавісьцю.
— Ну, што там? – пытаецца зьнізу Мікалай Іванавіч.
— Парадак, – кажу.
— Які парадак? – крычыць Мікалай Іванавіч. – Ты давай, підарас малы, выкручвай яе. Мне тут няма калі з табою трындзець.

І тут недзе ў глыбіні памяшканьня, за сьцяной, гучыць стрэл, потым яшчэ, потым чарга з калаша, сапраўдная табе перастрэлка, я ледзь не валюся са сваёй драбіны, ну, думаю, бля, Мікалай Іванавіч таксама, вядома ж, пужаецца, выхоплівае макарава і зьнікае ў глыбінях пашпартнага стала. А я застаюся на раскладной драбіне. Стрэлы сьціхлі. Што ж гэта дзеецца? думаю я, яшчэ раз спрабую выкруціць лямпачку, і раптам мяне б'е токам, я зноў ледзь не валюся на падлогу, ябаў я ваш раус, кажу, з пашпартным сталом уключна, спускаюся з драбіны і выходжу з пакою. Леваруч пачынаецца сьвежавымыты калідор, праваруч нейкія дзьверы. Я паварочваю ручку. Дзьверы адчыняюцца. За імі знаходзіцца падворак пашпартнага стала, каля дзьвярэй стаіць белая валжана, і ўсё, больш нікога, ніякіх наведнікаў, ніякіх пашпартыстак, ніякіх вышак з кулямётчыкамі і калючым дротам. Я выходжу і стаю ля дзьвярэй. У прынцыпе, думаю, яны могуць страляць і без папярэджаньня. За дзьвярыма зноў чуваць стрэл. Я іду да брамы, адчыняю весьніцы і еду дахаты.

На канцавой 38-га стаіць Вася Камуніст, стаіць ля кіёскаў і падтрымлівае рукамі джынсы. Здароў, кажу, што з табой? А, кажа Вася, ад цягніка адстаў. Дзе твае шнуркі? А, кажу, згубіў. Ясна, кажа Вася, вып'ем? Ага, кажу, толькі я бяз бабак. Мікалай Іванавіч усё забраў. Які Мікалай Іванавіч? пытаецца Вася. Плоскіх, кажу. Які-які? Плоскіх. Ясна, кажа Вася.

Як твой бізнэс? пытаюся я, ужо калі мы ўзялі. А, кажа Вася, ніяк. Вырашыў завязаць. Што так? пытаюся. Ды разумееш, кажа Вася, у гэтай краіне сумленна займацца бізнэсам немагчыма. Яшчэ і бакс блядзкі скача. Ясна, кажу.

8.47

Дома мы знаходзім нашага сябра Сабаку Паўлава. Здароў, кажа Сабака, нібы так і трэба, вы што – пабухаць прынесьлі? Пабухаць, Сабака, кажа Вася, пабухаць. А што менавіта? прынюхваецца ён, няўжо каньяк? Хуяк, кажу я яму. А дзе ты быў? На футболе, кажа Сабака, учора цэлы вечар там пратаўкліся, і хоць бы якая радасьць. Ну, і мы ўжо нікуды не выходзім, усё ж такі даўно ня бачыліся, ёсьць пра што пагаварыць, што ўжо там.
— Сабака, – пытаюся я, – а як хоць згулялі?
— Хто згуляў? – не разумее Сабака.

Частка першая

ЧЫЁЙ СЬМЕРЦІ ТЫ ХОЧАШ НАСАМПЕРШ

9.15

Гэтая лірычная гісторыя пачынаецца з таго, што перад нашымі дзьвярыма зьяўляецца чувак у сінім плашчы, з пластыкавым кейсам, і доўга круціць у руках паперку, глядзіць, ці правільны адрас, ці туды ён трапіў, ці ніхто яго ня кінуў, карацей – пануры, зьняверaны чувак, яшчэ і кейс гэты, наагул – ня ведаю, дзе такіх людзей бяруць і куды іх потым сьпісваюць. Нарэшце ён адважваецца, стукае ў дзьверы, заходзіць і бачыць усіх нас – мяне, Васю Камуніста і нашага сябра Сабаку, ад нас пахне ранішнім бухлом і вячэрнімі ванітамі, ранак працоўнага дня, адным словам, чувак зноў пачынае круціць у руках паперку, ты хто? пытае Сабака, ён найбольш з нас траіх пужаецца, бо пасьля ўчорашняга разьвітаньня славянкі, то бок пасьля таго, як ён рыбінай высьлізнуў зь няўмелых рук Вовы і Валодзі, менавіта на ягоную караткастрыжаную галаву мелі б пасыпацца непрыемнасьці, вось ён і думае, раптам гэта па яго, нехта з рэдакцыі, скажам, кілер, хто іх ведае, хто там у гэтых підарасаў у штаце ёсьць, газэта заможная, маглі, у прынцыпе, запрасіць наёмнага забойцу з пагадзінным тарыфам з былых інтэлігентаў, скажам, ён там яшчэ ўчора працаваў інжынэрам у

інстытуце, а тут дэфолт, і беспрацоўе, і вялікая краіна развалілася на кавалкі, вось ён і пайшоў у кілеры калыміць, Сабаку прабівае на жах, гэта ўжо дакладна, і ў пакоі западае маўчанка.
— Мяне завуць Робэрт. Дзядзя Робэрт, – кажа чувак, хаваючы нарэшце паперку. – А дзе Саша?
— Якая Саша? – пытаюся я. Можа, я нешта прапусьціў, і ў нас тут пасьпела завесьціся нейкая Саша. Тады гэта наш агульны кілер.
— Ну, Саша, ён жа з вамі павінен жыць. Гэта ж, – гаворыць ён, зноў дастае сваю паперчыну і пачынае яе нэрвова круціць.

Ён? – думаю я, – яна што, гермафрадыт, гэтая Саша?
— Ну, Саша, – умольна гаворыць дзядзя Робэрт. – Ён жа гэты адрас дома пакідаў, сказаў, што тут жыве. І пра вас апавядаў, ну, апісваў вас, я вас вось такімі і ўяўляў сабе, – гаворыць ён і па-сяброўску ўсьміхаецца.

Такімі? – думаю я. – Гэта якімі ж? Абрыганымі?
— А, – першым здагадваецца Сабака. – Гэта ён пра Карбюратара гаворыць, пра Сашу.
— А, ну, дакладна, – усе неяк супакойваюцца, выяўляецца, што ніякай Сашы тут усё-ткі не было, а гэта ўжо добра. І гэты ёбаны дзядзя Робэрт, здаецца, ня кілер, хоць і нешта добрае сказаць пра яго таксама нельга. Ён працягвае па-сяброўску ўсьміхацца нам, Сабака таксама пачынае праяўляць да яго інтарэс, уласна, ня так да яго, як да ягонага пластыкавага кейса, вядома ж, думае Сабака, калі гэты ёбаны дзядзя Робэрт прыехаў да Карбюратара, так ён думае, то, мабыць, ён прывёз яму нешта смачнае і карыснае, не каленвалы ж ён яму прывёз, мабыць, усё-ткі нешта смачнае і карыснае, там, думае Сабака, адэкалёны альбо марыхуану, зранку лепш, канечне, адэкалёны, толькі не каленвалы, карацей, мы ўсе цяпер ня надта добра разумеем, хто гэта такі і пра што ён нам гаворыць. А ён гаворыць:
— Дык гэта вы – сябры Сашы?
— Мы, – адказвае Сабака, ня зводзячы з кейса пахмельных вачэй. – Мы сябры.
— А што гэта вы тут, – пытаецца дзядзя Робэрт, спрабуючы ўвайсьці да нас у давер, – каньяк з ранку п’яце?

Мне ён пасьля гэтага чамусьці адразу перастаў падабацца. Стаіць нейкі прыцірак з кейсам, пізьдзіць тут.
— Дык тое яны, – паказвае Сабака на нас. – Вы праходзьце, сядайце. Можа, гарбаты?

Гарбату Сабака апошні раз піў гады два таму, яшчэ ў школе. А тут, бач, разбалакаўся.
— А дзе Саша? – заклапочана пытае чувак.

І тут усе насамрэч думаюць – а дзе Саша? Неяк так сталася, што апошнія некалькі дзён на яго ўсе забыліся, я дык дакладна, неяк так трапілася, што ў кожнага свая запара, свае праблемы, ну, ведаеце, як гэта бывае – закручваесься па справах, а потым раптам выяўляецца, што ня ведаеш нават, дзе твае сябры пазьнікалі.
— Можа, на занятках, – кажу няўпэўнена.
— Не, я там ужо быў, – кажа дзядзя Робэрт. – Мне сказалі, што ў вас заняткаў ужо тыдзень як няма.
— Сур'ёзна? – пытаюся.
— Так. Парадзілі тут пашукаць, у вас.
— Ну, гэта правільна, – гаворыць Вася, каб яго супакоіць. – Правільна. Дзе ж яго яшчэ шукаць?
— Сабака, – пытаюся я, – а на футболе яго з вамі не было?
— Не, кажа Сабака. – Хоць, у прынцыпе, – ён зьвяртаецца беспасярэдне да дзядзі Робэрта, – я там прытомнасьць страціў, так што добра ня памятаю, можа, і быў.
— А што здарылася? – пытаюся я.
— У Сашы бяда, – кажа дзядзя Робэрт і сядае пры ўваходзе на свой кейс. Я яшчэ думаю, што ён напраўду ў яго пусты і ён яго замест зэдліка носіць.
— Што за бяда? – пытаюся.
— З бацькам.
— Так у яго ж няма бацькі, – кажу я. – У яго ж айчым.
— Ён быў яму як бацька, – кажа дзядзя Робэрт.
— Ды ну, – раптам гаворыць Сабака, – бацька й айчым – гэта зусім розныя рэчы. Хоць, – дадае, – у прынцыпе, адзін хуй.
— Пачакай, – кажу я Сабаку. – А чаму – быў?
— Ён загінуў, – кажа дзядзя Робэрт. – Два дні таму.
— Як загінуў?
— Застрэліўся.

— Як?
— У яго стрэльба была.

Пра стрэльбу Карбюратар апавядаў. Ён наагул пра сваіх бацькоў гаварыць не любіў, але нешта недзе ўсё-ткі апавядаў, там у яго ўсё неяк замарочана выходзіла, бацька ягоны іх кінуў, калі ён зусім яшчэ малы быў, потым зьявіўся гэты чувак, са стрэльбай, Карбюратар казаў, што ён проста скончаны, што ён увесь час бухае, ходзіць і адстрэльвае навокал іхнага будынку ўсё жывое, час ад часу яго забіраюць, але потым адпускаюць на волю, разам са стрэльбай, нейкі ў іх там зусім дзікі Захад выходзіў, як паслухаць Карбюратара. Яшчэ ён апавядаў, што ў ягонага айчыма не было адной нагі, не ад нараджэньня, канечне, ня тое каб ён быў нейкім паталягічным выродкам, яму проста яе аднаго разу адрэзалі, гэта быў яшчэ савок, але для айчыма пачалася ўжо ягоная пэрсанальная грамадзянская вайна, зь якой ён і вярнуўся на пратэзе. Гэтую гісторыю Карбюратар апавядаць любіў, ён смакаваў дэталі, прадстаўляў усё гэта ў ролях, адным словам – гісторыя яму падабалася. Як я ўжо сказаў, айчым увесь час цягаў за сабою стрэльбу, добрую, калекцыйную, калі верыць Карбюратару, стрэльбу, у іх там нібыта цэлая кампанія шалёных паляўнічых на скальпы была, ліцэнзіяў у паловы зь іх не было, але нехта ў іх там працаваў у раённай пракуратуры, так што яны маглі хоць на браневіках ганяць, ніякае даі іх бы не спыніла, палявалі яны цэлы год, на сэзоны ўвагі не зьвярталі, проста набухваліся, бралі мянтоўскі бобік і гналі ў стэп, у бок расейскай мяжы, а паколькі, паўтаруся, савок яшчэ трымаўся сваёй цэласнасьці, то мяжы ніякай і не было, яны проста гналі, на колькі ім хапала бэнзіну, а потым, заглохшы недзе пасярод яравых ці там азімых, як маглі, дабіраліся дадому, замест трафэяў цягнучы на плячах адзін аднаго. Мне гэтая гісторыя таксама падабалася, я не разумеў Карбюратара, у цябе, казаў я, такі прыкольны айчым-ебанат, што ты на яго гоніш, лепш зьезьдзіў бы зь ім, прывёз бы скуру якога-небудзь маманта, я сабе мог уявіць такую паездку, гэтак яны маглі гнаць, у прынцыпе, да самага Касьпію, як чырванаскурыя ў прэрыях, забіваючы па дарозе ўсю навакольную фаўну, а прыехаўшы да Касьпію, набіць там цэлую гару вярблюдаў, ці хто там на тым Касьпіі вядзецца, і назад,

прыкольна; але Карбюратар такіх рэчаў не любіў, а можа – любіў, толькі выгляду не падаваў. І вось аднаго разу, падчас чарговага забуху, іхная п'яная кампанія выехала на палі, і недзе там яны заглухлі, таму мусілі станавіцца на ноч. А зранку на іх натыкнуліся камбайны, бо было жніво, зноў жа – не сэзон, і заселі яны недзе проста ў пакосах. Камбайны ехалі, расьцягнуўшыся на пару соцень мэтраў, і раптам перад імі зьявіліся чырванаскурыя, дакладней – чырванатварыя ўзброеныя чувакі. Прынамсі, я сабе гэта ўяўляю менавіта так. Найбліжэйшы камбайн, што ішоў проста на іх, пачаў зварочваць, і тут у яго забілася касілка, таму камбайн спыніўся, адтуль вылез чувак, і, баязьліва абзываючы паляўнічых, пачаў лезьці нагой проста ў пашчу свайго сатанінскага агрэгату, намагаючыся прабіць тромб, які ўзьнік; Карбюратар нам потым на схеме паказваў, на схеме, прынамсі, гэта выглядала страшна, я ўжо не кажу пра тэхніку бясьпекі. Ну, але хто ж дзеля гэтага будзе глушыць камбайн, усё ж ідзе бітва за ўраджай, усялякая такая фігня, што тут гаварыць. І вось паляўнічыя, якія ўсё яшчэ адчувалі сябе на паляваньні, раптам вырашылі дапамагчы камбайнэру, ня ведаю, можа, у іх там сумленьне прачнулася, хаця наўрад, мабыць, ім проста было па прыколе агораць такога монстра, як сельскагаспадарчы камбайн «Ніва»; «Ніва», «Ніва», крычаў Карбюратар, яму ўва ўсёй гэтай гісторыі, пэўна, падабалася вялікая колькасьць тэхнікі, і гэты ягоны кумарны айчым таксама палез сваёй нагою і нават прабіў тромб, і касілка закруціла сваімі мэталічнымі зубамі, заглытваючы ў сваю пашчу чарговую порцыю народнага ўраджаю, уключна з правай нагой айчыма, чувака пасьпелі выцягнуць назад, але ўжо без нагі, хоць магло быць значна горш. А так проста адкусіла па яйцы, ва ўсялякім разе Карбюратар так гаварыў. Я спрабаваў уявіць сабе, што было потым – добра, думаў я, ён ужо быў без нагі, яго, хутчэй за ўсё, павезьлі ў шпіталь, але як яны адтуль выбраліся? На камбайнах ці як? Ну, але добра. А нага? Гэта ж сельскагаспадарчае нутро камбайна, як я яго сабе ўяўляў, было ўжо ладна набіта некалькімі сотнямі кіляграмаў залацістага зерня, перамяшанага з косткамі і жыламі айчыма, плюс неарганічныя рэчывы, ну, там вайсковы чаравік, хэбэшная калашына, карацей – плойма сыравіны, цікава, што хлебаробы з гэтым усім дабром рабілі, сто пудоў жа ня высыпалі, мабыць, здалі дзяржаве, гэта

ўжо дакладна, ведаю я гэтых падступных хлебаробаў, яны б і гаўно ўласнае здавалі, калі б яго хто прымаў, і я сабе потым уяўляў гэтае печыва і гэты хлеб, карацей, крывавыя фантазіі простага хлопца, ведаеце, як яно бывае. І вось чувак далей жыў сабе, цяпер ужо з адной нагой, але яму, як я зразумеў, было цалкам дастаткова, прынамсі, ён працягваў бухаць і адстрэльваў усё, што рухалася, проста монстар нейкі.
— Як можна застрэліцца са стрэльбы? – падае голас Сабака. – Там жа ствол доўгі, на сябе не направіш.
— Ну, а калі рыкашэтам? – пытаецца Вася.
— Ну так, – кажу, – ён што – спачатку страляў, а потым кідаўся лавіць кулю, ці што?
— Не, – кажа дзядзя Робэрт. – Ён нагой на курок націснуў.
— У яго ж адной нагі не было, праўда? – пытаюся.
— Дык правай, – кажа дзядзя. – Ён левай націснуў.
— Ён што – ляўша? – пытае Сабака.
— Сабака, – заклікаем мы яго да сумленьня.
— Уяўляеце? – кажа дзядзя Робэрт. – Яго знайшлі, дык спачатку нават пазнаць не маглі – яму ж паўгалавы зьнесла. Па шкарпэтцы апазналі.
— У вас там, мабыць, шмат аднаногіх паляўнічых? – пытаюся я, але дзядзя Робэрт нават не крыўдуе.
— Дык дзе ён цяпер? – пытаецца Вася.
— У моргу. Пазаўтра пахаваньне.
— Пазаўтра?
— Так, пасьля абеду. Яны яму спрабуюць яшчэ чарапушку сабраць, разумееце?
— А калі не зьбяруць?
— Ня ведаю, спаляць, мабыць. Трэба Сашу знайсьці, каб ён прыехаў. Я ўжо на занятках быў, але яны сказалі, каб я тут шукаў.
— Тут яго няма, – кажа Вася.
— А дзе ён можа быць? – пытаецца дзядзя Робэрт.
— Ну, заставайцеся, – кажу я, – пачакайце.
— Не магу. Мяне дома чакаюць. Сястры трэба з пахаваньнем дапамагчы, потым у морг зьезьдзіць, яны ж яму галаву спрабуюць сабраць, трэба, каб падобна было.
— У іх што, – пытаецца Вася, – шмат варыянтаў?
— Слухайце, хлопцы, – дзядзя Робэрт падымаецца з кейса і падыходзіць да мяне, – знайдзіце яго. Сястра вельмі прасіла,

каб ён быў. Яны там ня вельмі ладзілі, але ж яго ўжо няма, разумееце? Гэта ж такое. А час у вас яшчэ ёсьць, да пазаўтра. Знайдзіце. Я вам вось тут прывёз. – Ён адкрывае кейс і дастае адтуль тры пляшкі каньяку.
— Ня трэба, – кажу я.
— Так, сапраўды – ня трэба, – кажа Сабака і забірае каньяк.
— Знайдзіце яго, – гаворыць дзядзя Робэрт, і неяк сагнуўшыся і нават не сказаўшы «да пабачэньня», выходзіць у калідор. Ня ведаю, можа, ён любіў нябожчыка, хто іх разьбярэ, гэтых чырванаскурых.

Дзядзя Робэрт, – кажу я, – дзядзя Робэрт. Якое дзіўнае імя – Робэрт. Гучыць як назва нейкага часопісу для геяў.

11.15
— Ну, што скажаш?
— Ня ведаю. Стромна.
— Што стромна?
— Ну, гэты дзядзя Робэрт. Кілер нейкі.
— Па-мойму, ён підар.
— Думаеш?
— Дакладна підар. Ты бачыў ягоны кейс?
— Ну...
— Што рабіць будзем?
— Ня ведаю.
— Можа, пашукаем Карбюратара?
— Дзе ты яго знойдзеш? На занятках яго няма. Я ня ведаю, дзе яшчэ ён бывае.
— А ў яго акрамя нас знаёмыя ёсьць?
— А я ведаю?
— Во бля...
— Яшчэ і дзядзя гэты. Підар.
— Дакладна.
— Карбюратар засмуціцца.
— Думаеш?
— Дакладна засмуціцца. Усё-ткі ж бацька.
— Айчым.
— Адзін хуй.
— Карбюратар яго не любіў.

— Ну, усё адно – сям'я. Такія рэчы, ведаеш, яны насамрэч устаўляюць.
— Ды нічога яны не ўстаўляюць, – кажу я. – Я, вядома ж, нічога супраць ня маю – там, сям'я, бацькі, усё нармальна, я да гэтага нармальна стаўлюся. Проста гэта насамрэч ня так ужо і важна, як здаецца, гэта такая фішка, што ўсе толькі гавораць – сям'я, сям'я, а напраўду ўсім похуй, зьбіраюцца толькі на пахаваньнях і хаўтурах, і ўсё. Разумееш?
— Ну, не, – кажа Вася. – Я ня згодны. Я сваіх бацькоў люблю.
— Ты іх калі апошні раз бачыў?
— Якая розьніца? – гаворыць Вася. – Мне ня трэба іх бачыць, каб любіць.
— Слухай, – раптам кажа яму Сабака, – а ты можаш уявіць сябе на пахаваньні сваіх бацькоў?
— Ты што – ёбнуўся? – крыўдуе Вася. – Што ты вярзеш?
— Ды так, – кажа Сабака, – нічога. А вось мяне на пахаваньне, мабыць, і не запросяць, ну, у сэнсе, калі яны навернуцца.
— А як ты сабе гэта ўяўляеш? – пытаюся я. – Табе што – трэба сьвяточную тэлеграму дасылаць: «Дарагі Сабака Паўлаў, прыяжджай – двума габрэямі стала менш!»?
— Ну, я не пра гэта.
— А пра што?
— Ня ведаю, проста я думаю, калі зь імі нешта здарыцца, усё адно зваляць на мяне, яны прывыклі ўсё валіць на мяне.
— Проста ты – антысэміт, – кажу я.
— Усё адно, – кажа Вася, – тут ты праганяеш. Па-свойму гэта прыкольна.
— Што, – кажу, – хаўтуры?
— Не, ну там бацькі, сям'я. Я вось разграбу тут усё і абавязкова звалю дахаты. У мяне мама ў Чаркасах.
— Разумееш, – кажу я яму, – я напраўду нічога ня маю супраць. Сям'я дык сям'я, мама дык мама. Разумееш, мы некалі з братам, яшчэ калі я ў школу хадзіў, абчысьцілі адзін палац культуры, невялікі такі. Вынесьлі апаратуру.
— Навошта?
— Ня ведаю, проста перла нас, вырашылі што-небудзь абчысьціць. Выцягнулі некалькі ўсілкоў, прымочкі там розныя, нават частку барабаннай устаноўкі, прыкінь.
— Ну, і што вы з гэтым зрабілі?
— Прадалі. У іншы палац культуры. Там нават не запыталіся,

адкуль гэта ў нас, лохі. Мы, у прынцыпе, танна прадалі, так што пытацца было бяз понту. Прадалі. А потым пайшлі ў краму і накупілі дыскаў.
— Дыскаў?
— Так. Плойму вінілу, яшчэ чувак, ну, які ўсё гэта прадаваў, меў пад прылаўкам фірмовы «Дэпэш Мод», прыкінь, у іх тады толькі выйшаў падвойны лайфовы альбом. «101» называецца. Ну, мы і выкінулі на яго процьму бабак.
— Сур'ёзна?
— Ну. А самае прыкольнае ведаеш што?
— Што?
— Гэта было наагул адзінае, што мы з братам купілі РАЗАМ.

11.35

Срань, што рабіць, я б яго і не шукаў. Навошта яму гэта, і нябожчыку – навошта, ён яму і жывому ня надта патрэбны быў, а цяпер дык і ўвогуле, ён цяпер недзе па дарозе ў сваю Валгалу, дыбае скрозь касьмічны змрок на сваей адзінай назе, і толькі анёлы, стоячы ўздоўж дарогі, салютуюць яму, беручы пад казырок і агольваючы абарваныя ў баях верхнія канцавіны, нябожчык бясспрэчна павінен трапіць у рай для інвалідаў, павінен жа там быць нейкі падзел, не запускаюць жа іх усіх праз адну браму, хоць адкуль мне ведаць. Сапраўды, адкуль мне ведаць, можа, акурат худыя і цыбатыя анёлы ў эсэсаўскіх шлемах са шмайсэрамі цераз плячо зьбіраюць і здаровых, і інвалідаў перад велічэзнай зьзяючай брамай, на якой шрыфтам Родчанкі напісана «Праца робіць свабодным», зьбіраюць усіх разам, хто спрабуе ўцячы – таго проста прыстрэльваюць і адцягваюць у суседнія хмары, нарэшце выходзіць сьвяты Пётра, такі сабе Бураціна зь вялікім залатым ключом, адчыняе браму, і анёлы пачынаюць заганяць туды масоўку, заштурхваюць іх і ўжо там, ва ўнутраным дворыку дзёўбанага раю, дзеляць на калёны і вядуць рознымі дарогамі, кожная зь якіх, у сваю чаргу, нязьменна сканчаецца вялікай газавай камэрай.

Так што чувак мае яшчэ два дні часу, каб дайсьці да сваёй канцавой і стаць навек у дэпо, здаўшы зброю анёлам і атрымаўшы ад іх вялікі жалезны крыж за гераізм на ўсходнім фронце. Тое, што ён добраахвотна вываліў свае мазгі на

кухонную падлогу, ні пра што яшчэ ня сьведчыць – бываюць у жыцьці такія моманты, калі найвышэйшай сумленнасьцю і найвялікшым маральным учынкам стае вызваленьне навакольных ад сваёй прысутнасьці, такія рэчы разумець трэба.

Штопраўда, ёсьць адзін раён, акурат за новым цыркам, ад самай ракі і да самай чыгункі, квадратныя кілямэтры непралазнага прыватнага сэктару, адразу за якім пачынаюцца заводы, так бы мовіць, старыя фабрычныя прыгарады, улетку там наагул нікога не сустрэнеш, куды яны ўсе зьнікаюць, я ня ведаю, але можна гадзінамі лазіць па пяску і друзу і нікога не сустрэць, я ўжо маўчу, што там робіцца ўзімку. Я да чаго вяду – там жыве наш сябра Чапай, ён жыве ў майстэрні пры заводзе, што вырабляе начыньне для шахтараў, у сэнсе, не адбойныя малаткі, а там розныя лямпы, ліхтары, ну і так далей – што там можа спатрэбіцца шахтарам пад настрой, Чапай кажа, што ягоны дзед будаваў гэты завод, так што ў іх гэта нібы традыцыя такая сямейная, тата Чапая збухаўся некалькі гадоў таму і лячыўся недзе ў дурцы, Чапай час ад часу езьдзіў да яго ў адведкі, прывозіў сьвежую бялізну і прэсу, перадаваў прывітаньні ад брыгадзіра, такія вось рэчы, яны жылі ў адным з баракаў акурат над рэчкай, але баракі пачалі зносіць, а паколькі Чапай-тата яшчэ ў васьмідзясятых прапіў усе дакумэнты ўключна з накладнымі на дзядулевы георгіеўскія крыжы і ордэны працоўнага чырвонага сьцяга, то перасяляць іх ніхто нікуды, вядома, не зьбіраўся, Чапай-джуніёр, як сын палка, пайшоў да дырэктара тады яшчэ нармальнага савецкага заводу і папрасіўся ўзяць яго ў цэх, тыпу па бацькоўскай лініі, дынастыя там, і так далей, Чапай на такія рэчы вёўся, думаю, ён ужо і ў дурцы пасьпеў сабе месца зарэзэрваваць, у адной палаце з татам, такая б выйшла палата перадавікоў вытворчасьці, да іх бы прыходзілі на экскурсіі піянэрскія дружыны, слухалі б іхныя дэпрэсіўна-маніякальныя ўспаміны і пакідалі б ім на тумбачках пакункі з апэльсінамі, печывам і дэнатуратам. Прадстаўнікі моцных прафэсіяў павінныя паміраць прыгожа, гэта толькі розная інтэлігенцкая шлаябень можа захлынацца ў памыях і пакутаваць ад гемарою, а сапраўдныя мужчыны, якія сьціскаюць у сваіх правіцах, што там яны сьціскаюць у сваіх правіцах, вось, якія сьціскаюць у

правіцах рычагі ад асноўных мэханізмаў гэтага жыцьця – яны маюць згараць на вытворчасьці, гераічна падаць на гарачыя падлогі ліцейных цэхаў, абрываючы ўласны працоўны стаж, паміраць ад белай гарачкі і перапою, ад рознага там пабытовага траўматызму, калі белую гарачку можна лічыць пабытовым траўматызмам.

Зноў жа, для чаго я гэта ўсё кажу? Дырэктар пагадзіўся ўзяць яго на працу, яны нешта там выправілі ў ягоных дакумэнтах, паколькі Чапай школу яшчэ ня скончыў і рабіць гэтага не зьбіраўся, дырэктар проста забраў яго ў цэх і ўсё. Дазволіў яму жыць у адной з майстэрняў, дакладней, у капцёрцы, на зашмальцаваных робах, і сказаў ні пра што не турбавацца. Дырэктар у іх, тыпу, таксама быў з дынастыі, калі можна ўявіць сабе дынастыю чырвоных дырэктараў, хаця чаму б і не. Завод на той час пачаў здаваць пазыцыі на рынку вытворчасьці шахтарскіх аксэсуараў, ці як гэта назваць, ну, то бок там і рынку як такога не было, яны лічыліся адзіным профільным прадпрыемствам у рэспубліцы, завод развальваўся, як і ўсё ў краіне, што можна было ўкрасьці – дырэктар скраў, што было нельга – сапсаваў, карацей, дзейнічаў па старых інструкцыях па грамадзянскай абароне і, прадбачачы наступленьне падступнага, хоць і нябачнага, ворага, станкі, водаправод і радыёрубку на ўсялякі выпадак падарваў, не ў прамым сэнсе, канечне, штосьці там і надалей працавала, некалькі майстэрняў плюс аўтапарк неяк і далей круціліся, толькі агульны энтузіязм зьнік, і работнікі распаўзьліся па прыватным сэктары. А Чапай з дырэктарам засталіся. Зь цягам часу дырэктар расслабіўся і вырашыў рэанімаваць хаця б часткова сваё эксклюзіўнае дзецішча, пэўна, прывіды памерлых чырвоных дырэктараў прыляталі да яго па начах і размахвалі перад вачыма шахтарскімі лямпамі, не даючы старому спаць, таму ён зноў пачаў рабіць бізнэс, знайшоў нейкіх інвэстараў, нешта яны там-такі запусьцілі на рынак, і хоць большасьць заводзкай тэрыторыі па-ранейшаму ляжала ў гаўне і руінах, агульнае ўражаньне было такім, што завод працуе. І ўласна, я ўсё гэта кажу да таго, што Чапай па-ранейшаму жыў у сваёй майстэрні, адбіў сабе два пакойчыкі, працаваў аўтасьлесарам, шабашыў налева і направа, дырэктар яго нават любіў, ну, у сэнсе, як спэцыяліста. Яшчэ Чапай, паколькі часу ў яго было

больш чым дастаткова, вадзіўся з панкамі на раёне і меў сапраўдны самагонны апарат, які ён змантаваў па схемах з абломкаў нейкай абаронкі, сабранай ім па цэхах і майстэрнях, нават знак якасьці на яго прыкруціў, уся гэтая д'ябальская машына зьзяла нікелем, медзьдзю і засакрэчаным авіяцыйным дуралюмінем, дырэктар ня меў нічога супраць, хай, казаў ён, хай займаецца, калі душа ляжыць да тэхнікі, ён, здаецца, не зусім разумеў, што менавіта пераганяе там па колбах Чапай, але бляск нікелевых зьмеевікоў яго заспакойваў, тым больш, што за электрычнасьць Чапай плаціў сам, тут галоўнае ўмець лічыць працоўную капейку, там, прафсаюзы, самаакупальнасьць, дзяржаўныя датацыі, ніколі гэтай хуйні не разумеў. І вось, чаму я пра гэта кажу – недзе праз панкаў, што куплялі ў Чапая свае наркамаўскія сто грамаў, зь ім пазнаёміўся Саша Карбюратар, Саша ня быў панкам, больш за тое – ён панкаў не любіў, ён любіў тэхніку, ну, я казаў ужо, здаецца, пра гэта, але так выйшла, што яны пазнаёміліся – Саша і Чапай, і Саша час ад часу заходзіў да Чапая ў майстэрню, разглядаў бліскучыя і запацелыя ад перагонкі трубы зьмеевіка, разьбіраў разам з Чапаем схемы танкаў, піў зь літровага кубка яшчэ не настоеную брагу, ну, адным словам – гэта было ягонае, у сэнсе ня брага, а вось усё гэта: станкі, зьмеевікі, цяжкая і машынная прамысловасьць, Карбюратару гэтага не хапала, а ў Чапая гэтага гаўна быў цэлы завод плюс ваколіцы. Таму, калі нашага Карбюратара і можна недзе цяпер знайсьці, то хіба што там – у заводзкіх майстэрнях, вось, што я думаю і выкладаю ўсё гэта сваім сябрам, так, напраўду, ня так ужо і шмат месцаў, дзе нашага брата могуць прапусьціць, вось Карбюратар адно такое месца дакладна меў, і мы павольна зьбіраемся і ўжо выходзім, і раптам ужо на выхадзе трапляем на Какаву, Какава стаіць перад пад'ездам увесь нейкі разьмяклы й апухлы, бачыць нас, о, кажа, здароў, вы куды? мы, гаворыць Вася, па справах, так што валі спаць. Можна я з вамі? пытаецца Какава, выціраючы пот рукавом пінжака, мудак тоўсты, давай-давай, кажа рэзка Вася, спаць, я не хачу спаць, зноў просіцца Какава, вазьміце мяне з сабой, пайшоў на хуй, нэрвуецца Вася, цябе нам толькі не хапае. Ну, а куды вы хоць? жаласна пытае Какава, Какава, адказвае яму Вася, у нас справы, бачыш? мы Карбюратара шукаем, Карбюратара? праўда? дык паслухайце, крычыць Какава, усё, адразае Вася, спаць, ну

сябры, разгублена гаворыць Какава, я ж магу вам... валі давай, дабранач, і мы ідзем, а ён застаецца, прыдурак тоўсты.

12.00

Зеляніна, што наліпае, як вільготная папера, чырвоныя будынкі, мы неяк так не зусім удала выехалі, прапхаліся амаль праз паўгораду, заехалі на плошчу, так, нібы хочам знайсьці нашага сябра недзе на вуліцы, урэшце нас выштурхваюць з тралейбуса кантралёры, і мы ідзём далей пешкі, пераходзім плошчу, ідзём, разглядаем афішы, разглядаем рэкляму, больш і разглядаць няма чаго, Сабака цягне заплечнік з бухлом, каля булачнай таўчэцца хіпота скончаная, спаўзьліся, як шчуры на сьвежае паветра, стаяць, п'юць сабе нешта, зь імі побач нейкія вядомыя твары, стаіць Саша Чарнецкі, яшчэ нехта ў скуранцы з ардэнамі і мэдалямі, Сашу мы ведаем, мы нават хадзілі з Сабакам пару тыдняў таму на ягоны канцэрт у дк каля стадыёну, нас там заламала ахова – нехта поруч з намі шпурнуў у залю пэтарду, яны падумалі, што гэта мы, ледзь адмазаліся, навокал Сашы стаіць хіпота скончаная, добры ранак добрага дня.
— Нефармалаў трэба расстрэльваць, – кажа Вася.
— Троцкі сказаў? – пытаюся.
— Пры чым тут Троцкі? Глядзі – стаяць, сукі.
— Ну і што?
— Не люблю, – кажа Вася і далей ідзе моўчкі.

Праз паўгадзіны мы пераходзім цераз мост, знаходзім заводзкі паркан і празь дзірку ў ім пралазім на падворак.

12.30

У Чапая мы былі некалькі разоў, ён адмыслова для сяброў пазначыў сваю майстэрню, бо іх там некалькі стаіць амаль падобных, напаўразваленых яшчэ з часоў першай расейскай рэвалюцыі 1905 году, шэрых буданоў. На Чапаевым зялёнай фарбай напісана «сацыялізм» і дамаляваная трохі рахітычная зорка, падобная да мэдузы, ну, маецца на ўвазе, колерам, Чапай у прынцыпе, тыпу Васі, таксама спэцыяліст па

дыялектыцы, яны паважаюць адзін аднаго, гэта мы з Сабакам тут чужыя – я не люблю Маркса проста так, ну, а Сабака мае да старога свае прэтэнзіі, тут усё зразумела.

Чапай нас адразу пазнае, здароў, – кажа, – заходзьце, прапускае нас у капцёрку, высоўвае галаву вонкі, асьцярожна азіраецца ва ўсе бакі і зачыняе за сабой дзьверы. Мы праходзім усярэдзіну. Чапай, як трапляецца сярод пралетараў, на побыт кладзе, пакой у яго амаль пусты, пасярэдзіне стаіць згаданы мной апарат і трывожна гудзе, пад апаратам валяецца пара колбаў, я нарэшце прыгадваю, якія яны на выгляд, на падваконьні ляжаць кнігі, я бяру адну – пятнаццаты том чагосьці, чаго менавіта, я разабраць не магу, але яўна нешта партыйнае, са штэмпэлем заводзкай бібліятэкі, сур'ёзны пацан гэты Чапай, ён старэйшы за нас на пару гадоў, яму ўжо за дваццаць, да таго ж і працоўны стаж – гэта вам ня проста так, ён праходзіць за намі ў пакой, сядайце, кажа, у пакоі некалькі зэдлікаў, як справы? пытаецца, нармальна, кажа Вася, вось Карбюратара шукаем, даўно яго бачыў? даўно, кажа Чапай, сядае на зэдлік, закідвае нагу на нагу і запальвае беламор.

Чапай худы і засяроджаны, на нас ён увагі амаль не зьвяртае, сядзіць сабе, нага на нагу, чытае нейкую партыйную прапаганду, на ім старая майка, кеды і спартыўныя штаны, да таго ж ён носіць акуляры, сярод нашых знаёмых ня так і шмат людзей, што носяць акуляры, хоць, можа, ён гэта для понту, ня ведаю.
— А дзе ён можа быць, ня ведаеш? – пытаюся я.
— Ня ведаю.
— Ён табе нічога не казаў?
— Не казаў.
— Хуёва, – кажу я. – У яго бацька загінуў.
— Айчым, – папраўляе мяне Сабака.

Чапай маўчыць.
— А ён у цябе сваіх рэчаў не забываў? – працягваю роспыты.
— Не забываў.

Так можна гаварыць бясконца, ён мантрамі нейкімі гаворыць, начытаўся Энгельса і не ўспрымае нармальнай інфармацыі, гэтыя новыя камуністы, у іх свой замарочаны дзэн, так вось

проста ня ўедзеш, а ўедзеш – ня выедзеш, будзеш прабуксоўваць у глыбокай разьябанай каляіне марксізму-ленінізму, не разумеючы, што да чаго.
— Чытаеш нешта? – раптам пытаецца ў яго Вася.
— Ды так, – адказвае Чапай. – Падкінулі тут пару кніжак. Перачытваю.
— Угу, – кажа Вася, усё ж такі яны аднадумцы, мы тут намагаемся не перашкаджаць.
— Можна мы яго ў цябе пачакаем?
— Можна.
— У нас бухло ёсьць.
— У мяне таксама, – паказвае Чапай на свой апарат. – Толькі я цяпер ня п'ю.
— Што так?
— Трыпэр.
— Напраўду? – Я вяртаю кнігу на падваконьне. – Дзе ж гэта ты?
— Ды проста тут, на заводзе, – спакойна адказвае Чапай.
— На заводзе?
— Ага.
— Што – проста ў цэху?
— Ага.
— У вас жа тут адны мужыкі.
— Ну.
— Хто ж гэта цябе? – пытаюся. – То бок, прабач – каго гэта ты?
— Што – каго? – не разумее Чапай.
— Ну, – кажу, – ты ведаеш, ад каго гэта ў цябе?
— А, – кажа Чапай, – ні ад каго. У мяне пабытовы трыпэр.
— Як пабытовы?
— Так. Пабытовы. Я ж ня трахаюся ўвогуле. Проста сэканд грузілі, вось і падхапіў.
— Ясна, – кажу. – Вы, марксісты, проста як анёлы – ня трахаецеся, не п'яце.
— Сэканд грузіце, – дадае Сабака.
— Слухайце, – гаворыць Чапай, пэўна, для таго, каб зьмяніць тэму, – а ў вас бабкі ёсьць?
— А што? – насьцярожваецца Вася.
— Можам зьезьдзіць да цыганоў, узяць травы. Пасядзім, пачакаем вашага Карбюратара. А то так без пантоў сядзець, я ж ня п'ю.
— Ну, – кажа Вася, – можна і зьезьдзіць. Думаеш, ён зьявіцца?

— Хто яго ведае, – кажа Чапай. – Можа, зьявіцца, можа, не. Вам, дарэчы, шмоткі не патрэбныя? Там, джынсы, красоўкі. Праўда, з сэканду...

14.00

За таксоўку пагаджаецца башляць Вася, ён, здаецца, зусім абламаўся рабіць бізнэс на вадзяры, не такі ён, вядома, чалавек, ня можа рабіць грошы на сьвятым, таму мы выходзім за Чапаем – Чапай, Вася і я, Сабаку пакідаем ля апарата, тыпу, падтрымліваць агонь, каб ён вартаваў і час ад часу падстаўляў пад зьмеявік новую колбу, Чапай паказаў яму як, але строга загадаў з колбы ня піць, маўляў, негігіенічна, ты б маўчаў ужо, кажа яму Сабака, трыпэраносец хераў, яны заводзяцца, але мы іх расьцягваем, дакладней, мы выцягваем Чапая на двор, а там ён і сам супакойваецца – трыпэр-то ў яго і сапраўды ёсьць, што ж тут запярэчыш. У прынцыпе, у гэтым раёне таксоўкі не вядуцца, тут вядуцца экскаватары, ды і тое зрэдку, таму мы пізьдзячым аж да цырку, каля цырку пуста, скрозь шэрыя пліты прарастае трава, добрае лета, здаецца, яшчэ б Карбюратара на хаўтуры адправіць – наагул было б здорава, Чапай ловіць машыну, кіроўцы пужаюцца ягоных сініх штаноў, ніхто не спыняецца, нарэшце ён штосьці там спыняе, і мы пхаемся ўсярэдзіну і едзем да цыганоў, аб'яжджаючы вясёлкавыя калюжыны.

14.40

Цыганы жывуць на іншым краі гораду, за іншай рэчкай, у іх там цэлае паселішча, харкаўскія цыганы па-свойму ўцелясьнілі спрадвечную цыганскую мару пра сьвяты цыганскі мэгаполіс, яны ня сталі асабліва задрочвацца і там, ня ведаю, ваяваць за незалежнасьць, адбіваць тэрыторыі, папраўляць межы, проста пасяліліся масава, але разам з тым кампактна, па-над рэчкай, акапаліся, як маглі, і фактычна расчыніліся ў варожай усходняй сталіцы, такі вымраены Горад Сонца ў іх атрымаўся, горад у горадзе, можна сказаць, празь іхны раён праходзілі цывільныя трамвайныя маршруты і нават побач цягнулася лінія мэтро, але насамрэч акрамя цыганоў у гэтым раёне амаль ніхто

ня жыў, таму калі ты сюды трапляў (хаця чаго б ты сюды трапляў) і ня ведаў, дзе ты знаходзісься, ты б мог толькі зьдзіўляцца такой колькасьці цыганоў на вуліцах, то бок ня тое, каб іх на вуліцах сапраўды было шмат, проста там акрамя іх на вуліцах няма нікога, таму ты адразу заўважаў, што нешта тут ня тое, але ня мог зразумець – што менавіта. Цыганы жылі дружна, у горадзе акапаліся надоўга – будавалі моцныя невысокія будынкі зь белай цэглы і з гэтай самай цэглы выкладвалі навокал будынкаў парканы, падобна было да цаглянага складу, цяжка было нават здагадацца, што там робіцца – за гэтымі белымі цаглянымі гарамі, рэклямы ў раёне таксама амаль не было, нейкі такі сярэднявечны раён, я мяркую, што парканы такія высокія былі, каб паморак не прасачыўся празь іх на іхныя падворкі, я наагул іх не разумеў ніколі, гэтых цыганоў, а вось у Чапая тут быў знаёмы дылер, на глухой бакавой вуліцы, трэба было спачатку павярнуць направа і ўжо там спыніцца. Кіроўца высаджвае нас, доўга круціць у руках расейскія грошы, пералічвае па курсе, колькі мы яму вінныя, загінае пры гэтым пальцы правай рукі, я, напрыклад, так лічыць ня ўмею, потым кажа: добра, хопіць, мы выходзім, а ён хутка ўцякае.

15.10

І вось мы стаім пасярод пагорбаў белай цэглы, дрэваў амаль няма, сырая зямля пад нагамі, з-пад парканаў выбіваецца едкая трава, наверсе за хмаркамі час ад часу зьяўляецца сонца, і ніводнага табе цыгана навокал. Трэба ж так, думаю, жывуць сабе людзі – без антэнаў, безь перадатчыкаў, без савецкай улады, нават без нумароў на будынках, цікава, як Чапай знойдзе свайго дылера? Але Чапай добра арыентуецца ў такіх умовах, ён папраўляе акуляры, нешта там сабе вынюхвае, і нарэшце кажа: гэта тут, знайшоў. Мы падыходзім да іржавай брамы, і Чапай пачынае грукаць кулакамі па іржавай набухлай паверхні, па дарозе апавядаючы, што дылер ягоны – Юрык – па-свойму прыкольны мужык, ён недзе тут нарадзіўся, праўда, быў няўдалым цыганом, пасьля школы пайшоў рабіць кар'еру па партыйнай лініі, і цыганы яго праклялі, натаўклі грызла і выгналі з раёну, хоць ён і сам бы адтуль звалiў, паколькі яму

далі добрую кватэру ў цэнтры, ён працаваў у Кіеўскім, здаецца, райкаме. Для цыгана ён рабіў неблагія посьпехі, і яго ўжо зьбіраліся перацягнуць у абкам, але тут гены ў ім узялі верх, і ён – кажа Чапай – ці то нешта скраў, ці то кагосьці трахнуў, карацей, аблажаўся, з райкаму яго папёрлі, але ў партыі пакінулі, ня так ужо і шмат цыганоў у партыі было, накіравалі па той жа партыйнай лініі на чапаеўскі завод загадчыкам клюбу, ён там граў на баяне і вёў шахматную сэкцыю. Калі завод пачаў развальвацца, Юрык трымаў клюб да апошняга, ён жа бязбожна бухаў, зранку прыходзіў у клюб, браў баян і граў нешта з Кабзона, дадаючы да кожнай мэлёдыі нешта сваё, цыганскае. Са словаў Чапая, Юрык дэградаваў маральна і фізычна, сцаўся ў штаны проста на сцэне клюбу, спаў ва ўласных рыгаках, заматаўшыся ў нейкія агітацыйныя транспаранты, так трывала, ажно пакуль дырэктар заводу не забраў у яго баян і не прадаў яго на рынку, пералічыўшы атрыманую, даволі мізэрную, паводле Чапая, суму ў залік зьнешняга заводзкага доўгу. Юрык зашыўся, кватэру ў яго яшчэ перад гэтым забраў нейкі акцыянэрны банк, аддаўшы яму ў якасьці кампэнсацыі левыя акцыі, Юрык спрабаваў іх недзе сплавіць, але іх, вядома ж, ніхто ня браў, адным словам, жыцьцё зрабіла поўнае кола, і Юрыку не заставалася нічога іншага, як вяртацца у свой сярэднявечны раён зь яго белай цэглай і суворай герархіяй. На дзіва, Юрыка прынялі як роднага, цыганы народ камунікабэльны, яшчэ раз далі яму ў лыч і прабачылі ўсё, заадно забралі ягоныя левыя акцыі і недзе іх усё ж прадалі, уцюхалі нейкім лохам-фэрмэрам, хоць зь Юрыкам грашыма не падзяліліся, ну, гэта ўжо іхныя справы, яны лепш ведаюць. Юрык спакойна зажыў у адным з цагляных будынкаў за белым цагляным плотам, у цэнтар больш не імкнуўся, нават хацеў ажаніцца, але не знайшоў нявесты – пэўна, іхныя сярэднявечныя законы забаранялі ім выходзіць замуж за камуністаў, добра, што яго наагул на вогнішчы не спалілі, ён патроху падключыўся да жыцьця грамады, спачатку гандляваў жуйкамі ў кіёску, потым пайшоў угору і пачаў гандляваць вадзярай у краме, потым – па ўзрастаньні – перайшоў на траву, і проста ўжо сядзеў дома, каму трэба – прадаваў лекавае зельле, каму ня трэба – таго пасылаў на хуй і страляў зь бярданкі з-за цаглянага плота, падняўшы мост і затапіўшы равы вадой, Чапая ён памятаў яшчэ з часоў працы ў

клюбе, Чапай быў сталым кліентам, хоць ён нам чагосьці яўна не дагаворваў, прынамсі мне так здалося, вось.

15.15

Празь нейкія пяць хвілінаў брама рыпіць, і зьяўляецца галава дылера. Юрык не падобны да цыгана, ва ўсялякім выпадку я сабе цыганоў звычайна іншымі ўяўляў, я, канечне, не чакаў, што выйдзе чувак у чырвонай кашулі ў буйны гарох з фанэрнай гітарай у руках, ну, але нешта ж нам у школе пра цыганоў апавядалі, ці як, а тут выходзіць нейкі худы альбінос у шэрым паношаным касьцюме і зь бяльмом на левым воку, недаверліва нас разглядае, яны з Чапаем пачынаюць пра нешта шаптацца, прыглядацца, ледзь не абнюхваць адзін аднаго, нарэшце дылер махае нам рукой і мы ідзём за ім. Мне цікава, што можа быць за байніцамі – гарматы, алебарды, прылады для катаваньня, але ўсё спакойна, на падворку стаіць невялічкі хляўчук зь белай цэглы, каля ганка – сабачая буда, таксама зь белай цэглы, у будзе ляжаць куры, адна залезла на буду і стаіць там, о – куры, думаю я, уласна, гэта і ўсё, што я думаю, і мы заходзім у хату. У пакоі стаіць стол і больш няма нічога. Сьцены голыя, на адной, праўда, вісіць дарагі кілім, прыхуячаны па баках цьвікамі, цьвікі добра відаць, нічога так – нармальныя, добрыя цьвікі. Юрык кажа нам пачакаць і тут, бліскаючы бяльмом, выходзіць у суседні пакой, Чапай чамусьці нэрвуецца, хоць паказвае нам, што ўсё ок, зараз возьмем, я разглядаю цьвікі ў кіліме, і раптам бачу на падваконьні вялікую рыбіну, нават ня ведаю, што за рыбіна, я іх ніколі ня мог адрозьніць, ну, там, рыбы, жабы – і ўсё, фортка адчыненая, і вакол рыбіны лётае некалькі пчолаў, ляніва кружляюць, адкуль яны толькі ўзяліся па такім надвор'і, сонныя і зусім неагрэсіўныя, хоць, можа, менавіта так і павінна быць. Сядаюць на цела рыбіны, поўзаюць па ім, я падыходжу бліжэй, спрабую перавярнуць нябожчыцу і адразу адторгваю руку – рыба зь сярэдзіны проста выжраная гэтымі драпежнікамі, іх там цэлы рой, калі я дакранаюся да рыбіны, яны вылятаюць адтуль і круцяцца над тушай, але хутка супакойваюцца і зноў залятаюць у сярэдзіну, якая брыдота, думаю я, мёртвая рыба, мёртвая цыганская рыба, выжраная зь сярэдзіны, які жах.

Заходзіць Юрык з пакункам травы, бачыць мяне каля рыбіны і таксама ня можа ад яе адарвацца, пчолы зноў запаўзаюць у сярэдзіну, і ёсьць у гэтым нешта настолькі моташнае, што мы ўсе глядзім і ня можам адвесьці ад гэтай чортавай рыбіны вачэй – і я, і Вася, і Чапай, і Юрык, і нават Ісус на ягоным укрыжаваньні, што выбіваецца з-пад ягонай кашулі, пільна-пільна глядзіць на выжраную пчоламі цыганскую рыбіну, і нават адвярнуцца ня можа. Юрык нарэшце кладзе пакунак на стол, і мы пачынаем яго нюхаць, мацаць, глядзець на сьвятло, карацей, усім сваім выглядам паказваем, што нам вядома, як выглядае добрая трава, і што нас не наябеш, хай ты нават тройчы цыган і колішні загадчык клюбу, мы цябе бачым наскрозь, хоць напраўду ні хера мы ня бачым, Вася дастае пачак грошай, адлічвае, Юрык сьвідруе яго сваім бяльмом, Ісус глядзіць пільна-пільна, Юрык скардзіцца, што будзе мець праблемы з рублямі, гэта ж па курсе трэба лічыць, невядома, што там з баксам, з баксам усё нармальна, кажа Вася, бакс стаіць, хуй у цябе стаіць, кажа яму Юрык, але грошы бярэ і выводзіць нас на двор, я яшчэ чую, як пчолы ціха перабіраюць лапкамі ў рыбіным чэраве, хоць, можа, гэта мне толькі здаецца.

На дварэ Юрык холадна з намі разьвітваецца, мы праходзім зь дзясятак мэтраў, Юрык па-ранейшаму стаіць ля брамы, не заходзячы ў двор, і тут нарэшце Чапай выдае, ён раптам спыняецца, стойце, кажа нам, можам узяць яго на понт, ты што, кажу я, навошта? ён там усё адно адзін, вы ж самі бачылі, нічога ня зробіць, перастань, палохаецца Вася, пайшлі адсюль, усё ж нармальна, ды ня сцыце, кажа Чапай, зараз я яго разьвяду, ён дастае пакунак з травой, чагосьці ў ім калупаеца, так, нібы перавярае, засоўвае назад у кішэню, паварочваецца і ідзе да Юрыка, за некалькі мэтраў ад яго спыняецца і крычыць:
— А трава ў цябе – гаўно!

Во, бля, – думаю я, – бля.
— Гаўно! – паўтарае Чапай больш упэўнена.

І тут Юрык раптам зрываецца і зьнікае ў двары, мы ня ведаем, што рабіць, ну, то бок мы з Васем Камуністам, толькі не Чапай, той, здаецца, у курсе, што яго чакае, напэўна, ён ужо ня першы раз так бярэ на понт свайго дылера, таму ён хутка вяртаецца і

крычыць нам: рвем адсюль, і мы сапраўды рвем і, трэба сказаць, не дарэмна, бо брама за намі зноў адчыняецца і адтуль выскоквае Юрык зь бярданкай, з вачэй ляцяць іскры, нават з таго, што зь бяльмом – таксама ляцяць, хоць і ня так моцна, мы бяжым, нам галоўнае дацягнуць да рогу, а там ужо цывілізацыя, трамваі, мэтро, сякія-такія нармальныя стасункі між людзьмі, а за нашымі сьпінамі – Юрык зь бярданкай і ягоны сярэднявечны замак з курамі і пчоламі-кілерамі, нам ёсьць ад чаго ўцякаць і мы ўжо выкладваемся, Васю горш – ён бяз пасу, трымае рукамі джынсы, каб не згубіць іх, Юрык пры гэтым зводзіць куркі і страляе ў неба над нашымі галовамі, раз, потым другі, у нас ён, дзякаваць богу, нават ня цэліцца, а то невядома, чым бы ўсё скончылася, ён страляе ў неба і весела сьмяецца, я гэта досыць добра чую, калі паварочваю за белы цагляны рог, нам у твар б'е сьвежы летні вецер, уздымаючы ў паветра папяровае сьмецьце, пыл і пер'е, і гэтае пер'е круціцца над нашымі галовамі, бо я нават ня ведаю, каму яно належыць – птушкам з цаглянага палацу ці толькі што падстрэленым анёлам, што прыляцелі вось да Юрыка, скажам, каб палегчыць ягоную сярэднявечную адзіноту, а ён, дэбіл, адагнаў іхную беласьнежную дружную зграю назад у дажджлівае неба і застаўся адзін – застаўся і стаіць сабе там – пасярод пустога цыганскага мэгаполісу, самотны-самотны дылер, абдураны лёсам прадавец радасьці, якому няма нават з кім пагаварыць, толькі Ісус на ягоным укрыжаваньні сумна хістаецца – зьлева направа, справа налева, зьлева направа.

17.00 – 20.00

— Вы ў гэтым проста не разьбіраецеся. Вы проста гаворыце: марксізм-марксізм, і не разумееце, што гэта.
— Ну-ну, адзін ты ў нас усё разумееш.
— Пры чым тут я? Гаворка не пра мяне. Вось вы гаворыце марксізм. Насамрэч, марксізм перамагае, разумееце?
— Ну, вядома. І дзе ж ён перамагае?
— Марксізм перамагае нідзе. Ён перамагае ў прынцыпе.
— Ну, вядома ж.
— Моц марксізму ў ягонай самадастатковасьці. Скажам, Троцкі.
— Троцкі – жыд.

— Так. Вы ведаеце, дзеля чаго Троцкі паехаў у Мэксыку?
— Па-мойму, яму Коба даў трындзюль.
— Коба таксама жыд.
— Коба?
— Так. Ільліч таксама.
— Ільліч – казах.
— Татарын.
— Казах.
— Якая розьніца?
— У казахаў няма пісьмовасьці.
— А ў татараў?
— І ў татараў таксама няма.
— Не, Коба ня жыд. Коба – рускі. У яго прозьвішча расейскае – Сталін.
— Гэта не ягонае прозьвішча.
— А чыё?
— Гэта прозьвішча ягонага сына. Васі Сталіна. Ён быў футбалістам.
— Ага, а Троцкі – баскетбалістам. Працоўныя рэзэрвы.
— Пры чым тут Троцкі, – гаворыць Чапай ужо знаёмую мне фразу, седзячы на зэдліку і распальваючы папяросу. – Троцкі тут ні пры чым. Ты, – кажа ён Васю, перадаючы яму папяросу, – мусіў бы гэта разумець. Яны, – ён выдыхае дым у наш бок, – гэтага ніколі не зразумеюць, іх заразілі бацыламі капіталу, але ты, – ён забірае ў Васі папяросу, яшчэ раз зацягваецца і вяртае папяросу Васю, – павінен гэта разумець. Ты ведаеш пра тэорыю пэрманэнтнага пахуізму?
— Што? – закашліваецца Вася і перадае папяросу мне. – Якога пахуізму?
— Пэрманэнтнага, – папраўляе акуляры Чапай. – Ну, гэта я яе так называю. Напраўду яна завецца тэорыя пэрманэнтнага распаду капіталу. Але мне больш падабаецца называць яе тэорыяй пэрманэнтнага пахуізму.
— Ну, – устаўляе Сабака, забіраючы ў мяне папяросу, – пэрманэнтнага пахуізму – больш прыкольна.
— А што гэта за тэорыя? – пытаюся я, зноў у чаканьні сваёй чаргі.
— Тэорыя простая, – кажа Чапай, выпускаючы дым і перадаючы папяросу далей па коле. – Яе распрацавалі таварышы з данецкага абкаму.

— О, – кажу, – гэтыя зробяць.

Чапай глядзіць на мяне запытальна.
— Землякі, – тлумачу.

Ён ухвальна ківае галавой, дастае з-пад стала трохлітровы слоік зь нейкім морсам, адпівае зь яго і працягвае мне. Не-не, адмоўна махаю рукой – я лепш папалю.
— Вось, – працягвае Чапай, абцёршы рукавом крывавыя памідорныя разводы. – Тэорыя, у прынцыпе, рэвізіянісцкая. Базуецца на пераглядзе асноўнай ідэі Маркса. Ідэі пра самадастатковасьць пралетарыяту як такога. Ты чытаў, – пытаецца ён у мяне, бо Вася схаваўся недзе за дымам, – ліставаньне Маркса і Энгельса?
— Не, – кажу, – але я ведаю, што яны сябравалі.
— Правільна, – кажа Вася, – яны сябравалі. У добрым сэнсе сябравалі, ты ня думай.
— Ясна, – кажу, – у добрым сэнсе.
— У іх, – працягвае Чапай, – было прыкольнае ліставаньне, па-свойму прыкольнейшае за «Капітал».
— Што можа быць прыкольнейшым за «Капітал»? – трохі ня ў тэму ўстаўляе Сабака, але я перадаю яму папяросу, і ён замаўкае.
— У саўку, – гаворыць Чапай, – базавым прызналі менавіта «Капітал». У гэтым, як на мяне, галоўная трагічная памылка савецкай ідэалёгіі. Увагу трэба было зьвяртаць на ліставаньне. На ліставаньне Маркса і Энгельса. Таварышы з данецкага абкаму гэта давялі, – упэўнена гаворыць ён і дабівае пятку.

Нейкія дваццаць-трыццаць хвілінаў усе маўчаць, думаючы пра таварышаў з данецкага абкаму. Нарэшце Чапай аддупляецца і ладзіць новую папяросу.
— У адным зь лістоў, – кажа Чапай, зацягваючыся і перадаючы папяросу непрытомнаму Васю, – гэта з раньняга ліставаньня, – тлумачыць ён, – так званага гамбурскага пэрыяду...
— Проста бітлз нейкі, – кажу я.
— Маркс тады шмат экспэрымэнтаваў з грамадзкай сьвядомасьцю.
— Што? – на гэтых словах Вася прачынаецца.
— Тут, – тлумачу, – Чапай кажа, што ў свой час твой улюбёны

Маркс у Гамбургу, на Рэпэрбане, экспэрымэнтаваў з пашырэньнем сьвядомасьці.
— Кіслату жэр, – Сабака ніяк ня можа дачакацца сваёй чаргі, таму заўважна нэрвуецца.
— У выніку гэтых экспэрымэнтаў, – працягвае Чапай, – яму адкрыўся прынцып БЛЯ.
— Што-што?
— Базісная левая ячэйка, – гаворыць Чапай. – Ідэя простая – нам ад самага пачатку паказваюць хібную карціну вытворчых адносінаў. Хібнасьць яе, – працягвае Чапай, – палягае насамперш у нібыта неабходнасьці пэрманэнтнага разрастаньня капіталу. Гэта – фікцыя, – рашуча кажа Чапай, выхоплівае ў мяне па-за чаргой папяросу і глыбока зацягваецца.
— Што – фікцыя? – не разумею я, спрабуючы адабраць папяросу.
— Усё фікцыя, – падумаўшы, адказвае Чапай. – Пралетарыят самадастатковы. Таму ідэальным і ідэалягічна правільным ёсьць прынцып базісных левых ячэек, так званых БЛЯ. Базісная левая ячэйка, сама сабой, таксама самадастатковая.
— Слухай, – кажу, – твой Маркс, ён жа проста Буда нейкі.
— Ужо ня кажучы пра Энгельса, – устаўляе Вася скрозь сон.
— Вось. Кожная БЛЯ фармуецца паводле прынцыпу мурашніка. Асновай такога фармаваньня ёсьць асобна ўзятае прадпрыемства, там, завод, фабрыка, ці яшчэ нейкая байда. І вось вакол гэтай байды зьбіраецца БЛЯ, як мурашы вакол мурашніку.
— Праўда? – пытаюся. – А хто выконвае ролю мурашынае каралевы?
— Парткам, – упэўнена кажа Вася.
— Ага, – кажу. – Значыць трахаць усе будуць парткам?
— Парткам, – упэўнена паўтарае Чапай.
— Добра, – пагаджаюся. – Ну, а далей?
— І гэта ўсё, – гаворыць Чапай. – Паводле гэтага прынцыпу будуецца жыцьцё грамадзтва, калі верыць Марксу.
— А ўлада? – пытаюся я.
— Улада не патрэбная. Улада ў гэтай сыстэме лішняя. Улада – гэта таксама фікцыя. Вось табе, – зьвяртаецца Чапай да Сабакі, спрабуючы выманіць у яго папяросу, – улада патрэбная?
— Не, – адказвае Сабака, – мне не патрэбная.

— А табе? – Чапай зьвяртаецца да мяне, не спускаючы пры гэтым аднаго вока з папяросы.
— Ну, нейкая першасная, – адказваю, – мінімальная...
— Вось, – урачыста прамаўляе Чапай і вырывае папяросу ў Сабакі. – Вось. Першасная. Менавіта пра гэта я і кажу. Неабходная толькі першасная ўлада, улада, збудаваная па аўтаномным прынцыпе. Усё іншае – фікцыя. Уся іншая, больш структураваная ўлада, не функцыянуе. Адпаведна, яна і не патрэбная, – і ён перадае мне папяросу як нейкі, толькі што выйграны мной, прыз глядацкіх сымпатый. На Васю мы ўсе забываемся, ён на нас – таксама. Наагул, – працягвае Чапай, – не патрэбная і большасьць структураў і інстытуцыяў, таму належыць усё гэтае гаўно раздрабніць і паступова зьнішчыць.
— І што твой Маркс прапануе Энгельсу ўзамен? – пытаюся я.
— Прынцып ПыХ, – кажа Чапай.
— Як-як? – нават Сабака перапытвае.
— Пралетарская Хартыя, – гаворыць Чапай.
— Пралетарская Хартыя – гэта ПХ, а ня ПыХ, – кажу я.
— Так, я ведаю, – адказвае Чапай. – Гэта для мілагучнасьці. Прынцып ПыХ дае ўсяму гэтаму ход, Хартыя пры гэтым выконвае ролю элемэнтарнага яднальнага мэханізму. Прыпыняецца ўсё далейшае назапашваньне капіталу і пачынаецца ягоны паступовы распад.
— Як гэта?
— Усё вельмі проста, – Чапай зноў прыкладаецца да крывавага слоіка. – У прынцыпе, у выніку папярэдняга беспрычыннага і маламатываванага назапашваньня капіталу адбылося перанасычэньне сродкамі жыцьцядзейнасьці, і як вынік – адзіным лягічным варыянтам у гэтай сытуацыі выступае распад існых запасаў.
— Гэта як?
— Ну, – спрабуе патлумачыць нам Чапай, – карацей, насамрэч нічога вырабляць ня трэба. Кожная асобна ўзятая БЛЯ можа вольна жыць некалькі дзясяткаў гадоў за лік ужо існага патэнцыялу. Гэта значна спрашчае сам мэханізм функцыянаваньня грамадзтва. На практыцы гэта адбываецца прыблізна так – вось, скажам, наш завод. Вакол яго ўтвараецца БЛЯ, якая, у сваю чаргу, падпарадкоўваецца гарадзкой ПыХ, кожная БЛЯ бярэ на сябе пэўную колькасьць аб'ектаў агульнагарадзкой інфраструктуры, захоплівае ўладу і ўсё гэта

расхуячвае.
— Навошта? – не разумею я.
— У гэтым і палягае сутнасьць прынцыпу пэрманэнтнага пахуізму, – кажа Чапай. – Мы нішчым структуру і харчуемся атрыманай сыравінай. Напрыклад, захопліваем банк і бабкі выдаткоўваем на жыцьцё і функцыянаваньне БЛЯ, захопліваем гандлёвыя цэнтры і ўсе шмоткі раўнамерна разьмяркоўваем сярод членаў БЛЯ, захопліваем канторы і ўсю бытавую апаратуру забіраем сабе, захопліваем тачкі і пускаем іх на патрэбы ячэйкі.
— Захопліваеце фэрму і раздаяце ўсім па карове, – раптам устаўляе Сабака.
— Так, – гаворыць Чапай, – так. Адным словам, таварышы з данецкага абкаму падвялі пад усё гэта эканамічную базу, пералічылі ўсё, зрабілі сур'ёзныя маніторынгавыя апытаньні, – Чапай дастае нейкія сшыткі і размахвае імі ў паветры, – выходзіць так, што існая грамадзкая інфраструктура, уся цяперашняя база капіталу, здатная пракарміць сябе саму, як мінімум, на працягу бліжэйшых 67 гадоў.
— А пасьля?
— Ну, што пасьля? – разгублена кажа Чапай. – Пасьля штосьці прыдумаем. Тэорыя, у прынцыпе, новая, яшчэ не апрабаваная на практыцы, у яе рэальна ўнесьці нейкія карэктывы. Але ўвогуле, – паўтарае ён, – ня трэба замарочвацца на далейшым нарошчваньні вытворчасьці, наадварот – вытворчасьць належыць максымальна скараціць, закансэрваваць, адным словам, а прыродныя рэсурсы – максымальна эканоміць, паколькі на бліжэйшыя 67 гадоў хопіць і таго, што ёсьць.
— Прыкольна, – кажу. – Мне асабліва пра гандлёвыя цэнтры спадабалася. І пра фэрмы, – кажу я Сабаку.
— Так, – пагаджаецца Чапай, – ідэя вельмі правільная. Галоўнае – справядлівая, бяз розных там капіталістычных наёбак.
— Пачакай, – кажу я, – але як гэты твой пых зможа ўсё гэта кантраляваць, калі існуе процьма рэчаў, якія ўсё адно вымагаюць цэнтралізацыі?
— Напрыклад? – пытаецца Чапай.
— Ну, я ня ведаю. Транспарт там, напрыклад, мэтро.
— Прычым тут мэтро?
— Ну, не мэтро, – адступаю я. – Але, скажам, авіякампаніі. Як

твой пых іх будзе кантраляваць?
— Авіякампаній ня будзе.
— Як гэта ня будзе? – дзіўлюся я. – А як жа народ будзе лятаць?
— А навошта яму лятаць? Якая з гэтага РЭАЛЬНАЯ карысьць? Вось ты, – цісьне ён на Сабаку, – лятаў калі-небудзь на самалёце?
— Не, – кажа Сабака, – я на трамваях у асноўным.
— Вось, – гаворыць Чапай, – і так большасьць насельніцтва. Авіялініі, аэрапорты, стуардэсы – гэта фікцыя. Насамрэч, у гэтым няма РЭАЛЬНАЙ патрэбы, разумееш? Трэба пакінуць толькі тое, у чым ёсьць РЭАЛЬНАЯ патрэба.
— Добра, – кажу я, – а войска?
— У войску таксама няма РЭАЛЬНАЙ патрэбы. Якая карысьць ад войска? Войска створанае толькі дзеля таго, каб апраўдваць у нашых вачах мэтазгоднасьць свайго існаваньня. Для гэтага час ад часу арганізоўваюцца войны, бамбардаваньні, рэвалюцыі, працуе абаронны комплекс, назапашваецца навукова-тэхнічны патэнцыял, ствараецца сыстэма прапаганды. Але РЭАЛЬНАЙ патрэбы ў гэтым няма, калі войска распусьціць, грамадзтва і далей будзе нармальна функцыянаваць, разумееш, таму ў ім проста няма ПАТРЭБЫ.
— Добра, – зноў кажу я, – а органы?
— Што? – надпівае Чапай са свайго крывавага слоіку.
— Ну, унутраныя органы. Міліцыя, паліцыя, гэбэ, цээру, я ня ведаю. Гэта што – таксама фікцыя?
— Так, гэта таксама фікцыя.
— Гэбэ – гэта фікцыя?
— Фікцыя.
— Дакладна?
— Абсалютна.
— Мне гэта падабаецца, – кажу я.
— Вось ты калі-небудзь, – працягвае Чапай катаваць Сабаку, – сутыкаўся з кгб?
— Так, – неспадзявана гаворыць Сабака, – да нас некалі ў школу, я вучыўся ўжо ў дзясятай клясе, прыходзіў гэбэшнік. Апавядаў пра работу, агітацыю разводзіў. Нешта пра прэзыдэнта казаў.
— І што?
— Нічога. Мне, у прынцыпе, спадабалася. Я да яго потым на

калідоры падышоў, кажу, камадзір, а да вас на працу ўладкавацца можна? Ён мяне паслаў. Кажа, у цябе з рота задужа сьмярдзіць, каб у гэбэ служыць. Ну, і ўсё.
— Вось бачыш, – павучальна кажа яму Чапай. – Усе сілавыя структуры працуюць ВЫКЛЮЧНА на падтрымку ўласнай жыццядзейнасьці, яны нічога не вырабляюць, ад іх няма КАРЫСЬЦІ. Калі заўтра гэбэ закрыць, нічога ня зьменіцца. Нічога ня зьменіцца, калі адкрыць ці закрыць межы, калі распусьціць дыпляматаў – запраста можна жыць бязь зьнешняй палітыкі. Без унутранай, у прынцыпе, таксама. Можна жыць без адмінрэсурсу – разам са зьнікненьнем адмінрэсурсу зьнікаюць і ўсе тыя праблемы, для вырашэньня якіх ён створаны. Не патрэбныя канторы, жэкі, упраўленьні, адміністрацыі – адпаведна, не патрэбная ніякая дакумэнтацыя, і наадварот. БЛЯ кантралююць увесь той мінімальны вытворчы працэс, які аж на цэлыя 67 гадоў забясьпечвае жыццядзейнасьць грамадзтва. Усе іншае – ад д'ябла, – пераможна гаворыць Чапай і перадае мне новую папяросу, але я ўжо сігаю сьледам за сябрам-Васем, і бачу, як Вася занураецца ўсё глыбей і глыбей, адштурхваючыся ад цяжкай сіняй вады рукамі і нагамі, і я бачу перад сабой толькі стаптаныя падэшвы ягоных старых красовак, за імі я і плыву і чую ўжо адтуль

Жыццё – гэта як касьмічная ракета, і калі ты залез у яе, то сядзі і нічога не чапай, проста будзь гатовы да таго, што жыццё тваё крута зьменіцца. Ва ўсялякім разе дзяцей у цябе дакладна ня будзе. Ды і наагул – нармальнага сэксу. Гэта ты мусіш ад самага пачатку ўлічваць – або сэкс, або космас, і тут ёсьць з чаго выбіраць, таму што насамрэч ніводнае траханьне ў сьвеце, хай нават і найбольш падрыўное траханьне, ня вартае таго вялікага і прыўкраснага, што адкрываецца табе з ілюмінатара тваёй бляшанай ракеты, некаторыя краявіды, некаторыя ляндшафты вартыя таго, каб за іх заплаціць найдаражэйшым, што ў цябе ёсьць, то бок эрэкцыяй, але каб зразумець гэта, трэба быць прынамсі касманаўтам, ну, на крайняк – анёлам, што ва ўмовах распаду капіталу – аднафігственна.
— Я не разумею, – кажу я скрозь сон, – чаму ўсё-ткі пэрманэнтны пахуізм?
— А таму, – адказвае Чапай і шчасьліва ўсьміхаецца мне з-за

трансгаляктычных промняў, – што ўсё похуй: бабкі – похуй, сыстэма плянаваньня – похуй, інвэстары – похуй, міністэрства – похуй, – ён, здаецца, завёўся, – дзяржава – похуй, транснацыянальныя карпарацыі – похуй, спайка капіталу – похуй, сфэры ўплыву – похуй, пашырэньне рынку на ўсход – похуй.
— Мірны космас – похуй, – дадае Вася.
— Няма сумневу, – сур'ёзна гаворыць Чапай, і ўсе змаўкаюць.

20.30

Недзе далёка-далёка, на ўсходзе рэспублікі, зусім побач зь дзяржаўнай мяжой, неба пахне ранішнім лесам, пахне зусім асабліва, брызэнтавымі намётамі і яловымі галінамі, што кладуць на гэтыя намёты свае цяжкія лапы. Я іду доўгай-доўгай лясной сьцежкай, леваруч і праваруч ад мяне – высокія і цёплыя сосны, што саграваюць сваім подыхам пясок навокал, і паветра, і ранішні суботні лес, і птушак, што трапляюцца час ад часу, і наагул усё гэтае неба, і, вядома ж, дзяржаўную мяжу, сосны – гэта такія сабе батарэйкі, якія пусьцілі карані акурат уздоўж ракі, раку відаць за ствалінамі леваруч, і мы ідзём уздоўж яе, уласна, мы ідзём угору, супраць плыні, а галоўнае – я люблю выходныя, мне цалкам вядома, што сосны на выходныя асабліва цёплыя, а неба – асабліва мірнае. На мне нейкая дурацкая футболка і дурацкія шорты, і запыленыя сандалеты, якімі я буцаю сасновыя шышкі, уздымаючы хмаркі ранішняга пылу, тады мая сяброўка паварочваецца да мяне і просіць, каб я супакоіўся і такога не рабіў. Маёй сяброўцы шаснаццаць, яна пагадзілася са мной пагуляць, уласна, яе папрасілі мае бацькі, якія сябруюць зь яе бацькамі, яны ўсе засталіся на рачным пляжы, сядзяць сабе і гатуюць салаты са сьвежай вільготнай гародніны, плаваюць у ранішняй рэчцы, наперадзе цэлы ўікэнд, таму яны займаюцца сваімі нецікавымі дарослымі справамі, але я знайшоў сярод сосен сьцяжынку, і мая знаёмая без асаблівага, трэба заўважыць, жаданьня павяла мяне па ёй, так, абы я нарэшце прайшоўся і заткнуўся і ўжо нікога больш не даставаў, хоць яна да мяне даволі добра ставіцца, дакладней, гэта я за ёй пастаянна цягаюся, але яна трымаецца даволі добра й асаблівых прэтэнзіяў да мяне не

прад'яўляе – так толькі – каб не ўздымаў пылу, каб не хапаў яе за рукі, адным словам – не паводзіўся, як дэбіл. Мне падабаецца пясок пад нагамі, мне падабаецца мокрая трава на пяску, мне падабаюцца сосны, у якіх трывожна перацякаюць электроны, мне падабаюцца крыклівыя бестурботныя птушкі на высокіх сасновых галінах, мне падабаецца неба, бо яно цягнецца далёка-далёка і ніколі не сканчаецца, гэта мне падабаецца найбольш, я вельмі люблю, калі нешта ніколі не сканчаецца, і неба – адна з такіх рэчаў, мне падабаецца, што гэтая сьцяжынка таксама не сканчаецца, таксама цягнецца без канца супраць плыні, то набліжаючыся да яе, то зноў закочваючыся за стваліны, нарэшце мая знаёмая не вытрымлівае, добра, кажа, пайшлі, акунёмся і назад, я спрабую вытаргаваць у яе яшчэ з паўкілямэтра, але яна кажа – досыць, купацца і назад, і я вымушаны з гэтым зьмірыцца. Яна зварочвае са сьцежкі і ідзе проста да вады, я намагаюся не адставаць, іду сьледам і разглядаю яе чорны бліскучы купальнік, такія тады, у канцы 70-х, акурат былі ў модзе, яе купальнік асаблівы – на чорным фоне рассыпанае жоўтае, чырвонае й аранжавае лісьце, сапраўдны лістапад, хоць у лістападзе, здаецца, ніхто не купаецца, але ў яе цэлы ворах лісьця на целе, і цела ў яе – прыгожае і моцнае, ёй вельмі пасуе гэтае лісьце, гэта нават я, у свае шэсьць, разумею, інакш я б за ёй не ішоў, вада яшчэ не пасьпела прагрэцца, бераг пусты і прахалодны, мая сяброўка падрульвае да вады і пачынае паступова ў яе заходзіць, я гляджу, як пад вадой зьнікаюць яе ступы, яе высокія цёмныя лыткі, яе калені, яе сьцёгны, нарэшце яна падае на паверхню вады, топячы ў ёй усё сваё лісьце – і жоўтае, і чырвонае, і аранжавае, і паварочваецца да мяне – давай, крычыць, давай, хадзі сюды, холадна, кажу я зь берагу, перастань, крычыць яна, нічога ня холадна, хадзі сюды, яна выплывае на сярэдзіну ракі, плынь пачынае зносіць яе ўніз, і я раптам пужаюся, што вось яе панясе ўніз, а я застануся тут адзін і буду стаяць на гэтым беразе нікому не патрэбны, перад халоднай глыбокай вадой, што цячэ невядома куды, і я не вытрымліваю і скачу ў ваду, нават забыўшыся, што ня ўмею плаваць, і кіруюся да яе, яна заўважвае мяне і пачынае падплываць да берагу, я б'ю па вадзе рукамі, намагаючыся не захлынуцца яшчэ на плыткім, і нарэшце яна падплывае і, пераводзячы дых, весела крычыць – давай руку, і я працягваю

ёй руку, і ў гэты самы час мяне проста разрывае, і ўся гэтая вада цячэ вакол мяне, цячэ ў адным напрамку, увесь час у адным напрамку, і мне ад гэтага так добра, нібы мне зусім ня шэсьць, а ўсе шаснаццаць, як і маёй сяброўцы, маёй біг ўайт маме, што цягне мяне за сабой супраць плыні, і так моцна трымае за руку, што калі б я мог, я б проста скончыў, але я толькі трымаюся за яе і не магу кончыць, зусім-зусім не магу скончыць, і так усё жыцьцё.
— Каса, – кажа ён. – Абшчак. Агульная каса, якая фармуецца агульнымі высілкамі. Скарочана – АК.

Чапай, страціўшы нас з Васем, трымаецца дзьвюма рукамі за апошняга суразмоўцу – Сабаку.
— Рабочая каса, – кажа Чапай. – Ніякіх банкаў. Банкі – гэта наёбка.
— Фікцыя, – падказвае Сабака.
— Правільна.

Нейкую хвіліну яны маўчаць, я зноў засынаю, але тут Чапай кажа:
— У прынцыпе, – гаворыць ён, – тут таксама ёсьць каса.

Сабака разгублена акідвае вокам пакой.
— На заводзе, – тлумачыць Чапай. – Наш дырэктар трымае яе ў парткаме. Колішнім парткаме, – дадае ён.
— Ну? – Сабака насьцярожваецца. Я таксама прачынаюся.
— У прынцыпе, – працягвае Чапай, – сёньня выходныя, ахова толькі на прахадной. Тэрыторыю абыходзяць двойчы на зьмену. Я ведаю іхны маршрут і расклад.
— Ну?
— У прынцыпе, – удакладняе Чапай, – гэта не ягоныя грошы. Не ягонай працай зароблены. Гэта працоўныя грошы. Абшчак.
— Як у Маркса? – пытаецца Сабака.
— Як у Маркса, – згаджаецца Чапай. – Можам узяць.
— Вы што, – кажу я, прачнуўшыся, – ёбнуліся? Замятуць адразу. Ты што, – кажу Сабаку, – ня бачыш? Ён жа паехаў на сваім пыху, ён жа цяпер не з табой размаўляе, ён жа з Карлам Марксам гаворыць, прычым гамбурскага пэрыяду.
— Менш трындзі, – крыўдзіцца Чапай. – Ніхто цябе не замяце. Ахоўнікаў усяго двое. Гэты завод рэгулярна хтосьці бамбіць,

пачынаючы з дырэктара. Тут ужо красьці няма чаго.
— Ну, – кажу, – а за якім херам мы туды палезем?
— Я сёньня бачыў, – сьцішвае голас Чапай, – як дырэктар нешта ў сябе пакаваў.
— Што?
— Ня ведаю. Можа, бабкі, можа, апаратуру. Да яго раніцай прыяжджалі акцыянэры, падагналі мікрааўтобус, і яны туды пачалі выносіць нейкія скрыні. Забілі пад завязку салён і паехалі. А некалькі скрыняў засталося, я сам бачыў.
— Ну вядома, – кажу, – там падшыпнікі якія-небудзь, а мы падстаўляцца будзем.
— Ды няма ў яго, – шэпча Чапай, – ніякіх падшыпнікаў. А калі і ёсьць – у парткаме ён іх не трымае. Там бабкі. Або апаратура. Ён, сука, замкі нават зьмяніў, я сам бачыў.
— Замкі?
— Замкі.
— Тады як мы туды залезем? – не разумею я.
— Праз дах, – кажа Чапай. – Я ведаю спосаб. Толькі трэба цяпер ісьці, пакуль яшчэ сьветла, і пераседзець на даху гадзіны да другой – да трэцяй, пакуль ахоўнік пройдзе. Потым спусьцімся і ўсё вынесем. Усё чыста, ніякіх сьлядоў.
— Ён жа адразу цябе вылічыць, – кажу.
— У мяне алібі, – кажа Чапай.
— А, сапраўды, у яго трыпэр, – шэпча мне Сабака, думаючы, што Чапай яго ня чуе.

20.45

Мы згаджаемся ісьці. Бяз Васі. Я кажу – давай так: Вася застанецца тут, тыпу на пасту, разумееш? Ён, у прынцыпе, наш, і давай яго таксама лічыць, але ён цяпер на пасту, Вася ў гэты час пераварочваецца на іншы бок і падае з крэсла. Мы падымаем яго змучанае цела і перакладваем на тапчан, я з падазрэньнем гляджу, што там Чапай сабе наслаў, а то мы з Васем пакуль жывём у адным пакоі, яшчэ прыцягне што-небудзь, ну, хопіць, думаю, і мы ідзём. Чапай нас праводзіць па вячэрнім заводзе, празь нейкія напаўразваленыя цэхі, дзе бегаюць шчуры і лётаюць птушкі, сапраўдны табе запаведнік, Сабака наступае на нейкую мэталічную херовіну і тая глуха

бразгае, ціха, сычыць Чапай, асьцярожна, ён праводіць нас яшчэ па нейкіх калідорах, на падлозе валяюцца старыя газэты і дранае спэцадзеньне, потым мы праходзім пад самым плотам, асьцярожна, кажа Чапай, што такое? насьцярожваемся мы, не наступіце, коратка тлумачыць Чапай, мы асьцярожна перабягаем пад нацягнутым уздоўж плота калючым дротам і апынаемся за нейкай чатырохпавярховай цаглянай будынінай, пакрытай новым шыфэрам. Усё, кажа Чапай, гэта парткам. Палезьлі.

Чапай лезе першы, бо ведае, куды. Перад гэтым ён скідае свае кеды і хавае іх у кішэнях спартыўных штаноў, што ты робіш? кажу, гэта для зручнасьці, кажа Чапай. Усё – пайшоў, і ён сапраўды чапляеца за ніжнюю галіну дрэва над самай сьцяной, рыўком падцягваецца, сядае на яе, потым устае і пачынае лезьці ўгору, нармал, крычыць нам адтуль, чаго? не разумеем мы, я кажу – усё нармалёва, паўтарае Чапай, галіна пад ім трашчыць, і ён ляціць проста на нас, я пасьпяваю адскочыць, а на Сабаку ён і ня трапіў, эх, абтрушваецца Чапай, трошкі не далез, давай ты – гаворыць ён мне, ага, кажу, зараз, не хапала яшчэ зваліцца з чацьвертага паверху на ўсю гэтую кучу гаўна, давай, кажу, нейкі іншы ўваход. Ну, добра, кажа Чапай, добра. Можна проста празь дзьверы зайсьці. Яны што – не зачыненыя? пытаюся. У мяне ёсьць ключ, тлумачыць Чапай, я падрабіў. Дык навошта ж ты, підар, прымушаў нас лезьці на гэтае хуева дрэва? Так больш прыкольна, – кажа Чапай і вядзе нас да ўваходу. Мы перабягаем празь невялічкую пляцоўку, нідзе сапраўды нікога няма, але я так разумею, што ахова можа зьявіцца калі заўгодна, Чапай хутка адмыкае дзьверы, і мы прашмыгваем усярэдзіну. Так, Чапай пераводзіць дых, цяпер наверх, там перачакайма да ночы, ахова пройдзе – залезем у парткам. А можа, у цябе і ад парткаму ключы ёсьць? пытаюся я з надзеяй, можа, ня трэба нічога ламаць? Былі, гаворыць Чапай, але гэтая сука замяніла, я ж казаў. Думаеце, для чаго я вас узяў – я сам дзьвярэй ня выламаю. А, кажу, я думаў, таму, што мы сябры. Троцкі сраны, шэпча Сабака. Усё-ўсё, рашуча кажа Чапай, наверх, патруль пройдзе, зламаем дзьверы і назад, наступнага разу яны зойдуць сюды ажно раніцай.

І мы сапраўды падымаемся на пляцоўку чацьвертага паверху, Чапай нешта там варожыць над замком, адчыняе дзьверы, мы выходзім проста на дах і бачым:

21.00

Многа-многа аранжавых рэек на захадзе цягнуцца ад вакзалу, што цямнее праваруч, і сьвецяцца пад сонцам, сонца вісіць у раёне Халоднай Гары, здорава, кажу я, я б на тваім месцы тут і жыў, кажу Чапаю, а ты зачыніўся ў капцёрцы і душысься там дэнатуратамі ўсякімі, Чапай сканфужана кракае, але марку трымае, бачыш, паказвае мне леваруч, што гэта? пытаюся, разглядаючы цудоўную тэрыторыю, дбайна, хоць і трохі хаатычна застаўленую жалезам, машынамі, бэтонам, трубамі, іншымі сьмешнымі рэчамі, заводы, кажа Чапай, большасьць зь іх не працуе, разумееш, не працуе, а раней працавалі? пытаюся на ўсялякі выпадак, я гэты раён дрэнна ведаю, раней працавалі, кажа Чапай, раней усё працавала, ух, кажу я, і працягваю разглядаць рэйкі, што паступова гаснуць і цямнеюць, ад вакзалу адпаўзае бясконцы таварняк, гружаны лесам, і цягнецца на поўдзень, што там? паказвае Сабака ў бок таварняка, там поўдзень, кажу я, бачыш, сонца на Халоднай Гары, значыць, там захад, а таварняк на поўдзень ідзе, бліжэй да мора, ты быў калі-небудзь на моры? пытаюся ў Сабакі, на моры? перапытвае той, не, на моры ня быў, я ўлетку на Салтаў ежджу, ясна, кажу, ты на Салтаў, а таварнякі на мора, лес вязуць, навошта на моры лес? пытаецца Сабака, ня ведаю, кажу, штосьці будуць будаваць, што? дапытваецца Сабака, флёт, – неспадзявана кажа Чапай, трошкі, праўда, недарэчы.

Сабака глядзіць на сонца, што пачынае ўжо расьцякацца па Халоднай Гары, і кажа: я, кажа, калі вырасту, абавязкова адсюль зьеду, праўда? пытаюся, і куды? ня ведаю, кажа Сабака, на поўдзень, да мора, уладкуюся на флёт, проста я цяпер не магу бацькоў кінуць, разумееш, яны ж старыя, маю ж я неяк іх даглядаць, але вось праз пару гадоў – абавязкова паеду, мне тут не падабаецца – працы няма, бабак няма, цэны высокія, вось пачакаю пару гадоў – і на поўдзень. Ты яшчэ гэтыя два гады пражыві, – кажу я, сядаючы на прагрэты сонцам дах.

21.30

Чапай радзіць тут і сядзець, тут нас ніхто ня ўбачыць, нават калі ахоўнік зойдзе ў парткам, сюды ён падымацца дакладна ня будзе, перасядзім яшчэ пару гадзінаў і спусьцімся, па цемнаце сюды было б цяжэй дайсьці незаўважнымі, усё прадумана, кажа Чапай, трасянем сёньня тлустых капіталістычных сьвіньняў, каб не асабліва зажыраліся, эксплюатуючы і без таго заёбаныя пралетарскія масы, і мы зь ім пагаджаемся – добра-добра, заёбаныя, дык заёбаныя, нам-то што, мы сядзім і маўчым, я кажу, цікава – дзе цяпер Карбюратар, можа, ён даўно ўжо дома, сядзіць і перасыпае з далоні ў далонь цёплы попел свайго айчыма, а мы тут яго шукаем і ня можам знайсьці, так, ціха адгукаецца Сабака, паказваючы навокал, тут яго ня знойдзеш.

22.15

Пачынаецца дождж, зранку было сонечна й цёпла, паветра прагрэлася, вось і дах нагрэўся, я ўжо думаў: усё – нармальнае лета пачалося, а тут ізноў – дождж, нямоцны, праўда, так – накропвае сабе, арашае тэрыторыю, але ўсё адно непрыемна, асабліва калі ты сядзіш на даху чатырохпавярховага будынку на варожай заводзкай тэрыторыі, аплеценай калючым дротам, ня вельмі весела выходзіць, я нацягваю на галаву сваю старую джынсавую куртку і намагаюся заснуць, у каго-небудзь гадзіньнік хаця б ёсьць, пытаюся ў апошні раз, па зорках зарыентуемся, кажа Чапай, мудак, кажа на ягоны адрас Сабака, прывальваецца да мяне плячом, і мы спрабуем заснуць. Час ад часу я чую грукат таварнякоў з вакзалу, нават аб'яўленьні чуваць, не з самога вакзалу, а ўжо з запасных каляінаў, нейкія іхныя аб'явы, тыпу для сваіх, яны адзін з адным, здаецца, толькі праз мацюгальнік і размаўляюць, у іх іншыя паняткі прасторы й адлегласьці, я то заглыбляюся ў свой сон, то выходжу зь яго, нібы зь ценю на сонца, правальваюся туды, як у цёплы чорны сьнег, чорны-чорны, але ад гэтага ўсё адно цёплы, я думаю, што, цікава, цяпер робіць Юрык, пра што ён думае ў сваім палацы, у яго на ўкрыжаваньні Ісус быў залачоны, а сама крыжавіна – зялёная. Прыкольна, думаю я, можа, ва ўсіх цыганаў Ісус – залачоны, можа, гэта нейкая іншая вера, вера ў тое, што Ісус насамрэч залачоны, у іх тады павінна быць усё

інакш, і гэтыя, як іх там, прарокі павінны былі б прадбачыць прыход у сьвет такога вось хлопчыка – цалкам нармальнага ўсходняга хлопчыка, які фізіялягічна ці там анатамічна нічым не адрозьніваўся б ад сваіх аднаклясьнікаў, акрамя таго, што ён залачоны, то бок не мэталічны, не жалезны, не пафарбаваны, а вось проста – залачоны, у яго скура мусіла б мець нейкую іншую атамную ці клеткавую структуру, там нешта магло б быць са зьместам соляў ці кальцыю ў скуры, нейкія такія хімічныя штукі, трэба будзе запытацца ў Чапая, ён разьбіраецца ў хіміі, ці можна генным способам вывесьці залачоную скуру, і ў колькі гэта можа абысьціся дзяржаўнаму бюджэту.

23.05

Ісус ня можа быць залачоным – кажа мне Ісус. Чаму ня можа? зьдзіўляюся. Гэта немагчыма, кажа ён, гэта ня ў тэму. Чаму ж тады цыганы думаюць, што ты залачоны? Цыганы, кажа ён, ведаюць, што я не залачоны, проста яны хаваюць гэта ад усіх іншых. Дзеля чаго? не разумею я. А дзеля таго, каб дыстанцыявацца ад астатніх, цыганы, кажа Ісус, карпаратыўныя, ім не патрэбна прыманьне іх веры іншымі, разумееш? Яны наўмысна стварылі залачоны вобраз Ісуса, каб усе думалі, што яны, цыганы, лічаць, быццам Ісус залачоны. Насамрэч яны лепш за іншых ведаюць, што я не залачоны. Але ўсё-ткі – чаму ты не залачоны?

Але Ісус не адказвае. Я толькі бачу перад сабой цяжарную Марыю, і пад яе скурай, у яе жываце, лёгка пераварочваецца малы, яшчэ не народжаны Ісус, і нешта мне апавядае, і вось нарэшце змоўк, здаецца, я яго расчараваў, таму ён проста бавіцца пад скурай сваёй багародзіцы, пераварочваецца там, як касманаўт у стане бязважкасьці, кранаючыся губамі, і сьпінай, і іншымі часткамі скафандра тонкіх падатлівых сьценак, што атачаюць яго, плавае сабе ў мацярынскім улоньні, час ад часу падплываючы да паверхні і штурхаючы яе зь сярэдзіны, тады яго ножка, або галоўка, або антэны прагінаюць Марыіна цела, і з-пад яе грудзей ці з-пад яе жывата, як з гумовага шарыка, выпінаецца Ісус, які, у адрозьненьне ад мяне, ведае, што ніякага цела не існуе: ні майго, ні Марыінага, ні ягонага

ўласнага, і што ўся скура, нацягнутая цыганамі на крохкія і балючыя целы нашых каханьняў і нашых смуткаў, проста дзеля таго, каб ніхто ня ведаў, што насамрэч ніхто і ні ў чым нас не абмяжоўвае, і што можна плысьці куды хочаш – няма ніякіх сьценак, няма ніякіх перашкодаў, няма нічога, што магло б цябе спыніць; і калі ён чарговы раз дэфармуе яе скуру, акурат пад горлам, Марыя весела сьмяецца, бліскаючы вострымі зубамі, і я бачу, як яе паднябеньне асьвятляецца аднекуль зьнізу мяккім залацістым бляскам, і гэтае залацістае сяйво перамешваецца зь белым густым малаком у яе лёгкіх, тады бляск цямнее і пераліваецца, і вочы ў яе – зялёныя-зялёныя.

19.06.93 (субота)

02.15

— Слухай, – альбо пайшлі ламаць дзьверы, альбо валім дахаты. Я ўжо ўвесь мокры. Сабака, вунь, здаецца, наагул памёр.

Чапай падыходзіць да Сабакі і гідліва кранае яго сваім кедам.
— Нічога ён не памёр, – кажа. – Проста сьпіць крэпка.

Дождж усё сыплецца, хопіць, кажа Чапай, мабыць, час ужо, гэта ты як, кажу, па зорах зарыентаваўся? па якіх зорах, крыўдуе Чапай, я проста чуў, як ахоўнік заходзіў, хвілінаў 15 таму, так што можам ісьці – мы будзім Сабаку, той спачатку не разумее, дзе ён і хто мы такія, але паступова вяртаецца ў прытомнасьць, і мы спускаемся ўніз.

2.25

Парткам на другім. Мы стаім ля дзьвярэй, значыць так, тлумачыць Чапай, ты – паказвае на мяне – ідзі ўніз да дзьвярэй, ты – паказвае Сабаку – будзеш мне дапамагаць, зараз я знайду што-небудзь цяжкае, і мы стукнем па дзьвярах, ды навошта, кажа Сабака і з нагі высаджвае дзьверы, будзем тут ябацца яшчэ паўгадзіны, я задаволена ўсьміхаюся, я б і сам, кажа Чапай, выбіў, але ў мяне ж кеды, так, дадаю я, і трыпэр. Мы хутка пераварочваем усё ў пакоі – дзьве шафы з паперамі, у

адной пачатая пляшка каньяку, Сабака адразу ж пхае яе ў кішэню штаноў, дзьвюхтумбавы стол, начынены розным канцылярскім гаўном, як гамбургер халестэрынам, шарым на падваконьнях, глядзім на стале, шукаем які-небудзь схоў альбо хаця б невялічкі сэйф, што заўгодна, і раптам у кутку бачым тое, што шукалі – каробку з-пад ксэракснай паперы, заклееную і запячатаную зьверху. Месяцовае сяйво прабіваецца скрозь жалюзі на вокнах і драпежна пабліскваe на сьвежым сургучы. Яно! кажа Чапай. Я спрабую падняць каробку, у прынцыпе, яна ня надта цяжкая, можа быць. Што, кажу, бяром? Канечне бяром, кажа Чапай, бяром, давай, цягні яе да мяне, там паглядзім. Можа, яшчэ пашукаем? прапануе Сабака, здаецца, адчуваючы нешта, усё-ўсё, нэрвуецца Чапай, досыць, валім адсюль. І мы выходзім з пакою, асьцярожна спускаемся ўніз, Чапай нешта мудруе з замком, нарэшце мы апынаемся на дварэ, Чапай зачыняе за намі, і мы вяртаемся дахаты – наперадзе я з каробкай, за мной Сабака і ў канцы Чапай, ляпаючы кедамі па калюжах.

2.55

— Зрывай сургучы! – кажа Чапай Сабаку.
— Што гэта? – Вася таксама прачынаецца і спалохана сочыць за намі з тапчана.
— Усё нармальна, – кажу, – ня бойся, – ты таксама ў долі.
— У якой долі? – баязьліва пытаецца Вася.
— Зараз убачыш, – кажу.

Сабака знаходзіць між зьмеевікамі шырокі кухонны нож і зразае пячаткі, павольна ўсё гэта размотвае і разгортвае, хутчэй, хутчэй! нецярплівіцца Чапай, але Сабака робіць усё ўпэўнена і нясьпешна, адкрывае каробку і кажа: о, помнік! дастае адтуль бюст вышыней недзе з паўмэтра і ставіць яго на табурэт.
— Што гэта? – не разумею я.
— Помнік, – кажа Сабака.
— Бюст, – папраўляе яго Чапай.
— Чый бюст? – пытаюся я.
— Наш, – адказвае Чапай.
— Ты не зразумеў – хто гэта такі? – паказваю я на бюст.

Чапай задумліва працірае акуляры.
— Можа, гэта дырэктар? – гаворыць Сабака.
— Не, – кажа Чапай, – гэта не дырэктар. У дырэктара вусоў няма.
— А ён сабе для красы прырабіў.
— Усё адно не падобны, – кажа Чапай.
— Гэта нейкі марксіст, – мяркую я.
— Троцкі, – кажа Сабака. – Бачыш, нос які? Дакладна, Троцкі.
— Гэта ня Троцкі, – нэрвуецца Чапай. – У Троцкага барада. А ў гэтага барады няма.
— Гэта Троцкі ў Мэксыцы, – кажа Сабака.
— Гамбурскага пэрыяду, – дадаю я.

На Васю нават глядзець шкада.
— Ніякі гэта ня Троцкі, – бадзёрыцца Чапай, намагаючыся прыхаваць свой мандраж. – Гэта Молатаў. Член цк.
— Молатаў? – кажу я разгублена.
— Молатаў, – кажа Чапай. – Член цк, – дадае ён на ўсялякі выпадак.
— Нічога сабе, – кажу.

Сабака насуплена дастае скрадзеную пляшку каньяку і п'е з рыльца.
— Молатаў, – працягвае Чапай, – зь іх усіх адзіны нармальны быў тып. Ён быў геданістам. Як Ціта.
— Як што?
— Як Ціта. Любіў жанчын, спорт, рэстараны.
— Кактэйлі, – кажу я. – Адкуль ён у твайго дырэктара?
— Яны некалі рабілі іх, – кажа Чапай, падумаўшы. – З адкідаў. Тут быў спэцыяльны цэх суправаджальных матэрыялаў. Мне мой стары апавядаў.
— Бюст Молатава гэта што – суправаджальны матэрыял?
— Яны рабілі ня толькі бюст Молатава, – апраўдваецца Чапай.
— А што яшчэ?
— Яшчэ бюст гэтага, як яго – Варашылава. А гэты, здаецца, нейкім цудам ацалеў. Хацеў прадаць, сука, – жорстка кажа Чапай, – народны бюст.
— Слухай, ты! – не вытрымлівае Сабака. – Выходзіць што – мы ламалі дзьверы, хаваліся ад аховы, пакінулі там процьму сьлядоў, і ўсё гэта дзеля гэтага дзёўбанага геданіста?

Чапай падыходзіць да яго, рашуча бярэ з рук каньяк, усаджвае ў сябе тыя 200 грамаў, што там былі, ідзе да тапчана, адсоўвае Васю і ляціць ніц у свой брудны бяздонны трыпэрны ложак. Нават ня скінуўшы кедаў.

3.30

— Значыць, робім так, – кажа раздражнёны Сабака, – забіраем усё бухло, сцэджваем брагу, бярэм траву, шмоткі, – ён глядзіць на Чапая, – не, хай задушыцца сваімі шмоткамі. Бярэм вось гэта, – ён паказвае на Молатава, – і валім, пакуль ахова нічога ня ўбачыла.
— А што зь ім рабіць будзем? – пытаюся я.
— Спалім, – кажа Сабака. – Адным уродам будзе меней.
— А Карбюратар?
— Які Карбюратар? – крычыць Сабака. – Ты што, не разумееш – валіць трэба! Давай, пайшлі.
— Куды?
— Ня ведаю, – кажа Сабака, – дахаты.
— Ты што, зьбіраесься ў такім стане пхацца праз увесь горад? – кажу. – Зь бюстам на руках? Цябе возьме першы ж патруль.
— Давайце да ранку пераседзім, – раптам спакойна кажа Вася. Ён ужо апрытомнеў, ходзіць па пакоі, цягне з падваконьня нейкія брашуры, засоўвае ў кішэню нейкую пакусаную асадку, адным словам – ён адзіны, хто не панікуе. – Раніцай нармальна выйдзем і ніхто нас ня возьме. Галоўнае – дасядзець да ранку.
— Так, – пагаджаюся я, – галоўнае – дасядзець.

5.30

Я спрабую разбудзіць Чапая, той толькі загаворвае скрозь сон на нейкай сваёй мове, на мове тагасьветных марксістаў-леніністаў і адварочваецца ад мяне. Добра, кажу я Васю, пакінем яго тут, хай потым сам разьбіраецца, ён усё гэта ў прынцыпе прыдумаў, таму гэта ягоныя праблемы, добра, кажа ў сваю чаргу Вася, правільна, але Молатава бярэм з сабой, на фіга? кажу, на фіга нам Молатаў? засыплемся зь ім, па-першае, тлумачыць Вася, калі яго тут раніцай знойдуць – Чапаю кранты, адразу зразумеюць, хто дзьверы выламаў. Па-другое – Молатава можна здаць, ён жа ня проста шматок каляровага

мэталу, ён жа яшчэ і скульптура, ёсьць людзі, якія плацяць за такія рэчы вялікія бабкі. Ня ведаю, кажу я, ня ведаю, хто б заплаціў за Молатава вялікія бабкі, яшчэ за жывога – ладна, а за гэтую мумію, паказваю я, ну, ды хопіць, паспрабуем здаць, толькі каму?

Каму з маіх знаёмых можна здаць бюст Молатава? Вось так вызначаецца ўзровень асяродзьдзя, у якім ты перабываеш, так і не інакш. Ну, у мяне няма знаёмых антыквараў, знаёмых ювэліраў, знаёмых трунароў у мяне таксама няма, што маглі б зьбіць з гэтага бюста вусы і перарабіць яго ў галаву якой-небудзь Падзаборнай Людмілы Кузьмінічны, якая гераічна пала пад коламі пятага трамвая на скрыжаваньні вуліцаў Пушкінскай і Весьніна і там-такі пахаванай, паколькі сабраць разам усё тое, што там ад яе засталося – на тым скрыжаваньні – выявілася немагчымым, вось, трунароў у мяне таксама знаёмых няма, далей – знаёмых скульптараў, для якіх гэты суправаджальны матэрыял зьяўляўся хоць бы якой эстэтычнай каштоўнасьцю, у мяне няма, знаёмых камуністаў, акрамя Васі і Чапая, для якіх гэта быў бы прадмет культу – няма, знаёмых дырэктараў гістарычных музэяў, для якіх гэты дзёўбаны геданіст меў бы якую-ніякую гістарычную вартасьць – няма, больш за тое, я ўпэўнены, што такіх дырэктараў музэяў няма наагул у прыродзе, вось што я думаю. Вось так, мне нават няма каму сплавіць зьнешне цалкам прыстойны бюст Молатава, члена цк, бля, як я жыву і дзеля чаго? дзеля чаго гэта ўсё? уся гэтая барацьба за выжываньне? Гульня на ўтрыманьне рахунку? дзеля чаго? мне цяпер дзевятнаццаць, праз пяць гадоў, калі я не памру ад пабытовага трыпэру, мне будзе ўсяго толькі дваццаць чатыры, Гайдар у такім веку ўжо нават палкі не вадзіў, што я буду рабіць у свае дваццаць чатыры? ці будуць у мяне палкі? і калі будуць – куды я іх павяду? у прынцыпе, я магу рабіць што заўгодна, ну, амаль што заўгодна, але тут такая праблема – што я нічога не хачу рабіць, гэта для мяне больш натуральна, хоць і ня ўсе гэта разумеюць, такая вось праблема.

Марусі! – выгукае Сабака, які перад гэтым стаяў ля акна і нэрвова ўглядаўся ў сьвежы чэрвеньскі ранак, – Марусі можна, у яе поўная кватэра такога гаўна, можа, ёй і гэты помнік

падыдзе. І тут мы ўсе згадваем пра Марусю.

Але Марусі трэба папярэдне патэлефанаваць, просто так да яе завальвацца нельга – будзе горш. Маруся – гэта такі кшталту масток у зьнешні сьвет, уласна, ад яе ўпершыню ў жыцьці я даведаўся, што таксі, выяўляецца, можна карыстацца ня толькі калі спазьняесься на вакзал ці калі цябе п'янага адвозяць дадому – а проста так. Вось проста ты выходзіш з дому і маеш кудысьці ехаць, і вось бярэш таксі. І што найпарадаксальнейшае – плаціш у канцы падарожжа таксісту бабкі – раней я ня ведаў, што і так можна, яна першая мне гэта паказала. І гэта пры тым, што яна самая малодшая сярод нас усіх. Ёй усяго толькі гадоў шаснаццаць. Там такая гісторыя: яе тата з Каўказу, ён – я ня ведаю – ці то грузін, ці то азэр, па-мойму, усё-ткі грузін, я ў гэтым не разьбіраюся, адным словам, ён генэрал, сапраўдны генэрал са сваёй колькасьцю гарматнага мяса ў казармах і самалётаў у ангарах, першую палову свайго цяжкага афіцэрскага жыцьця ён качаваў па Саюзе, ахоўваючы, я так разумею, мірнае неба нашай Айчыны, апошнія гадоў дзесяць завіс у Харкаве, з жонкай разьвёўся, іхная адзіная дачка падрасла і паслала абаіх, генэрал купіў ёй прыкольную двухпакаёвую кватэру ў крутым будынку на плошчы, зь відам на муніцыпалітэт, праўда, на апошнім паверсе, пад самай вежай, на штосьці больш прыземленае ў яго не хапіла ці то бабак, ці то ракет на продаж, але ўсё гэта было крута, Маруся вучылася ў крутой школе, мела процьму грошай, ледзь не нарадзіла год таму, у свае пятнаццаць, тата-генэрал ледзь-ледзь угаварыў яе зрабіць аборт, падарыў ёй за гэта жыгуль, Маруся надзіва лёгка пагадзілася – аборт зрабіла, жыгуль расхуячыла і далей жыла сабе сваім жыцьцём, якое яна, з прыроджанай каўкаскай мудрасьцю і жыцьцярадаснасьцю, своечасова падзяліла на прыгожае і карыснае: прыгожым у гэтым выпадку была крутая школа, двухпакаёвая кватэра і расхуячаны жыгуль, а карысным – усё тое сьмецьце і ўсё тое непатрэбства, зь якім яна мела справу ў вольны ад навучаньня час – Маруся ведала Сашу Чарнецкага, хадзіла на панк-канцэрты, жэрла таблеткі, паліла траву, піла партвэйн, праўда без залежнасьці, то бок зранку пасьпяхова вырыгвала рэшткі паганага алькаголю і ішла вучыць Лабачэўскага ці што яны там у школах вывучаюць. Параноя, адным словам, тыповая

параноя, за гэта мы яе і любілі. Да яе час ад часу можна было заваліць, толькі папярэдне патэлефанаваць і назвацца – яна нас ня ўсіх памятала, хоць і спала з усімі, для яе гэта быў ня сэкс, для яе гэта было штосьці значна цікавейшае, я ня ведаю, што. Мы напіваліся ў яе пантовай кватэры, крычалі на яе бальконе зь відам на муніцыпалітэт, глядзелі яе відэа, а потым засыналі ў яе ложку, часам нават безь яе. Мне ў гэтым разе нават ня столькі сэкс падабаўся, колькі сама магчымасьць прачнуцца з кімсьці, не аднаму, ня сам-насам са сваім пахмельлем і сваімі крывавымі начнымі відзежамі, прачынацца з кімсьці – гэта заўсёды прыкольней, нават калі гэта Маруся, якая ня памятае, як цябе завуць і што ты зь ёй учора рабіў. Яна надзвычай абыякава да нас усіх ставіцца, дакладней, яна кожны раз ставіць нас на месца, яна заўжды нібы гаворыць – тое, што вы ўсе ўчора мелі мяне, сьведчыць толькі пра тое, што зараз вы забераце з сабой свае зарыганыя шмоткі, усю пустую тару, увесь свой канабіс, увесь свой гемарой, усё сваё гаўно і зваліце ў сваю каналізацыю, а я – Маруся – застануся тут, зраблю сабе малочны кактэйль і буду глядзець на ранішні муніцыпалітэт, да якога вось-вось пачнуць зьяжджацца ўсякія дэпутаты ці проста выпадковыя ўблюдкі, і гэта заўжды дзейнічала – прынамсі мяне гэта забівала кожнага разу, без варыянтаў, я разумею пра сябе ўсё, чаго мне пра мяне свайго часу не сказалі бацькі, не сказалі невядома чаму, магчыма, ім проста было мяне шкада.

Так ці інакш, але да яе без званка прыходзіць проста ня варта, можна нарвацца на старога генэрала, хоць я яго, шчыра кажучы, у вочы ніколі ня бачыў, Маруся неяк усё гэта разводзіла, яна любіла сябе і сваё жыцьцё і, вядома ж, не хацела, каб у яе булёне плавалі лішнія мухі, акрамя таго, стары, мабыць, і сам падазраваў, што яго ўлюбёная дачка-Маруся не заўсёды прытрымліваецца ўнутранага гарнізоннага распарадку, таму, калі хацеў наведаць дзіцё, таксама заўжды папярэдне тэлефанаваў ёй, такі ўжо ў іх на Каўказе звычай, тады яна выкідала за акно ўсіх сваіх выпадковых гасьцей, прымушала іх забіраць з сабой пустую тару і недарэзаную вараную кілбасу, высыпала праз фортку бычкі, выкідала ў сьметніцу ўсе бульбулятары, ссыпала драбкі ва ўнітаз, адным словам – згортвала дэкарацыі і вярталася да нармальнага

жыцьця, у якім быў тата-генэрал, узброеныя сілы рэспублікі, рэгулярнае харчаваньне, спартыўныя залі, тэнісныя корты, нармальныя знаёмыя, вышэйшая адукацыя, добрая музыка, маецца на ўвазе – жывая добрая музыка, ня ў запісах, хоць і добрыя запісы таксама – карацей, увесь той мінімальны набор пратэзаў і штучных сківіцаў для больш зручнага перасоўваньня па гэтым жыцьці, якімі цябе адорвае сыстэма ў тым разе, калі ты пагодзісься перапісаць у сваім тэстамэнце на яе імя ўласныя ныркі, лёгкія, палавыя органы і душу. Яна ўсе гэтыя пратэзы мела, таму магла сабе дазволіць выпендрывацца і час ад часу досыць такі глыбока занурацца ў каналізацыйныя люкі грамадзтва, залязаць на пару дзён на адваротны бок Месяца, што да таго ж знаходзіўся ўвесь час ня так ужо і далёка адсюль – перабываць там нейкі час на траве і партвэйне, далучыцца хоць часова да Вялікай Нэрвовай Сыстэмы, Рванага і Залатанага Сеціва Кровазвароту і Каханьня, занурыцца з галавой у плыні лімфы, лайна і спэрмы, на самым дне якіх, як некаторыя думаюць, і знаходзяцца найбольш масіўныя і цудоўныя шматкі шчасьця, хоць напраўду там нічога няма, гэта ўжо я вам дакладна кажу.

6.00

Таму мы ёй абавязкова затэлефанавалі б, калі б было адкуль, але выходзіць так, што найбліжэйшы тэлефон знаходзіцца на кпп, дзе нас чакаюць ахоўнікі зь ятаганамі й агнямётамі, з ручнымі гранатамі і супрацьпяхотнымі мінамі, дбайна закапанымі на заводзкіх клюмбах, адным словам – я б туды не пайшоў, асабліва маючы пры сабе вусатага Молатава, лепш ужо іншым разам, як-небудзь, калі ўсё ўсталюецца, мы лепш забяром усё, што нам трэба – гаворым мы між сабой і забіраем усё бухло і рэшткі травы, Вася нават нейкія брашуры бярэ з падвоканьня – і мы вылазім праз плот. Я яшчэ кажу, можа, кажу, запіску Карбюратару пакінем, каб ведаў, дзе нас шукаць, але Вася скептычна кажа, што гэта будзе запіска не для Карбюратара, а для пракурора, таму, сапраўды – навошта нам лішні клопат, раз ужо так здарылася, то трэба з годнасьцю выйсьці з гэтай сытуацыі, інакш і быць ня можа. Чапай працягвае пераварочвацца ў ложку вакол уласнай восі, так,

нібы хтосьці яго ў сьне раскручвае, бы нейкі махавік, жадаючы запусьціць нешта вельмі важнае для гэтага сьвету, але яно ўсё ніяк не запускаецца, круці гэтым махавіком, не круці, усё адно нічога не атрымаецца, толькі змучанае і хворае цела будзе балець, як аскепак, усаджаны д'ябальскімі артылерыстамі ў задніцу марксізму-ленінізму і пакінуты там на ўспамін яшчэ адной загубленай душы.

6.15

Мы праходзім ранішнім прыватным сэктарам, выходзім на тую самую плошчу перад цыркам, я цягну вусатага Молатава, Сабака цягне бухло, брагу мы, вядома, ня сцэджвалі, але свае, сумленна вырваныя ў дзядзі Робэрта тры каньякі, мы пакінулі пры сабе, а Вася ідзе проста так, яму найгорш, ва ўсякім разе ён так кажа, і ў нас няма падставаў, каб яму ня верыць. Нам тут толькі перабегчы праз мост, павярнуць да царквы, прапаўзьці некалькі кварталаў і выйсьці на плошчу, там яшчэ раз перабегчы вуліцу і заскочыць у пад'езд будынку зь вежай, і калі нам пашчасьціць і нас ніхто ня спыніць, жыцьцё пасьпяхова працягнецца яшчэ на некалькі гадзінаў, да абеду дык дакладна.

6.45

Маруся зноў пафарбавалася. У арыгінале яе валасы маюць, здаецца, чорны колер, мабыць, чорны, гэта было б натуральна, усё-ткі яна з Каўказу, цяпер яна пафарбаваная ў нешта цёмна-чырвонае і вельмі коратка пастрыжаная, на ёй чорны халацік, пад якім ужо нічога, акрамя самой Марусі, няма, яна вывальвае ўсё гэта на нас, нам і бяз гэтага дрэнна, а тут яшчэ такое, вы хто? пытаецца яна спачатку, потым пазнае-ткі Васю, мяне яна ніколі не пазнае, і гэта мяне ўжо нават ня крыўдзіць, а Сабака наагул ні на што не прэтэндуе, ну, кажа, што – прынесьлі? яна яшчэ сьпіць, проста стоячы пасярод калідору, стаіць і сьпіць, але пра нешта размаўляе з намі, дрэнна, праўда, размаўляе, але хоць нешта, добра, што наагул нас пусьціла. Прынесьлі? пытаецца яна зноў. Што прынесьлі? не разумее яе Вася. Ну вы ж абяцалі, кажа Маруся, я напружваюся, нешта тут ня тое, можа, лепш адразу зваліць і не чакаць чарговых

непрыемнасьцяў з боку генэралітэту, вы ж толькі што тэлефанавалі, напаўсонна кажа Маруся, я ж прасіла. Гэта ня мы тэлефанавалі, кажа Вася, ня вы? зьдзіўляецца яна, ня мы. А што табе трэба? пытаецца Вася. У нас усё ёсьць, можна мы ў цябе пераседзім? Маруся расчаравана паціскае плячыма, маўляў, сядзіце, мне якая розьніца, паварочваецца і зьнікае ў пакоі, а мы застаемся ў калідоры з нашым сябрам Молатавым, членам цк.
— Нешта ня радая яна нам, – кажа Сабака і ідзе на кухню.
— Яна нікому ня радая, – кажу я, ідучы за ім. – Чаго ёй радавацца?
— Ну, а чаго б і ня радавацца, – гаворыць Сабака, разьліваючы каньяк па гліняных кухліках. – Калі б мне хто з ранку прынёс тры пляшкі каньяку – я б радаваўся.
— Калі б мне, – кажу я, выпіваючы, – зранку прынесьлі бюст Молатава, я б яшчэ падумаў, ці радавацца.
— Трэба яе разбудзіць, – кажа Сабака, наліваючы па другім разе. – А то неяк непрыгожа – прыйшлі, сядзім, бухаем.
— Сапраўды – непрыгожа, – кажу. – Але лепш не будзіць. Лепш самім паспаць. Я, – кажу, – ужо другую ноч паспаць нармальна не магу. Спачатку мусарня, потым гэты марксіст у кедах. Спаць хачу. Пайшлі спаць.
— Спаць? – пытаецца Сабака. – Ведаеш, я цяпер у такім стане, што проста баюся спаць.
— Чаму баісься? – пытаюся.
— Я баюся, што засну і проста не дадумаюся прачнуцца, разумееш?

Сабака налівае зноў, але я ўжо адмаўляюся, усё, кажу, досыць, пайшлі спаць, Сабака незадаволена падымаецца, мы знаходзім у адным з пакояў на канапе Васю, які захутаўся ў нейкую коўдру і пасьпяхова сабе сьпіць, і нам не застаецца нічога іншага, як ісьці шукаць нейкі іншы ложак ці канапу, ну хоць што-небудзь, мы заходзім у іншы пакой і бачым там пасярод вялікага, добра знаёмага нам ложка Марусю, ужо нават без халаціка, якая запхала галаву пад падушку і так сьпіць і на нас асаблівай увагі не зьвяртае, дзіўная бясконцая ноч, што перацякае ў такі самы ранак, нашы сябры распаўзаюцца па кутках і зь імі губляецца ўся сувязь, яны нібы паміраюць штодня а 7 раніцы, выглядае ўсё гэта ва ўсялякім разе менавіта

так, калі ня больш страшна, усё – я сплю, кажу я Сабаку, ён падыходзіць да ложка, пасунься, кажа Марусі, і адсоўвае яе на край ложка, можаш спаць, кажа мне, не, кажу, давай ты да яе, чаму я? пытаецца Сабака, а чаму я? кажу, ты ж спаць хочаш, а я, кажа, яе баюся. Я пазяхаю і згаджаюся, але ўсё-ткі кладу паміж сабой і Марусяй Молатава, так – на ўсялякі выпадак.

9.57

— О, чорт! – крычыць яна. – Гэта яшчэ што такое?!

Я прачынаюся і напалохана гляджу навокал. Побач са мной на ложку сядзіць Маруся, зусім безь нічога, прыкрываецца падушкай і напалохана глядзіць на мяне.
— Чорт! – крычыць яна. – О, чорт! Гэта што такое?
— Не крычы, – я спрабую супакоіць яе. – Чаго ты крычыш?
— Гэта яшчэ што такое? – паказвае яна на бюст адной рукой, другой прытрымліваючы падушку. Сабака таксама прачнуўся і адбег да дзьвярэй. Здаецца, Маруся яго напужала.
— Гэта бюст, – адказваю. – Не крычы.
— Чорт!
— Ну, што ты? – кажу я напалохана. – Бюст. Усяго толькі бюст. Гэта мы прынесьлі.
— Навошта? – зь недаверам пытаецца Маруся.
— Ну, проста так, – кажу. – Думалі, можа, табе патрэбны.
— Мне не патрэбны, – нэрвова кажа яна.
— Добра, зараз мы яго забяром.
— А як вы сюды трапілі? – пытаецца Маруся.
— Ты ж нас сама пусьціла, – кажу я разгублена.
— Навошта?
— Ня ведаю, – кажу. – Мы прыйшлі, ты пусьціла.
— Вы прынесьлі? – пытаецца Маруся, пэўна, нешта прыгадваючы.
— Што? – не разумею я.
— Ну, што-небудзь.
— Вось, – кажу я, – Молатава прынесьлі.
— Якога Молатава? – не разумее яна.
— Члена цк.
— Дзе ён? – не разумее Маруся.
— Ну, вось, – паказваю я на Молатава.

Маруся намагаецца хоць нешта зразумець. Потым дастае аднекуль цыгарэту з запальнічкай і пачынае паліць, нэрвова ўсё абдумваючы.
— Даўно вы тут? – пытаецца.
— Ня вельмі, – адказваю. – Гадзіны дзьве-тры.
— Ясна, – кажа яна.

Мы сядзім зь ёй на яе ложку і моўчкі глядзім адно на аднаго. Яна сымпатычная, п'е замнога, але ўсё адно сымпатычная. Асабліва з падушкай.
— Хочаш папаліць? – пытаюся.

Яна падымае цыгарэту і паказвае мне – маўляў, я ж палю.
— Мы прынесьлі, – кажу.
— Прынесьлі? – яна вокамгненна прачынаецца. Здаецца, гэта быў пароль, ва ўсялякім разе – правільная камбінацыя словаў, якая ўсё прыводзіць у дзеяньне. Мне аж самому спадабалася, таму я паўтарыў:
— Так, – кажу, – мы прынесьлі.
— Чорт, – кажа Маруся, і, баязьліва азіраючыся на Молатава, кладзе падушку на месца.

10.15

Зранку на такія рэчы лепш наагул не глядзець, або, калі ўжо глядзіш, то хіба што скрозь пальцы. Мы так і робім, і, пакуль яна ходзіць па пакоі і зьбірае свае майткі і шкарпэткі, нацягвае свае фірмовыя джынсы, апранае розныя мэдальёны і бранзалеткі, мы ідзём сабе на балькон і чакаем яе там. Яна выходзіць на балькон зь вялікай чорнай люлькай, і далей мы ўжо проста стаім сабе на бальконе і амаль ні пра што не размаўляем, так хіба што – глядзім на ранішнія проліўныя нябёсы, на пусты суботні муніцыпалітэт, ва ўсім гэтым столькі паветра і вільгаці, нібыта мы раптам апынуліся ў чыіхсьці лёгкіх, напрыклад – у лёгкіх старой камбалы, што наглыталася ледзяных арктычных хваляў і цяпер ляжыць сабе на дне акіяну, моўчкі пакутуючы ад перадозу.
— Як у цябе справы? – пытаюся. Мы апошні раз бачыліся недзе зь месяц таму, было яшчэ зусім холадна, мы тэлефанавалі ёй з вакзалу, а што мы рабілі, дарэчы, на вакзале? ня памятаю ўжо,

але тэлефанавалі мы ёй дакладна з вакзалу, яна сказала – ок, прыходзьце, вазьміце бухла толькі, мы ўзялі пляшку кайзэра, потым выходзілі яшчэ, яна тады была пасьля нейкага масажнага кабінэту і пахла нейкімі крэмамі, у яе тады былі трошкі даўжэйшыя валасы і нейкага іншага, здаецца, колеру, хоць якога менавіта – згадаць не магу.
— Дрэнна справы, – кажа яна.
— Штосьці здарылася?
— Здарылася, – кажа яна, – здарылася. У школе праблемы. Іспыт заваліла.
— Прыкольна, – кажу. – Ты ў школу ходзіш.
— Нічога прыкольнага, – кажа яна. – Поўнае гаўно.
— Ясна, – кажу.
— Мы павінны былі напісаць навуковую працу, – кажа Маруся, грэючы люльку ў руках. – Тэма, ведаеш, якая была?
— Якая? – пытаюся.
— «Што я думаю пра работу муніцыпальных службаў».
— А што гэта?
— Муніцыпальныя службы?
— Ну.
— Ну, там, скажам, пажарныя. Або газавая служба. Камунальнікі, адным словам.
— Ясна, – кажу я. – І што ты напісала?
— Я напісала пра палівальныя машыны.
— Пра якія машыны?
— Пра палівальныя машыны. Тыя, што раніцай паліваюць вуліцы, бачыў?
— Бачыў, – кажу. – Ты што-небудзь ведаеш пра палівальныя машыны?
— У мяне перад гэтым была нейкая жахлівая ноч. Я амаль ня спала. Прыйшла на заняткі – а мяне проста разрывае на шматкі, разумееш? Я ледзь не памерла.
— Ну, дык пайшла б дахаты.
— Гэта ж іспыт.
— Папрасіла б тату, ён бы падагнаў пару бэтээраў, і ўсе праблемы.
— Табе лёгка казаць. У цябе тата не вайсковец.
— Ну, – кажу, – дзякаваць богу.
— Яму, напраўду, вельмі падабаецца, калі я яго аб нечым такім прашу. Таму я яго ніколі і не прашу.

— Ага, – кажу.
— Гэта брат яго ўвесь час доіць.
— У яго ёсьць брат? – пытаюся.
— У мяне ёсьць брат, – Маруся нарэшце распальвае люльку. – У мяне ёсьць старэйшы брат.
— Чаму я яго ніколі ня бачыў?
— Я яго сюды не пускаю.
— Чаму?
— Я яго ненавіджу. Хоць раней вельмі любіла.
— І што здарылася?
— Ён чапляўся да мяне.
— Сур'ёзна?
— Сур'ёзна. Ён мяне некалі ледзь ня згвалціў, добра, што ўкураны быў – у яго проста нічога ня выйшла. А так, уяўляеш – мог бы стаць маім першым мужчынам.
— Ну, – кажу, – бывае. А мой брат за мяне ў дзяцінстве заступаўся.
— А да мяне, – кажа яна, – у дзяцінстве ніхто не чапляўся. Баяліся...

11.00 – 12.00
— Ну, і што?
— Што?
— Ты пра палівальныя машыны нешта казала.
— А, так, – згадвае яна. Мы сядзім на бальконе, Сабака сьпіць у кутку, а мы сядзім на нейкіх кілімчыках і глядзім у неба, Маруся зусім разгубленая, яна водзіць навокал пустымі вачыма, спрабуючы зачапіцца хоць за нешта, але ў яе гэта ня надта выходзіць, праўда, вось на мяне зьвярнула ўвагу, спрабуе нешта гаварыць. – У мяне відзежа была. Я ноч напярэдадні ня спала, разумееш, і тут гэтая работа. Адным словам, я напісала ім штосьці кшталту таго, я ўжо дакладна ня памятаю, але галоўная думка там такая была, што напраўду гэтыя палівальныя машыны, яны паліваюць зусім не вадой.
— А чым?
— Ты разумееш, – яе голас раптам робіцца сур'ёзны і напалоханы, – я калісьці раніцай прачнулася, вельмі рана, яшчэ шостай не было, і мяне нешта перамкнула, што трэба купіць малака, і я ўзяла нейкі тэрмас і ў тапках пайшла шукаць

малако.
— А шостай ранку?
— Я ня ведала, – кажа яна, – што толькі шостая. Я проста выйшла на балькон, а было ўжо сьветла, гляджу – унізе праяжджаюць гэтыя штукі, ну, палівальныя машыны, я чамусьці падумала, што гэта малакавозы, яны ж падобныя, пагадзіся.
— Ну, не зусім.
— Чаму?
— Дзе ты бачыла, каб малакавозы палівалі вуліцы малаком?
— Малаком? – тут Маруся замаўкае, пэўна, у яе цяпер зноў відзежа, але я пасьпяваю выцягнуць яе назад.
— Але, – кажу, – сапраўды падобныя. Прынцып такі самы. Нешта возяць сабе ў бочках. Пажарныя машыны таксама падобныя.
— І цыстэрны з нафтай, – кажа Маруся.
— Ну, – кажу, – цыстэрны з нафтай таксама, у прынцыпе, падобныя да малакавозаў.
— Я тады падышла да палівальнай машыны са сваім тэрмасам, – працягвае Маруся, – і тут, ты разумееш што – у мяне трапіў струмень вады, ён ударыў акурат у мяне, у цела, у твар, у рукі, нават тэрмас з рук выбіў. І вось тут, ты разумееш, я паднесла рукі да твару, па іх сьцякала халодная вада, і панюхала іх. Ведаеш, чым яны пахлі?
— Чым? – пытаю.
— Газам.
— Якім газам?
— Ня ведаю, – кажа Маруся. – Але дакладна – газам. І я, ведаеш, што падумала – гэта, у прынцыпе, магло быць зроблена наўмысна, разумееш – яны наўмысна падмешваюць у ваду для паліваньня танізуючы газ, скажам, для таго, каб, з аднаго боку, насельніцтва прастымуляваць перад пачаткам працоўнага дня, а зь іншага – скіраваць энэргію гэтага самага насельніцтва ў прадуктыўнае рэчышча, паколькі газ гэты павінен быў быць выраблены на аснове псыхатропных штук, народ бы па-свойму заводзіўся і весела валіў бы на вытворчасьць.
— І ты ўсё гэта напісала?
— Так, – кажа Маруся, – напісала. У мяне ж відзежа была. Я яшчэ пачала прыдумваць розныя варыяцыі на гэтую тэму, там, скажам, усе элемэнты, прысутныя ў газе, трапіўшы ў паветра, пачыналі дзейнічаць толькі праз 45 хвілінаў. І калі палівалкі

выкідалі газ у паветра, напрыклад, у 6.15, да 7-й ён дзейнічаў толькі часткова і быў якраз надзвычай шкодным для чалавечага арганізму.
— А гэта для чаго?
— Каб адрэгуляваць распарадак дня ў гарадах. Калі ты выпрасься на вуліцу да 7-й – ты хапаеш сваю пайку шкодных рэчываў і цябе цэлы дзень выкручвае, разумееш? Пры гэтым, калі ты выходзіш з дому ну хаця б роўна а 7-й – ты нармальна закачваесься правільнай сумесьсю і цэлы дзень кілбасісься ў імя дабрабыту бацькаўшчыны, выходзіць эканомна і рацыянальна.
— І ты ўсё гэта напісала?
— Ага.
— Ведаеш, – кажу я, – я б на тваім месцы ўсё-ткі пагаварыў бы з татам. Пара бэтээраў – і пра твой газ ніхто не даведаецца... Альбо адна вадародная бомба, – дадаю, падумаўшы.

12.00 – 13.00
— Не, – кажа яна, – я лепш проста перапішу. Напішу пра нешта іншае. Скажам, пра трамвайнае дэпо.
— Уяўляю сабе гэтую работу, – кажу. – Слухай, у нас тут насамрэч праблема. У нашага сябра бацькі памерлі.
— Усе? – перапытвае Маруся.
— Не, – кажу. – Часткова. Айчым.
— А што за сябар?
— Карбюратар. Памятаеш яго?
— А які ён?
— Ну, – кажу, – у яго такі сьмешны твар, далёкаўсходні. Скулы высокія, вочы вузкія, памятаеш?
— Гэта такі, – гаворыць яна, – падобны да кітайца?
— Хутчэй да мангола, – адказваю.
— А якая розьніца?
— У манголаў няма пісьмовасьці.
— А ў кітайцаў?
— А ў кітайцаў пісьмовасьць была, яшчэ калі не было манголаў.
— Так, – гаворыць Маруся, – я яго памятаю. Ты калісьці зь ім прыходзіў. І што цяпер?
— Ну, што, – кажу, – цяпер нам трэба яго знайсьці. Заўтра

пахаваньне. А яго нідзе няма. Уяўляеш?
— Так, – гаворыць Маруся, – лажа. А як, ты кажаш, яго завуць?
— Карбюратар.
— Дзіўнае імя.

13.00 – 14.00
— Карбюратар?
— Ну.
— Слухай, – Маруся нарэшце падымае галаву і глядзіць на мяне больш-менш прытомна. – Дык гэта той чувак, у якога тата памёр?
— Айчым.
— Ды адзін хуй, – канчаткова прачынаецца Маруся. – Мне ўчора тэлефанаваў ваш знаёмы, гэты, такі тоўсты, брудны.
— Какава, – кажу.
— Што?
— Завуць яго так – Какава.
— Кашмар, – кажа яна. – Вось, дык ён учора тэлефанаваў, вас шукаў.
— Табе тэлефанаваў?
— Ну, а каму? – Маруся спрабуе падняцца на ногі. – Шукаў вас, казаў акурат пра гэтага вашага, як ты сказаў?..
— Карбюратара.
— О, Карбюратара. Сказаў, здаецца, што ведае, дзе ён.
— А дзе ён?
— Карбюратар?
— Ды не Карбюратар, – я таксама падымаюся, – гэты – тоўсты ўблюдак?
— Ён у Гошы. Адтуль і тэлефанаваў.
— Хто такі Гоша?
— Ты што? – пытаецца яна. – Ты дзе жывёш? Гоша – гэта рэдактар нашай наймаднейшай газэты. Гэтая ж вось скаціна, здаецца, у яго працуе, – Маруся паказвае на соннага Сабаку.
— Гэта рэдактар ці што? – да мяне нарэшце даходзіць.
— Ну, а я табе пра што кажу?
— А як да яго наш Какава трапіў?
— Адкуль я ведаю? – гаворыць Маруся і ідзе ў пакой.
— Пачакай! – крычу я ёй. – А ты яго тэлефон ведаеш?
— Ня ведаю, – крычыць Маруся аднекуль з кухні. – Адрас

ведаю. Я зь ім спала некалькі разоў, у яго дома. У яго вялікая кватэра, тут недалёка, на Гогаля. Ён там адзін жыве.
— Усё адно, пачакай, – я знаходжу Марусю на кухні, яна корпаецца ў лядоўні, дастае адтуль слоічак зь мёдам, падае ў крэсла і пачынае есьці. – Пачакай, – паўтараю, – а што ён табе сказаў?
— Што яшчэ? – Маруся на хвіліну задумваецца. – Больш нічога. Сказаў, што ведае, дзе гэты ваш... ну карацей, у якога тата памёр... то бок – айчым. Сказаў, што калі захочаце – можаце знайсьці яго ў Гошы.
— А як ён там апынуўся?!
— Ды адкуль я ведаю! – не вытрымлівае Маруся і пачынае крычаць. – Адкуль я ведаю? Можа, Гоша яго недзе зьняў!
— Як зьняў? – не разумею я.
— Моўчкі! Узяў – і зьняў. Ты што – ня ведаеш Гошу?
— Ня ведаю.
— Гоша – підар нумар адзін у гэтым дзёўбаным горадзе. Ён паводле гэтага прынцыпу і рэдакцыю сабе падбірае. Я зь ім з прынцыпу пераспала, тыпу – прынцып у мяне такі. Таму, можа, ён недзе зьняў вашага сьмярдзючку, адтрахаў, а цяпер утрымлівае ў сябе на Гогаля, я ня ведаю, адным словам, – яна замаўкае і працягвае зьлізваць свой жоўта-гарачы халодны мёд.

14.15
— Слухай, мы пойдзем.
— Угу, – кажа яна.
— Дай адрас Гошы.

Маруся дастае нейкі нататнік, абцягнуты жоўтай скурай, штосьці ў ім піша, вырывае аркуш і працягвае мне. На, гаворыць, толькі там трэба званіць доўга, кватэра вялікая, ён можа спаць і проста не пачуць. Скажаце, што ад мяне, а то ён вас ня пусьціць, зразумеў? Зразумеў, кажу, дзякуй табе, ну усё – валіце, кажа яна і адразу забываецца на нас. Мы ўжо выходзім, і тут – ужо ў дзьвярах – я паварочваюся і кажу ёй:
— Маруся, – кажу я. – Слухай, тут такая рэч.
— Ну?
— Можа, возьмеш нашага Молатава?
— Молатава? – перапытвае яна.

— Ну, так, Молатава. Нам яго ўсё адно напружна цягаць за сабой, а табе, можа, прыдасца. Усё-ткі член цк.

Маруся падыходзіць да мяне, разглядае Молатава, праводзіць рукамі па ягоным твары і кажа:
— Добра. Я яго вазьму. Ён мне падабаецца – ён падобны да майго таты. У яго такая самая хуйня на кіцелі.
— Гэта не хуйня, – кажу я. – Гэта ордэн Леніна.

Добра, кажа Маруся, хрэн з вамі – вось вам бабкі – яна суе мне купюру, давайце, я вас адвязу, а то вас заграбуць яшчэ ў пад'езьдзе, пастаў, кажа яна мне, пастаў Молатава на бальконе, ён цяпер мой, я паслухмяна адношу Молатава на балькон, і мы ідзём уніз, Маруся падводзіць нас да гаража, брама гаража абабітая жалезам і медзьдзю, сапраўдная табе брама ў пекла, за такой брамай трэба хаваць драконаў або атамныя бамбардавальнікі, нешта апакаліптычнае, адным словам. Сьмешна, але ў Марусі там усяго толькі расхуячаны жыгуль, у самой браме ёсьць ячшэ адна – меншая, таксама абабітая жалезам, Маруся адчыняе менавіта яе, заходзьце, кажа, можа, кажа Вася, адчынім усю браму, вы заходзьце, кажа Маруся, я сама адчыню, а то хто-небудзь убачыць, як вы круціцеся каля гаража – пачне распытваць, я сама, лезьце ў машыну, мы заходзім у цёмны гараж, сапраўды бачым там расхуячаны, але цалкам баяздольны жыгуль і запіхваемся ўтрох на задняе сядзеньне – я, Вася Камуніст і Сабака Паўлаў, Сабака спачатку хоча лезьці на пярэдняе сядзеньне, але правае крыло наглуха разьбітае і ўмятае ў сярэдзіну, таму мы бяром Сабаку да сябе, так бы мовіць – на калені. Маруся нейкі час стаіць каля брамы, дастае аднекуль з кішэні джынсаў недабітую папяросу, хутка яе дабівае і раптам згадвае, што яна на нешта забылася, на што я забылася, думае яна, на што? чаму я каля гаража, мабыць, я хацела некуды ехаць, але куды? засяроджваецца яна, задуменна сядае за руль, ну, што, Маруся, нэрвова крычыць ёй Сабака, паехалі? паехалі, рэагуе на заклік Маруся, уключае рухавік і ўрубае задні ход. Адчыніць браму яна, канечне, забываецца.
— Вылезеш? – пытаюся.
— Вылезу-вылезу, – кажа Маруся. – Усё добра.
— Ідзі дахаты, – кажа ёй Вася. – Дойдзеш сама?

— Дайду, – кажа Маруся.
— Дакладна дойдзеш? – пытаецца Вася.
— Ага, – кажа яна і спрабуе зноў завесьці машыну.

Вася перахіляецца з задняга сядзеньня і забірае ў яе ключы. Разам мы выцягваем нашу сяброўку з крэсла кіроўцы, зачыняем за сабой гараж, укладваем ёй у рукі яе ключы і ідзём сабе, думаючы яшчэ – дойдзе яна ці ня дойдзе, і калі дойдзе – то куды, але так выходзіць, што пакуль мы выбіраемся на плошчу і глядзім адтуль на будынак насупраць муніцыпалітэту, Маруся нейкім цудам апынаецца на сваім бальконе і ўжо сядзіць там, прытуліўшыся да Молатава, два няшчасныя стварэньні – Маруся ў фірмовых драных джынсах і футболцы з «ролінг стоўнз» і Молатаў, член цк, стары геданіст, аматар кактэйляў – бліжэй да неба, няхай усяго толькі на некалькі мэтраў, але – бліжэй.

Частка другая

РАКА, ШТО ЦЯЧЭ СУПРАЦЬ УЛАСНАЙ ПЛЫНІ

15.15

Я цісну доўга і настойліва, у мяне проста няма выбару, што тут скажаш – калі яго тут зараз ня будзе, нам давядзецца вяртацца дахаты, а там яшчэ не вядома, што нас чакае, наагул – тады ўся гэтая задума страчвае сэнс, навошта мы тады другі дзень цягаемся па горадзе, спрабуем хоць нешта выправіць у гэтай, даволі-такі лажовай, сытуацыі, так што галоўнае – каб ён тут быў, але ніхто не адчыняе, і я ўжо думаю, ну, хопіць, ня выйшла, пахаваюць айчыма і, па ўсім, паедзе наш сябра потым на сорак дзён, калі ўжо ім так дужа трэба, яны могуць усё гэта для яго зафіксаваць, сфатаграфаваць ягоны попел, або зьняць на відэа, каб потым забіты горам Карбюратар пераглядаў жалобную цырымонію доўгімі зімовымі вечарамі, перад сном, Сабака ўрэшце не вытрымлівае і пачынае біць у дзьверы нагой, я хачу яго супакоіць, але тут за дзьвярыма чуецца нейкае шамаценьне, нехта, здаецца, ідзе, дзьверы сапраўды адчыняюцца, і да нас выходзіць лысы тоўсты чувак у сінім

ядвабным халаце.
— Што нада? – пытаецца ён.
— Нам Какаву нада, – адказвае яму Сабака.

Чувак моўчкі дастае з кішэні халата газавы пісталет і прыстаўляе яго да Сабачае пысы.
— Якую какаву? – пытаецца ён.
— Наш сябра, – перапужана говарыць яму Сабака. – Какава.
— Што ты грузіш? – нэрвуецца чувак, па ўсім відаць – Гоша.

Вася хаваецца за маёй сьпінай, а я думаю – як жа яго завуць, гэтага нашага Какаву – як жа ж яго завуць, як могуць назваць данбаскага інтэлігента? мабыць, Андрушай, сапраўды – Андрушай.
— Андруша, – кажу я. – Нам патрэбны Андруша. Мы яго сябры.
— Праўда? – недаверліва перапытвае Гоша. – Ну, добра, заходзьце, – кажа ён. Але пісталет не хавае. Раптам ён бачыць у Сабакі заплечнік і кажа: што там?
— Бухло, – кажа Сабака.
— Давай, – гаворыць Гоша.

Сабака дастае пляшку каньяку, аддае Гошу, той моўчкі запіхвае яе ў кішэню халата, і мы заходзім за ім і апынаемся ў велічэзнай кватэры, калідор цягнецца некуды ўглыб, мы ідзём за Гошам і выходзім на бязьмежную кухню, нехуёва яму, відаць, плацяць за аплёўваньне нашых сьвятыняў, думаю я з зайздрасьцю, на кухні сядзіць Какава, праўда, без касьцюму, таксама ў нейкім халаце, такое ўражаньне, што ў іх тут лазьня, сядзіць і п'е нешта зь вялікага кубка, магчыма, менавіта какаву і п'е, Андруша, гэта да цябе, кажа яму підар-рэдактар і, страціўшы да нас усякі інтарэс, зьнікае ў нетрах сваёй підарскай кватэры.
— Здароў, – радасна ўсьміхаецца нам Какава, мудак тоўсты.
— Здароў, Какава, – кажа Вася, – прыкольны халат. Ты ў ім цяпер заўжды будзеш хадзіць?
— Гэта мне Гоша даў, – тлумачыць Какава.
— Ну, хопіць, – перапыняю я. – Маруся казала, што ты тэлефанаваў, нешта пра Карбюратара казаў.
— Ага, – кажа Какава. – Я вам яшчэ ўчора хацеў сказаць, а вы і слухаць ня сталі.

— Чаго нам цябе слухаць, – пачынае Сабака, але Вася яго спыняе, маўляў, няхай гаворыць.
— Вось, – працягвае радасна Какава. – Вы пайшлі, а я потым думаю, трэба ж вас неяк папярэдзіць.
— Пра што папярэдзіць? – пытаецца Вася.
— Пра Карбюратара.
— Ты ведаеш, дзе ён?
— Ведаю.
— Ён у горадзе?
— Вы, што – лохі? – храбрыцца Какава, адчувае, мудак, што ён на сваёй тэрыторыі. – Ясна – гэтыя прыдуркі, але ты, Жадан, павінен быў ведаць, вы ж, здаецца, разам вучыцеся.
— Я хварэў, – кажу.
— Ага, – пагаджаецца ён, – у цябе гэта надоўга. Карбюратар даўно ў лягеры.
— У якім лягеры? – пужаюся я.
— Ён што – сеў? – пужаецца ў сваю чаргу Сабака.
— Ды не, куды ён сядзе, – сьмяецца Какава. – Ён у гэтым, у піянэрскім лягеры, ці як гэта цяпер называецца, працоўным, во. Там цяпер акурат гэты, як яго, першы тэрмін, не, ня тэрмін, завоз. Не, не завоз, зьмена. Прыедзе процьма малалетніх уёбкаў, і Карбюратар будзе іх вучыць, як ставіць намёт.
— Ні фіга сабе, – зьдзіўляюся.
— Ну, – кажа Какава, – у лягеры прыкольна. Цёлак шмат. Я некалі, яшчэ ў школе, езьдзіў раз, дык там да мяне адзін важаты чапляўся. Уяўляеце – підарам выявіўся.
— Вось і Карбюратар, мабыць, да кагосьці чапляецца, – кажа Вася.
— Ён што – таксама підар? – не разумее Сабака.
— Не, Карбюратар ня підар, – кажу я, – я яго добра ведаю. Хоць па-свойму – підар, канечне.
— Ну, і што рабіць? – пытаецца Вася ў Какавы.
— Яжджайце да яго, – кажа Какава. – Там файна. Цёлкі.
— Важатыя-підары, – дадае Сабака.
— А дзе гэта? – пытаецца Вася.
— За Вузлавой, – адказвае Какава. – Лягер «Хімік».
— Гэта што – для нейкіх мутантаў лягер? – пытаюся.
— Не, гэта для хімікаў. Значыць, сядаеце на электрычку і едзеце праз Чугуеў да Канцавой. Там чакаеце пару гадзінаў наступнай электрычкі і едзеце да Вузлавой. Там чакаеце яшчэ

пару гадзінаў і едзеце проста ў «Хімік». З Вузлавой можна і пешкі. Але выяжджаць трэба сярод ночы, інакш не пасьпееце. Там першая электрычка а чацьвёртай ранку. Акурат да абеду даедзеце. У Чугуеве можна бухнуць, – дадае ён чамусьці.
— Гэта як – на перакладных? – пытаецца Вася Камуніст.
— Ну, як хочаце, – незадаволена адказвае Какава. Відаць, у яго свая нейкая фішка па Чугуеве, часам такое трапляецца.

16.00
— А калі цяпер выехаць? – пытаюся на ўсялякі выпадак.
— Там, здаецца, апошняя электрычка а палове на пятую адыходзіць, – тлумачыць Какава. – Не пасьпееце. Яжджайце начной, – усьміхаецца ён.
— Ты што, сьмяесься? – незадаволена пытаюся ў яго. – Чаго гэта ты ўсьміхаесься, а?
— Нічога, – разгублена кажа Какава. – Проста так.
— Проста так, – кажу я незадаволена.
— Ну добра, – гаворыць Вася, – а ў вас тут пераседзець да вечара можна? Ці вы зараз трахацца пачняце?
— Я запытаю ў Гошы, – сарамліва кажа Какава.
— Пра што? – не разумее Вася, але Какава ўжо выбягае з кухні.
— Вось мудак, – незадаволена кажа яму ўсьлед Сабака.

16.15
— Гоша сказаў, можаце сядзець, – радасна забягае на кухню Какава. – Толькі ў туалеце акуратней.
— Ты чуў, Сабака? – гаворыць Вася. – У туалеце акуратней. Усё тое самае, толькі акуратней.
— Сядайце, – кажа Какава, узмахваючы крысамі свайго халату. – Гарбату будзеце?
— А гарэлка ёсьць?
— Не, гарэлкі няма. Гоша ня п'е.
— Ага, ня п'е, – кажа Сабака. – А каньяк забраў.
— У нас жа, – кажу, – яшчэ пляшка заставалася.
— Я не хачу каньяку, – кажа Вася. – У мяне пякотка ад яго. Давай, – прапаноўвае ён Сабаку, – ты зьлётаеш, гарэлкі купіш. У мяне яшчэ, здаецца, бабкі засталіся.

Вася дастае з кішэні рэшткі сваёй выручкі і аддае іх Сабаку.

Какава зачыняе за ім дзьверы, назад трапіш? пытаецца на парозе, без пантоў, кажа яму Сабака і зьнікае. А мы застаёмся яго чакаць.

16.30 – 18.00
— Можа, ён памёр?
— Можа, і памёр, – кажа Вася. – А можа, проста зьліняў з маімі бабкамі.
— Перастань, – кажу я. – Ты што – Сабаку ня ведаеш? Ён не зьліняе.
— Значыць – памёр, – кажа Вася.
— Я пайду, – нясьмела кажа Какава, ён тут з намі таксама сядзіць паўтары гадзіны, сумуе, але ісьці не ідзе, усё ж не вытрымлівае і гаворыць – я пайду.
— Куды ты пойдзеш? – пытаюся.
— Ну, – паказвае Какава рукой у калідор. – Туды. А вы тут сядзіце сабе. Можаце гарбаты запарыць. Калі што – паклічаце мяне.
— Давай, валі, – кажа яму ўсьлед Вася. – Слухай, – кажа ён мне, – як ён сюды трапіў?
— Ня ведаю, – кажу. – А мы як сюды трапілі? Бачыш, што ў сьвеце дзеецца?
— Дзе ж Сабака? – толькі і перапытвае Вася.

18.00 – 18.15

18.15 – 18.45

18.45 – 19.10

— Можа, яго пераехала чым-небудзь?
— Можа. Трамваем. Альбо токам.
— Якім токам?
— Электрычным.
— Лепш няхай ужо трамваем.

19.30
— У мяне яшчэ, здаецца, трава засталася.

— Што ж ты маўчыш?
— Забыўся, – кажа Вася і сапраўды знаходзіць у джынсах рэшткі травы. Усё, бабкі скончыліся, трава сканчаецца, колазварот вады ў прыродзе, інакш ня скажаш. – Колазварот вады ў прыродзе, – кажа мне Вася і забівае папяросу.

19.30 – 21.30

Нават згадаць няма чаго. Сядзім, маўчым, на нечым засяроджваемся і раптам заўважаем усе гэтыя рэчы навокал сябе, разумееце, старую кухню, скажам, нехта тут, мабыць, жыў і да гэтага, мне такія рэчы заўжды ўстаўлялі – проста тыя месцы, дзе я жыў, як правіла, былі ненашмат старэйшыя за мяне, іх маглі будаваць на маіх вачах, а тут нейкая мэбля, гара бруднага посуду, ён жыве, як скаціна, зусім не прыбірае за сабой, калі б ён быў маньякам, яго б вылічылі па рэштках трупаў у ягоных рондалях на кухні, я вось думаю: чаму такое памяшканьне не далі мне, я б трымаў яго ў чысьціні і цішыні, не пускаў бы сюды ніякіх дэбілаў, і сам бы сюды не прыходзіў для чысьціні экспэрымэнту, зачыніў бы дзьверы, заплямбаваў бы замок і пайшлі ўсе ў задніцу – асобна ўзятая кватэра ўзорнага побыту, калі я стану поўнагадовым прадстаўніком гэтага дзёўбанага грамадзтва, я пачну скупляць нерухомасьць, рамантаваць яе, прыводзіць у людзкі выгляд і заплямбоўваць, парадак павінен быць унутраным, ненаўмысным, кватэры, як ныркі: іх трэба ачышчаць ад рознага гаўна, інакш ня будзеш пасьпяваць прыбіраць трупы, у яго пахне кавай і кетчупам, салодкі пах кетчупу, пах нармальнага жыцьця і рэгулярнага харчаваньня, цярпець не магу, кетчуп зацякае мне пад скуру, я нюхаю свае пазногці – яны пахнуць кетчупам – кетчупам і распушчальнай кавай, мёдам і кетчупам, усе гэтыя слоікі і кухлікі, вялікія талеркі, перамазаныя яечняй, і відэльцы з засохлым чакалядам – усё гэта пахне кетчупам, мяне пачынае нудзіць, і я кажу Васю: пайшлі адсюль, куды? гаворыць ён, куды мы пойдзем? вечар на дварэ, нам яшчэ рана, нам трэба перачакаць тут, а потым паедзем ужо, давай перачакаем у гэтага підара, кетчуп, – кажу я, што? ня чуе Вася, кетчуп, крычу яму я, і ён ківае галавой, нібы хоча сказаць: ага, кетчуп-кетчуп, а як жа – кетчуп, пайшлі ў іншы пакой, кажу я, тут шмат

посуду, ён не ўпіраецца і мы выходзім у калідор і трапляем у вітальню, вітальня ў яго таксама заваленая розным антыкварным гаўном, чорт, мяне гэта заўжды раздражняе, у сэнсе, калі я бачу, што да мяне, высьвятляецца, таксама нехта жыў, і, у адрозьненьне ад мяне, жыў сапраўдным жыцьцём, еў сьняданкі, займаўся сэксам, можа, нават кахаў кагосьці, хадзіў на рынкі і ў крамы, купляў ня тое, што мог, а тое, што хацеў, кетчуп, у яго была праца, былі стасункі з рознымі людзьмі, ён апранаў тое, што яму падабалася, езьдзіў адпачываць, у яго быў сапраўдны адпачынак, езьдзіў на пікнікі, умеў гатаваць, смачна гатаваў розныя штукі і нават ня еў іх, кетчуп, кетчуп, калі хварэў, лячыўся ня толькі гарэлкай, а меў нейкія лекі, хатнюю аптэчку, знаёмых дактароў, у абедзенны перапынак мог зайсьці ў рэстаран, прычым не за тым, каб выпіць, а каб перакусіць, меў улюбёныя стравы, улюбёныя, бля, спэцыі, кетчуп, кетчуп, кетчуп, а дзе ў гэты час быў я? чаму тут не было мяне, сярод усіх іхных шафаў і канапаў, палітых кетчупам і цытрынавым сокам, чаму мяне ніхто не ўсынавіў, скажам, тады, калі я па некалькі дзён жыў на аўтавакзале і спаў на драўляных крэслах, або калі я некалькі дзён харчаваўся кіпенем, зрэшты, чаму мяне цяпер ніхто не ўсынаўляе, чаму мяне гэты підар усынавіць ня можа? я быў бы сынам підарскага палка, мне ўжо дзевятнаццаць, я ўжо дастаткова самастойны, я не патрабую пастаяннай увагі, мне ня трэба мяняць пялюшкі і мяне ня трэба карміць кашай – так, нейкі мінімальны харч, цёплая вада, туалетная папера, парнафільмы на відэа, цёлкі на кухні, канапля на бальконе, але нават гэта не галоўнае, галоўнае, каб бацькоўская ўвага была, нармальная і пастаянная бацькоўская ўвага, сапраўдная бацькоўская ўвага, як па тэлевізары.

Мы знаходзім прыкольную радыёлу, у мяне такая была ў дзяцінстве – на чатырох высокіх ножках, у драўляным корпусе, са шкляным экранам, на якім чырвоным напісаны назвы ўсіх паднябесных гарадоў, якія мне ў маім дзяцінстве сьніліся і якія мяне маглі пачуць – Прага, Варшава, Бялград, Усходні Бэрлін, на такой прыкольнай радыёле можна было слухаць вініл і радыё, у дзяцінстве я слухаў падрапаны вініл, але ў гэтага підара вінілу няма, ёсьць, праўда, нейкі занюханы саўковы бітлз, ну, але што мы з Васем – лохі, бітлз слухаць, ды яшчэ ў такім хімэрным стане, калі рэчы расьсейваюцца, а пахі

наадварот – склейваюцца, і разабрацца ва ўсім гэтым проста немагчыма, мы пачынаем круціць радыё, прыкольная радыёла сумна пахрыпвае, і мы чуем адразу тагасьветны голас:

Добры вечар, паважаныя радыёслухачы. Няхай лагода прыйдзе ў вашыя мірныя хаты.

— Хто прыйдзе? – пытаецца Вася.
— Лагода, – кажу. – У хаты.
— А, – кажа Вася.

Сёньня з вамі ў гэты цудоўны вечар,

— Ага, – гаворыць Вася, – цудоўны вечар: дождж цэлы дзень хуячыць.

як заўсёды па суботах у 22.00 маладзёжная праграма «Музычная талака» і я – яе вядучы хрррррррр хрррррррр, дадае ад сябе радыёла. Сёньняшні выпуск нашай праграмы будзе цалкам прысьвечаны творчасьці папулярнага ірляндзкага гурту, вядомага ня толькі ў нас, але і ў іншых краінах Эўропы – ансамбля «Дэпэш Мод». Свае пытаньні, а таксама думкі вы можаце выказаць па тэлефоне хррррр хрррррррр хрррррррррр – гаворыць вядучы.

— Якая прыкольная праграма, – кажу я.
— Ну, – кажа Вася, – лепш, чым бітлз.

І пакуль вы будзеце задаваць свае пытаньні, гучыць інструмэнтальная кампазыцыя сьцяпана галябарды «Ліст да мамы».

Кампазыцыя сапраўды пачынае гучаць, і нас адразу пачынае ад гэтага развозіць, гэты сьцяпан галябарда ўкладвае ў сваю іёніку

столькі галюцынагену, настолькі ўсё гэта стромна гучыць, што цябе ня можа не разьвезьці, іх на радыё, мабыць, паводле гэтага прынцыпу і на працу бяруць, так, каб яны ўрубалі, і народ ахуяваў на пятай сэкундзе іхных музычных кампазыцыяў, так, каб ён – гэты неймаверны і нерэальны сьцяпан галябарда – толькі кранаў сваімі пульхнымі валасатымі пальчыкамі пластмасавыя клявішы іёнікі – і бац – цябе перамыкае, і ты пераўтвараесься ў прыладу божага промыслу і ўжо не адпаўзаеш ад радыёпрыёмніка, аж пакуль не перададуць прагноз надвор'я на заўтра; мы сядзім пад нашай прыкольнай радыёлай, абапёршыся сьпінамі на яе і прываліўшыся адзін да аднаго, каб нас ня зьнесла ўбок, разглядаем крэслы, шафы і канапы, ты адчуваеш, кажу я, як тут пахне цытрынамі? адчуваю, кажа Вася, цытрынамі і кашацінай. Не кашацінай, кажу, не кашацінай – кетчупам. Кашацінай, не згаджаецца ён. І кетчупам, дадаю я.

Гэта была інструмэнтальная кампазыцыя сьцяпана галябарды «Ліст да мамы», гаворыць касьмічны радыёвядучы, выконваў аўтар. А наша сёньняшняя праграма, нагадваю, прысьвечана творчасьці вядомага ірляндзкага калектыву «Дэпэш Мод». Асновай для праграмы стала дакумэнтальнае дасьледаваньне Дэвіда Баскомба «Бог як разнавіднасьць гераіну», выдадзенае ў гэтым годзе на вялікабрытанскіх выспах і ласкава перакладзенае і дасланае нам нашай лёнданскай рэдакцыяй. Вось жа, «Дэпэш Мод» (гучыць мэлядычная застаўка, падазраю, таго ж такі сьцяпана галябарды, бо мы зноў замбуемся). Сярод нашай моладзі ўжо даўно карыстаецца папулярнасьцю творчасьць гэтых парубкаў з Ольстэру. У чым жа сакрэт такога посьпеху нікому не вядомых хлопцаў, што вырасьлі ў самым сэрцы ірляндзкіх кляк? Паспрабуйма разам з вамі, паважаныя радыёслухачы, разабрацца ў гэтым. Як сьцьвярджаюць біёграфы, адным шэрым восеньскім ранкам 1962 году (сьцяпан галябарда дадае сваёй іёніцы трагічнасьці, цяжка ціснучы пластмасу пульхненькімі пальчыкамі) у партовым Ольстэры, акупаваным брытанскімі калянізатарамі, у сям'і простага ірляндзкага марака і машыністкі, Бэна і Марыі Ганаў, неспадзявана нарадзіўся хлопчык. Бацькі досыць насьцярожана паставіліся да малога, паколькі гэта было ўжо пятае ікнае

дзіцё, папярэднія чацьвёра, як сьцьвярджае містэр Баскомб, памёрлі раптоўнай сьмерцю ў раньнім дзяцінстве ад цяжкай формы ўнутрыкішэчнай інфэкцыі, вельмі распаўсюджанай у найбольш бедных прыпартовых кварталах Ольстэру. Натуральна, што такі незайздросны лёс быў вызначаны і пятаму сыну Ганаў – цяжкія ўмовы акупацыйнага побыту не давалі ягоным бацькам падставаў чакаць сьветлай будучыні для свайго гаротнага першынца. Хлопчыка вырашылі назваць Дэйвам – у гонар сьвятога Дэйва, які, як вядома, ёсьць патронам ірляндзкіх партызанаў і пэўным сымбалем невялічкага, у параўнаньні з нашым, народу ў яго барацьбе з брытанскімі калянізатарамі. Са сьвятым Дэйвам зьвязана шмат народных легендаў і паданьняў карэннага ірляндзкага насельніцтва, у прыватнасьці, у даўнім ірляндзкім эпасе ён лічыцца богам жывёлагадоўлі, мяса-малочнай вытворчасьці і проста плоднасьці. Яшчэ і цяпер ірляндзкія футбольныя фанаты, ідучы на спартыўныя арэны і падтрымліваючы сваіх улюбёнцаў, дружна напяваюць: «Сьвяты Дэйве, адтрахай сёньня гэтых чортавых католікаў». Бацька Дэйва, стары вірлавокі Бэн, здаўна славіўся сваёй прыхільнасьцю да дзейнасьці ІРА і рэгулярна пералічваў у кантар на рахунак арміі складку са свайго мізэрнага марацкага заробку.

— Гэта ўжо бітлз? – перапытвае Вася.

Мама Дэйва працавала ў партовай канторы машыністкай і, рызыкуючы сваім жыцьцём і рэпутацыяй, час ад часу дапамагала паўстанцам выпраўляць іхныя кіроўцаўскія і шлюбныя пасьведчаньні. Такім чынам, юны Дэйв падрастаў у атмасфэры нацыянальнай сьвядомасьці і нянавісьці да каралевы-маці, прынца Чарлза і ўсіх яго малалетніх выблядкаў, ва ўсялякім разе, так сьцьвярджае містэр Баскомб. Першым эмацыйным узрушэньнем для будучага артыста эстрады стаўся выпадак, калі падчас разгону традыцыйнай для ірляндзкіх сэпаратыстаў першамайскай дэманстрацыі праз каталіцкія раёны Ольстэру конныя брытанскія паліцэйскія згвалцілі тату Дэйва… не, – раптам запінаецца вядучы, – ня тату. Маму. Так – Дэйваву маму. Перапрашаю, паважаныя радыёслухачы, – гэтую

інфармацыю для нас пераклалі нашыя калегі зь лёнданскай рэдакцыі, таму магчымыя некаторыя стылістычныя недакладнасьці. Такім чынам, Дэйваву маму. Проста на вачах будучай зоркі шоў-бізнэсу. Гэта, бясспрэчна, стала не абы-якім стымулам... то бок не абы-якім узрушэньнем для маладога хлопца, які ня меў дагэтуль падобнага досьведу, і асновай для яго будучага першага дыску, які адразу зрабіўся плятынавым. Але пра гэтыя і іншыя прыемныя рэчы – пасьля невялічкай музычнай паўзы. (Вядучы робіць паўзу.) Музыка і словы сьцяпана галябарды. «Мая мама». Выконвае аўтар.

Сьцяпан галябарда цяжка кранае сваімі валасатымі пальчыкамі клявіятуру, я скурай адчуваю гэтае ягонае варушэньне тоўстымі, валасатымі, чырвонымі адросткамі, робіць пройгрыш на сваёй плястмасавай іёніцы і пачынае сьпяваць. «Я спытаў у ветра, каля брамы, – сьпявае ён, – ці ня бачыў ты, та-ра-рам, маёй мамы. Ты схадзі, штосьці там та-ра-ра-рам, за тую браму, там я бачыў, та-ра-ра-рам, тваю маму». «Тваю маму, тваю маму», – хмурна ўступае хор.

— Гэта што – хор? – пытаюся я, павярнуўшыся.
— Хор, – няўпэўнена адказвае Вася.
— Слухай, а я думаў, што сьцяпан галябарда сам сьпявае.
— Гэта хор.
— Што хор?
— Сьцяпан галябарда – гэта хор, – кажа Вася.
— Як гэта?
— Так. Вось паслухай.

«Тваю маму, тваю маму», – сумна падтаквае сьцяпан галябарда з касьмічных глыбіняў.

— Ты ведаеш, – кажу я, – калі гэта і хор, то нейкі нядобры хор. Нейкі злы хор. Чуеш, як яны пра маму?

«Тваю маму», яшчэ раз пагрозьліва адгукаецца сьцяпан галябарда.

— Мне здаецца, – кажа Вася, – яны нас падслухоўваюць.
— Ага, здаецца, яны насьцярожыліся, чуеш – змоўклі?
— Яны нас пасуць.
— Наўрад ці. Навошта гэта ім?
— Ня ведаю. Можа, яны зь міліцыі.
— Так, нейкія яны нядобрыя.
— Я кажу табе – больш упэўнена гаворыць Вася, – мянтура, сто пудоў мянтура. Чуеш – замоўклі, сукі.
— Пачакай, – кажу я, – не завадзіся. Якая ж гэта мянтура? Мянтура не сьпявае.
— Ага, не сьпявае. Сьпявае. Ты глядзеў калі-небудзь навіны?
— Што?
— Навіны.
— А. Не, не глядзеў.
— А я, – кажа Вася, – глядзеў. Там паказвалі мангольскіх міліцыянтаў. У іх быў дзень незалежнасьці, і яны сьпявалі.
— Што – усе?
— Ну, не, ня ўсе. Хор. Вось таксама, як тут, – паказвае Вася на прыкольную радыёлу. – Стаялі, гады, і сьпявалі.
— Ну, і што?
— Ну, і тут тое самае. Гэта мянтура, павер мне.
— Ды ладна.
— Я табе кажу.

Х р р р

— Што значыць?
— Ну, вось гэтая «галябарда» што значыць?
— Ну, і што?
— Гэта і значыць мянтура.
— Ды ідзі ты.
— Я табе кажу. Гэта мянтура. Гэта хор мангольскіх міліцыянтаў.
— Сьцяпан галябарда – гэта хор мангольскіх міліцыянтаў?
— Так.
— Сьцяпан галябарда?
— Сто пудоў.
— Ну, добра, – кажу я. – Я яшчэ магу пагадзіцца з тым, што іх там сапраўды шмат, нават з тым, што яны зь міліцыі.
— З мангольскай міліцыі, – удакладняе Вася.
— Добра – з мангольскай міліцыі. Але чаму яны называюцца сьцяпан галябарда?
— Дык гэта ж па-мангольску і значыць – «хор мангольскіх міліцыянтаў»!
— Сьцяпан галябарда – гэта «хор мангольскіх міліцыянтаў»?
— Так. Па-мангольску.
— Значыць, сьцяпан галябарда – гэта множны лік?
— Так. Гэта множны лік, – упэўнена кажа Вася.
— Во, бля.

Дваццаць другая гадзіна дваццаць хвілінаў. У этэры – «Музычная талака»! – радасна ўрываецца ў пакой голас вядучага. Працягваем наш аповед пра творчасьць легендарнага ірляндзкага народнага калектыву «Дэпэш Мод». Як кажуць у народзе – бяда ідзе, бяду вядзе. Увосень 1970 году, халодным верасьнёўскім вечарам, бацька Дэйва – вірлавокі Бэн, пасьля працяглай цяжкай агоніі, зьвязанай зь цяжкімі цялеснымі болямі і маральнымі перажываньнямі, шчасьліва памёр, пакінуўшы сіротамі жонку-пакрытку і малога хваравітага Дэйва. Паміраючы, стары марак сказаў сыну: «Усё сваё жыцьцё я аддаў барацьбе за незалежнасьць Ірляндыі, не забывай гэтага, Дэйве. Годна нясі праз усё жыцьцё імя ірляндца, не давай гэтым сукам, гэтым факін-каталікам узяць цябе за геніталіі, памятай, бляха-муха, што ты з гордага роду Ганаў, а Ганы, бля, дадаў ён моцнае марацкае слоўца, ніколі не прагіналіся пад

гэтымі факін-каталікамі, зразумеў, ты, ублюдак малалетні?» – сказаў ён і з тым памёр. Малому Дэйву засталіся ад яго ў спадчыну толькі жэтон на рыбалавецкі човен і стары губны гармонік. Жэтон малы Дэйв адразу ж згубіў, гармонік, у прынцыпе, таксама, што не зашкодзіла яму, аднак, стаць у будучым зоркай шоў-бізнэсу.

Пачатак музычнай кар'еры біёграфы Дэйва зьвязваюць з тым сямейным бязладзьдзем, што ўзьнікла ў дружнай сям'і Ганаў пасьля сьмерці бацькі. Дэйвава мама, ня маючы сілаў для супраціву і далейшай барацьбы, устае на шлях калябарацыянізму, проста ў сваёй канторы аддаючыся афіцэрам вялікабрытанскіх ваенна-марскіх сілаў. Малы Дэйв балюча перажывае маральнае падзеньне блізкага яму чалавека... ну, то бок я так разумею мамы, дадае ад сябе вядучы. Тады ж ён упершыню знаёміцца з наркакультурай, і гэта – паводле сьпевака – робіцца адным з найбольш прыемных адкрыцьцяў у ягоным жыцьці... Не, раптам папраўляецца вядучы, мабыць, усё-ткі не наркакультурай. Проста – культурай. А, тваю маму – урэшце ён абломваецца выпраўляць сваіх калегаў зь лёнданскай рэдакцыі, і далей ужо чытае з аркуша, што там ёсьць. Менавіта ў гэты момант свайго жыцьця і ў такім стане малады Дэйв Ган пачынае займацца музыкай. Спачатку ён яе слухае, але зь цягам часу яму гэтага робіцца недастаткова, і Дэйв вырашае стварыць уласны музычны калектыў, каб праз музыку выславіць свае пачуцьці, якія яны там у яго былі. Халодным восеньскім вечарам 1980 году ў адным з партовых ольстэрскіх бардэляў Дэйв сустракае сымпатычную бляндынку, якую звалі Гор. Гор, перачытвае вядучы, ну так: якую звалі Марцін Гор.

— Во яго прэ, – кажа Вася.
— Ціха, – кажу, – а то зараз зноў пачнецца.

У жыцьці юнага Дэйва зьяўляецца перашае сур'ёзнае захапленьне. Разам з сымпатычнай бляндынкай Марцін Гор яны зьбіраюць першы склад «Дэпэш Мод». Абавязкі ў калектыве дзеляць пароўну – Дэйв сьпявае ірляндзкія песьні, грае на некалькіх музычных інструмэнтах, а яго сымпатычная

бляндынка танчыць на сцэне і займаецца фінансавым бокам справы. Неўзабаве ў іх нарадзілася дзіця.

— У каго нарадзілася дзіця? – пытае Вася.
— У «Дэпэш Мод».
— Праўда? – Вася зьдзіўляецца. – Цікава, ад каго.
— Ад сьцяпана галябарды, – кажу.

...То бок не, не дзіця, зноў папраўляецца вядучы, дзецішча, у іх зьяўляецца першае дзецішча – альбом «Гавары і запісвай», які адразу ж робіцца плятынавым. А зараз – ён змучана пераводзіць дых, канчаткова, здаецца, заблытаўшыся ў сцэнары – мы яшчэ раз зробім музычную паўзу і паслухаем наступную музычную кампазыцыю. «Маміны вочы». Сьпявае сьцяпан галябарда.

«Маміны сінія вочы, – адразу ж бяруцца за справу сьцяпан галябарда, – бачу вас як на далоні я – усе вы па-ра-рам смуткам апавітыя і трошкі ад сьлёзаў салёныя». «Трошкі ад сьлёзаў, трошкі ад сьлёзаў», – назадаволена зацягвае хор.

Трошкі салёныя, думаю я, гэта добра ці дрэнна? Мабыць, усё-ткі дрэнна, было б лепш, каб іх нармальна пасалілі, калі я ўсё правільна разумею.

— Во бля, – гаворыць Вася. – Ну і жукі.
— Дзе жукі? – не разумею я. – Ты пра што?
— Пра маму.
— Што пра маму?
— Захбвалі маму, – задаволена кажа Вася, так, нібы спраўдзіліся нейкія ягоныя падазрэньні наконт гэтага сьвету.
— Хто захбваў?
— Ну, гэтыя – сьцяпан галябарда.
— Ды ну. Гэта ж яны так проста.
— Нічога ня проста. Чуеш, што кажуць – трошачкі салёныя.

«Па-ра-рам толькі вуснамі да вас дакрануся», – працягваюць

сьцяпан галябарда...

— Смакуюць, гады, – камэнтуе Вася.
— Перастань, – кажу. – Гэта проста сьмешна.
— Вуснамі, – кажа Вася. – Дакрануся. Гурманы хэравы.
— Перастань. Яны ж пра іншае.
— Пра іншае? І пра што? Захбвалі сваю вялікую мангольскую маму, а ты кажаш – пра іншае.
— Ды ніхто іхную маму ня хбваў. Як ты ўвогуле гэта сабе ўяўляеш? Як можна вочы есьці? Вось як вочы ядуць?
— Маміны? – перапытвае Вася.
— Якія маміны? Маміны вочы ніхто ня есьць, – нэрвуюся я.
— Сьцяпан галябарда – ядуць, – настойвае Вася.
— Ну, добра, – пагаджаюся. – Няхай маміны. Але лепш усё-ткі ня маміны. Там, вочы жывёлаў, напрыклад, як ядуць? Або вочы рыбаў?
— У рыбаў маленькія вочы, іх ніяк не ядуць, – гаворыць Вася.
— Гэта ў маленькіх рыбаў маленькія. А ў вялікіх – вялікія. У акулаў, прыкладам.
— Акулы – гэта ня рыбы.
— А хто гэта, па-твойму?
— Па-мойму, гэта ня рыбы.

Я лёгка пагаджаюся, усё можа быць – магчыма, у ягонай пэрсанальнай карціне сьвету акулы – гэта ня рыбы, чаму я павінен пераконваць яго ў чымсьці супрацьлеглым.
— Ну, добра, – кажу, – добра. Хай не акулы. Ну, гэтыя, як іх? Скбты!
— Скаты? – зь недаверам пытаецца Вася.
— Так, – кажу. – Скаты. Як іх вочы гатуюць?
— У іх няма вачэй.
— Як няма?
— Так. Няма. Яны жывуць на такой глыбіні, дзе сьвятло расьсейваецца, і вочы ім не патрэбныя.
— А як жа яны рухаюцца?
— Хто?
— Скаты. Электрычныя.
— А яны ня рухаюцца.
— Як гэта ня рухаюцца? А што ж яны жаруць?

— Плянктон.
— Плянктон?
— Плянктон. Плянктон таксама ня рухаецца. І скаты ня рухаюцца. Так яны і жывуць.
— Ну, добра, – кажу я зноў, – добра. А як яны трахаюцца?
— Хто? Скаты?
— Так, – кажу. – Электрычныя скаты.
— Навобмацак, – кажа Вася.

Я спрабую ўявіць сабе палавы акт электрычных скатаў. Выходзіць кашмарна: па-першае, у вадзе, па-другое – навобмацак, а па-трэцяе – цябе пры гэтым увесь час б'е токам!
— Вочы, мабыць, марынуюць, – кажу я, падумаўшы. – Закатваюць у слоікі і прадаюць як кансэрвы.
— Ага, – кажа Вася. – Уяўляеш, у іх ва Ўлан-Удэ ў гастраномах, мабыць, можна купіць кансэрвы, на якіх па-мангольску напісана: «Вочы маміны. Марынаваныя».
— Ага, – кажу, – а ўнізе, драбней, дапісана – «трошкі салёныя».

А для тых, хто ў гэты позьні час яшчэ пакуль ня сьпіць, мы працягваем наш аповед пра імклівы ўзьлёт сямейнага дуэту «Дэпэш Мод». У лютым гэтага году выйшаў новы сынгл калектыву, «I feel you», у якім, у прыватнасьці, гаворыцца:

I feel you
Your sun it shines
I feel you
Within my mind
You take me there
You take me where
The kindom comes
You take me to
And lead me through Babylon

што прыблізна перакладаецца так: «Прабач мне, мама, прыблуднаму сыну, я ўжо далёка ня той, якім быў тады, у часы нашага бестурботнага дзяцінства, злая цэнтрабежная сіла

наркаманіі і пэдэрастыі засмактала мяне ў свае глыбіні, і жыцьцё маё – руская рулетка, без канца і без пачатку. Але, працягвае вядучы, здаецца, ужо ад сябе, я веру, мама, што мы яшчэ сустрэнемся ў нашым старым добрым Ольстэры, і надаем разам, ты чуеш, мама? абавязкова разам, надаем па задніцы факін-каталіцкім акупантам, наматаем іхныя языкі і геніталіі на магутны махавік ірляндзкай грамадзкай думкі, як таго прагнуў наш няшчасны бацька, вірлавокі Бэн, і як вучыў таварыш Троцкі, Леў Давыдавіч, і як заклікаў нас сьвяты Дэйв і беззаганная панна – старая партызанская курва!» Вядучы робіць паўзу, пэўна, думае, ці не запусьціць яму яшчэ раз сьцяпана галябарду, гуляць дык гуляць, але ўрэшце абломваецца і вядзе далей: Ужо сёньня, з дыстанцыі столькіх гадоў, можна сказаць, што творчы лёс калектыву склаўся найлепшым чынам, і што такой музычнай кар'еры можна толькі пазайздросьціць – гурт працягвае пасьпяхова гастраляваць, выпускае час ад часу новыя альбомы, якія імгненна апынаюцца на вяршынях найразнастайнейшых гіт-парадаў, гаротнік Дэйв шчасьліва сядзіць на гераіне і злазіць зь яго не зьбіраецца, ды і навошта, дарагія радыёслухачы, яму зь яго злазіць? было б у вас, кажа вядучы, столькі бабла, вы б таксама ні пра што, акрамя гераіну, ня думалі. Сядзелі б і ўтыкалі, і сраць хацелі б на крызіс духоўнасьці і падзеньне валавога прадукту, бо нахера табе валавы прадукт, калі ты ўжо зранку зараджаны і дакладна ведаеш, што на вечар у цябе таксама нешта ёсьць, сядзі сабе і ўтыкай, ні пра што ня думай, а тут ябошысься-ябошысься, гнеш хрыбет на гэтых гандонаў тлустых, якія вучаць цябе, як табе жыць, нажываеш гемарой на іхным дзёўбаным радыё, і ніводная сука табе ня скажа дзякуй, адны мудакі навокал, мудакі і прыдуркі, тэкст, сукі, нармальна перакласьці ня могуць, сядзяць у сваім траханым Лёндане, на сваім, бля, туманным альбіёне, і ня могуць нармальна перакласьці тэкст пра гэтую дзёўбаную бляндынку Марцін Гор, што за бляндынка такая? трахаў я такіх бляндынак, касьцюма няма нармальнага, у госьці ўжо некалькі гадоў не хадзіў, зубы, сука, гніюць, а гэтая падла на гераіне, разам са сваёй бляндынкай, сука, ненавіджу, падла, гэта была праграма «Музычная талака» і я, яе вядучы хрррррр хрррррр, дзякуй вам, паважаныя радыёслухачы, што былі з намі ў гэты позьні час, і хай вам заўжды ўсьміхаецца лёс.

А наш маладзёжны канал працягвае сваю работу, і калі вам ёсьць што сказаць, можаце зрабіць гэта па тэлефоне хррр хр хр.

— Запісваю, – раптам кажа Вася, – стоп: запісваю.

Ён сапраўды дастае з кішэні джынсаў пакусаную шарыкавую асадку і піша ў сябе на левай далоні нумар. Навошта табе гэта? кажу, перастань, тут тэлефона, мабыць, няма, як няма? гаворыць Вася, устае і няцьвёрда рушыць у бок спальні, трымаючы перад сабой выцягнутую левую далонь з запісаным на ёй нумарам. Дзьверы ў спальню зачыненыя, але Вася пачынае стукаць, што табе? нарэшце адгукаецца адтуль наш сябра, здаецца, мы іх там ад чагосьці адрываем, мужык, дай тэлефон, крычыць Вася, наш сябар змаўкае, пэўна, думае, ці да яго гэта зьвяртаюцца, Вася працягвае стукаць, ну, мужык, крычыць ён, хопіць ужо трахацца, дай тэлефон, а мы і ня трахаемся, хутка адказвае наш сябар, дзьверы неадкладна адчыняюць, у іх прасоўваецца голая валасатая рука (вось яно, думаю я, сьцяпан галябарда з намі), што трымае тэлефон, Вася на ўсялякі выпадак прасоўвае ў дзьверы сваю левую руку з нумарам, каб там і не сумняваліся, што яму патрэбны тэлефон, хутка забірае апарат, за якім цягнецца доўгі-доўгі шнур, дзьверы адразу ж зачыняюцца, і Вася ідзе назад, зараз, кажа, я гэтаму чортаваму вядучаму патэлефаную, навошта? пытаю, зараз-зараз, пабачыш, Вася ставіць апарат на падлогу, і, спраўджваючы лічбы на левай руцэ, правай пачынае накручваць дыск, прыціскаючы слухаўку вухам і гаворачы, зараз-зараз, я гэтаму підару

гэта былі апошнія навіны, ласкава перакладзеныя і перададзеныя нам нашай лёнданскай рэдакцыяй. А я прапаную вам, паважаныя радыёслухачы, зрабіць яшчэ адну музычную паўзу, ага, раптам кажа вядучы, у нас, здаецца, тэлефонны званок, паслухаем, хто гэта

усё скажу, алё, гаворыць Вася, алё.

ня сьпіць гэтай позьняй парой. Гаварыце...

я гэтаму підару зараз усё скажу, зараз-зараз

гаварыце-гаварыце, вы ў этэры

там нехта ёсьць, Вася разгублена працягвае мне слухаўку

ну, яшчэ б, кажу

а хто гэта? спалохана пытаецца Вася

підар, кажу я, якому ты ўсё хацеў сказаць. Так што давай.

— Я слухаю вас, – трохі нэрвова гаворыць вядучы, ён заўважна стаміўся ад такой работы, ну, але мае даседзець, дзявацца няма куды.
— Алё, – кажа Вася на ўсялякі выпадак.
— Вы ў этэры, – кажа вядучы.
— Што? – не разумее Вася.
— Гаварыце-гаварыце.
— Што яму сказаць? – пытаецца ў мяне Вася шэптам.
— Ня ведаю, – шапчу ў адказ. – Пра музыку што-небудзь запытай.
— Пра музыку?
— Пра «Дэпэш Мод». Ведаеш што-небудзь пра «Дэпэш Мод»?
— Ня ведаю.
— Ну, тады што-небудзь пра музыку ўвогуле. Пацягні час, каб ён не зарыентаваўся. Гэта галоўнае.
— Добра, – напружана кажа Вася і прыкладвае слухаўку да вуха. – Добры вечар.
— Як вас завуць? – цярпліва пытаецца вядучы.
— А навошта вы пытаеце?
— Ну, я ўсіх пытаю, калі хто дазвоніцца – як вас завуць.

— Праўда ўсіх? – удакладняе Вася.
— Усіх-усіх, – заспакойвае яго вядучы. – То як вас завуць?
— Ну, – пачынае таргавацца Вася, – мяне завуць... А вас як завуць?
— Мяне?
— Так, вас.
— Ну, мяне, – какетнічае вядучы. – А, ладна, бог зь ім. Што вы ўвогуле хацелі?
— Ад каго?– зноў не разумее Вася.
— Ну, ад мяне.
— Што? – шэпча мне Вася.
— А я ведаю? – адказваю. – Пагавары зь ім пра музыку. Галоўнае – пацягнуць час, разумееш?
— Разумею, – кажа Вася. – На, сам пацягні.

Ён тыцкае мне ў морду слухаўку, я ўдыхаю паветра і адчуваю, як моцна слухаўка пахне кетчупам, так, нібы яе нехта доўга пхаў у вядзерца са спэцыямі, кетчуп проста сьцякае па ёй, мяне адразу ж пачынае выварочваць.
— Слухай, – кажу я Васю, – ты тут патрымайся, я пайду адалью. Галоўнае – сачы за мовай, не кажы лішняга! Ты зразумеў? Сачы за мовай! Не кажы лішняга! Сачы за мовай! – крычу я ўжо з сарціру.
— Алё, – нагадвае пра сябе вядучы. – Вы там яшчэ жывыя?
— Сачы за мовай, – хмурна кажа яму Вася.
— Прабачце?
— І не кажы лішняга! – дадае Вася.
— Дык пра што вы хацелі пагаварыць?
— Ну, ня ведаю, – кажа Вася, – пра музыку.
— Пра музыку?
— Так. Пра «Дэпэш Мод».
— Цудоўна.
— Так? – зь недаверам перапытвае Вася.
— Цудоўна, – запэўнівае яго вядучы. – Вам спадабалася нашая праграма?
— Не, – гаворыць Вася.
— Чаму? – пытаецца вядучы.
— Мне, – спрабуе патлумачыць Вася, – не спадабалася пра шоў-бізнэс.
— Так-так, – гаворыць вядучы.

— Вы разумееце, – Вася доўга падбірае словы, цягнучы час, – я ня тое што не люблю шоў-бізнэс, хоць, мабыць, усё-ткі не люблю.
— А «Дэпэш Мод» вы любіце? – здаецца, вядучы таксама вырашыў пацягнуць час.
— «Дэпэш Мод»?
— «Дэпэш Мод».
— Не, не люблю.
— Ну, то, можа, раскажыце нам якую-небудзь гісторыю? – ня хоча яго адпускаць вядучы.
— Гісторыю?
— Так. Якую-небудзь гісторыю.
— Добра, – згаджаецца Вася, – раскажыце.
— Не, – нэрвуецца вядучы, – гэта вы раскажыце.
— А чаму я? – насьцярожваецца Вася.

Тут і я вяртаюся, што там? паказваю на слухаўку, а, кажа Вася, мужык гісторыі расказвае, прыкольна, слухай, кажа ён мне, давай дадому правядзём тэлефон, такія рэчы можна рабіць.
— То як? – адгукаецца вядучы. – Як там з гісторыяй?

Вася запытальна глядзіць на мяне.
— Ды раскажы ты яму якую-небудзь гісторыю, – шапчу я, – а то ён не адчэпіцца.
— Пра «Дэпэш Мод»? – пытаецца Вася ў слухаўкі.
— Пра «Дэпэш Мод», – пагаджаецца вядучы.
— Добра, – кажа Вася, – я магу вам расказаць адну гісторыю, але яна, як бы гэта сказаць...
— Ня надта прыстойная? – хіхікае вядучы.
— Не, – павольна кажа Вася. – Яна проста сумная. Расказаць вам сумную гісторыю?
— Але яна пра «Дэпэш Мод»? – на ўсялякі выпадак перапытвае вядучы.
— Ды пра «Дэпэш Мод», пра «Дэпэш Мод», – кажа Вася, – не хвалюйцеся. З чаго б я вам расказваў не пра «Дэпэш Мод»? Але сумная.
— Ну, добра, – згаджаецца вядучы, – давайце вашую сумную гісторыю. Толькі каб пра «Дэпэш Мод», – строга дадае ён.
— Так, – кажа Вася, – пра «Дэпэш Мод». Я, калі вучыўся ў дзясятай клясе, у Чаркасах, то ў мяне быў сябра, не, ня тое каб

сябра, хутчэй проста аднакласьнік, разумееце?
— Разумею, – проста кажа вядучы.
— І ён у прынцыпе нармальны чувак быў, нічым такім асаблівым не адрозьніваўся, вы разумееце, пра што я?
— .....
— Але ў яго фішка была.
— Фішка?
— Ну так – фішка. Ён, разумееце, як бы гэта сказаць – вось вы тут казалі шоў-бізнэс – шоў-бізнэс, плятынавыя дзялы і так далей, ну, карацей, мы ўсе тады слухалі «Дэпэш Мод»...
— О, – радасна адгукаецца вядучы, здаецца, ён кроўна зацікаўлены ў публічнай любові да «Дэпэш Мод».
— Зьбіралі іхныя запісы, фоткі, плякаты, памятаеце?
— Так-так-так, – радасна квакае вядучы.
— І вось нехта з нас, я ўжо ня памятаю, хто менавіта, падарыў яму на дзень народзінаў плякат Гэхана, разумееце?

Вядучы зноў радасна квакае.
— І вось ён, разумееце, ён, у прынцыпе, нармальны быў чувак, але ён павесіў у сябе ў сарціры гэты плякат і пачаў драчыць на Гэхана, уяўляеце?
— Як драчыць? – разгублена пытаецца вядучы. Відаць, ён не чакаў, што гісторыя будзе аж настолькі сумнай.
— Ну, так, – Вася ня ведае, як яму па тэлефоне паказаць, – пачаў ананаваць на плякат Гэхана, уяўляеце?
— Які жах, – кажа вядучы. – А вы спрабавалі растлумачыць яму, што гэтага рабіць нельга?
— Спрабавалі, – кажа Вася, – але ў яго фішка была, разумееце? Ён гэтага нават ня ўтойваў – прыходзіў са школы, кідаў партфэль у калідоры – і ў сарцір.
— А вы?
— Мы – не.
— Не, я не пра гэта.
— А, ну, што мы? Мы думалі, можа, чувак так музыку любіць, можа, яму гэты ваш «Дэпэш Мод» так падабаецца, што ён стрымацца ня можа, у прынцыпе, што ж дрэннага, пагадзіцеся.
— Хрррррррррр, – хрыпіць вядучы.
— Але, разумееце, у чым справа – мы яму на нейкае наступнае сьвята прынесьлі запісы «Дэпэш Мод», думалі, ён усьцешыцца, падзякуе. А ён, ведаеце, што? Ён уключыў гэтыя запісы і

гаворыць – што за гаўно вы прынесьлі? Гэта ж, кажам, той чувак, на якога ты штодня дрочыш, гэта ён сьпявае. Табе што, пытаемся, не падабаецца? Не, кажа ён, не падабаецца. І вырубіў магнітафон. І больш ніколі «Дэпэш Мод» ня слухаў. Уяўляеце?
— Так, – разгублена гаворыць вядучы. Адчуваецца, што ён перавёў бы размову на нешта іншае, але на што ж ты яе пасьля ўсяго гэтага перавядзеш. – Ну, а далей што было? – пытае ён урэшце.
— З кім? – не разумее Вася.
— Ну, з гэтым вашым драчуном... перапрашаю – зь сябрам вашым.
— Пайшоў у бізнэс, – коратка кажа Вася, – адкрыў у Чаркасах сетку аптэк. Гандляваў трамадолам. Год таму памёр ад дыябэту.
— Драчыць трэба менш, – злосна кажа вядучы.

На нейкі час павісае маўчаньне. Кожны думае пра сваё. У вядучага, здаецца, свайго было ня так шмат, бо ён не вытрымлівае першы.
— Вось такую павучальную гісторыю, паважаныя радыёслухачы, апавёў нам наш паўночны незнаёмец. Але, мушу адзначыць, што сёньня гэты ваш знаёмы, – чуеце? – сёньня ён наўрад ці адважыўся б на такі крок.
— Гэта яшчэ чаму? – абражана пытаецца Вася.
— Ну, хоць бы таму, што цяпер Гэхан ужо ня той, каб на яго, як вы тут нам апавядалі, ананаваць.
— Вы пра што?
— Ну, Гэхан вельмі зьмяніўся. Ён зьмяніў імідж.
— Што?
— Ну, выгляд.
— Чуеш? – Вася зноў разгублена тыцкае мне ў твар слухаўкай. – Ён кажа, што Гэхан зьмяніўся.
— Запытай, ці дужа, – раджу я.
— І што, – кажа Вася ў слухаўку, – дужа зьмяніўся?
— Так, вы не паверыце, ягоныя старыя прыхільнікі яго не пазнаюць. Кажуць, гэта ў яго ад гераіну.
— У яго што, – гаворыць Вася, – адвалілася нешта?
— Наадварот, – радасна кажа вядучы.

Вася роспачна глядзіць на мяне. Ой, бля, – думаю.

— У яго штосьці вырасла?
— Так! – пераможна выгукае вядучы.
— Што? – пытаецца Вася.
— Здагадайцеся.
— Рука?
— Не, не рука.
— Нага, – пачынае гадаць Вася.
— Не, не нага!
— Нават думаць пра гэта не хачу.
— Барада! – выгукае вядучы, вытрымаўшы эфэктную паўзу.

Васю перасмыквае.
— І што – вялікая барада?
— Нармальная.
— І на каго... прабачце – на каго ён цяпер падобны?
— Ну, ня ведаю, – трохі манерна гаворыць вядучы, – гледзячы, з кім параўноўваць. Вось каго зь вядомых асобаў з барадой вы ведаеце?
— Санта-Клаўса, – гаворыць Вася.
— Ну, не, – крыўдуе вядучы. – Я вам кажу пра рэальных асобаў. Пра тых, хто сапраўды ёсьць.
— А Санта-Клаўса што – няма?
— Няма, канечне.
— Ну, мужык? – зьдзекліва кажа Вася. – Гэта ты сам прыдумаў?
— Што прыдумаў? – не разумее вядучы.
— Пра Санта-Клаўса. Гэта ж трэба прыдумаць такое – Санта-Клаўса няма. Гэта, хутчэй, цябе з тваім дзёўбаным радыё і ўсімі мангольскімі міліцыянтамі, разам узятымі, няма.
— Якімі міліцыянтамі? – не разумее вядучы.
— Мангольскімі, – гаворыць Вася.

З таго боку этэру павісае цяжкая паўза. Я паказваю Васю – маўляў, дай мне слухаўку, дай я паспрабую, а то ў цябе нешта не выходзіць, што ты прычапіўся да гэтага Санта-Клаўса, ну, ня ведае чувак, што Санта-Клаўс ёсьць, што ж цяпер, можа, ён старавер які-небудзь, можа, у яго дзяцінства цяжкое было, можа, у яго тата – афіцэр і мама – настаўніца матэматыкі, а ты яго грузіш, дай сюды слухаўку, карацей.
— Алё, – кажу я, – вы мяне чуеце?

— Так, – жвава рэагуе вядучы, – а вы мяне?
— Ужо другую гадзіну, – кажу. – Тут мой сябра, на жаль, адышоў і ня змог да канца даслухаць ваш захапляльны аповед. Так што там у вас з Дэйвам? На каго ён цяпер падобны?
— Ага, – гаворыць вядучы, відаць, ён нават не заўважыў, што зь ім размаўляе нехта іншы, – ну, называйце далей вядомых барадачоў.
— Леў Давідавіч Троцкі, – кажу я, падумаўшы. – Ці, можа, вы скажаце, што Троцкага таксама няма?
— Не, – крыху разгублена кажа вядучы, – чаго ж – Троцкі ёсьць.
— Ага, бачыце, – кажу, – усё-ткі хоць штосьці сьвятое для вас засталося.
— Так, – гаворыць вядучы, – засталося. Але Дэйв на яго не падобны.
— Не падобны?
— Анітрошачкі.
— Зі-зі-топ, – кажу.
— Міма.
— Ну, добра, – кажу, – Кастра.
— Што?
— Кастра. Фідэль Кастра. Падобны ён на Фідэля?
— На Фідэля? Так, – гаворыць нарэшце вядучы, – на Фідэля трошкі падобны. На маладога, канечне ж, – адразу папраўляецца ён. – Так, на маладога Фідэля – трошачкі падобны. Я тут нядаўна глядзеў відэазапіс іхнага канцэрту – нам калегі перадалі зь лёнданскай рэдакцыі, і вось там ён сапраўды – чымсьці нагадвае маладога Фідэля. Фантастычнае відовішча, вы ўяўляеце – зьбіраюцца некалькі дзясяткаў тысячаў прыхільнікаў «Дэпэш Мод», а да іх выходзіць Фідэль і пачынае сьпяваць голасам Гэхана. Уяўляеце?
— Ведаеце, – кажу я, памаўчаўшы, я ўвогуле разумею, што ён, канечне, старэйшы за мяне, я, як правіла, намагаюся нармальна зь людзьмі размаўляць, ну, але тут мужык такое кажа. – Ведаеце, – гавару я, – вы такога нам не кажыце. І ведаеце чаму?
— Чаму? – разгублена пытаецца вядучы.
— Таму, – працягваю я, – што мы вось тут вас сумленна слухалі-слухалі, мы, у прынцыпе, праслухалі ўсё – і пра маракоў, і пра паліцыю, і пра скатаў.
— Пра скатаў? – не разумее вядучы.

— Ага, – і пра электрычных скатаў. Але не кажыце нам пра Фідэля. І ведаеце чаму?
— Чаму? – зноў пытаецца вядучы.
— Таму што вось мы зь сябрам сядзім тут – у чыёйсьці кватэры, пасярод чыёйсьці мэблі, пасярод кетчупу і чакаляду, і ледзьве выжываем. І ведаеце чаму? Проста таму, што мы ўжо другі дзень шукаем нашага сябра, нашага сябра Карбюратара, і ведаеце чаму мы яго шукаем? Таму што ў яго, – я цяжка падбіраю словы, – пару дзён таму загінуў тата, уласна, ня тата, айчым, хоць якая, на хуй, розьніца, ён у яго загінуў, і мы ня можам гэтага дзёўбанага Карбюратара знайсьці ўжо другі дзень, і нам ад гэтага так херова, што мы сядзім і жарэм усё, што нам трапляецца пад руку, разумееце? Бо мы напханыя тытунём і травой, партвэйнам і сьпіртам, і мне асабіста гэта ўжо папярок горла стаіць, у прамым сэнсе гэтага слова.
— Ага, – нарэшце ўстаўляе слова вядучы, – такім чынам, у вашага сябра загінуў тата.
— Айчым, – папраўляю я.
— Адзін хуй, – нецярпліва кажа вядучы. – І вы ад гэтага п'яце гарэлку і ўжываеце лёгкія наркотыкі?
— Не, – кажу, – не зусім. Гарэлку мы п'ём проста так, разумееце?
— Разумею, – не зусім упэўнена кажа вядучы.
— Прычым даўно, – дадаю я. – І ведаеце, я так гляджу, што ўсё гэта нічым добрым ня скончыцца, бо мы проста трапляем у нейкія ямы, вы разумееце, пра што я кажу? Усё часьцей і часьцей, гэтых ямаў робіцца ўсё болей і болей, я ўжо проста ня ў стане выбірацца зь іх, яны засмоктваюць, і чым далей, тым усё больш балюча мне ў іх падаць, вы разумееце, пра што я вам тут кажу? Так, нібы ўсё нармальна, мы вось тут сядзім і слухаем вашую дурацкую радыёпраграму і нават вашых міліцыянтаў паслухалі...
— Якіх міліцыянтаў? – не разумее вядучы.
— Ня важна, – адказваю, – але рэч ня ў гэтым, ведаеце? рэч у тым, што ўсё адно, гэта нічым добрым ня скончыцца, проста таму, што я не магу сабе ўявіць нічога добрага там – наперадзе, там проста ня можа быць нічога добрага, бо калі яго – гэтага добрага – не было раней, то з чаго б яно раптам зьявілася ў будучым, скажыце мне, чаму? Яго там проста ня можа быць, мы проста прасоўваемся сабе навобмацак, як электрычныя скаты

пад вадой, нават ня верачы, што нам напраўду кудысьці трэба прасоўвацца.
— Так? – зьбянтэжана гаворыць вядучы. – Вы ведаеце, гэта вельмі цікава.
— Што табе цікава? – не разумею я.
— Вось гэта ўсё, што вы нам тут расказалі. Вось бачыце, паважаныя радыёслухачы, – зьвяртаецца ён у касьмічную пустату, – прыблізна пра гэта самае я і казаў вам увесь гэты час. Таму на гэтай аптымістычнай ноце і заканчвае сваю работу наш маладзёжны канал, і я – яго вядучы хрррррр хрррррррр. А вы, – ён зьвяртаецца, відаць, асабіста да мяне, – пачакайце, калі ласка, хвілінку, вам – як аўтару найбольш цікавага пытаньня, мы з задавальненьнем уручаем прыз, ласкава перададзены нам нашымі калегамі зь лёнданскай рэдакцыі – выдадзены ў Вялікай Брытаніі апошні альбом сьцяпана галябарды «Мамін сад».
— Як-як? – пытаюся.
— Сад. Мамін сад, – адказвае вядучы. – Праз «эс», – чамусьці дадае ён.

Лунаюць разьвітальныя акорды, этэр паступова сьціхае, у слухаўцы чуваць нейкае шамаценьне, пасьля гэтага нехта, паквакваючы, прыкладае яе да свайго касьмічнага вуха.
— Алё, – я чую знаёмы голас, але ўжо бліжэй.
— Алё, – згаджаюся я.
— Вы яшчэ тут?

Я азіраюся на Васю, той прытуліўся да прыкольнай радыёлы і водзіць пальцамі па падсьвечаных лямпамі назвах савецкіх сталіцаў, асобна счышчае пазногцем слова «Прага», чамусьці менавіта Прага.
— Так, – кажу я, – мы яшчэ тут.
— Вы ведаеце, – гаворыць вядучы, – выбачайце, што я вас затрымліваю – насамрэч у мяне няма ніякага альбому.
— Дзякуй богу, – кажу.
— Дакладней, ён у мяне быў, але я яго яшчэ мінулага тыдня падарыў нашым спонсарам. Яны нам паабяцалі прафінансаваць рамонт офісу, і я захацеў зрабіць ім прыемнае. Падарыў альбом.
— О, госпадзе, – кажу.

— Я проста хацеў у вас запытаць, калі вы ня супраць, канечне. Можна?
— Можна, – кажу.
— Скажыце, вы што, сапраўды, п'яце гарэлку і ўжываеце лёгкія наркотыкі?
— Ну, праўда, – адказваю няўпэўнена.
— Сур'ёзна?
— Ну.
— А ў мяне, – гаворыць ён з сумам, – ніколі разам не выходзіла. Або вадзяра, або трава, разумееце?
— Галоўнае прызвычаіцца, – кажу.
— Ну, але як вы пры гэтым пачуваецеся?
— Як пачуваемся? – пытаю.
— Так – як вы сябе адчуваеце?
— Ведаеце, – кажу, – я сябе адчуваю, як рака.
— Як рака?
— Так, як рака, што цячэ супраць уласнай плыні.

Пасьля гэтага вядучы адразу кладзе слухаўку – моўчкі і трагічна.

20.06.93 (нядзеля)

0.05
— Спаць хачу.
— У электрычцы пасьпіш.
— Ага, – кажу. – У электрычцы. Там жа зараз поўны вагон дэмбялёў будзе. Або грыбнікоў. Або міліцыянтаў.
— Поўны вагон міліцыянтаў? – скептычна перапытвае Вася. – Ну, ня ведаю, ня ведаю.
— Ну добра, пайшлі, – кажу, і мы зьбіраемся выходзіць.

Какава адчыняе нам дзьверы, вы зразумелі? перапытвае – да Канцавой, там перасядзеце, выйдзеце на Вузлавой, і там ужо зусім побач, пару гадзінаў, дадае ён і ўсоўвае нам нейкую брашуру, што гэта за гаўно? пытаецца Вася, вазьміце, кажа Какава, і хай адкрыцьцё госпада будзе з вамі. Вось мудак, гаворыць Вася, ужо калі дзьверы за намі зачыняюцца, ага, кажу,

мудак, мы спускаемся ўніз і на першым паверсе, каля ліфта, бачым цела Сабакі, Сабака, крычу я, слухай, ён, здаецца, усё-ткі памёр, ды пачакай, супакойвае мяне Вася, падыходзіць да Сабачага цела і пераварочвае яго тварам дагары, Сабака ўвесь зарыганы, але яшчэ жывы, яшчэ б трошкі, і ён, мабыць, памёр бы, захлынуўся б ва ўласных рыгаках, сапраўдны табе Гэндрыкс, што тут скажаш, як бы ён потым перад госпадам паўстаў бы – са сваімі белымі матузкамі на вайсковых чаравіках і ўвесь абрыганы, мы яго падымаем, Сабака, гаворым, Сабака, прачынайся, ён прыходзіць у прытомнасьць, нават пазнае нас, я заблукаў, кажа, выйшаў, вадзяры купіў, вярнуўся – а куды ісьці ня ведаю, сядзеў тут, чакаў, што хтосьці з вас выйдзе, а вадзяра дзе? пытаецца Вася, вадзяру я выпіў, кажа Сабака, дождж пайшоў, холадна было, я ж думаў, вы выйдзеце па мяне, ну добра, расчаравана кажа Вася, ты можаш ісьці? так, усё нармальна – Сабака падымаецца, і мы выходзім на Гогаля.

0.30

— Што рабіць будзем? – пытаецца Вася.
— Паехалі дамоў, – кажу.
— А Карбюратар?
— А што Карбюратар? З Карбюратарам усё ў парадку. А гэты вось дакладна нікуды не даедзе. Ня будзеш жа ты цягнуць яго на сабе аж да Вузлавой?
— Усё нармальна, – кажа Сабака. – Я ў норме. Я даеду.
— Можа, лепш дамоў? – пытаюся.
— Не, – гаворыць Сабака. – Толькі не дамоў.
— Добра, – кажу. – Але як мы туды даедзем? Бабак усё адно няма.
— Трэба было ў гэтага мудака пазычыць, – гаворыць Вася.
— Не хачу я ў яго пазычаць, – кажу.
— Ну, дык і што рабіць?
— Слухай, – раптам кажа Сабака, – табе ж Маруся за Молатава нешта давала.
— Сапраўды, – кажу. – Я зусім забыўся. – Я лезу ў кішэню і дастаю адтуль досыць-такі нармальную дваццатку. – Прыкол, – кажу. – У нас, як выявілася, ёсьць процьма грошай. Толькі трэба іх недзе памяняць. І пры гэтым адразу не растраціць.

0.45

Мы здаём нашую дваццатку ў кіёск непадалёк, і яшчэ нават не пасьпяваем пералічыць суму ў нацыянальным грашовым эквіваленце, як на нас налятае патруль. Нават дакумэнты не запыталі. Колазварот вады ў прыродзе.

1.25

— Сынок?
— Мікалай Іванавіч...
— Я ж табе казаў, каб больш такога не было.
— Мікалай Іванавіч, я зараз патлумачу.
— Што ты мне, блядзь, патлумачыш?
— Мікалай Іванавіч...

Добра, кажа Мікалай Іванавіч патрулю, я іх забіраю, гэта з табой? пытаецца ён у мяне і паказвае на Васю з Сабакам, са мной, кажу, са мной, і гэты абрыганы, паказвае ён яшчэ раз на Сабаку, з табой? са мной, кажу, ну добра, пайшлі да мяне, я іх забіраю, кажа ён яшчэ раз патрулю, пагавару зь імі ў МАІМ кабінэце, ясна? таварыш капітан, кажа патруль, мы ж іх, тыпу, для пляну, пайшлі на хуй, кажа ім Мікалай Іванавіч, ясна? ясна, сумна кажа патруль і ідзе далей на паляваньне, плян, усё-ткі.
— Значыць так – вы двое сядзіце тут, у калідоры, і чакайце. А ты, – ён паказвае на мяне, – за мной.
— Добра, – кажу і заходжу ў завешаны агітацыяй кабінэт. – Колькі ў вас тут плякатаў, – кажу.
— Ты, блядзь, мне яшчэ пагавары, – нэрвуецца Мікалай Іванавіч. – Ты мне яшчэ пагавары. Я табе, блядзь, дам плякаты. Я табе што казаў? Трапіш мне на вочы – заб'ю. Казаў?
— Казалі.
— Ну?
— Мікалай Іванавіч...
— Што?
— Прабачце. Я не зьбіраўся сёньня піць. Вы разумееце... Мы проста з хаўтураў.
— Адкуль?
— З хаўтураў.
— Зь якіх хаўтураў?

— Дэкан… – выціскаю я зь сябе.
— Што?
— Дэкан, – кажу я. – Памёр у пятніцу. Сёньня хавалі. Мы дапамаглі на могілках. Ведаеце, там яму выкапаць, цела прысыпаць.
— Сур'ёзна? – разгублена пытаецца Мікалай Іванавіч.
— Ага.
— А без матузкоў чаму ходзіш?
— Дык вы ж забралі, Мікалай Іванавіч.

Мікалай Іванавіч доўга і сумна маўчыць, але матузкоў не вяртае.
— Эх, сынок-сынок. Што ж мне з табой рабіць?
— Ня ведаю, – кажу. – Бабак няма. Дэкан памёр.
— Як хоць яго звалі – твайго дэкана?
— А хер яго ведае.
— Як?
— Ну, у яго прозьвішча такое было, ведаеце…
— Разумею, – задуменна кажа Мікалай Іванавіч.
— І што за краіна такая блядзкая? – раптам кажа Мікалай Іванавіч. – Народ мрэ як мухі. У мяне сын у рэанімацыю трапіў.
— Як у рэанімацыю? – пытаюся.
— Ды ён, выяўляецца, тры дні таму, ноччу, палез у аптэку. Кажа, што па вітаміны. Ну, я-то ведаю, па якія вітаміны, мяне не абдурыш, з МАІМ-то досьведам.
— Ну?
— Вось, палез, гаўнюк малы, праз фортку, набраў там нейкіх таблетак, зжэр цэлы пачак, а калі лез назад – яго вырубіла. Так у фортцы і захрас.
— О, госпадзе, – кажу.
— Вось так, – Мікалай Іванавіч задуменна разглядае агітацыю за маёй сьпінай. – Раніцай народ у аптэку прыйшоў, бачаць – ён вісіць у фортцы і ня дыхае. Ну, яны перапужаліся, думаюць – усё, памёр хлопец, яны да яго – а ён дыхае.
— Здорава, – кажу.
— Што – здорава? Ён калі назад лез, штосьці там сабе вывіхнуў, а на ім яшчэ і куртка была, уяўляеш – МАЯ куртка, адным словам, ён захрас – ні туды, ні сюды. А яго пры гэтым яшчэ і кілбасіць.
— Ну і што?

— Ну, яны выклікалі хуткую. Хуткая кажа: мы яго адтуль ня выцягнем, ён парэжацца альбо задушыцца, і што рабіць? пытаюць яны ў хуткай, што рабіць, кажуць тыя, што рабіць, ня ведаем, кажуць, хай вісіць, пакуль сам ня выпадзе, дык яго ж кілбасіць, кажуць тыя, кілбасіць, кажа хуткая, ну дык падкормлівайце яго патрошкі, каб ён там зусім ня скончыўся. А гэтыя прыдуркі, уяві, сапраўды пачалі яго падкормліваць. Ну, яму, уёбку-малалетку, ясная рэч, больш нічога і ня трэба, ён і ня думаў адтуль вылазіць, уяўляеш – вісіш сабе ў чужой куртцы, а цябе пры гэтым яшчэ і наркотыкамі кормяць.
— Файна, – кажу.
— Што? – гаворыць Мікалай Іванавіч. – Што файна? Ён жа, шчанюк, нават імя сваё не назваў. Я зь дзяжурства вяртаюся, а мая крычыць – сын прапаў. Уяўляеш? Добра, што яны наступнага дня ў яго ў кішэні МАЁ пасьведчаньне знайшлі.
— А чаго яны па ягоных кішэнях лазілі? – пытаюся.
— Таблетак стала шкада, я так думаю. Адным словам, наступнага дня, ужо недзе пад вечар, яны мяне знайшлі. Ну, мы разам яго і выцягнулі.
— Дык гэта ён у рэанімацыю пасьля вас ужо трапіў?
— Ты што? – насьцярожваецца Мікалай Іванавіч, – думаеш, я яго біў?
— Ды не, што там.
— Я яго наагул ніколі ня біў. Мне ў падлу яго біць. У яго проста абязводжваньне арганізму, разумееш? Ён жа там амаль двое сутак прасядзеў, на адных таблетках.
— Нічога сабе, – кажу.
— Вось, – задумліва дадае Мікалай Іванавіч.

2.05

— Ты што – ведаеш яго?
— Так – сустракаліся калісьці.
— Ну і знаёмыя ў цябе.
— Дзякуй, што наагул адпусьціў. Сядзелі б цяпер у камэры.
— Яшчэ і апошні каньяк забраў. Як мы цяпер – без каньяку?
— У цябе ўсё адно пякотка ад яго.
— Добра, паехалі ўжо куды-небудзь. А то тут проста нейкая камэнданцкая гадзіна, – і Вася адцягвае мяне ад уваходу ў раус.

Пачакай, кажу я, мне адліць трэба, потым, нэрвуецца Вася, потым адальеш, не магу, адказваю, адыходжу за рог шэрай будыніны, начыненай газавымі камэрамі, і яшчэ нават не пасьпяваю зрабіць сваю чорную справу, як аднекуль з-за рогу выбягае Мікалай Іванавіч, некуды імчыць, але ўсё-ткі заўважае мяне, сумна качае галавой, эх, маўляў, сынок, сынок, і бяжыць кудысьці ў ноч.

2.35

Да вакзалу мы даяжджаем без прыгодаў, таксіст усю дарогу круціць носам і праветрывае салён, абрыганага Сабаку гэта нэрвуе, але мы яго стрымліваем, каля прыгараднага Сабака пачынае крычаць, што нічога гэтай суцы плаціць ня трэба, што ён на нас, маўляў, нядобра глядзеў усю дарогу, ага, кажу я Сабаку, сурочыў ён цябе, харэ, супакойся, кіроўца напужаны, Вася таксама супакойвае Сабаку, мы плацім, колькі там трэба, і ідзём на вакзал.

3.45

Электрычка павольная-павольная, вагоны халодныя і пустыя, падлогу, відаць, хтосьці толькі што памыў, уласна – не памыў, а шчодра паліў халоднай бруднай вадой, нас трасе, на вакзале мы папрасілі Сабаку зьбегаць купіць у кіёску што-небудзь пажэрці, Сабака купіў дзьве паўтаралітровыя пляшкі мінэралкі, так што ён іх цяпер і трымае, мы сядзім у пустым халодным вагоне, ні табе грыбнікоў, ні дэмбялёў, нават міліцыі няма, уся міліцыя цяпер выконвае плян недзе ў сваім Кіеўскім раёне, дзе яшчэ засталіся хаця б якія жывыя людзі, хоць нехта, каго можна зацягнуць у газавую камэру, мы перажылі сваю камэнданцкую гадзіну і ўпарта намагаемся цяпер выехаць кудысьці ў нікуды, ну, хоць куды-небудзь.

Толькі дзеці мітусяцца па вагоне, мы яшчэ толькі зайшлі, яны ўжо сядзелі ў нашым вагоне, яны прыехалі ў ім аднекуль з дэпо, нас-то з Васем яны дакладна не спужаліся б, яны, здаецца, наагул нічога не баяцца, такое ўражаньне, што яны ўжо ўсё ў сваім жыцьці перажылі, са сьмерцю ўключна, ну, але

пры адным выглядзе незадаволенага абрыганага Сабакі яны перапужаліся і зьбіліся ў зграю, вы адкуль? пытаецца Вася, і яны пачынаюць нешта расказваць, што, маўляў, тут і жывуць, у электрычцы, начуюць па вагонах, асабліва цяпер, калі дажджы, катаюца да канцавой, потым вяртаюцца назад у горад, часам начуюць у міліцыі, але міліцыя іх звычайна адпускае, каб яны не нанесьлі ім у камэры рознай заразы, так і жывуць, нядрэнна, дарэчы, жывуць, не найгорш.

Нарэшце яны здымаюцца і ідуць у суседні вагон. Гэта для іх нібы перайсьці з кухні ў вітальню, акупавалі цягнік і катаюцца па адным і тым самым маршруце, як заведзеныя або праклятыя.

Я спрабую заснуць, але мяне ўвесь час выкідае са сну, нібы няўдалага сэрфінгіста з хвалі, і я пачынаю ціха стагнаць.
— Табе што – блага? – пытаецца Вася.
— Ныркі штосьці ныюць.
— Так, растрэсла цябе.
— Ага, растрэсла. Канечне – растрэсла.

У тыя кароткія хвіліны, калі я ўсё ж устаю на сваю хвалю, утрымліваюся на дошцы і лячу ўніз, я сьню двух анёлаў – адзін таўсьцейшы, другі вышэйшы, яны выходзяць у калідор і пачынаюць хуячыць адзін аднаго, пер'е ляціць ва ўсе бакі, і іхныя доўгія жаночыя пазногці, якімі яны драпаюць адзін аднаму твары і пад якімі запяклася соль нябёсаў, паблісквaюць у паветры, як нажніцы ў руках спраўных краўцоў, яны б'юць адзін аднаго па твары, і ўжо іхныя кулакі перамазаныя крывёй, і раптам адзін зь іх падае, б'ецца галавой аб халодную калідорную плітку, і той – вышэйшы, – які перамог, падыходзіць да яго і цалуе яго ў паўнаватыя крывавыя вусны, зь якіх пачынае выцякаць пастэрызаванае малако.

Мне сьніцца, што я – лёгкія гэтага анёла, я адчуваю, як доўга і старанна нехта біў яго – майго анёла, акурат па той частцы ягонага поўнага цела, дзе знаходжуся я, цяжкімі футбольнымі бутсамі, я паволі пераварочваюся ў ягоным целе, увесь у рубцах і ранах, з маіх ранаў праступае малако, я спрабую ўхіліцца ад удараў, але мне проста няма куды ўхіляцца, бо я цалкам залежу ад таго, у чыім целе знаходжуся, хто прыкрывае мяне

сабой і хто ўвесь час мяне выкарыстоўвае, мне застаецца толькі трываць і назіраць, як гэтае малако праступае скрозь усе мае поры, скрозь кожны надрэз, скрозь кожную рваную рану, скрозь кожны шнар, выцякае зь мяне разам з маім болем, разам з маім страхам, разам з маім жыццём.

Мне сьніцца мой анёл, ужо мёртвы, яго перавозяць кудысьці, каб спаліць яго мёртвае пераможанае цела, яго цягнуць па чорнай падлозе трупярні, нібы мёртвую курыцу, кроў з малаком перамяшаліся ў ягоным пер'і і цягнуцца за ім крывавым сьледам, яго зацягваюць у нейкі вялікі пакой, кладуць на мэталічны стол і здымаюць зь яго рэшткі адзеньня – здымаюць чорныя бухгальтарскія нарукаўнікі, здымаюць шэры дзелавы касьцюм, здымаюць жоўтыя італьянскія чаравікі, здымаюць чорныя шкарпэткі, сінія трусы, белую майку, нехта дастае нарэшце скальпэль і ўскрывае майго анёла, разразае яго ад горла да жывата і разглядвае яго скалечаныя і вымучаныя вантробы, выжраныя зь сярэдзіны мурашамі, пчоламі і павукамі і запоўненыя тлустым пастэрызаваным малаком. Разрэз расьцінае малюнак на яго скуры, на малюнку – старое, ужо бляклае ўкрыжаваньне: жоўты Ісус на пафарбаваным зялёнкай крыжы. Ісуса скальпэль амаль не закрануў – а вось укрыжаваньне раскалолася напалам, так што цяпер трэба хіба што сшыць гэтую мёртвую грудную клетку, каб мець уяўленьне, як яно там усё выглядала – на самай справе.

3.40

У Чугуеве мы не выходзім. Недзе ў горадзе ў гэты час, я сабе так думаю, тоўстае і потнае цела Какавы перавярнулася. Калі б ён гэта бачыў, ён бы нас пракляў. Але ў Чугуеве электрычка спыняецца на паўтары хвіліны, вакзал у Чугуеве ў гэтую трывожную ноч мокры і непрыветны, і я б ня выйшаў са свайго вагона, нават калі б мне давялося стаяць тут і два дні, хоць гэта ніякім чынам не апраўдвае мяне ў вачах данбаскай інтэлігенцыі. Як бы там ні было – мы не выходзім. І ніхто не выходзіць.

5.30

На Канцавой мы хочам знайсьці хоць бы якую лаўку, дзе можна было б перачакаць пару гадзінаў, да наступнай электрычкі, але тут ужо на самай справе зьяўляюцца дэмбялі з грыбнікамі, усе лаўкі ў пачакальні занятыя нейкімі падазронымі суб'ектамі, таму мы выходзім на адзіную плятформу, па радыё яе чамусьці патасна называюць першай, так, нібы тут недзе ёсьць другая, мэтраў за сто ад вакзалу відаць высокі пешаходны мост, вісіць над усёй гэтай панарамай, прыкольна, кажу я, пайшлі на мост, усё адно спаць няма дзе, мы падымаемся па мэталічнай лесьвіцы і разглядаем тэрыторыю, бясконцыя разгалінаваньні рэек, зьбітыя ў купу таварнякі, цыстэрны, друз, сэмафоры, дрэвы, туман, вакзальныя будыніны, столькі ўсяго, а няма пра што пагаварыць, таму мы моўчкі сядзім тут, сярод туману і хмараў, і разглядаем усю гэтую пакалечаную чыгуначную інфраструктуру, павольна п'ючы халодную мінэральную ваду.

7.25

Нарэшце нашая электрычка, мы працісkваемся скрозь сонны дэмбельскі натоўп і рушым у бок Вузлавой. Жыцьцё працягваецца яшчэ на дзьве гадзіны. Дзьве нармальныя ранішнія гадзіны, чаму б і не.

Шкада, немагчыма заснуць, я, напрыклад, не магу доўга спаць у вэртыкальным стане, мяне гэта неяк прыніжае ці што, жахліва – сядзіш і сьпіш ці стаіш і сьпіш, ну, вы разумееце, пра што я, а тут яшчэ і надвор'е пачынае псавацца, адусюль налязаюць хмары, усё нібыта так добра, здавалася б – туман, рэйкі, цыстэрны, а тут такая лажа, зноў будзе дождж, зноў уся гэтая нябесная цягамоціна на нашыя галовы, я нэрвова выглядаю ў акно, але і так усё ясна – зараз пачнецца, зараз-зараз, проста брыдка на ўсё гэта глядзець, ня ведаю, як гэта растлумачыць – я асабіста зьмену надвор'я заўжды ўспрымаю на ўласны рахунак, як непавагу асабіста да мяне, хоць зь яе боку, падазраю, акурат нічога асабістага і няма, ну, але ў мяне на гэты конт уласная думка. Застаецца хіба што чытаць. Вася дастае з кішэняў дзьве брашуры, ён, высьвятляецца, увесь гэты час цягае за сабой дзьве брашуры, цяпер вось разглядае, што там напісана, перадае мне, потым Сабаку, але ў яго нічога добрага не выходзіць, бо нас усё-ткі трое, а кніг – толькі дзьве.

Адну я нават пасьпяваю прачытаць.

Кніга № 1

ГРЫМУЧЫ ВАЗЭЛІН
(БІБЛІЯТЭКА РАБОЧАГА)
АНАТАЦЫЯ

Дарагі дружа!

Ты трымаеш у руках надзвычай цікавую і пазнавальную кнігу, якая, пры ўмове правільнага засваеньня выкладзенага ў ёй матэрыялу, дапаможа табе ня толькі ў тэорыі, але і на практыцы лепш зразумець прынцыпы і тэндэнцыі разьвіцьця сацыяльна-вытворчых адносінаў у сучасным грамадзтве. Распрацаваная і напісаная гуманітарна-тэхнічным аддзелам Данецкага абкаму партыі, кніга гэтая зробіцца найлепшым сябрам і радцам табе на першых этапах твайго далучэньня да неператадольных працэсаў дыялектыкі і пэрманэнтнага распаду капіталу, празарліва прадбачанага таварышам Троцкім Л. Д.

Рэкамэндаваная для дамашняга чытаньня, а таксама калетыўнага вывучэньня ў прафэсійна-тэхнічных гуртках, працоўных калектывах, месцах пазбаўленьня волі, лягерах працы і адпачынку.

Для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту.

З павагай – Партыя ўкраінскіх камуністаў.

УСТУП

Замест уступу

Разьдзел 1

**ВЫБУХОВЫЯ РЭЧЫВЫ,
НЕАБХОДНЫЯ РАБОЧАМУ НАСАМПЕРШ**

1.1

Таварыш!

Зрабі напалм!

Напалм – гэта запальвальная сумесь. Складаецца напалм з бэнзіну, алівы і алюміневага парашку. Інгрэдыенты, неабходныя для вырабу напалму, можна і неабходна дастаць на вытворчасьці, у хатняй гаспадарцы ці ўкрасьці.

Парады па прыгатаваньні:

Таварыш! Запальвальная сумесь выкарыстоўваецца для зьнішчэньня жывой сілы і тэхнічных сродкаў праціўніка. Лепш – жывой сілы. Разам з тым, напалм лёгка прапальвае нават браню танка, калі ён у праціўніка ёсьць. Пры гэтым, зрабіць напалм можа КОЖНЫ шкаляр – бо напалм, як ты ўжо даведаўся, гэта ўсяго толькі сумесь бэнзіну (2/3), ляку ці алівы (1/3) і алюміневага парашку (чым больш алюміневага парашку, тым большая прапальвальная магутнасьць, памятай пра гэта!). Найчасьцей выкарыстоўваецца ў якасьці паліва для баявых агнямётаў ці ў запальвальных бомбах.

Заўвага: Калі ў цябе ёсьць баявы агнямёт, рэкамэндуем выкарыстоўваць менавіта гэтую сумесь. Баявы агнямёт можна і неабходна дастаць у вайсковых частках, хатняй гаспадарцы ці адбіць у вартавых.

1.2

Таварыш!

Зрабі магневую выбухоўку!

Магневая выбухоўка – гэта выбуховае рэчыва сярэдняй

магутнасьці. Яна складаецца з магневага парашку або стружкі і марганцоўкі. Марганцоўка ў цябе ёсьць, а магневы парашок або стружку можна і неабходна знайсьці ў цэхах, на складах ці гандлёвых прадпрыемствах народнагаспадарчага профілю. Можна ўкрасьці.

Парады па прыгатаваньні:

Таварыш! Каб вырабіць магневую выбухоўку, трэба зьмяшаць 3/4 парашку (стружкі) магну з 1/4 марганцоўкі (суаднесьці ў залежнасьці ад аб'ёму). Не шкадуй марганцоўкі, таварыш! Сумесь выбухае ў выніку ўзьдзеяньня адкрытага агню на працягу некалькіх сэкундаў (ад 2 да 10). Падчас выбуху ўзьнікае яскравы магневы спалах, нашмат больш яскравы за фотаўспышку, і ўтвараецца вялікая колькасьць белага дыму.

Заўвага: Ні ў якім разе нельга глядзець на спалах, пры дрэнным зьбегу абставінаў ты можаш цалкам асьлепнуць. У прынцыпе, на фотаўспышку лепш таксама не глядзець, хоць гэта і стварае пэўныя праблемы пры фатаграфаваньні.

Нават у невялікіх колькасьцях магневая выбухоўка вельмі небясьпечная, скажам, аэразольны балёнчык, напоўнены ёю, здольны разарваць чалавека на дробныя каляровыя шматочкі, калі той знаходзіцца бліжэй, чым за два мэтры ад выбухоўкі. Калі далей – то проста заб'е.

1.3

Таварыш!

Зрабі кактэйль Молатава!

Кактэйль Молатава – гэта не сапраўдны кактэйль, гэта запальвальная сумесь. Кактэйль складаецца з бэнзіну і алівы.

Парады па прыгатаваньні:

Гэта запальвальная бомба пры ўдалым зьбегу абставінаў вядзе да запальваньня аб'екту. Кактэйль Молатава – гэта звычайная

шкляная пляшка (0,5 ці 0,7 л – на твой густ), вызваленая ад папярэднягя напою і напоўненая на дзьве траціны бэнзінам і на адну траціну – алівай. Пляшка ў цябе ёсьць, бэнзін і аліву можна і неабходна зьліць з казённай тэхнікі, грамадзкага транспарту ці адбіць у вартавых. Кнот для кактэйлю вырабляецца са старых лапікаў тканіны, намочаных бэнзінам і потым устаўленых у шыйку пляшкі. Лапікі выразаюцца са старога спэцадзеньня, транспарантаў ці іншых прадметаў *нагляднай агітацыі*. Пляшку затыкаюць коркам і ў такім выглядзе, з запаленым кнотам, яе кідаюць у бок аб'екту, які трэба запаліць. Бомба запальвае аб'ект, разьбіваючыся аб яго паверхню. Вораг ня ў стане загасіць гэтае полымя вадой.

Заўвага: пры вырабе і запальваньні будзь асьцярожны, сачы, каб корак шчыльна закрываў пляшку і не даваў магчымасьці ўтварацца парам бэнзіну, якія могуць справакаваць датэрміновы выбух! Бомба не прыдатная для запальваньня няцьвёрдых прадметаў, паколькі ня можа разьбіцца аб іх, памятай пра гэта пры выбары аб'екта.

1.4

Таварыш!

Скарыстайся выбуховым вазэлінам!

Выбуховы вазэлін – гэта выбуховае рэчыва. Выбуховы вазэлін складаецца з вазэліну. І бэнзіну.

Парады па прыгатаваньні:

Выбуховы вазэлін – гэта сумесь 2 частак вазэліну і 1 часткі бэнзіну, якая выбухае пад узьдзеяньнем электрычнага току. Вазэлін у цябе ёсьць, адносна бэнзіну гл. п. 1.3, так што ўся справа за электрычным токам!

Заўвага: асьцярожна з вазэлінам!

1.5

Таварыш!

Вось табе газавая бомба!

Газавая бомба – гэта бомба з газам. Яна складаецца з гаручага газу і паветра.

Парады па прыгатаваньні:

Газавая бомба выкарыстоўваецца для зьнішчэньня жывой сілы праціўніка (аглушэньне, кантузія, дэзарыентацыя). Найпрасьцейшая газавая бомба складаецца з пляшкі з газам і паветрам, зьмяшанымі ў пэўнай прапорцыі (гл. ніжэй). Выкарыстоўваецца падчас дэманстрацыяў, пікетаў, галадовак, пры правядзеньні мітынгаў, маёвак, выбараў і іншых сьвятаў працоўных.

Прапорцыі: прыродны газ – 4,7:15, ацэтылен – 2,5:81, прапан – 2,2:10, бутан – 1,9:9.

1.6

Таварыш!

Прыгатуй пластыкавую выбухоўку!

Пластыкавая выбухоўка – гэта магутнае выбуховае рэчыва. Складаецца яна з хлёрыстага калію і, што найважлівей, вазэліну.

Парады па прыгатаваньні:

Для вырабу пластыкавай выбухоўкі неабходна зьмяшаць добра пакрышаны хлёрыстакіслы калій з вазэлінам і старанна перамяшаць. Хлёрыстакіслы калій можна і неабходна дастаць на хімічных прадпрыемствах, у хімічных лябараторыях і непасрэдна ў хімікаў. Украсьці яго цяжка. З вазэлінам ты, спадзяёмся, ужо разабраўся. Для выкарыстаньня выраблена рэчыва неабходна добра прасушыць. Патрэбны дэтанатар.

Падумай пра гэта!

Заўвага: У высушаным стане гэтае выбуховае рэчыва робіцца небясьпечным пры ўдарах. Нават ягонае падзеньне з рук на падлогу можа справакаваць дэтанацыю. Не выпускай яго з рук, таварыш!

1.7

Таварыш!

Калі ты ня можаш усяго гэтага зрабіць, не сумуй – зрабі сабе проста порах!

Порах – гэта слабое выбуховае рэчыва. Ён складаецца з каліевай салетры (85 %), вугалю (12 %) і серы (3 %).

Парады па прыгатаваньні:

Усё перамяшаць.

Заўвага: без заўваг.

Разьдзел 2

**ВЫБУХОВЫЯ РЭЧЫВЫ,
НЕАБХОДНЫЯ ПРАЦОЎНАМУ Ў ДРУГУЮ ЧАРГУ**

2.1

Таварыш!

Зрабі сабе французскі аманал!

Французскі аманал – гэта слабое выбуховае рэчыва. Складаецца ён са стэарынавай кіслаты, аміячнай салетры і алюміневага парашку.

Парады па прыгатаваньні:

Французскі аманал – гэта сумесь аміячнай салетры (86 %), стэарынавай кіслаты (6 %) і парашку алюмінію (8 %). Паводле сваіх выбуховых характарыстык рэчыва горшае за айчынны аманал. Выбухае толькі ў сьціснутым стане. Але калі ў цябе ёсьць магчымасьць скарыстацца дэтанатарам, гэта мяняе ўсё.

Заўвага: патрабуе дэтанатара!

2.2

Таварыш!

Трытруол!

Трытруол – гэта магутнае выбуховае рэчыва, якое звычайна складаецца з тэтрылу (75 %) і толу (25 %).

Парады па прыгатаваньні:

Гэта выбуховае рэчыва надзеленае вялікай выбуховай сілай і зьяўляецца надзвычай небясьпечным. Выкарыстоўваецца для руйнаваньня збудаваньняў, у артылерыйскіх снарадах, для падрыву чыгунак, пры іншых будаўнічых работах.

Заўвага: дэтанатар!

2.3

Таварыш!

Не ўпадай у адчай! Ёсьць яшчэ аматол!

Аматол – гэта таксама магутнае выбуховае рэчыва. Аматол складаецца з аміячнай салетры (80 %) і толу (20 %).

Парады па прыгатаваньні:

Гэта выбуховае рэчыва валодае магутнай выбуховай сілай і зьяўляецца надзвычай небясьпечным. Выкарыстоўваецца для зьнішчэньня збудаваньняў, у артылерыйскіх снарадах, бомбах і проста так.

Заўвага: утварае небясьпечныя спалучэньні зь медзьдзю і латуньню!!!

2.4

Таварыш!

Зрабі астраліт!

Астраліт – гэта магутнае (!) выбуховае рэчыва. Складаецца яно з аміячнай салетры (66 %) і гідразілу (33 %).

Парады па прыгатаваньні:

Віншуем цябе: гэта – наймагутнейшая з усіх вядомых выбуховак! Астраліт надзелены надзвычай магутнай выбуховай сілай (у 20 разоў магутнейшай за тратыл). Хуткасьць дэтанацыі – 9 км/с. Пры ўсёй сваёй магутнасьці не выкарыстоўваецца, напрыклад, вайскоўцамі, паколькі дэструктуецца цягам чатырох дзён з моманту прыгатаваньня. А прыгатаваць яго пры ўсім пры гэтым можа КОЖНЫ шкаляр, які ведае сьпіс складнікаў. Складнікі: аміячная салетра (выкарыстоўваецца ў народнай гаспадарцы), гідразіл (выкарыстоўваецца ў ракетабудаваньні, фармацэўтыцы і народнай гаспадарцы). Для таго, каб зрабіць астраліт, неабходна зьмяшаць аміячную салетру з гідразілам у прапорцыі 2 да 1.

Заўвага: складнікі надвычай таксычныя, трымаць іх у руках небясьпечна для жыцьця. Але выпусьціць іх з рук яшчэ больш небясьпечна.

2.5

Таварыш!

Зрабі выбуховую ртуць!

Выбуховая ртуць – гэта магутнае выбуховае рэчыва. Вырабляецца яна з азотнай кіслаты, ртуці і сьпірту.

Парады па прыгатаваньні:

Прыгатаваньне гэтай выбухоўкі небясьпечнае для жыцьця, прычым ня толькі твайго, таму лепш яе наагул не рабіць. Усё ж, для прыгатаваньня трэба зьмяшаць азотную кіслату, ртуць і сьпірт. Атрыманая сумесь заліваецца ў пляшку і цяпер, калі раптам ты гэтую пляшку разаб'еш, прагучыць фантастычны выбух. Паспрабуй як-небудзь – зрабі гэта!

Заўвага: вельмі небясьпечна! Нават калі ты і не разаб'еш пляшку, усё адно атруціься парамі ртуці (насьмерць).

2.6

Таварыш!

Вось яшчэ адна штука – нітрагуанідын!

Штука гэтая складаецца зь сернай кіслаты і нітрату гуанідыну.

Парады па прыгатаваньні:

Серная кіслата павінна мець канцэнтрацыю ня менш як 95 %. У эмалевы кубак наліваецца серная кіслата, кубак ставіцца на сьнег або лёд. У кубку паступова расчыняецца нітрат гуанідыну, пры гэтым тэмпэратура рошчыны не павінна падымацца вышэй за 10 °C. Пасьля расчыненьня нітрату гуанідыну сумесь страціць сваю празрыстасьць і пачне нагадваць малако. Таварыш – гэта не малако! Цяпер сумесь выліваецца ў халодную ваду зь лёдам, пасьля гэтага трэба пачакаць, пакуль усе крышталікі гуанідыну расчыняцца. Потым сумесь фільтруецца і старанна прамываецца.

Заўвага: вельмі небясьпечна! Да таго ж гэтая выбухоўка

надзвычай чульлівая да цяпла. Ня грэй яе!

2.7

Таварыш!

Зрабі сабе тэрміт!

Тэрміт, таварышу, – гэта запальвальная сумесь. Робіцца тэрміт з аксыду жалеза, парашку алюмінію і серы!

Парады па прыгатаваньні:

Мэталічная сумесь, якая пры згараньні дае вельмі высокую тэмпэратуру – каля 3000 ˚С! Гэтую ўласьцівасьць можна выкарыстоўваць для вырабу магутных запальвальных бомбаў, разумееш, да чаго мы вядзём? Для прыгатаваньня тэрміту трэба проста зьмяшаць 75 % аксыду жалеза (іржы) і 25 % алюмінію. Сам тэрміт запальваецца пры досыць высокай тэмпэратуры, таму ў сумесь дадаюць серу, якая пры запальваньні дае тэмпэратуру, дастатковую для запальваньня тэрміту.

Заўвага: вось на што нам сера!

2.8

Таварыш!

А супэртэрміт?!!

Супэртэрміт, таварыш, – гэта таксама запальвальная сумесь. А складаецца яна з бэнзіну, алівы, парашку алюмінію і аксыду жалеза (іржы).

Парады па прыгатаваньні:

Гэтая запальвальная сумесь гарыць зь вельмі высокай тэмпэратурай, здольнай расплавіць амаль кожны мэтал

(тэмпэратура гарэньня амаль такая, як і ў тэрміту). Вельмі небясьпечная рэч, каб ты ведаў. Тым ня менш, што асабліва прыемна, вырабіць яе таксама можа КОЖНЫ вучань. Складнікі: бэнзін – 44 %, аліва – 20 %, аксыд жалеза – 16 %, парашок алюмінію – 20 %.

Заўвага: ня кожны вучань здагадваецца пра свае магчымасьці, памятай пра гэта, таварыш!

Разьдзел 3

НА ЗАЦЕМКУ РАБОЧАМУ:
ЯК ЗРАБІЦЬ ДАМАШНЮЮ БОМБУ,
НЕ ПРЫЦЯГВАЮЧЫ ДА СЯБЕ ЎВАГІ
АНТЫНАРОДНАГА РЭЖЫМУ

Таварыш!

Для вырабу бомбы назапась складнікаў. Складнікі, неабходныя для вырабу бомбы, можна і неабходна купіць на гандлёвых прадпрыемствах народнагаспадарчага профілю ці адбіць у антынароднага рэжыму, не прыцягваючы да сябе ўвагі зь яго боку. Табе спатрэбіцца:

1. Папера (можна дастаць у пунктах прыёму макулятуры, на дрэваапрацоўчых камбінатах ці вырабіць самастойна (гл. наступную брашуру сэрыі «Бібліятэка рабочага»).

2. Цьвікі (такія доўгія мэталічныя штукі).

3. Тоўстая драціна (тоўстая, таварышу!).

4. Клей (таварыш! Выкарыстай свой клей з карысьцю!).

5. Моцныя ніткі (!).

6. Салетра (вытворчасьць, гандлёвыя ўстановы народнагаспадарчага профілю, антынародны рэжым).

7. Стапін (???).

8. Магн (антынародны рэжым, толькі антынародны рэжым!).

9. Гільза 12 калібру (ну, гэта ў цябе, спадзяёмся, ёсьць).

10. Гумка (проста гумка).

Парады па прыгатаваньні:

Дружа! Вазьмі 10 аркушаў паперы (фармат А4) і разрэж кожны зь іх па даўжыні, падзяліўшы на дзьве паловы. Пакладзі адну палоску на гладкую, роўную і надзейную паверхню (стол, стул, падлога). Нанясі слой клею («крухмальны» або «сыліконавы») на ўсю паверхню палоскі. Пакладзі зьверху іншую і правядзі прасам (не гарачым!) так, каб не засталося паветраных прамежкаў і каб выціснуць лішні клей. Паўтарай апэрацыю, пакуль ня скончацца палоскі. Апошнюю палоску змаж клеем зьверху асабліва шчыльна. Адрэж ад гільзы лязом папяровую частку. Прыстасуй адрэзаную частку на пачатку зьлепленых палосак (бакі, што выступаюць, павінны быць аднолькавымі) і накруці іх на яе. Адступі ад канца на 0,5–1 см і перацягні тоўстай драцінай (закруці канцы драціны і зацягні кусачкамі намёртва) у чатырох месцах з розных бакоў. Паверх драціны наматай 10–15 маткоў моцнай вяроўкі.

Забі 7–8 невялікіх цьвікоў (сачы за тым, каб падчас забіваньня не парвалася вяроўка). Зьмяшай 5 ваг. ч. магневага парашку з 6 ваг. ч. каліевай салетры і акуратна перамяшай да аднароднай кансыстэнцыі. Засып гэтай сумесьсю ўсю адрэзаную частку гільзы, пастаянна ўтрамбоўваючы яе. Зноў адступі ад канца на 0,5–1 см і перацягні тоўстай драцінай, папярэдне ўставіўшы туды цьвік галоўкай угору. Яшчэ раз наматай 10–15 маткоў моцнай вяроўкі і забі 10 цьвікоў. Празь нейкі час (1–2 дні) акуратна наматай расьцягнутую гумавую нітку па бакох бомбы. Праз пару дзён здымі гумку і выцягні цьвік. На месца цьвіка ўстаў бікфордаў шнур. Устаў яго як мага глыбей, устаў яго! І пакінь прыстасаваньне ў такім стане сохнуць каля тыдня на батарэі цэнтральнага ацяпленьня ці на два тыдні пры пакаёвай тэмпэратуры. Пасьля гэтага прыстасаваньне гатовае да

ўжываньня.

Заўвага: Выкарыстай яго, любы дружа, па прызначэньні, хулі там!

Яшчэ, дружа, настойліва рэкамэндуем табе нітрагліцэрын. Калі ты сапраўды зможаш яго прыгатаваць, значыць, мы стараліся не дарма.

Такім чынам, перад тым, як апісаць гэту цудоўную тэхналёгію, хочам папярэдзіць цябе пра неабходныя меры бясьпекі, хоць і разумеем, што табе яно ўсё адно. Усё ж рэкамэндуем не цурацца хоць бы мінімальных мераў бясьпекі. Паколькі нітрагліцэрын, таварыш, – гэта вельмі датклівае рэчыва, ты сабе нават не ўяўляеш, наколькі яно датклівае. Мы, шчыра кажучы, таксама. Радзім табе працаваць з тымі колькаснымі паказьнікамі, якія прыводзяцца тут, прынамсі, калі цябе і разарве, то хоць можна будзе сабраць твае пралетарскія шматкі па кавалках. Таму – да справы, таварыш:

1. Налі ў 75-мл мэнзурку 13 мл азотнай кіслаты, якая дыміць (98 %).

2. Пастаў мэнзурку ў вядро зь лёдам і дай ёй ахалодаць да тэмпэратуры, ніжэйшай за пакаёвую.

3. Калі азотная кіслата астыне, дадай трайны аб’ём сернай кіслаты (99 %) – 39 мл. Кіслоты зьмешвай вельмі асьцярожна, не дапускай іхнага разьліваньня.

4. Пасьля гэтага трэба зьнізіць тэмпэратуру рошчыны да 10–15 °С, дадаючы лёд.

5. Дадай гліцэрын. Рабіць гэта трэба вельмі асьцярожна пры дапамозе піпэткі, пакуль уся паверхня вадкасьці не пакрыецца слоем гліцэрыну.

6. Нітраваньне – вельмі небясьпечная стадыя. Падчас рэакцыі вылучаецца цяпло, таму вытрымлівай тэмпэратуру на ўзроўні 30 °С. Калі яна пачне падымацца – адразу ж ахалоджвай

сумесь!

7. Першыя 10 хвілінаў нітраваньня сумесь неабходна асьцярожна памешваць, намагаючыся не кранаць сьценак. Пры нармальнай рэакцыі нітрагліцэрын утварае слой на паверхні.

8. Пасьля ўдалага нітраваньня вадкасьць з мэнзуркі неабходна вельмі асьцярожна пераліць у іншую ёмкасьць з вадой. Нітрагліцэрын павінен асесьці на дно.

9. Зьлі, колькі зможаш, кіслату, ня зьмешваючы яе зь нітрагліцэрынам, і пры дапамозе піпэткі перанясі яго ў рошчыну бікарбанату натрыю (пітной соды). Рэшткі кіслаты будуць нітралізаваныя.

10. Пры дапамозе піпэткі аддзялі нітрагліцэрын. Для таго, каб праверыць прыгатаваны прадукт, нанясі маленькую кропельку яго на мэталічную пластыну і падпалі. Калі выжывеш, то ўбачыш, што нітрагліцэрын успыхвае чыстым блакітным полымем.

11. Атрыманую порцыю рэкамэндуем перарабіць у дынаміт, паколькі нітрагліцэрын, падла, мае дрэнную здольнасьць выбухаць безь ніякай на тое прычыны.

І памятай – яны б вельмі хацелі, каб ты ўсяго гэтага не рабіў! Магчыма, сам ты гэтага таксама ня хочаш. Але ведай, што насамрэч усе бомбы падзяляюцца на дзьве катэгорыі – тыя, якія кідаеш ты, і тыя, якія кідаюць у цябе. Так што займі зручную для сябе пазыцыю на вырашальнай стадыі барацьбы пралетарыяту за ўласнае, блядзь, вызваленьне!

9.00

Во бля, думаю я, ну і кніга. Я адкладаю брашуру ўбок, бяру іншую і адразу нарываюся на фразу «Слова Ісусу Хрысту», о, думаю, гэта што – якая-небудзь стэнаграма, потым прыглядаюся – насамрэч напісана «Слава Ісусу Хрысту», і гэтак цікава, думаю, хоць было б цікавей, калі б яно напраўду выявілася стэнаграмай, уяўляеце, нейкія зборы на якім-небудзь

заводзе, і раптам вядучы абвяшчае: а цяпер слова мае таварыш Ісус Хрыстос. Рэглямэнт – дзесяць хвілінаў. Думаю, гэтага было б цалкам дастаткова.
— Адкуль у цябе такія кнігі?
— Гэтую, што пра бомбы, я ў Чапая ўзяў. У яго іх там цэлы пачак быў. А пра Ісуса Какава даў.
— А ў Какавы адкуль такія кнігі? – пытаюся.
— А ён, – адказвае Вася, – з мармонамі тусуе. Хаця не, не з мармонамі, з гэтымі, як іх – з баптыстамі.
— А якая розьніца?
— Мармоны могуць мець некалькі жонак.
— Какаву гэта ня сьвеціць, – кажу. – Ён поўны мудак.
— Так, – згаджаецца Вася, – ён – поўны.
— Ведаеш, – кажа ён мне, памаўчаўшы, – я тут чытаў кнігі багасловаў розных, таксама Какава прыносіў. Прыкольныя, у прынцыпе, багасловы. Толькі мяне нэрвуе, што там увесь час, калі яны цытуюць біблію, пішацца на кожнай старонцы «Ад Лукі», «Ад Яна», «Ад Мацея», разумееш? Так, ведаеш, нібыта ў электрычцы хтось ідзе, прадае атруту і крычыць – ад прусакоў! ад шчуроў! ад макрыцаў якіх-небудзь! Разумееш?

Я прыгаломшана гляджу на Васю. «Ад прусакоў...» Што ў чалавека ў галаве?

9.30

Дождж было відаць, яшчэ толькі ён зьявіўся там – уверсе, ужо тады было зразумела, што ўсё зараз апынецца тут, сярод нас, заставалася толькі чакаць, і вось, сапраўды – пачынаецца дождж, мы выбягаем на плятформу і бяжым у бок вакзалу, каля дзьвярэй, пад навесам, стаіць натоўп звар'яцелых ранішніх пасажыраў, якія спрабуюць выехаць куды-небудзь са сваёй Вузлавой, дождж падае ўсё шчыльней і шчыльней, падае на нас, падае на вакзал, на электрычку, на якой мы прыехалі, на некалькіх мужыкоў у аранжавых камізэльках, што ідуць па плятформе і нібыта не заўважаюць увесь гэты дождж, увесь гэты натоўп, я раптам думаю, што на самай справе дождж не такі ўжо і халодны, нармальны дождж, нармальны летні дождж, падае сабе, куды мае падаць, чаго тут дужа замарочвацца, і я іду пад найбліжэйшыя дрэвы, якія растуць

побач з будынкам вакзалу, Вася і Сабака плятуцца за мной, мы спыняемся пад чымсьці хвойным і глядзім з-пад іголак на хмары, што разгортваюцца і разгортваюцца над бясконцымі рэйкамі, прапаўзаюць з поўначы на поўдзень, з усходу на захад, пакідаючы па сабе мокрыя цыстэрны і халодныя плыні ў сьцёкавых трубах, і калі гэта ўсё сканчаецца, недзе праз паўгадзіны,

10.00

калі дождж прыпыняецца і пачынаецца нармальны летні ранак, выходны дзень, дарэчы, з вакзалу выходзіць нейкі інвалід ці проста алькаголік, нават ня ведаю – пэўна, проста п'яны інвалід, у адной руцэ ён трымае невялічкі зэдлік, а ў другой – нейкую скрыню, зэдлік ён ставіць проста на плятформу, сядае сабе і ставіць перад сабой сваю скрынку, раскрывае яе, і – нічога сабе – высьвятляецца, што гэта патэфон, сапраўдны стары патэфон, як у тэлевізары, адным словам, інвалід дастае нейкую кружэлку, штосьці там круціць, і машына раптам пачынае працаваць, хто б мог падумаць, ён задаволена аглядае ўсіх дэмбялёў і ўсіх мужыкоў у аранжавых камізэльках, але ніхто не ўдупляецца, што гэта за інвалід і што гэта за патэфон у яго на плятформе, тады інвалід заўважае нас і разумее: калі ў гэтым бэстыярыі хтосьці яго і ўспрымае, то хіба што гэтыя тры сонныя, мокрыя, зьнядоленыя прыдуркі – то бок мы, і ён усьміхаецца нам, маўляў – давайце, пацаны, ідзіце сюды, паслухаем райскія мэлёдыі для інвалідаў і юродзівых, калі яшчэ вы такое пачуеце, ідзіце-ідзіце, ня бойцеся. Мы падыходзім да яго, ён працягвае нам усьміхацца, хоць, можа, ён на самай справе і ня нам усьміхаецца, ну, але ўсё адно прыемна, што ні кажыце, мы сядаем побач і слухаем яго жорсткае, падзёртае і парэпанае вінілавае рэтра, Сабака таксама ўсьміхаецца і наагул распускае соплі, і я так сабе думаю – што вось і дэмбелі, і аранжавыя мужыкі, і мокрыя дрэвы, і халодныя плыні – ва ўсім у гэтым нібыта нічога няма, ну, нармальныя мужыкі, нармальныя дэмбелі, плыні нармальныя, але разам з тым я сяджу цяпер тут – на гэтым вакзале, побач зь незнаёмым інвалідам, слухаю гаўнянае, у прынцыпе, рэтра, але ёсьць у гэтым нешта правільнае, менавіта

так і мае быць, і выключы адсюль цяпер плыні ці выключы адсюль аранжавых мужыкоў – усё адразу зьнікне, радасьць і спакой трымаюцца менавіта на вялікім лягічным яднаньні тысячы нікому не патрэбных, анамальных шызафрэнічных штук, якія, пры спалучэньні ў нешта адзінае, даюць табе ўрэшце поўнае ўяўленьне пра тое, што такое шчасьце, што такое жыцьцё, і галоўнае – што такое сьмерць.

ЭПІЛЁГ № 1

10.45

З вакзалу выходзіць патруль, ляніва акідвае вокам тэрыторыю і спыняе свой цяжкі позірк на інваліду. Яны падыходзяць да мужыка, пра нешта зь ім перамаўляюцца, інвалід ім усьміхаецца таксама безьзьмястоўна, як і 45 хвілінаў таму ўсьміхаўся нам, яны насядаюць на яго з двух бакоў, нарэшце адзін зь іх, відаць, старэйшы, не вытрымлівае і валіць з нагі па патэфоне, які пры гэтым адлятае ўбок і маркотна змаўкае.
— Трэба было забраць інваліда, – кажу я Васю.
— Куды – у лягер? Яны ж тут свае, павінны дамовіцца.
— Як свае? – кажу. – Глядзі, што, сукі, з машынай зрабілі.

Мы ўжо сядзім у вагоне сваёй электрычкі, якая вось-вось мае рушыць, і назіраем, як інвалід спрабуе ўстаць і сабраць па кавалках кішкі свайго патэфона. Але адзін зь мянтоў, відаць, малодшы, хутка падбягае да зламанай машыны і яшчэ раз буцае яе нагой, ад чаго патэфон зноў уздымаецца ў паветра і, цяжка пераляцеўшы, падае каля самага ўваходу ў вакзал.
— Я зараз, – раптам кажа Сабака.
— Пачакай, – спыняю я яго. – Ты куды?
— Стой, Сабака, – крычыць Вася. – Мы ўжо едзем.
— Яжджайце безь мяне, – крычыць ён і выходзіць.
— Што зь ім?
— Ня ведаю, – кажа Вася. – Можа, яму херова.
— Давай выйдзем пачакаем, – прапаную я.
— Куды пачакаем? А Карбюратар? Хер зь ім – няхай застаецца. Прыедзем – забяром.

10.47

Электрычку ператоргвае, і мы вырушаем далей на ўсход, але яшчэ пасьпяваем убачыць, як наш сябра-габрэй-Сабака-Паўлаў падыходзіць да аднаго зь мянтоў, да таго, які старэйшы, паварочвае яго да сябе і прыцэльна зацэджвае яму проста ў ягонае сяржанцкае ябала, так што картуз валіцца на зямлю, ды і сам сяржант валіцца, але яму на выручку – пасьпяваем заўважыць мы – кідаецца іншы патрульны, той, які малодшы, а з самога вакзалу выбягаюць яшчэ двое ці нават трое ўблюдкаў ва ўніформе – пасьпяваем падлічыць мы – уласна, гэта і ўсё, што мы пасьпяваем. Электрычка ад'яжджае, давай, крычу я Васю Камуністу, рві стоп-кран, ты што – дурны? пытаецца Вася, які стоп-кран, гэта ўсяго толькі электрычка, усё, кажа ён, праехалі.

10.51

Спачатку Сабаку б'юць проста на плятформе, паступова навокал іх зьбіраецца натоўп, інвалід пасьпявае некуды зьбегчы, разам са шматкамі сваёй рэтрамашыны, потым паставыя зацягваюць непрытомнага Сабаку да сябе ў апарняк, прыкоўваюць наручнікамі да лавы, паліваюць вадой зь вядра і пачынаюць мачыць зноў, хоць карысьці з гэтага ўжо і мала – Сабаку дык дакладна. У нейкі момант, калі ўжо ён, зноў непрытомны, ляжыць на мокрай падлозе, зь ягонага горла выбіваюцца дзьве стомленыя стронгі і, лупячы хвастамі па цэмэнтавай падлозе, скачуць пад лаву і срэбна паблісквающь паламанай луской.

Пад вечар ён усё ж прыходзіць у прытомнасьць, пакрыўджаны ім сяржант ужо зьмякчаецца, хуй з табой, кажа, сука, давай, яжджай у свой Харкаў, каб я цябе тут ня бачыў, а ўбачу – заб'ю, яны з напарнікам загружаюць Сабаку ў вячэрні транзытны на Харкаў і папярэджваюць правадніка, каб той не забыўся ў Харкаве скінуць цела, праваднік перапужаны, але што рабіць, у вагон ён акрываўленага Сабаку не пусьціў, вынес яму вады, на, кажа, абмыйся, Сабака цяжка водзіць разьбітай галавой, не зусім разумеючы, дзе ён і хто ён. Так і сядзіць у тамбуры на падлозе да самага Харкава, там праваднік адчыняе дзьверы і

дапамагае яму спусьціцца ўніз, Сабака робіць некалькі крокаў, але раўнавагі не губляе і ледзьве ўтрымліваецца на нагах, потым усё ж зьбіраецца і выходзіць у горад. Праз гадзіну ён прыпаўзае да сваёй бабулі-вэтэрана, о, кажа бабуся, Віталік, дзе гэта ты быў? нармальна, кажа Сабака, усё нармальна, і падае каля лядоўні.

Праз два дні бабуля выклікае хуткую. О, у сваю чаргу кажуць дактары, у яго ж страсеньне мазгоў, і ключыца, здаецца, зламаная, яны выносяць Сабачае цела на вуліцу і вязуць лячыць.

Празь некалькі дзён Сабака прыходзіць у прытомнасьць, дактары да яго хутка прывязваюцца, яго перастае нудзіць, так што, нібыта, усё ў парадку, Сабака нават пачынае падымацца з ложка і гуляць па калідоры, сябруе з пэрсаналам і наагул ідзе на папраўку. У суботу, калі ў аддзяленьні застаецца толькі дзяжурная сястра, Сабака залазіць у кабінэт загадчыка аддзяленьня, знаходзіць там сьпірт, аскарбінку і яшчэ нейкія таблеткі і ўсё гэта зжырае, не адыходзячы ад касы, – у кабінэце загадчыка аддзяленьня.

Наступнага ранку Сабаку знаходзяць на падлозе ў кабінэце, з рота Сабакі цячэ сьліна, яго пачынаюць адкачваць, адкачаўшы, думаюць – што з гэтай сукай цяпер рабіць. Пакідаць яго ў сябе пакрыўджаны пэрсанал адмаўляецца.

Лета Сабака праводзіць у дурцы. Ён хутка таўсьцее і дзічэе, сапраўдная табе дзікая сабака дынга, у яго вырастае густая чорная шавялюра, удзень ён ходзіць у бальнічны сад і зьбірае яблыкі. Яблыкі Сабака прыносіць сваім суседзям, сам іх ня есьць, невядома чаму. Аднаго разу Сабака сустракае ў дурцы Чапая. Той ідзе засяроджаны, у спартыўных штанах і драных кедах, і нясе ў руцэ тармазок, зь якога тырчыць рыльца пляшкі. Чапай Сабаку не пазнае.

У верасьні Сабаку выклікае доктар, значыць так, кажа, Віталь Львовіч, замахаліся мы вас лячыць – неяк так ён яму кажа, магчыма не даслоўна так, але прыблізна – замахаліся, кажа, мы вас тут лячыць, так што зьбірайцеся. Куды? стомлена перапытвае Сабака. Ну, кажа, доктар, выбар у вас невялікі – або

сядзеце, праўда, ненадоўга, або ў будбат. Я не хачу ў будбат, кажа Сабака, у мяне гэтыя, як іх – рэлігійныя перакананьні. Якія перакананьні? не разумее яго доктар. Рэлігійныя, кажа Сабака. Я мармон. Мармон? перапытвае доктар. Мармон, менш упэўнена кажа Сабака. Значыць сядзеце, кажа доктар. Сабака выбірае ўзброеныя сілы. Доктар адпускае яго назад у палату, думаючы, як усё-ткі дрэнна пахне з рота ў гэтага хворага.

ЭПІЛЁГ №2

11.15

— Гэта ваш сябра?
— Сябра.
— Добры хлопец. Шкада яго.
— Шкада, – кажу. – А што мы маглі?
— Я нічога і не кажу. Проста кажу – шкада.
— Можа, яны яго адпусьцяць?
— Можа. Можа, і адпусьцяць, – кажа цётка і змаўкае. Яна едзе з намі яшчэ ад Канцавой, таксама чакала на вакзале дзьве гадзіны, цяпер вось сядзіць насупраць і гаворыць.
— Бярыце, – нечакана кажа яна і дастае са сваёй бяздоннай торбы гумовую грэлку.
— Што гэта? – пытаюся.
— Сьпірт.
— Што – сапраўдны сьпірт?
— Так. Чысты.
— Адкуль ён у вас?
— З Польшчы прывезла.
— З Польшчы?
— Так. Езьдзіла, – кажа цётка, – тавар вазіла, амаль нічога не прадала. Пакідаць было шкада, вось, назад вязу. Бярыце, выпіце за свайго сябра.
— Ды чаго там, – кажу, – ня трэба.
— Бярыце-бярыце, – кажа цётка і адварочваецца ад нас да нейкіх сваіх знаёмых з суседняй лавы.

Я бяру грэлку і паказваю Васю, маўляў, што – бахнем за спакой Сабачай душы? Усё-ткі не ўратавалі таварыша-антысэміта, бахнем-бахнем, згаджаецца Вася, і дастае паўпустую пляшку

мінэралкі. Я адкаркоўваю грэлку і наліваю зь яе ў пляшку, прыблізна вытрымліваючы прапорцыі, але вагон трасе, так што якія ўжо тут прапорцыі, закручваю грэлку, і мы пачынаем піць.

11.45

— Тут ёсьць сарцір?
— Адкуль тут сарцір? Тут нават стоп-крану няма.
— Мне трэба выйсьці.
— Давай на хаду.
— Ты што – не разумееш? Мне трэба выйсьці!
— Усё я разумею. Чаго ты крычыш.
— Калі наступны прыпынак?
— Адкуль я ведаю? – кажу я Васю. – Я тут першы і, спадзяюся, апошні раз еду.
— Прыпынак будзе хвілінаў праз дваццаць, – кажа нашая знаёмая-кантрабандыстка. – Я там сыходжу. Але там прыпынак усяго пару хвілінаў. Так што ты не пасьпееш, – сьмяецца яна.
— Чуеш, – кажу я Васю, – не пасьпееш. Так што давай – ідзі ў тамбур.
— Не магу я ў тамбуры, – кажа Вася.
— Чаму?
— Не магу. Разумееш?
— Не.
— Я так не магу.
— Ну, пачакай, – кажу.
— І чакаць не магу.
— Перастань, – кажу.
— Ты што – не разумееш? – толькі і паўтарае Вася.

12.05

— Усё, я выходжу.
— Пачакай, – кажу. – Тут ехаць – пятнаццаць хвілінаў засталося. Патрывай крыху.
— Не, – кажа Вася.
— Ды перастань, – кажу я. Яшчэ не хапала, каб і ён зваліў. – Там жа Карбюратар.
— Я выходжу, – кажа Вася.
— Казёл ты, – кажу.
— Сам казёл, – адказвае Вася і выходзіць сьледам за

кантрабандысткай на нейкай безыменнай станцыі.

12.25

— Калі будзе наступны на Вузлавую?
— А другой. Толькі ён тут не спыняецца. Ён у «Хіміку» спыняецца.
— А далёка да «Хіміка»?
— Кілямэтраў дзесяць-пятнаццаць.
— Дык як мне даехаць да Вузлавой?
— Ну, выйдзі на трасу, прагаласуй – можа, нехта і падкіне.

Вася дзячыць нейкаму ўгашанаму мужыку, якога ён тут, на станцыі, цкаваў некалькі хвілінаў, і ідзе шукаць трасу. Траса разьбітая і пустая, не відаць, каб тут наагул нешта езьдзіла, Вася сядае на ўзбочыне і пачынае чакаць.

Праз паўгадзіны ля яго спыняецца малакавоз. Куды табе, зямеля? пытаюцца чувакі ў кабіне, ды мне похуй, мне дадому трэба, ну, добра, кажуць яны – сядай, Вася залазіць, і яны зрываюцца зь месца, што везяце? пытаецца ў сваю чаргу Вася, сьпірт, сьмяюцца мужыкі, сур'ёзна? сур'ёзна – сьпірт, мы тут ад мытнікаў ныкаемся, здорава, кажа Вася, здорава, туліцца да дзьвярэй і адразу ж засынае, усё, чуе ён скрозь сон недзе праз гадзіну, праскочылі, што праскочылі? не разумее ён, мяжу! сьмяюцца мужыкі, якую мяжу? расейскую мяжу, зямеля! а куды вы ўвогуле едзеце? прачынаецца нарэшце Вася, у Белгарад, сьмяюцца яны, у Бел-га-рад, ведаеш такі горад, зямеля?

ЭПІЛЁГ №3

— Так, хутка ўсе вывернулі кішэні.
— А што яшчэ табе вывернуць?
— Я сказаў – вывернулі кішэні! Інакш ва ўсіх будуць праблемы.
— Ды што ты кажаш.
— Ты што – не зразумеў? – ахоўнік падыходзіць да Малога Чака Бэры і рэзкім ударам звальвае яго на крэсла. Заступіцца за яго ніхто не адважваецца. Іншы ахоўнік стаіць пры ўваходзе і нікога не выпускае.
— Хутка, – гаворыць першы. – Выварочваем кішэні.

— А ў чым справа? – пытаецца нехта.
— Гадзіньнік.
— Які гадзіньнік?
— Залачоны, – кажа ахоўнік. – Залачоны ролекс.
— А мы тут пры чым?
— Акрамя вас тут нікога не было, – адказвае ахоўнік. – Пакуль гэты мудзіла амэрыканскі хадзіў на абед, пакой быў адчынены, і акрамя вас тут нікога не было.
— На хуя нам ягоны ролекс?
— Кішэні, – рычыць ахоўнік і раптам зьвяртаецца да Какавы. – Кішэні вывернуў!
— Што? – спалохана перапытвае Какава.
— Я сказаў – кішэні вывернуў.

Какава маўчыць. Ахоўнік падыходзіць да яго, запускае руку ў кішэню ягонага пясочнага пінжака і раптам дастае адтуль цяжкі залачоны гадзіньнік. Сука ты, кажа ён і рэзка б'е Какаву кулаком у жывот. Какава падае на калені і пачынае бляваць проста сабе пад ногі.

ЭПІЛЁГ №4

12.15

Седзячы тут, у гэтым вагоне, напоўненым дзецьмі і спэкулянтамі, седзячы на безнадзейна цьвёрдай лаве, гледзячы ў акно і душачыся сьпіртам, я ведаю ўжо цяпер, у свае дзевятнаццаць, пра што я буду думаць празь дзесяць гадоў, я ведаю, пра што я буду думаць, але самае галоўнае нават ня гэта – самае галоўнае, што я ведаю, пра што я думаць ня буду ніколі, ні за што ў сьвеце, ніводнага разу, нават міжволі – ня буду. Я ніколі ня буду думаць пра тое, што ўсё магло быць інакш, што ўсё залежала ад мяне і было ў маіх руках, што насамрэч гэта я вызначаў свой шлях і кіраваў абставінамі вакол сябе, вось пра гэта я не падумаю ніколі ў жыцьці. Усё магло быць толькі так, так і ніяк іначай, ды нават так – яно магло й ня быць, вялікае шчасьце, што ўсё адбылося хоць неяк, склалася больш-менш, вось жа, калі шчыра, я нават на гэта не разьлічваў, я не разьлічваў ні на што, я ня верыў, што ўсё гэта

можа разматацца і трываць, у мяне заўжды было адчуваньне таго, што ўсё можа скончыцца хутка і проста – проста цяпер і проста тут. Таму што цяпер і тут – у дзевятнаццаць, на безнадзейнай лаве, я ведаю, у што я буду верыць празь дзесяць гадоў, я ведаю, што я буду верыць, і я таксама ведаю, ува што я верыць ня буду, думаю, для мяне ў гэтым разе мала што зьменіцца, ёсьць рэчы, якія не мяняюцца, менавіта яны, вядома, і датычаць веры. Я ня веру ў памяць, я ня веру ў будучыню, я ня веру ў божы промысел, я ня веру ў нябёсы, ня веру ў анёлаў, ня веру ў каханьне, я нават у сэкс ня веру – сэкс робіць цябе самотным і безабаронным, я ня веру ў сяброў, ня веру ў палітыку, я ня веру ў цывілізацыю, добра, калі браць ня так глябальна, – я ня веру ў шлюб і ня веру ў гомасэксуалізм, я ня веру ў канстытуцыю, ня веру ў сьвятасьць папы рымскага, нават калі нехта давядзе мне сьвятасьць папы рымскага, я ў яе верыць ня буду – з прынцыпу ня буду. Затое я веру, нават ня веру – я ведаю пра прысутнасьць там, наверсе, толькі там, дзе час ад часу зьмяняецца надвор'е – з добрага на дрэннае, я ведаю пра прысутнасьць таго, хто цягнуў мяне ўвесь гэты час праз жыцьцё, хто выцягнуў мяне з маіх праклятых 90-х і кінуў далей – каб я і надалей прасоўваўся па сваім жыцьці, таго, хто не даваў мне загінуць толькі таму, што гэта, на яго думку, было б надта проста, я ведаю пра прысутнасьць тут, у чорных нябёсах над намі, нашага чарговага шатана, які насамрэч адзіны, хто існуе, адзіны, у чыім існаваньні я ніколі ня буду сумнявацца, хоць бы таму, што я бачыў, як ён зграбаў маіх сяброў і выкідаў іх з гэтага сьвету як гнілую гародніну зь лядоўні, або, пакідаючы, выціскаў ім вочы, пракусваў горлы, спыняў сэрцы, скручваў шыі, укладаў у галовы вар'яцкія мэлёдыі, выразаў на паднябеньнях крывавыя літары, уліваў ім у жылы хворую кроў, напаўняў іх лёгкія тлустым пастэрызаваным малаком, заліваў іх душы туманам і дзікім мёдам, і ад гэтага жыцьцё іх рабілася такім самым, як і іх адчай, то бок – бясконцым.

Я ведаю, што ўсё залежала толькі ад яго, і мне, калі і даводзілася адчуваць побач з сабой нечую прысутнасьць, то менавіта ягоную, хоць мне асабіста куды больш была патрэбная чыясьці іншая прысутнасьць, асабіста мне было б важна адчуваць, што побач са мной, у паветры навокал мяне, знаходзіцца ня толькі гэты сучы шатан, а нехта больш

прыхільны да мяне, ну, але ўсё склалася менавіта так, толькі так і не інакш, і менавіта праз гэта мне ня сорамна ні за адзін з маіх учынкаў, хоць там і ўчынкаў як такіх не было, было прасоўваньне праз шчыльнае і цьвёрдае паветра, намаганьне праціснуцца скрозь яго, праціснуцца яшчэ трошкі, шчэ на некалькі мілімэтраў, безь ніякай мэты, безь ніякага жаданьня, безь ніякага сумневу, безь ніякай надзеі на посьпех.

12.30

«Хімік», кажа мне нейкі мясцовы старажыл, партызан-падпольшчык, што сядзіць на суседняй лаве, і я выходжу. Вакзалу як такога тут няма, проста пасярод лесу стаяць два павільёны – на адным напісана «Хімік», на другім – «КАФЭ ХІМІК», трэба было напісаць «Нэскафэ хім*нк*», думаю я і накіроўваюся да другога павільёну. У кавярні, каля высокага століка, стаіць ня хто іншы, як мой сябра Карбюратар уласнай пэрсонай, амаль такі, якім я яго памятаю – у нейкіх кароткіх підарастычных шортах, у футболцы, з задуменным мангола-татарскім тварам. Толькі ўвесь нейкі абгарэлы і кімсьці пакусаны, у прынцыпе, тут паўсюль лес, розныя маскіты, тарантулы, увогуле, ня ведаю – якім хімікам трэба быць, каб адправіць сюды на адпачынак сваё дзіцё, гэта ж катарга нейкая.

Карбюратар заўважае мяне, замірае на нейкі момант, а потым ягоны твар расплываецца ў шырокай хашымінаўскай усьмешцы.
— А, прыехаў, – гаворыць Карбюратар.
— Прыехаў, прыехаў.
— Ну, добра, што прыехаў, – гаворыць Карбюратар.
— А што гэта ты, Карбюратар, такі вясёлы? – трохі нэрвова кажу я, але неяк стрымліваюся, кажу сам сабе – ты што, маўляў, ты што, навошта так рэзка? – Як справы, Карбюратар? – пытаюся вясёлым голасам. Во мудак, думаю пра сябе, як у яго могуць быць справы – па-першае, у ягонага айчыма адна нага, а, па-другое, ён ужо застрэліўся.
— Ды нармальна справы, – адказвае Карбюратар і адпівае са шклянкі нейкі сьмярдзючы кампот. – А ты як даведаўся?

Оба-на, думаю, ён ужо ўсё ведае.

— Ну, – кажу, – мне твой дзядзька Робэрт сказаў.
— Сур'ёзна? – Карбюратар кусае нейкі засушаны коржык. – Цікава, а ён адкуль ведае? Ён жа мяне ніколі з гэтым не віншаваў.
— З чым не віншаваў? – пытаюся.
— Ну, з народзінамі, канечне.
— З чыімі народзінамі? – не разумею я.
— З маімі, канечне, – задаволена давіцца коржыкам Карбюратар.
— А, – кажу я, падумаўшы. – Ну, так, ясна.
— А дзе падарункі? – зноў цешыцца Карбюратар.
— Вось, – кажу я і аддаю яму грэлку. – Трымай.
— О, грэлка.
— Гэта ня грэлка, – кажу.
— А што ж гэта?
— Гэта сьпірт.
— О, – толькі і адказвае Карбюратар.
— Умажам? – пытаюся я і іду да цёткі за касай. – Дайце, – кажу, – мне кампоту. І коржыкаў якіх-небудзь.

— Ты адзін? – пытаецца Карбюратар, ужо калі мы зьмяшалі і выпілі.
— Яшчэ быў Вася, – кажу. – Але ён адстаў. Перадаваў табе віншаваньні.
— Ясна, – кажа Карбюратар, п'ючы сьпірт невялічкімі глыткамі. – Надоўга?
— Ня ведаю, – кажу. – Наступным, мабыць, паеду назад.
— Ты што? Ён жа будзе праз гадзіну. Мы ж так і не пасядзім. Заставайся, заўтра паедзеш. Я цябе ў намёце зь піянэрамі пакладу.
— Лепш зь піянэркамі, – кажу.
— На рэчку пойдзем, – ня слухае мяне Карбюратар. – Я цябе з важатымі пазнаёмлю.
— А яны нармальныя? – пытаюся.
— Нармальныя, – адказвае Карбюратар, заглытваючы сьпірт. – Нармальныя цёлкі.
— Добра, – кажу я. – Добра. З дому не чуваць нічога?
— Не, – кажа Карбюратар. – Не чуваць. І дзякуй богу.
— Чаго ж ты так?

— Ды заябалі, – гаворыць Карбюратар. – Яны калі зьяўляюцца, пастаянна пачынаюцца праблемы. Асабліва з гэтым мудаком аднаногім.
— Айчымам?
— Ну. Ты разумееш, – кажа ён мне, – я іх яшчэ год таму паслаў, кажу, не прыяжджайце да мяне, я вас ведаць, кажу, не хачу, а яны ўсё адно пхаюцца. Я на іх даўно забіў, для мяне іх няма, разумееш? Яны мяне грузяць. Так што лепш ня згадвай пра іх, тым больш сёньня, я сёньня сьвяткую народзіны, ясна?
— Ясна, – кажу я. – Дзе тут адліць можна?
— Там, – паказвае Карбюратар на дзьверы. – У тайзе.

13.00

Апошняя электрычка на Вузлавую пойдзе праз 45 хвілінаў. Калі я скажу яму цяпер, ён пасьпее сабрацца і недзе а трэцяй будзе там. З Вузлавой, я думаю, ён зможа паехаць дадому аўтобусам, дзядзя Робэрт казаў, што там нешта ходзіць. У прынцыпе, ён пасьпявае. Галоўнае, сказаць яму цяпер. Вярнуцца і сказаць. Нешта ня тое. Нешта мяне ламае. Што? Што будзе, калі я яму не скажу? Я не зусім упэўнены, што хачу яму пра гэта гаварыць. Па-мойму, у яго ўсё добра, ва ўсякім разе ўсе нармальна, так што я ня ўпэўнены, што маю права нешта цяпер казаць яму. Зь іншага боку – мяне папрасілі, мне што – усё-ткі яго айчым, і мама хацела яго бачыць, трэба ўсё-ткі сказаць, хай ён нават і не паедзе туды, усё адно – сваю справу я зраблю. Ня ведаю, ці стане мне ад гэтага лепш, у мяне ўсё-ткі нармальная сям'я, нармальныя бацькі, праўда, я іх ня бачыў ужо недзе з год, ну, але ўсё адно – у нас зь ім гэта ўсё па-рознаму, так што ня ведаю, ня ведаю.

Я раптам думаю пра Марусю, як яна там, думаю, сядзіць, мабыць, на бальконе, у абдымку са сваім Молатавым, які ў нечым падобны да яе таты-генэрала. Чаму яна ня можа вось так сядзець са сваім татам? Што ёй перашкаджае? Ня ведаю, проста калі ты маеш кватэру зь відам на муніцыпалітэт і гараж зь няхай і расхуячаным, але ўсё-ткі жыгулём, ты перастаеш заўважаць такія рэчы, разумееце, пра што я, перастаеш іх успрымаць, для цябе куды больш натуральна абдымаць медны бюст Молатава, члена цк, чым свайго ўласнага, жывога тату,

такая фігня. Іншая рэч Карбюратар. Ён, па-мойму, столькі гаўна ў сваім жыцьці зжэр, што ўвесь гэты прагруз зь сям'ёй, з аднаногім айчымам, зь дзядзем Робэртам яму, відаць, і насамрэч не патрэбны. Ва ўсякім разе мне так здаецца, але хто ведае, як яно на самай справе, я проста стаю тут і пераказваю ўсе гэтыя гісторыі, пераказваю ўсе размовы, як яны мне запомніліся, так што хто я такі, каб выказваць свае меркаваньні. Зараз пайду і ўсё скажу.

13.10

— Пайшлі лепш на паветра.

— Пайшлі, – кажа ён, мы выходзім на плятформу, ідзем у самы яе канец і сядаем на ўскраі, тварам на ўсход, туды, адкуль мае прыйсьці цягнік.

— Як ты тут? – пытаюся.

— Нармальна, – кажа Карбюратар. – Тут здорава. Я сабе тут калі-небудзь куплю дом.

— Тут?

— Ага.

— І што ты тут будзеш рабіць?

— Пабудую піларараму, – адказвае Карбюратар. – Буду валіць тайгу. Глядзі, колькі тут дрэваў. На ўсё жыцьцё хопіць.

— Ну, – кажу, – ажэніся зь якой-небудзь піянэрважатай. Народзіце тузін дзяцей.

— Ну, не, – кажа Карбюратар. – Толькі не дзяцей.

— Чаму?

— Ня ведаю, – кажа ён, – ня ведаю. Не хачу, каб яны ўсё гэта бачылі, разумееш?

— Ну, ты ж бачыў гэта ўсё?

— Вось таму і не хачу. Лепш я піларараму пабудую.

13.20

— Ведаеш, тут вельмі халодная вада. Я плаваю толькі пасьля абеду, калі яна прагрэецца.

— Сёньня дождж, наўрад ці яна прагрэецца.

— Так, мабыць, не прагрэецца.

— Тады што рабіць будзем?

— Ня ведаю. Пачакаем. Павінна ж калі-небудзь яна прагрэцца.

— Хто яе ведае, – кажу, – хто ведае.

13.30
— Там яшчэ засталося?
— Так, – кажу, – трохі.
— Пакінь на пасьля, добра?
— Як скажаш, – кажу. – У цябе ж народзіны, не ў мяне.
— Я не люблю сваіх народзінаў.
— Што так?
— Ня ведаю, я, разумееш, заўжды дзіўна пачуваўся, ну, у дзяцінстве, яны ўсе навокал мяне таўкліся і чагосьці ад мяне хацелі. А народіны-то насамрэч мае, разумееш?
— Ну.
— Зараз цягнік на Вузлавую пойдзе.

13.47
— Слухай, – кажу, – а вы сваіх піянэраў купацца водзіце?
— Водзім, – адказвае Карбюратар.
— А калі вада халодная?
— А ім усё адно, яны, як жабы: скачуць у ледзяную ваду, плаваюць сабе. Ім здорава, яны яшчэ не разумеюць, што вада халодная.
— Ніхто яшчэ не ўтапіўся?
— Хто ж ім дасьць. Тут захочаш – ня ўтопісься. Гэта ж лягер, разумееш?

15.52

Ён разламвае жоўты цьвёрды хлеб, на, кажа, трымай, я бяру кавалак і кладу побач з сабой на асфальт, з-за хмараў нарэшце праступае сонца, праз пару гадзінаў вада павінна прагрэцца, і тады можна будзе пераплысьці іхную рэчку і паглядзець нарэшце што там – на тым баку ракі, што ўвесь час знаходзіцца побач са мной, хоць раз пераплысьці і нармальна ўсё там агледзець, добрая нагода, дарэчы, галоўнае, каб вада прагрэлася, апошні на сёньня цягнік праяжджае паўз нас, сьледам за ім цягнуцца хмары, рэальнасьць ссоўваецца ў заходнім кірунку, нібы слайд, цяпер павінен зьявіцца наступны кадар, Карбюратар моўчкі перажоўвае свой жоўты хлеб, кроплі падаюць з соснаў на плястыкавыя дахі павільёнаў, акрамя нас

на плятформе больш нікога няма, я гляджу на асфальт і бачу, як да майго хлеба падпаўзае стомлены, змучаны дэпрэсіямі сьлімак, выцягвае сваю недаверлівую пыску ў бок майго хлеба, потым расчаравана ўсоўвае яе назад у панцыр і пачынае адпаўзаць ад нас на захад – на іншы бок плятформы. Я нават думаю, што гэтай дарогі яму хопіць на ўсё ягонае жыцьцё.

Студзень–травень 2004, Харкаў

Пераклала з украінскай Таціяна Ўрублеўская паводле: Жадан Сергій. Депеш Мод. – Харків: Фоліо, 2004.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 10 (50) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/10/15**
[image]

ВІТАЛЬ СКАЛАБАН
гісторык, літаратуразнавец, архівіст.

Віталь Скалабан А знак націску паставіць забыліся... Заўвагі археографа на палях «навукова-папулярнага выдання»

Карский Е. Ф. *Белорусы: В 3 т. Т. 2. Язык белорусского народа. Кн. 1.* – Минск: Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – 456 с.
Знаёмства з 1-й кнігай 2-га тома (надрукаваная вельмі хутка пасля выдання 1-га) пачнем з тытула і выходных звестак. Ёсць адрозненні ад афармлення папярэдняга тома. Пазначана, што выданне будзе трохтомнае, у 1-м томе праз недагляд аб гэтым не паведамлялася. Трэба таксама ўхваліць шляхетнае стаўленне да аўтара прадмовы і каментароў В. М. Курцовай: яе імя чытач знойдзе на адвароце тытула. Але ёсць і навацыі, якія выклікаюць пытанні. Беларуская мова ў афармленні выходных звестак цяпер скарыстана толькі ў знаку серыі і назве выдавецтва (чамусьці без імя Петруся Броўкі). Між тым прадмова і каментары друкуюцца, як і раней, на беларускай мове. Такі разнабой, мабыць, звязаны з тым, што на выдаўцоў «цісне» зробленыя на расійскай мове вокладка і тытул 1-га тома перавыдадзеных «Беларусаў», хоць і іх можна было

зрабіць на беларускай мове, скарыстаўшы вопыт падрыхтоўкі «Слоўніка беларускай мовы» І. Насовіча.

Даволі спрэчным уяўляецца падзел тамоў на кнігі, а не на традыцыйныя ў такім выпадку выпускі (том 2, выпуск 1; том 2, выпуск 2–3). Выдаўцы наогул выключылі з выходных звестак сам тэрмін «выпуск», што ўскладняе наступны бібліяграфічны пошук, асабліва суаднясенне з папярэднімі выданнямі. Сумненні ў правільнасці афармлення выходных звестак яшчэ больш узмацняюцца пасля знаёмства з прадмовай, дзе В. М. Курцова гаворыць пра тры выпускі і зрэдку карыстаецца тэрмінам «часткі», але не згадвае пра падзел тома на кнігі. А сам Я. Карскі ў 1908 г. у прадмове да першага выдання 2-га тома «Беларусаў» пісаў: «Гэты 1-шы выпуск II тома «Беларусаў», акрамя колькіх уступных артыкулаў, прысвечаны гістарычнаму нарысу гукаў беларускай мовы, 2-гі выпуск будзе змяшчаць марфалогію (словаўтварэнне і словазмяненне), а 3-ці – сінтаксіс». Мабыць, выдаўцы пайшлі ўслед за тытулам 1908 г., дзе тэрмін «выпуск» не ўпамінаўся.

Надзвычай свабольна выдаўцы паставіліся да рубрыкацыі тома, узялі на сябе смеласць і падзялілі том на чатыры раздзелы (пра такое чляненне піша ў прадмове В. М. Курцова). Больш за тое, не палічылі неабходным перадрукаваць змест у тым выглядзе, у якім ён быў зроблены аўтарам, з пазначэннем сюжэтаў, вылучаных у тэксце пад асобнымі загалоўкамі. Гэта рабіла том вельмі зручным для чытача, а змест фактычна выконваў функцыю рэзюме і своеасаблівага паказальніка. Але тут ужо выходзім на іншы сюжэт – пра навукова-даведкавы апарат у беларускіх энцыклапедычных выданнях. (Пакуль толькі заўважым, што сярод набыткаў у гэтым кірунку – выдадзены ў 1976 г. накладам 5 тысяч асобнікаў том паказальнікаў да 12-томнай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі і іменны паказальнік да «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі».)

Яўна не на сваё месца трапіў спіс скарачэнняў – фактычна унікальны даведнік пра скарыстаныя ў працы крыніцы: старажытныя граматы, летапісы, рукапісныя і старадрукаваныя кнігі, археаграфічныя выданні, фальклорныя і этнаграфічныя публікацыі, перыядычныя выданні (у тым ліку «Мужыцкая

праўда», «Наша Доля» і «Наша Ніва»), навуковыя працы. Гэты спіс з'яўляецца неад'емнай часткай тома, а з незразумелага рашэння выдаўцоў ён змешчаны перад пачаткам тэксту.

На жаль, як і ў 1-м томе, адсутнічае тэксталагічная прадмова – тлумачэнне прынцыпаў падрыхтоўкі выдання. Адсутнічае і прозвішча таго, хто займаўся падрыхтоўкай тэксту да друку, выконваў працу складальніка-тэкстолага, якая ў гэтым выпадку павінна была пачацца з выбару крыніцы для публікацыі. І наяўнасць аўтарытэтнага рэдакцыйнага савета, адказнага за выпуск і літаратурнага рэдактара становішча не ратуюць.

Убачыўшы на с. 35 факсіміле вокладкі 1-га выпуску 2-га тома «Беларусаў», выдадзеных у Варшаве ў 1908 г., чытач можа падумаць, што прапануецца перадрук гэтага выдання. Але, перагарнуўшы старонку, ён прачытае падзагаловак «Гістарычны нарыс гукаў беларускай мовы» («Исторический очерк звуков белорусского языка»), які ў 1908 г. выглядаў інакш: «Гістарычны нарыс гукаў беларускай гаворкі» («Исторический очерк звуков белорусского наречия»). Аказалася зменена і назва ўсяго тома: «Мова беларускага народу» («Язык белорусского народа») замест «Мова беларускага племені» («Язык белорусского племени»).

Які ж тэкст прапанавалі чытачу беларускія энцыклапедысты? Аказваецца, тэкст, што ўбачыў свет пад грыфам Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук БССР у 1955 г. у Маскве ў выдавецтве Акадэміі навук СССР. Рэдактар таго выдання, вядомы мовазнавец В. І. Баркоўскі (зяць Я. Карскага), паведамляў у прадмове «Ад рэдактара», што ён меў аўтарскі экземпляр «Беларусаў» з праўкамі і дапаўненнямі Я. Карскага, які рыхтаваў сваю працу да перавыдання (дзе сёння зберагаецца гэтая рэліквія і чаму не скарыстана – гаворка асобная). Былі выкарыстаныя таксама дадаткі з артыкула «Нататкі па беларускай гаворцы» («Заметки по белорусскому наречию») і ўдакладненні да «Беларусаў», зробленыя аўтарам у 3-м выпуску 2-га тома (цікава, ці ведалі пра гэта ў час падрыхтоўкі перавыдання 1-га тома?). Пры падрыхтоўцы перавыдання 1955 г. усе гэтыя дапаўненні і праўкі рэдактарам былі ўлічаныя, але яны былі не агавораныя. Паводле словаў

рэдактара, ён лічыў неабходным поўнасцю захаваць аўтарскі тэкст, дазволіў сабе толькі прыбраць супярэчнасці ў тэрміналогіі. Прывядзем цытату з адпаведным тлумачэннем В. І. Баркоўскага:

Я. Ф. Карскі ў шматлікіх сваіх працах ужываў, побач з тэрмінамі беларускі народ, беларуская мова, заходняруская мова, *тэрміны, што з'яўляліся, ва ўмовах царскага рэжыму, вымушанай саступкай афіцыйным колам, суровай цэнзуры:* беларускае племя, беларуская гаворка, заходняруская гаворка. *У новым выданні «Беларусаў» захоўваюцца тыя найменні, якія адлюстроўваюць сапраўднае меркаванне самога аўтара, які горача любіў свой народ – беларусаў і марыў пра час, калі Беларусія будзе вольная і шчаслівая. Гэтымі найменнямі з'яўляюцца:* беларускі народ, беларуская мова, заходняруская мова.

Рашэнне В. І. Баркоўскага даволі спрэчнае, але важна, што ён агаварыў свае падыходы да падрыхтоўкі публікацыі. І застаецца толькі выказаць здзіўленне, што сучасныя выдаўцы без аніякіх спасылак перадрукавалі падрыхтаваны В. І. Баркоўскім тэкст, выдадзены пад грыфам Інстытута мовазнаўства.

Распачатае сёлета перавыданне «Беларусаў» значна актывізуе вывучэнне жыцця, навуковай і грамадскай дзейнасці аўтара шматтомнай энцыклапедыі беларусазнаўства – найвышэйшага дасягнення еўрапейскай славістыкі канца XIX – пачатку XX ст. у вывучэнні беларусаў[1]. Пры гэтым увага будзе нададзена таксама новым аспектам: вывучэнню гісторыі стварэння і выдання ягоных класічных працаў, іх функцыянаванню, успрыняццю і скарыстанню ў розны час і з рознымі мэтамі. Надзвычай багаты матэрыял для асэнсавання значэння навуковых росшукаў Я. Карскага даюць уласна тэксты яго публікацый, гісторыя прыжыццёвых і пасмяротных выданняў.

Прывядзем архіўныя звесткі пра забытую спробу Акадэміі навук Беларусі распачаць выданне Поўнага збору твораў Я. Карскага ўжо ў першыя паваенныя гады. Акадэмік-сакратар аддзялення грамадскіх навук У. М. Перцаў у «Тлумачальнай

[1] Гл.: Булыка А. М. Мушынскі

запісцы да плана на трохгоддзе 1948–1950 гг. па інстытутах, што ўваходзяць у склад аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР», падаў наступныя звесткі аб прычынах выключэння з плана праекта, які і праз 60 гадоў застаўся неажыццёўленым:

Пяцігадовым планам намячалася таксама і праца ў выданні Поўнага збору твораў акад. Карскага. Эта праца планавалася як комплексная супольнымі сіламі Інстытута літаратуры (поўная тагачасная назва – Інстытут літаратуры, мовы і мастацтва – **В. С.**) *і сектарам этнаграфіі Інстытута гісторыі, з прыцягненнем некаторых работнікаў збоку (галоўным чынам праф. Баркоўскага, які жыве ў цяперашні момант у г. Львове). Аднак у цяперашні час выявілася цяжкасць здзяйснення гэтай комплекснай тэмы. Работа над ёй патрабуе засяроджанай працы цэлага шэрагу супрацоўнікаў інстытутаў літаратуры і гісторыі. Між тым адцягнуць іх ад работы над асноўнымі тэмамі дзеля выканання названага выдання ёсць немагчымым. Да таго ж выданне работ Карскага патрабуе забеспячэння іх уводнымі артыкуламі, заўвагамі, дадаткамі і інш. Усё гэта выявілася настолькі складаным, што агульным сходам аддзела грамадскіх навук АН БССР вырашана было гэтую тэму зняць з плана гэтай пяцігодкі*[2].

Мяркую, што энцыклапедычныя выдаўцы дарэмна адмовіліся ад публікацыі аўтарскіх прадмоў да тамоў. Між тым, у выданні 1955 г. прадмова была захаваная, але апушчаны першы сказ: «Зыходзячы з таго палажэння, што з’яўленне навуковай граматыкі расійскай мовы і ейнай гісторыі магчыма толькі пасля стараннага вывучэння жывых расійскіх гаворак і гісторыі апошніх, аўтар у 2-м томе «Беларусаў» падступіў да дэталёвай распрацоўкі мовы беларускага племені». У адпаведнасці з тагачаснымі патрабаваннямі з тэксту знікла вызначэнне «Імператарскі» ў дачыненні да Акадэміі навук і Варшаўскага універсітэта.

У сувязі з гэтым паўстае пытанне: якія яшчэ неагавораныя праўкі былі зробленыя не з засведчанай волі аўтара, а паводле меркаванняў рэдактара, выдавецтва, цэнзуры? А прэтэнзій да працаў Я. Карскага выстаўлялася ў той час вельмі шмат, не кажучы пра 20–30-я гады мінулага стагоддзя. У прадмове

М. І. Фядосік А. С., Цыўлюнь А. П., Чамярыцкі В. А. Карскі Яўхім Федаравіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т. 2. Мінск: БелСЭ, 1985. С. 696.

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4 п. Вып. 47. Спр. 185. Арк. 185.

Інстытута мовазнаўства АН БССР да выдання 1955 г. адзначалася:

Асобныя з'явы мовы разглядаюцца Карскім толькі бегла, эпізадычна, без выяўлення зменаў, якія адбываліся на працягу ўсіх перыядаў гісторыі беларускага народу.

У Карскага не заўсёды атрымлівалася падняцца вышэй за факты і, адпаведна, вызначыць пэўную заканамернасць у развіцці мовы. Як вядома, усе гістарычныя змены ў мове сведчаць пра паслядоўнае самаўдасканаленне і ўзбагачэнне ейнай сістэмы. Прыватныя ж і больш агульныя вывады Карскага не паказваюць непасрэдна на гэты выключна важны бок пытання.

Не валодаючы марксісцкім метадам у падыходзе да вывучэння грамадскіх з'яваў, акадэмік Карскі не мог даць глыбокага тэарэтычнага абагульнення сваіх найкаштоўнейшых назіранняў і даследаванняў у галіне беларускай мовы. Ня ўсе ягоныя вывады, сфармуляваныя шмат гадоў таму, адпавядаюць сучасным дасягненням савецкага мовазнаўства.

Неабходна крытычна ставіцца і да тэарэтычных вывадаў Я. Ф. Карскага аб утварэнні беларускай народнасці, аб узаемадзеянні працэсаў развіцця беларускай мовы з мовамі расійскай і ўкраінскай, аб дыялектах беларускай мовы і г. д.

Я. Ф. Карскі лічыў, што фармаванне мовы народнасці адбываецца непасрэдна на аснове племянных дыялектаў…

Гэтае сцверджанне нельга лічыць праўдзівым, бо ў перыяд утварэння Літоўскага княства існавалі ўжо не племянные дыялекты, а тэрытарыяльныя, якія не паспелі яшчэ перамалоцца ў адзінай мове.

У працах Карскага, у тым ліку і паслярэвалюцыйных, не знайшлі належнага адлюстравання працы класікаў марксізму-ленінізму з нацыянальнага пытання. Нідзе ім не закранутае пытанне пра фармаванне беларускай буржуазнай і сацыялістычнай нацыі.

Сёння, трымаючы ў руках гэтае надзвычай каштоўнае і

патрэбнае выданне, найперш трэба аддаць належнае тым, хто ў сярэдзіне мінулага стагоддзя далучыўся да няпростай на той час справы перавыдання 2-га тома «Беларусаў». І можна пашкадаваць чытача, які будзе ламаць галаву над законным пытаннем: каму належаць падрадковыя заўвагі ў 1-й кнізе 2-га тома на с. 27, 51, 69, 219, 236 з пазнакай «ред.»? Хацелася б спадзявацца, што ўжо ў наступнай кнізе «Беларусаў» будзе адзначана праца В. І. Баркоўскага – рэдактара 2-га тома.

На жаль, сучасныя выдаўцы не толькі прамаўчалі пра сваіх папярэднікаў, але выпусцілі ў свет кнігу з шэрагам недахопаў і элементарных тэхнічных недаглядаў. Так, у выданні шмат спасылак на адпаведныя старонкі як папярэдняга тома (гл. с. 13–33, 88, 125, 141, 155, 257, 273, 347), так і самой рэцэнзаванай кнігі (гл. с. 37, 232, 306, 366). Але ж ніхто не звярнуў увагі на тое, што ў час падрыхтоўкі перавыдання старонкі «паплылі» – адпаведна, спасылкі трэба было зверыць і паправіць згодна з новай пагінацыяй. У выданні 1955 г. такія праўкі ці заўвагі, за рэдкім выключэннем, былі зробленыя. Напрыклад, на с. 230 чытаем: «Указаныя Я. Ф. Карскім старонкі 272, 378 – у гэтым выданні гэта старонкі 230 і 304. (*Ред.*)». У агляданым выданні на с. 232 (менавіта яна адпавядае с. 230 у выданні 1955 г.) гэтая заўвага, мабыць праз недагляд, апушчаная.

Пакідаючы разгляд падрыхтаваных В. М. Курцовай грунтоўнай прадмовы і падрабязных каментароў мовазнаўцам, усё ж выкажам некаторыя пажаданні. У прадмове дарэмна толькі называецца, але не аналізуецца ілюстраваны палеаграфічны нарыс «Асаблівасці пісьма заходнярускіх твораў, пачынаючы ад найстаражытнейшых часоў». Таксама шкада, што да нарыса не прыведзена ніводнага сучаснага каментара. Прынамсі, каментар 1955 г. пра выдадзеную Я. Карскім у 1928 г. класічную працу «Славянская кірылаўская палеаграфія» можна было дапоўніць упамінаннем пра яе факсімільнае перавыданне ў Маскве ў 1979 г. Менавіта акцэнт у прадмове і анатацыі (дарэчы, чаму яна адсутнічае?) на палеаграфічны нарыс і выявы старонак старажытных беларускіх рукапісаў і кніг мог бы садзейнічаць значнаму пашырэнню кола чытачоў.

Можна паспрачацца і са сцверджаннем, што найперш 2-гі том «Беларусаў» застанецца неацэнным капіталам гістарычнай вартасці «ў аналах нацыянальнай навукі» (с. 12), бо найбольшая вартасць працы менавіта ў яе непарыўнай цэльнасці і «адзінааўтарстве». Значнага ўдакладнення і канкрэтызацыі патрабуе, на наш погляд, і тэзіс пра тэндэнцыйнасць і нават прадузятасць многіх высноў і думак Я. Карскага (тамсама). Тлумачыць гэта знітаванасцю і ў пэўнай меры абмежаванасцю навуковых росшукаў Я. Карскага традыцыямі расійскага мовазнаўства, выхаванцам якога ён быў, яўна недастаткова.Трэба было пракаментаваць і наступную выснову на с. 88: «З канца XVIII ст. польская мова паступова выціскае з канцылярый і школаў заходняй Русі расійскае маўленне і пісьмо». Вядома, што паланізацыя пачалася значна раней, а ў 1696 г. сейм прыняў пастанову аб тым, што мовай справаводства з'яўляецца польская, а не «руская», пра гэта можна прачытаць на с. 134 1-га тома «Беларусаў». Для сучаснага чытача таксама трэба было пракаментаваць думку Я. Карскага, што беларускай мове невядома «колькасць галосных» (с. 395). У адрозненне ад 1-га тома, не каментуюцца персаналіі, перыядычныя выданні, месцы захоўвання помнікаў і інш. Трэба было пракаментаваць і эпіграф (с. 36), які для шырокага чытача не зашкодзіла б падаць у сучаснай беларускай мове, тым больш што ў 1-м томе эпіграф з верша Цютчава каментуецца. Карыстаючыся выпадкам, адзначым, што з 1-га тома з недагляду выпаў вядомы эпіграф з верша Янкі Лучыны. Але ў гэтай сітуацыі выдаўцоў ратуе праф. М. Г. Булахаў, які ва ўступным нарысе на с. 11 цытуе эпіграф: «Сонца навукі скрозь хмары цёмныя / Прагляне ясна над нашай ніваю, / І будуць жыці дзеткі патомныя / Добраю доляй, доляй шчасліваю!». Але ж Я. Карскі надрукаваў гэтыя радкі з паметай «З аднаго новага беларускага верша» і, вядома, іншым правапісам.

У апошнім абзацы прадмовы сустракаем такі фрагмент: «фундаментальная «навуковая распрацоўка» беларускай мовы «Беларусы» (с. 12). Відавочна, тут адбыліся адразу два збоі. І апошняя заўвага, дробязная, пра звычайны недагляд. На с. 50 чытаем: «У словах заўсёды пазначаецца націск знакам. Іншыя знакі і напісанні заўваг не выклікаюць». А сам знак націску паставіць забыліся…

Разумею, што пішу гэтыя заўвагі ў складаны для выдавецтва час, звязаны з пошукамі свайго месца ў інфармацыйна-выдавецкай прасторы Беларусі пасля заканчэння выдання універсальнай 18-томнай Беларускай энцыклапедыі і блізкім завяршэннем рэгіянальнай энцыклапедыі «Республика Беларусь» (папярэдняя 5-томная рэгіянальная энцыклапедыя выдавалася на дзвюх мовах, беларускай і расійскай). Сітуацыя яшчэ больш абвастрылася ў сувязі з меркаваным нечаканым пераездам «Энцыклапедыі» ў вельмі нязручнае для такой унікальнай установы памяшканне на ўскраіне Менска. Як кажуць, ляжачых не б'юць. Але ж «Беларусы» Яўхіма Карскага – наш неацэнны скарб, які вымагае надзвычай уважлівай падрыхтоўкі да друку, тым больш што выданне аднесена да «навукова-папулярных».

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/10/18

[image]

СЯРГЕЙ ЗАПРУДСКІ
Сяргей Запрудскі
мовазнавец, старшыня Карскі без рэдактара
Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

Карский Е. Ф. *Белорусы. Т. 1. Введение в изучение языка и народной словесности. –*
Минск: Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – 656 с.
Надрукаваны больш за сто гадоў таму 1-шы том фундаментальнай працы Я. Карскага «Беларусы» выдадзены ў заснаванай сёлета серыі «Помнікі гістарычнай думкі»; уласна гэты том адкрывае серыю. У рэдакцыйны савет увайшлі некалькі энцыклапедычных і акадэмічных супрацоўнікаў, іхныя прозвішчы пералічаны ў кнізе, галоўны рэдактар – Генадзь Пашкоў. Аб прынцыпах укладання серыі можна толькі здагадвацца са змешчанага ў кнізе кароткага непадпісанага зварота «Да чытача»: мэтай выдання серыі з'яўляецца «вярнуць у шырокі навуковы і паўсядзённы ўжытак найбольш істотныя працы аўтараў, што прысвяцілі свой талент вывучэнню беларускага народу, яго гісторыі і асяроддзя пражывання». У прыватнасці, называюцца імёны «найбольш значных рупліўцаў на ніве беларускай навукі, славянскай духоўнасці» Я. Ф. Карскага, Е. Р. Раманава, М. В. Доўнар-Запольскага, П. В. Шэйна, В. Ю. Ластоўскага, А. П. Сапунова.

Магчыма, аўтар ананімнага зварота не ведае, але спадчына пералічаных асоб нядрэнна-такі зафіксавана ў беларускай гуманітарнай навуцы. Па меры публікацыі серыі можна будзе прасачыць, ці папраўдзе першымі будуць выдадзеныя ўсе

названыя аўтары. Што тычыць Я. Карскага, то з пасляваенных гадоў увага да яго спадчыны была заўсёднай, пра што могуць сведчыць, прыкладам, змешчаныя ў беларускім друку шматлікія артыкулы, апублікаваныя да 90-гадовага (1951 г.), 100-гадовага (1961 г.), 120-гадовага (1981 г.), 125-гадовага (1986 г.) юбілеяў класіка. 2-гі (мовазнаўчы) том «Беларусаў» быў надрукаваны ў Маскве ў 1955–1956 гг., ягоныя працы па беларускай і іншых славянскіх мовах – у 1962 г. Спецыяльная манаграфія пра Я. Карскага (аўтар – М. Булахаў) выйшла ў Менску ў 1981 г. Ужо добры дзесятак гадоў у Гродзенскім універсітэце рэгулярна праходзяць Карскія чытанні, на якіх у тым ліку даследуецца спадчына земляка і ейнае значэнне для нашага часу. Ужо некалькі дзесяцігоддзяў навукоўцы карыстаюцца працамі Я. Карскага папраўдзе *штодзённа*. Выданне твора класіка сёння (накладам 2000 асобнікаў) мела б на ўвазе не столькі «вяртанне», колькі грунтоўнае, на ўзроўні патрабаванняў часу навукова-эдыцыйнае забеспячэнне працаў нашага вялікага папярэдніка, без чаго, уласна кажучы, не можа ісці гаворкі пры выданні аўтараў падобнага рангу.

Тэксту Я. Карскага папярэднічае прадмова супрацоўнікаў трох акадэмічных гуманітарных інстытутаў: мовазнаўцы В. Курцовай, гісторыка А. Унучка і этнолага І. Чаквіна (с. 15–30), у якой спадчына Я. Карскага ацэньваецца ў значнай меры згодна з вымогамі часу. Аўтары справядліва адзначаюць, што працы Я. Карскага маюць «комплексны, сістэмны характар і з'яўляюцца асновай беларусазнаўства як навуковай дысцыпліны» (с. 15). В. Курцова, А. Унучак і І. Чаквін далучаюцца да меркавання эмігранцкага гісторыка В. Тумаша, згодна з якім дзякуючы Я. Карскаму беларускі народ ужо ў самым пачатку XX ст. у галіне навуковага вывучэння сваёй мовы аказаўся «на самым перадзе сярод іншых славянскіх народаў» (с. 23). (Такая ацэнка, заўважым у дужках, у пэўнай меры сугучная меркаванням расіяніна Барыса Ляпунова і англічаніна Арнольда Макміліна, выказаным імі адпаведна ў 1932 і 1967 гг.) У прадмове не толькі называюцца ўмовы, якія спрыялі ўзнікненню твора тыпу «Беларусаў» на пэўным гістарычным этапе развіцця беларускага народу, але і пазначаюцца некаторыя будучыя перспектыўныя кірункі даследаванняў (у гэтым выпадку маецца на ўвазе спасылка на

значэнне для дзейнасці Я. Карскага «ўкраінскага чынніка», с. 16).

Аднак шэраг прыватных выказванняў аўтараў прадмовы (тыпу таго, што праца Я. Карскага *рыхтавалася* на сродкі, выдаткаваныя віленскім генерал-губернатарам П. Святаполк-Мірскім; што першай навуковай працай Я. Карскага быў «Агляд гукаў і формаў беларускай мовы») даводзіцца прызнаць недакладнымі. Парадаксальна выглядае меркаванне, паводле якога для Я. Карскага «беларускія гаворкі не з'яўляліся асобным, самастойным утварэннем, але разам з тым яны характарызаваліся ўласным комплексам лінгваасаблівасцей» (с. 28). Матэрыял у прадмове размеркаваны не заўсёды рацыянальна: напрыклад, пра меркаванні Я. Карскага адносна этнагенезу беларускай нацыі, а таксама пра сёмы і восьмы раздзелы манаграфіі даводзіцца чытаць двойчы ў розных месцах прадмовы – у фрагментах, напісаных рознымі аўтарамі.

В. Курцова, А. Унучак і І. Чаквін падрыхтавалі таксама каментары да тома, апублікаваныя на с. 372–402. Пры тым, што ў значнай меры каментары выглядаюць вельмі грунтоўна, у цэлым шэрагу выпадкаў у вочы кідаецца паспешлівасць, якая, відавочна, спадарожнічала іхнай падрыхтоўцы. Даволі звычайнай у кнізе выглядае, напрыклад, практыка, калі аднолькавыя ці, прынамсі, сувымерныя паняцці ці імёны трактуюцца па-рознаму: адны з іх каментуюцца, а іншыя – не.

У шэрагу выпадкаў каментар падаецца не пры першай згадцы таго або іншага твора або прозвішча. Напрыклад, этнаграфічныя карты А. Рыціха, П. Кепен, «Матэрыялы па гісторыі тапаграфіі Віцебскай губерні» Е. Раманава ўпершыню згадваюцца Я. Карскім на с. 34, 35 выдадзенага тома, у той час як каментары да гэтых прозвішчаў і твораў дадзены ў сувязі з іх згадваннем на с. 37, 38, 164.

Неабгрунтаваным выглядае прыём, пры якім некаторыя каментары падзяляюцца на дзве часткі, змешчаныя ў розных месцах тома. Напрыклад, на с. 41 з нагоды спасылкі Я. Карскага на 69-ю старонку працы А. Сабалеўскага «Спроба рускай дыялекталогіі» тлумачыцца, што тут мае месца спасылка на працу «вядомага расійскага лінгвіста» (с. 373) і

падаецца крыніца яе часопіснай публікацыі ў 1892 г. (Кніжная публікацыя працы Сабалеўскага 1897 г., пра якую піша сам Я. Карскі на с. 265, пры гэтым не згадваецца.) Папраўдзе, незразумелая ўпэўненасць каментатараў у тым, што Я. Карскі карыстаўся менавіта часопіснай публікацыяй Сабалеўскага пры існаванні больш позняй і вядомай Я. Карскаму кніжнай – тым больш, што, як вынікае з іншай заўвагі ў томе (с. 378), публікацыя Сабалеўскага ў «Живой старине» змяшчалася на с. 1–61 (і, значыць, у ёй не магло быць 69-й старонкі). Больш падрабязная характарыстыка «рускага і ўкраінскага філолага» (с. 377) А. Сабалеўскага ў каментарах з'яўляецца, аднак, пазней – з нагоды спасылкі Я. Карскага на А. Сабалеўскага на с. 69.

Некаторыя каментары няпоўныя. Так, у заўвазе з нагоды спасылкі Я. Карскага на Яна Карловіча (с. 107) не называюцца суаўтары працы «Слоўнік польскай мовы» А. Крынскі і У. Нядзведскі (якія, дарэчы, згадваюцца самім Я. Карскім на с. 139). У томе не каментуецца вялікае мноства геаграфічных назваў і прозвішчаў (Д. Языкаў, Ф. Булгарын, С. Пташыцкі, М. Карпінскі, Е. Барсаў, К. Гаворскі, М. Любаўскі і інш.).

Некаторыя імёны або творы (напрыклад І. Первольф, В. Сопікаў, «Этымалагічны слоўнік славянскіх моў» Ф. Міклашыча, «Цывілізацыя і мова» А. Брукнера, «Чэцця» 1489 г., праца Я. Галавацкага «Рысы хатняга побыту рускіх дваран на Падляссі»), наадварот, каментуюцца двойчы, тройчы (праца «Да пытання аб утварэнні рускіх гаворак…» А. Шахматава) ці нават (П. Чубінскі) чатыры разы (с. 372, 382, 387, 392). Толькі ў адзінкавых выпадках у каментарах сустракаюцца пажаданыя ў такіх выпадках унутрыкаментарныя адсылкі.

У шэрагу выпадкаў публікатары ўхіліліся ад каментароў – у тым ліку ў сувязі з нейкімі недакладнымі або тэндэнцыйнымі меркаваннямі Я. Карскага. Напэўна, заўвагу можна было змясціць пры выказванні Я. Карскага аб тым, што на самым захадзе Белавежскай пушчы, каля станцыі Гайнаўка, беларусаў няма (с. 39). Праўдападобна, не лішнім быў бы каментар пры выказваннях Я. Карскага пра «заходнюю дыпламатыю, якая хацела ўмяшацца ў славянскую сямейную справу» (с. 202), пра «неэфектыўнасць» выдання «Мужыцкай праўды» К.

Каліноўскага (с. 351), пра крайнюю «тэндэнцыйнасць» «Дудкі беларускай» Ф. Багушэвіча (с. 357). Я. Карскі несправядліва ацэньваў працы некаторых заходніх аўтараў (Ё. Х. Адэлунга, С. Б. Ліндэ), у гэтых выпадках у сваіх заўвагах каментатары беспадстаўна некрытычна пайшлі ўслед за Я. Карскім (гл. рэмарку з нагоды С. Б. Ліндэ на с. 400).

У кнізе аўтаматычна ўзноўлена недакладнае датаванне некаторых крыніц. Так, выказванне Ё. Х. Адэлунга аб беларусах было надрукавана ў шматтомнай працы «Мітрыдат...» не ў 1806 г., як падаў Я. Карскі, а ў 1809 г. у 2-м томе (у 1806 г. выйшаў 1-шы том працы Ё. Х. Адэлунга). Памылковая рэмарка каментатараў аб тым, што тэрмін *Белая Русь* ужываецца з VIII ст. (с. 381). Насуперак каментатарам даводзіцца сцвердзіць, што, бадай, легендарным з'яўляецца меркаванне, што Чачот дасылаў С. Б. Ліндэ беларускія лексічныя матэрыялы для яго славутага слоўніка (с. 385). «Слоўнік польскай мовы» С. Б. Ліндэ пачаў друкавацца ў 1807 г. (калі Я. Чачоту было ўсяго 11 гадоў), скончыў публікавацца ў 1814 г., калі Я. Чачот яшчэ нават не быў студэнтам Віленскага універсітэта... Выразным перабольшаннем з'яўляецца выказванне пра тое, што П. Шпілеўскі праславіўся сваімі мовазнаўчымі працамі (с. 391). Незразумела, адкуль у каментарах магла з'явіцца заўвага пра тое, што В. Грыгаровіч з'яўляецца заснавальнікам славяназнаўства ў Расіі (с. 393).

Творы Я. Карскага апублікаваны згодна з сучаснымі нормамі расійскага правапісу і граматыкі, але хто займаўся моўнай адаптацыяй, не пазначана. У шэрагу выпадкаў, аднак, пакінуты «ёр» на канцы словаў-ілюстрацый (напрыклад с. 121 і наступныя), а таксама «яць» (с. 192 і інш.), не выпраўлены стары канчатак роднага склону прыметніка *-аго* (с. 333). Часам пры апрацоўцы тэксту змест быў скажоны. Напрыклад, на с. 181–182 з нагоды працы К. Калайдовіча «Аб беларускай гаворцы» Я. Карскі заўважыў, што ў слоўніку К. Калайдовіча ў некаторых выпадках незнарок адзначаны істотныя гукавыя асаблівасці, і пры гэтым падаў напісанне *сстатокъ*. У томе гэта форма надрукавана як *статок*, і таму чытачу незразумела, якую гукавую асаблівасць меў на ўвазе Я. Карскі. Грубай сваволяй выдаўцоў з'яўляецца замена формы *руський* формай

русский у наступным кантэксце: «Вядомы крытык прафесар Качаноўскі пусціў ва ўжытак тэрмін *русский* для назвы заходнярускай мовы» (с. 180). У гэтым выпадку ішлося акурат пра тэрмін *руський* (ці, згодна з тагачасным напісаннем, *руській*), што ўласна і відаць на аснове пададзенай ніжэй цытаты з М. Качаноўскага. Неабазнанага чытача такая вольнасць выдаўцоў можа проста паставіць у тупік. Згаданы на с. 183 артыкул Д. Языкава папраўдзе называўся «Белорусский или Руський язык», а не *русский*, як зноў-такі неабгрунтавана «паправілі» Я. Карскага (а разам і Д. Языкава) публікатары. І ў цытаце з М. Грэча (с. 184) нельга было замяняць форму *руський* на *русский*, балазе на наступнай старонцы Ф. Булгарын тлумачыў сэнс гэтай дыферэнцыяцыі: «Гэты ь пасля літары *с* складае ў нас розніцу паміж народнай мовай Рускай (г. зн. расійскай мовай. – **С. З.**) і Руськай або Літоўскай (г. зн. беларускай мовай. – **С. З.**)». Назва *руськая мова* ў якасці назвы беларускай мовы ў М. Качаноўскага, Д. Языкава, Ф. Булгарына і М. Грэча процістаўлялася назве *руская мова* (*русский язык*), адпаведна ўжываць іх узаемазамяняльна нельга.

Са старога выдання публікатары перанеслі ў новае «Паказальнік асобаў…» (с. 360–365; пры гэтым перайначыўшы назву) і «Паказальнік геаграфічных месцаў…» (с. 366–371; таксама падрэдагаваўшы загаловак). Тое, што такія паказальнікі ў кнізе ёсць, вядома, добра. Аднак сучасныя выдаўцы (хоць, напэўна, былі ўзброены камп’ютэрам) на адрозненне ад выдаўцоў стогадовай даўнасці (якія камп’ютэраў не мелі)… не пазначылі пры прозвішчах і геаграфічных назвах нумароў старонак, ласкава пакідаючы чытачам кнігі «захапляльную» магчымасць самастойна і неаднаразова гартаць розныя старонкі тома ў пошуку патрэбных прозвішчаў ці тапонімаў. Ці можна ў гэтым выпадку гаварыць пра павагу да чытачоў кнігі?

У шэрагу выпадкаў пакідае жадаць лепшага карэктарская работа (с. 41, 42, 51, 135, 136, 139, 177, 233, 275, 283, 326, 375). Не зменена нумарацыя пры спасылках Я. Карскага на папярэднія старонкі ўласнага тома (напрыклад на с. 174, дзе Я. Карскі паклікаецца на с. 13–14 колішняга выдання, аднак у агляданым томе адпаведнае месца знаходзіцца на с. 41). Не

выпраўлены памылкі друку, якія фіксаваліся ў выданні стогадовай даўнасці: *1812* (замест *1821*) *году* – с. 51. Гаворка тут ідзе пра ўражанні Бястужава-Марлінскага з нагоды яго побыту ў Беларусі ў 1821 г., пра што паведамляецца ў каментары на с. 376. Выдаўцы пакінулі без зменаў арфаграфічную варыянтнасць пры перадачы Я. Карскім прозвішча Кепена, пішучы яго то як *Кеппен*, то як *Кёппен*. У некаторых выпадках не прыведзена да уніфікацыі неаднастайнае тэхнічнае афармленне выдання 1903 г. (гл. напрыклад загалоўкі на с. 134 і 150). Выдаўцы фатальна выправілі назву аднаго з выданняў П. Бяссонава: замест «Калики перехожие» напісалі… «калеки» (с. 209). Гэтая, з дазволу сказаць, «праўка» змушае думаць, што непасрэдным навуковым рэдагаваннем тома або ніхто не займаўся, або такое рэдагаванне было ўскладзена на карэктара, або рэдагаваннем займаліся нейкія невядомыя (і, як бачым, непрафесійныя) асобы.

Паводле вартай даверу інфармацыі, энцыклапедычныя выдаўцы задумалі сваю серыю без шырокіх кансультацый з элітай беларускай акадэмічнай навукі. Што да падрыхтоўкі выдання «Беларусаў», то ўжо на прасунутым этапе працы, незадоўга да запланаванага тэрміну публікацыі, выдаўцы зразумелі, якога ўзроўню публікацыю яны ініцыявалі, і звярнуліся ў акадэмічныя інстытуты па дапамогу з навуковым забеспячэннем выдання (уступны артыкул, каментары і інш.). Зразумела, падобныя справы (асабліва, калі мець на ўвазе дэфіцыт рабочых рук у акадэмічных гуманітарных інстытутах) на працягу двух-трох месяцаў не робяцца. Акадэмічным кіраўнікам выпадала або сарваць высакародную справу «вяртання» спадчыны Я. Карскага беларускаму народу, або выканаць замову энцыклапедыстаў у вялікай спешцы – з усімі спадарожнымі малапрыемнымі наступствамі. Быў абраны другі падыход. Акадэмічныя каментатары, напэўна, ведалі, што і як трэба зрабіць, але не мелі магчымасцяў выканаць сваю працу адказна. У некаторых выпадках яны свядома падалі частковыя каментары, падстаўляючы тым самым сябе пад крытыку – аднак пазначаючы будучыя кірункі працы для даследчыкаў Я. Карскага. Так, напрыклад, з нагоды прыведзенага Я. Карскім спіса літуанізмаў і паланізмаў у беларускай мове каментатары

(праўдападобна, В. Курцова) напісалі: «Пададзеныя Я. Карскім падборкі літуанізмаў і паланізмаў патрабуюць абавязковай пераправеркі па сучасных этымалагічных крыніцах» (с. 383). Падобны каментар знаходзім і з нагоды спісаў гебраізмаў і цюркізмаў (с. 386). Гэтыя фразы-сігналы трэба разумець прыблізна так: «Многія (ці некаторыя) этымалогіі Карскага адносна літуанізмаў, паланізмаў, гебраізмаў і цюркізмаў не знайшлі пацвярджэння ў сучасных працах па этымалогіі». Але ці не акурат абавязкам каментатараў было выканаць такую праверку, балазе за апошнія дзесяцігоддзі этымалагічнае вывучэнне беларускай лексікі радыкальна пасунулася наперад? Напэўна, на такую праверку не хапіла часу... Несумненна, аўтары прадмовы і каментароў заслугоўваюць ухвалы і падтрымкі за хутка выкананую работу. Дзякуючы В. Курцовай, А. Унучку і І. Чаквіну само выданне стала магчымым...

У дадатку (с. 405–650) без ніякага абгрунтавання, тлумачэння ці каментара змешчаны шэраг іншых працаў Я. Карскага, узятых, напэўна, з маскоўскага выдання 1962 г., пра што сведчыць захаванне пры некаторых артыкулах указанняў на крыніцы першых публікацый з пазнакай «ред.». Але ж рэдактара (праўдзівага, а не калектыўнага рэдактара-«генерала») агляданая кніга не мае. Яўна неадпаведнымі ў гэтым томе выглядаюць русістычныя працы Я. Карскага («Аб уплыве паэтычнай дзейнасці А. С. Пушкіна на развіццё расійскай літаратурнай мовы», «Значэнне М. В. Гогаля ў гісторыі расійскай літаратурнай мовы». «Значэнне М. В. Ламаносава ў развіцці расійскай літаратурнай мовы» і інш.). З другога боку, перадрук артыкула «Культурныя заваёвы рускай мовы ў старажытнасці на заходняй ускраіне яго пашырэння», у якім ішла гаворка пра беларускі ўплыў на літоўскую, латышскую, татарскую і жыдоўскую мовы, мог бы быць карысным.

Крытычна пісаць пра здзейснены друк – нялёгкае маральнае выпрабаванне. Акурат цяпер «Энцыклапедыя» перажывае ня лепшы час, а каментатары зрабілі тое, што змаглі ў прапанаваных умовах... Атрымліваецца, пытанне прафесіяналізму выдаўцоў – у гэтым выпадку адрасуюся да Г. Пашкова – пры падрыхтоўцы тома трэба было б неяк «вынесці

за дужкі»?..

Між тым «Беларуская Энцыклапедыя» мае занадта глыбокую традыцыю прафесійнай працы, каб сёння яе можна было занядбаць. І ўсёй сваёй дзейнасцю Я. Карскі сцвердзіў, што *ў пачатку было Слова*. Я. Карскі дасягнуў небывалых навуковых вяршыняў – і канкрэтна, карпатліва і прафесійна давёў існаванне беларусаў – у тым ліку таму, што з глыбокім піетэтам ставіўся да прамоўленага слова і надрукаванай літары. Было б добра, калі б людзі, якія сёння дакранаюцца да ягонай несмяротнай спадчыны, былі – хоць бы там, дзе гэта залежыць ад нас, смяротных – вартымі заснавальніка беларускай філалогіі.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 10 (50) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/18
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 10 (50) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2006

"ды Зыкеста"

[image] [image] [image]

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ

Павал Абрамовіч крытык літаратуры. Больш, чым сшытак Рэгулярна друкуецца ў «ARCHE».

Літаратурны сшытак // Наша Ніва. 2006. 26 траўня. № 19.
Літаратурны сшытак // Наша Ніва. 2006. 30 чэрвеня. № 24.
Літаратурны сшытак // Наша Ніва. 2006. 21 ліпеня. № 26.
Літаратурны сшытак // Наша Ніва. 2006. 11 жніўня. № 29.

Літаратура – гэта жменька солі, прыхаваная на чорны дзень.

Міларад Павіч

Неяк я набываў пэрыёдыку ў незалежных распаўсюднікаў. У продажы меліся тры апошнія нумары «Нашай Нівы» (№№ 23, 24 і 25). Мне быў патрэбны канкрэтны нумар «НН», 24-ты, і як выявілася, ён застаўся ў адзіным экзэмпляры, у адрозьненьне ад астатніх – іх ляжалі стосы. Што было такога сэнсацыйнага ў тым нумары? Чаму менавіта ён, а не 23-ці ці 25-ты, гэтак хутка разышоўся? На мой погляд, уся справа ў чарговым «Літаратурным сшытку» («ЛС»), які друкавала газэта.

Новы праект «Нашай Нівы», «ЛС», вельмі запатрабаваны, як і яе калядныя нумары (іх мы абавязкова разгледзім асобна). Дарма што нядобразычліўцы кажуць пра нашаніўскія калядныя нумары і нумары з «ЛС» як пра «лёгкія», многія з чытачоў «Нашай Нівы» ад 1991 г. – пачатку выданьня адноўленай вэрсіі газэты – вылучаюць у ёй менавіта літаратурна-мастацкую

частку.

Сьвіньні-касманаўты і беларускі паэтычны пэсымізм

Франц Сіўко. «І наша сьвядомасьць цынічна маўчала». Маркотна-засмучоныя дзёньнікавыя запісы віцебскага пісьменьніка пра сучаснае жыцьцё і літаратуру. Трапныя характарыстыкі («Як дыктар ці дыктарка на нашым тэлебачаньні – абавязкова зласьлівы») мяжуюць з мудрымі разважаньнямі («Больш, чым само нават пачуцьце нацыянальнае прыналежнасьці, нармальных людзей можа яднаць факт яго абразы»).

Ня толькі Сіўко, але і іншыя старэйшыя беларускія пісьменьнікі вяртаюць моду часу Івана Шамякіна на «прыжыцьцёвае» друкаваньне ўласных прыватных запісаў. Такое ўражаньне складваецца, калі бачыш, зь якой рэгулярнасьцю і імпэтам зьяўляюцца ў нашых часопісах і газэтах чарговыя часткі дзёньнікаў прызнаных майстроў слова, якія быццам спаборнічаюць між сабою ў «глыбакадумнасьці». Між тым у Расеі фрагмэнты дзёньніка Міхася Прышвіна за 1930 г. былі надрукаваныя толькі ў мінулым годзе (Отечественные записки. 2005. № 5–6), як і Аляксандра Твардоўскага за 1970 г. (Знамя. 2005. № 9–10). Сапраўды, ці варта з гэтым сьпяшацца?

Абсурдысцкае апавяданьне сталага аўтара «Нашай Нівы» **Паўла Касьцюкевіча** «ССК-1», пра першага беларускага сьвіна-скарбонку-касманаўта, многім прыйдзецца даспадобы: «Ён дасылае поштаю ўсе зароблены баксы і ў лістах просам просіць сваіх бацькоў ня кідаць у выбарчыя скрыні ўстаўных сківіц. <...> Па гулкіх калідорах касьмічнае станцыі гайнямі бегаюць байструкі Белкі і Стрэлкі. Салянка ў цюбіках даўно скісла». Такі гармідар, такая адзінота!

У «Як дарасьці нам да паўстаньня» крытык **Даніла Жукоўскі** разглядае раман прэзыдэнцкага стыпэндыята Алеся Наварыча «Літоўскі воўк» (статусны твор, зь якім варта азнаёміцца). Як сьцьвярджае Жукоўскі, вострапалемічная галоўная ідэя раману – «наканаванасьць каляніяльнага лёсу Беларусі» – знайшла адпаведнае мастацкае ўвасабленьне.

Падаецца заканамерным тое, што «Наша Ніва» зьмяшчае ў «ЛС» літаратурна-мастацкую крытыку: апошняя – аніякая не спэцыфічная галіна літаратуразнаўства, навуковая дысцыпліна, а самастойны род творчай дзейнасьці. Згадайце бліскучыя эсэ «Браму скарбаў сваіх адчыняю…» Алеся Адамовіча ці «Загадку Багдановіча» Міхася Стральцова. Літаратуразнаўчымі працамі іх язык не павернецца назваць.

У першым «ЛС» прыклад такога свабоднага лунаньня думкі – эсэ **Аляксандра Фядуты** «Два прарокі ў сваёй Айчыне». «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Ўладзімера Караткевіча і «Вершалінскі рай» Аляксея Карпюка: што паміж імі супольнага? Крытык экспрэсіўна апавядае пра сваё бачаньне, успрыняцьце гэтых мастацкіх тэкстаў, заахвочвае чытача да перачытаньня айчыннай клясыкі. Зь Фядутам хочацца спрачацца – асабліва наконт таго, што «простыя людзі», для якіх, на думку крытыка, пісалі згаданыя вышэй аўтары, «кніг не чытаюць», а таму «сьветлае прароцтва Караткевіча і змрочнае прароцтва Карпюка ў роўнай ступені не былі пачутыя». Далібог, я ўвесь час думаў, што кнігі Караткевіча зьвернутыя найперш да інтэлектуалаў, каб яны памяталі: народ ня чуе сваіх прарокаў, але гэта ня значыць, што ім (інтэлектуалам) можна адмаўляцца ад сваёй місіі.

Славуты **Готгальд Эфраім Лесінг**, дзякуючы высілкам перакладчыка **Алеся Яцэвіча**, загучаў па-беларуску. Жыцьцесьцьвярджальныя вершы пісалі паэты раней: «Nie skažu, ci daviadziecca / Zaŭtra dzień pražyć. / Tolki ŭsio ž kali pryjdziecca / I butelka padviarniecca - / Budu zaŭtra pić!» Дысанансам гучаць галасы некаторых маладых беларускіх творцаў, чые вершы зьмешчаныя ў гэтым жа нумары «Нашай Нівы». Яны ня тое што жыцьцё, творчасьць адмаўляюць: «Бо пасьля, як усе мы загінем / І згніюць у зямлі карані, / На ўспаміны нашчадкам пакінем / Не паперу – адны камяні (**Юрась Нераток**. «Без натхненьня») ці «кнігі паміраюць <…> іх рассоўваюць па ўсіх вуглах дому / ператвараючы яго ў вялікі кніжны могільнік / тых чые імёны ўжо нічога ня кажуць / зносяць на паддашак / дзе яны па дваццаць асобнікаў у адной каробцы / як у брацкіх магілах» (**Вальжына Морт**. «Памяці кнігі»).

Махавік помсты і нобэлеўка для ўсіх нас

Другі «ЛС» (№ 24 «НН») адкрываецца інтэрвію зь пісьменьнікам **Адамам Глёбусам** пад назвай «У палітыцы трэба, каб тыя, хто прайграў, маглі працягваць гульню». Гэтае інтэрвію ня ўпісваецца ў канцэпцыю «ЛС», бо ў ім ані слоўца пра літаратуру, мастацкую дзейнасьць. Адно што аўтар «сУчасьнікаў» апавядае казку ў адказ на пытаньне пра тое, як дачакацца зьменаў у беларускім грамадзтве. Цікавую, трэба сказаць, казку, я такой раней ня чуў.

Усевалад Гарачка зьмяшчае чарговую нізку сваіх вершаў. Некаторым мо спадабаецца манатонны, як цяжкая будзённая праца, верш «Жыў на сьвеце рабочы…», а я вылучу наступнае трохрадкоўе паэта: «Возера – старасьць. / Гэта рэчка спынілася ўспомніць / Сваё мінулае».

Павал Касьцюкевіч у гэтым «ЛС» выступае як перакладчык з габрэйскае: за магчымасьць прачытаць па-беларуску беззаганнае з усіх бакоў апавяданьне ізраільскага пісьменьніка **Этгара Керэта** «Адыдасы» – дзякуй яму вялікі. Што вылучае сапраўднага пісьменьніка? Свая гісторыя і здольнасьць яе распавесьці. Керэт, чые апавяданьні друкаваліся ў «НН» у розныя гады, мае і першае, і другое. У «Адыдасах» Керэт ня проста выправіў чытача ў экскурсію лябірынтамі ўразьлівай дзіцячай псыхікі, ён паказаў, што дзеля таго, каб застацца чалавекам, трэба своечасова бурыць махавік нянавісьці і помсты, які раз ад разу запушчаюць у нашых душах чужыя спрактыкаваныя рукі.

Валянцін Тарас у «Беразе даверлівага пляча» апавядае пра сваё сяброўства з паэткай Яўгеніяй Янішчыц. Памяць, гавары! «Калі разьвітваліся, Жэня раптам неяк панікла, твар пастарэў, вялізныя шэра-зялёныя вочы глядзелі журботна». Чым аддзячыць лёс за такія сустрэчы, за такую невымоўную пяшчоту і «блізкасьць без набліжэньня» (радок з аўтографу паэткі аўтару «Берагу…»)? Толькі вось гэтымі ўспамінамі…

Натуралістычны фотарэпартаж **Андрэя Лянкевіча** «Як тры дзяды ў лазьню хадзілі», які нагадаў мне творы француза Эміля

Заля, чамусьці апынуўся ў «ЛС» (на сайце «Нашай Нівы» прыкрая памылка выпраўленая – фотарэпартаж можна пабачыць у адпаведным разьдзеле). Якасьць фатаздымкаў вельмі нізкая – з-за кепскага друку газэты. Можа, то і добра, бо відовішча, шчыра кажучы, не для ўсіх.

Літаратурна-крытычны тэкст **Уладзімера Някляева** ёсьць прадмоваю да кнігі выбранага Рыгора Барадуліна «Руны Перуновы», а таксама тыповым узорам «пісьменьніцкай» крытыкі. Паэт-крытык вядзе гаворку ня толькі пра паэзію Барадуліна (пункцірна, па-багдановіцку: «Нязмушанасьць мэтафары, палётная лёгкасьць радка, электрычнай дугой са словам счэпленае слова…»), але і пра літаратуру наагул, і словы яго суворыя, важкія, прапушчаныя праз уласнае сэрца: «Субяседнікі Паэта – Ён і Яна. Бог і Вечнасьць. Больш размаўляць Паэту няма з кім і няма пра што».

Някляеў – нечуваная зьява для беларускай літаратуры – прызнае першынство над сабой іншага паэта. «Роўных яму няма сярод сучасьнікаў», – піша ён пра Барадуліна. Нехта скажа, маючы на ўвазе кампанію ў вылучэньні Барадуліна на Нобэлеўскую прэмію: «Гэтае прызнаньне – у імя агульнай перамогі». Можа быць. Тым больш што Някляеў адкрыта кажа, што «паэтычнае дойлідзтва» Барадуліна заслугоўвае гэтай высокай узнагароды.

Перачытваньне апавяданьня Міхася Стральцова «Смаленьне вепрука» абуджае ў душы **Аляксандра Фядуты** ўспаміны пра сваё маленства і родных (эсэ «Недамоўленае»). А я, чытаючы ў «ЛС» пра тое, як дзед Фядуты засмаліў вепрука Ваську, а дзеці адмовіліся яго есьці, згадаў таксама асабістае: як калісьці мой дзядуля зранку закалоў цялятка, што яшчэ ўвечары так сьмешна хавалася за сваю матулю, у хлеўны закуток, і мы, малыя, даведаўшыся пра забойства, плакалі ўголас. І зноў мне стала сумна.

Падчас чытаньня літаратурных твораў і эсэістыкі кожны згадвае сваё, і гэта цалкам натуральна, бо гэта вынікае з спэцыфікі мастацкай дзейнасьці. Дарэчы, бачыць зьнітаванасьць усяго з усім вучыў і сам Стральцоў.

Бесы нашага ТБ і «распад душы»

Аляксандар Апон у фантастычным апавяданьні «Азіятка і кампанія», якім пачынаецца трэці «ЛС» (№ 26 «Нашай Нівы»), стварае неверагодную ў мастацкай пераканальнасьці трагікамічную атмасфэру. Маленькія злыя духі, якія немаведама адкуль узяліся, прымушаюць беларускую сям'ю глядзець «роднае» тэлебачаньне. Пры гэтым яны бесьперастанку брыдкасловяць, лезуць біцца зь людзьмі, наводзяць вэрхал у кватэры, цягнуць прадукты зь лядоўні і жаруць чыпсы на падлозе, гледзячы канцэрт «За бацьку!». Пазбавіцца ад «тэбэшных» д'ябальчыкаў няпроста, але не хвалюйцеся, нашыя перамогуць.

Анджэй Стасюк. Апавяданьне «Васіль Падва» (пераклад **Марыі Мартысевіч**). Змаганьне чалавека са стыхіямі не прыносіць плёну, а мара зьехаць у далёкую краіну застаецца нязьдзейсьненай. Сапраўды, навошта «быць багатым, мець болей, чым меў дагэтуль»? І ў каго ператвараецца чалавек, які адмаўляе сабе ва ўсім, робіцца закладнікам ідэі і нават на прыроду пачынае глядзець праз прызму грошай («Каменьне мела колер лінялых капэрнікаў, а маленькія стронгі зіхцелі на сонцы, як срэбныя пятакі»)? Правільна, у фанатыка. Аднак грошы гэты польскі літаратар усё ж вельмі прыгожа апісвае: «Сотні, якія мелі колер полымя, пяцідзясяткі, зялёныя, як вада, і дваццаткі, бурыя, як дым». Так і хочацца патрымаць іх у руках.

«Мне няма што сказаць, я маўчу. Ў маім целе / ані кроплі сіл, у душы – распад. / Каб забыцца, нырцую у радыё- й тэле- / акіян. Падкажы мне дарогу назад», – просіць у паэме «Дывэртысмэнт для ІК» **Сяргей Прылуцкі**. Спачатку, Сяргей, вам трэба выкінуць тэлевізар, як зрабіў гэта герой апавяданьня Апона (гл. вышэй).

Адэпт нонфікшну і паэзія змаганьня

Чацьверты «ЛС» (№ 29 «НН») пачынаецца з апытаньня «Хто народны?». Газэта паспрабавала высьветліць, хто з сучасных беларускіх літаратараў варты званьня Народнага пісьменьніка.

Апытаньне і ягоныя вынікі (вартымі гэтага званьня большасьць беларускіх творцаў назвала Алеся Разанава і Генадзя Бураўкіна) выклікалі палкую палеміку ў Інтэрнэце і на старонках газэты. Асабіста я лічу, што ва ўмовах, калі наша грамадзтва імкліва губляе цікавасьць да мастацкага слова наагул і дзічыцца ўсяго беларускага, спачатку трэба аднавіць прэстыж кнігі, а потым – нацыянальнай літаратуры.

Дзеля таго, каб даведацца, што значыць для пісьменьніка **Андрэя Федарэнкі** рэалізм як мастацкі мэтад, варта працытаваць наступныя словы зь ягонага інтэрвію, зьмешчанага ў гэтым «ЛС»:

Там (у аповесьці «Нічые». – **П. А.**) *90 % дакумэнтальных зьвестак. Я два гады працаваў над кнігай. Мне вельмі дапамог гісторык Ляхоўскі… Ён даставаў мне такія фантастычныя рэчы, якіх дакладна ня бачыў Быкаў са сваёй аповесьцю «На Чорных Лядах». Мне было проста непрыемна чытаць яе, бо там узяты эпізод са змаганьня УПА, а Быкаў перавёў гэта на Слуцкі збройны чын, дзе быць такога не магло.*

Я не разумею Федарэнкі: як можна ставіць знак роўнасьці паміж жанрам нонфікшн, паводле канонаў якога створаны «Нічые», і мастацкай літаратурай (аповесьць «На Чорных Лядах»), і з гэтай пазыцыі крытыкаваць Быкава, крыўдаваць на яго? Дакумэнталіст карпатліва вывучае гістарычныя крыніцы, імкнучыся да аднаўленьня ходу падзеяў, літаратар вырашае пэўныя мастацкія задачы і дзеля таго наўмысна скажае рэчаіснасьць. Іншымі словамі, «Нічые» лягічней было б параўнаць з творам накшталт «Я з вогненнай вёскі».

Амаль усе вершы, зьмешчаныя ў чацьвертым «ЛС», можна аднесьці да грамадзянскай лірыкі. У час, калі ў краіне пануе жорсткасьць, страх і адчай, маладыя беларускія лірнікі не губляюць веры ў перамогу: «Сьлязьмі сплылае сэрца зноўку ўсьміхаецца. / Сны мрояць рэшткі муроў. / Ды гучыць палянэз, не спыняецца. / Ды вітае свабода сваіх ваяроў» (**Юры Стасінскі**, «Разьвітаньне з інсургентам»).

* * *

Усяго ў чатырох «Літаратурных сшытках» было зьмешчана 5 апавяданьняў і 50 вершаў[1]. Чытачу таксама былі прапанаваны нататкі, рэпартажы, інтэрвію, апытаньне, партрэтны і падарожны нарысы, успаміны, эсэ і інш. Акрамя таго, друкавалася літаратурна-мастацкая крытыка.

Дзякуючы «ЛС» пабачыў сьвет шэраг якасных тэкстаў, створаных па-беларуску (Касьцюкевіч, Апон, Фядута, Тарас), і перакладаў (Лесінг, Міцкевіч, Гэрбэрт, Керэт, Стасюк). Аднак ня ўсё так добра. Па-першае, канцэпцыя праекту не акрэсьлілася: «ЛС» атрымаліся досыць эклектычныя. Ці нез-за імкненьня «НН» друкаваць у іх і жука, і жабу (маю на ўвазе найперш інтэрвію з Глёбусам і фотарэпартаж з голымі дзядамі)? Па-другое, падтрымлівалася небясьпечная («прыжыцьцёвыя дзёньнікі» Сіўка). Па-трэцяе, друкавалася слабое, няўцямнае, публіцыстычна-аднадзённае (паэма Прылуцкага «Дывэртысмэнт для ІК», эсэ Балахонава «Код адзіноты», «геральдычнае» апавяданьне Астраўна «Яечнае пытаньне»). Па-чацьвертае, сустракаліся перадрукоўкі (прадмова Някляева да кнігі Барадуліна).

Тым ня менш ня будзем казаць пра «ЛС» у мінулым часе: у праекту ёсьць будучыня пры ўмове, што Рэдакцыя пазбавіцца ўсіх пералічаных вышэй заганаў. Гэта – пытаньне гонару і прэстыжу, бо друкаваньне літаратурных твораў для «Нашай Нівы» – не забава, а вернасьць традыцыям і своеасаблівы абавязак перад грамадзтвам і літаратурай. Тут неабходна прывесьці наступныя словы А. Дынька:

«Наша Ніва» ня стала ні радыкальнай, ні палітычнай. Раней яна была літаратурна-мастацкім выданьнем, а пасьля стала газэтай для ўсіх. Гэта было выклікана агульнымі патрэбамі беларускага грамадзтва. Да таго ж, адбывалася эвалюцыя беларускай культуры[2].

«Раней» – гэта, відаць, у 1906–1915 гг., а таксама ў першыя гады выданьня адноўленай вэрсіі газэты на чале зь Сяргеем

[1] Сярэднеарыфмэтычны паказьнік прозы і паэзіі – 1/10. Чым тлумачыцца гэта? Як кажа галоўны рэдактар «Нашай Нівы» Андрэй Дынько, «на сеньня мы маем у Беларусі пэўную паэзію, але няма добрай прозы». Я згодны, «ЛС» аб'ектыўна адлюстроўваюць стан рэчаў у сучаснай літаратуры.

Дубаўцом. Сапраўды, літаратура друкавалася ў «НН» ad incunabulis. Так, калі ўзяць шараговы нумар газэты за 1910 г., напрыклад, № 40, мы пабачым, што ў ім надрукаваны верш польскай паэткі Мар'і Канапніцкай «Пара» (у перакладзе Янкі Купалы), нэкралёг на ейную сьмерць з элемэнтамі літаратурна-мастацкай крытыкі (бяз подпісу), верш у прозе Вацлава Ластоўскага «Апаўшае лісьце», ягоны ж рэпартаж «Беларускі вечар у Полацку», верш Янкі Купалы «Дудар», рэцэнзія Альгерда Бульбы на «Песьні жальбы» Якуба Коласа, нарыс «Лісты з дарогі» Ядвігіна Ш., верш Алеся Гаруна «Каму што…». Такія «Літаратурныя сшыткі» супрацоўнікі газэты рыхтавалі амаль штонумар, як быццам прыхоўваючы для нас соль на чорны дзень. І ў выніку таго, што гэта быў больш, чым сшытак, больш, чым газэта, амаль усё з надрукаванага тады ўвайшло ў залаты фонд нацыянальнай літаратуры (ці можна сказаць гэта пра сёньняшнія «ЛС»? – вось у чым пытаньне). Пры гэтым творчы калектыў на чале з А. Уласавым, а пазьней і Я. Купалам спраўна выконваў свае прафэсійныя абавязкі журналістаў, таму спадар А. Дынько памыляецца: ужо ў тыя часы «НН» мела рэпутацыю газэты для ўсіх – не ў апошнюю чаргу дзякуючы таму, што Рэдакцыяй быў знойдзены разумны балянс паміж літаратурай і публіцыстыкай[3].

Яшчэ адна заўвага: галоўны рэдактар кажа, што «НН» была літаратурна-мастацкім выданьнем *раней.* Але цікава, ці менавіта сучасная «НН» спрабуе ўзбуйніць, умацаваць літаратурна-мастацкую частку! Гэты працэс пачаўся ў 2000 г., калі выйшаў першы калядны нумар газэты, а С. Дубавец, які напачатку друкаваў у выданьні пераклады з Дантэ і Эдгара По і рэгулярна выступаў на ейных старонках у якасьці літаратурнага крытыка, сышоў з пасады галоўнага рэдактара. Таму А. Дынько супярэчыць сам сабе. Працэс непазбежны – «Нашай Ніве» наканавана ўплываць на сучасны літаратурны працэс, захоўваць і ўзбагачаць традыцыі нацыянальнага слоўнага мастацтва, падтрымліваць дэбютантаў. І менавіта ад А. Дынька, чалавека, які калісьці вельмі ўдала дэбютаваў у «НН» як празаік, а сёньня ачольвае газэту, залежыць, ці будуць нашаніўцы і далей назапашваць соль.

[3] Падрабязней пра гэта гл.: Ніцкі, Аўрамовіч, Павецьці, Пэпі Літаратурная крытыка ў «Нашай Ніве» // Наша Ніва. 2002. № 25; Аўрамовіч А. Місія – знаходзіць і выхоўваць // Наша Ніва. 2002. № 25; Ніцкі, Аўрамовіч

Ніве» ў 1906–1910 гады // Дзеяслоў. № 13. 2004.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 10 (50) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/18
[image]